# ВОЛЬНЫЯ МУЛЯРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

## канец XVIII – пачатак XX ст.



БЕЛАРУСКАЕ ГІСТАРЫЧНАЕ ТАВАРЫСТВА

# ВОЛЬНЫЯ МУЛЯРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ

## канец XVIII – пачатак XX ст.

Укладальнік і навуковы рэдактар
доктар гістарычных навук
А.Ф. Смалянчук

Вільня
«Gudas»
2005

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беі)4**
**З 41**

**З 41** **Вольныя муляры ў беларускай гісторыі.** Канец XVIII — пачатак XX ст. — Вільня: Gudas, 2005. — 280 с.: іл., табл., бібл.

ISBN 99-8695-154-2

Зборнік з'яўляецца першай у беларускай гістарыяграфіі спробай навуковага асвятлення "вольнамулярскага (масонскага) следу" ў айчыннай гісторыі канца XVIII – пачатку XX ст. Стваральнікі кнігі імкнуліся сродкамі навуковага аналізу "праверыць" антымасонскія стэрэатыпы масавай свядомасці. Матэрыялы зборніка знаёмяць чытача з таямнічым светам масонскіх ложаў, дзейнасць якіх у пэўныя перыяды беларускай гісторыі была істотным фактарам грамадска-палітычнага і культурнага жыцця.

На першай старонцы вокладкі выява пячаткі Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць" (Вільня). 1819 г.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беі)4**

ISBN 99-8695-154-2
© А.Ф.Смалянчук, 2005

# Змест

Прадмова рэдактара ..................................................................4

ДАСЛЕДАВАННІ

*Тадэвуш Цагельскі (Варшава)*
"Ordo in Chao". Вольнае мулярства і крызісы эпохі Асветніцтва .... 12

*Марына Сакалова (Менск)*
Масонства як сацыяльна-культурная практыка. XVIII – XIX ст. ...... 27

*Вячаслаў Швед (Гародня)*
Масонскія ложы на землях Беларусі
(канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.) ........................................ 37

*Юры Гардзееў (Кракаў-Гародня)*
З гісторыі гарадзенскіх масонаў ................................................ 103

*Юры Гардзееў (Кракаў-Гародня)*
Гарадзенскія масонскія прывілеі з мяжы XVIII – XIX ст. .............. 128

*Сяргей Рыбчонак (Менск)*
Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 ст.
(нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі) ............... 135

*Станіслаў Малахоўскі-Лэмпіцкі (Варшава)*
Міцкевіч і вольнае мулярства ..................................................... 148

*Алесь Смалянчук (Гародня)*
Адраджэнне вольнага мулярства
на беларускіх і літоўскіх землях напачатку XX ст. ........................ 157

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ
Канстытуцыі Андэрсана
альбо Старажытныя запаветы вольнага муляра. 1723 г. ................. 186
Ландмаркі. 1889 г. ....................................................................... 192
Статут вольных муляраў "Расейскай правінцыі". 1782 г. ................. 195
Статут Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага
і Вялікага Княства Літоўскага. 1784 г. .......................................... 206
Канстытуцыйны статут вольнага мулярства Польскага. 1820 г. ...... 218
Статут Вялікага ўсходу народаў Расеі. 1912 г. ................................ 233
Аўтабіяграфія Браніслава Адамавіча Тарашкевіча. 1933 г.
(Фрагменты) ............................................................................... 239

ХРАНАЛОГІЯ. СЛОЎНІК. БІБЛІЯГРАФІЯ ........................................ 245

# Прадмова рэдактара

У навуковай літаратуры вольнае мулярства або масонства звычайна вызначаецца як этычны або рэлігійна-этычны рух, які канчаткова аформіўся напачатку XVIII ст. у Англіі. Паводле вольнамулярскай ідэалогіі, мэтаю дзейнасці ягоных прыхільнікаў з'яўляецца духоўнае ўдасканаленне чалавека і ўсталяванне братэрскіх адносінаў паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцяў і рэлігій, прыхільнікамі розных сацыяльна-палітычных пазіцый.

Даследаванне дзейнасці вольных муляраў або масонаў (freemasonry – англ.) з'яўляецца новым сюжэтам беларускай гістарыяграфіі апошняга часу. Толькі ў 90-я гг. XX ст. айчынныя гісторыкі ўпершыню заняліся навуковай распрацоўкай праблемы, якую ў савецкі перыяд прыватызавалі "прапагандысты" кшталту У.Я.Бегуна[1].

Адной з першых навуковых публікацый быў артыкул Сяргея Рыбчонка, прысвечаны вольным мулярам Менску пачатку XIX ст.[2] Варта згадаць таксама артыкулы Ігара Гатальскага пра Даменіка Манюшку[3] і Яўгена Анішчанкі пра пачатак гісторыі вольных муляраў на беларускіх землях[4]. Важную ролю ў навуковай актуалізацыі праблемы адыгралі пераклады працаў даследчыка пачатку XX ст. Станіслава Дабранскага, апублікаваныя на старонках *Спадчыны*[5]. У 1997 г. *Гарадзенскія запісы* змясцілі артыкул Вячаслава Шведа, прысвечаны дзейнасці гарадзенскіх ложаў канца XVIII – пачатку XIX ст.[6] Нарэшце, першую спробу абагульнення гісторыі вольных муляраў Беларусі зрабіў Мікалай Рыбко[7]. Таксама трэба згадаць публікацыі Юрыя Гардзеева, які вельмі

---

[1] Гл., напр., кнігу: В.Я.Бегун *Рассказы о "детях вдовы"* (Минск, 1986).

[2] Рыбчонак С. Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагоддзя (Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі) // Годнасць. – 1994. – № 1(2).

[3] Гатальскі І. Масон з Роткаўшчыны // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 5.

[4] Анішчанка Я. Вольныя муляры // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 3.

[5] Дабранскі С. Масонскія лёжы ў Літве // Спадчына. – 1997. – № 1; ён жа. Нарысы з гісторыі масонства ў Літве // Спадчына. – 1997. – № 3.

[6] Швед В.В. Гродзенскія масонскія ложы (канец XVIII-пач. XIX ст.) // Гарадзенскія запісы: Старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1997. – Вып. 3.

[7] Рыбко М. Масонства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 5. – Мн.: БелЭн, 1999.

грунтоўна аднавіў гісторыю ложаў Гародні ў канцы XVIII і пачатку XIX ст.[8], і аўтара гэтых радкоў, прысвечаныя ложам Беларусі і Літвы пачатку XX ст.[9] Ідэалогія віленскіх масонаў пачатку XX ст. і іх узаемаадносіны з "Вялікім Усходам народаў Расеі" закраналіся таксама Мікалаем Сташкевічам[10].

Традыцыі беларускай гістарыяграфіі масонскага сюжэту толькі складваюцца. Але гэты пачатак можна ацаніць станоўча. Большасць айчынных даследчыкаў пазбегла стэрэатыпаў. Выразна пераважае імкненне да навуковага аналізу месца і ролі масонаў у гісторыі Беларусі.

Цікавасць да "вольнамулярскага следу" ў беларускай гісторыі цалкам зразумелая. Даследчыкаў вабіць тое, што польскі гісторык Ю.Чыньскі назваў "гісторыяй ночы". Вольнае мулярства заўсёды было ахутана покрывам таямніцы, якая ў вялікай ступені спрыяла нараджэнню "чорнай легенды" пра масонства. Гэтая "легенда" найчасцей праяўляецца ў розных варыяцыях вядомай канцэпцыі "тайнай змовы" [або супраць усяго чалавецтва, або супраць асобна ўзятай нацыі-дзяржавы]. Вельмі часта яна набывае антысеміцкае адценне ["жыдамасонская змова"]. Якраз таму адной з галоўных задачаў дадзенага зборніка з'яўляецца праверка антымасонскіх стэрэатыпаў сродкамі навуковага гістарычнага даследавання. Даследчыкі, якія рыхтавалі матэрыялы для зборніка, не імкнуліся замяніць "чорную легенду" на "белую" ці "ружовую". Яны толькі паспрабавалі зразумець месца вольных муляраў у нашай гісторыі.

Зборнік пачынаецца раздзелам *Даследаванні*, які ўтрымлівае аналітычныя матэрыялы, прысвечаныя гісторыі вольных муляраў на беларускіх землях у другой палове XVIII – першай трэці XX ст. Аўтарамі тэкстаў з'яўляюцца беларускія гісторыкі і архівісты – Марыяна Сакалова і Сяргей Рыбчонак (Менск), Вячаслаў Швед і Алесь Смалянчук (Гародня), Юры Гардзееў (Гародня-Кракаў). Трэба адзначыць публікацыю перакладаў артыкулаў двух вядомых польскіх даследчыкаў вольнага мулярства – Станіслава Малахоўскага-Лэмпіцкага (1884-1959) і прафесара Тадэвуша Цагельскага, галоўнага рэдактара часопіса *Ars Regia*, гэтага своеасаблівага навуковага цэнтра польскага масоназнаўства. Артыкул С.Малахоўскага-Лэмпіцкага ("Міцкевіч і вольнае мулярства") прысвечаны адносінам славутага паэта да "каралеўскага майстэрства", а тэкст Т.Цагельскага ("Ordo in Chao". Вольнае мулярства і крызісы эпохі Асветніцтва") знаёміць чытача з сацыяльна-палітычнай пазіцыяй вольных муляраў Еўропы ў эпоху Асветніцтва.

---

[8] Гардзееў Ю. З гісторыі гарадзенскіх масонаў // Гістарычны альманах. – 2001. – Т. 5.

[9] Гл., напр., Смалянчук А. З гісторыі віленьскага масонства пачатку XX ст. // Спадчына. – 1998. – № 5; ён жа. Масонскія ложы на беларускіх і літоўскіх землях. 1910-1916 гг. // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2002. – 17.

[10] Сташкевіч М. Гістарычны выбар напачатку XX ст. // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Пад рэд. А.П.Вайтовіча ды інш. – Мінск, 2000.

Раздзел *Дакументы і матэрыялы* ўтрымлівае пераважна тэксты Канстытуцый і Статутаў вольных муляраў, паводле якіх была арганізаваная дзейнасць ложаў на беларускіх землях у разглядаемы перыяд. Большасць з дакументаў друкуецца ўпершыню ў беларускай навуковай літаратуры. Англамоўныя і польскамоўныя тэксты таксама ўпершыню перакладаюцца на беларускую мову.

Трэба адзначыць, што пры перакладзе гэтых дакументаў, а таксама пры рэдагаванні аналітычных тэкстаў зборніка ўзнікла праблема тэрміналогіі. Менавіта таму ў зборніку змешчаны *Слоўнік* найбольш пашыраных масонскіх тэрмінаў (В.Швед і А.Смалянчук). Была зроблена спроба пэўнай уніфікацыі тых спецыфічных тэрмінаў, якія датычаць дзейнасці вольных муляраў. У прыватнасці, гэта датычыць самой назвы прыхільнікаў "каралеўскага майстэрства". У матэрыялах зборніка апроч агульнапрынятага тэрміна "масоны" шырока ўжываюцца тэрміны "дзеці ўдавы", "браты" і "вольныя муляры". Асабліва часта сустракаецца апошні з іх. Ягонае ўжыванне абумоўлена тым, што для большасці чытачоў тэрмін "вольны муляр" з'яўляецца новым і не ўтрымлівае таго асуджальнага сэнсу, якім антымасонская прапаганда надзяліла тэрмін "масон". Аднак тэрміналагічныя пошукі нельга лічыць закончанымі. Прапанаваны *Слоўнік* трэба разглядаць як пачатковы этап гэтай працы.

Увазе чытача таксама прапануецца *Храналогія гісторыі вольнамулярскага руху*, у якую ўключаныя найбольш значныя падзеі беларускай мінуўшчыны (аўтары М.Сакалова і А.Смалянчук), а таксама *Бібліяграфія* (А.Смалянчук).

Больш глыбокаму разуменню феномена вольнага мулярства ў айчыннай гісторыі паспрыяе знаёмства з канкрэтнымі гістарычнымі постацямі. Аўтарамі партрэтаў вольных муляраў у адпаведнай рубрыцы былі Іна Соркіна (Гародня), Вольга Шаталава (Менск) і Алесь Смалянчук. Адносіны да Ордэна вольных муляраў адлюстраваныя ў рубрыцы *Вольныя муляры: ацэнкі і меркаванні*.

Хачу выказаць шчырую падзяку Тадэвушу Цагельскаму і Янушу Мацеёўскаму (абодва Варшава), Збігневу Соляку і Юры Гардзееву (абодва Кракаў), якія сваімі парадамі і прадастаўленымі матэрыяламі істотна дапамаглі ў падрыхтоўцы гэтага зборніка. Вялікую ролю таксама адыграла падтрымка праекта з боку таварыства "Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр" (Варшава). Выданне кнігі стала магчымым дзякуючы дапамозе Беларускага інстытута навукі і мастацтва (Belarusan Institute of Arts and Sciences).

Алесь Смалянчук,
доктар гістарычных навук

Франк-масонство или масонство (нем. *Freimaurerei, Maurerei, Masonei*, англ. *masonry, freemasonry*, фран. *mazonnerie, franc-mazonnerie*, лат. *ars liberorum muratorum* или *latomia*) – задается целью нравственно облагораживать людей и объединять их на началах братской любви, равенства, взаимопонимания и верности.

Энциклопедический словарь. Том XXXVIa
/ Изд. Ф.А.Брокгауз, И.А.Ефрон. – Спб., 1902.
– С. 502 (аўтар артыкула Ю.Гесен).

С первых же шагов своей деятельности масонство стало встречать противодействие со стороны духовных и светских властей. Если это враждебное отношение парализавало кое-где распространение союза, то в большинстве случаев оно способствовало ему, вызывая особенный интерес к новому таинственному учреждению. В Великобритании, где граждане издавна пользовались правом собраний и союзов, преследования вообще были незначительны; в Шотландии в 1755 г. Генеральный Синод возбудил преследование против масонов, не принадлежащих к цеху; в Ирландии католическое духовенство объявило себя врагом союза и преследование его продолжало в течение всего XIX в. Во Франции папские буллы о преследовании масонов не оказывали действия; лишь в 1737, 1744 и 1745 гг. полиция препятствовала работе масонов; позже деятельность французских лож не прерывалась властью. Наиболее грозными врагами масонов явились папы, вызывавшие преследование масонов в Италии, Испании и Португалии. Благодаря папам масонство имело и своих мучеников. В 1737 г. в Риме образовалась особая конференция из нескольких кардиналов и инквизитора святого судилища; многие братья попали в руки инквизиции, а в 1738 г. папа Климент XII объявил буллою анафему союзу; в силу этой буллы Карл VI запретил масонство в Нидерландах. Однако на месте закрывавшихся лож возникали новые. В 1751 г. Бенедикт XIV подтвердил буллу своего предшественника; тогда же Фердинанд VI Испанский запретил масонов под страхом смертной казни. В 1814 г. Пий VII вновь провозгласил проклятие масонству и в 1821 г. повторил его. Лев XIII и Пий VIII шли по стопам предшественников. По мере распространения союза папы стали чаще высказываться против него. В 1846 г., дважды в 1849, 1854, 1863, 1864, 1865 и 1875-х гг. Пий IX обрушивался с проклятиями на масонство. Лев XIII также энергично восставал против Союза; он назвал масонскую терпимость обманом, так как ею хотят уверить братьев будто люди всех рели-

гий достигнут загробного блаженства. Он призывал католических правителей принять меры к уничтожению Союза <…>

Энциклопедический словарь. Том XXXVIa
/ Изд. Ф.А.Брокгауз, И.А.Ефрон. – Спб., 1902.
– С. 508 (аўтар артыкула Ю.Гесен).

Пасля рэвалюцый 1848 г. каталіцкі касцёл распачаў змаганне супраць распаўсюджвання рэспубліканскіх формаў праўлення, ідэі аддзялення касцёла ад дзяржавы, прызнання праблемы веравызнання асабістай справай чалавека. Гэтыя палажэнні часта з'яўляліся складовымі праграмаў палітычных партый. Якім жа выгодным для рэакцыі быў палемічны тэзіс, што праграмы гэтых партый ствараюцца ў выніку дзеяння нейкіх закулісных сілаў, якія ўсё расстаўляюць на шахматнай дошцы палітычнай барацьбы і імкнуцца да знішчэння касцёла і існуючага сацыяльнага ладу!

Паняцце масонства аказалася вельмі прыдатным для гэтага. Масонства нечакана ператварылася ў гіганцкую пачвару з тысячамі вачэй і шчупальцаў, якая здалёк ад суеты сённяшняга дня ў цішы канспірацыі вырашае лёсы свету і чалавецтва. Быў створаны міф і распрацаваная методыка, якая сдала іспыт на "выдатна". Ёй карысталася ўся рэакцыя. Калі не хапала канкрэтных аргументаў, казалі пра таямнічасць ложаў, а ў палітычных праціўніках бачылі іх прадстаўнікоў. Класічны вобраз гэтай барацьбы прадстаўлены ў Францыі пасля 1870 г. падчас змагання кансерватыўнага духавенства супраць маладой рэспублікі. Практычна не было ніводнай палітычнай справы, за якой бы не бачылі рукі масонаў <…>

Kipa E. Studia i szkice historyczne.
– Wrocław, 1959. – S. 201

Няма неабходнасці ні перабольшваць, ні змяншаць значнасць зробленага вольнымі мулярамі на магістралях цывілізацыі. Захад дасягнуў шмат чаго дзякуючы дзейнасці масонаў. І наадварот, тыя краіны, дзе яно забаранялася ці праследавалася, неслі значныя страты, нават паражэнні як на поле боя, так і пры мірным супастаўленні сацыяльных сістэмаў і каштоўнасцяў.

Алег Салаўёў, расейскі гісторык масонства, 1998 г.
(Харитонович Д. Масонство. – Москва, 2001. – С. 8)

Масонства заўсёды было супольнасцю, сяброў якой звязвалі ўзаемныя інтарэсы, хоць яны ніколі не былі вызначаны. Яго ворагі сцвярджалі, што масонства – з'ява антыфеміністычная, бо ў яго шэрагі не прымаюцца жанчыны, а таксама – антысацыяльная і антыхрысціянская, бо ягоныя сябры дзеля ўзаемападтрымкі выкарыстоўваюць палітычныя, гандлёвыя і сацыяльныя кантакты, што шкодзіць інтарэсам іншых людзей. Самі вольныя муляры заўсёды падкрэслівалі ўласны супраціў атэізму, прыхільнасць рэлігійнай талеранцыі, нейтралітэт у палітычных справах і зацікаўленасць у дабрачыннасці.

<...> Спрэчкі на тэму ролі масонства працягваюцца. Але найлепей пра вольнае мулярства гаворыць спіс ягоных сяброў. Гаворыцца, што ў яго трапілі імператар Аўстрыі Францішак I, кароль Прусіі Фрыдрых II, кароль Швецыі Густаў IV, кароль польскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, цар Расеі Павел I, Врэн, Свіфт, Вальтэр, Мантэск’е, Гётэ, Гібон, Бэрнс, Уілкс, Барк, Гайдн, Моцарт, Гільёцін і Марат, генералы Лафайет, Кутузаў, Сувораў і Велінгтон, маршалы Макдональд і Панятоўскі, апроч таго Талейран, Кэнінг, Скот, Тролап, О'Конэл, Пушкін, Ліст, Мазіні, Гарыбальдзі і Кошут, кароль Бельгіі Леапольд I, германскі імператар Вільгельм I, Эйфель, Цірпіц, Шарнхорст, Масарык, Керанскі, Срэзэман і Чэрчыль, а таксама – за адзіным выключэннем – усе брытанскія каралі ад Георга IV да Георга VI. Гэта сведчыць, што найвялікшае з міжнародных тайных таварыстваў не было цалкам тайным.

Norman Davies. Europa. Rozprawa historyka z historia.
– Kraków, 1998. – S. 679.

Як Мы даведаліся <…> шырока распаўсюджваюцца і штодня робяць поспехі пэўныя таварыствы, арганізацыі, сходы, гурткі і тайныя саюзы, што называюцца масонствам альбо выступаюць пад іншай назвай у залежнасці ад асаблівасцяў мовы, у якіх людзі ўсялякіх рэлігій і ўсялякіх сектаў, ствараючы бачнасць прыроднай дабрасумленасці, звязваюцца паміж сабой тайнай дамовай паводле правоў і статутаў, выдуманых дзеля таго, каб, даючы прысягу на Біблії і пад пагрозай самага жахлівага пакарання, захоўваць у непарушнай маўклівасці ўсё тое, што робіцца ў змроку таямніцы.

Але прырода злачынства такая, што яно само сябе здраджвае, само пра сябе ўголас гаворыць, і гэта дазваляе яго адкрыць і ўбачыць, таму вышэйазначаныя таварыствы і тайныя саюзы выклікалі такія моцныя падаз-

рэнні ў душах вернікаў, што далучэнне да гэтых таварystваў у вачах людзей светлых і разумных азначае запляменне сябе як маральна сапсаванага, бо, калі б не рабілі яны нічога кепскага, то не хаваліся б так ад святла. А падазрэнні настолькі ўзмацніліся, што ў некаторых краінах згаданыя таварыствы здаўна забароненыя і пастаўленыя па-за законам, як пагроза грамадскаму спакою.

Задумваючыся над велізарнасцю зла, якое звычайна зыходзіць з такога тыпу таварystваў і тайных саюзаў, не толькі дзеля спакою дзяржаваў, але таксама дзеля ратавання душаў, і таму, што з гэтай нагоды не магчыма прымірыць гэтыя арганізацыі з законамі свецкімі і кананічнымі, і таму, што па воле Божай абавязкам Нашым з'яўляецца назіранне днём і ноччу – як вернага і разумнага слугі Божага – каб людзі падобнага тыпу не забіраліся як злодзеі да дамоў і не спусташалі як лісы склепаў, не псавалі сэрцаў прастакоў і не траплялі ў іх атрутымі стрэламі. Каб закрыць вельмі шырокі шлях, які мог бы стаць шляхам для злачынстваў, якія здзяйсняюцца без пакарання, ды па іншых вядомых Нам разумных і справядлівых прычынах, паслухаўшы рады Вялебных Братоў Кардыналаў святога рымска-каталіцкага касцёла і Нашым уласным рашэннем, будучы цалкам перакананымі ў правацэ, пасля працяглага роздуму і моцай Нашай поўнай апостальскай улады, пастанавілі асудзіць і забараніць названыя таварystвы, арганізацыі, сходы, гурткі і тайныя саюзы, якія называюцца масонствам або вядомыя пад іншай назвай, бо асуджаем і забараняем іх гэтым Нашым загадам назаўсёды. Дзеля гэтага забараняем фармальна і ў моцы святога паслухмянства ўсім і кожнаму асобна веруючаму ў Ісуса Хрыста кожнага саслоўя, ранга, кандыцыі, гонару і пасады, свецкім і духоўным, дыяцэзіяльным і манаскім, якія заслугоўваюць нават на спецыяльнае ўпамінанне, каб не дазволілі сабе пад якім бы ні было прэтэкстам, па якой бы ні было прычыне, уступаць у названыя таварystвы вольных муляраў альбо інакш названых, распаўсюджваць іх, утрымліваць, прымаць у сябе або даваць прытулак дзе-небудзь у іншым месцы, хаваць іх, далучацца да іх, падтрымліваць іх або выдзяляць ім сродкі і магчымасць для правядзення паседжанняў, дастаўляць што-небудзь, удзяляць ім рады, дапамогі або пад-трымкі адкрыта або тайна, непасрэдна або ўскосна, асабіста або праз іншых, якім бы ні было спосабам, таксама заахвочваць іншых, угаворваць, схіляць, каб запісваліся да таварystваў падобнага тыпу, станавіліся іх сябрамі, дапамагаць ім у тым, утрымліваць іх так ці інакш або раіць. І адназначна загадваем стрымлівацца ад усялякага ўдзелу ў гэтых таварystвах, арганізацыях, сходах, гуртках або тайных саюзах

пад пагрозай экскамуніі, якая будзе выкарыстаная супраць усіх, хто здзейсніць вышэйазначаныя праступкі фактычна і без аніякіх расследаваняў, і ад якой (экскамуніі) ніхто не можа атрымаць выбачэння іншым шляхам як толькі ад Нас або ад актуальнага біскупа Рыма ў выпадку смяротнай пагрозы.

Жадаем таксама і загадваем, каб усе біскупы і вышэйшыя духоўныя асобы ды іншыя кіраўнікі, каб усе інквізітары па справах ерэтызму паведамлялі і выступалі супраць здзейсненых праступкаў нягледзячы на саслоўе, рангі, кандыцыю, гонар і пасады, стрымлівалі іх і выносілі заслужаныя пакаранні як тым, каго моцна падазраюць у ерэтызме. Няхай нікому не будзе дазволена парушаць альбо супрацьставіцца Нашаму загаду, асуджэнню і забароне, што ўтрымліваюцца ў гэтай Буле. Калі хто-небудзь асмеліцца пасягнуць на яе, хай ведае, што яго чакае гнеў Бога Усемагутнага і святых апосталаў Пятра і Паўла.

Фрагмент энцыклікі папы Клеменса XII *In Eminenti* (1738)
(http://www.tradycja.koc.pl/InEminenti.htm)

Негатыўная ацэнка Касцёлам вольнамулярскіх арганізацый застанецца нязменнай, бо прынцыпы іх дзейнасці заўсёды былі нязгоднымі з вучэннем Касцёла і таму ўваходжанне ў іх склад застаецца забароненым. Вернікі, якія належаць да вольных муляраў, здзяйсняюць цяжкі грэх і не могуць быць дапушчанымі да Святога Прычасця.

З Дэкларацыі дактрыны веры. Ватыкан. 26 лістапада 1983 г.
(http://www.republika.pl/adnikiel/cc.html)

Масонства з'яўляецца тайнай інтэрнацыянальнай сусветнай рэвалюцыйнай арганізацыяй барацьбы супраць Бога, хрысціянства, Царквы, нацыянальнай дзяржаўнасці, і асабліва дзяржаўнасці хрысціянскай. У гэтай інтэрнацыянальнай арганізацыі першае месца па ўплывам і значэнню належыць яўрэйскай нацыі, якая адрозніваецца богазмаганнем з дня распяцця Ісуса Хрыста.

Мітрапаліт Антоній, Старшыня Архіерэйскага Сабора
Рускай праваслаўнай царквы за межамі. 1932 г.
(Харитонович Д. Масонство. – Москва, 2001. – С. 6)

**ДАСЛЕДАВАННІ**

*Тадэвуш Цагельскі (Варшава)*

# "Ordo in Chao". Вольнае мулярства і крызісы эпохі Асветніцтва*

## Масонства як адкрытая сістэма

У гістарыяграфічнай традыцыі, пачынаючы ад Спенсера і Тойнбі і да Поля Хазарда ўключна, у традыцыі, якая жыве і сёння, замацаваўся вобраз масонства XVIII ст. як "прадстаўніцтва" або нават "авангарда" Асветніцтва. У межах гэтай традыцыі рух вольных муляраў тлумачыцца як маніфестацыя інтэлектуальных і сацыяльных памкненняў "новага класа" – буржуазіі, а таксама інтэлектуальных колаў – інтэлігенцыі. Адначасна Асветніцтва трактуецца як праграма гэтых і іншых сацыяльных групаў, якія былі зацікаўленыя аслабленнем і нават поўнай ліквідацыяй феадальнай сістэмы[1].

Даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў дазваляюць па-новаму паглядзець на генезіс і ідэйны змест як Асветніцтва, так і "каралеўскага майстэрства". Аднак яшчэ вельмі далёка да выпрацоўкі сучаснай канцэпцыі ўзаемаадносінаў паміж інтэлектуальнымі структурамі XVIII ст. і вольным мулярствам. Рэзюміруючы, можна сцвярджаць, што вынікам гэтых даследаванняў з'яўляецца канстатацыя плюралістычнага характару як асветніцкай ідэалогіі, так і ідэйнага падмурку масонства.

---

* Перадрук з дазволу аўтара. Артыкул быў упершыню надрукаваны ў часопісе *Ars Regia* (1992. – Nr 1).

[1] Сярод шматлікай літаратуры параім чытачу толькі некаторыя выданні, дасягальныя ў Польшчы. Напр.: *M.S.Anderson Historians and the Eighteenth-Century Europe. 1715-1790. – Oxford, 1979. – S. 106-118; Chevallier P. Histoire de la Franc-Maçonnerie française. – T. 1; La Maçonnerie. Ecole de l'Egalite. 1725-1799. – Paris, 1974; Epstein K. The Genesis of German Conservatism. – New Jersey, 1966. – S. 84-111; Hazard P. Myśl europejska w XVII wieku Monteskiusza do Lessinga. Przełożył H.Suwała. Wstępem poprzedził S.Pietraszko. – Warszawa, 1972. – S. 242-245.* Азначаную пазіцыю цалкам падзяляе Людвік Хас, што адлюстравалася ў ягоных шматлікіх манаграфіях і артыкулах, прысвечаных вольнаму мулярству Польшчы і Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Напр., *Hass L. Z dziejów wolnomularstwa w Toruniu // Pamiątki masońskie w zbiorach Muzeum Okręgowego w Toruniu. – Toruń, 1970. – S. 5-28*; ён жа. *Sekta farmazonii warszawskiej. Pierwsze stulecie wolnomularstwa w Warszawie (1721-1821). – Warszawa, 1980*; ён жа. *Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX wieku. – Wrocław, 1982.* Грунтоўны аналіз поглядаў прафесара Хаса на філасофскі і сацыяльны вобраз вольнага мулярства XVIII ст. будзе зроблены ў Nr 2 *Ars Regia*.

Гэтае сцвярджэнне з'яўляецца зыходным тэзісам для разважанняў над характарам узаемасувязяў паміж масонствам, як інтэлектуальным рухам і сацыяльнымі і ідэйнымі крызісамі XVIII ст. "Каралеўскае майстэрства" трактуецца як рознанакіраваная светапоглядная рэакцыя на сацыяльныя крызісы і звязаныя з імі крызісы сістэмы каштоўнасцяў, якія мелі месца ў розныя перыяды і ў розных рэгіёнах Еўропы. Прапанаваная інтэрпрэтацыя супярэчыць як традыцыйнаму ўспрыяццю вольнага мулярства ў якасці "авангарда" або "фарпоста" Асветніцтва, так і досыць рэдкаму ўспрыяццю масонства як ідэйнага саюзніка "старога ладу" (на карысць гэтага сведчыць удзел у масонскім руху манархаў, арыстакратыі і прадстаўнікоў каталіцкага касцёла – будучых праціўнікаў французскай рэвалюцыі). Узамен аўтар прапануе дынамічны, зменлівы ў часе і прасторы вобраз вольнага мулярства.

На думку аўтара, "каралеўскае майстэрства" выконвала розныя функцыі – ад рэлігійнай да палітычнай – дзякуючы стварэнню практычнай альтэрнатывы для дадзенай праблемы або светапогляднай дылемы. Шматлікасць функцый ідэалогіі вольных муляраў з'яўлялася вынікам яе эзатэрычнага характару[2]. Эклектычны і адначасна сінкрэтычны характар сістэмы, якая была атрыманая ў спадчыну галоўным чынам ад прыхільнікаў герменеўтыкі, г.зн. ад нямецкіх і англійскіх паслядоўнікаў Разэнкрэйцара XVII ст., меў наступствам тое, што на яго падмурку маглі сустракацца і зліваецца ў адзінае самыя розныя, часта супярэчлівыя тэндэнцыі эпохі. Якраз гэтым тлумачыцца, напрыклад, тая лёгкасць, з якой гэтая сістэма выкарыстоўвала наватарскія сацыяльныя канцэпцыі, з аднаго боку, і адкрыцці навуковага прыродазнаўства, з іншага. Вольнае мулярства як адкрытая сістэма магло адказаць на многія пытанні, якія ставіла эпоха, вырашыць многія яе праблемы. Прычым вырашыць іх рознымі спосабамі.

Інтэрпрэтацыя агульных прынцыпаў у масонстве залежала ад саміх зацікаўленых асобаў. Карыстаючыся адзінай універсальнай мовай – мовай сімвалаў і алегорый – масонства станавілася зразумелым для ўсіх народаў света. Таксама яно магло звяртацца да вернікаў розных рэлігій і прадстаўнікоў розных супольнасцяў, да людзей з розным інтэлектуальным узроўнем.

Нагадваючы сваім універсалізмам вялікія рэлігіі, вольнае мулярства адрознівалася ад іх індывідуалізмам і суб'ектывізмам. У адрозненні ад пазітыўных рэлігій яно ніколі не стварыла сваёй закончанай сістэмы, не выпрацавала ўласнай дактрыны. Цалкам невыпадкова масонства не мае ні Папы, ні Сабора. Таксама ніколі – насуперак пашыранаму меркаванню – яно не ства-

[2] Больш падрабязна на гэтую тэму аўтар пісаў у артыкуле *"Sztuka królewska" a chrześcijaństwo (Ezoteryzm wolnomularski w XVII i XVIII w.) // Kwartalnik Historyczny. – R. 92. 1984. – S. 727-746*, і асабліва ў працы *"Ordo ex Chao". Wolnomularstwo i światopoglądowe kryzysy XVII i XVIII w. – T. 1 "Oświecenie Różokrzyżowców" i początki masonerii spekulatywnej 1614-1740. – Warszawa, 1992.*

рыла адзінай арганізацыі або аднародных. З моманту свайго нараджэння ў Англіі на рубяжы XVII і XVIII ст. вольнае мулярства было падзеленым на шэраг востра канкурыруючых паміж сабою накірункаў. І гэта, нягледзячы на энергічныя спробы ўніфікацыі і цэнтралізацыі[3]. Пасля трохсот гадоў існавання гэты рух складаецца з больш чым трохсот арганізацый і таварыстваў (саюзаў), якія аб'ядноўваюць каля 8 млн. чалавек, што прадстаўляюць розныя рэлігіі, розныя сацыяльныя групы і розныя палітычныя накірункі за выключэннем левых і правых радыкалаў[4].

Прпанаванае бачанне праблемы дазваляе вылучыць для XVIII ст. наступныя тэзісы:

1. Рух вольных муляраў уяўляў сабой свайго роду платформу, на якой праявіліся сацыяльныя і светапоглядныя канфлікты эпохі Асветніцтва. Дзякуючы "каралеўскаму майстэрству" гэтыя канфлікты, па меншай меры, да пэўнага моманту і пэўнай ступені нейтралізаваліся. Менавіта таму можна казаць пра кампенсацыйную або псіхатэрапеўтычную функцыю вольнага мулярства часоў Асветніцтва[5].

2. Ідэйна падзелены рух вольных муляраў у XVIII ст. з'яўляўся адлюстраваннем хвалявання і фрустрацыі, з аднаго боку, тых сацыяльных групаў, якія выходзілі на сацыяльную арэну і пры гэтым перажывалі цяжкасці адаптацыі да новай сацыяльнай, палітычнай ролі ды інш. ("новая шляхта", буржуазія новага тыпу, людзі культуры, што дзейнічалі ва ўмовах свабоднай канкурэнцыі і рынку, маладая інтэлігенцыя ў краінах Сярэдняй Еўропы ды г.д.), а з іншага боку, тых асяродкаў, пазіцыя якіх значна аслабела (напр., розныя катэгорыі шляхты, арыстакратыя разам з буржуазіяй старога тыпу).

Прапанаваныя тэзісы хачу праілюстраваць двумя гістарычнымі прыкладамі, якія могуць служыць практычнай праверкай усёй канцэпцыі. Першы датычыць англійскіх пачаткаў руху і сістэмы, створанай у 1717 г. Вялікай ложай Лондана (г.зв. *Premier Grand Lodge*), якая ўключала тры лонданскія ложы і ложу ў Вестмінстэры. Арганізацыйным і ідэйным падмуркам руху сталі апублікаваныя ў 1723 г. Вялікай ложай *The Constitutions of the Free-Masons*, аўтарства пастара Джэймса Андэрсана. Канстытуцыі Андэрсана былі дапоўненыя і папраўленыя ў другім выданні 1738 г. Якраз яны

---

[3] Bord G. La Franc-Maçonnerie en France des origines a 1815. – Paris, 1908. – S. 342-355; Hammermayer L. Der Wilhelmsbader Freimaurer-Konvent von 1781. – Heidelberg, 1980.

[4] Сярод польскай масоназнаўчай літаратуры адсутнічае праца, якая б характарызавала сённяшні дзень сусветнага вольнага мулярства. Актуальныя дадзеныя па складу і колькасці ложаў, ідэйных прынцыпах і спосабах іх рэалізацыі прадстаўленыя ў часопісах, якія выдаюцца большасцю саюзаў вольных муляраў. Некаторыя з іх, асабліва выданні вялікіх нямецкіх ложаў, даступныя ў Бібліятэцы універсітэту ў Познані, у чытальнай залі Самастойнай секцыі масонскіх збораў.

[5] Гэтая функцыя, безумоўна, звязаная з сімвалічным характарам "каралеўскага майстэрства", які грунтоўна прааналізаваў Караль Сэрыні.

стварылі канон трохступенчатага брытанскага масонства, які пазней сталі называць "блакітным" або "янаўскім"[6]. Сістэма Вялікай ложы Лондана, якая хутка пашырылася ў краінах кантынентальнай Еўропы, была альтэрнатывай для ложаў г.зв. "якабіцкага" тыпу, што аб'ядноўвалі прыхільнікаў выгнанага Якава II Сцюарта і ўжо напачатку XVIII ст. мелі свае арганізацыі ў каталіцкіх краінах Еўропы, асабліва ў Францыі, Італіі, а магчыма, нават у Польшчы.

Другі са згаданых прыкладаў, звязаны з ложамі новага, г.зв. "шатландскага" тыпу, якія ўзніклі ў Францыі каля 1740 г. Шатландскае масонства, якое таксама называюць "чырвоным", апроч трох ступеняў пасвячэння, вядомых англійскаму масонству, прыняло яшчэ вышэйшыя ступені, прасякнутыя духам эзатэрычнага і містычнага хрысціянства. Сістэма вышэйшых ступеняў зрабіла ашаламляльную кар'еру ў наступную чвэрць стагоддзя сярод вольных муляраў большасці краінаў Еўропы. Асаблівага поспеху яна дасягнула ў Францыі (дзе і нарадзілася), а таксама – у Германіі і Скандынавіі. У іншых краінах гэтая сістэма (рытуал) канкурыравала з масонствам, якое працягвала традыцыі Вялікай ложы Лондана.

## "Рэлігія, якую прымаюць усе людзі"

У дадзенай працы няма мажлівасці падрабязна спыняцца на паняцці "светапогляднага крызісу" 1680 – 1715 гг., якое ўвёў у навуковы зварот Поль Хазард[7]. Не згаджаючыся з усімі тэзісамі, якія прапанаваў французскі навуковец, я прыняў услед за ім, а таксама ўслед за амерыканскім гісторыкам ідэі Артурам О.Лаўджоем (A.O.Lovejoy) характарыстыку "інтэлектуальнай сітуацыі" ў Англіі на рубяжы XVII і XVIII ст.[8] Таксама немагчыма даць вычарпальную характарыстыку розных рэлігійна-этычных, сацыяльных, палітычных, а таксама эстэтычных складовых англійскай масонскай думкі таго перыяду. Хачу сканцэнтраваць увагу на першай праблеме, г.зн. на масонскай альтэрнатыве абодвум вядучым рэлігійным ідэям англійскага Асветніцтва – дэізму, з аднаго боку, а таксама атэізму і лібертынізму (вольнадумству), з іншага.

---

[6] Anderson J. The Constitutions of the Free-Masons containing the History, Charges, Regulations, etc, of that most Ancient and Right Worshipful Fraternity. For the Use of the Lodge. By… – London, 1723 (далей: Constitutions, 1723); ён жа.The New Book of Constitutions of the Ancient and Honourable Fraternity of Free and Accepted Masons <...>. – London, 1738 (далей:: *Constitutions*, 1738). Існуе шмат рэпрынтных выданняў, крытычных разглядаў і перакладаў абодвух выданняў андэрсанаўскіх Канстытуцый. Сярод кніг Самастойнай секцыі масонскіх збораў у Познані захоўваюцца вельмі рэдкія асобнікі.

[7] Hazard P. Kryzys świadomości europejskiej 1680-1715. Przekład J.Lalewicz, A.Siemek. – Warszawa, 1974.

[8] Lovejoy A.O. Essays in the History of Ideas. – New York, 1960.




Карчма “Гусь і верцел”, месца першага паседжання Вялікай ложы Лондана
24 чэрвеня 1717 г. Гравюра. 1894 г.

"Класічнае" і сёння найбольш пашыранае ўяўленне падкрэслівае сувязь паміж "каралеўскім майстэрствам" і рацыяналізмам у самым шырокім разуменні. У першую чаргу размова ідзе пра розныя варыянты дэізму, г.зн. пра фактычнае адмаўленне традыцыйнай рэлігіі і трактоўку ўсіх гістарычных рэлігій як фальшывых. Гэты погляд звычайна звязаны з перакананнем, што сацыяльнай базай руху вольных муляраў, як на Брытанскіх астравах, так і пазней на кантыненце, было імкненне да роўнасці мяшчанства альбо буржуазіі[9].

Прыхільнікі тэзіса пра дэістычны падмурак галоўнага маніфеста англійскага масонства – ужо згаданых *Канстытуцый* Андэрсана – галоўным чынам грунтуюцца на першым артыкуле *Канстытуцый* "Пра Бога і рэлігію". У варыянце 1723 г. ён выглядае так:

"Вольны муляр абавязаны ў моц дадзенага ім абавязацельства, падпарадкоўвацца маральнаму закону; і калі ён правільна разумее Каралеўскае Майстэрства, ён ніколі не стане неразумным атэістам альбо неверуючым вольнадумцам. Аднак, калі ў старажытнасці Вольныя муляры абавязаны былі вызнаваць рэлігію сваёй краіны і свайго народу, якой бы яна ні была, то сёння лічыцца больш разумным належаць да той рэлігіі, якую прымаюць усе людзі, пакідаючы для сябе ўласнае меркаванне..."[10]

"Рэлігія, якую прымаюць усе людзі" ў дадзеным выпадку атаясамлівалася альбо з "рэлігіяй прыроды", альбо з дэізмам, але найчасцей з гэтымі абедзьвума дактрынамі адначасна. З першым варыянтам можна пагадзіцца толькі пры ўмове, што "рэлігіяй прыроды" ў XVIII ст. разумелі падмурак усіх традыцыйных рэлігій, свайго роду "прарэлігію" або "першаснае прасвятленне", якое атрымаў яшчэ Адам[11]. Паколькі гэтая канцэпцыя адвяргае дэістычны падыход, які не прымае ідэю "прасвятлення", першародны грэх ды інш., то аб'яднанне "рэлігіі прыроды" з дэізмам з'яўляецца лагічнай памылкай. Яе прычына – недакладнасць паняццяў. Што датычыць дэізму, то ні далейшы тэкст *Канстытуцый*, ні змест дадатковай *Гісторыі вольных і пасвечаных муляраў* не дазваляе сцвярджаць, што мэтаю (няхай нават другараднай) вольных муляраў з'яўляецца прапаганда дэізму. Красамоўным выглядае пры гэтым тое, што андэрсанаўская формула паўтараецца амаль дакладна ў зборніку законаў, апублікаваным

---

[9] Падобнай думкі прытрымліваюцца між іншымі Джон Барцье, П'ер Шэвалье, Вінфрыд Доцзауэр, Клаўс Эпштайн, Бернард Фэй, Поль Хазард, Бемард Э.Джонс, Хэльмут Райнальтэр. У Польшчы – галоўным чынам Леан Хайн, Марыя Асоўска і Юзаф Уейскі (гл., напр., *Chajn L. Wolnomularstwo w II Rzeczypospolitej. – Warszawa, 1974. – S. 34; Ossowska M. Myśl moralna Oświecenia angielskiego. – Warszawa, 1966. – S. 121; Ujejski J. Król Nowego Izraela. Karta z dziejów mistyki wieku oświeconego. – Warszawa, 1924. – S. 18*).

[10] Constitutions, 1723 (пераклад М.Сакаловай, А.Смаленчука).

[11] На тэму разумення тэрміна "прырода" ў XVIII ст. гл., напр., *Lovejoy A.O. "Nature" as aesthetic Norm // History of Ideas. – S. 69-72.*

у 1756 г. ірландцам Лаўрэнсам Дэрматам[12], які ствараў сістэму, што канкурыравала з Вялікай ложай Лондана. Кодэкс Дэрмата быў насычаны духам хрысціянства і не пакідаў ніякіх сумненняў у тым, што аўтар цалкам прымае традыцыйную рэлігію.

*Канстытуцыі* 1723 г., якія катэгарычна адвяргалі атэізм і лібертынізм, называючы іх "неразумнымі", загадвалі масонам належаць да "рэлігіі, якую прымаюць усе людзі". Што гэта за рэлігія? Мы маглі б назваць яе "рэлігіяй прыроды", бо ў кантэксце паняційнага апарату XVIII ст. у згодзе з "прыродай" знаходзіцца тое, што прымаюць усе людзі[13]. Аднак у гэтым выпадку, прызнаючы "рэлігію прыроды" за свайго роду прарэлігію, з якой выйшлі ўсе гістарычныя рэлігіі, мы павінны будзем прызнаць, што ў вачах вольных муляраў часоў Вялікай ложы гэтая рэлігія ўяўляла сабой супольны выток Старога і Новага Запаветаў, г.зн. – іўдаізма і хрысціянства. Такая выснова напрошваецца пасля вывучэння другога выдання *Канстытуцый* (1738), у якім ідзе гаворка пра тры вялікія запаветы Ноя, утвараючыя "цэмент ложы"[14].

Пастар Андэрсан згадаў тры запаветы старажытнай "рэлігіі Ноя". Аднак з тэксту *Канстытуцый* немагчыма зразумець, які іх змест. Заўважым, што ў часы Вялікай ложы ў Англіі ведалі сем запаветаў Ноя. Нямецкі масоназнаўца Эўген Ленхоф, услед за якім мы разглядаем гэтую справу, лічыць, што адпаведна пашыранаму погляду першыя шэсць запаветаў Бог абвясціў ужо Адаму[15].

Паводле гэтага абвяшчэння забаранялася: "1. ствараць ідалаў, пакланяцца статуям і абразам; 2. зневажаць Бога; 3. праліваць чужую кроў і самому рызыкаваць уласным жыццём; 4. дапускаць кровасмяшэнне і грэх садоміі; 5. красці і рабаваць" і, нарэшце, (6) прапанавалася "жыць па праўдзе і справядлівасці". Сёмы запавет атрымаў Ной ад Бога – "не ўжываць у ежу ні жывых, ні ўласнай крывёю задушаных жывёл"[16].

Запаветы Адама і Ноя прасякнуты духам рэлігійнага сінкрэтызму, таксама як *Канстытуцыі*. "Рэлігія, якую прымаюць усе людзі" на практыцы мела не дэістычны і нават не "старажытны" або "прыродны" характар, а сінкрэтычны. У сямі запаветах знаходзім рэлігійныя і этычныя прынцыпы розных гістарычных традыцый: біблейскай (г.зн. іўда-хрысціянскай), талмудычнай і

---

[12] Dermott L. Ahiman Rezon: or a Help to all that are, or would be Free and Accepted Masons. Цытата па кнізе: *Fay B. La Franc-Maçonnerie et la revolution intellectuelle du XVIII siècle. – Paris, 1935. – S. 275.* Гл. таксама трэцяе выданне *Ahiman Rezon* 1778 г. у бібліятэцы Познаньскага універсітэта.

[13] Lovejoy A.O. "Nature" as aesthetic Norm // History of Ideas. – S. 69-72.

[14] Constitutions. 1738. – S. 144.

[15] Lennhof E., Posner O. Internationales Freimaurerlexikon. – Wien, 1932 (reprint Graz, 1965). – Szp. 1122.

[16] Ibid.

сучаснай, звязанай з пратэстанцкай этыкай. Тут адсутнічае, напрыклад, характэрная для Бібліі забарона супружніцкай здрады, і адначасна прысутнічае ўзнятая пратэстантамі да найвышэйшага узроўня забарона пакланення абразам Бога і святых. Прынцып "не забівай!" быў пашыраны на яшчэ адну рацыянальную максіму – "і сам не дай сябе забіць!" Апошні прынцып быў накіраваны не столькі супраць хрысціянскай пакорлівасці, колькі супраць каталіцкага ідэала пакуты за веру. Забарона кровасмяшэння і садоміі – агульная для ўсіх вялікіх рэлігій. Таямніца ахутвае сёмы, апошні запавет, абвешчаны Ною. Ці размова ідзе пра абумоўленую клопатам пра здароўе "прыродную" забарону ўжывання мяса хворых жывёл, ці пра характэрную для Талмуда забарону ўжывання "нечыстай" ежы, г.зн. ужывання мяса жывёл, забітых з парушэннем рытуала? А можа гэта адмаўленне магіі? Гэтую праблему мы вымушаны пакінуць адкрытай.

Прапануючы сінкрэтычную, этычную "рэлігію Ноя" стваральнікі Вялікай ложы імкнуліся пакончыць з тэалагічнымі спрэчкамі паміж галоўнымі накірункамі хрысціянства, а таксама ўлагодзіць канфлікт паміж хрысціянамі і іўдзеямі[17]. Якраз гэтым тлумачыцца катэгарычная забарона абмеркавання пад час паседжанняў ложы рэлігійных праблемаў[18]. Калі ж эвалюцыя "каралеўскага майстэрства" – асабліва ў краінах кантынентальнай Еўропы – паспрыяе з'яўленню тэндэнцыі да ўтварэння супольнай для ўсіх братоў рэлігійнай прасторы, то ў кожным выпадку ў яе падмурак не ўвойдзе дэістычная канцэпцыя. Гэта будзе спецыфічная форма эзатэрычнага хрысціянства, заснаванага на традыцыі герменеўтыкі і канцэпцыі "першаснага абвяшчэння".

*Ordo in Chao* – гучаў дэвіз многіх сістэмаў вольных муляраў XVIII ст. Ён жа мае непасрэднае дачыненне да рэлігійна-этычнага аспекту ранняга брытанскага масонства. Страх перад "хаосам" – і не толькі перад сацыяльным і палітычным хаосам рэвалюцыі, але таксама перад пантэістычна-матэрыялістычнай філасофіяй вольнадумцаў – абумовіў саюз стваральнікаў *Premier Grand Lodge* з лагерам памяркоўных англіканцаў, прыхільнікаў філасофіі Ньютана[19]. З апошнімі, г.зв. "лацітударыянамі" масонаў яднала агульная мэта і агульны ідэал – захаванне сацыяльнага, палітычнага і канфесійнага (касцельнага) *status quo* шляхам дасягнення гармоніі чалавечай гісторыі і Божай арганізацыі свету. Гэтая канцэпцыя знаходзілася ў апазіцыі да праграмы Джона Толанда, Энтані Колінза і Робэрта Клейтана, якія на глебе рэлігійнага і палітычнага радыкалізму будавалі падмурак рэспубліканскай праграмы.

---

[17] Больш падрабязна аб ролі пачатковага брытанскага масонства ў пераадоленні сацыяльных канфліктаў гл.: *Jacob M.C. The Newtonians and the English Revolution 1689-1720. – Hassocks, 1976. – S. 223.*

[18] Constitutions. 1723. – S. 94.

[19] Jacob M.C. The Newtonians and the English Revolution 1689-1720. – S. 2-71, 162-200.

## "Шатландскае" масонства і культ Сярэднявечча

Сістэма Вялікай ложы з'яўлялася, як ужо адзначалася, альтэрнатывай якабіцкіх ложаў, якія захавалі архаічны рытуал цэхоў і разэнкрэйцераў XVII ст.[20] На гэтым фоне трохступенчатае масонства ў варыянце *Premier Grand Lodge* трэба прызнаць за крок наперад у накірунку рацыяналізацыі формулы. На тэрыторыі кантынентальнай Еўропы ў Францыі, у Германіі, у Польшчы сімвалы і рытуал, якія ўтваралі духоўны падмурак "каралеўскага майстэрства", значна ўзбагаціліся і ўскладніліся. Пасля пераходнага перыяду 30-х гг. XVIII ст., калі ложы з'яўляліся снабісцкай прыманкай для французскай эліты, прыблізна ў 1740 г. у дзяржаве Бурбонаў характар масонства кардынальна змяніўся. Ужо пазначаны крызіс масонства быў пераадолены дзякуючы дапаўненню трох асноўных некалькімі вышэйшымі ступенямі пасвячэння. Узнікшаму такім чынам шатландскаму масонству ("чырвонаму") спадарожнічалі дзве з'явы:

1. Нараджэнне і хуткае распаўсюджванне легенды пра рыцарскае паходжанне масонскіх таварыстваў. На другі план адышла, атрыманая ў спадчыну ад англічан, легенда пра сувязь масонства з цэхамі муляраў і архітэктараў. Пасля кавалера Эндру Рамсэя (1686-1743), які ў сваім вядомым *Discours* 1737 г. звязаў нараджэнне масонства з ерусалімскімі іанітамі, з'явіліся іншыя шматлікія версіі паходжання вольных муляраў ад рыцарскага ордэна тампліераў[21].

2. Паварот да эзатэрычнай традыцыі звычайна ў хрысціянскай, радзей у алхіміка-кабалістычнай версіі[22].

Абодва накірункі масонства, якія пэўны час развіваліся асобна (каля 1750 – каля 1770 гг.), у апошняй чвэрці XVIII ст. аб'ядналіся ў адзін эклектычны рух, які запанаваў у "каралеўскім майстэрстве" ў кантынентальнай Еўропе. Аднак перад выбухам французскай рэвалюцыі і ён перажываў упадак і дэзінтэграцыю.

Хоць "шатландскае" масонства і выкарыстала міф Э.Рамсэя пра ўласнае паходжане ад рыцарскага ордэну, аднак мэты і прынцыпы новых саюзаў разыходзіліся з інтэнцыямі аўтара *Discours*. Рамсэй стварыў вобраз наднацыянальнага саюза вучоных і дзеячоў культуры, які б выпрацаваў кодэкс усіх ведаў чалавецтва – "Універсальную бібліятэку"[23]. Гэты вобраз, безумоўна, быў узяты з распрацаванай яшчэ напачатку XVII ст. праграмы нямецкіх, а пазней англійскіх разэнкрэйцэраў, якая была часткова рэалізаваная ў 1662 г.,

---

[20] Больш падрабязна пра рытуал ложаў XVII ст. гл.: *Stevenson D. The Origins og Freemasonry Scotlands' Century. 1590-1710. – Cambridge, 1988.*

[21] Henderson G.D. Chevallier Ramsay. – London, 1962. – S. XI; Degener W. Andreas Michael Ramsays Reden über Freimaurerei. – Leipzig, 1927. – S. 29; Lennhof E., Posner O. Internationales Freimauererlexikon. – Szp. 497, 1277.

[22] Cegielski T. "Sztuka królewska" a chrześcijaństwo… – S. 735.

[23] Тэкст *Discours* гл., напр.: *Degener W. Andreas Michael Ramsays Reden… – S. 29.*

дзякуючы адкрыццю ў Лондане Акадэміі навук, *The Royal Society*[24]. Ператварэнне ложаў, паводле думкі Рамсэя, у еўрапейскую Акадэмію навук аказалася нерэальным. Ідэю Энцыклапедыі выкарысталі ў сярэдзіне стагоддзя французы. Аднак галоўная плынь вольных муляраў імкнулася да мэтаў, вельмі далёкіх ад імкненняў энцыклапедыстаў.

Статут і рытуал Саюза строгага нагляду (*Stricte Observance Templière S.O.T.*, 1751-1778), вельмі ўплывовага ў Германіі, Францыі, Італіі, а таксама ў Польшчы, уводзяць нас у свет кансерватыўнай утопіі[25]. Ужо сама мэта *S.O.T.*, вызначаная яго стваральнікам баронам Карлам Готэльфам фон Хунд унд Альтэнгроткаў (1722-1776), з'яўляецца красамоўнай – аднаўленне зліквідаванага ў часы Філіпа Прыгожага (1285-1314) ордэна тампліераў. "Рыцары Храма" ў вачах фон Хунда былі адлюстраваннем феадальнага ідэала рыцарства і пакуты за веру. Героі легенды Саюза строгага нагляду прадстаюць, як сябры наднацыянальнай, універсальнай супольнасці, незалежнай ад папства і ад свецкай улады.

Кансерватызмам быў прасякнуты не толькі дух, але і літара рыцарскай ступені. Упершыню ў гісторыі вольных муляраў быў парушаны прынцып дасканаласці і заслугаў як адзіных крытэрыяў прыёму ў братэрства і руху ў ягонай іерархіі. У статутах *S.O.T.* (і аналагічных сістэмаў) з'явіўся артыкул, які гарантаваў заняцце высокай пасады ў ордэне толькі прадстаўнікам радавітай шляхты. Рытуал уяўляў сабой суму элементаў рыцарскай культуры. Выкарыстоўвалася каляровае багатае аддзенне як успамін пра касцюмы сярэднявечча і псеўдарыцарскі цырыманіял. Адпаведна протарамантычным уяўленням рыцарам-манахам надаваліся фантастычныя тытулы, накшталт "кавалера Усходу", "Шатландскага кавалера", "Князя Усходу і Захаду", а таксама гербы і манаскія імёны. У 70-я гг. па ініцыятыве экспастара Іагана Аўгуста Старка (1741-1816) з'явілася "капланская" галіна тампліераў. Да гэтага часу дзіцячая забава ў сярэднявечных рыцараў набыла рэлігійны падтэкст, што праз чвэрць стагоддзя стане падставай для сур'ёзных абвінавачванняў з боку касцёла: масоны здзекуюцца з каталіцкага культа[26]. У той жа час "канонікі храма" Старка, таксама апранутыя ў казачнае аддзенне як

[24] На тэму ролі разэнкрэйцэраў у распаўсюджванні ідэй Энцыклапедыі і Міжнароднай Акадэміі навук гл.: *Yates F.A. The Rosicrucian Enlightenment. – London, 1972.*

[25] Frick K.R.H. Die Erleuchteten. Gnostisch-Geheimgesellschaften bis zum Ende des 18. Jahrhunderts. – Graz, 1973. – S. 214-234.

[26] Гісторыя, статут і рытуал *S.O.T.* адлюстраваныя ў выпісках з Стакгольмскага архіва капітулы саюза (Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве, Бібліятэка ардынацыі Замойскіх. Рукапіс № 913). На тэму дзейнасці І.А.Старка гл.: *Blum J. J.A.Starck et la querelle du crypto-catholicisme. – Paris, 1912; Guinet L. Zacharias Werner et l'esoterisme maçonnique. – La Haye, 1962. – S. 40-43; Frick K.R.H. Erleuchteten... – S. 246-285.* З абвінавачваннем у пародыі на каталіцкі культ выступіў эксмасон ксёндз Аўгустын Баруэль. Гл.: *Memoires pour servir a l'histoire du Jacobinisme. – Vol. 1-4. – Hamburg, 1804;* ён жа. *Swięte tajemnice Massonerii sprofanowane. – Lwów, 1805* (гэта пераклад на польскую мову *Memoires*)

"свецкая" галіна ордэну, з найглыбейшай павагай пачалі пошук таямніцаў ордэна тампліераў. Яны захоўвалі духоўную чысціню, пасціліся і вялі аскетычны вобраз жыцця[27].

Дзякуючы шматлікім інсцэнізацыям у ложах легенды пра св.Грааля, французская, нямецкая або італьянская шляхта магла назіраць сваё славутае мінулае. Завяршаўся "залаты век" гэтага класа. Усё больш выразнымі станавіліся сімптомы ўпадку. Такім чынам, рыцарская легенда не толькі задавальняла патрэбу ў экзатычнай і прывабнай прыгодзе. Яна надавала ідэалагічную легітымнасць класу, чые слабеючыя палітычныя пазіцыі больш не адпавядалі па-ранейшым высокаму сацыяльнаму прэстыжу. Культ хрысціянскага рыцарства часткова запаўняў бездань паміж ідэяй і рэчаіснасцю.

Ідэалогія Саюза строгага нагляду і блізкіх да яе арганізацый (напр., тампліераў Іагана Вільгельма Кельнэра фон Цынэндорфа (1753-1782)) таксама мела палітычны аспект. Падкрэсліванне злачыннай ролі, якую адыграла французская манархія пры ліквідацыі Ордэна тампліераў, прэтэнзія на ўтварэнне наднацыянальнай і пры гэтым незалежнай ад свецкай улады структуры, былі падмуркам антыманархічнай праграмы. *S.O.T.* была прасякнутая духам феадальнай свабоды, якая разумелася як незалежнасць ад палітычнай улады. Чыноўнай іерархіі абсалютысцкай дзяржавы супрацьстаяла іерархія, якая абапіралася на шляхецтва крыві і духа.

Верагоднасць гэтай праграме надавала таямніца. Глыбокая канспірацыя, якая ахутвала працу па адраджэнню Ордэна, значныя сумы, што збіраліся дзеля гэтай мэты, стваралі ўражанне рэальнай пагрозы свецкім уладарам на чале з дынастыяй Бурбонаў. Гістарычная і палітычная містыфікацыя, якая грунтавалася на снабізме, нявуцтве і шляхецкім імкненні вярнуць мінулае, святкавала поўны трыўмф.

Разам з рыцарамі Хунда і Цынэндорфа мы апынуліся ў лагеры апазіцыі Асветніцтву, энцыклапедыстам і "літаратурнай рэспубліцы" Вальтэра. Асветнікі асуджалі "цемру і забабоны", рэлігійнасць Сярэднявечча, саслоўныя прывілеі. Антыклерыкалізм ішоў у пары з прызнаннем крыжовых паходаў за *un crime historique de l'Eglise*, і, нарэшце, з апалогіяй тагачасных каранаваных дэспатаў.

Поспех "шатландскага" масонства быў абумоўлены не толькі фрустрацыяй дэкласаванай шляхты, якая марыла пра вяртанне ўлады. Элітарны, псеўдарыцарскі характар новых саюзаў прыцягваў да іх прагнае сацыяльнага поспеху мяшчанства. Хоць сістэма рыцарскіх ступеняў фармальна зачыняла перад мяшчанамі шлях да вышэйшых пасадаў, аднак на практыцы часта

[27] Апісанні цырыманіялу гл.: *Nettelbladt Ch.C.F.W. Geschichte der freimaurerischen Systeme in England, Frankreich und Deutschland. – Berlin, 1879 (Neudruck, 1973). – S. 318-324; Blum J. J.A.Starck... – S. 67-73.*

мелі месца выключэнні з правілаў. Самыя годныя прадстаўнікі буржуазіі дасягалі высокіх ступеняў на падставе таго ж самага прынцыпу, які дазваляў ім займаць найвышэйшыя пасады ў познефеадальных дзяржавах. Шляхта "разбройвала" сацыяльнага і ідэалагічнага праціўніка, купляючы яго і перацягваючы ў свой лагер. Шмат што залежала не толькі ад асабістых якасцяў "рыцараў-манахаў", але таксама ад сацыяльнай геаграфіі краіны, у якой дзейнічаў ордэн. У Францыі (дзе пазіцыя буржуазіі была больш моцнай, чым у Германіі і тым больш у Польшчы, а таксама ў Швейцарыі існавалі тэрытарыяльныя саюзы рыцарскіх ступеняў, у якіх пераважалі багатыя прадстаўнікі трэцяга саслоўя. Так было, напрыклад, у гандлёвым Ліоне, дзе дзейнічаў славуты правадыр вольнага мулярства вышэйшых ступеняў Жан Батыст Вілермоз (1730-1824). У якасці масона французскі фінансіст быў сябрам і дарадцам манархаў. Ягоныя веды і грошы аказалі вялікі ўплыў на галоўныя вольнамулярскія саюзы другой паловы XVIII ст.[28]

Ахутаныя таямніцай і незалежныя ад дзяржаўнай улады таварыствы вышэйшых ступеняў (таксама цалкам незалежныя ад янаўскіх масонаў) знаходзіліся на перыферыі свабоды, якую гарантавала абсалютысцкая манархія. Гэта пацвярджала таксама прысутнасць у ложах князей крыві і саміх манархаў (асабліва нямецкіх). Манархі адыгрывалі ў ложах (падобна, як і многія іншыя браты) падвойную сацыяльную ролю. Яны знаходзіліся адначасна ў двух розных сферах – рэальнай і ідэальнай, і ўсё часцей таксама – у ірэальнай. У ідэальнай – яны маглі выконваць функцыю асветнікаў, "філосафаў на троне". Гэтая роля канчалася, аднак, адначасна з выхадам з ложы. Філосаф адразу ж ператвараўся ў дэспатычнага самадзержца[29].

Ілюзію незалежнасці ад дзяржавы падтрымліваў ордэнскі характар саюзаў вышэйшых ступеняў. Многія з іх адрозніваліся адпаведнай рэлігійнай атмасферай, далёкай ад каталіцкай альбо пратэстанцкай артадаксальнасці. У такіх арганізацыях як *Elus Coëns* ("абраных мудрацоў") вольнае мулярства атаясамлівалася з "ісцінным хрысціянскім культам" – эзатэрычнай рэлігіяй абраных. Хрысціянскае масонства, уздымаючыся над канфесіямі, над звычайным трохступенчатым "блакітным" масонствам, фактычна адрывалася ад сацыяльнага і палітычнага кантэксту. Па ўзору сузіральніцкіх ордэнаў яно абяцала сваім адэптам душэўны спакой пры ўмове адыходу ад свету за кляштарныя муры. Сярод братоў такіх ложаў хапала былых авантурыстаў і прафесійных афіцэраў (напрыклад, такія стваральнікі мартынізму як Дон Марцінес дэ Паскуале і Луі Клод дэ Сэн-Сімон), бунтароў з ліку ксяндзоў і пастараў (як

[28] Joly A. Un mysique lyonnais et les secrets de la Franc-Maçonnerie. 1730-1824. – Maçon, 1938; Hammermayer L. Wilhemsbader Freimaurer-Konvent.

[29] Möller H. Die Gold- und Rosenkreuzer // Geheime Gesellschaften, hrsg. Von P.Ch.Lutz. – Heidelberg, 1979. – S. 172.

Іаган Аўгуст Старк), містыкаў і прарокаў (як Тадэвуш Грабянка, правадыр ілюмінатаў з Авіньёна)[30].

Усе гэтыя людзі, якіх тэмперамент, погляды і лёс выштурхнулі на перыферыю іерархізаванага грамадства, падзеленага саслоўна і рэлігійна, шукалі бяспечнага месца і мажлівасці самарэалізацыі ў закрытых эзатэрычных брацтвах. Рэвалюцыя канца XVIII ст., якая юрыдычна і фактычна зліквідавала шэраг сацыяльных канфліктаў і праблемаў, азначала канец рыцарскіх і эзатэрычных масонскіх саюзаў[31]. Менавіта рэвалюцыю, а не абвінавачванні і пераслед з боку каталіцкага касцёла можна лічыць галоўнай прычынай упадку "шатландскага" масонства, па меншай меры ў яго формах эпохі Асветніцтва[32]. Разам з канкрэтнай эпохай з гістарычнай арэны зышла арганізацыя, створаная гэтай эпохай.

## Рэакцыя на рыцарскае і эзатэрычнае масонства: этычнае і палітычнае масонства

Дамінаванне арыстакратычных рыцарскіх формаў, зварот да складанай для звычайнага адэпта праблематыкі эзатэрычнага хрысціянства – усё гэта нарадзіла пратэст прагматычных братоў з мяшчанскіх колаў. Напрыканцы XVIII ст. пачала вымалёўвацца новая тэндэнцыя, асабліва ў пратэстанцкай частцы Германіі: "каралеўскае майстэрства" атрымала чыста этычны характар. Вольнае мулярства стала трактавацца як свецкая версія пратэстанцкай этыкі[33].

Роўнасць і братэрства, талеранцыя і веды сталі ўспрымацца як выключна этычныя дырэктывы, пазбаўленыя канкрэтнага сацыяльнага, палітычнага або рэлігійнага зместу. Паварот да таямнічага гуманізму не абмяжоўваўся толькі сацыяльнай псіхатэрапеўтычнай функцыяй масонства. Наадварот, вольнае мулярства, не зацікаўленае "вышэйшымі" рэлігійнымі ведамі, вызваленае ад абслугоўвання класа феадалаў, больш паспяхова магло рэалізаваць сваю інтэграцыйную мэту.

---

30 Тэма мартыністаў і *Elus Coëns* падрабязна асвятляецца ў працы *Joly A. Un mysique lyonnais*... Што датычыць дзейнасці польскага масона вышэйшых ступеняў і містыка Грабянкі, гл.: *Ujejski J. Król Nowego Izraela.*

31 Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej. – S. 191-221. Аўтар акцэнтуе праблему дэзінтэграцыі вольнага мулярства як адзінага цэлага. Па-іншаму глядзіць на гэтую праблему Даніэль Лігу ў артыкуле *Французскае масонства і ўлада* (Ars Regia. – 1992. – Nr 1).

32 Тэма рэпрэсій больш падрабязна асветлена ў кнізе: *Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej.– S. 195-207.*

33 Brauweiler H. Deutsche und romanische Freimaurerei im Lichte der Religions- und Kirchengeschichte. – Gotha, 1926. – S. 6-24.




Фрагмент масонскага прывілея XX ст.

Падобную функцыю ўлагоджвання палітычных і сацыяльных канфліктаў выконвала польскае масонства. У 70-ыя гг. XVIII ст. пасля стварэння ў Варшаве Нацыянальнай ложы масонства аб'яднала ў сваіх шэрагах прадстаўнікоў вядучых і часта антаганістычных сацыяльных групаў – арыстакратыі, сярэдняй шляхты, узнікаючай інтэлігенцыі, багатага мяшчанства і *last but not least* іншаземцаў (французаў, немцаў, англічан, звычайна прадстаўнікоў трэцяга саслоўя). Пасаду Вялікага майстра займаў правадыр антыкаралеўскай і антырасейскай апазіцыі Ігнацы Патоцкі (1750-1809). Ва ўмовах ліберальнай шляхецкай дзяржавы, "загадкавыя" прынцыпы роўнасці і братэрства набывалі сацыяльны змест. Хуткая палітызацыя польскага масонства, г.зн. парушэнне асноўнага прынцыпа, які забараняў ложам займаць канкрэтную пазіцыю па палітычных пытаннях, мела сваім наступствам дэзінтэграцыю саюза ў перыяд Чатырохгадовага сейма. Трое галоўных аўтараў Канстытуцыі 3 траўня – кароль Станіслаў Аўгуст, ксёндз Сцыпіён Пятолі і Ігнацы Патоцкі – былі вольнымі мулярамі. Кожны з іх належаў да асобнай масонскай і палітычнай традыцыі. Дасягнуты кампраміс у пытаннях уладкавання Рэчы Паспалітай не з'яўляўся заслугай "каралеўскага майстэрства". Апошняе заплаціла свой кошт за вызваленне ад ранейшых абмежаванняў і парушэнне асноўных прынцыпаў.

Аналагічна развівалася гісторыя французскага масонства ў перыяд рэвалюцыі. Вольныя муляры апынуліся ва ўсіх палітычных лагерах, хоць най-

болей іх было сярод шляхецкіх эмігрантаў і ворагаў новага ладу. Да таго часу французскіе ложы не з'яўляліся палітычнай сілай насуперак пазнейшым абвінавачванням з боку каталіцкага касцёла. Неабгрунтаваныя абвінавачванні прычыніліся да фарміравання "гераічнай" масонскай легенды, якая прыпісывала масонам падрыхтоўку рэвалюцыі[34]. Тут таксама палітыка знішчыла масонства. Адроджанае Напалеонам і падпарадкаванае палітыцы імператара, яно, нягледзячы на колькасны рост, было толькі ценем (калі не карыкатурай) самога сябе. Аналагічныя вынікі прынесла "адзяржаўленне" вольнага мулярства ў Аўстрыі ў перыяд праўлення Юзафа II. Паліцыйны кантроль над ложамі, абмежаванне іх колькасці да адной у кожнай правінцыі сталі прэлюдыяй поўнай ліквідацыі ложаў пераемнікамі імператара-рэфарматара[35]. Ва ўмовах паліцыйнай манархіі Габсбургаў забарона дзейнасці ложаў была фармальнасцю. "Каралеўскае майстэрства", пазбаўленае ўласнай формы і зместу, перастала быць прыцягальнай формулай сацыяльнай актыўнасці.

Факт упадку арганізацый вольных муляраў у краінах, ахопленых рэвалюцыяй (а таксама шляхам "зверху", як у Аўстрыі) спрашчае выяўленне іх сацыяльных функцый – арбітральнай і інтэграцыйнай, а таксама ў сферы псіхікі асобы – тэрапеўтычнай. Аб'ектыўная роля руху вольных муляраў у большай ступені зводзілася да кансервацыі сацыяльнага *status quo*, чым да яго парушэння. Масонства з'яўлялася фактычным саюзнікам "старога ладу". Парадокс гісторыі заключаецца ў тым, што яго абвінавацілі якраз у знішчэнні гэтага ладу. "Віна", якую як гісторыя, так і самі вольныя муляры з часам пачалі лічыць за заслугу, абцяжарвае "каралеўскае майстэрства" па сённяшні дзень[36].

*Пераклад Алеся Смаленчука*

[34] Mellor A. Histoire de l'anticlericalisme français. Nouv. èd. – Paris, 1978. – S. 208-219; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej. – S. 191 (хоць апошні схіляецца да думкі, што вольныя муляры часцей змагаліся на рэвалюцыйным баку барыкадаў).

[35] Тэма французскага масонства перыяда I імперыі больш падрабязна асвятляецца ў артыкуле Даніэля Лігу *Французскае масонства і ўлада*. Пра рэпрэсіі ў Аўстрыі гл.: *Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej. – S. 196, 198-203.*

[36] Тэма "чорнай" і "белай" ("гераічнай") масонскай легенды падрабязна асвятляецца ў працы: *Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej.* – S. 9-12.

*Марына Сакалова (Менск)*

# Масонства як сацыяльна-культурная практыка. XVIII – XIX ст.

XVIII і XIX стагоддзі былі часам з'яўлення новых формаў культурнага і сацыяльнага жыцця, атрымаўшых у сучаснай літаратуры назву "Асветніцтва". Сімвалам эпохі лічыцца французская энцыклапедыя. Аднак, як адзначыў Аласдэр Макінтайр, самі французы часта прызнавалі ў якасці пэўнага ўзора Асветніцтва англійскую мадэль. Філосаф тлумачыў гэта тым, што ў французаў адсутнічаў універсітэт новага тыпу і не было секулярызаванага пратэстанцкага фона, г.зн. шырокага сацыяльнага слоя чытаючай публікі[1]. Трэба прызнаць правату даследчыка, бо, як вядома, менавіта ў Англіі раней, чым у іншых еўрапейскіх краінах склаліся эканамічныя, палітычныя і юрыдычныя ўмовы, неабходныя для ўзнікнення новых сацыяльна-культурных практык, у т.л. і масонства.

У выніку сацыяльна-палітычных трансфармацый (сацыяльнай і прамысловай рэвалюцый) адбывалася секулярызацыя[2] і палітызацыя грамадскага жыцця. Нават рамеснікі і сяляне праяўлялі цікавасць да дзеянняў урада і разумелі важнасць удзелу ў палітыцы. "Бальшыня рамеснікаў пачынае дзень з наведвання кавярні, каб пачытаць там газету. Я часта бачыў, што чысцільнікі абутку ды іншы гэткі ж люд збіраюцца, купляюць газету за *liard* кожны дзень і чытаюць яе", – так характарызаваў Лондан у 1726 г. адзін з яго жыхароў[3]. У сваю чаргу, палітызацыя і секулярызацыя спрыялі таму, што постпрыдворнае і постклерыкальнае грамадства пазбаўлялася выразных сацыяльна-культурных дэтэрмінуючых каардынатаў[4].

Прасторай, у якой ствараліся новыя каардынаты стала "публічная сфера". Па вызначэнню Юргена Хабэрмаса, "публічная сфера – гэта форум, на які людзі (у якасці прыватных асобаў, пазбаўленых статуса ў дзяржаўнай іерархіі) збіраюцца разам, фарміруючы такім чынам грамадскасць (a public).

---

[1] Макинтайр А. После добродетели. – Москва, 2000. – С. 55-56.

[2] П.Бэрк вызначае секулярызацыю як "выяўленне спадзяванняў і страхаў у свецкіх паняццях, відавочнае змяншэнне ролі звышнатуральнага" (Бэрк П. Народная культура Эўропы ранняга новага часу. – Мінск, 1999. – С. 290).

[3] Цыт. па: Бэрк П. Народная культура Эўропы ранняга новага часу. – Мінск, 1999. – С. 296.

[4] Brewer J. "The most polite and the most vicious". Attitudes towards culture and commodity. 1600-1800 // The Consumption of Culture 1600-1800: Image, Object, Text. Ed. by A.Berminghem and J.Brewer. – London-New York, 1995. – P. 341-361.

Пры гэтым яны гатовыя падпарадкоўвацца аўтарытэту грамадства ў абмен на прызнанне сябе з боку грамадскага меркавання"[5]. Ю.Хабэрмас разглядаў феномен "публічнай сферы" ў сэнсе пэўнага месца (таму і сам тэрмін "форум" не выпадковы і адсылае да свайго першапачатковага значэння), якое належыць ужо не "двару", а "гораду" і рэалізуецца ў форме разнастайных інстытутаў, такіх як клубы, салоны, гурткі наведвальнікаў кавярняў і масонскія ложы[6].

Па меркаванню Ю.Хабэрмаса, гэтыя інстытуты характарызаваліся некалькімі адметнымі рысамі. Па-першае, яны прадуцыравалі этас роўнасці, свядома не звяртаючы ўвагу на розны сацыяльны статус сваіх сяброў. Па-другое, хоць гэтыя інстытуты не з'яўляліся эквівалентам уласнага грамадства, тым не менш сацыяльныя дыскурсы, якія яны нараджалі самі прэтэндавалі на вызначэнне грамадскіх аўтарытэтаў. Яны лічылі, што публічная сфера патэнцыяльна ці рэальна ўключае ўсю грамадскую прастору, хоць на практыцы яна датычыла толькі мужчынаў, якія валодалі маёмасцю[7]. Па-трэцяе, тут абмяркоўваліся палітычныя і этычныя пытанні, якія раней былі "таямніцай" двара і царквы. Яшчэ адной прыкметай публічнай сферы стаўся перыядычны друк. Гэты прынцыпова новы спосаб артыкуляцыі грамадскіх патрабаванняў і інтарэсаў атрымаў у Англіі з пачатку XVIII ст. хуткае развіццё[8].

Класічным прадуктам трансфармацыі практыкі сацыяльнага жыцця Брытаніі XVII – XVIII ст. стала стварэнне клубаў. Гэтаму своеасабліваму інстытуту, які ў слоўніку Уільяма Джонсана (1746-1794) быў вызначаны, як "збор прыемных суразмоўцаў у пэўных умовах", не было аналагаў у кантынентальнай Еўропе. Клубы служылі вузлавымі цэнтрамі асэнсавання навінаў, выпрацоўкі ідэяў, развіцця кантактаў. Яны садзейнічалі развіццю грамадскіх сувязяў, вызначалі сферы інтарэсаў, давалі магчымасць адчуць прыналежнасць да агульнай справы і тым самым станавіліся вырашальнымі фактарамі фарміравання грамадскай сферы[9].

Разам з тым, сацыяльныя і палітычныя перамены спрыялі росту сацыяльнай мабільнасці і зменьвалі спосабы легітымацыі эліты. Сацыяльная ідэнтыфікацыя набывала дынамічны характар і патрабавала стварэння такіх мадэляў, якія маглі б улічваць прагматыку адаптацыі "Я" да зменлівых сацыяльных умоваў. Стала неабходнай выпрацоўка культурных сродкаў, якія б надзя-

---

[5] Habermas J. The Structural Transformation of the Public Sphere: An Inquiry into a Category of Bourgeuos Society. – Cambridge, 1989. – P. 25.

[6] Ibid. P. 30-36.

[7] Brewer J. "The most polite and the most vicious"... – P. 343

[8] Habermas J. The Structural Transformation of the Public Sphere. – P. 36-44

[9] Падрабязна пра гэта гл.: *Clark P. British Clubs and Societies. 1580-1800: The Origins of an Associational World. – Oxford, 2000; Porter R. Origin and History of English Clubs // London Review of Books. 2000. June 22.*

лялі сацыяльную мабільнасць і сацыяльны поспех адпаведнай рыторыкай самарэпрэзентацыі і станавіліся механізмам, які б забяспечваў такі поспех[10]. Усё гэта давалі асаблівасці клубнага жыцця – падпарадкаванне фармальным правілам паводзінаў і рытуалам, філантрапічныя жэсты ды інш. У рамках новай сацыяльна-палітычнай практыкі клубнага жыцця Брытаніі XVIII ст. і ўзніклі першыя масонскія ложы.

Рэальная гісторыя сучаснага спекулятыўнага масонства пачынаецца 24 чэрвеня 1717 г.[11], калі ў лонданскай таверне "Гусь і верцел" была створана "Вялікая ложа Англіі". Спачатку новае аб'яднанне, сходы якога адбываліся адзін раз на год – 24 чэрвеня (Янаў дзень) – нічым не адрознівалася ад іншых шматлікіх лонданскіх клубаў. Але ўступленне ў ложу святара і дэманстратара Лонданскага Каралеўскага таварыства развіцця ведаў пра прыроду знакамітага публічнага лектара і сябра Ісаака Ньютана Тэафіла Дэзагюлье (1683-1744) цалкам змяніла сітуацыю. Вядомы ў прыдворных колах навуковец і прапаведнік здолеў прыцягнуць у ложу знатных арыстакратаў і ўвёў у практыку паседжанняў выказванне прамоваў. Ідэі эксперыментальнай філасофіі і ньютаніянскай "натуральнай рэлігіі", якія былі надзвычай папулярнымі сярод адукаваных жыхароў Лондана таго часу, таксама спрыялі пашырэнню цікавасці да масонскіх ложаў[12]. На паседжанні 24 чэрвеня 1721 г. Вялікім майстрам ложы быў абраны герцаг Мантэгю, пра што паведамілі лонданскія газеты.

Папулярнасць масонства хутка расла. У 1725 г. у Брытаніі налічваліся 52 ложы, у 1786 г. – амаль 300 (з іх 87 у Лондане), а ў 1800 г. – больш за 800[13]. У 1721 г. прэсвітэрыянскі пастар Джэймс Андэрсан (1680-1739) склаў кодэкс масонскіх статутаў, вядомы пад назвай *Новая кніга канстытуцый*. Яна была надрукаваная ў 1723 г. *Канстытуцыі* Д.Андэрсана сталі асновай усіх пазнейшых масонскіх статутаў. Але запаветы (*landmark*) набывалі моц закона толькі, калі ўваходзілі ў кнігу канстытуцый кожнай ложы. Агульнапрынятымі і аба-

[10] Klein L. Politness for Plebs. Consumption and Social Identity in earle 18lh century England // The Consuption of Culture 1600-1800: Image, Object, Text. Ed. by A.Berminghem and J. Brewer. – London-New York, 1995. – P. 363.

[11] Існуе некалькі дзясяткаў версій паходжання масонства. Адны з іх заснаваныя на легендах (з часоў цара Саламона, Эўкліда і Піфагора), другія – на тэксце свяшчэннага пісання (ад часоў стварэння свету, ад Маісея і г.д.), трэція – на падабенстве сімволікі (першыя масоны – эсэны, халдзеі, друіды). Даволі папулярныя версіі паходжання масонства ад ваенна-рыцарскіх ордэнаў (разэнкрэйцэры, крыжаносцы, тампліеры) і ад аб'яднанняў рамеснікаў – муляраў (гільдыі каменацёсаў у Італіі, Францыі, Германіі; англійскіх і шатландскіх аператыўных масонаў; аб'яднання муляраў, створанага архітэктарам сэрам Крыстаферам Рэнам пры будаўніцтве сабора св. Паўла ў Лондане і г.д). Існуюць г.зв. "палітычныя" версіі пра стварэнне масонства Аліверам Кромвелем або прыхільнікамі рэстаўрацыі Сцюартаў. Нарэшце, стварэнне масонства тлумачыцца як ініцыятыва асобных дзеячоў, напр., Фрэнсіса Бэкана або Тэафіла Дэзагюлье.

[12] Jacob M. The Newtonians and the English Revolution. 1689-1720. – New York, 1976.

[13] Clark P. British Clubs and Societies. 1580-1800... – P. 128.

вязковымі для рэгулярных масонскіх ложаў[14] былі толькі першы і шосты пункты канстытуцый Д.Андэрсана – "Пра Бога і рэлігію" і "Пра паводзіны".

Агульнапрызнана, што франкмасонства запазычыла прынцыпы арганізацыі і сімвалы ў сярэднявечных цэхаў прафесійных муляраў. Аднак не меншую ролю ў інстытуалізацыі масонскай практыкі адыгралі ўзоры дзейнасці Лонданскага Каралеўскага таварыства развіцця ведаў пра прыроду, заснаванага ў 1660 г. Рэгулярная публічная дзейнасць калектыўнага органа, стала прыкладам таго, як арганізаваная супольнасць, імкнучыся да ісціны, можа пераадольваць рознагалоссі і памылкі, змагацца з дагматызмам і тыраніяй. Падставай быў прынцып доказу ўласнай праваты выключна абапіраючыся на довады розума і паказанні прыбораў[15]. Некаторыя прыхільнікі навуковых дыскусій, эксперыментаў і матэматычных доказаў (у асноўным з ліку тэолагаў) пісалі, што бачаць у гэтым Таварыстве прататып новай царквы, якая выратуе свет. Яны прапаноўвалі "аб'яднаць эксперыментальную лабараторыю з алтаром"[16]. Нядзіўна, што сярод 200 вядомых у 20-х гг. XVIII ст. лонданскіх масонаў чвэрць уваходзіла ў Каралеўскае таварыства[17].

На стадыі станаўлення "спекулятыўнага" масонства на яго арганізацыйныя формы паўплывалі апісанні тайных таварystваў у працах англійскага філосафа і палітычнага дзеяча Фрэнсіса Бэкана (1561-1626). У "Новай Атлантыдзе" Ф.Бэкан апісваў дзейнасць грандыёзнага навуковага ордэна "Дом Саламона", які меў жорсткі іерархічны лад і прадугледжваў удзел вялікай колькасці асобаў з самых розных сацыяльных слаёў. Паводле меркавання Ф.Бэкана, дзейнасць "Дома Саламона" павінна была мець замкнёны характар і засноўвацца на пэўных рытуалах. У "Новай Атлантыдзе" быў артыкуляваны прынцып сакрэтнасці, які адрозніваўся ад эзатэрызма акультных тайных ведаў[18].

Першапачатковай асновай масонства сталі рэлігійная цярпімасць, эксперыменталізм, ньютаніанская "натуральная рэлігія", лаяльнасць да ўлады, а з пункту гледжання арганізацыйнага – рытуалы і сімволіка сярэднявечных гільдый муляраў і бэканаўскае ўяўленне пра "навуковы ордэн". Для англійскай сістэмы масонства ("блакітнае" ці янаўскае) былі характэрнымі прастата формаў арганізацыі, акцэнт на маральныя каштоўнасці, касмапалітычная ідэя

[14] Рэгулярная ложа – гэта ложа, якая працуе на падставе хартыі, атрыманай ад законнай масонскай улады. Звычайна, гэта адна з Вялікіх ложаў.

[15] Менцин Ю. Лаборатория и парламент (у истоков современной политической культуры Запада) // Вопросы истории естествознания, науки и техники. – 1993. – № 4.

[16] Shapin S., Shaffer S. Leviafan and Air Pump: Hobbes, Boyle and the Experimental Life. – Princeton, 1985. – P. 319.

[17] Clark J. The Royal Society and Early Grand Lodge Freemasonry // Ars Quator Coronatorum. – 1967. – V. 80. – P. 110-119.

[18] Бэкон Ф. Новая Атлантида. Сочинения. – Т. 2. – Москва, 1978. – С. 483-518.

братэрства ўсяго чалавецтва, прызнанне роўнасці людзей усіх класаў, нацый, рэлігій і прафесій, рацыяналізм[19].

Папулярнае ў Англіі і Шатландыі масонства хутка распаўсюдзілася па заходняй і паўночнай Еўропе. У 1728 г. ложы англійскага ўзору з'явіліся ў Мадрыдзе, у 1732 г. – у Парыжы, у 1733 г. – у Гамбургу, у 1735 г. – у Рыме, у 1734 – 1749 гг. – у Нідэрландах, Швецыі, Даніі і Нарвегіі[20].

Распаўсюджванне вяло да з'яўлення разбежнасцяў у разуменні задачаў і мэтаў масонства, спрыяла фарміраванню розных плыняў. Прыхільнікі кожнай з іх стваралі сваю, як правіла, легендарную гісторыю і выпрацоўвалі ўласныя сістэмы ўнутранай арганізацыі, сімвалы і рэлігійна-філасофскія прынцыпы. Узнікалі сістэмы[21], якія атрымлівалі назву або ў залежнасці ад краіны, дзе яны нарадзіліся і развіваліся (англійская, французская, шведская), або ў гонар галоўнага арганізатара і ініцыятара (сістэмы Сен-Мартэна, Цынэндорфа ды інш.). Назва сістэмы магла ўказваць на мэты і характар "працаў", напр., сістэма "духоўнага рыцарства". Адныя масоны звязвалі сваю дзейнасць з сярэднявечнымі рыцарскімі ордэнамі, у прыватнасці, з ордэнам тампліераў, які ўзнік у 1118 г. і быў зліквідаваны папай рымскім на падставе фальшывых абвінавачванняў у 1312 г.[22] Другія распаўсюджвалі версію пра нараджэнне масонства падчас крыжовых паходаў і салідарызаваліся з Мальційскім духоўна-рыцарскім ордэнам[23]. Трэція лічылі сябе паслядоўнікамі легендарнага Хрысціяна Разэнкрэйцэра[24].

---

[19] Трэба адзначыць, што рацыяналізм "эксперыментатараў" спалучаўся з глыбокай рэлігійнасцю і нават містыцызмам (Гл.: *Christiansen G.E. In the Presence of the Creator: Isaac Newton and His Times. – New York, 1984*).

[20] Шустер Г. История тайных союзов. – Т. 2. – Москва, 1996. – С. 63-70.

[21] Янаўскае трохступенчатае масонства (вучань, падмайстар або чаляднік, майстар) дапоўнілася рыцарскімі ступенямі, а ўзвядзенне ў іх суправаджалася ўрачыстасцямі. 33 масонскія ступені (градусы) падзяляліся на сімвалічныя ("блакітнае масонства", якое мае 3 ступені), сярэднія ці капітулярныя ("чырвонае масонства" – з 4-й па 18-ю ступень, 18 ступень – разэнкрэйцэрская), філасофскія ("чорнае масонства", якое складаюць ступені з 19 па 29) і адміністратыўныя ("белае масонства" – 30-33 ступені). У ступені з 4 па 18-ю масоны ўзводзяцца капітулам, у ступені з 19 па 30-ю – арэапагам. Рытуальныя Рады па ўзвядзенню ў ступені, наступныя за янаўскімі, звычайна называюць шатландскімі. У большасці сістэмаў з высокімі ступенямі яны былі пераходнымі да рыцарскіх, тампліерскіх і разэнкрэйцэрскіх. У шатландскіх ступенях пачыналіся "ўяўныя працы" (герметычная філасофія і тэасофія). У рыцарскіх ступенях рыхтаваліся да барацьбы з сусветным злом. І, нарэшце, ступені "Крыжа і ружы" вучылі кабале, магіі і нават практычнай алхіміі (Гл.: *Mackey A. The History of Freemasonry, Its legends and Traditions, Its Chronological History. – N.Y., 1996; Encyclopedia of Freemasonry: And its Kindred Sciences Comprising the Whole Range of Arts, Sciences and Literature as Connected with the Institution. – N.Y., 1991*, а таксама *Соколовская Т. Масонские системы // История масонства. – Смоленск, 2002. – С. 315-348*).

[22] Мельвиль М. История ордена Тамплиеров. – Санкт-Петербург, 1999.

[23] Антошевский И.К. Державный Орден святого Иоанна Иерусалимского, именуемый Мальтийским в России. – Санкт-Петербург, 1914

[24] Йейтес Ф. Розенкрейцерское просвещение. – Москва, 1999. – С. 67-68.

У каталіцкіх краінах, перш за ўсё ў Францыі і Італіі, дзе масоны падвяргаліся наймацнейшаму ціску з боку царквы і дзяржавы, у рэшце рэшт перамаглі радыкальныя сацыяльна-палітычныя тэндэнцыі. У 1877 г. "Вялікі ўсход Францыі" адмяніў рытуальную формулу аб прызнанні Вялікага Будаўніка сусвету. Фактычна, гэта азначала адмаўленне ад веры ў Бога і бессмяротнасць душы. У першым пункце канстытуцыі Вялікага ўсхода адзначалася: "Франкмасонства суцэльна з'яўляецца філантрапічнай і прагрэсіўнай установай, якая лічыць сваей мэтай пошукі ісціны, вывучэнне сусветнай маралі, навук, мастацтваў і ажыццяўленне дабрачыннасці. Яго прыкметамі з'яўляюцца поўная свабода сумлення і салідарнасць людзей. Яно нікога не выключае за перакананні і мае дэвізам свабоду, роўнасць і братэрства"[25]. Аднак не ўсё французскае масонства развівалася ў гэтым напрамку. У 1894 г. была створана "Вялікая ложа Францыі", якая працавала па Старажытнаму шатландскаму абраду. Палітычная дзейнасць не ўхвалялася, затое распаўсюдзіліся акультызм, містыцызм і тэасофія[26].

У тых краінах, дзе "асвечаны дэспатызм" пачаў умешвацца ў функцыянаванне традыцыйных структур грамадства, арыстакратыя адчувала пагрозу сваім прынцыпам і статусу. Гэта спрыяла з'яўленню тых формаў масонства, якія падкрэслівалі высакародства і перадачу старажытнай мудрасці. Фарміраванне ірацыяналістычных тэндэнцый як рэакцыі на рацыяналізм Асветніцтва прыводзіла да захаплення акультызмам і алхіміяй. Містыка, якая спачатку не адыгрывала значнай ролі, паступова пранікла ў ложы. Напр., у Германіі было распаўсюджана масонства разэнкрэйцэрскага тыпу, арыентаванае на строгую дысцыпліну ў духе рыцарскіх ордэнаў. Масонскія ложы, якія прызнавалі "рыцарскія ступені", галоўным сваім заняткам лічылі вывучэнне герметычнай філасофіі і алхіміі і вызначаліся пышнай абраднасцю. На чале ложаў ордэна "Залатаружовага крыжа", які аформіўся ў 1782 г., стаялі, як правіла, тайныя кіраўнікі з неабмежаванымі паўнамоцтвамі[27].

Першая паўночнаамерыканская Вялікая ложа была створана Бенджамінам Франклінам (1706-1790) у 1731 г. у Філадэльфіі. Напярэдадні амерыканскай рэвалюцыі налічвалася ўжо 8 Вялікіх ложаў[28]. Амерыканскія даследчыкі лічаць, што адносіны, якія ўсталёўваліся паміж "братамі" сталі падмуркам фарміравання амерыканскай нацыі. Менавіта масонскія ложы сталі тым кантынуумам, дзе адбываўся пераход ад кроўных (прымусовых) да дабраахвот-

[25] Соловьёв О. Русское масонство. 1730-1917 гг. – Москва, 1993. – С. 149.

[26] Рубинский Ю. Масоны во Франции (вчера и сегодня) // Вопросы истории. – 1976. – № 9. – С. 143; Морамарко М. Масонство в прошлом и настоящем. – Москва, 1990. – С. 163.

[27] Соколовская Т.О. Масонские системы // Масонство в его прошлом и настоящем. – Т. 2. – Изд. 2-е. – Москва, 1991. – С. 72, 74.

[28] Херасков И.М. Масонство в Северо-Американских Соединённых Штатах // Масонство в его прошлом и настоящем. – Т. 2. – Москва, 1991. – С. 245-251.

ных сувязяў[29]. Калі на першым этапе (1717-1752) амерыканскае масонства было сродкам вылучэння арыстакратыі і легітымізацыі эліты, то ў 1752 – 1792 гг. адбываецца дэмакратызацыя амерыканскага масонства. Найбольшую ролю ў фарміраванні культуры дэмакратыі і індывідуалізму ў Паўночнай Амерыцы масонства адыгрывала ў 1790 – 1826 гг. З 1826 г. пачынаецца заняпад масонства, яго адыход у сферу прыватнага жыцця[30].

У Расейскай імперыі ў канцы XVIII ст. было 130 ложаў. Тут існавалі як прыхільнікі англійскага масонства першых трох ступеняў, так і паслядоўнікі шведскай сістэмы і разэнкрэйцэрства[31].

Першыя ложы ў Рэчы Паспалітай таксама ўзніклі ў канцы XVIII ст. Адбылося гэта ў перыяд праўлення Аўгуста III (1733-1763), а ў 1784 г. польскія ложы аб'ядналіся ў "Вялікі ўсход Каралеўства Польскага і ВКЛ". Менавіта яму падпарадкоўваліся ложы, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі. У сярэдзіне 1821 г. масонскія ложы існавалі ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі і Літвы, а таксама ў Нясвіжы, Навагрудку і Слуцку. Па некаторых дадзеных, яны аб'ядноўвалі каля 800 чал.[32] Большасць беларускіх і літоўскіх масонаў складалася з буйных землеўласнікаў і арыстакратыі. Разам з тым у склад ложаў уваходзілі афіцэры, прадстаўнікі "свабодных прафесій" (настаўнікі, адвакаты і г.д.), чыноўнікі. "Па ўсёй Літве кожны хоць колькі-небудзь дастойны чалавек, да якога б класа грамадства ён не належыў (акрамя яўрэяў), клапаціўся атрымаць слаўнае ў той час імя масона, якое гэтак жа легка атрымліваў", – успамінаў тыя часы Ян Ходзька (1777-1851)[33].

Масоны прытрымліваліся ў цэлым памяркоўных сацыяльных і палітычных поглядаў і падкрэслівалі неабходнасць спалучэння свабоды і роўнасці з павагай да парадка і палітычнай лаяльнасцю. Адыход ад масонства арыстакратыі і наплыў дробнага і сярэдняга дваранства, садзейнічаў развіццю рацыяналістычных тэндэнцый у беларуска-літоўскім масонстве. Віленскія масоны Якуб Шымкевіч (1774-1818) і Казімір Контрым (1776-1836), якія вялі барацьбу з абскурантызмам з "пазіцый прагрэса", у 1818 г. выступілі з праграмай рэформы масонства. Яны крытыкавалі масонскую абраднасць, тайныя рытуалы і прапаноўвалі ператварыць масонскія ложы ў адкрытыя навукова-дабрачынныя таварыствы. Гэтая праграма не атрымала агульнага ўхвалення. Аднак частка братоў ложы "Руплівы ліцьвін", перш за ўсё выкладчыкі уні-

[29] Davis M. Nineteenth Century Rhetorics of American Brotherhood. – Washington, 2000. – 250 p.

[30] Bullock S. Revolutionary Brotherhood: Freemasonry and Transformation of the American Social Order. 1730-1840. – University of Northen California, 1996.

[31] Серков А.И. Русское масонство. 1731-2000. – Москва, 2001; яго ж. История русского масонства. 1845-1945. – Санкт-Петербург, 1997.

[32] Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII-XIX wieku. – Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk-Łódź, 1982. – S. 273-274.

[33] Цыт. па: Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej... – S. 278.

версітэту і “асобы свабодных прафесій”, заснавалі новую ложу. У ёй займаліся навукай і імкнуліся праз асвету дасягнуць усеагульнага дабра[34]. Гэтая ложа праіснавала каля года. У 1820 г. расейскія ўлады забаранілі друкаваць масонскія тэксты. 1 жніўня 1821 г. быў выданы імператарскі Указ пра скасаванне масонскіх ложаў і іншых тайных таварыстваў, які на доўгі час прыпыніў дзейнасць масонаў у Беларусі[35]. Аднаўленне ложаў адносіцца да пачатку XX ст., калі маніфест 17 кастрычніка 1905 г. абвясціў свабоду сходаў і саюзаў. У 1910 г. у Менску была створана масонская ложа, з якой звязаны пачатак адраджэння масонства на беларуска-літоўскіх землях. Новыя ложы былі больш дэмакратычнымі і палітызаванымі. Часта яны адыгрывалі ролю міжпартыйных дыскусійных клубаў[36].

Такім чынам, кароткі агляд гісторыі масонства XVIII – XIX ст. паказвае, што погляды масонаў на свет і чалавека змяняліся ў залежнасці ад ордэнскіх сістэмаў, ад канкрэтных сацыяльных і палітычных умоваў той ці іншай эпохі. Што ж дае магчымасць разглядаць масонства як суцэльную тэндэнцыю? Іншымі словамі, ці можна вылучыць пэўную ідэалогію масонства? Большасць даследчыкаў адзначае, што адэпты масонства звязаныя паміж сабой агульнымі маральнымі прынцыпамі, ідэаламі маральнага самаўдасканалення. Так, расейскі гісторык С.Карпачоў вызначыў масонства як “сукупнасць філасофска-эстэтычных, сацыяльна-палітычных з’яваў грамадскага і інтэлектуальнага жыцця, заснаваных на пэўных арганізацыйных прынцыпах і прад’яўляючых сваім сябрам пэўныя этычныя патрабаванні”[37].

Гэтае тлумачэнне не дазваляе зразумець значнасць той ролі, якую адыграла масонства ў сацыяльным жыцці розных краінаў у XVIII – XIX ст. Трэба згадаць, што менавіта тады пачала фарміравацца “мараль” у сучасным сэнсе гэтага паняцця, г.зн. як правілы паводзінаў, якія не з’яўляюцца ні тэалагічнымі, ні палітычнымі, ні эстэтычнымі, а ствараюць і займаюць асобную культурную прастору[38]. Індывідум, вызвалены ад традыцыйных саслоўна-карпаратыўных формаў салідарнасці, становіцца маральным і аўтаномным суб’ектам. Пры гэтым змяняецца не толькі і не столькі яго статус, колькі прырода сацыяльных сувязяў. Цяпер асновай сацыяльнага яднання становіцца не пры-

[34] Добрянский С.Ф. Масонские ложи в Литве // Зап. Северо-зап. отд-ния Императ. Рус. географ. о-ва. – Вильно. 1913. – Кн. 4. – С. 103-135; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej... – S. 287.

[35] Полное собрание законов Российской империи. Собр. 1-е с 1649 по 12 дек 1825 г.: В 45 т. – Санкт-Петербург. – Т. 38. – 1847. – № 29151.

[36] Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-1917. – Гродна, 2001. – С. 173-176.

[37] Карпачёв С. Краткий очерк истории западноевропейского и русского масонства XVII-XIX в. // Масонство и масоны. Сб. статей. – Москва, 1997. – С. 4.

[38] Макинтайр А. После добродетели. – С. 57.



Віленскі універсітэт. XIX ст. Гравюра.

належнасць да двара, саслоўя і г.д., а перакананні. Масонства стала той субкультурай, якая ператварала кагнітыўныя змены ў практыку сацыяльнага жыцця. Амерыканская даследчыца М.Джэйкабс адзначала, што масонства выконвала ролю маста паміж "высокім" і "нізкім" Асветніцтвам і садзейніча-

ла пранікненню асветніцкіх ідэяў і каштоўнасцяў у масавую свядомасць і паўсядзённую сацыяльную практыку[39].

Акрамя таго, у перыяд мадэрнізацыі, калі адныя інстытуцыянальныя формы сацыяльнага яднання былі разбураны, а іншыя яшчэ не сфарміраваліся, масонства дазваляла ажыццяўляць нефармальны абарот "сацыяльнага капітала" і кампенсавала нарматыўны вакуум[40]. І, нарэшце, сяброўства ў ложах працавала як пэўны адаптацыйны механізм. Ложа была духоўным "оазісам" у гетэрагенным і зменлівым свеце, служыла інстытутам, які нёс этас капіталізму і ў той жа час дапамагаў прыстасавацца да яго, ствараючы "ценявыя формы" салідарнасці. Вельмі трапна гэтую спецыфіку масонства ахарактарызаваў французскі гісторык Р.Алеві. Ён пісаў, што "туманная ідэалогія" масонства "мела, па меншай меры, уласную аўтаномію, якую за ёй не заўсёды прызнаюць. Яна была асноўным прынцыпам, інтэлектуальным абгрунтаваннем дабраахвотнай асацыяцыі, якую "браты" не пераставалі перапрацоўваць унутры ложаў. Іншымі словамі, яе значэнне дэтэрмінуецца не столькі зместам, колькі сацыяльнай роллю. Яе кожны раз нанова фармулявалі, перакройвалі і прыстасоўвалі для выкарыстання ў розных абставінах і розных мэтах"[41]. Масонства функцыянавала як экран для праектавання страхаў і надзеяў, якія адлюстроўвалі праблемы кожнага перыяду[42]. Іншымі словамі, у XVIII – XIX ст. ложы былі пляцоўкамі фарміравання грамадскасці і грамадскага меркавання, анклавамі станаўлення грамадзянскай супольнасці, дзе ствараліся новыя формы самакіравання[43].

З канца XIX ст. у працэсе структурнай трансфармацыі публічнай сферы, развіцця дэмакратычных установаў, фарміравання грамадскіх рухаў і арганізацыі палітычных партый ствараліся новыя сацыяльна-культурныя практыкі, якія ў большай ступені адпавядалі новай сітуацыі. Аднак масонства і да нашага часу захавала за сабой статус і ролю грамадскага клуба і пляцоўкі фарміравання грамадскасці.

---

[39] Jacobs M. Living the Enlightenment. Freemasonry and Politics in Eighteenth Century Europe, 1992.– P. 214, 222.

[40] Пра сацыяльны капітал гл.: *Coleman J. Foundations of Social Theory. – Cambridge, 1990; Бурдье П. Социология политики. – Москва, 1993.*

[41] Halevi R. Les Loges Masoniques dans la France d'Ancien Regime: aux origins de la sociabilite democratique. – Paris, 1984. – P. 145.

[42] Smith D. Working the Rough Stone: Freemasonry and Society in the Eighteenth Century Russia. – Northen Illinois, 1999. – P. 170-171.

[43] Jacobs M. Living the Enlightenment...; Harl and-Jacobs J. The Essential Link Freemasonry and British Imperialism, 1751-1918. Duke University, 2000; Davis M. 19 Century Rhetorics of American Brotherhood. Washington, 2000; Kappiel F. Mystic Ties of Brotherhood: Freemasonry, Roylty and Ritual in Hawaii. – Hawaii, 1998.

*Вячаслаў Швед (Гародня)*

# Масонскія ложы на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.)

Масонства нарадзілася напачатку XVIII ст. у Англіі. 24 чэрвеня 1717 г. у Лондане арганізавалася першая Вялікая ложа, якая і стала крыніцай масонства на ўсім свеце. Спачатку яно перанеслася ў Германію (першая ложа ўзнікла ў 1733 г.), затым у Амерыку (1734), Італію (1735) і Францыю (1736)[1].

Пад юрысдыкцыяй Вялікай ложы Англіі масонства ў XVIII ст. пранікла ў Расейскую імперыю. Паводле гістарычных дакументаў (1731), Вялікім майстрам у Расеі быў прызначаны капітан Джон Філіпс. У 1765 г. у Санкт-Пецярбургу была створана аўтаномная структура кіраўніцтва. Асобна падкрэслім, што ядром новай масонскай арганізацыі была група каталікоў. Пры Кацярыне II масонства перажыло свой "залаты век", але гэтая ж імператрыца Указам ад 1 жніўня 1792 г. забараніла яго[2].

Першыя масонскія ложы на тэрыторыі Беларусі з'явіліся яшчэ ў "кацярынінскія часы" (гл. *Дадатак*). На жаль, сведчанняў пра іх няшмат. 22 траўня 1770 г. у Магілёве пачала свае працы ложа "Двух арлоў". У 1776 г. (ці 1777 г.) прафесар Маскоўскага універсітэту Іаган Шварц з дазволу Вялікага майстра расейскіх ложаў Івана Ялагіна заснаваў у Магілёве ложу "Геркулес у калысцы". Пазней яе майстрам быў А.І.Вяроўкін. Працавала ложа па г.зв. "ялагінскай сістэме"*. У 1784 г. яна ўвайшла ў Правінцыяльную ложу ў Маскве. У

---

[1] Морамарко М. Масонство в прошлом и настоящем. – М.: Прогресс, 1990. – С. 102; Małachowski-Łempicki St. Wykaz Polskich loż wolnomularskich oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum komisji historycznej Polskiej Akademii Umiejętności. – T. 14. – Kraków, 1930. – № 14. – S. 116.

[2] Башилов Б. История русского масонства. – Москва: МПКП "Русло", 1993. – С. 142; Морамарко М. Масонство в прошлом и настоящем. – С. 119-120; Уколова В. Под покровом масонской тайны // Наука и жизнь. – 1990. – С. 121.

* "Ялагінская сістэма" была распрацаваная сенатарам І.Ялагіным па ўзору "англійскай": да трох "янаўскіх" ступеняў (вучань, чаляднік і майстар) дадавалася невызначаная колькасць вышэйшых ступеняў. Вольныя муляры займаліся "разумовымі працамі" на аснове герметычнай філасофіі або тэасофіі [Масонство в его прошлом и настоящем. – М., 1915. – Т. 2. – С. 78-79]. Таксама існавала "шведска-нямецкая сістэма" "Строгага нагляду" ("Stricte Observanz"), якая прадугледжвала англійскае масонства для першых трох ступеняў і разэнкрэйцарства для вышэйшых. Тры "янаўскія" ступені дапаўняліся трымя вышэйшымі – "Шатландскі майстар", "Паслушнік", "Рыцар храма" трох аддзелаў ("рыцар", "сябра", "збраяносец"). Статут патрабаваў поўнага падпарадкавання малодшых братоў старэйшым і ўсіх вольных муляраў галаве ордэна. Братам мог стаць толькі багаты і радавіты дваранін-хрысціянін [Тамсама. – С. 75-76].

1778 – 1779 гг. у Магілёве дзейнічала ложа, назва якой пакуль невядомая (Майстар кафедры – У.Палянскі).

Другім цэнтрам распаўсюджвання масонства ў Беларусі стаў Полацк. Сюды ў 1777 г. перанесла працу ложа "Талія", якую заснаваў у 1775 г. у Маскве Вердэрэўскі. Яна таксама прытрымлівалася шведска-нямецкай сістэмы і падпарадкоўвалася Вялікаму майстру Правінцыяльнай ложы ў Санкт-Пецярбургу Івану Ялагіну. У 1791 г. па "ялагінскай сістэме" працавала ў Шклове ложа "Мудрасць"[3]. Большасць названых ложаў існавала толькі да забароны масонства Кацярынай II. У часы Аляксандра I на землях Беларусі ложаў пад кіраваннем расейскіх структураў ужо не было.

У Рэчы Паспалітай масонства стала распаўсюджвацца пры польскім карале і вялікім князе літоўскім Аўгусце III. У кастрычніку 1738 г. ягоны пазашлюбны брат граф Рутоўскі заклаў у Дрэздэне ложу "Трох белых арлоў" ("Trzech Białych Orłów"), якая стала свайго роду "маці" польскага і ліцьвінскага масонства. Першая польская ложа сфармавалася ў 1739 г. на каралеўскім двары ў Варшаве, як філіял названай ложы[4]. 10 снежня 1779 г. ложа "Добры пастыр" ("du Bon Pasteor") у Вільні прыняла рашэнне ўтварыць у Гародні *loge de deputation*. Туды паслалі Вялікага суддзю Гурка. Ён жа правёў два паседжання ложы *petite loge de deputation* у Слоніме (12 – 13 лютага 1780 г.)[5].

У 1781 г. Вялікі майстар правінцыяльнага масонства Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага Ігнацы Патоцкі падрыхтаваў Статут Вялікага Усхода Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. 26 лютага 1784 г. яго падпісалі дэпутаты ад адной вялікай, трох правінцыяльных і дзевяці сімвалічных ложаў. Сярод іх была ложа "Шчаслівае вызваленне" ў Гародні.

Ложа ўзнікла ў 1781 г. і працавала на французскай мове. Менавіта таму паводле масонскіх дакументаў яна называлася "L'hereuse Delivrance". Гэты скарочаны надпіс утрымліваецца на авальнай пячатцы ложы (адбітак яе захаваўся на дакуменце ад 17 лютага 1782 г. у бібліятэцы Польскай Акадэміі мастацтва). У бібліятэцы АН Літвы захоўваецца пергамент з подпісамі 17 братоў ложы "Шчаслівае вызваленне", якія даверылі А.Гадэну прадстаўляць іх у ложы "Дасканалая еднасць" у Вільні. Майстрам кафедры быў знакаміты Ж.Э.Жылібер, намеснікам – Я.Бекю, скарбнікам – Ж-Л.Бекю, сакратаром – Ф.Шрай-

---

[3] Воспоминания прелата Будкевича: Польское восстание 1831 года // Русская старина. – 1878. – Т. 22. – Кн. 8. – С. 591-616; 1892. – Т. 75. – Кн. 9. – С. 503-531; Пыпин А.Н. Русское масонство. XVIII и первая четверть XIX в. / Ред. и прим. Г.В.Вернадского. – Петроград: Огни, 1916. – С. 501-502, 505, 508, 510, 521.

[4] Масонство в его прошлом и настоящем. – М., 1915. – Т. 2. – С. 227-228; Папюс. Генезис и развитие масонских символов. – СПб.: МИКО, 1992. – С. 15, 79.

[5] Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1776-1822). Dzieje i materiały. – Wilno, 1930. – S. 167.

бер[6]. Колькі існавала ложа, сказаць цяжка, бо нават такі вядомы польскі даследчык, як С.Малахоўскі-Лэмпіцкі і той губляецца: то піша, што яна перастала працаваць у XVIII ст., то дае спіс братоў ложы на 1820 – 1821 гг. Вядомы факт перадачы Вялікім усходам назвы гарадзенскай ложы нясвіжскім масонам 4 жніўня 1810 г.[7]

Адпаведна Статуту 1784 г. існавалі тры масонскія правінцыі – Вялікапольская, Малапольская і Літоўская – на чале якіх стаялі намеснікі Вялікага майстра (магістра). Кожная правінцыя складалася з сімвалічных ложаў і адной правінцыяльнай. У ВКЛ Правінцыяльнай была віленская ложа "Дасканалая еднасць" (гл. *Дадатак*). Прадстаўнікі ложаў меліся таксама пры Вялікім усходзе Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Статут 1784 г. умацаваў незалежнасць польска-літоўска-беларускага масонства ад замежных уладаў вольных муляраў. Ён не прызнаваў падзелу Рэчы Паспалітай і падпарадкоўваў ложы-маці "Кацярыне пад паўночнай зоркай" "усе землі і края, якія знаходзіліся пад польскім панаваннем, а таксама края і правінцыі, якія ляжаць за мяжой"[8]. У польскім і ліцьвінскім масонстве гэтага часу яшчэ адчуваліся прарасейскія настроі, але ў перыяд працы Чатырохгадовага сейму адбыўся пералом да незалежнасці. Гэта адлюстравалася ў новай назве вялікай ложы – "Станіслаў Аўгуст пад паўночнай зоркай"[9].

Пасля другога і трэцяга падзелаў Рэчы Паспалітай, а таксама разгрома паўстання Т.Касцюшкі ў масонскім руху былых Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага назіраўся поўны развал. Толькі ў 1810 г. пачала працу ложа "Шчаслівае вызваленне" ў Нясвіжы, а 22 сакавіка 1810 г. ненадоўга аднавіўся Вялікі ўсход Каралеўства Польскага і ВКЛ. 17 сакавіка 1812 г. быў створаны Нацыянальны Вялікі ўсход Каралеўства Польскага і ВКЛ, але вайна перапыніла яго дзейнасць. Вольныя муляры адклалі свае працы да заканчэння ваенных дзеянняў.

У 1815 г. быў адноўлены Вялікі ўсход Каралеўства Польскага і ВКЛ і пачалося адраджэнне ліцьвінскага масонства. У 1816 г. масоны Ян Норвід, Міхал Сабескі, Караль Гофман і Ян Ходзька прыехалі ў Вільню і пры дапамозе старэйшага масона прэлата Міхала Длускага пачалі працы ў ложах "Руплівы ліцьвін" і "Добры пастыр". Яны ж адчынілі дзве новыя ложы – "Школу Сакрата" ў Вільні і "Палямон" у Расіенах Ковенскай губ. У 1818 – 1819 гг. у Літоўскай правінцыі мелася 12 ложаў. Толькі ў Вільні працавалі Правінцы-

---

[6] Каталог пергаментов / Сост. Р.Ясас. – Вильнюс: Масклас, 1980. – С. 483.

[7] Małachowski-Łempicki St. Wykaz Polskich loż wolnomularskich... – S. 116-118; Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego... – S. 53.

[8] Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego... – S. 9; Масонство в его прошлом и настоящем. – М., 1915. – Т. 2. – С. 232.

[9] Kukiel M. Dzieje Polski porozbiorowej 1795-1921. – Wyd. 4. – Paris, 1984. – S. 25-26.

яльная ложа "Дасканалая еднасць" і сімвалічныя – "Руплівы ліцьвін", "Храм мудрасці", "Добры пастыр", "Школа Сакрата" і "Славянскі арол"[10].

Росквіт масонства адбыўся на землях Беларусі ў 1816 – 1821 гг. пад апекаю Аляксандра I, які сам быў масонам. Менавіта ў гэты час узніклі сімвалічныя ложы ў Гарадзенскай і Менскай губ. (гл. *Дадатак*): у Наваградку – ложа "Багіня Цэрэра", якая хутка перайменавалася ў "Вузел еднасці", у Гародні – "Сябры чалавецтва"[11] , у Менску – "Паўночная паходня", "Святыня поўначы" і капітулярная (ніжэйшая, а з красавіка 1821 г. – вышэйшая) ложа "Гара Табар". Акрамя таго былі створаныя сімвалічная ложа "Уладзіслаў Ягайла" ў Слуцку і ніжэйшая капітулярная ложа "Святыня спакою" ў Нясвіжы. Пакуль невядома, калі ўзніклі, узгаданыя ў архіўных крыніцах ложы "Пераможаныя забабоны" ў Нясвіжы і "Святасць змовы" ў Менску[12].

Арганізацыйная структура масонства на беларускіх і літоўскіх землях у час росквіту адлюстраваная ў схеме (гл. *Дадатак*). Ложы падпарадкоўваліся Вялікаму ўсходу Каралеўства Польскага і ВКЛ, у склад якога ўваходзілі капітулярныя ложы "Святыня спакою" і "Гара Табар", а таксама Правінцыяльная ложа "Дасканалая еднасць". Апошняй падпарадкоўваліся пяць сімвалічных ложаў, якія мелі сваю нумарацыю ў пераліку ложаў, што ўваходзілі ў Вялікі ўсход, адпаведна часу ўзнікнення.

Ложа як ячэйка масонскага таварыства – гэта супольнасць абраных, з'яднаных духоўнымі вузамі і адпаведнай клятвай. Ложай таксама называлася памяшканне, у якім праходзілі паседжанні вольных муляраў. Вокны ў такіх памяшканнях выходзілі на тры бакі свету: усход, захад і поўдзень[13]. Ложы дзяліліся на сімвалічныя і капітулярныя. У сімвалічных працы вяліся ў першых трох ступенях – вучня, чаляднік (падмайстра) і майстра. Інакш такія ложы зваліся "янаўскімі", у гонар свайго патрона св. Яна, якога Вялікі Будаўнік сусвету накіраваў да людзей, "якія знаходзяцца ў цемры і ценю смерці", дзеля іх асветы. Ложы першых двух ступеняў называліся "блакітнымі", бо сцены памяшканняў ложаў і фартукі братоў былі блакітнага колеру. Сцены памяшканняў, дзе адбываліся паседжанні майстроў і абраных кавалераў, былі чорнага колеру. Для ступеняў ад 5 да 33 з сярэдзіны XVIII ст. быў прыняты чыр-

[10] Małachowski-Łempicki St. Wykaz Polskich loż wolnomularskich… – S. 120; Добрянский С.Ф. Очерки из истории масонства в Литве // Записки Северо-западного отдела Императорского Русского Географического общества. – Вильна, 1914. – Кн. 4. – С. 103.

[11] Добрянский С.Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 103; Швед В.В. Гродзенскія масонскія ложы (канец XIII-пач. XIX ст.) // Гарадзенскія запісы: Старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1997. – Вып. 3. – С. 66, 70.

[12] Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. – Kraków, 1908. – Cz. 2. – S. 112-119; НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп.1, ад.з. 2860. Арк. 3-3 адв.

[13] Шустер Г. Тайные общества, союзы и ордена / Под ред. А.Погодина. – СПб., 1905. – Т.2. – С. 47-48.

воны колер. Інтэр'ер памяшканняў паседжанняў масонаў таксама адпавядаў розным ступеням[14].

Масонскія працы адбываліся па ступенях. Напрыклад, у гарадзенскай ложы "Сябры чалавецтва" на працягу 1820 г. (па масонскім календары 5820 г.) адбылося 37 паседжанняў у ступені вучня, 7 – у ступені чаляднікa, 8 – у ступені майстра[15].

Ступені масонства з першага па сёмы называліся наступным чынам: вучань, чаляднік, майстар, кавалер абраны, кавалер шатландскі, кавалер Усходу, кавалер Ружовага крыжа. Кожная ступень азначала ўзровень пасвячэння ў масонскія таямніцы. Асноўная праца вольных муляраў кожнай ступені складалася з падрыхтоўкі і прыняцця брата ў сваю ступень. Навука масонаў дзвюх першых ступеняў складалася з выхавання ў духу сямі абавязкаў – даверу, шчырасці, міласэрнасці, паслухмянасці, лагоднасці, адвагі і маўчання. Сімвалам вучня быў грубы прыродны камень, а галоўным заняткам – "апрацоўка" самаго сябе. Абчэсаны кубічны камень – сімвал чаляднікa, які "да Адкравення, слова прарокаў і евангелія адносіцца з глыбокай пашанай, не саромеецца розуму <...> пазбягае спрэчак, не лічыць сябе замкнёным у вызначанае кола, не бачыць карысці ў фанатычнай прапагандзе, якая не спрыяе ўнутранай канцэнтрацыі". Сімвалам майстра былі лічэбнікавая дошка з геаметрычнымі фігурамі і эстэтычнымі контурамі. Ён ведаў легенду пра забойства будаўніка храма Саламона Хірама (Адоранíма). Ягоная праца заключалася ў дапамозе вучням і чаляднікам дасягнуць пастаўленых перад імі мэтаў[16].

Ніжэйшыя капітулярныя ложы працавалі ў 4 і 5 ступенях, а вышэйшыя – у 6 і 7 ступенях і мелі права ствараць сімвалічныя ложы. Чацвёртая ступень называлася "Абраны кавалер". У ёй вучылі помсце за забойства Хірама. Ступень пятая (шатландскі кавалер), апісвала падарожжа шатландскіх майстроў у пошуках скарбаў, якія знаходзяцца ў труне Хірама. У навуцы шостай ступені (кавалер Усходу), гаварылася пра Хірама, а таксама пра падтрымку існуючай улады. Масон сёмай ступені (кавалер Ружовага крыжа), ведаў, што "той, хто праз сваю працу і пошукі адкрые таямніцу, высокія праўды замыкаючую, будзе ўпэўнены, што знайшоў шчасце, пра якое марыць кожны смяротны, дні яго будуць шчаслівыя, рукі яго будуць чыстыя, а нястача і слабасць не будуць мець перавагі"[17].

[14] Załęski S. O masonii w Polsce od roku… – Cz. 2. – S. 420; НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. Арк. 92, 92 адв., 318.

[15] Małachowski-Łempicki St. Wykaz Polskich loż wolnomularskich… – S. 210.

[16] Материалы для истории масонских лож / сост. Пыпин А.Н. // Вестник Европы. – 1872. – Т. 4. – Кн. 7. – С. 272, 274; Małachowski-Łempicki St. Wykaz Polskich loż wolnomularskich… – S. 124, 127.

[17] Małachowski-Łempicki St. Wykaz Polskich loż wolnomularskich… – S. 127-132.

Кожны год 1 сакавіка (гэта быў першы дзень масонскага года) адбываліся выбары адміністратараў ложы тэрмінам на адзін год: Майстра кафедры, ягонага Намесніка, Дазорцаў, Прамоўцы, Скарбніка, Суддзі, Ялмужніка. Майстар кафедры – адміністрацыйны кіраўнік ложы, які выносіў прысуд, падтрымліваў кантакты з Правінцыяльнай ложай і Вялікім усходам, прадстаўляў братоў на атрыманне вышэйшай ступені, падпісваў дакументы, зацвярджаў рашэнні Суддзі. Другую пасаду пасля майстра займаў Намеснік. Ён дапамагаў Майстру, а ў яго адсутнасць кіраваў справамі ложы, вёў паседжанні.

Наступная пасада ў іерархіі ложы – Прамоўца. Ён павінен быў добра ведаць статут, звычаі і прадпісанні ордэна, каб іх адстойваць. Прамоўца выступаў па сутнасці кожнай справы, даваў заключэнне на пададзеныя справы адпаведна масонскім законам. Звычайна пасля яго выступу старшыня паседжання пачынаў дыскусію. Дзве наступныя пасады – Скарбнік і Суддзя. Пад апекаю першага знаходзіўся бюджэт ложы і фінансавыя разлікі. Другі вырашаў судовыя справы братоў. Апошняя выбарная пасада – Ялмужнік (Jałmužnik). Ён збіраў і размяркоўваў грошы для дапамогі бедным, наведваў хворых братоў, на яго імя падаваліся прашэнні аб дапамозе.

Многія афіцэры ложы прызначаліся Майстрам кафедры тэрмінам на адзін год: Сакратар, ягоны Намеснік, Майстар абрадаў, Сцюарты (эканамічны і абрадавы), Захавальнік пячаткі, Архівіст, Гасцёўнік, Будаўнічы рахмістр, Мечнік, Дырэктар гармоніі. Сакратар вёў справаводства і перапіску ложы. Майстар абрадаў рыхтаваў цырымоніі і сачыў, каб падчас іх кожны брат знаходзіўся на сваім месцы. Захавальнік пячаткі распараджаўся пячаткай і штэмпелямі, ставіў пячатку на дакументы і вёў іх улік. Архівіст захоўваў архіў, куды складаў усе дакументы пра дзейнасць ложы, вёў вопіс справаў. Першы сцюарт (эканамічны) загадваў маёмасцю ложы і дапамагаў Ялмужніку. Другі сцюарт (абрадавы) дапамагаў Майстру абрадаў. Гасцёўнік быў памочнікам Ялмужніка. Будаўнічы рахмістр правяраў рахункі Сакратара, Скарбніка, Сцюартаў і рабіў заключэнне пра стан прыбытку і выдаткаў. У функцыі Мечніка ўваходзіла нясенне мяча на падушцы перад майстрам на цырымоніях. Дырэктар гармоніі кіраваў музыкай і спевамі падчас працаў ложы, банкетаў і ўрачыстасцяў[18]. Звычайна масонскія пасады братоў адпавядалі свецкім, напрыклад, урачы сачылі за здароўем братоў і былі Ялмужнікамі, юрысты – Суддзямі і Прамоўцамі, музыканты – Дырэктарам ці Братамі гармоніі, служачыя канцылярый – Сакратарамі і г.д.

Колькасць братоў у масонскіх ложах на землях Беларусі першай чвэрці XIX ст. дасягала 1 024 чал. (гл. *Дадатак*). Лічба прыблізная, бо адкрыццё новых гістарычных крыніцаў павінна адкрыць новыя прозвішчы. Але адсутнасць 1-2 дзесяткаў масонаў не скажае агульнай карціны ахопу насельніцтва

[18] Швед В.В. Гродзенскія масонскія ложы… – С. 67-73.

масонскім рухам. Масоны былі дзейсныя (дзяліліся на тых, хто прысутнічаў і хто непрысутнічаў) і ганаровыя. Першых налічвалася 672 чал., апошніх – 284. Былі яшчэ служкі (18 чал.), большая частка якіх таксама з'яўлялася братамі-масонамі. На жаль, не атрымалася высветліць да якой групы масонаў адносіліся 68 братоў. Немагчыма пакуль вызначыць колькасць масонаў-ураджэнцаў Беларусі ў віленскіх ложах. У якасці прыкладу можна назваць маршалка Наваградскага пав. Ю.Вайніловіча, прэзідэнта Менскага галоўнага суда А.Гюнтара, князя К.Радзівіла, мастака Я.Дамеля, Вялікага гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Агінскага, межавога суддзю Ашмянскага пав. А.Дмухоўскага ды інш.

Разгледзім якасны склад 672 дзейсных беларускіх масонаў. Найбольшай групай былі вайскоўцы – 122 чал. Сярод іх было шмат тых, хто служыў у войсках ВКЛ і Каралеўства Польскага. Напрыклад, генерал-маёр Караль Мараўскі, генерал Фларыян Вайніловіч, палкоўнікі Дамінік Рэйтан і Ігнацы Ляхніцкі, падпалкоўнік Адам Солтан, капітаны Франц Фрыбэс і Ян Валовіч, напалеонаўскі афіцэр Ян Канопка і іншыя. Былі ваеннаслужачыя Літоўскага асобнага корпусу, а менавіта Літоўскага, Татарскага, Валынскага і Коннапольскага уланскіх палкоў, 29 і 30 конна-артылерыйскіх ротаў. Тут па прыблізных падліках служыў 51 масон. У палках Літоўскай уланскай дывізіі служылі 37 вольных муляраў, у асобных артылерыйскіх батарэях – 8, у Валынскім і Падольскім гвардзейскіх палках – 3, у Літоўскім піянерным батальёне – 1 (штабс-капітан К.Г.Ігельстром), у Гарадзенскім гусарскім палку – 2[19]. Сябрамі беларускіх ложаў былі таксама вайскоўцы тых падраздзяленняў расейскага войска, што знаходзіліся часова на тэрыторыі Беларусі. Гэта, напр., ад'ютант генерала І.К.О'Рурка І.С.Бястужаў, палкоўнікі Густаў Бетхер, Эмануэль Рашэт, Павел Сцяпанаў ды інш.

Другая па колькасці група масонаў (102 чал.) – шляхта і памешчыкі. Іх прафесійны статус пакуль не ўстаноўлены, напр., Якуб Эстка паказаны як памешчык і як былы падсудак земскага Ігуменскага суда; Вінцэнт Ляўковіч – як паручнік войска Каралеўства Польскага і памешчык; Дамінік Радзівіл – як палкоўнік таго ж войска і памешчык розных губерняў і г.д.

Значная колькасць масонаў была служачымі па "судовай частцы" (97 чал.). Гэта адвакаты, суддзі, рэгенты, асэсары і чыноўнікі з Гарадзенскага і Менскага галоўных судоў, межавыя і земскія судзі. У прыватнасці, гэта старшыня (прэзідэнт) Менскага галоўнага суда Ян Ходзька, адвакаты Гарадзенскага галоўнага суда Ян Сержпутоўскі і Караль Эйсымонт, межавы суддзя Ігуменскага пав. Казімір Касоўскі, гарадзенскі губернскі пракурор Юзаф Гарагляд, лідскі гродскі суддзя Ян Дзежыц ды інш.

[19] Материалы по истории масонства в прежней русской армии / Т. Соколовская // Русская старина. – 1907. – Т.130. – Кн. 6. – С. 659-668; Кн. 7. – С.197-216; Кн.8. – С. 405-432; Кн. 9. – С. 643-653.

Чацвёртую па колькасці групу складала шматлікае чынавенства мясцовай адміністрацыі і дваранскіх органаў кіравання. Напр., гарадзенскія губернатары Міхал Бутаўт-Анджэйковіч і Станіслаў Урсын-Нямцэвіч, менскі губернатар Казімір Сулістроўскі, сакратар Гарадзенскай скарбавай палаты Станіслаў Далінскі і яе прэзідэнт Казімір Крэйбіх, маршалкі паветаў: Берасцейскага – Павел Ягмін, Вілейскага – Ян Аскерка, Наваградскага – Юзаф Вайніловіч, Слуцкага – Адам Непакайчыцкі, стараста Нясвіжа Ян Флемінг, прэзідэнт Нясвіжа Франц Нолтэнмейер і іншыя служачыя губернскіх канцылярый і скарбавых палатаў, земскія пісары і спраўнікі, павятовыя і губернскія маршалкі, сябры розных губернскіх і павятовых камісій.

Вылучалася таксама група ўрачоў, дактароў медыцыны, аптэкараў (25 чал.), асабліва ў гарадзенскіх і нясвіжскай ложах[20]. Сярод іх інспектар Гарадзенскай урачэбнай управы старшы дарадца Бернэс Рэйнольдавіч (Бернард Міхайлавіч) Міхельсон, гарадзенскі аптэкар Фрыдэрык Шэдэ, дывізіённы доктар Караль Бідэрман, наглядальнік вайсковых лазарэтаў Ян Брандт, доктар Менскага вайсковага шпіталя Аляксандр Генрыц, дактары медыцыны Караль Юзаф Вірыён, Вінцэнт і Тэадор Эме.

Таксама трэба згадаць пра настаўнікаў Менскай гімназіі Яна Чачота, Вінцэнта Сянкевіча, Пятра Шнэйдэра, настаўніка музыкі Менскага пансіёна Аўгустына Дразда, музыкантаў Матэвуша Стравінскага, Вінцэнта Шалькевіча, Міхала Фрэйта, ксяндза-капелана Менскай гімназіі Яна Жылінскага, доктара філасофіі Антонія Развадоўскага, прафесара кальвініcцкай школы ў Слуцку Юзафа Сеўрука.

Цікавую характарыстыку літоўска-беларускім масонам даў І.Ходзька ў сваіх *Літоўскіх замалёўках*: "Уступіўшы ў ложу польскі (чытай ліцвінскі – *В.Ш.*) брат масон шукаў перш за ўсё навінаў, адкрыцця таямніцы, наўмысна зацямнёнай баламутнай сімволікай і яшчэ больш баламутнай масонскай легендай <...> Польскі брат масон шмат не думаў. Не дакрануўшыся да таямніцы так хутка, як таго прагнуў, угаворваў сябе, што яна ёсць, але такая ўзвышаная, такая высакародная і так глыбока схаваная, што ён яе адшукаць не здолее. Супакоіўшы сябе такім чынам сядзеў у масонстве далей, пакуль яго адтуль не выгнаў аляксандраўскі ўказ"[21].

Але не толькі цікаўнасць штурхала ў лона ложаў. Некаторых прывабліваў матэрыяльны інтарэс, перамяшчэнне па службовай лесвіцы, уваходжанне ў элітныя колы. І.Ходзька пісаў: "Слабы літаратар, журналіст і кнігавыдаўца ўступае ў ложу, бо "браты" разнясуць па свету яго літаратурныя і журналісцкія опусы як вяршыню мудрасці, ведаў і дасціпнасці, кнігі купяць ў кнігарнях

[20] Пыпин А.Н. Русское масонство… – С. 529; Швед В.В., Ігнатовіч Ф.І. Урачы і аптэкары – члены гродзенскіх масонскіх лож (канец XVIII – пачатак XIX ст.) // История и современные проблемы лекарственого обеспечения населения. – Гродно: б.и., 2000. – С. 37-41.

[21] Цыт. па: Załęski S. O masonii w Polsce od roku… – Cz. 2. – S. 44-45.

"брата", таксама дадуць і рэкамендацыю, а, нават, і грошы і дапамогуць зрабіць добрую кар'еру <...>"[22].

Былі сярод масонаў і тыя, хто імкнуўся злучыць ідэю духоўнай працы па пабудове "Храма Божага" з пераўтварэннямі рэчаіснасці, але пра гэта скажам ніжэй. Звернем ўвагу на патаемны характар масонскай дзейнасці. Святы абавязак кожнага масона – захоўваць таямніцу абрадаў і сімвалаў. Другі дазорца ложы "Уладзіслаў Ягайла" Ян Садкоўскі ў прамове пад час ўрачыстага паседжання ў гонар св.Яна заўважыў, што трэба і далей утрымліваць таямніцу пра сваю дзейнасць, бо гэта спрыяе "пэўнасці мэтаў, да якіх узносяцца намеры шляхетна згодных душаў". Парушэнне таямніцы каралася грыўнай у касу ложы, вуснай і пісьмовай вымовай, адхіленнем ад удзелу ў паседжанні ложы, паніжэннем у ступені і г.д., уключна да "масонскай смерці"[23].

Звернем увагу на погляды і грамадска-палітычную дзейнасць масонаў. Галоўнай іх мэтаю было самаўдасканаленне, самавыхаванне, "пераўтварэнне першапачаткова змарнаванай чалавечай натуры". Пра адкрыццё ў Слуцку ложы "Уладзіслаў Ягайла" Б.Квіналоўскі казаў, што гэта ўзыход сонца, "першыя промні якога выводзяць з начной цемры, усяму прыроднаму вяртаюць рух і жыццё <...> Утвараецца новая святыня, узносіцца новы алтар для Вялікага Будаўніка сусвету, а таму кожны з іх (братоў – *В.Ш.*) павінен імкнуцца быць руплівым і паслухмяным, каб сусвет папярэджаны і асепляны са здзіўленнем на іх глядзеў, і ў кожным масоне, хоць бы і насуперак уласнаму жаданню, шанаваў і любіў дабрадзейнасць". У адной з прамоваў на паседжанні ложы "Паўночная паходня" ў Менску невядомы брат казаў, што вольнамулярская навука "з'яўляецца вялікай, цяжкай і складанай, бо мае высокую мэту, а менавіта – святую падрыхтоўку агульнага шчасця для народаў, навуку, якая звязвае вольных муляраў у адзінае цела, злучае іх сэрцы ланцугом братэрскага адзінства"[24].

Масоны казалі пра роўнасць усіх людзей, пра неабходнасць жыць агульнай супольнасцю. Першы дазорца на ўрачыстым паседжанні ложы "Казімір Вялікі" сцвярджаў: "Недастаткова таго, каб прызнаваць роўнасць у свяцілішчы, а трэба, каб мы ва ўсіх людзях прызнавалі чалавека, незалежна ад таго, ці прыгожа ён апрануты, ці ў лахманах, ідзе ён за плугам, ці сядзіць за сталом з пяром у руцэ, трымае ў руках зброю ці пілу, скіпетр ці аршын. Ён усюды такі самы, мае аднолькавую аснову, аднолькавае права на зямное шчасце і аднол-

---

[22] Тамсама. S. 46; Серков А.И. Из истории русского масонства: Ложа трёх добродетелей и декабристы // Вестн. Моск. ун-та. – Сер. 8. История. – 1988. – № 5. – С. 65.

[23] Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego… – S. 68; НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. Арк. 338.

[24] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 226 адв., 340 адв.

кавае прызначэнне за труною <...>"[25]. Масоны марылі аб стварэнні, а дакладней аб вяртанні чалавецтва да "агульнай супольнасці па прынцыпах Ісуса Хрыста". Бог хацеў, каб людзі жылі "адзінай супольнасцю, адно цела складалі". Розныя прамоўцы з ложаў "Паўночная паходня" і "Уладзіслаў Ягайла" прыйшлі да адзінай высновы – галоўнай перашкодай дасягнення гэтага з'яўляецца "монстр эгаізму", які перамог і падзяліў людзей, унёс у іх жыццё скваплівасць, пагарду, уціск, несправядлівасць[26].

У святле вышэйазначанага, не зразумела пра які "падзел тэрыторыі" Расеі масонамі гаворыць сучасны расейскі даследчык А.А.Платонаў: "У 1807 г. частка заходніх губерняў была неправамерна аб'яднана ў г.зв. Царства Польскае, у якое трапілі таксама гістарычна рускія (маларускія і беларускія) землі"[27]. У 1807 г. Царства (Каралеўства) Польскае не існавала. Яно было створана пасля Венскага кангрэса 1815 г., а г.зв. "заходнія губерні" з'яўляюцца не "гістарычна рускімі", а часткай тэрыторыі былога ВКЛ. Масоны да гэтых працэсаў дачынення не мелі, хоць сам Аляксандр І належыў да іх. У 1807 г. Напалеон Банапарт арганізаваў Герцагства (Княства) Варшаўскае, а Расея атрымала Беластоцкую акругу (вобласць), далучаную ў 1842 г. да Гарадзенскай губ.[28]

У Статуце сімвалічных ложаў шмат увагі ўдзелялася праяўленню чалавечнасці. Гэты абавязак масона сфармуляваны наступным чынам: "Любі блізкага свайго, як самога сябе, не рабі яму ніколі таго, што сабе не зрабіў бы. Скарыстай з раскошнага дару мовы, гэтага знешняга знака твайго панавання над прыродай, каб прадбачыць патрэбы чалавека і ў сэрцах усіх распаліць святое полымя дабрадзейнасці". Масон не павінен быў саромяцца чалавека з ніжэйшага стану, але пачцівага, якога абдымаў як брата ў ложы. Яго абавязак спяшацца на дапамогу брату, які патрабуе яе, са "святлом розума, сэрцам і радаю"[29].

Роўнасць, да якой імкнуліся масоны, грунтавалася на панаванні закона. Л.Плятэр у адной з прамоваў на паседжаннях менскай ложы "Паўночная паходня" ў 1817 г. казаў пра роўнасць, свабоду слова, панаванне права, перад якім роўныя і сын і брат караля, і рамеснік: "Вось тады і будзе сапраўдная ад вякоў уводзімая і захоўваемая, адзіная разумная і карысная роўнасць у абліччы закона"[30].

---

[25] К истории масонства в России / Н.М.Затворницкий // Русская старина. – Т. 129. – Кн. 3. – С. 548.

[26] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 227 адв., 337 адв.-338.

[27] Платонов О. А. Терновый венец России: Тайная история масонства. 1731-1996. – М.: Родник, 1996. – С. 74.

[28] Госцеў А.П., Швед В.В. Гродзенская губерня // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1996. С.125; Encyklopedyczny słownik historii Polski / Pod red. J.Maciszewskiego. – Warszawa: POW, 1998. – S. 29, 132-133, 136-137.

[29] Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego… S. 65, 67.

[30] НГАБ У Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 227.

Складанымі былі рэлігійныя погляды масонаў. З аднаго боку, статут патрабаваў: "Прысвяці Богу ў ахвярнасць волю і жаданне і паспрабуй быць годным Яго ажыўляючых уплываў. Здзяйсняй правы, якія Ён хоча, каб чалавек меў у гэтым тленным побыце на зямлі. Падабацца Богу – гэта тваё шчасце, злучыцца з ім назаўсёды – гэта найцудоўнейшае жаданне і канчатковая мэта тваіх учынкаў <...>"[31] Аднак каталіцкія традыцыі пераважвалі веру ў Вялікага Будаўніка сусвету. Вольныя муляры хадзілі ў касцёл, дапамагалі каталіцкім шпіталям і Таварыствам дабрачыннасці, спавядаліся перад смерцю. З другога боку, як піша польскі даследчык С.Залэнскі, "нехрысціянская, наскрозь паганская атмасфера ложы, не магла не ўплываць адмоўна на розум сваіх адэптаў. Ігнараванне рэлігійнай практыкі і з часам поўнае яе занядбанне – гэта першыя вынікі ўплыву. Пасля гэтага знікала павага да касцёла, ігнараваліся дагматы, пашыраўся агульны індыферэнтызм, і, нарэшце, нараджалася сумненне і рэлігійны скептыцызм <...>"[32]

Мэта рэгулярнага масонства – гэта маральнае ўдасканаленне і самавыхаванне. Але жыццё ўносіла карэктывы, асабліва на тэрыторыях, якія страцілі незалежнасць. Былы масон віленскай ложы "Руплівы ліцьвін" Ст.Міцканеўскі паведамляў віленскаму генерал-губернатару Рымскаму-Корсакаву: "Галоўная таямніца масонаў заключаецца ў наступным: усталяваць паміж людзей усіх станаў вольнасць і роўнасць, зліквідаваць дэспатызм або самадзяржаўнае праўленне. Яны схіляюцца да рэвалюцыі, падобнай на тыя, што былі ў Францыі, Іспаніі, Партугаліі, Неапалі і Турыне, а таму, зразумела, пагражаюць хваляваннямі народаў"[33].

Палітычныя погляды масонаў былой Рэчы Паспалітай былі розныя. Ложы складаліся з дробнай шляхты, буйных магнатаў, мяшчанства, прыхільнікаў і праціўнікоў манархіі. Палітычная думка вагалася паміж спадчыннай канстытуцыйнай манархіяй і алігархічнай магнацкай рэспублікай накшталт Венецыянскай, а самая смелая брала за ўзор дзяржаўнага будаўніцтва Вашынгтон ці Парыж.

Варта звярнуць увагу на стаўленне вольных муляраў не толькі да асобы манарха наогул, але і да канкрэтнага манарха, а менавіта да Аляксандра І. Статут сімвалічных ложаў сцвярджаў: "Паняцце манарха як памазанніка божага моцна звязана з паняццем Айчыны <...> Найвышэйшая істота бачным і ўпэўненым спосабам перадала сваю ўладу ў рукі манарха. Таму шануй і любі яго <...> у кожным кутку зямлі, дзе жывеш"[34]. Стаўленне да Аляксандра І у

[31] Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego… – S. 61-62.

[32] Załęski S. O masonii w Polsce od roku… – Cz. 2. – S. 49.

[33] Добрянский С. Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 130; К истории масонства в России. – Кн. 3. – С. 540; Семевский В.И. Декабристы-масоны // Минувшие годы. – 1908. – февраль (№ 2). – С. 36.

[34] Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego… – S. 62.

вялікай ступені залежала ад яго адносінаў да "польскага пытання". У той час, калі расейскі імператар "заляцаўся" да жыхароў былой Рэчы Паспалітай, на паседжаннях менскай ложы "Паўночная паходня" можна было пачуць верш Ю.Рагожы на імяніны Аляксандра I, у якім усхвалялася яго "шырокая і прыгожая душа". Пасля Венскага кангрэса некаторы час добрыя адносіны масонаў да Аляксандра I захоўваліся. На адным з паседжанняў слуцкай ложы "Уладзіслаў Ягайла" Ф.Пяткевіч усхваляў дабрыню душы брата Аляксандра, які дазволіў існаванне масонаў і стаўся іх апекуном, аднавіў жыццё іх роднай Айчыны, захаваў яе назву, мову, права, звычаі, "тым самым загаіў раны, што адкрыліся ад штогадовых няшчасцяў"[35]. Пасля сейму 1818 г. давер да Аляксандра I быў падарваны. Хоць Вялікі ўсход у 1819 г. рэкамендаваў вывесіць у ложах над тронамі майстроў партрэт манарха, але рабілася гэта дзеля прыкрыцця сапраўдных настрояў. Незадаволеннасць "дабрадзейнасцю" імператара пашырылася ў грамадстве і сярод вольных муляраў. Пад час сейма 1820 г. В.Маеўскі выступіў з крытыкай Аляксандра I і яго ўраду[36].

У 1817 г. шубраўцы праз сваю газету "Брукавыя ведамасці" пачалі рыхтаваць літоўска-беларускую грамадскасць да адмены прыгону. Ідэю вызвалення сялянаў па прыкладу Остзейскіх губерняў распаўсюджваў праз маршалкаў Ковенскай і Віленскай губ. віленскі віцэ-губернатар – масон Плятэр-Зіберг. У снежні 1817 г. пытанне аб рэформе было ўзнята на дваранскіх выбарах у Вільне Ш.Завішай, які заявіў: "Мы абавязаны прыняць рашэнне не большасцю галасоў, але аднагалосна: адракаемся ад правоў і прывілеяў над сялянамі!.." Не ўсе масоны яго падтрымалі. Напр., тройчы выступаў супраць дэпутат з Ашмянскага пав. М.Пашкоўскі. Нарэшце было вырашана падаць "всеподданнейшее" прашэнне аб стварэнні камітэта для складання праекта паляпшэння становішча сялянаў. Падрыхтоўка да рэформы зацягнулася да 1819 г., а ў гэты час пачаўся разлад у масонстве, які скончыўся яго забаронай у 1821 г.[37]

На практыцы некаторыя вольныя муляры пайшлі далей размоваў. Вядомы гарадзенскі масон Ігнацы-Эмануіл Ляхніцкі апублікаваў у 1817 г. працу "Статыстыка Літоўска-Гарадзенскай губерні", у якой між іншым паказаў цяжкае становішча сялянаў і зрабіў высновы пра неабходнасць ліквідацыі паншчыны. Слуцкі масон Ю.Вішчынскі 24 чэрвеня 1819 г. заявіў на паседжанні ложы, што вызваліў навечна з прыгону селяніна з маёнтка Косажыцы М.Пуцяту з сям'ёй, бо той стаў масонам, а значыць родным яму братам[38].

---

[35] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 225, 338.
[36] Załęski S. O masonii w Polsce od roku… – Cz.1. – S. 211.
[37] Добрянский С. Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 111-112.
[38] Lachnicki I.-E. Statystyka guberni Litewsko-Grodzieńskiej. – Wilno, 1817. – S. 249; НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 344 адв.



Віжэ-Лебрэн Э. Партрэт Станіслава Аўгуста Панятоўскага. 1797 г.



Міхал Казімір Агінскі (1730-1800). Вялікі гетман ВКЛ (1768), Вялікі намеснік Літоўскай правінцыі Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і ВКЛ (1784).

Хвалявала масонаў і ідэя адраджэння Рэчы Паспалітай. Гэтаму спрыяла палітыка Аляксандра I, а менавіта ўтварэнне Каралеўства Польскага і наданне яму канстытуцыі ў 1815 г., арганізацыя польскага войска і Літоўскага асобнага корпусу. Якраз гэтая ідэя нарадзіла сярод рэвалюцыйна-дэмакратычнай часткі масонаў думкі пра неабходнасць рэфармавання масонства і ўплыву на тайныя таварыствы. У 1819 г. маёр польскай арміі В.Лукасіньскі заснаваў арганізацыю "Нацыянальнае масонства" з мэтаю адраджэння Рэчы Паспалітай у межах да 1772 г. Звернем увагу на масонскую афарбоўку гэтай арганізацыі. Вучань павінен быў прапагандаваць навуковыя веды і знаёміць людзей з гісторыяй Польшчы. Чаляднік – апісваць подзвігі славутых палякаў, славіць польскасць, рыхтаваць грамадскасць да барацьбы за Айчыну. На пытанне Майстра: "Як вялікая твая ложа?" Чаляднік адказваў: "Высокія горы, два вольных мора і дзве ракі служаць яе межамі". "Дзе знаходзяцца твае браты?", – пытаўся Майстар і чуў у адказ: "Пры алтары Айчыны, які зверху пашкоджаны, але падмурак <…> захаваўся да гэтага часу"[39].

У легенду пра Хірама былі ўнесены карэктывы: ягоная смерць – гэта падзелы Рэчы Паспалітай; тры ягоныя забойцы – тры манархі, якія здзейснілі падзелы. Абавязак дзяцей Хірама шукаць бацьку ўсюды і змагацца з яго ворагамі – абавязак адраджэння Рэчы Паспалітай. Уваскрашэнне Хірама – сімвал адраджэння былой польска-літоўска-беларуска-ўкраінскай дзяржавы[40].

Беларуска-літоўскае масонства мела ўплыў на стварэнне тайных арганізацый сярод вучнёўскай моладзі і афіцэраў Літоўскага асобнага корпусу. Масон прафесар Віленскага універсітэту Я.Шымкевіч быў першым прэзідэнтам шубраўцаў. Філамат-масон Тамаш Зан стварыў таварыствы "Прамяністых" і філарэтаў. Наваградскія масоны К.Ігельстром і А.Вягелін арганізавалі Таварыства ваенных сяброў. У Таварыстве з 25 чалавек было 9 масонаў наваградскай ложы. Сябры Патрыятычнага таварыства М.Ромэр, Я.Вайніловіч, Л.Каменскі, К.Чапскі, А.Елец, П.Корбут, Ст.Мацкевіч, Я.Сержпутоўскі, Я.Сабескі, А.Солтан, Я.Ходзька і інш. таксама належалі да вольных муляраў[41]. Пра сувязь масонаў з тайнымі таварыствамі ведалі і царскія ўлады. Цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч 24 студзеня 1829 г. пісаў менскаму губернатару: "<...> Звесткі

---

[39] Масонство в его прошлом и настоящем. – М., 1915. – Т. 2. – С. 242; Załęski S. O masonii w Polsce od roku… – Cz.1. – S. 218.

[40] Załęski S. O masonii w Polsce od roku… – Cz.1. – S. 219.

[41] Швед В.В. Высоцкі П.Я. // Беларуская энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 325; Швед В.В. Ігельстром К.Г. // Беларуская энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 1999. – Т. 7. – С. 161; Швед В.В. Вягелін А.І. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 383-384; Серков А.И. Масонские ложи на территории Белоруссии и движение декабристов // Декабристские чтения: Тезисы респ. межвуз. науч. конф. / Под ред. Б.С.Клейна, Д.В.Карева, В.В.Шведа. – Гродно, 1990. – С. 72-74; Ланда С.С. У истоков "Оды к юности" // Литература славянских народов: Адам Мицкевич: к столетию со дня смерти. – М., 1956. – Вып.1. – С. 60.

пра існаванне ў Менску, Нясвіжы, Слуцку і іншых месцах даверанай Вам губерні масонскіх ложаў, я паслаў правадзейнаму стацкаму дарадцу сенатару Навасільцаву <...> з разглядам справы пра тайныя таварыствы"[42].

Масоны ўдзельнічалі ў паўстаннях. Касцюшкаўцамі былі П.Багурскі і Я.Лапэрэ. Падчас лістападаўскага паўстання 1830 – 1831 гг. улады звярнулі ўвагу на былых масонаў. Менскі часовы ваенны губернатар Даўгарукаў 2 траўня 1831 г. пісаў выконваючаму абавязкі Менскага губернатара Малафееву: "Паводле атрыманых мною звестак, у канцылярыі грамадзянскага губернатара знаходзіцца спіс розных асобаў тутэйшай губерні, якія раней былі ў таварыстве масонаў. Я прапаную <...> даставіць мне яго копію"[43]. Па нашых дадзеных, у паўстанні ўдзельнічаў вольны муляр К.Валовіч[44]. Камандзірамі атрадаў былі вольныя муляры Я.Жылінскі, С.Незабітоўскі, А.Солтан, сын масона А.Валадковіч.

У 1818 г. доктар філасофіі і медыцыны масон віленскай ложы "Руплівы ліцьвін" Якуб Шымкевіч задумаў рэформу з мэтаю стварэння шырокай сацыяльнай базы масонства. 16 сакавіка 1818 г. К.Контрым замест хворага Я.Шымкевіча выступіў на паседжанні ложы з уласнай прамовай, у якой крытыкаваў сімволіку і абраднасць. К.Контрым сцвярджаў, што за ёй хаваецца ідэйная пустэча, што сярэдневечная арганізацыйная форма не адпавядае рэчаіснасці XIX ст. і паралізуе актыўную дзейнасць. К.Контрым выступіў за пераўтварэнне ложы ў "паўлегальнае навукова-дабрачыннае таварыства, падпарадкаванае адукацыйным уладам краю". Рэфарматары прапанавалі ўласны статут:

"1. Масонскі ордэн, агульны для ўсіх, распадаецца на асобныя таварыствы, незалежныя адзін ад другога, не звязаныя абавязкам грашовых складак і збораў.

2. Кожнае таварыства, якое фарміруецца ў выглядзе асобнага гуртка, прымае наступную назву: "Рэфармаванае масонскае таварыства №".

3. Мэта кожнага таварыства: мудрасць і дабрачыннасць, г.зн. удзел у справах міласэрнасці і асветы.

4. Кожная ложа выбірае сабе вызначаную спецыяльнасць, у межах якой і адбываюцца "працы".

5. Удзельнікі таварыства называюцца "сябрамі".

6. На паседжаннях ложы могуць прысутнічаць сябры іншых ложаў, нават нерэфармаваных, але толькі ў якасці гасцей.

7. Кожная ложа-таварыства вядзе свае заняткі пад наглядам той улады, якая кіруе народнай асветай у краі. Яна можа змяніць свой статут,

---

[42] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 363.

[43] Серков А.И. Масонские ложи на территории Белоруссии... – С. 72-73; НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 365.

[44] НГАБ у Менску. Ф. 31, воп. 2, ад.з. 86. Арк. 36 адв.

надрукаваць яго. Працы носяць публічны характар і падлягаюць справаздачы"[45].

Майстар гарадзенскай ложы М.Бутаўт-Анджэйковіч выступіў супраць праекта Шымкевіча і Контрыма і прасіў пакінуць у спакоі "старое масонства", а калі ёсць моцнае жаданне, дык стварыць якую-небудзь новую арганізацыю. На публікацыю праекта ён адказаў запіскай, зачытанай на паседжанні 23 сакавіка. Усе, хто быў згодны з рэфарматарамі, былі выдаленыя з ложы. Яны ўтварылі ўласную ложу пад назвай "Руплівы ліцьвін рэфармаваны". Я.Шымкевіч, каб заручыцца падтрымкай ложаў былога ВКЛ разаслаў лісты, у якіх пісаў, што Правінцыяльная літоўская ложа "Дасканалая еднасць" вырашыла стварыць у Вільні Вялікі ўсход і запрашае прысылаць дэпутатаў. Але праз месяц браты слуцкай ложы "Уладзіслаў Ягайла" атрымалі ліст з адмовай, якая тлумачылася неабходнасцю "забеспячэння існавання і дабрабыту ад святовага ўраду"[46]. Рэформа не адбылася, але яе ідэі, верагодна, былі выкарыстаны ў "Нацыянальным масонстве" В.Лукасіньскага.

Гэтыя падзеі несумненна паўплывалі на тое, што 16 (30) траўня 1820 г. пасля гадавой спрэчкі і працы над удасканальваннем тэкста статут 1784 г. быў заменены "Канстытуцыйным статутам Вольнамулярства Польскага". Пра зацятую барацьбу прыхільнікаў і праціўнікаў новага статута гаворыць галасаванне: 20 галасоў – за, 11 – супраць. Вялікі майстар Станіслаў Костка Патоцкі казаў 21 чэрвеня 1820 г., што пратакол апошняга паседжання Вялікага ўсхода стане "духоўнай памяццю, што значнай большасцю галасоў гэты канстытуцыйны статут быў прыняты"[47]. Перапіска паміж літоўска-беларускімі ложамі і Варшаваю, а таксама паседжанні ложаў паказваюць, што барацьба не скончылася і пасля прыняцця статута. Правінцыяльная ложа "Дасканалая еднасць" выслала сімвалічным ложам ліст, у якім асуджала яго, бо, на яе думку, ён вядзе "да ліквідацыі братэрства і знішчэння вольнасці і роўнасці, якія з'яўляюцца дэвізам іх саюза"[48].

Справа ў тым, што новы статут абмежаваў правы правінцыяльных і сімвалічных ложаў, падпарадкаваў іх створанай Найвышэйшай Радзе з 7 чалавек пад старшынствам Вялікага майстра Ст.Патоцкага. Праз Вялікага на-

[45] Добрянский С. Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 118-119; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX w. – Wrocław: Zakład narodowy im. Ossolinskich, 1982. – S. 287; Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego… – S. 71-77.

[46] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286, 327; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej…– S. 287; Добрянский С. Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 119, 122.

[47] НГАБ у Менску. Ф. 694, воп. 1, ад.з. 517. Арк. 13-14.

[48] Ланской С. О литовских бывших масонских ложах // Русская старина. – 1907. – Т. 129. – С. 542.

месніка А.Ражнецкага расейскі ўрад атрымаў магчымасць кантраляваць польскае і літоўскае (ліцьвінскае) масонства. У выніку 20 з 40 ложаў Вялікага ўсхода Каралеўства Польскага і ВКЛ прыпынілі свае працы на невызначаны час. Браты ложы "Сябры чалавецтва" засталіся працаваць па "старым чарцяжам". Ложы "Вузел еднасці", "Святыня поўначы", "Гара Табар", "Уладзіслаў Ягайла" прызналі новы статут[49].

Спісы масонаў сведчаць, што вольнамулярства на беларускіх землях мела поліэтнічны характар. Напр., у віленскай ложы "Славянскі арол" сябрамі былі мясцовыя жыхары, а таксама рускія чыноўнікі і афіцэры. Як трапна заўважыў на паседжанні ложы "Паўночная паходня" адзін з братоў Вялікага ўсхода: нашай агульнай мэтай з'яўляецца "распаўсюджанне сапраўднага святла на зямным шары, вывядзенне народаў з глыбіні цемры <…> калі ж сусвет стане адной грамадой, злучанай братэрскімі вузамі, тады пачнецца сапраўдная гісторыя"[50].

Масоны Беларусі мелі добра наладжаныя кантакты з ложамі ў Польшчы і Расеі. Напр., менская ложа "Паўночная паходня" падтрымлівала сувязі з ложамі Кракава ("Святыня роўнасці"), Ломжы ("Узыходзячае сонца"), Санкт-Пецярбурга ("Астрэя", "Белы арол", "Елізавета"), Варшавы ("Ізіс", "Казімір Вялікі", "Святло Мінервы"), Плоцка ("Дасканаласць"), Седльца ("Белы арол"), Радома ("Узыходзячая заранка"), Любліна ("Вернутая вольнасць") і г.д. Прыкладна такія ж сувязі былі ў ложаў "Шчаслівае вызваленне" (Нясвіж) і "Уладзіслаў Ягайла" (Слуцк)[51].

Пецярбургская ложа "Астрэя" паспрабавала падначаліць сабе літоўска-беларускага масонства. У лісце ад 5 лютага 1818 г. ложа (Майстар кафедры граф А.-Ст.Жэвускі) прапанавала беларускім вольным мулярам прызнаць яе вяршынства. Ложы двойчы (у сакавіку і красавіку 1818 г.) адмовіліся ад прапановы. Польскі даследчык Л.Хас слушна лічыць, што падпарадкаванне не залежала ад нацыянальнага складу масонскіх ложаў. Больш важкую ролю адыгрывала "прыцягненне дадзенага рэгіёну да аднаго з двух палітыка-эканамічных цэнтраў, якімі былі Варшава і Пецярбург, а таксама <...> розныя кантакты, і не толькі вольнамулярскія, кіраўнікоў дадзенай тэрыторыі". 14 верасня 1818 г. ліст з Варшавы "ўхваляў цвёрдую рашучасць літоўскіх ложаў застацца ў саюзе з Варшаўскім усходам, і захаваць незалежнасць ад Санкт-Пецярбурга"[52].

[49] Добрянский С. Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 126; Ланской С. О литовских бывших масонских ложах. – С. 543; Małachowski-Łempicki St. Wykaz Polskich loż wolnomularskich… – S. 120-121.

[50] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 226 адв.

[51] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 218-219, 259-298; Добрянский С.Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 117.

[52] Ланской С. О литовских бывших масонских ложах. – С. 542; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej…– S. 276.

Барацьба паміж расейскім і польскім Вялікімі ўсходамі прывяла да таго, што ў 1820 г. сярод літоўска-беларускага масонства ўзнік праект утварэння самастойнага Вялікага ўсхода Літоўскага. Былі зробленыя першыя практычныя крокі. Валынскі масон граф Н.Олізар даў 15 тыс. руб. на будынак будучай рэзідэнцыі. Рэалізацыі праекта перашкодзіла змена адносінаў уладаў да масонства і закрыццё ложаў[53].

У жніўні 1821 г. выйшаў указ Аляксандра I аб закрыцці масонскіх ложаў і тайных таварыстваў. 25 верасня 1821 г. на апошняй сесіі Вялікага ўсхода Польскага было заяўлена, што ўсе ложы павінны закончыць свае працы да 1 кастрычніка ў Варшаве і да 15 кастрычніка ў правінцыі. Пасля гэтай даты ўсе працы будуць лічыцца незаконнымі. У першай палове кастрычніка віленскі генерал-губернатар Рымскі-Корсакаў абвясціў жнівеньскі ўказ цара. 6 лістапада 1821 г. на паседжанні Адміністрацыйнай рады была прынята пастанова Намесніка ў Каралеўстве Польскім Заёнчыка аб агульным, безумоўным і канчатковым закрыцці ўсіх тайных таварыстваў у Каралеўстве Польскім[54]. Практычна ўсе ложы на землях Беларусі былі зачынены. Іх архівы, грошы, рэчы, прадметы рытуала і сімволіка па прадпісанню Вялікага майстра А.Ражнецкага павінны былі быць сабраныя дзеля захавання[55].

Якраз у гэты час адбылася г.зв. "справа С.Міцканеўскага" – масон ложы "Руплівы ліцьвін" у ступені майстра пакінуў масонства. Пры гэтым ён патрабаваў, каб ложа вярнула яму 76 руб. ягоных сяброўскіх складак. А калі ложа адмовіла, дык звярнуўся з адпаведнымі прашэннямі да Віленскага галоўнага суда, губернскага праўлення, генерал-губернатара. Паколькі справа не была вырашына, С.Міцканеўскі двойчы звярнуўся з прашэннем на імя імператара і адзін раз – да яго Намесніка ў Каралеўстве Польскім. У ходзе справы былы масон па сутнасці зрабіў данос на вольнае мулярства, абвінаваціўшы яго ў падрыхтоўцы "народнага хвалявання" і вынішчэнні хрысціянскай веры. 8 лютага 1822 г. Рымскі-Корсакаў даслаў міністру ўнутраных справаў змястоўную запіску па "масонскім пытанні", а той паведаміў цару[56]. Несумненна, што гэтая справа толькі "падліла алею ў полымя" забароны масонства. 1 жніўня 1822 г. царскі ўказ забараніў ложы на ўсёй тэрыторыі імперыі.

Усе дзяржаўныя чыноўнікі, настаўнікі, прафесары, вайскоўцы павінны былі даваць падпіску аб непрыналежнасці да масонскіх і іншых тайных таварыстваў у крае ці за мяжой. У гарадзенскім і віленскім архівах захавалася частка масонскіх распісак двух узораў: не належаў да масонскай ложы і належаў да пэўнай масонскай ложы, але цяпер і ў будучым не буду належаць ні ў

[53] Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej...– S. 275.

[54] Załęski S. O masonii w Polsce od roku... – Cz.1. – S. 264, 272; Askenazy Sz. Lukasinski. – Warszawa,1908. – T. 2. – S. 93.

[55] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. Арк. 167.

[56] Добрянский С.Ф. Очерки из истории масонства в Литве. – С. 126-134.

краі, ні за мяжой[57]. 14 лістапада 1822 г. царскі намеснік Заёнчык загадаў забраць ключы ад скрыні з дакументамі і рэчамі Вялікага ўсхода Польскага[58].

Улады заняліся ліквідацыяй масонскіх сімвалаў, дэкарацый, зборам архіваў, а ў Менскай губ. – нават патрабаваннем выплаты "недаімак". Усё канфіскаванае павінна было захоўвацца (адпаведны загад цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча) у "архіве грамадзянскага губернатара пры сакрэтных справах". Напр., памешчык Адынец у 1827 г. перадаў уладам знакі ложаў "Сябры чалавецтва", "Шчаслівае вызваленне" і "Паўночная паходня". Аднак, відаць, не ўсе аддавалі масонскія рэчы. У 1830 г. пад час вобыску ў доме К.Валовіча знайшлі выдадзены яму патэнт, знак ложы і запон[59].

Большасць масонскіх ложаў спыніла свае працы, але ўрад адчуваў, што не ўсе. Сенатар Навасільцаў пісаў гарадзенскаму губернатару 24 траўня 1823 г.: "<...> Уважліва назірайце, ці не збіраюцца былыя масоны ў кагонебудзь са сваіх сяброў або ў трэцім месцы пад выглядам сяброўскіх размоваў, ці часта бываюць такія размовы і сходы, ці запрашаюцца на іх пабочныя асобы, чым яны займаюцца, ці не прасочваецца ўплыў якой-небудзь асобы на гэтыя сходы?.."[60] Губернатар М.Бутаўт-Анджэйковіч рэгулярна дакладваў пра выкананне распараджэнняў, але як былы масон, відаць, не вельмі рупіўся, бо ў Гародні працягвалася дзейнасць "Сяброў чалавецтва". Э.Ажэшка ў сваіх "Успамінах" занатавала: "<...> Бацька мой быў вальнадумцам, як гэта тады называлася, вальтэрыянцам. Ведаю, што паміж 1825 і 1840 годам належаў да адной з масонскіх ложаў, якія існавалі ў Літве"[61]. Дакладна вядома, што ў 1821 г. масон 3-й ступені Б.Паўлоўскі ў гарадзенскай ложы займаў пасаду Прамоўцы.

Такім чынам, на землях Беларусі ў канцы XVIII ст. – першай чвэрці XIX ст. дзейнічала да 17 масонскіх ложаў, склад як налічваў болей 1000 братоў. Літоўска-беларускія ложы падпарадкоўваліся Варшаве. Масонства з'яднала розныя часткі дэмакратычнай грамадскасці для вырашэння галоўнай задачы – адраджэння былой дзяржаўнасці. Яно ўнесла ў жыццё народаў лозунгі роўнасці, вольнасці і братэрства, паўплывала на стварэнне і дзейнасць тайных таварыстваў.

---

[57] НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 2860. Арк. 8, 15.

[58] Arhiwum Główne Akt Dawnyh. Zesp. K. Novosilcowa. – Sygn. 565. – K. 40.

[59] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. Арк. 20, 32, 40, 98, 322, 350, 366; НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 2860. Арк. 51, 62, 71-72, 83; Тамсама. Ф. 31, воп. 2, ад.з. 86. Арк. 36.

[60] НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 2860. Арк. 59.

[61] Jankowski E. Eliza Orzeszkowa. – Warszawa: PIW, 1966. – S. 21.

# ДАДАТКІ

## Арганізацыйная структура масонства на беларуска-літоўскіх землях (першая чвэрць XIX ст.)




Крыніцы: НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 2860. Арк. 3-4; Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. – Kraków, 1908. – Cz. 2. – S. 112-119; Вернадский Г.В. Русское масонство в царствование Екатерины II. – Петроград, 1917. – С. 18, 68; Пыпин А.Н. Русское масонство. XVIII и первая четверть XIX в. / Ред. и прим. Г.В.Вернадского. – Петроград: Огни, 1916. – С. 501-502, 521-522; Добрянский С. Ф. Очерки из истории масонства в Литве // Записки Северо-западного отдела Императорского Русского географического общества. – Вильна, 1914. – Кн. 4. – С. 136; Małachowski-Łempicki St. Wykaz polskich lož wolnomularskich oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum komisji historycznej Polskiej Akademii Umiejętności. – T. 14. – Kraków, 1930. – № 14. – S. 118, 160, 164; Уничтожение масонских лож в России. 1822 г. // Руская старина. – 1877. – Т. 28. – С. 664.

*Табл. 1.*

**Колькасць братоў у масонскіх ложах на землях Беларусі (першая чвэрць XIX ст.)**

| № пп | Назва ложы | Дзейсныя | Ганаровыя | Невядомыя | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Сябры чалавецтва | 100 | 64 | – | 164 |
| 2. | Паўночная паходня | 163 | 68 | – | 231 |
| 3. | Гара Табар | 31 | – | – | 31 |
| 4. | Вузел еднасці | 81 | 18 | – | 99 |
| 5. | Шчаслівае вызваленне | 132 | 87 | 25 | 244 |
| 6. | Святыня спакою | 131 | – | – | 131 |
| 7. | Уладзіслаў Ягайла | 32 | 47 | 43 | 122 |
| 8. | Саюз справядлівасці і дасканаласці | 2 | – | – | 2 |
| | Усяго | 672 | 284 | 68 | 1024 |

Крыніцы: НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 123-124, 129-130, 134-157, 163-166, 171, 179, 238, 240-245, 308-311; Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. – Kraków, 1908. – Cz.1. – S. 180-187, 191-199, 204-210; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX w. – Wrocław: Zaklad Narodowy im. Ossolińskich, 1982. – S. 297; Расейскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 156, воп.1, ад.з. 91. Арк. 213; ад.з. 147. Арк. 116; Ф. ВУА, т. 1, ад.з. 766, ч. 1.

*Табл. 2.*

**Сацыяльны склад масонскіх ложаў на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.)**

| Сацыяльны статус | Колькасць* |
|---|---|
| Прыдворныя чыны | 1 |
| Вышэйшыя дзяржаўныя чыны | 7 |
| Грамадзянскія чыны | 78 |
| Служачыя адукацыйных устаноў | 18 |
| Служачыя судовых устаноў | 97 |
| Служачыя паліцыі | 5 |
| Вайскоўцы | 122 |
| Шляхта і дваранства | 102 |
| Каталіцкія святары | 3 |
| Прафесары і вучоныя | 6 |
| Урачы і медыцынскія служачыя | 25 |
| Кампазітары і музыканты | 10 |
| Мастакі і скульптары | 1 |
| Рамеснікі | 4 |
| Слугі | 10 |
| Статус не высветлены | 187 |
| Усяго | 672 |

*Указаны толькі дзейсныя сябры. Асобы, якія згадваюцца ў некалькіх ложах лічыліся толькі аднойчы.

Крыніцы: НГАБ у Менску. Ф. 295, воп.1, ад.з. 286. Арк. 123-124, 129-130, 134-157, 163-166, 171, 179, 238, 240-245, 308-311; Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. – Kraków, 1908. – Cz.1. – S. 180-187, 191-199, 204-210; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX w. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1982. – S. 297; Расейскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 156, воп.1, ад.з. 91. Арк. 213; ад.з. 147. Арк. 116; Ф. ВУА, т. 1, ад.з. 766, ч. 1.

## Спіс масонскіх ложаў XVIII ст.

1. Гародня. Шчаслівае вызваленне (1781 – 1809)
2. Магілёў. Геркулес у калысцы (1776/77 – ?)
3. Магілёў. Двух арлоў (1770 – 1792)
4. Магілёў. Назва невядомая (1778 – 1779)
5. Нясвіж. Пераможаныя забабоны (? – ?)
6. Полацк. Талія (1777 – ?)
7. Слонім. Добры пастыр (1780 – ?)
8. Шклоў. Мудрасць (1791? – 1792?)

## Спіс масонскіх ложаў 1800 – 1861 гг.

1. Гародня. Сябры чалавецтва (1817 – 1840-е)
2. Менск. Паўночная паходня (1816 – 1821)
3. Менск. Гара Табар (1818 – 1821)
4. Менск. Святасць змовы (? – ?)
5. Менск. Святыня поўначы (не пазней 1820 – 1821)
6. Наваградак. Багіня Цэрэра (1816 – 1817)
7. Наваградак. Вузел еднасці (1817 – 1821)
8. Нясвіж. Шчаслівае вызваленне (1810 – 1821).
9. Нясвіж. Святыня спакою (1819 –1821)
10. Слуцк. Уладзіслаў Ягайла (1818 – 1821)
11. Шклоў. Саюз справядлівасці і дасканаласці (? – ?)

## Асабовы склад масонскіх ложаў напрыканцы XVIII ст.

## Гародня.
## Ложа "Шчаслівае вызваленне" ("L'heureuse Delivrance")

1) Бекю (Becu) Якуб. Майстар кафедры.
2) Бекю (Becu) Жан Луіс (Ян Людвік). Скарбнік.
3) Бютнэр (Büttner) Захары.
4) Вальтэр (Walter) Жан (Ян) Годэфрой.
5) Вязоўскі (Wiazowski) Луіс.

6) Готліб Чарльз (Golt?).
7) Гэмбоўскі. Майстар абрадаў.
8) Жылібер (Gilibert) Жан Эмануэль. Майстар кафедры.
9) Гімель (Gimel) Я. Першы дазорац.
10) Готліб Ефраім (Kaus?).
11) Мюнц (Müntz) І.Х. Другі дазорац (1781).
12) Нарвойш (Narwoysz) Францішак. Прамоўца (1781).
13) Сако (Sacco) Юзаф (1781).
14) Фэхнер (Fechner) Хрысціян Эрнэст.
15) Шмідт (Schmidt) Зыгфрыд.
16) Шрайбер (Schreiber) Фр. Сакратар.
17) Юрэвіч (Jurewicz) Тад.[62]

## Магілёў. Ложа "Геркулес у калысцы"*

1) Алееўцаў Васіль Іванавіч.
2) Вяроўкін Андрэй Іванавіч. Майстар кафедры.
3) Гамалея Сямён Іванавіч.
4) Гірш.
5) Дабрынін Гаўрыла Іванавіч.
6) Палянскі Васіль Ігнацьевіч. Майстар кафедры (1778-1779).
7) Стражаў Іван Мартынавіч. Брамнік, масон 2-й ст.
8) Шафрскі Фёдар.
9) Шварц Іаган Ягоравіч. Сябра-заснавальнік ложы. Майстар кафедры.

## Нясвіж. Ложа "Пераможаныя забабоны"

1) Вірыён (Virion, Wiryon) Караль Юзаф. Захавальнік пячаткі (1781).
2) Кіцкі Аўгуст. Упаўнаважаны пры Вялікім усходзе Каралеўства Польскага і ВКЛ (1784).
3) Мюнц Й.Х. Другі дазорац (1781).
4) Сухадолец. Майстар абрадаў (1781).
5) Шаняўскі Фабіян. Упаўнаважаны пры Вялікім усходзе Каралеўства Польскага і ВКЛ (1784).
6) Шрайбер Ф. Сакратар (1781).

## Шклоў. Ложа "Мудрасць"

Ільін Іван Ільіч.

---

[62] Ю.Гардзееў устанавіў імя яшчэ аднаго сябра ложы. Караль Юзаф Вірыён быў Захавальнікам пячаткі (гл. артыкул Ю.Гардзеева *З гісторыі гарадзенскіх масонаў*) [тут і далей заўвагі рэд.].

***Дамінік Манюшка** (6 ліпеня 1788 г., мяст. Смілавічы Ігуменскага павета – 26 верасня 1848 г., Менск), асветнік. Пасля заканчэння Віленскага універсітэту атрымаў вучоную ступень доктара права. У 1812 г. ваяваў на баку арміі Напалеона. У 1816 г. пакінуў вайсковую службу ў арміі Каралеўства Польскага ў чыне маёра і заняўся гаспадаркай у спадчынным маёнтку Роткаўшчына Ігуменскага пав.*

*Быў актыўным удзельнікам масонскага руху, гуманістычна-ліберальная ідэалогія якога моцна паўплывала на яго светапогляд. У 1819-1820 гг. ён узначальваў ложу "Паўночная паходня". У гэтыя ж гады быў ініцыяваны ў 7° паводле Шатландскага рытуалу. У якасці ганаровага сябра ўваходзіў у склад ложаў "Школа Сакрата" і "Шчаслівае вызваленне". Таксама належаў да капітулы "Гара Табар".*

*Абавязковай для вольных муляраў дабрачыннай дзейнасцю Д.Манюшка займаўся ва ўласных маёнтках Роткаўшчына і Пацічола. Ён забараніў цялесныя пакаранні і арганізаваў вясковыя суды, прысуды якіх не прыніжалі чалавечую годнасць. Д.Манюшка падзяліў увесь вялікі маёнтак на калоніі па тры валокі зямлі разам з лугам і лесам у кожнай і перадаў іх сялянам, якія за гэта павінны былі плаціць невялікі чынш. Атрыманыя сродкі пайшлі на культурна-асветніцкія мэты, а менавіта ў 1824 г. былі заснаваныя ў Пацічоле школа для дзяўчат паводле методыкі Песталоцы і ў Роткаўшчыне – школа для хлопчыкаў паводле методыкі Ланкастэра. Пры школах былі сады з лекавымі раслінамі, існаваў шпіталь з аптэкай. У школе ў Роткаўшчыне былі створаныя хімічная лабараторыя і фізычны кабінет, дзейнічала бібліятэка. Праграма навучання ўключала Закон божы, арыфметыку, расейскую і польскую мовы, геаметрыю з практычнай метралогіяй, прыродазнаўства,*

# Асабовы склад масонскіх ложаў 1800 – 1822 гг.

## Гародня. Ложа "Сябры чалавецтва" ("Przyjaciele Ludzkości") .

1) Адамовіч (Adamowicz) Якуб. Ініцыяваны каля 1819 г., сябра ложы 2-й ст. (1821).
2) Адынец (Odyniec) Геранім. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 5-й ст.
3) граф Алізар (Olizar) Нарцыз Філіпавіч. Ганаровы сябра ложы.
4) Аляшкевіч (Oleszkiewicz) Юзаф Янавіч. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 3-й ст., Прамоўца ложы "Белы арол" у Санкт-Пецярбургу.
5) Анджэйковіч (Бутаўт-Анджэйковіч, Andrzeykowicz) Міхал Фадзеевіч. Сябра ложы 4-й ст., 5-й ст. (1820-1821), майстар (1818-1822).
6) Анджэйковіч (Andrzeykowicz) Фелікс. Масон 31-й ст.
7) Анджэйковіч (Andrzeykowicz) Ян Фадзеевіч. Ініцыяваны каля 1816 г., сябра ложы 4-й ст. (1819), 5-й ст. (1821).

*гісторыю краю, а таксама гімнастыку, пчалярства, садоўніцтва, хатнюю гаспадарку, сталярства ды інш. Заняткі праходзілі ў зімовы перыяд, а летам вучні адбывалі практыку або ў школьных садах, або ў бацькоўскай гаспадарцы. Увесь курс навучання складаў 2 гады.*

*У 1838 г. па загаду ўладаў адукацыйны эксперымент быў спынены, а школы зачыненыя. Аднак дабрачынная і асветніцкая дзейнасць Д.Манюшкі мела добры плён. Адам Кіркор у 1882 г. пісаў: "Пакаленне, выхаванае Манюшкам, абсалютна змянілася. Гэта былі разумныя, праўдзівыя, працалюбівыя і высокамаральныя земляробы <...> Да сённяшняга дня сяляне Роткаўшчыны шмат чым адрозніваюцца ад сваіх суседзяў, а імя Манюшкі і сёння вельмі шануецца сялянамі".*

*Дамінік Манюшка пераехаў у Менск, дзе і памёр увосень 1848 г. пад час эпідэміі халеры. Паводле Аляксандра Ельскага, на ягонай магіле недалёка ад Камароўкі быў пастаўлены помнік з надпісам: "Ад удзячных падданых сялянаў".*

---

Літ.: Ельскі А. Дамінік Манюшка (1788-1848) // Голас Радзімы. – 17 верасня 1998 г.; Гатальскі І. Масон з Роткаўшчыны // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 5; Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Под общей ред. П.П.Семенова. – Том третий. – Часть вторая. Белорусское Полесье. – М. – Спб., 1882; Маслыка Г.А. Манюшка Дамінік (6.7.1788-26.9.1848) // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX ст. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 487; Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego WKL (1776-1822). – Wilno, 1930.

*Алесь Смалянчук (Гародня)*

8) Багурскі (Bogurski) Пётр. Масон 33-й ст. (1821), прадстаўнік Амерыканскага Савета.
9) Бжэзіна (Brzezina) Юзаф. Заснавальнік ложы, масон 3-й ст. (1819-1821).
10) Блажэўскі (Błażewski) Банавентура [Блажэеўскі – Ю.Г.]. Ганаровы сябра ложы, яе Упаўнаважаны пры Вялікім усходзе (1821).
11) Бліорэ (Bliore) Артур Карл. Сябра ложы, брат служачы (1819-1821), масон 2-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
12) Блоцкі (Błocki) Станіслаў Міхайлавіч. Сябра ложы (1819), масон 1-й ст. (1821).
13) Брадоўскі (Brodowski) Антоні (Антон Марцінавіч). Сябра ложы (1819), масон 2-й ст. (1821).
14) фон Брэм Лорэнц Іаган Людвіг*. Ганаровы сябра ложы, ініцыяваны ў 1815 г.

---

* Вольны муляр, прозвішча якога адсутнічае ў спісе Ю.Гардзеева (гл. артыкул *З гісторыі гарадзенскіх масонаў*), пазначаны зоркай. У выпадку, калі Ю.Гардзееў дае іншае напісанне імя або прозвішча, яно падаецца ў квадратных дужках [заўвага рэд.]

15) Бухавецкі (Bychowiecki) Людвіг [Людгард-Ю.Г.]. Масон 2-й ст. (1821).
16) Быкоўскі (Bykowski) Канстанцін Фадзеевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1821).
17) Быстры (Bystry) Каспар. Масон 2-й ст. (1821).
18) Бычыньскі (Byczyński) Ян Юр'евіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст.
19) Бялоцкі (Białocki) Гжэгаж [Рыгор – Ю.Г.] Іванавіч. Заснавальнік ложы, масон 4-й ст. і Скарбнік (1819).
20) Вальтэр (Wolter) Багуміл Іванавіч. Масон 1-й ст. (1821).
21) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Фларыян. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820), 6-й ст. (1821).
22) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Юзаф Мікалаевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1821).
23) Валовіч (Wołłowicz) Ян. Масон 1-й ст. (1821).
24) граф Валовіч (Wołłowicz) Яўхім Антонавіч*. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 3-й ст.
25) Верашчака (Wereszczaka) Юзаф Антонавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
26) Вейсенгоф (Weysenhoff) [Вайсанхоф – Ю.Г.] Францішак. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
27) Відацкі (Widacki) Якуб Філіпавіч. Масон 1-й ст. (1821).
28) Вірыён (Wiryon) Ян Юзафавіч (Восіпавіч). Заснавальнік ложы, масон 3-й ст. (1819-1821).
29) Вітаноўскі (Witanowski) Дамінік Янавіч. Прамоўца (1818-1820), масон 4-й ст. (1821).
30) Вітаноўскі (Witanowski) Міхал Янавіч. Другі дазорац (1818), Першы дазорац (1819), Майстар (1820), масон 4-й ст. (1821).
31) Галіцкі (Halicki) Якуб. Масон 2-й ст. (1821).
32) Гарабурда (Haraburda) Адам. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1821).
33) Гарагляд (Horehlad) [Гарыгляд – Ю.Г.]Юзаф Якімовіч. Масон 3-й ст. (1819-1821).
34) Гарэцкі (Gorecki) Юзаф Валянцінавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1821).
35) Генч (Hentsch) [Геч – Ю.Г.] Францішак. Ганаровы сябра ложы (1821).
36) Герланд Федар Федаравіч*.
37) Герс (Giers) Аляксандр Карлавіч. Масон 3-й ст. (1819-1821).
38) Главацкі (Glowacki) Юзаф Антонавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
39) Гласка (Hłasko) [Глашка – Ю.Г.] Юльян Леапольдавіч. Масон 3-й ст. (1819-1821).
40) Глінскі (Glinski) Аўгустын. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 7-й ст.
41) Гофман (Hofman) Караль. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 7-й ст.
42) Грамыка (Грамыкін) Юзаф Станіслававіч*. Ганаровы сябра ложы.
43) Гродэк (Groddeck) Багдан (Эрнэст?) [Гродэк Эрнэст Готфрыд – Ю.Г.] Веніямінавіч. Ганаровы сябра ложы.
44) Грыгаровіч (Hrehorowicz) Караль. Масон 1-й ст. (1819-1821).
45) Губарэвіч (Hubarewicz) Станіслаў. Масон 2-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
46) Дабжанскі (Dobrzanski) Вінцэнт Антонавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 6-й ст.
47) Далінскі (Dolinski) Станіслаў. Масон 2-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
48) Дамброўскі (Dąbrowski) Міхал Лявонцьевіч. Ініцыяваны каля 1817 г., масон 1-й ст. (1819), 2-й ст. (1821).

49) Дамброўскі (Dąbrowski) Хрызастам. Ганаровы сябра, масон 7-й ст. (1820).
50) Данкевіч (Dankiewicz) Рамуальд Марцінавіч. Масон 2-й ст. (1819), масон 3-й ст. і Ялмужнік (1821).
51) Даўнаровіч (Downarowicz) Казімір. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
52) Дзежыц (Dzieżyc) Ян. Масон 2-й ст. (1821).
53) Дзяконскі (Dziekonski) Юзаф. Масон 2-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
54) Князь Длускі (Dłuski) Міхаіл Сцяпанавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
55) Дмухоўскі [Дмахоўскі – Ю.Г.] Міхал. Ганаровы сябра ложы.
56) князь Друцкі-Любецкі (Drucki-Lubecki) Ксаверы Францішак [Любецкі-Друцкі Францішак Ксаверы – Ю.Г.]. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
57) Елец (Jelec) Адам Юзафавіч. Масон 1-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
58) Елец (Jelec) Антоні Міхайлавіч. Масон 3-й ст. і Суддзя (1819-1820), 4-й ст. і Намеснік майстра (1821).
59) Ельскі (Jelski) Юзаф Юзафавіч. Масон 1-й ст. (1819), 2-й ст. (1821).
60) Ельскі (Jelski) Плацыд. Масон 1-й ст. (1821).
61) Жышкевіч (Żyszkewicz) Антоні. Масон 3-й ст. і Першы сцюарт (1819), Сакратар (1821).
62) Жукоўскі (Żukowski) Шыман. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
63) Граф Жэвускі (Rzewuski) Адам Станіслававіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
64) Граф Жэвускі (Rzewuski) Генрых Адамавіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 5-й ст.
65) Завадскі Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820-1821).
66) Загурскі (Zagórski) Ян. Масон 2-й ст. (1819), 3-й ст. і Будаўнічы рахмістр (1821).
67) Задарноўскі (Zadarnowski) Станіслаў. Масон 3-й ст. (1819-1821).
68) Заха (Zacha) Ян Янавіч. Масон 3-й ст. і Ялмужнік (1819), масон 4-й ст. (1821).
69) Іваноўскі (Iwanowski) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й (1821).
70) Івашкевіч (Iwaszkiewicz) Ян. Ганаровы сябра. Упаўнаважаны пры Вялікім усходзе (1821), масон 7-й ст.
71) Кайсараў (Kaysarof) Пётр Сяргеевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1819-1821).
72) Казлоўскі (Kozłowski) Міхал. Масон 3-й ст. (1821).
73) Граф Камароўскі (Komarowski) Бальтазар Іванавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1821).
74) Каменскі (Kamienski) Казімір. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст.
75) Каменскі (Kamienski) Людвік Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
76) Каменскі (Kamienski) Юзаф Францавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
77) Каміньскі (Kamiński) Ян. Масон 3-й ст. (1819).
78) Канюшэўскі (Koniuszewski) Ян. Масон 3-й ст. (1821).
79) Капроўскі Юзаф. Масон 1-й ст. (1821).
80) Кашуба Адольф.
81) Кожыц Якуб*.
82) Котвіч (Kotwicz) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).



**Ян Ходзька (Барэйка)** *(24 чэрвеня 1777 г., мяст. Крывічы Вілейскага павета – 10 лістапада 1851 г., Менск), пісьменнік, драматург, грамадскі дзеяч. У 1793 г. быў абраны цывільна-вайсковым камісарам Ашмянскага павету. З 1795 г. – асэсар суда ў Паставах, з 1798 г. –падсудак, з 1808 г. – падкаморы Вілейскага павету, з 1811 г. – старшыня Галоўнага цывільнага суда ў Менску. На гэтай пасадзе Ян Ходзька разгарнуў актыўную грамадска-культурную дзейнасць. Ён арганізоўваў тэатральныя пастаноўкі і канцэрты, выступаючы адначасова аўтарам п'есаў, рэжысёрам і акцёрам. Сродкі ад спектакляў ішлі на дзейнасць Менскага таварыства дабрачыннасці.*

*У вайне 1812 г. як патрыёт былой Рэчы Паспалітай актыўна падтрымаў Напалеона. Менавіта ён не дапусціў знішчэння расейцамі харчовых запасаў ў Менску падчас іх адступлення, удзельнічаў у стварэнні Часовай рады ВКЛ, дзе займаўся фінансавымі і медыцынскімі пытаннямі. Ян Ходзька напісаў і надрукаваў у "Менскай газеце" патрыятычны твор пад назвай "Вызваленая Літва". Пасля выгнання Напалеона нейкі час жыў у Варшаве.*

*У Менск вярнуўся толькі пасля амністыі. Адразу аднавіў сваю грамадска-асветніцкую дзейнасць. Стаў актыўным арганізатарам ложаў вольных муляраў у Літве і Беларусі. У 1816 г. быў адным з заснавальнікаў менскай ложы "Паўночная паходня" і стаў яе першым Вялебным. У ліпені 1816 г. быў пасвечаны ў вышэйшыя шатландскія ступені. Прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі віленскіх ложаў. У канцы 1816 г. удзельнічаў у аднаўленні Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць", у 1818 г. быў сярод заснавальнікаў ложы "Школа Саката", сябры якой абралі яго Вялебным. Як ганаровы сябра належаў таксама да гарадзенскай ложы "Сябры чалавецтва". Менавіта ён прапанаваў далучэнне да вольнамулярства Тамашу Зану (1821).*

*Адначасна быў ганаровым сябрам Таварыства шубраўцаў, Таварыства дабрачыннасці, Віленскага друкарскага таварыства, клапаціўся аб распаўсюджванні прышчэпак ад воспы і г.д. Цікавіўся праблемай асветы. У часопісе "Dzieje dobroczynności" выступіў як прыхільнік адкрыцця шматлікіх сельскіх школаў і распаўсюджвання асветы сярод народу. Прапагандаваў стварэнне школ для бедных вучняў па метаду Ланкастэра. У 1821 г. Ян Ходзька выдаў кнігу "Пан Ян са Свіслачы", напісаную ў форме гутарак галоўнага героя з сялянамі. Гэтая форма дазваляла абмяркоўваць сельскагаспадарчыя і гандлёвыя справы, праблемы здароўя і выхавання дзяцей ды інш. Яна вытрымала шэсць выданняў і здабыла для аўтара годнасць ганаровага сябра Рады Віленскага універсітэта. У 1822 – 1823 гг. Ян Ходзька выконваў абавязкі інспектара школаў Віленскай, Магілёўскай і Віцебскай губ. Ягоным сакратаром быў Тамаш Зан.*

*Паводле ўспамінаў, Ян Ходзька быў незвычайным чалавекам. Яго адрознівала адкрытасць і шчырасць, дабразычлівасць і ветлівасць, вясёлы і лёгкі нораў, які ўсіх зачароўваў. Гэта быў высока адукаваны і шляхетны чалавек.*

*Ян Ходзька падтрымліваў добрыя адносіны з моладзю. Быў сябрам Таварыства філаматаў (па некаторых звестках з'яўляўся ініцыятарам гэтага руху). Разам з іншымі філаматамі быў арыштаваны, пасля доўгага судовага следства і працэсу (1826-1829) быў аддадзены пад нагляд паліцыі і вясной 1830 г. вярнуўся ў Вільню. За ўдзел у паўстанні 1830 – 1831 гг. разам з сынам Юзафам быў сасланы на Урал. Вярнуўся адтуль у 1834 г. З-за недахопу сродкаў Ходзькі былі вымушаны прадаць маёнтак Крывічы і набыць невялікі фальварак Яноўшчыну ў Менскім пав. Ян Ходзька заняўся літаратурнай працай. Ён пісаў апавяданні, аповесці, успаміны, навукова-гістарычныя працы. Ягоныя творы склаліся ў 12-томныя "Pisma rozmaite autora "Pana Jana ze Świsłoczy", выдадзеныя ў Вільні ў 1837 – 1842 гг. Друкаваўся ў часопісах "Dziennik Wileński", "Athenaeum", альманаху "Rubon" ды інш.*

*Пахаваны Ян Ходзька ў Заслаўі.*

Тв.: "Pisma rozmaite autora "Pana Jana ze Świsłoczy". – T. 1-12. – Wilno, 1837-1842; Diecezja Mińska około 1830 r. – T. 1. – Lublin, 1998.

Літ.: Мархель У. Як свечка перад згасаннем // Мархель У. Прысутнасць былога. – Мінск, 1997; Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X-XIX ст.: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 590; Рыбчонак С. Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагоддзя (Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі) // Годнасць. – 1994. – № 1(2); Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 6. – Ч. 2. – Мінск, 2003. – С. 74; Chodźko D.C. Jan Chodźko: Obrazek życiorysowy // Teka Wileńska. – 1858. – № 5; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX wieku. – Wrocław, 1982. – S. 274, 286, 297; Małachowski-Łempicki St. Wykaz polskich loż wolnomularskich oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum komisji historycznej Polskiej Akademii Umiejętności. – T. 14. – Kraków, 1930. – S. 209; Turska H. Język Jana Chodźki. – Wilno, 1930; Polski Słownik Biograficzny. – T. III. – Kraków, 1937. – S. 384-385; Encyklopedja powszechna / S.Michalski. – T. 2. – Warszawa, [b.r.]. – S. 471; Ilustrowana Encyklopedja Trzaski, Everta i Michalskiego / S.Lam. – T. 1. – Warszawa, 1927. – S. 607.

*Іна Соркіна (Гародня)*

83) Крыдэль (Krydel) Аляксандр Антонавіч. Сябра ложы, масон 3-й ст. (1819-1821).
84) Крыдэль (Krydel) Ануфры Антонавіч. Сябра-заснавальнік ложы, масон 3-й ст. (1819-1821).
85) Крэйбіх (Kreybich) Казімір. Другі дазорац (1819-1821), масон 3-й ст. (1819), 4-й ст. (1821).
86) Кузімовіч (Kuzimowicz) Тамаш. Масон 3-й ст. (1821).
87) Кунцэвіч (Kuncewicz) Юзаф Юр'евіч. Масон 1-й ст. (1819), 2-й ст. (1821).
88) Кунцэвіч (Kuncewicz) Ежы [Юры – Ю.Г.] Юр'евіч. Масон 3-й ст. (1821).
89) Ланьскі (Łański) Сяргей Сцяпанавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1821).
90) Ласковіч (Łaskowicz) Станіслаў. Ініцыяваны каля 1817 г., масон 2-й ст. (1821).
91) Лыкаў (Łykow) Тэадор. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).

92) Ляхніцкі (Lachnicki) Ігнацы Антонавіч. Заснавальнік ложы, Майстар кафедры (1820), масон 4-й ст. (1819), 5-й ст. (1820).
93) Ляхніцкі (Lachnicki) Ігнацы Эмануіл. Заснавальнік ложы, масон 4-й ст. (1821).
94) Малеўскі (Malewski) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820-1821).
95) граф Мараўскі (Morawski) Караль Дзям'янавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820-1821).
96) Марачэўскі (Moraczewski) Казімір Мацвеевіч. Масон 2-й ст. (1821).
97) Марачэўскі (Moraczewski) Тэафіл. Масон 1-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
98) Маркіановіч (Markianowicz) Юзаф Тамашавіч. Ганаровы сябра ложы (1821).
99) Маркіановіч (Markianowicz) Міхал Тамашавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1821).
100) Мацкевич (Mackiewicz) Міхал. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820-1821).
101) Межаеўскі (Mierzejewski) Антоні*. Масон 4-й ст. і Скарбнік (1820).
102) Межаеўскі (Mierzejewski) Калікст Юзафавіч. Майстар кафедры (1818), масон 5-й ст. (1819), 7-й ст. (1821).
103) Межаеўскі (Mierzejewski) Фелікс. Майстар абрадаў, масон 3-й ст. (1819-1820), ганаровы сябра (1821).
104) Міхаэліс (Michaelis) Ян. Масон 1-й ст. (1819), масон 3-й ст. і Другі сцюарт (1821).
105) фон Міхельсон (Michelson) Бернард (Берэнс) Міхайлавіч. Масон 4-й ст. (1819-1820).
106) Граф Мусін-Пушкін Брус (Mousin-Puszkin) Васіль Валянцінавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст.
107) Мухлінскі (Muchliński) Ігнацы. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820-1821).
108) Мэйнэ (Meine) [Майнэ – Ю.Г.] Філіп. Сябра-заснавальнік ложы, Першы сцюарт (1819), масон 3-й ст. (1821).
109) Насажэўскі (Nosarzewski) Юліян. Масон 2-й ст. (1819-1821).
110) Невядомскі (Niewiadomski) Якуб. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 4-й ст.
111) Незабытоўскі (Niezabytowski) Стэфан. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 4-й ст.
112) Нелюбовіч (Nielubowicz) Юзаф. Ініцыяваны каля 1818 г., масон 2-й ст. (1819), 3-й ст. і Скарбнік (1821).
113) Нелюбовіч (Nielubowicz) Ян. Ініцыяваны каля 1818 г., масон 1-й ст., Захавальнік пячаткі і архіва (1821).
114) Непакайчыцкі (Пацей-Непакайчыцкі) (Niepokoyczycki) Адам Варфаламеевіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст. (1818).
115) Нефел [Нефёль – Ю.Г.] Фрыдрых. Масон 1-й ст. і брат служачы (1821).
116) Нямцэвіч (Niemciewicz) Ян. Масон 3-й ст. (1819-1821).
117) Паўлоўскі (Pawłowski) Бенедыкт. Сакратар (1819-1820), масон 3-й ст., Прамоўца (1821).
118) Пахнеўскі (Pachniewski) Антоні. Масон 2-й ст. (1819-1821).
119) Пярфільеў (Perfiliew) Павел. Масон 2-й ст. (1821).
120) Патоцкі (Костка-Патоцкі) (Potocki-Kostka) Станіслаў Яўстаф'евіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст (1821).
121) Пуцілоўскі (Puciłowski) Бенэдыкт. Ганаровы сябра, масон 4-й ст. (1821), прадстаўнік у ложы "Дасканалая еднасць" (1818-1820).
122) Плятэр (Plater) Людвік. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст.

123) Ражнецкі (Rożniecki) Аляксандр Аляксандравіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
124) Рамбяліньскі (Rembieliński) Віктар. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. Упаўнаважаны пры Вялікім усходзе (1817-1819).
125) Рамбяліньскі (Rembieliński) Раймонд. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 7-й ст.
126) Барон Розэн (Rozen) (Фрыдэрык) Фёдар Фёдаравіч. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 5-й ст.
127) Граф Рдултоўскі (Rdułtowski) Казімір. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
128) Робі (Robbi) Мікалай. Масон 3-й ст. і Другі сцюарт (1821).
129) Ромэр (Romer) Міхал Сцяпанавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
130) Ронгэ (Ronge) Караль. Ганаровы сябра ложы, масон 6-й ст. (1821).
131) Ружыц Якуб Шымановіч*. Масон 1-й ст. (1819).
132) Рымовіч (Rymowicz) Міхал. Масон 2-й ст. (1821).
133) Рымскі-Корсакаў (Rzymski-Korsakow) Андрэй Пятровіч. Ганаровы сябра ложы, масон 6-й ст.
134) Рэвель (Rewel) Юзаф. Брат служачы (1819-1821), масон 3-й ст. (1821).
135) Сержпутоўскі (Sierzputowski) Ян. Масон 4-й ст. (1819), ганаровы сябра ложы (1821).
136) Сіманоўскі (Simanowski) Пётр. Сакратар (1818), масон 4-й ст. (1819-1821).
137) Сіпайла (Sipayło) Юзаф Міхайлавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
138) Скіндар (Skinder) Ігнацы Міхайлавіч. Масон 3-й ст. (1819-1821).
139) Смігевіч (Smigewicz) Себасцьян*. Масон 2-й ст. (1821).
140) Стычыньскі (Styczyński) Вінцэнт Ягоравіч. Масон 3-й ст. і Першы дазорац (1821).
141) Судхоўскі [Судакоўскі – Ю.Г.] Пётр.
142) Сядлецкі (Siedlecki) Казімір Мацвеевіч. Масон 4-й ст., Захавальнік пячаткі і архіва (1819-1820), ганаровы сябра ложы (1821).
143) Сядлецкі (Siedlecki) Фелікс Мацвеевіч. Масон 1-й ст. (1821).
144) Фаленьскі (Faleński) Антоні Юзафавіч. Масон 1-й ст. (1819), 2-й ст. (1821).
145) Філсян (Fiłsjan) [Філс'ян – Ю.Г.] Ян. Масон 1-й ст. (1821).
146) Хабжыньскі (Chobrzyński) Юзаф. Масон 5-й ст. (1819).
147) Хлявінскі (Chlewinski) Адам. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1821).
148) Хмялеўскі Ян.
149) Ходзька (Chodźko) Ян Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
150) Чачкоўскі (Czaczkowski) Міхал. Масон 2-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
151) Шпінгер*. Масон 3-й ст. (1821).
152) Шукевіч (Szukewicz) Алойзы Антонавіч. Масон 1-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
153) Шуліпнікаў (Schoulipnikow) Рамуальд [Раман – Ю.Г.] Сяргеевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1821).
154) Шыц (Szyc) Караль. Масон 3-й ст. (1819), ганаровы сябра ложы (1821).
155) Шышка (Szyszko) Леапольд Юзафавіч. Масон 1-й ст. (1819), 2-й ст. (1821).
156) Шэдэ (Schede) Фрыдэрык. Масон 1-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).
157) Эйсымонт (Эйсмант) (Eysymont) Юзаф Мацвеевіч*. Масон 3-й ст. і Майстар абрадаў (1819).
158) Эйсымонт (Эйсмант) (Eysymont) Караль*. Масон 2-й ст. (1821).



**Гродэк Готфрыд Эрнэст** *(17.11. 1762 – 11.04. 1825) – філолаг (класічныя мовы), даследчык старажытнай грэчаскай гісторыі і літаратуры. Нарадзіўся ў Гданьску. Вучыўся ў Гетынгенскім універсітэце, дзе ў 1786 г. атрымаў ступень доктара філасофіі. З наступнага году працаваў у Пулавах бібліятэкарам і выхавальнікам Адама і Канстанціна Чартарыйскіх. З 1804 г. Г.Гродэк заняў у Віленскім універсітэце пасаду прафесара грэчаскай мовы, а праз тры гады і лацінскай мовы і літаратуры. З 1805 па 1817 г. ён спалучаў з выкладаннем выкананне абавязкаў прэфекта універсітэцкай бібліятэкі і кусташа нумізматычнага кабінету. Дзякуючы намаганням Г.Гродэка ва універсітэце пачаў дзейнічаць польскі філалагічны семінар, сярод наведвальнікаў якога былі А.Міцкевіч, Т.Зан, Я.Чачот ды інш. З'яўляўся адным з найлепшых прафесароў Віленскага універсітэту, быў цалкам аддany працы, умеў перадаць уласную цікавасць і захапленне студэнтам. Меў вялікі ўплыў на слухачоў. Не выключана, што менавіта ён абудзіў у Адама Міцкевіча любоў да класічнай паэзіі і дапамог атрымаць грунтоўныя філалагічныя веды.*

*Готфрыд Гродэк прычыніўся да ажыўлення культурнага жыцця Вільні. У 1806 г. ён стаў заснавальнікам і рэдактарам "Віленскай літаратурнай газеты". З'яўляўся сурэдактарам "Віленскага дзённіка" і "Віленскага тыгодніка".*

159) Ютэйка (Juteyko) [Ятэйка – Ю.Г.] Палікарп. Масон 2-й ст.

160) Ягалкоўскі Ежы (Рыгор)*. Масон 4-й ст., упаўнаважаны пры Вялікім усходзе (1820).

161) Ягмін (Jagmin) Павел Каэтанавіч. Масон 2-й ст. (1819-1821).

162) Ягмін (Jagmin) Станіслаў. Масон 1-й ст. (1819), 3-й ст. (1821).

163) Яноўскі (Janowski) Вінцэнт. Першы дазорац (1818), Майстар кафедры (1818), масон 4-й ст. і Суддзя (1821).

164) Ясковіч (Jaskowicz) Станіслаў*.

## Менск. Ложа "Паўночная паходня"

1) Аборскі (Oborski) Гіляры. Масон 2-й ст. (1820).

2) Адынец (Odyniec) Геранім. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).

3) Азямблоўскі (Oziębłowski) Віктар. Масон 1-й ст. (1820).

*Г.Гродэк быў сябрам-карэспандэнтам Каралеўскага навуковага таварыства ў Гетынгене, ганаровым старшынёй Таварыства маральных навук у Вільні. Імя Готфрыда Эрнэста Гродэка звязваецца са стварэннем польскай школы класічнай філалогіі і аўтарствам дзесятка навуковых працаў.*

*У 1813 г. прайшоў ініцыяцыю ў віленскай ложы "Руплівы ліцьвін", якая вяла актыўную навуковую і публіцыстычную дзейнасць. У 1816 г. быў прыняты таксама ў склад элітарнай варшаўскай ложы "Казімір Вялікі". Адначасна заставаўся актыўным удзельнікам жыцця віленскіх вольных муляраў. Уваходзіў у Правінцыяльную ложу "Дасканалая еднасць" (з 1816 г.) і сімвалічную ложу "Добры пастыр" (з 1820 г.). У 1818 г. падтрымаў спробу рэфармавання вольнага мулярства Рэчы Паспалітай, з якой выступілі Казімір Контрым і Якуб Шымкевіч. Належаў да ложы "Руплівы ліцьвін рэфармаваны". Быў ганаровым сябрам віленскай ложы "Школа Сакрата" (1820), гарадзенскай ложы "Сябры чалавецтва", а таксама ложы "Увенчаная цнатлівасць" (Дубна).*

---

Літ.: Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX ст.: Энцыклапедычны даведнік – Мінск, 1995. – С. 203-204; Асветнікі зямлі беларускай: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 121-122; Groddeck G.E. // Polski Słownik Biograficzny. T.VIII. – Wrocław-Kraków-Warszawa, 1959-1960. – S. 639; Mężyński K. Gotfryd Ernest Groddeck – profesor Adama Mickiewicza. Próba rewizji. – Gdańsk, 1974; Małachowski-Łempicki St. Wykaz polskich loż wolnomularskich oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum komisji historycznej Polskiej Akademii Umiejętności. – T. 14. – Kraków, 1930. – S. 209.

*Вольга Шаталава (Менск)*
*Іна Соркіна (Гародня)*

4) Аксамітоўскі (Axamitowski) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
5) Акушка (Okuszko) Юзаф. Масон 2-й ст. (1820).
6) Алеша (Olesza) Ігнацы Леапольдавіч. Масон 2-й ст. (1820).
7) Граф Алізар Нарцыз Філіпавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст.
8) Аляшкевіч (Oleszkiewicz) Ян. Масон 1-й ст. (1820).
9) Арцімовіч (Arcimowicz) Гіляры. Масон 1-й ст. (1820).
10) Арцімовіч (Arcimowicz) Феліцыян Венедыктавіч. Масон 3-й ст. і Скарбнік (1820).
11) Арцішэўскі (Arciszewski) Антон Казіміравіч. Масон 3-й ст. (1820).
12) Асіньскі (Osiński) Людвік*. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
13) Аскерка (Oskierka) Казімір. Масон 3-й ст. (1820).

---

* Вольны муляр, прозвішча якога адсутнічае ў спісе С.Рыбчонка (гл. артыкул *Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 ст...*), пазначаны зоркай. У выпадку, калі С.Рыбчонак дае іншае напісанне прозвішча, яно падаецца ў квадратных дужках.

14) Аскерка (Oskierka) Ян. Масон 3-й ст. (1820).
15) Ашторп (Osztorp) Леан Францавіч. Майстар абрадаў, масон 4-й ст. (1820).
16) Багдановіч (Bohdanowicz) Ануфры. Масон 3-й ст. (1820).
17) Багдановіч (Bohdanowicz) Вінцэнт*. Масон 4-й ст. (1820).
18) Багдановіч (Bohdanowicz) Ігнацы. Масон 4-й ст. (1820).
19) Багдановіч (Bohdanowicz) Казімір*. Масон 2-й ст. (1820).
20) Бардскі Матэвуш.
21) Бачыжмальскі (Baczyżmalski) [Багіжмольскі – С.Р.] Тэадор. Масон 3-й ст. (1820).
22) Беліковіч (Bielikowicz) Францішак. Перайшоў з Пецярбургскай ложы, масон 1-й ст. (1820).
23) Белінковіч (Bielinkowicz) [Беліковіч – С.Р.] Ян. Масон 2-й ст. (1820).
24) Беліновіч (Bielinowicz) Цыпрыян Львовіч. Масон 3-й ст. і Захавальнік пячаткі (1820).
25) Бярновіч (Bernowicz) Сарвацы. Другі дазорац (1818), масон 4-й ст. (1820).
26) Бетхер (Bether) [Ветлер – С.Р.] Густаў Янавіч*. Масон 3-й ст. (1820).
27) Бжастоўскі (Brzostowski) Аўгуст. Масон 3-й ст. (1820).
28) Бідэрман (Biderman) Караль. Масон 2-й ст. (1820).
29) Борсук (Borsuk) Ян*. Масон 1-й ст. (1820).
30) Брадоўскі (Brodowski) Ігнацы. Масон 3-й ст. (1817).
31) Брант (Brant) Ян. Масон 3-й ст. (1820).
32) Бургельскі (Burgielski) Альберт. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1818-1820).
33) Буцэвіч (Bucewicz) Ігнацы Антонавіч. Масон 3-й ст. (1820).
34) Буцэвіч (Bucewicz) Ян. Ганаровы сябра, масон 3-й ст. (1820).
35) Бястужаў (Bestużew) Іван Сцяпанавіч. Масон 1-й ст. (1820).
36) Б.Я. (B. I.)* Масон 4-й ст., Прамоўца (1820).
37) Вазніцкі Міхал*. Майстар кафедры (1818).
38) Вайдзевіч (Woydziewicz) [Вандзевіч – С.Р.] Ліфтан-Арыст. Масон 1-й ст. (1820).
39) Вайдзевіч (Woydziewicz) Фелікс Францавіч. Першы дазорац (1817), масон 4-й ст. (1820).
40) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Казімір Юзафавіч*. Масон 1-й ст. (1820).
41) Валадковіч (Wołodkowicz, Wołodkewicz) Вінцэнт. Масон 3-й ст. (1820).
42) Валадковіч (Wołodkowicz, Wołodkewicz) Мельхіор Ксавер'евіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
43) Валасоўскі (Wołosowski) Канстанцін. Масон 3-й ст. (1820).
44) Валасоўскі (Wołosowski) Юзаф*. Масон 1-й ст.
45) Ваньковіч (Wańkowicz) Апалінары Янавіч. Другі дазорац (1817), Першы дазорац (1818), масон 4-й ст. і Намесны майстар (1820).
46) Ваньковіч (Wańkowicz) Эдвард Станіслававіч. Масон 3-й ст., Першы дазорац (1818).
47) Ваньковіч (Wańkowicz) Ян. Масон 3-й ст. (1820).
48) Венгжэцкі (Węgrzecki) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1821).
49) Вейс (Weys) 1-ы Аляксандр Андрэевіч. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
50) Вежбіцкі (Wierzbicki) Казімір*. Масон 1-й ст. (1820).

51) Вілкашэўскі (Wiłkoszewski) Валенты. Ганаровы сябра ложы (з 1819 г.), масон 7-й ст.
52) Вільчэўскі (Wilczewski) Ежы. Ганаровы сябра ложы (з 1820 г.), масон 7-й ст.
53) Вішнеўскі (Wiszniewski) Фелікс Фадзеевіч. Масон 2-й ст. (1820).
54) Вішнякоў (Wiszniakow) Іван Федаравіч. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
55) Выджга (Wydżga) [Відза – С.Р.] Фларыян. Ганаровы сябра ложы (з 1820 г.), масон 7-й ст.
56) Выпыхоўскі (Wypychowski) Францішак*. Масон 1-й ст., брат служачы (1820).
57) Вяргун (Werhun) [Верчун – С.Р.] Ян. Масон 1-й ст. (1819-1820).
58) Галаўня (Hołownia) Алойзы. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
59) Гарабурда (Haraburda) Адам. Ганаровы сябра ложы (з 1820 г.), масон 4-й ст.
60) Гаршкоўскі (Gorszkowski) [Гаркоўскі – С.Р.] Лаўрэнці Восіпавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820), брат Пецярбургскай ложы "Белы арол", прадстаўнік у Дырэктарыяльнай ложы "Астрэя" (1820-1821).
61) Гарэцкі (Gorecki) Юзаф Валянцінавіч. Ганаровы сябра ложы (з 1820 г.), масон 7-й ст.
62) Гатоўскі Мікалай.
63) Гейдукевіч (Heydukiewicz) [Гайдукевіч – С.Р.] Іпаліт. Масон 3-й ст. і Другі сцюарт (1820).
64) Гендэрсон (Henderson) Тамаш. Масон 7-й ст. (1820).
65) Генрыцы (Henrycy) [Гэнрыцкі – С.Р.] Аляксандр Фёдаравіч*. Ініцыяваны ў 1819 г., масон 1-й ст. (1820).
66) Герловіч [Гарловіч – С.Р.] Вінцэнт.
67) Герман (Herman) Міхал. Масон 1-й ст. (1820).
68) Гілятэр Людвік*. Ганаровы сябра ложы.
69) Гінтэр (Ginter) Адам. Ганаровы сябра ложы (з 1820 г.), масон 5-й ст.
70) Гінэт (Ginet) Людвік. Ганаровы сябра ложы (з 1820 г.), масон 7-й ст.
71) Гольц (Holtz, Golc) Адам*. Ганаровы сябра ложы (з 1820 г.), масон 5-й ст.
72) Гофман (Hoffman) Караль. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
73) Гофман (Hoffman) Якуб Фрыдрых. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст., прадстаўнік пры Вялікім усходзе (1819-1821).
74) Гродэк (Grodeck) Багдан Веніямінавіч*. Ганаровы сябра ложы (з 1819 г.).
75) Гродэк (Grodeck) Эрнест Годфрыд. Ганаровы сябра, масон 7-й ст. (1820).
76) Грынеўскі (Hryniewski) Вінцэнт. Ініцыяваны ў 1819, масон 3-й ст. і Сакратар (1820).
77) Дабашыньскі (Doboszyński) Каэтан*. Масон 2-й ст. (1820).
78) Дабжаньскі (Dobrzański) [Дабранскі – С.Р.] Вінцэнт Антонавіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 6-й ст.
79) Дамброўскі (Dombrowski) Тадэвуш. Масон 1-й ст. (1820).
80) Дамброўскі (Dombrowski) Ян Хрызастом. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
81) Дамель Ян.
82) Дваржэцкі Фердынанд.
83) Дэдэрка (Dederko) Барнаба. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
84) Дэдэрка (Dederko) Рох. Масон 2-й ст. (1820).
85) Князь Длускі (Dłuski) Міхал Сцяпанавіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.



**Ян Рустэм** *(1762 г., Канстанцінопаль – 9 (21) чэрвеня 1835 г., Вільня) – мастак і педагог. Яго творчасць звязаная з культурным жыццём Беларусі і Літвы, з Віленскай мастацкай школай, як, звычайна называюць факультэт выяўленчага мастацтва Віленскага універсітэта. Ян Рустэм вучыўся ў Варшаве ў вядомых мастакоў Я.Норбліна і М.Бачарэлі, у 1788 –1790 гг. працягваў вучобу ў Германіі. У 1798 г. быў запрошаны ў Віленскі універсітэт, дзе працаваў ад'юнктам на кафедры жывапісу. У 1811 г. пасля смерці Ф.Смуглевіча прызначаны прафесарам гэтай кафедры. Рэфармаваў сістэму навучання ў Віленскай мастацкай школе. Ян Рустэм імкнуўся вызваліць жывапіс ад уплыву класіцызму, які, на яго думку, перашкаджаў развіццю мастацкай індывідуальнасці. Ён увёў маляванне з жывой натуры, дамогся дазволу прымаць у Віленскую мастацкую школу здольных вучняў незалежна ад іх сацыяльнага паходжання. Выхаванцамі школы і вучнямі Яна Рустэма былі І.Аляшкевіч, В.Ваньковіч, Я.Дамель, В.Дмахоўскі, Н.Орда, І.Хруцкі ды інш. Рустэм карыстаўся вялікай папулярнасцю і любоўю сярод студэнтаў. А.Шэмеш успамінаў: "У класе заўсёды стаяла цішыня, таму што прысутнічаў Рустэм, якога ўсе паважалі. Ён любіў студэнтаў. Даваў шмат каштоўных парадаў. Некаторых, асабліва здольных вучняў, ён запрашаў да сябе ў майстэрню для працягу навучання".*

86) фон Дорнфельд (Dornfeld) Ксаверы-Францішак. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
87) Дростэ (Droste) [Дрозд – С.Р.] Аўгуст. Масон 3-й ст. (1820).
88) Дыбоўскі (Dybowski) Леапольд*. Масон 2-й ст. (1820).
89) Еленьскі (Jeleński) [Яленскі – С.Р.] Павел. Масон 3-й ст. (1820).
90) Есьман (Jeśman) Ігнацы. Масон 3-й ст. (1820).
91) Есьман (Jeśman) Юстын. Масон 3-й ст. (1820).
92) Ёдка (Jodka) Антоні.
93) Жамойтэль (Żamoytel) Адам. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 5-й ст.
94) Жылінскі Ян.
95) Жэброўскі (Żebrowski) Вінцэнт. Масон 3-й ст. (1820).
96) З.Я. (Z.I.)*. Масон 4-й ст. і Гасцёўнік (1820).
97) Заблоцкі Юзаф. Ініцыяваны ў 1820 г.
98) Завадскі (Zawadzki) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820). Прадстаўнік у ложы "Дасканалая еднасць" (1820).
99) Загароўскі*.

*Сам Рустэм працаваў пераважна ў жанры партрэта (партрэты Т.Зана, А.Снядэцкага, Я.Снядэцкага, М.Ромэра, Я.Главацкага, ды інш., мініяцюрныя партрэты Т.Касцюшкі і Я.Лялевеля, аўтапартрэты). Быў вядомы таксама як майстар бытавога жанру, гістарычнай кампазіцыі, пейзажа і гравюры. Творчай манеры Яна Рустэма ўласцівы ўстойлівасць кампазіцыйных прыёмаў, дакладны малюнак, стрыманасць колераў. Аднак у гісторыю выяўленчага мастацтва ўвайшоў, перш за ўсё, як выдатны педагог, які выхаваў некалькі пакаленняў літоўскіх, польскіх і беларускіх мастакоў.*

*Дата ініцыяцыі дакладна невядомая. Паводле звестак С.Дабранскага, у 1813-1814 гг. Ян Рустэм займаў пасаду Апекуна бедных у віленскай ложы "Руплівы ліцьвін", а ў 1815 г. у той жа ложы быў намеснікам Сакратара. Людвік Хас паведаміў, што ў 1819 г. Ян Рустэм апякаваўся 4-ма студэнтамі, якія вучыліся ў Віленскай мастацкай школе дзякуючы стыпендыям, што прызначылі для іх браты ложы "Руплівы ліцьвін".*

Тв.: Souvenir pittoresque des petits ourrages de J.Rustem. – Wilno, 1837.

Літ.: Дабранскі С. Масонскія лёжы ў Літве // Спадчына. – 1997. – № 1. – С. 36-37; Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX–начала XX в. – Минск, 1974; Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X–XIX ст.: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 535 – 536; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. – Т. 4. – Мінск, 1987. – С. 543; Encyklopedyja powszechna / S.Orgelbrand. – T. 10. – Warszawa, 1884. – S. 236; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX wieku. – Wrocław, 1982. – S. 282; Ilustrowana Encyklopedja Trzaski, Everta i Michalskiego – T. 4. – Warszawa, 1927. – S. 991; Szemesz A. Wspomnienia o Damelu // Athenaeum (Wilno). – 1842. – T. II.

*Іна Соркіна (Гародня)*

100) Заманскі Тэадор*.
101) Замбжыцкі (Zambrzycki) Валенты. Масон 2-й ст. (1820).
102) Замойскі (Zamoyski) Тадэвуш [Тэадор – С.Р.]. Масон 2-й ст. (1820).
103) Збарашэўскі (Zbaraszewski) Анджэй*. Масон 3-й ст., Другі сцюарт (1820).
104) Зелінгоўскі (Zelingowski) [Жэлігоўскі – С.Р.] Юльян. Масон 2-й ст. (1820).
105) Зяновіч (Zenowicz) Ігнацы.
106) Зяновіч (Zenowicz) Міхал Антонавіч. Прамоўца (1818), масон 4-й ст. і Майстар кафедры (1819-1821).
107) Іваноўскі (Iwanowski) Ігнацы Антонавіч. Масон 3-й ст. (1820).
108) Іваноўскі (Iwanowski) Раман. Масон 3-й ст. (1820).
109) Кабылінскі (Kobylinski) Ежы. Першы сцюарт (1817), масон 4-й ст. (1820).
110) Калкоўскі (Kołkowski) Васіль. Масон 1-й ст. (1820).
111) Каменскі (Kamienski) Казімір. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст. (1820).
112) Каменскі (Kamienski) Людвік Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
113) Карабічын (Karabiczyn) Васіль*. Масон 1-й ст. (1820).
114) Карказевіч (Korkozewicz) Міхал. Масон 3-й ст. (1820).

115) Карказевіч (Korkozewicz) Януары Валер'янавіч. Масон 2-й ст. (1820).
116) Касоўскі (Kossowski) Казімір. Масон 3-й ст. (1820).
117) Кастравіцкі (Kostrowicki) Самуэль. Масон 2-й ст., звольнены ў 1820 г.
118) Квяткоўскі Ян.
119) Класоўскі (Kłossowski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
120) Котвіч (Kotwicz) Ян. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 4-й ст.
121) Курчынскі (Kurczynski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
122) Лазінскі (Łozinski) Ян [Юзаф – С.Р.]. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
123) Лангхамп (Longchamp) Ян*. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
124) Ландрагін (Landragin) [Ляндразын – С.Р.] Іван Якаўлевіч. Масон 2-й ст., звольнены ў 1820 г.
125) Лапіцкі (Łapicki) Міхал. Масон 2-й ст. (1820).
126) Лапушынскі (Łopuszyński) Юзаф. Масон 2-й ст. (1820).
127) Лэнтоўскі (Łentowski) Шыман Францішак. Масон 3-й ст. (1820).
128) Лёншан Ян.
129) Лібельт (Libelt) Якуб Герман. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
130) Лыкаў (Łykow) Тэадор Міхайлавіч. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
131) Любаньскі (Lubański) Ян. Масон 4-й ст., звольнены ў 1820 г.
132) Любаўскі (Lubawski) Тэадор. Масон 3-й ст. і Намеснік Майстра абрадаў (1820).
133) Ляўковіч (Lewkowicz) Вінцэнт. Масон 5-й ст., звольнены ў 1820 г.
134) Мадзалеўскі (Modzolewski) Фердынанд. Брат служачы (1819), масон 1-й ст. (1820).
135) Мадоўскі Ігнацы*. Сакратар (1818).
136) Манцігранды [Мантэграндзі – С.Р.] Людвік.
137) Манюшка (Moniuszko) Дамінік. Масон 7-й ст., Намесны майстар (1818), Майстар кафедры (1820).
138) Манюшка (Moniuszko) Казімір Юзафавіч. Масон 3-й ст. (1820).
139) Манюшка (Moniuszko) Чэслаў. Масон 3-й ст. (1820).
140) Манюшка (Moniuszko) Юзаф. Масон 2-й ст. (1820).
141) Граф Мараўскі (Morawski) Караль Дзем'янавіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
142) Маркіановіч (Markianowicz) Юзаф Фаміч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
143) Марціноўскі ((Marcinowski) Антоні. Масон 1-й ст. (1820).
144) Масыні (Massyni) Аўгуст. Масон 1-й ст., звольнены ў 1820 г.
145) Матушэвіч (Matyszewicz) [Матусевіч – С.Р.] Міхал. Масон 1-й ст. (1820).
146) Мацкевіч (Mackiewicz) Міхал. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
147) Мацкевіч (Mackiewicz) Стэфан. Масон 2-й ст., звольнены ў 1820 г.
148) Машынскі (Moszynski) Феліцыян. Масон 1-й ст. (1820).
149) Міладоўскі (Miładowski) Раман. Масон 2-й ст. (1820).
150) Мірскі (Mirski) Ян*. Масон 2-й ст. (1820).
151) Навамейскі (Nowomieyski) [Наваміцкі – С.Р.] Канстанцін. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 5-й ст.
152) Навіцкі (Nowicki) Банавентура. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
153) Навіцкі (Nowicki) Матэвуш. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 4-й ст.

154) Непакайчыцкі (Пацэй-Непакайчыцкі, Niepokoyczycki) Адам Варфаламеевіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
155) Норвід (Norwid) Ян. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
156) Нофак (Nofok) Ян Антоні. Ганаровы сябра, масон 7-й ст. (1820).
157) Граф Патоцкі (Potocki-Kostka) Станіслаў Костка. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820), Вялікі майстар Вялікага усхода Каралеўства Польскага і ВКЛ.
158) Граф Пацей (Pociey) Аляксандр. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
159) Пашкевіч (Paszkiewicz). Брат служачы (1820), масон 1-й ст.
160) Пашкоўскі (Paszkowski) Мікалай. Масон 3-й ст. і Першы дазорац (1820).
161) Пэйкер 1-ы (Peykier) Аляксандр Эмануілавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
162) Петрыкоўскі Антоні.
163) Пётух (Piotych) [Пятух – С.Р.] Юзаф. Масон 3-й ст. (1820).
164) Пжыстаноўскі (Przystanowski) [Прыстаноўскі – С.Р.] Пётр. Майстар кафедры (1817), масон 5-й ст. і Суддзя (1820).
165) Підо(т) (Pidot) Мікалай. Масон 3-й ст. (1820).
166) Граф Плятэр (Plater) Людвік Казіміравіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
167) Прушынскі (Prószynski) Афанасі. Масон 3-й ст. у 1820.
168) Прушынскі (Prószynski) Яўстах. Масон 1-й ст. (1820).
169) Рагоза (Rahoza) Юзаф. Прадстаўнік у Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць" (1817), масон 4-й ст.
170) Ражанскі (Rożanski) Францішак*. Брат служачы, масон 1-й ст. (1820).
171) Ражнецкі (Rożnecki) Аляксандр Аляксандравіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
172) Развадоўскі (Rozwadowski) Ян. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
173) Ракіцкі (Rokicki) Людвік Міхайлавіч. Масон 1-й ст. (1820).
174) Ракіцкі (Rokicki) Міхал. Масон 1-й ст. (1820).
175) Раманус (Romanus) Аляксандр. Масон 3-й ст. (1820).
176) Ратыньскі (Ratyński) Антоні [Аляксандр – С.Р.]. Масон 4-й ст. (1820).
177) Рашкоўскі (Roszkowski) Серафін. Масон 3-й ст. (1820).
178) Рашэт (Raszet) Эмануіл Якаўлевіч. Масон 3-й ст. (1820).
179) Сабескі (Sobeski) Міхал. Ганаровы сябра, масон 5-й ст., прадстаўнік ложы пры Вялікім усходзе (1817, 1820).
180) Сабескі (Sobeski) Ян*. Ганаровы сябра ложы, прадстаўнік ложы пры Вялікім усходзе (1818).
181) Граф Салагуб (Sołohub) Антоні. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
182) Свентажэцкі (Swiętorzecki) Станіслаў. Масон 3-й ст. (1820).
183) Свянціцкі (Swięcicki) Юзаф*. Масон 2-й ст. (1820).
184) Граф Серакоўскі (Sierakowski) Ян. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 4-й ст.
185) Сержпіньскі (Sierzpiński) [Сержыінскі – С.Р.] Станіслаў. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 4-й ст.
186) Сіпайла (Sipayło) Юзаф Міхайлавіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 3-й ст.
187) Снітка (Snitko) Ян Сцяпанавіч. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
188) Станьскі (Stański) Канстанты. Масон 1-й ст. (1820).




**Жан Эмануэль Жылібер** *(21 чэрвеня 1741 г. – 2 верасня 1814 г.) – вучоны-прыродазнаўца, лекар і мысліцель. Закончыў медыцынскі факультэт універсітэту ў Манпелье (1763). У 1768 г. заняў пасаду прафесара анатоміі, хірургіі і натуразнаўства Ліёнскага медыцынскага коледжа. Ж.Э.Жылібера адрознівала самастойнасць і незалежнасць думкі, ініцыятыўнасць і глыбокія веды. Гарадзенскім каралеўскім старастам А.Тызенгаўзам быў запрошаны ў Гародню, дзе ў 1775 г. арганізаваў і ўзначаліў Медыцынскую Акадэмію. Вёў актыўную прафесарскую дзейнасць, чытаў курсы агульнай медыцыны, хірургіі і натуразнаўства. Перавёз у Гародню асабістую бібліятэку і гербарый (болей 300 асобнікаў). Заснаваў шпіталь, анатамічны тэатр,Каралеўскі батанічны сад, Медыцынскую Акадэмію, навуковую бібліятэку. Разам з А.Тызенгаўзам планаваў арганізацыю ў Гародні Акадэміі навук. Належаў да ордэна вольных муляраў. У 1781 г. узначальваў гарадзенскую ложу "L'hereuse Delivrance" ("Шчаслівае вызваленне"), якая працавала на французскай мове.*

*Пасля вымушанай адстаўкі каралеўскага старасты разам з вучнямі пераехаў у Вільню. Быў заснавальнікам медыцынскага факультэту ў Галоўнай літоўскай школе (будучы Віленскі універсітэт), узначаліў кафедру натуральнай гісторыі і батанікі, заснаваў батанічны сад. Падзяляў погляды французскіх асветнікаў. Паводле Э.Дарашэвіча, "светапогляд Жылібера ў сваёй аснове адлюстроўвае стыхійна-матэрыялістычныя імкненні вучонага, які высока ставіў эксперымент і назіранне... Логіка натуральна-навуковага светапогляду падводзіла яго фактычна да адмаўлення некаторых палажэнняў тэалогіі". Магчыма якраз апошняе выклікала незадавальненне мясцовых кансерватыўна-клерыкальных колаў, якія абвінавацілі Жылібера ў падрыве веры і маралі. У выніку былі забароненыя лекцыі вучонага, а некаторыя яго працы забраныя з бібліятэкі. У 1783 г. ён вярнуўся ў Ліён. Удзельнічаў у французскай рэвалюцыі, у 1793 г. быў абраны мэрам Ліёна. Пазней займаўся толькі навукай. Сярод яготых працаў – пяцітамовая "Флора Літвы" (тт.1-2. – Гародня, 1781; тт.3-5. – Вільня, 1781-1782).*

---

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадзенскія масонскія прывілеі з мяжы XVIII–XIX ст. (гл. раздзел *Даследаванні*); Дарашэвіч Э. Жылібер (Gilibert) Жан Эмануэль // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X–XIX ст.: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 213-214; Мілінкевіч А. Жылібер (Jilibert) Жан-Эмануэль // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 380; Краснова А.Н., Кузьмичев А.И. Жан Эммануэль Жилибер (Jean Emmanuel Gilibert) – ботаник Линнеевской эпохи. – Рыбинск, 2000.

*Алесь Смалянчук (Гародня)*



**Канстанцін Ігельстром** *(8 мая 1799 г., мяст. Шумск Валынскай губерні – 13 лістапада 1851 г.), грамадска-палітычны дзеяч, дзекабрыст. Нарадзіўся ў сям'і генерал-майора, камандзіра 2-ой брыгады Літоўскай уланскай дывізіі Густава (Яўстафія) Ігельстрома. Выхоўваўся ў 1-ым кадэцкім корпусе. Служыў капітанам у Літоўскім піянерным батальёне (Літоўскі асобны корпус, Беластоцкая вобласць). Вёў антыўрадавую прапаганду ў войсках. У 1820 г. быў ініцыяваны ў масонскай ложы Наваградка "Вузел еднасці".*

*Пасля знаёмства з былым філаматам М.Рукевічам разам са стрыечным братам А.Вягеліным стаў арганізатарам і адным з кіраўнікоў тайнага таварыства "Ваенныя сябры". Меў сувязь з дзекабрыстам В.Кюхельбекерам. Адыграў значную ролю ў падрыхтоўцы ўзброенага выступлення Літоўскага піянернага батальёна з мэтай сарваць прысягу Мікалаю I, якое адбылося 24 снежня 1825 г. у мяст. Браньск Беластоцкай вобласці. 27 снежня 1825 г. быў арыштаваны. Ваенным судом прыгавораны да смяротнага пакарання, якое паводле высачайшага распараджэння 15 красавіка 1827 г. заменена пазбаўленнем дваранства і 10 гадамі катаргі ў Сібіры з наступным пасяленнем. З красавіка 1836 г. радавы ў асобным Каўказскім корпусе. 13 лютага 1843 г. звольнены ў адстаўку ў чыне паручніка з забаронай наведвання сталіцы і ўстанаўленнем сакрэтнага паліцэйскага нагляду.*

Літ.: Декабристы: библиографический справочник. – Москва, 1988. – С. 73-74, 355-366; Швед В. Ігельстром Канстанцін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 470.

*Іна Соркіна (Гародня)*

189) Стравіньскі (Strawiński) Матэвуш. Масон 1-й ст. (1820).
190) Струміла (Strumiłło) Юзаф. Ганаровы сябра ложы (1821), масон 7-й ст.
191) Стрынеўскі Вінцэнт*. Масон 3-й ст. і Сакратар (1820).
192) Граф Суліструоўскі (Sulistrowski) Казімір Алаізавіч. Масон 7-й ст. і Майстар кафедры (1818-1819).
193) Сургучэўскі (Surguczewski) [Сергушэўскі – С.Р.] Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 1-й ст. (1820).
194) Сцяпанаў 2-і (Stepanow) Павел. Масон 3-й ст. (1820).
195) Сымановіч (Symonowicz) Рамуальд. Масон 4-й ст., звольнены ў 1820 г.
196) Сяменьскі (Siemieński) [Сямінскі – С.Р.] Аляксандр. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
197) Сянкевіч (Sienkiewicz) Вінцэнт Фадзеевіч. Масон 3-й ст. і намеснік Захавальніка архіва (1817), масон 4-й ст. і Будаўнічы архітэктар (1820).
198) Тарчыньскі (Torczyński) Пётр. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.

199) Тжцінскі Караль.
200) Трэмбінскі (Trembinski) [Трабінскі – С.Р.] Аляксандр. Масон 3-й ст. (1820).
201) Турскі (Turski) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
202) Тучкоў 1-ы (Tuczkow) Сяргей Аляксеевіч*. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
203) Граф Тышкевіч (Tyszkiewicz) Вінцэнт. Масон 1-й ст. (1820).
204) Федаровіч (Fiedorowicz) Ян. Масон 2-й ст., брат служачы.
205) Філімонаў (Filimonow) Мікалай Гаўрылавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820-1821).
206) Фрыбэс (Fribes) Вінцэнт Францавіч. Масон 3-й ст. і Другі дазорац (1820), 4-й ст. (1820).
207) Фрыбэс (Fribes) Францішак. Масон 7-й ст. і Будаўнічы рахмістр (1820).
208) Фрэйт (Freit) Міхал. Масон 1-й ст., Брат гармоніі (1820).
209) Хаецкі (Choiecki) Ян. Масон 3-й ст. (1820).
210) Ходзька (Chodźko) Ігнацы. Масон 3-й ст., звольнены ў 1820 г.
211) Ходзька (Chodźko) Ян Юзафавіч. Заснавальнік ложы, масон 7-й ст., Майстар кафедры (1816-1818), ганаровы сябра ложы.
212) Хрушчэўскі (Chruszczewski) Ануфры. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1818), 4-й (1820).
213) Цюндзевіцкі (Ciundziewicki) Юзаф. Масон 1-й ст. (1820).
214) Граф Чапскі (Czapski) Караль Францавіч*. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
215) Чарніхоўскі (Czernichowski) Людвік. Масон 1-й ст. (1820).
216) Чачот (Czeczot) Апалінары. Масон 3-й ст. (1820).
217) Чачот (Czeczot) Ян (Іван Фаміч). Масон 3-й ст. (1820).
218) Чмыхаў (Czmychow) Ян (Іван Фёдаравіч). Масон 3-й ст і Ялмужнік (1820).
219) Шалькевіч (Szalkiewicz) Вінцэнт. Масон 2-й ст., Брат гармоніі (1820).
220) Шнэйдэр (Szneider) Пётр Пятровіч. Масон 3-й ст. і намеснік Сакратара (1820).
221) Штэйн (Sztein) Станіслаў. Масон 1-й ст. (1819).
222) Шулякоўскі (Szulakowski) Паўліні. Масон 1-й ст., брат служачы (1820).
223) Шышка (Szyszko) Міхал. Масон 1-й ст. (1820).
224) Эйтвід (Eytwid) Казімір. Масон 3-й ст., брат служачы (1820).
225) Элснер (Elsner) Юзаф. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст.
226) Эстка (Estko) Адам. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
227) Эстка (Estko) Зыгмунт. Масон 2-й ст. (1820).
228) Эстка (Estko) Якуб. Масон 3-й ст. (1820).
229) Юрскі (Jurski) Антоні*. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
230) Язерскі (Бібесцяў-Язерскі, Jezierski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
231) Якубоўскі (Jakubowski) Гіляры. Масон 3-й ст. і намеснік Сакратара (1820)[63].

[63] С.Рыбчонак у артыкуле *Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагоддзя*... апроч пералічаных сяброў "Паўночнай паходні" назваў таксама Леапольда Дзітоўскага, Габрыэля Гольца, Васіля Каратокціна, Францішка Ужыхоўскага, Людвіка Агінскага, Вінцэнта Ахлю, Адама Жэвускага і Якуба Лібельта (заўвага рэд.).

## Менск. Ложа "Гара Табар"*

1) Аштарп (Osztorp) Леан Францавіч. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
2) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Фларыян. Сябра капітула, масон 6-й ст. (1820).
3) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Юзаф Мікалаевіч*. Сябра капітула, масон 4-й ст.
4) Валадковіч (Wołodkowicz) Мельхіёр. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1821).
5) Ваньковіч (Wańkowicz) Апалінары. Сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
6) Гендэрсон (Henderson) Тамаш. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
7) Гольц (Holtz) Адам*. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
8) Дамброўскі (Dombrowski) Ян Хрызастом. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
9) Замойтэль (Zamoytel) [Жамойтэль – С.Р.] Адам. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
10) Зяновіч (Zienowicz) Міхал Антонавіч. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
11) Ігельстром (Igelstrom) Густаў. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
12) Каменскі (Kamienski) Казімір. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
13) Каменскі (Kamienski) Людвік Юзафавіч. Майстар кафедры, масон 7-й ст. (1820).
14) Манюшка (Moniuszko) Дамінік. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
15) Граф Мараўскі (Morawski) [Ма(ў)роўскі – С.Р.] Караль. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
16) Мацкевіч (Mackiewicz) Міхал. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
17) Мітарноўскі (Mitarnowski) Юзаф. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
18) Мухліньскі (Muchliński) Ігнацы. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1821).
19) Навіцкі (Nowicki) Банавентура. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
20) Непакайчыцкі (Пацэй-Непакайчыцкі, Niepokojczycki) Адам. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
21) Пжыстаноўскі (Przystanowski) [Прыстаноўскі – С.Р.] Пётр. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
22) Развадоўскі (Rozwodowski) Людвік. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
23) Развадоўскі (Rozwodowski) Ян. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
24) Ратыньскі (Ratyński) Антоні. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
25) Рдултоўскі (Rdułtowski) Казімір. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
26) Рэйтан (Reytan) Дамінік. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
27) Граф Салагуб (Sołłohub) Антоні. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
28) Турскі (Turski) Антоні. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
29) Фрыбэс (Fribes) Францішак. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
30) Граф Чапскі (Czapski) Караль. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
31) Язерскі (Бібесцяў-Язерскі, Jezierski) Станіслаў. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820)[64].

---

* Была адчынена каля 1818 г. як ніжэйшая капітулярная ложа. З красавіка 1821 г. працавала ўжо як вышэйшая капітулярная ложа ў складзе Вялікага усхода Каралеўства Польскага і ВКЛ і Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць". Сябрамі пераважна былі браты ложы "Паўночная паходня", якія мелі высокія масонскія ступені.

[64] С.Рыбчонак у артыкуле *Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагоддзя*… апроч пералічаных сяброў "Гары Табар" назваў таксама Малхера (Мельхіёра?) Вайніловіча, Габрыэля Гольца (заўвага рэд.).



**Тамаш Зан** *(21 снежня 1796 г., в.Мясата Ашмянскага павета – 19 ліпеня 1855 г., маёнтак Кахачын каля Оршы), паэт-рамантык, удзельнік вызваленчага руху, даследчык прыроды. Вучыўся ў Менскай гімназіі, Маладзечанскім павятовым вучылішчы. У 1815 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага універсітэта, адначасова займаўся на літаратурным факультэце. Чалавек надзвычайнай сілы волі і душэўнай чысціні, Тамаш Зан карыстаўся вялікай павагай сярод студэнтаў і выкладчыкаў, быў кумірам моладзі. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў віленскіх тайных таварыстваў студэнцкай моладзі – філаматаў, філарэтаў, прамяністых. Належаў таксама да Таварыства шубраўцаў, Патрыятычнага таварыства. Ян Чачот прысвяціў Зану верш "У дзень урачыстасці ў гонар Тамаша Зана. 29 мая 1821 г.", дзе ёсць радкі: "О, брацці! Нам заўтра шчасліваае ззяе! Яго перад намі Тамаш расчыняе!"*

*У 1821 г. быў ініцыяваны ў віленскай масонскай ложы "Школа Сакрата". Хутка стаў яе прадстаўніком у Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць". Напісаў два вольнамулярскіх верша, адзін з якіх быў прачытаны на святаянскіх масонскіх урачыстасцях у 1821 г.*

*У 1823 г. пасля выкрыцця тайных таварыстваў у Віленскім універсітэце Зан быў арыштаваны. Каб выратаваць сваіх сяброў па арганізацыі, ён усю віну ўзяў на сябе. У 1824 г. высланы ў Арэнбург, дзе прабыў 13 гадоў. У час ссылкі даследаваў прыроду Урала (знайшоў каля Самары нафту, каля Троіцкай крэпасці – медную руду, у Зауральскім стэпе – багатыя паклады золата, стварыў мінералагічны музей у Арэнбургу). Быў сябрам тайнай арганізацыі рускіх рэва-*

## Наваградак. Ложа "Вузел еднасці"

1) граф Ажароўскі (Ożarowski) Войцах. Масон 3-й ст. (1820).
2) Анджэйковіч (Бутаўт-Анджэйковіч, Andrzeykowicz) Міхал Фадзеевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
3) Анджэйковіч (Andrzeykowicz) Ян Фадзеевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1821).
4) Арлоўскі.
5) Арцішэўскі (Arciszewski) Антоні Казіміравіч. Масон 3-й ст. (1820).
6) Багданаў 1-ы.
7) Букаты (Bukaty) Алойзы. Масон 1-й ст. (1820).
8) Белапятровіч (Białopiotrowicz) Караль. Дазорац (1819-1820).
9) Белапятровіч (Białopiotrowicz) Ян. Масон 3-й ст. і Другі дазорац (да 1820 г.).

*люцыянераў пад кіраўніцтвам П.Кудрашова. У 1837 г. Тамаш Зан перабраўся ў Санкт-Пецярбург, дзе працаваў бібліятэкарам у Горным інстытуце. У 1841 г. яму было дазволена вярнуцца на радзіму. Ажаніўшыся, пасяліўся ў маёнтку Кахачын каля Оршы, дзе займаўся літаратурнай дзейнасцю.*

*Тамаш Зан стаў адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, якая спалучала рысы асветніцтва і рамантызму. Пісаў на польскай мове, але яго творчасць грунтавалася на беларускіх крыніцах, на гісторыі беларускага народу. Ва ўральскім дзённіку "З выгнання" выказваў намер пісаць на беларускай мове (але ніводны з яго беларускіх твораў не захаваўся). Адным з першых звярнуў увагу на вусную народную творчасць як на крыніцу абнаўлення і ўзбагачэння літаратуры. Шырока выкарыстоўваў беларускі фальклор, апяваў прыгажосць роднай Беларусі. Аўтар паэмаў "Табакерка"(апісваецца беларускае вяселле, свята Купалле, іншыя звычаі і абрады), "Мёд", баладаў "Свіцязь-возера", "Твардоўскі", "Бекіш", "Цыганка", вершаў, элегій і трыялетаў. Сваёй творчасцю звярнуў увагу на багацце беларускага фальклору, гістарычную пераемнасць і прыгажосць мовы беларусаў. Сябраваў з А.Міцкевічам, Я.Чачотам, А.Адынцом і інш. польска-беларускімі пісьменнікамі, паўплываў на іх творчасць.*

---

Тв.: Triolety i wiersze miłosne. – Warszawa, 1922; Z wygnania. – Wilno, 1929.
Літ.: Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. даведнік. – Мінск, 2001. – С. 176-177; Грицкевич В.П. От Немана к берегам Тихого океана. – Минск, 1986; Калинкович Н. Дело №26 // Неман. – 1990. – № 4; Цвірка К. Дарогамі Тамаша Зана // Цвірка К. Лісце забытых алеяў: Эсэ. – Мінск, 1993; Цвірка К. Тамаш Зан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 404; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. – Т. 2. – Мінск, 1985. – С. 484; Dunajówna M. Dzieciństwo i lata szkolne Tomasza Zana. – Wilno, 1932; Gawalewicz M. Poeta promienisty. – Warszawa, 1911; Encyklopedja powszechna / Wydawnictwa Gutenberga. – T. XVIII. – Kraków, 1932; Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX wieku. – Wrocław, 1982. – S. 286.

*Іна Соркіна (Гародня)*

10) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Аўгуст Фларыянавіч. Масон 4-й ст. (1820).
11) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Казімір Юзафавіч. Масон 1-й ст. (1820).
12) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Фларыян. Масон 4-й ст.і Майстар абрадаў (1818), 5-й ст. (1820).
13) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Юзаф Мікалаевіч. Масон 5-й ст. (1821).
14) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Ян. Масон 3-й ст. (1820).
15) Валодзька (Wołodzko) 1-ы.
16) Валодзька (Wołodzko) 2-і Юзаф. Масон 3-й ст.
17) Валовіч (Wołłowicz) Казімір. Масон 3-й ст. і Будаўнічы рахмістр (1820).
18) Вірыён (Virion, Wiryon) Ян Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы.
19) Вітаноўскі (Witanowski) Міхал Янавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1821).
20) Вішнеўскі (Wisznewski) Павел. Масон 3-й ст. (1820).
21) Воўк (Wołk) Адольф. Масон 4-й ст. і Архівіст (1820).

22) Вягелін Аляксандр Іванавіч. Ініцыяваны ў 1820 г.
23) Гадлеўскі (Godlewski) Францішак. Прамоўца (1819), масон 3-й ст. (1820).
24) Галецкі Якаў. Ганаровы сябра ложы, масон 6-й ст. (1820), прадстаўнік пры Вялікім усходзе (1820-1821).
25) Гарэгляд (Horehlad) [Гарыгляд – Ю.Г.] Юзаф Якімавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1819-1821).
26) Гацыскі (Haciski) Бенедыкт Андрэевіч. Масон 3-й ст. (1819-1820).
28) Гацыскі (Haciski) Тадэвуш Янавіч. Масон 3-й ст. (1820).
29) Грамыка (Грамыкін) Юзаф Станіслававіч.
30) Грахольскі Рафал. Масон 2-й ст. (1820).
31) Грыневіч (Hryniewicz) Антоні. Масон 1-й ст. (1820).
32) Грынцэвіч (Hrynciewicz) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
33) Дабрачынскі.
34) Далінскі (Dolinski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1821).
35) Далубоўскі Аляксандр. Масон 2-й ст. (1819).
36) Жэброўскі (Żebrowski) Вінцэнт. Масон 3-й ст.
37) Забароўскі (Zaborowski) Вінцэнт. Масон 3-й ст і Захавальнік пячаткі (1820).
38) Загарэцкі.
39) Збарашэўскі (Zbaraszewski) Анджэй. Масон 3-й ст., Другі сцюарт (1820).
40) Зелеў Караль. Масон 2-й ст. (1820).
41) Ігельстром (Ігельштром, Igelstrom) 2-і Аляксандр Густававіч. Масон 4-й ст. (1820).
42) Ігельстром (Igelstrom) Артур Густававіч.
43) Ігельстром (Igelstrom) Густаў. Масон 4-й ст (1820).
44) Ігельстром (Igelstrom) Канстанцін Густававіч. Ініцыяваны ў 1820 г.
45) Казажэўскі.
46) Кандратовіч (Kondratowicz) Леан. Масон 2-й ст. (1820).
47) Канопка (Konopko) Вінцэнт Аляксандравіч.
48) Каравайскі (Korowajski) Канстанцін. Брат-служачы, масон 3-й ст. (1820).
49) Кашыц Юзаф. Масон 3-й ст. (1819).
50) Керсноўскі (Kiersnowski) Ігнацы Янавіч. Масон 2-й ст. (1820).
51) Клячкоўскі (Kleczkowski) Мікалай. Масон 4-й ст., Сакратар (1819), Намеснік майстра кафедры (1820).
52) Крушынскі Ян. Масон 1-й ст., прадстаўнік пры Вялікім усходзе (1817-1819).
53) Кшэмінскі Ігнацы. Масон 3-й ст. і Другі сцюарт (1820).
54) Лісоўскі (Lisowski) Антоні. Масон 3-й ст. (1819-1820).
55) Лускін. Масон 2-й ст (да 1821 г.).
56) Лыхоўскі (Łychowski) Павел. Масон 3-й ст. (1820).
57) Лянкевіч Ян. Масон 1-й ст. (1819).
58) Магільніцкі (Mogilnicki) Пётр Ігнацьевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
59) Малеўскі (Malewski) Антоні. Масон 4-й ст. (1820-1821), прадстаўнік у ложы "Дасканалая еднасць".
60) Маркевіч (Markiewicz) Матэвуш. Масон 3-й ст. і Прамоўца (1820).
61) Маркевіч (Markiewicz) Ян Ануфрыевіч. Масон 3-й ст., Ялмужнік (1820).

62) Мацкевіч (Mackiewicz) Міхал. Майстар кафедры (1818-1819), масон 7-й ст. (1820).
63) фон Міхельсон (Michelson) Бернард Міхайлавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
64) Навакоўскі (Nowakowski) Станіслаў-Костка. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1821).
65) Незабытоўскі (Niezabytowski) Стэфан. Дазорац (1818), Намесны майстар (1819), масон 4-й ст. (1819).
66) Незабытоўскі (Niezabytowski) Якуб. Масон 4-й ст. і Скарбнік (1820).
67) Незабытоўскі (Niezabytowski) Ян. Масон 3-й ст (1820).
68) Нямцэвіч (Урсын-Нямцэвіч, Ursyn-Niemcewicz) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
69) Парадоўскі Аляксандр Юзафавіч.
70) Паразінскі Шымон. Ганаровы сябра ложы (1820).
71) Пжэцлаўскі Юзаф (Восіп) Антонавіч. Масон 2-й ст. (1820).
72) Похвіснеў.
73) Пратасевіч (Protasiewicz) Ежы. Масон 3-й ст. і Сакратар (1820).
74) Пушкоўскі Францішак. Масон 1-й ст. (1820).
75) Пятрынскі В.
76) Расінскі Мікалай. Масон 2-й ст. (1820).
77) Ратыньскі (Ratyński) Э.
78) Рдултоўскі (Rdułtowski) Казімір. Масон 4-й ст. (1819).
79) Рушчыц Каспер Фадзеевіч. Масон 2-й ст. (1820).
80) Рыкгоф.
81) Сакалоўскі Караль. Масон 1-й ст. (1820).
82) Сангайла К.
83) Сарнацкі Алойзы. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
84) Сецынскі.
85) Слізень (Ślizień) Ян Юзафавіч. Масон 4-й ст., Другі дазорац (1819-1820).
86) Сляскі Ян. Ганаровы сябра ложы.
87) Солтан (Sołtan) Адам. Масон 3-й ст. і Майстар кафедры (1819-1820).
88) Стэфановіч Францішак. Масон 1-й ст. (1820).
89) граф Тышкевіч (Tyszkiewicz) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 1-й ст. (1820).
90) Філімонаў (Filimonow) Мікалай Гаўрылавіч. Масон 3-й ст. (1820-1821).
91) Хельміцкі В.
92) Хлявіньскі (Chłewiński) Адам Фадзеевіч. Масон 4-й ст. (1821).
93) Чахоўскі (Czechowski) Станіслаў-Казімір. Масон 3-й ст. (1820).
94) Шавельскі (Szewielski) Гжэгаж. Брат-служачы, масон 1-й ст. (1820).
95) Шымкевіч (Szymkiewicz) Якуб. Прадстаўнік у Правінцыяльнай ложы “Дасканалая еднасць”.
96) Шукевіч (Szykiewicz) Юзаф. Масон 3-й ст. (1820).
97) Элец (Elec) Яўхім. Масон 1-й ст. (1820).
98) Эме (Охмэ, Ochme) Вінцэнт. Намесны майстар (1818), масон 3-й ст., звольнены з ложы ў 1820 г.
99) Эме (Охмэ, Ochme) Тэадор. Масон 5-й ст. (1820).

**Юзаф Завадскі** *(15 сакавіка 1781 г., Пазнаншчына – 5 снежня 1838 г., Вільня) – кнігавыдавец і друкар. Пасля заканчэння школы піяраў (1794) працаваў у кнігарнях Познані, Вроцлава і Лейпцыга. У 1804 г. заснаваў уласную друкарню ў Вільні, якая ў наступным годзе набыла статус універсітэцкай. З 1806 па 1828 г. узначальваў кнігарню Віленскага універсітэту і сабраў найбагацейшую для таго часу калекцыю польскіх кніг, якая налічвала болей за 20 тыс. асобнікаў. Кнігарня забяспечвалася літаратурай з Варшавы, Вены, Лейпцыга, Парыжа, Лондана, Масквы, Санкт-Пецярбурга ды інш. Для лепшага забеспячэння кнігарні і задавальнення попыту чытачоў Ю.Завадскі дамагаўся ад кіраўніцтва універсітэта выдання новых кніг і перакладаў, дапаможнікаў для прафесуры, студэнтаў і вучняў, арганізоўваў пункты па продажы кніг пры школах, выдаваў каталогі.*

*У 1808 г. ён заснаваў філіял універсітэцкай друкарні ў Гародні, а ў 1810 г. – у Варшаве. У друкарнях Ю.Завадскага выдаваліся школьныя падручнікі, календары, малітоўнікі, навуковыя універсітэцкія выданні, публікаваліся творы Іяхіма Лялевеля, Готфрыда Гродэка, Адама Міцкевіча, пераклады вершаў Дж.Байрана, раманаў В.Скота ды інш. Тут друкаваліся перыядычныя выданні "Віленьскі дзённік" ("Dziennik Wileński"), "Віленьскі штотыднёвік" ("Tygodnik Wileński") ды інш. Усяго Ю.Завадскі выдаў больш за 400 назваў кніг. Выданні адрозніваліся дасканалай паліграфіяй. Яны карысталіся вялікім попытам, прадаваліся апрача Вільні ў Менску, Варшаве, Кіеве, вывозіліся ў Францыю і Германію.*

*Прыкметнай была таксама грамадская дзейнасць Ю.Завадскага. З лютага 1817 г. ён быў сябрам Таварыства шубраўцаў, Віленскага друкарскага таварыства, Віленскага таварыства дабрачыннасці. У сакавіку 1818 г. быў ініцыяваны ў віленскай ложы "Руплівы ліцьвін рэфармаваны". Пасля забароны дзейнасці ўсіх таемных таварыстваў (1822) і завяршэння справы над філаматамі і філарэтамі (1824) ён страціў падтрымку універсітэцкіх уладаў і вымушаны быў пакінуць Віленскі універсітэт. Аднак выдавецкая дзейнасць працягвалася. У сваёй новай друкарні Ю.Завадскі распачаў выданне навуковага часопіса "Wizerunki i Roztrząsania Naukowe" (1834).*

*У сваёй прадпрымальніцкай дзейнасці Ю.Завадскі не ганяўся толькі за грашовым прыбыткам. Ён разумеў значэнне развіцця літаратуры і навукі. У асяроддзі віленскай інтэлігенцыі розум і дабрыня Ю.Завадскага выклікалі такую самую павагу, як ягоная энергічнасць, сумленнасць і прадпрымальнасць – у асяроддзі гандляроў.*

Літ.: Маслыка Г. Завадскія // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X–XIX ст.: Энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 431; Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. даведнік. – Мінск, 2001. – С. 172; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 6. – Кн. 2. – Мінск, 2003. – С. 585; Encyklopedyja powszechna / S.Orgelbrand. – T. 28. – Warszawa, 1868. – S. 366-367; Cybulski R., Józef Zawadski – księgarz, drukarz, wydawca. – Wrocław, 1972; Zawadski J. // Encyklopedia historii Polski. Dzieje polityczne / Jan Dzięgielewski, Janusz Ekes, Tadeusz Krawczak, Jan Sańkowski, Jerzy Skowronek, Andrzej Szwarc, Jan Tyszkiewicz. – T. 2. – Warszawa, 1995. – S. 664.

*Іна Соркіна (Гародня)*
*Вольга Шаталава (Менск)*

## Нясвіж. Ложа "Шчаслівае вызваленне"*

1) Абуховіч (Obuchowicz) Філіп. Ініцыяваны каля 1816 г. Масон 2-й ст. (1818), 4-й ст. і Суддзя (1820).
2) Князь Агінскі (Oginski) Габрыэль. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 7-й ст., Другі дазорац Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць".
3) Адынец (Odyniec) Геранім. Ганаровы сябра ложы. Ініцыяваны каля 1811 г. Масон 5-й ст. (1820).
4) Адынец (Odyniec) Караль. Масон 3-й ст. (1818-1820).
5) Ажаровіч (Ożerowicz) Ільдэфонс. Масон 1-й ст. (1820).
6) Граф Ажароўскі (Ożarowski) Войцах. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 3-й ст.
7) Анджэйковіч (Бутаўт-Анджэйковіч, Butowt-Andrzeykowicz) Міхал Фадзеевіч. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 4-й ст.
8) Арцішэўскі (Arciszewski) Антоні Казіміравіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
9) Багдановіч (Bohdonowicz) Вінцэнт. Ініцыяваны каля 1814 г. Масон 3-й ст. (1818-1819), 4-й ст. (1820).
10) Бараноўскі 1-ы (Baranowski) Юзаф. Ініцыяваны ў 1819 г., масон 1-й ст. (1819-1820).
11) Баранцэвіч (Barancewicz) Ігнацы. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. 1820).
12) Бернард (Bernard) Герман Янавіч. Масон 3-й ст. (1820).
13) Берновіч (Bernowicz) Сарвацы. Ганаровы сябра, масон 4-й ст. (1820), Другі дазорац ложы "Паўночная паходня".
14) Б.Я. (B.I.). Ганаровы масон 4-й ст.
15) Бібікаў (Ілля Гаўрылавіч?). Ганаровы сябра, масон 1-й ст.
16) Болтуць (Bołtuć) Бенуа (Бенэдыкт) Феліксавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
17) Бохвіц (Bochwic) Адам. Масон 1-й ст. (1820).
18) Буджынскі Тадэвуш. Масон 2-й ст. (1820).
19) Булгарын (Bułharyn) Міхал Людвікавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
20) Бургельскі (Burgielski) Альберт. Ініцыяваны каля 1800 г., масон 3-й ст. (1818-1820).
21) Буцэвіч (Bucewicz) Ігнацы. Масон 3-й ст. (1820).
22) Быкоўскі (Bykowski) Ксаверы Ігнатавіч. Масон 1-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
23) Былеўскі (Bylewski) Антоні. Масон 2-й ст. (1819).
24) Былецоскі Антоні. Масон 2-й ст. (1818).
25) Бычкоўскі Міхал.
26) Белапятровіч (Białopiotrowicz) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
27) Вайдзевіч (Woydziewicz) [Вандзевіч – С.Р.] Фелікс. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 4-й ст.
28) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Аўгуст Фларыянавіч. Масон 2-й ст. (1818), 4-й ст. (1819).
29) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Дыянісі. Масон 1-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
30) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Леан. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).

* Узноўленая 4 верасня 1810 г. Працавала па "шведскай сістэме". Сходы адбываліся ў доме Навашынскага, а з 1811 г. – у палацы князя Радзівіла. Закрытая ў 1812 г. Аднавілася ў 1817 – 1820 гг. Працавала на французскай і польскай мовах.

31) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Людвік. Масон 4-й ст. (1821).
32) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Фларыян. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
33) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Юзаф. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1819).
34) Валодзька 2-і Юзаф. Масон 3-й ст.
35) Валадковіч (Wołodkowicz) Мельхіор. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
36) Ваньковіч (Wańkowicz) Апалінары. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
37) Васьнеўскі (Waśniewski) Юзаф. Масон 2-й ст. (1819).
38) Верашчака (Wereszczaka) Міхал Антонавіч. Масон 3-й ст. і намеснік Прамоўцы (1820).
39) Верашчака (Wereszczaka) Юзаф Антонавіч. Масон 3-й ст. і Майстар абрадаў (1818-1819), Другі дазорац (1821).
40) Відал (Widał) Юзаф. Брат-служка, масон 1-й ст. (1820).
41) Вілямоўскі (Wilamowski) Юліян. Масон 1-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
42) Вінел (Winieł) Юзаф. Брат-служка, масон 1-й ст. (1820).
43) Вірыён (Virion, Wiryon) Караль Юзаф. Ялмужнік (1810), масон 6-й ст., памёр у 1820 г.
44) Вітаноўскі (Witanowski) Дамінік Янавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
45) Вітаноўскі (Witanowski) Міхал Янавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820-1821).
46) Вішнеўскі (Wisznewski) Павел. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
47) Воджбун (Wodżbun) Антоні. Масон 1-й ст. (1818).
48) Вольскі (Wolski) Мікалай. Масон 2-й ст. (1818), 4-й ст. і Майстар абрадаў (1820).
49) Гайля Адольф.
50) Гарабурда (Haraburda) Адам. Масон 4-й ст., Прамоўца (1818-1819).
51) Гарайскі (Gorayski) Якуб. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
52) Гарэцкі (Gorecki) Юзаф Валянцінавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
53) Гацыскі (Haciski) Тадэвуш Янавіч. Масон 3-й ст. (1819).
54) Гендэрсан (Henderson) Тамаш. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
55) Глінка (Glinka) Ян. Масон 1-й ст. (1817 г.).
56) Гольц (Holc, Holtz) Адам. Масон 5-й ст. (1820).
57) Гольц (Holc, Holtz) Габрыель. Масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. (1820).
58) Гофман (Hofmann) Карл. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
59) Грабенскі. Ганаровы сябра ложы, прадстаўнік пры Вялікім усходзе (1811).
60) Гродэк (Groddeck) Багдан Веніямінавіч. Ганаровы сябра ложы.
61) Гродэк (Groddeck) Эрнэст Годфрыд. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820), Майстар ложы “Добры пастыр”.
62) Грыневіч (Hryniewicz) Вінцэнт. Масон 3-й ст., сакратар Правінцыяльнай ложы.
63) Грынцэвіч Вінцэнт. Масон 2-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
64) Граф Гюнтэр (Gunther) Адам. Масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. (1820).
65) Дамбкоўскі (Dąbkowski) Адам. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820), Прамоўца ложы “Уладзіслаў Ягайла”.
66) Дамброўскі (Dąbrowski) Ян Хрызастом. Масон 3-й ст. (1818), 7-й ст. (1820).
67) Дамброўскі (Dąbrowski) Ян. Ініцыяваны каля 1813 г., Другі дазорац (1819).
68) Даўгяла Шымон.

69) Дзенеў Ян.
70) Дзердзееўскі (Dzierdziejewski) Ян. Масон 3-й ст. і Скарбнік (1818), 4-й ст. і Падскарбі (1820).
71) Дзічкоўскі (Dziczkowski) Ян. Брат гармоніі, масон 1-й ст. (1820).
72) Дэдэрка (Dederko) Барнаба. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
73) Князь Длускі (Dłuski) Міхал Сцяпанавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
74) Драздовіч (Станіслаў.
75) Дучынскі Эдвард Юзафавіч.
76) Дучынскі Юзаф.
77) Елец (Jelec) Антоні Міхайлавіч. Масон 4-й ст. (1820).
78) Жаль (Żal) Якуб. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820). Сябра Вялікага ўсходу Італіі.
79) Жукоўскі (Żukowski) Шымон. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст.
80) Жэброўскі (Żebrowski) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
81) Забароўскі (Zaborowski) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
82) Заблонскі Антоні. Масон 2-й ст. (1818).
83) Заблоцкі Юзаф. Ганаровы сябра ложы.
84) Завадскі (Zawadzki) Казімір. Сябра ложы, масон 3-й ст.
85) Завадскі (Zawadzki) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820-1821).
86) Залеўскі (Zalewski) Францішак. Масон 1-й ст. (1818-1820).
87) Замойтэль (Zamoytel) Адам. Масон 5-й ст., Сакратар Ніжэйшага капітула.
88) Збарашэўскі (Zbaraszewski) Анджэй. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
89) Звяровіч Матэвуш. Масон 4-й ст., Брат гармоніі (1820).
90) Зданкевіч (Zdankiewicz) Васіль. Масон 2-й ст. (1818-1820).
91) Зяновіч (Zenowicz) Міхал Антонавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
92) З.І.(Z.I.). Масон 6-й ст.
93) Іваноўскі (Iwanowski) Ігнацы Антоніевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
94) Ігельстром 2-і (Igelstrom) Аляксандр Густававіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
95) Ігельстром (Igelstrom) Густаў. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
96) Кабылінскі (Kobylinski) Ежы. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
97) Каланкоўскі (Kołankowski) Пётр. Масон 1-й ст. (1818).
98) Камаеўскі (Komajewski) Караль. Масон 1- й ст. (1820).
99) Каменскі (Kamienski) Аляксандр Людвікавіч. Масон 3-й ст. (1820).
100) Каменскі (Kamienski) Казімір. Масон 3-й ст. (1818), 7-й(?) ст. (1821).
101) Каменскі (Kamienski) Людвік Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
102) Кандратовіч (Kondratowicz) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
103) Канрадзі (Konradi) Ежы. Брат гармоніі 3-й ст. (1818).
104) Карпаў Дзмітры.
105) Катовіч (Kotowicz) Тэафіл.Сябра ложы 1-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
106) Келіша Гіляры.
107) Керсноўскі (Kiersnowski) Мар'ян. Масон 1-й ст. (1820).
108) Клячкоўскі (Kleczkowski) Ігнацы. Сябра ложы да 1820 г.



**Ян Дамель** *(1780, Мітава (Курляндыя) – 18(30).08.1840, Мінск), мастак. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Мітаве. Потым вучыўся ў Віленскім універсітэце на кафедры жывапісу ў Ф.Смуглевіча і Я.Рустэма. Атрымаўшы ступень магістра прыгожых мастацтваў (1809), стаў ад'юнктам і выкладаў на кафедры жывапісу (1809-1820). У 1820 г. Яна Дамеля абвінавацілі ў стасунках з фальшываманетчыкам Гезікам, у якога пад час вобыску быў знойдзены ліст Яна, і выслалі ў Сібір (1820-1822, Табольск, Томск, Енісейск). На думку сучасных даследчыкаў, фактычнай прычынай высылкі мастака быў яго ўдзел у адной з тайных масонскіх арганізацый. У ссылцы Ян нястомна працаваў. Да нашых дзён захаваўся "Дзённік з падарожжа ў Сібір", дзе мастак запісваў і замалёўваў уражанні, рабіў шматлікія малюнкі на тэмы быту народаў Сібіры. У Табольску Дамель зрабіў роспісы Евангеліцкага касцёла, у Томску ўпрыгожыў фрэскамі Бернардзінскі касцёл, напісаў шмат партрэтаў мясцовых сібірскіх чыноўнікаў і іншых асобаў, стварыў шэраг пейзажаў. Вялікія здольнасці, вясёлы нораў мастака прыцягнулі да яго ўвагу тагачаснага губернатара Сібіры графа Сперанскага, заступніцтва якога дапамагло вярнуцца на радзіму. У 1822 г. Ян прыехаў у Менск, дзе жыў і працаваў да канца сваіх дзён.*

*Постаць Дамеля была таямнічай, нараджала самыя неверагодныя чуткі. Адныя менчукі казалі, што мастак адбывае ў Менску пакаранне за ўдзел у тайнай змове супраць імператара. Другія былі ўпэўнены, што ён па сваёй ахвоце асеў тут, каб зарабіць грошы ў багатых магнацкіх маёнтках і ўцячы за мяжу. Цьмяна казалі аб яго знаходжанні ў Сібіры за нейкія дзяржаўныя злачынствы. Але дакладна ніхто нічога не ведаў. Мастак быў адарваны ад культурнага жыцця. Вільня, Варшава, Пецярбург, Масква – усе тагачасныя буйныя культурныя цэнтры Усходняй Еўропы былі далёка. Наводдаль ад усіх, ён самабытна развіваў свой талент і, дзякуючы незвычайнай працаздольнасці, дасягнуў у гэтым значных поспехаў. У апошнія гады жыцця, ужо ў сталым узросце Дамель хацеў адправіцца ў замежнае вандраванне, каб папоўніць свае веды, але цяжкае матэрыяльнае становішча перашкодзіла яму гэта зрабіць.*

*Творчая спадчына Яна Дамеля вялікая. Шматлікія карціны мастака раскіданы па ўсёй былой Расейскай імперыі, па самых нечаканых кутках Палесся і Сібіры (мастак прадаваў іх часта за самую нязначную суму, а то і проста дарыў розным людзям). Многія работы загінулі і да нас не дайшлі. Творчасць Дамеля сфармавалася пад уплывам класіцызму, рамантызму, сентыменталізму. Як адзначаў мастацтвазнаўца і гісторык мастацтва Л.Дробаў, Ян Дамель – гэта спачатку сплаў ягоных цудоўных настаўнікаў, сплаў дзвюх эпох, а пасля – сам – эпоха трэцяя, прадвесень рэалізму ў беларускім жывапісе. Дамель працаваў амаль ва ўсіх жанрах выяўленчага мастацтва. Але асабліва шмат зрабіў у гістарычным*

*жанры. Яго хвалявалі найбольш значныя, кульмінацыйныя падзеі, звязаныя з якой-небудзь гістарычнай асобай. Сярод гістарычных палотнаў мастака: "Смерць князя Панятоўскага", "Смерць магістра крыжаносцаў Ульрыха фон Юнгінгена ў бітве пад Грунвальдам", "Чарнецкі пераплывае Піліцу", "Смерць Глінскага ў няволі", "Павел I вызваляе Касцюшку з няволі", "Твардоўскі паказвае Сігізмунду Аўгусту цень яго жонкі Барбары", "Напалеон на біувуаку пад Аўстэрліцам", "Цар Аляксандр I падпісвае ў Вільні амністыю", "Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.", "Разбітыя войскі Напалеона на ратушнай плошчы ў Вільні", "Хрышчэнне славян" і шмат іншых (А.Шэмеш называе 27 гістарычных палотнаў Дамеля). У 1820 г. Дамель выканаў шэраг накідаў і малюнкаў на тэмы вайны 1812 г. Планаваў, але не паспеў стварыць вялікае манументальнае палатно на тэму пераправы французаў праз Бярэзіну. З рэлігійных кампазіцый вядомыя: "Хрыстос, які нясе крыж", "Святая дзева з дзіцём Ісусам", "Зняцце з крыжа", "Узнясенне ў неба", "Хрыстос і самарыцянка", "Адрачэнне святога Пятра", "Палажэнне ў труну", "Спакушэнне Хрыста", "Агар у пустыні", "Ахвяра Аўраама" і інш. У музеях Вільні, Варшавы і іншых гарадоў зберагася шмат партрэтных твораў Дамеля: партрэты князя Д.Радзівіла, графаў І.Храптовіча, К.Тышкевіча, рэктара Віленскага універсітэта Ш.Малеўскага, менскага губернатара Гіцэвіча, ксяндза Ф.Галанскага, А.Горвата з жонкай, М.Спяранскага, С.Строганава, Е.Кабылінскага і інш. Лепшым з іх уласцівая тонкая псіхалагічная характарыстыка. Некаторыя партрэты маюць рысы рамантызму (аўтапартрэт, партрэт прафесара Рустэма).*

*Вялікае месца ў творчасці Дамеля займаў пейзаж. Асабліва выразныя і эмацыянальныя пейзажы напісаныя ў сібірскай ссылцы: "Заход сонца ў Табольскай губерні", "Ноч на Уральскіх гарах" і інш. Сярод пейзажаў Менска і яго ваколіцаў – "Вадзяны млын", "Дрэвы пад вадой" і інш. Шмат працаваў мастак як дэкаратар. Ён упрыгожваў жывапіснымі пано памяшканні масонскіх ложаў, афармляў рэлігійныя святы. Шырокай вядомасцю ў менскай публікі карысталіся карыкатуры Дамеля. Многія з іх вылучаліся тонкім гумарам, які быў адметнай рысай характару мастака. Ян Дамель пакінуў значны след у мастацтве Літвы і Беларусі. Паводле Л.Дробава, Дамель – мастак-патрыёт, творчасць якога асвятляе ўсю першую палову XIX ст. у беларускім мастацтве.*

*Апошнія гады Дамель пражыў у вялікай беднасці. Будучы чалавекам вельмі добрым, ён амаль усю сваю невялікую маёмасць раздаў бедным. Паводле сведчання сучаснікаў, мастак пасля сябе, "апрача добрага імя і твораў жывапісу нічога не пакінуў". Пахаваны ён у Менску, на Кальварыйскіх могілках. Замест помніка ў цвінтарнай капліцы была павешана карціна "Маленне збавіцеля", якую Дамель лічыў лепшым сваім творам.*

Літ.: Szemesz A. Wspomnienia o Damelu // Athenaeum. – T. II. – Wilno, 1842; Дробаў Л.М. Беларускія мастакі XIX ст. – Мн., 1971; Дробов Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. – Мн., 1974; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. – Т. 2. – Мн., 1985. С. 266-267; Encyklopedja powszechna /S.Orgelbrand. – T. 6. – Warszawa, 1861. – S. 701; Encyklopedja powszechna / S.Michalski. – T. 2. – Warszawa. – S. 701.

*Іна Соркіна (Гародня)*

109) Клячкоўскі (Kleczkowski) Мікалай. Ганаровы сябра ложы (1820), масон 4-й ст.
110) Корбут (Korbut) Пётр. Брат гармоніі 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
111) Корзун (Korzun) Ян. Масон 1-й ст. (1820).
112) Корсак (Korsak) Іпаліт. Масон 1-й ст. (1818-1820).
113) Косцял (Kostyał) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
114) Кулеша (Kulesza) Пётр. Масон 2-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
115) Курнатоўскі (Kurnatowski) Багуслаў Уладзіслававіч. Масон 4-й ст. (1820).
116) Лазіньскі (Łoziński) Юзаф. Ініцыяваны каля 1815 г., масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820), Брат гармоніі.
117) Лангхамп (Longchamp) Юзаф. Масон 1-й ст. (1820).
118) Лаперэ (Lapierre) Ян. Ініцыяваны каля 1810 г.
119) Лёншан Юзаф.
120) Лісоўскі (Lisowski) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
121) Лопат (Łopott) Міхал. Ініцыяваны каля 1815 г. Масон 3-й ст. (1818), Другі сцюарт і масон 4-й ст. (1820).
122) Лопат (Łopott) Станіслаў. Намеснік Суддзі ложы (1818).
123) Люткевіч (Lutkiewicz) Ануфры. Ганаровы сябра ложы, масон 6-й ст. (1820).
124) Лутkоўскі Ян. Масон 1-й ст. (1818).
125) Лыхоўскі (Łychowski) Павел. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
126) Любаньскі (Lubański) Ян. Ініцыяваны каля 1814 г. Масон 3-й ст. (1818).
127) Ляўковіч (Lewkowicz) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
128) Магільніцкі (Mogilnicki) Пятро Ігнатавіч. Ініцыяваны каля 1814 г. Масон 3-й ст. і намеснік Майстра абрадаў (1818), 4-й ст. (1820).
129) Магільніцкі (Mogilnicki) Станіслаў. Масон 3-й ст. (1820).
130) Маеўскі (Maewski) Франц. Масон 2-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
131) Малаткоўскі. Брат служачы ў 1810 г.
132) Малеўскі (Malewski) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820-1821).
133) Манюшка (Moniuszko) Дамінік. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
134) Граф Мараўскі (Morawski) Караль Дзям’янавіч. Майстар кафедры (1818-1819), масон 7-й ст. (1820-1821).
135) Маркіанавіч (Markianowicz) Юзаф Фаміч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820-1821).
136) Мацкевіч (Mackiewicz) Гжэгаж. Брат служачы (1818-1820), масон 1-й ст.
137) Мацкевіч (Mackiewicz) Міхал. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
138) Медзыхоўскі (Miedzychowski) Тамаш. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
139) Межаеўскі (Mierzeiewski, Mierzejewski) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
140) Межаеўскі (Mierzeiewski, Mierzejewski) Калікст Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820-1821), былы Майстар ложы “Сябры чалавецтва”.
141) Межаеўскі (Mierzeiewski, Mierzejewski) Міхал. Масон 2-й ст. (1820).
142) Мікуцкі (Mikucki) Ігнацы. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
143) Мінасовіч (Minasowicz) Юзаф Дзіянісі. Ганаровы сябра, масон 5-й ст. (1820), прадстаўнік пры Вялікім усходзе (1817-1820).
144) Мірскі (Святаполк-Мірскі, Mirski) Станіслаў. Ініцыяваны каля 1810 г., Суддзя (1818), масон 3-й ст. (1820).

145) Мітарноўскі (Mitarnowski) Антоні. Масон 4-й ст. (1820).
146) Мітарноўскі (Mitarnowski) Ксаверы. Масон 3-й ст. (1818-1820).
147) Мітарноўскі (Mitarnowski) Юзаф. Масон 4-й ст. (1820).
148) фон Міхельсон (Michelson) Бернард (Берэнс) Райнольд Міхайлавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
149) Міцкевіч (Mickiewicz) Ігнацы.
150) Мухлінскі (Muchlinski) Ігнацы. Масон 3-й ст. і намеснік Сакратара (1818), 5-й ст. і Другі дазорац (1820-1821).
151) Мухлінскі (Muchlinski) Феліцыян. Ініцыяваны каля 1815 г. Масон 2-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
152) Навамейскі (Nowomiejski) Канстанцы. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст.
153) Навіцкі (Nowicki) Банавентура. Масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. і Першы дазорац (1820).
154) Навіцкі (Nowicki) Матэвуш. Адзін з заснавальнікаў ложы, масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. (1820).
155) дэ Неве (de Newe) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
156) Незабітоўскі (Niezabitowski) Стэфан. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1819-1820).
157) Непакайчыцкі (Пацэй-Непакойчыцкі, Niepokojczycki) Адам Варфаламеевіч. Намесны майстар (1818), Майстар кафедры (1819-1820), масон 7-й ст. (1820).
158) Непакайчыцкі (Niepokojczycki) Міхал Ігнатавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820), Сакратар ложы "Уладзіслаў Ягайла".
159) Нолтэнмейер (Noltenmejer) Францішак. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
160) Норвід (Norwid) Ян. Масон 7-й ст. (1820).
161) Палонскі (Połonski) Юзаф. Масон 3-й ст. і прадстаўнік у ложы "Дасканалая еднасць" (1818-1820), 5-й ст. (1820).
162) Пангоўскі (Pągowśki) Юзаф. Масон 1-й ст. (1820).
163) Петэрсан Ян.
164) Пжыстаноўскі (Przystanowski) [Прыстаноўскі – С.Р.] Пётр. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
165) Пжэцішэўскі (Przeciszewski) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
166) Граф Плятэр (Plater) Канстанты. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
167) Пулікоўскі (Pulikowski) Раман. Масон 3-й ст., брат служачы (1818), 5-й ст. (1820).
168) Пуцілоўскі (Puciłowski) Бенедыкт. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1821).
169) Пясецкі (Piasecki) Людвік. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
170) Пяткевіч Францішак.
171) Рагасінскі (Rogosinski) Антоні. Масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. (1820).
172) Рогаўскі (Rogawski) Юзаф. Масон 1-й ст. да 1820 г.
173) Рагоза (Rahoza) Юзаф. Масон 4-й ст. (1820).
174) Князь Радзівіл (Radziwiłł) Дамінік. Ініцыяваны ў 1810 г., 6-й ст. і Майстар абрадаў (1820).
175) Князь Радзівіл (Radziwiłł) Канстанцін. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
176) Ражнецкі (Rożniecki) Аляксандр Аляксандравіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
177) Развадоўскі (Rozwadowski) Антоні. Ініцыяваны каля 1810 г. Масон 3-й ст. (1818-1820).

178) Развадоўскі (Rozwadowski) Вінцэнт. Ініцыяваны каля 1816 г. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. і Будаўнічы рахмістр (1820).
179) Развадоўскі (Rozwadowski) Людвік. Ініцыяваны каля 1814 г. Масон 3-й ст. і Сакратар (1818-1819), 5-й ст. і Сакратар (1820).
180) Равеньскі (Reweński) Ігнацы. Ініцыяваны каля 1815 г. Масон 4-й ст. і Скарбнік (1820).
181) Равеньскі (Reweński) Тадэвуш. Масон 3-й ст. (1820).
182) Развадоўскі (Rozwadowski) Ян. Ініцыяваны каля 1809 г. Першы дазорац (1818), Намесны майстар (1819), масон 7-й ст.
183) Барон Розэн (Rosen) Фрыдэрык (Фёдар Фёдаравіч). Ганаровы сябра ложы (1820), масон 5-й ст., Намеснік Майстра кафедры “Добры пастыр”.
184) Граф Рдултоўскі (Rdułtowski) Казімір. Ініцыяваны каля 1811 г. Масон 5-й ст. (1820).
185) Граф Жэвускі (Rzewuski) Адам Станіслававіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
186) Ромэр (Romer) Міхал Сцяпанавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
187) Ронге (Ronge) Караль. Масон 3-й ст. і Першы сцюарт (1818), Ялмужнік і масон 5-й ст. (1820), 6-й ст. (1821).
188) Роп (Ropp) Тэадор. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820), Другі дазорац у Правінцыяльнай ложы “Дасканалая еднасць”.
189) Рудзіньскі (Rudziński) Тадэвуш. Масон 1-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
190) Рымша (Rymsza) Ксаверы. Масон 3-й ст. (1819).
191) Рэйтан (Reytan) Дамінік. Масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. і Гасцёўнік (1820).
192) Садкоўскі (Sadkowski) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
193) Граф Салагуб (Sołłohub) Антоні. Масон 3-й ст. і Намесны майстар (1818), 7-й ст. (1820).
194) Свяжыньскі (Swieżyński) Матэвуш. Масон 3-й ст. (1820).
195) Граф Серакоўскі (Sierakowski) Ян. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
196) Сержпутоўскі (Sierzputowski) Ігнацы. Масон 3-й ст. (1820).
197) Сержпутоўскі (Sierzputowski) Ян. Масон 4-й ст. (1819-1820).
198) Сіверс Уладзімір.
199) Слізень (Ślizeń) Ян Юзафавіч. Масон 4-й ст. (1820).
200) Смігельскі Геранім.
201) Стацэвіч (Stacewicz) Ян. Масон 3-й ст. і Другі сцюарт (1818), 4-й ст. (1820).
202) Граф Суліcтроўскі (Sulistrowski) Казімір Алаізавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1818-1819).
203) Сулкоўскі (Sułkowski) Ян. Масон 3-й ст. (1820).
204) Сяржпіньскі (Sierzpiński) [Сержыінскі – С.Р.] Станіслаў. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
205) Сяўрук (Siewruk) Юзаф (Восіп Сяменавіч). Ганаровы сябра ложы (1820), масон 3-й ст. (1820).
206) Талькоўскі Юзаф.
207) Тарнэзы 1-ы (Tornezy) Цэзары. Масон 1-й ст. (1820).
208) Трусаў Іван.
209) Трушынскі Мікалай.

210) Турскі (Turski) Антоні. Масон 3-й ст. і Будаўнічы рахмістр (1818). Скарбнік да 1820 г., масон 5-й ст. (1820).

211) Тэльчэўскі (Telczewski) Дыянісі Ігнатавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).

212) Фальскі Юзаф.

213) Фелінг (Felling) Ян. Масон 1-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).

214) Філімонаў (Filimonow) Мікалай Гаўрылавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820-1821).

215) Фрыбэс (Fribes) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).

216) Хайноўскі (Choynowski) Матэвуш. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).

217)Хлявіньскі (Chlewiński) Адам. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).

218) Ходзька (Chodźko) Ян Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст., Майстар кафедры ложы "Паўночная паходня" (1820).

219) Хоніке (Honicke) Хрысціян Самуэль. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст., брат ложы "Добры пастыр" (1820).

220) Храпавіцкі (Chrapowicki) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).

221) Хрушчэўскі (Chruszczewski) Ануфры. Масон 3-й ст. (1818), 4-й ст., Захавальнік пячаткі і архіва (1818-1820).

222) Граф Чапскі (Czapski) Караль Францавіч. Масон 3-й ст. (1818), 7-й ст. (1820).

223) Чарноўскі (Czarnowski) Юзаф (Іосіф Гаўрылавіч). Масон 1-й ст. (1820).

224) Чарноцкі (Czarnocki) Караль. Масон 1-й ст. (1818-1820).

225) Чэхоўскі (Czechowski) Казімір. Ганаровы сябра ложы (1820).

226) Чэхоўскі (Czechowski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).

227) Шалькевіч (Szalkiewicz) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 2-й ст. (1820).

228) Шванцоў Ян.

229) Шусціскі (Szuściski) Ян. Масон 1-й ст. (1818), 3-й ст. і Брат гармоніі (1820).

230) Шчэнсновіч (Szczęsnowicz) Юльян. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).

231) Шыманьскі (Szymański) Тэафіл. Масон 1-й ст. (1818), 2-й ст. (1820).

232) Шэмеш (Szemesz) Казімір. Масон 1-й ст. (1818), 3-й ст. і Першы сцюарт (1820).

233) Эйдзятовіч (Eydziatowicz) Ігнацы. Масон 3-й ст. (1819).

234) Эльснэр (Elsner) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).

235) Эме (Ochme) Вінцэнт. Масон 3-й ст. (1817).

236) Эстка (Estko) Адам. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).

237) Юрскі (Jurski) Антоні. Масон 5-й ст. (1820).

238) Яблоньскі (Jabloński) Антоні. Масон 4-й ст. (1820).

239) Яблоньскі (Jabloński) Віктар Юзафавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1819).

240) Язерскі (Jezierski) Отан.

241) Граф Язерскі (Бібесцеў-Язерскі, Jezierski) Станіслаў. Масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. і Другі дазорац (1820).

242) Язерскі (Jezierski)Тадэвуш. Ініцыяваны ў 1810 г.

243) Яноўскі (Janowski) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).




Пячаткі і знакі масонскіх ложаў на беларускіх і літоўскіх землях напрыканцы XVIII – пачатку XIX ст.

## Нясвіж. Ніжэйшы (малы) капітул "Святыня спакою"*

1) Адынец (Odyniec) Геранім. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820), Прамоўца.
2) Анджэйковіч (Бутаўт-Анджэйковіч, Andrzeykowicz) Міхал Фадзеевіч. Майстар кафедры (1819), масон 5-й ст. (1820).
3) Анджэйковіч (Andrzeykowicz) Ян. Сябра капітула, масон 5-й ст.
4) Арцімовіч (Arcimowicz) Феліцыян Венедыктавіч. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
5) Аскерка (Oskierko) Казімір. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
6) Аскерка (Oskierko) Ян. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
7) Аўторп (Asztorp) Леан Францэвіч. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
8) Багдановіч (Bohdanowicz) Вінцэнт. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
9) Багдановіч (Bohdanowicz) Ігнацы. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
10) Бараноўскі (Baranowski) Юзаф. Сябра капітула, масон 1-й ст. (1819-1820).
11) Баранцэвіч (Barancewicz) Ігнацы. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
12) Берновіч (Bernowicz) Сарвацы. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
13) Болтуць (Bołtuć) Бенедыкт (Бенуа). Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
14) Брадоўскі (Brodowski) Ігнацы. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1817).
15) Булгарын (Bułharyn) Міхаіл. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
16) Бургельскі (Burgielski) Альберт. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
17) Буцэвіч (Bucewicz) Ігнацы. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
18) Бялоцкі (Białocki) Гжэгаж Янавіч. Сябра капітула (1819), масон 4-й ст. (1821).
19) Вайдзевіч (Woydziewicz) [Вандзевіч – С.Р.] Фелікс Францавіч. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст.
20) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Аўгуст. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
21) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Ежы. Сябра капітула.
22) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Леан. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
23) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Фларыян. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).
24) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Юзаф. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
25) Валадковіч (Wołodkowicz) Вінцэнт. Сябра капітула (1820), масон 3-й ст.
26) Валадковіч (Wołodkowicz) Мельхіор Ксавер'евіч. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
27) Валадковіч (Wołodkowicz) Юзаф. Сябра капітула.
28) Валовіч (Wołłowicz) Казімір. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
29) Ваньковіч (Wańkowicz) Антоні. Сябра капітула.
30) Ваньковіч (Wańkowicz) Апалінары Янавіч. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст.
31) Ваньковіч (Wańkowicz) Эдвард Станіслававіч. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
32) Верашчака (Wereszczaka) Міхал. Сябра капітула, масон 3-й ст.
33) Вітаноўскі (Witanowski) Дамінік Янавіч. Сябра капітула (1819), масон 4-й ст. (1820).
34) Вітаноўскі (Witanowski) Міхал Янавіч. Сябра капітула (1819), масон 4-й ст. (1820).
35) Вішнякоў Юзаф Ян Фёдаравіч. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
36) Воўк (Wołk) Адольф. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).

---

* Існаваў у 1817 – 1821 гг. Аб'ядноўваў братоў вышэйшых ступеняў з ложаў Гародні, Менска, Наваградка, Нясвіжа, Слуцка. У 1819 г. насіў таксама назву "Даліна Нясвіжа".

37) Вольскі (Wolski) Мікалай. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
38) Гадлеўскі (Godlewski) Францішак. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
39) Гайля Адольф. Сябра капітула (1820).
40) Гарабурда (Haraburda) Адам. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).
41) Гарайскі (Gorayski) Якуб. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).
42) Гендэрсон (Henderson) Тамаш. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
43) Гольц (Holc) Габрыэль. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. (1820).
44) Гофман (Hoffman) Караль. Прадстаўнік пры Вялікім усходзе Польскім (1820-1821), масон 7-й ст.
45) Гюнтэр (Günther) Адам. Сябра капітула і службовец капітула, масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
46) Дамброўскі (Dąbrowski) Ян Хрызастом. Сакратар капітула (1818), масон 7-й ст. (1820).
47) Дзердзіеўскі (Dzierdziejewski) Ян. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).
48) Дростэ (Droste) [Дрозд – С.Р.] Аўгустын. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
49) Елец (Jelec, Elec) Антоні. Сябра капітула, масон 4-й ст.
50) Жылінскі Ян. Сябра капітула.
51) Забароўскі (Zaborowski) Вінцэнт. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
52) Замойтэль (Zamoytel) Адам. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. (1820).
53) Звяровіч (Zwierowicz) Матэвуш. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
54) Зяновіч (Zenowicz) Міхал. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
55) Ігельстром (Igelstrom) Густаў. Сябра капітула, масон 4-й ст.
56) Кабылінські (Kobyliński) Ежы. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).
57) Каменскі (Kamienski) Казімір. Сябра капітула і службовец капітула (1818). Майстар абрадаў, масон 7-й ст. (1821).
58) Каменскі (Kamienski) Людвік Юзафавіч. Старшыня капітула (1818-1821), масон 7-й ст. (1820).
59) Катовіч (Kotowicz) Тэафіл. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
60) Керсноўскі Нікадым. Сябра капітула.
61) Клячкоўскі (Kleczkowski) Мікалай. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
62) Кулеша (Kulesza) Пётр. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
63) Лазінскі (Łozinski) Юзаф. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
64) Лопат (Łopot) Міхаіл. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
65) Лопат (Łopot) Станіслаў. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
66) Любаньскі (Lubański) Ян. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1818), 4-й ст. (1820).
67) Лянтоўскі Шымон-Францішак. Сябра капітула, масон 3-й ст.
68) Ляўковіч (Lewkowicz) Вінцэнт. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1818).
69) Ляхніцкі (Lachnicki) Ігнацы Антоніевіч. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820-1821).
70) Магільніцкі (Mogilnicki) Пятро Ігнатавіч. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
71) Маеўскі (Mayewski) Францішак. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
72) Манюшка (Moniuszko) Дамінік. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
73) Манюшка (Moniuszko) Чэслаў. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
74) Мараўскі (Morawski) Караль. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
75) Маркевіч (Markiewicz) Матэвуш. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
76) Мацкевіч (Mackiewicz) Міхал. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).

77) Медзыхоўскі (Miedzychowski) Тамаш. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
78) Межаеўскі (Mierzeiewski) Антоні. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
79) Межаеўскі (Mierzeiewski) Калікст. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
80) Мітарноўскі (Mitarnowski) Антоні. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
81) Мітарноўскі (Mitarnowski) Юзаф. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
82) фон Міхельсон (Michelson) Бернард (Берэнс). Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
83) Мухлінскі (Muchlinski) Ігнацы. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. (1820).
84) Мухлінскі (Muchlinski) Феліцыянт. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
85) Навіцкі (Nowicki) Бонавентура. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. (1820).
86) Навіцкі (Nowicki) Матэвуш. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).
87) Незабітоўскі (Niezabitowski) Стэфан. Сябра капітула (1818-1819), масон 4-й ст. (1819-1820).
88) Непакайчыцкі (Пацэй-Непакайчыцкі, Niepokojczycki) Адам Варфаламеевіч. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1818).
89) Непакайчыцкі (Пацэй-Непакайчыцкі, Niepokojczycki) Міхал Ігнатавіч. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
90) Палонскі (Połonski) Юзаф. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. (1820).
91) Пётух [Пятух – С.Р.] Юзаф. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
92) Пжыстаноўскі (Przystanowski) [Прыстаноўскі – С.Р.] Пётр. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст.
93) Пясэцкі (Piasecki) Людвік. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
94) Рагасінскі (Rogosinski) Антоні. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. (1820).
95) Развадоўскі (Rozwadowski) Вінцэнт. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
96) Развадоўскі (Rozwadowski) Леан. Сябра капітула (1818).
97) Развадоўскі (Rozwadowski) Людвік. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
98) Развадоўскі (Rozwadowski) Ян. Сябра капітула (1818), масон 7-й ст. (1820).
99) Ратыньскі (Ratyński) Антоні. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
100) Рдултоўскі (Rdułtowski) Казімір. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
101) Ронгэ (Ronge) Караль. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. (1820).
102) Равеньскі (Rewieński) Ігнацы. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
103) Равеньскі (Rewieński) Тадэвуш. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
104) Рэйтан (Reytan) Дамінік. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. і Другі дазорац (1820).
105) Садкоўскі (Sadkowski) Ян. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
106) Свяжыньскі (Swieżyński) Матэвуш. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
107) Граф Серакоўскі (Sierakowski) Ян. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).
108) Сержпутоўскі (Sierżputowski) Ян. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
109) Сіманоўскі (Simonowski) Пётр. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1819-1820).
110) Слізень (Ślizeń) Ян Юзафавіч. Сябра капітула, масон 4-й ст.
111) Солтан (Sołtan) Адам. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
112) Стацэвіч (Stacewicz) Ян. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
113) Сядлецкі (Siedlecki) Казімір Мацвеевіч. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
114) Сянкевіч Вінцэнт. Сябра капітула, масон 4-й ст.
115) Сяржпіньскі (Sierżpiński) [Сержыінскі – С.Р.] Станіслаў. Сябра капітула (1818), масон 4-й ст. (1820).

116) Сяўрук (Siewruk) Юзаф Сямёнавіч. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
117) Тарчыньскі (Torczyński) Пётр. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
118) Турскі (Turski) Антоні. Сябра капітула (1818), масон 5-й ст. Архівіст і Захавальнік пячаткі (1820).
119) Філімонаў (Filimonow) Мікалай. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
120) Фрыбэс (Frybes) Вінцэнт. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
121) Фрыбэс (Frybes) Францішак. Сябра капітула, масон 7-й ст. (1820).
122) Хлявіньскі (Chlewiński) Адам. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
123) Хрушчэўскі (Chruszczewski) Ануфры. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
124) Граф Чапскі (Czapski) Караль Францавіч. Падскарбі капітула (1818), масон 7-й ст. (1820).
125) Чахоўскі (Czechowski) Станіслаў. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
126) Шэмеш (Szemesz) Казімір. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
127) Эстка (Estko) Адам. Сябра капітула, масон 3-й ст. (1820).
128) Яблонскі (Jabłonski) Антоні. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
129) Яблонскі (Jabłonski) Віктар. Сябра капітула, масон 4-й ст. (1820).
130) Граф Язерскі (Бібесцяў-Язерскі, Jezierski) Станіслаў. Сябра капітула, масон 5-й ст. (1820).
131) Яноўскі (Janowski) Вінцэнт. Сябра капітула (1819), масон 4-й ст. (1820).

## Слуцк. Ложа “Уладзіслаў Ягайла”*

1) Адынец (Odyniec) Геранім. Намесны майстар (1818-1820), масон 5-й ст. (1820-1821).
2) Акунь Каэтан.
3) Анджэйковіч (Бутаўт-Анджэйковіч, Andrzeykowicz) Міхал Фадзеевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
4) Арцішэўскі (Arciszewski) Антоні Казіміравіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
5) Багдановіч (Bohdanowicz) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, масон 1-й ст. (1820).
6) Бараноўскі (Baranowski) Юзаф. Ганаровы сябра ложы, ініцыяваны ў 1819 г., масон 1-й ст. (1819-1820).
7) Баранцэвіч (Barancewicz) Ігнацы. Масон 2-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
8) Беліковіч (Bielikowicz) Ігнацы.
9) Бернард (Bernard) Герман Іванавіч. Ініцыяваны каля 1815 г., Ялмужнік і масон 3-й ст. (1818-1820).
10) Бістром. Ініцыяваны ў Слуцку, Шатландскі майстар.
11) Болтуць (Bołtuć) Бенедыкт (Бенуа) Феліксавіч. Масон 2-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
12) Болтуць (Bołtuć) Пётр.
13) Брадовіч Макар.
14) Букініч Якаў.

* Заснавана каля 1818 г. Сімвалічная ложа, якая працавала ў складзе Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і ВКЛ пад кіраўніцтвам Правінцыяльнай ложы “Дасканалая еднасць” пад № 32.

15) Булгарын (Bułharyn) Вінцэнт.
16) Булгарын (Bułharyn) Міхал Людвікавіч. Масон 2-й ст. (1818), 3-й ст. і Майстар абрадаў (1820).
17) Буцэвіч Ігнацы. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
18) Быкоўскі (Bykowski) Людвік.
19) Быкоўскі (Bykowski) Міхал. Ганаровы сябра ложы, масон 2-й ст. (1820).
20) Воджбун (Wodżbun) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 1-й ст. (1818-1820).
21) Воджбун (Wodżbun) Леан.
22) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Аўгуст Фларыянавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
23) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Фларыян. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. і Майстар абрадаў (1818), 5-й ст. (1820), 6-й ст. (1821).
24) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Юзаф Мікалаевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
25) Вайніловіч (Woyniłłowicz) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
26) Ваньковіч (Wańkowicz) Антоні.
27) Ваньковіч (Wańkowicz) Казімір.
28) Венцкоўскі Матэвуш. Масон (1820-1822).
29) Венцлавовіч Ксаверы.
30) Вішнеўскі (Wisznewski) Павел. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
31) Вішнякоў (Wiszniakow) Юзаф Ян (Фёдаравіч). Ганаровы сябра ложы 3-й ст. (1820).
32) Вольскі (Wolski) Мікалай. Ганаровы сябра ложы (1818), масон 4-й ст. (1820).
33) Вышчынскі Юзаф.
34) Гантарскі Антоні.
35) Гарабурда (Haraburda) Адам. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1821).
36) Гардзенін 1-ы.
37) Гатоўскі Мікалай Паўлавіч. Ганаровы сябра ложы.
38) Гендэрсон (Henderson) Тамаш. Сябра ложы 7-й ст. і Суддзя (1818).
39) Гітль Каэтан.
40) Давідоўскі Уладзіслаў.
41) Дамбкоўскі (Dąbkowski) Адам. Масон 2-й ст. (1818), 4-й ст. і Прамоўца (1820).
42) Даўгяла Шымон. Ганаровы сябра.
43) Князь Длускі (Dłuski) Міхал Сцяпанавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
44) Елец (Elec, Jelec) Міхал.
45) Ёдка (Jodko) Антоні.
46) Ёдка (Jodko) Ануфры. Ганаровы сябра.
47) Забароўскі (Zaborowski) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
48) Завадскі (Zawadzki) Казімір. Ганаровы сябра ложы, масон 2-й ст. (1818), 3-й ст. (1820).
49) Замойскі (Zamoyski) Тадэвуш. Ганаровы сябра ложы, масон 2-й ст. (1820).
50) Збарашэўскі (Zbaraszewski) Анджэй. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
51) Званцоў 1-ы Іван Паўлавіч.
52) Зяновіч (Zenowicz) Міхал Антоніевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1819-1820).

53) Ігельстром (Igelstrom) 2-і Аляксандр Густававіч. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
54) Ігельстром (Igelstrom) Густаў. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
55) Каменскі (Kamienski) Аляксандр Людвікавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 2-й ст. (1818); 3-й ст. і наместнік Сакратара (1820).
56) Каменскі (Kamienski) Канстанцін Львовіч. Масон 3-й ст. (1818-1822).
57) Каменскі (Kamienski) Людвік Юзафавіч. Заснавальнік ложы, масон 7-й ст. (1820), Майстар кафедры (1818-1820).
58) Камаеўскі Караль.
59) Клімантовіч Ян.
60) Корвін-Красінскі. Ініцыяваны каля 1818 г.
61) Крушчынскі Тамаш.
62) Кузьма Станіслаў.
63) Кунцэвіч Ігнацы.
64) Курнатоўскі (Kurnatowski) Багуслаў Уладзіслававіч. Масон 4-й ст. і Прамоўца (1818-1820).
65) Курнатоўскі (Kurnatowski) Людвік. Масон 4-й ст., Прамоўца.
66) Лапіцкі (Łapicki) Юзаф.
67) Ласка Мікіта.
68) Лютніцкі Антоні.
69) Ляўковіч (Lewkowicz) Міхал.
70) Маліноўскі Юліян.
71) Мамерзускі Т.
72) Маркевіч (Markiewicz) Францішак. Масон (1822).
73) Марцінкевіч (Marcinkiewicz) Алэн.
74) Межаеўскі (Mierziejewski) Антоні. Масон 3-й ст. і Падскарбі (1818), 4-й ст. (1820).
75) Мірскі (Святаполк-Мірскі, Mirski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
76) Мітарноўскі (Mitarnowski) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. і Будаўнічы рахмістр (1818), 4-й ст. (1820).
77) Навакоўскі (Nowakowski) Тадэвуш.
78) Непакайчыцкі (Пацэй-Непакайчыцкі, Niepokojczycki) Адам Варфаламеевіч. Ганаровы сябра ложы, масон 7-й ст. (1820).
79) Непакайчыцкі (Niepokojczycki) Міхал Ігнатавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. і Сакратар (1818).
80) Непакайчыцкі (Niepokojczycki) Ежы. Ганаровы сябра ложы.
81) Петрашкевіч (Pietraszkiewicz) Юзаф.
82) Пуцята (Puciata) Мікалай.
83) Пясецкі Людвік. Другі дазорац (1818), масон 4-й ст. і Суддзя (1820).
84) Пяткевіч Францішак. Ганаровы сябра ложы.
85) Пятроўскі (Piotrowski) Васіль.
86) Пятроўскі (Piotrowski) Фелікс. Масон 5-й ст., прадстаўнік пры Вялікім усходзе (1819-1820).
87) Ратомскі-Кміта (Кміта) Вінцэнт.
88) Рэйтан (Reytan) Дамінік. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1818), 5-й ст. (1820).

89) Садкоўскі (Sadkowski) Ян. Масон 3-й ст. і Майстар абрадаў (1818), 4-й ст. і Другі дазорац (1820).
90) Саецкі Банавентура.
91) Саковіч Юзаф.
92) Сержпутоўскі (Sierżputowski) Ігнацы. Захавальнік пячаткі і архіва (1818).
93) Сержпутоўскі (Sierżputowski) Казімір.
94) Сержпутоўскі (Sierżputowski) Ян. Сябра ложы, масон 3-й ст. і Захавальнік пячаткі і архіва (1819-1820).
95) Солтан (Sołtan) Ігнацы.
96) Стацэвіч (Stacewicz) Ян. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820).
97) Страхоўскі Людвік.
98) Сяўрук (Siewruk) Юзаф Сяменавіч. Другі сцюарт (1818), масон 3-й ст. (1820).
99) Талькоўскі Юзаф. Ганаровы сябра ложы.
100) Тарнезы (Tornezy) 1-ы Цэзары (Сямен Якаўлевіч). Ганаровы сябра ложы, масон 1-й ст. (1820).
101) Тоўсцік Вінцэнт.
102) Турскі (Turski) Антоні. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).
103) Тыльчэўскі Дыанісі (Дыянісі Ігнацьевіч). Масон 3-й ст. (1818-1820).
104) Граф Тышкевіч (Tyszkiewicz) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 1-й ст. (1820).
105) Фальскі Юзаф. Ганаровы сябра ложы.
106) Федаркевіч Сільвестр. Брат служачы.
107) Філімонаў (Filimonow) Мікалай Гаўрылавіч. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820-1821).
108) Фоўх Фердынанд.
109) Фрыбэс (Fribes, Frybes) Вінцэнт. Ганаровы сябра ложы, масон 4-й ст. (1820-1821).
110) Фукс. Масон 1-й ст. (1820), 2-й ст. (1820).
111) Хрсцішэўскі А.
112) Тэльчэўскі (Telczewski) Дыянісі Ігнатавіч. Масон 3-й ст. (1820).
113) Чэхоўскі (Czechowski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 3-й ст. (1820).
114) Чыбісаў Іван.
115) Шмігельскі (Szmigielski) Геранім.
116) Шчэнсновіч (Szczęsnowicz) Юльян. Масон 3-й ст. і Першы сцюарт (1818).
117) Шыманьскі (Szymański) Вінцэнт.
118) Шымковіч (Szymkowicz) Юзафат. Масон 3-й ст., прадстаўнік у ложы “Даскана-лая еднасць” (1820).
119) Яблоньскі (Jabłoński) Віктар Юзафавіч. Масон 4-й ст., Першы дазорац (1818).
120) Ягалкоўскі Гжэгаж. Прадстаўнік пры Вялікім усходзе (1820).
121) Язерскі (Jezierski) Отан. Ганаровы сябра.
122) Граф Язерскі (Бібесцяў-Язерскі, Jezierski) Станіслаў. Ганаровы сябра ложы, масон 5-й ст. (1820).

## Шклоў. Ложа “Саюз справядлівасці і дасканаласці”.

1) Інард Леў. Майстар кафедры.
2) Шмерль Ізраэль.



Пячатка Вялікага ўсходу
Каралеўства Польскага і ВКЛ.
1784 г.

Літаратура:

1. Добрянский С.Ф. Масонские ложи в Литве // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. – Кн.2. – Вильно, 1911. – С. 231-262.
2. Каталог пергаментов / Сост. Р.Ясас. – Вильнюс, 1980. – 610 с.
3. Ланда С.С. У истоков "Оды к юности" // Литература славянских народов: Адам Мицкевич:к столетию со дня смерти. – М.: Изд-во АН СССР, 1956. – Вып.1. – С. 5-64.
4. Материалы по истории масонства в прежней русской армии / Собщ. Тира Соколовская // Русская старина. – 1907. – Т. 130. Кн. VI. – С. 659-668; Кн. VII. – С. 197-216; Кн. VIII. – С. 405-432; Кн. IX. – С. 643-653.
5. Платонов О.А. Терновый венец России. Тайная история масонства. 1731-1996. – М.: Родник, 1996. – 703 с.
6. Пыпин А.Н. Русское масонство. XVIII и первая четверть XIX в. / Ред. и прим. Г.В.Вернадского. – Петроград: Огни, 1916. – 575 с.
7. Рыбчонак С. Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагоддзя (Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі) // Годнасць. – 1994. – № 1(2). – С. 3-14.
8. Серков А.И. Русское масонство. 1731-2000. Энциклопедический словарь. – М.: Российская политическая энциклопедия, 2001. – 1224 с.
9. Hass Ludwik. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX w. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1982. – 572 s.
10. Małachowski-Łempicki St. Wykaz polskich loż wolnomularskich oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum komisji historycznej Polskiej Akademii Umiejętności. – T. 14. – Kraków, 1930. – S.112-430.
11. Załeski S. O masonii w Polsce od roku 1742 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. – Kraków, 1899. – S.I-II, VII-IX, XX-XXVIII dodatek.
12. Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. – Kraków, 1908. – Cz. 1. – 274 s.; Cz. 2. – 248 s.

Юры Гардзееў (Кракаў-Гародня)

# З гісторыі гарадзенскіх масонаў*

## Літаратура і крыніцы

Першыя даследаванні, прысвечаныя гісторыі масонскага руху на землях былога Вялікага Княства Літоўскага, былі праведзеныя на мяжы XIX – XX ст. Адной з першых гэтую праблематыку закранула Фелікса Эгер, якая асвятліла старонкі мінулага "вольных муляраў" Рэчы Паспалітай, паказваючы гэты ліберальны ў сваёй істоце рух у абсалютна чорных колерах[1]. Адначасова з працамі Эгер пытанне гісторыі масонаў узняў Станіслаў Залэнскі[2]. Аднак сапраўдным пачынальнікам доследаў гісторыі масонскіх ложаў ВКЛ канца XVIII – пачатку XIX ст. трэба лічыць С.Дабранскага[3], які ў сваіх працах засяродзіў увагу на пытаннях адносінаў грамадскай думкі да руху франкмасонаў, іх стаўлення да праблемы аднаўлення незалежнасці Рэчы Паспалітай, адмены прыгоннага права, да спробаў масонскіх рэформаў Якуба Шымкевіча. Нягледзячы на відавочны недахоп дакументальных матэрыялаў, Дабранскі паспрабаваў высветліць адносіны гарадзенскіх масонаў да рэформы масонскага руху пачатку XIX ст.[4] Пытанні гісторыі масонаў у Рэчы Паспалітай уздымаў Станіслаў Малахоўскі-Лэмпіцкі. Асаблівую каштоўнасць маюць змешчаныя ў яго працах цікавыя дадзеныя аб складзе гарадзенскай масонскай арганізацыі[5]. Пытаннем гісторыі гарадзенскіх масонаў займаўся таксама Юзаф Ядкоўскі[6]. Малалікія, але досыць

---

* Перадрук з незначнымі ўдакладненнямі з дазволу аўтара. Артыкул упершыню быў надрукаваны ў *Гістарычным Альманаху* ў 2001 г. (Т. 5. – С. 78-104).

[1] Eger F. Historia masonerii i innych towarzystw tajnych. – Warszawa, 1904; яна ж. Żydzi i masoni we wspólnej pracy. – Warszawa, 1908.

[2] Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1742 do 1822. – Kraków, 1889; ён жа. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822. – Wyd. 2. – Kraków, 1908. – Cz. 1.

[3] Добрянский С. Масонские ложы в Литве // Записки Северо-западного отдела Императорского Русского географического общества (далей ЗСЗОИРГО). – Кн. 2. – Вильно, 1911. – С. 231-262; ён жа. Очерки из истории масонства в Литве // ЗСЗОИРГО. – Кн. 4. – Вильно, 1914. – С. 103-145.

[4] Добрянский С. Масонские ложи... – С. 252.

[5] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego Wielkiego Księstwa Litewskiego 1776-1822 // Rozprawy Wydziału Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Wilnie. – Wilno, 1930. – T. IV. – Z. 1; ён жа. Wolnomularstwo polskie za Stanisława Augusta (1784-1795) // Wiedza i Życie. – 1927. – Nr 21. – S. 1-18; ён жа. Wykaz polskich loż oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum Komisji Historycznej. – Kraków, 1930. – T. II. – S. 112-430.

[6] Jodkowski J. Loża masońska w Grodnie i Białymstoku w latach 1781-1782 // Głos Ziemi Grodzieńskiej. 9. IX. 1931.

важныя звесткі па вышэйзгаданай тэматыцы можна сустрэць у працах Людвіка Хаса[7]. Урэшце гісторыю гарадзенскіх масонаў раскрыў Вячаслаў Швед[8].

Нешматлікасць захаваных крыніцаў па гісторыі гарадзенскіх масонаў, на жаль, не дазваляе даць разгорнутую характарыстыку гэтай цікавай старонкі мінулага Гародні. У прадстаўленым матэрыяле ўвага будзе засяроджана галоўным чынам на пытаннях заснавання, дзейнасці, структуры і ўнутраным складзе гарадзенскіх масонскіх ложаў.

## Масонскі рух у Рэчы Паспалітай і гарадзенскія масоны XVIII ст.

Як вядома, рух "вольных муляраў" нарадзіўся на брытанскіх астравах у першай чвэрці XVIII ст. Адсюль масонскія ідэі пранiклі на еўрапейскі кантынент, а першая ложа ў Рэчы Паспалітай была заснавана ў Варшаве ў 30-х гг. XVIII ст.[9] У склад ложаў спачатку ўваходзіла пераважна арыстакратыя[10]. Папулярнасць масонскіх ідэяў значна пашырылася ў часы гаспадарання Станіслава Аўгуста. Ложы прапагандавалі і рэалізавалі ліберальныя прынцыпы палітычнай і рэлігійнай талеранцыі, свабоды, роўнасці, разумовага развіцця грамадства, якія былі "праявай асветніцкай веры ў розум і прагрэс"[11].

У 1781 – 1784 гг. сфармаваўся Вялікі ўсход Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага[12]. Факт з'яўлення гэтай структуры сведчыць пра тое, што масонскія погляды даволі хутка распаўсюдзіліся ў ВКЛ напярэдадні канчатковага фармавання Вялікага ўсходу[13]. Масонскія павевы не абмінулі Гародню, якая ў другой палове XVIII ст. была важным асяродкам палітычнага жыцця ВКЛ. Тут збіраліся сеймы, працавалі Літоўскі трыбунал і Літоўская асэсорыя. Абсалютна заслужана падарожнік Уільям Кокс назваў яе галоўным горадам Літвы[14].

Пра гарадзенскіх масонаў канца XVIII ст., як зрэшты пра большасць іншых ложаў ВКЛ, захаваліся надзвычай рэдкія звесткі. Малахоўскі-Лэмпіцкі тлумачыць гэта знікненнем архіваў ложаў таго часу[15].

---

[7] Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX w. – Wrocław, 1982.

[8] Швед В. Гродзенскія масонскія ложы (канец XVIII - пач. XIX ст.) // Гарадзенскія запісы. – Гародня, 1997. – С. 64-77.

[9] Добрянский С. Масонские ложи... – С. 232.

[10] Małachowski-Łempicki S. Wykaz polskich loż... – S. 117.

[11] Ibidem. – S. 1; Chmielowski P. Liberalizm i obskurantyzm na Litwie i Rusi // Biblioteka Dzieł Wyborowych. – Warszawa, 1898. – Nr 21. – S. 21-26; Siewierski J. Dzieci wdowy czyli opowieści masońskie. – Milanówek, 1992. – S. 8, 12.

[12] Małachowski-Łempicki S. Wykaz polskich loż... – S. 117.

[13] Добрянский С. Масонские ложи... – С. 233.

[14] Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. – Warszawa, 1963. – T. 1. – S. 681.

[15] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo polskie... – S. 1.

Першае ўпамінанне пра з'яўленне масонаў у Гародні адносіцца да 1779 г., калі сюды з мэтаю заснавання *loge de deputation* быў накіраваны суддзя Гурке з віленскай ложы "Добры пастыр"[16]. Прыезд віленскага сябра наводзіць на думку, што ў фармаванні сеткі масонскіх ложаў галоўная роля належала ложам вышэйшай інстанцыі. Таму, каб больш поўна асвятліць ход з'яўлення ложы "вольных муляраў" у Гародні, варта нагадаць пра характар арганізацыйнай структуры масонаў у Рэчы Паспалітай. Паводле масонскай канстытуцыі 1784 г. Вялікапольскую, Малапольскую і Літоўскую правінцыі масонаў узначальвалі наместнікі Вялікага майстра. У 1786 г. наместнікам Літоўскай правінцыі быў Людвік Гутакоўскі, майстар кафедры ў Гародні[17]. Кожная правінцыя мела Правінцыяльную ложу, якая карысталася правам заснавання сімвалічных ложаў (ці структураў ніжэйшай інстанцыі) і нагляду за ложамі ў сваёй правінцыі. У 1781 г. правы Правінцыяльнай атрымала ложа "Дасканалая еднасць"[18]. У гэтым жа годзе была заснавана гарадзенская ложа "L'hereuse Delivrance"[19]. С.Малахоўскі-Лэмпіцкі інфармаваў, што першым майстрам кафедры ў Гародні быў Людвік Гутакоўскі, а потым каралеўскі дарадчык Аўгуст Бэкю. Аднак вядома, што апошні нарадзіўся ў 1771 г., а ў 1787 г. скончыў Галоўную літоўскую школу. У 1784 г. ён ніяк не мог займаць гэтую пасаду[20]. Можна меркаваць, што на чале арганізацыі стаяў Ян Людвік Бэкю, вядомы дзеяч адміністрацыйнага апарата на Гарадніцы з асяроддзя падскарбія надворнага літоўскага Антонія Тызенгаўза.

У невялікай ступені раскрыць гісторыю гарадзенскай ложы канца XVIII ст. дазваляе адшуканы масонскі прывілей, датаваны чэрвенем 1781 г., які падае яе персанальны склад. Паводле зместу дакумента, ложа "L'hereuse Delivrance" передала паўнамоцтвы свайго прадстаўніцтва перад вышэйпастаўленымі масонскімі інстанцыямі Антонію Гадэну, Майстру кафедры віленскай ложы "Добры пастыр". Дакумент багата аздоблены масонскай сімволікай: калонамі, цыркулямі і г.д.

**Склад ложы "L'hereuse Delivrance" ("Шчаслівае вызваленне") у пачатку 80-х гг. XVIII ст.[21]**

1. ***Жан Эмануэль Жылібер***, *майстар кафедры. Батанік і прафесар медыцыны з Ліёна, заснавальнік Медыцынскай Акадэміі на Гарадніцы*[22].

[16] Ibidem. – S. 167.
[17] Ibidem.
[18] Добрянский С. Масонские ложи... – S. 234.
[19] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo polskie... – S. 9.
[20] Ibidem; Polski Słownik Biograficzny (далей PSB). – Kraków, 1935. – T. 1. – S. 392.
[21] Аддзел рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літвы (далей АР ЦБАН Літвы). F 1-318.
[22] Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz podskarbi nadworny litewski. – Londyn, 1970. – T. 1. – S. 383, 393.

2. ***Якуб Бэкю,*** *майстар абрадаў. Кіраўнік працы гарадніцкіх мануфактураў і дырэктар мануфактурнага кантару (бюро) (1780), наглядальнік мануфактураў на Гарадніцы (1780-1787)*[23].
3. ***Ян Людвік Бэкю,*** *скарбнік. Бухгалтар мануфактурнага кантару (1771), дыспанент гандлёвага кантару на Гарадніцы (1776), кантралёр Літоўскай Скарбавай камісіі (1778), дырэктар мытнай каморы ў Гародні*[24].
4. ***Францішак Нарвойш,*** *прамоўца. Былы езуіт, у 1769-1772 гг. кіраваў працамі па ачышчэнню рэчышча Нёмана, прафесар Віленскай Акадэміі, праводзіў астранамічныя доследы і меўся стаць дырэктарам гарадзенскай астранамічнай абсерваторыі*[25].
5. ***Фрыдэрык Шрайбэр,*** *сакратар. Харунжы надворнай міліцыі Антонія Тызенгаўза*[26].
6. ***Гэмбоўскі,*** *майстар абрадаў.*
7. ***Ян Гімель,*** *першы дазорац. Паручнік Шавельскага гарнізону*[27].
8. ***Й. Х. Мюнц (Muntz),*** *другі дазорац. Праўдападобна, служыў у А.Тызенгаўза*[28].
9. ***Караль Юзаф Вірыён,*** *захавальнік пячаткі.*
10. ***Караль Готліб.***
11. ***Эфраім Готліб***[29].
12. ***Хрысціян Эрнест Фэхнер.*** *Купец з Эльбланга, які ў 1788 г. атрымаў гарадзенскае грамадзянства*[30].
13. ***Ян Гадэфрой Вальтэр.*** *Бухгалтар гандлёвага кантару на Гарадніцы*[31].
14. ***[Тадэвуш] Юрэвіч.*** *Ксёндз, прэфект гарадзенскай школы Адукацыйнай Камісіі.*
15. ***Юзаф Сако.*** *Архітэктар, гарадзенскі гараднічы, з 1774 г. працаваў у А.Тызенгаўза*[32].
16. ***Захары Бютнэр.*** *Уладальнік нерухомасці, касір Гарадзенскай эканоміі*[33].
17. ***Зыгфрыд Шмідт.*** *Адзін з кіраўнікоў фабрыкі золата на Гарадніцы.*
18. ***Людвік Вязоўскі.*** *Каралеўскі маёр*[34].

Як бачым, майстрам кафедры гарадзенскай ложы ў 1781 г. быў добра вядомы доктар Жан Эмануэль Жылібер, а да сяброў ложы належалі асобы,

---

[23] Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – Londyn, 1971. – T. 2. – S. 382; PSB. – T. 1. – S. 392-393.
[24] Ibidem. S. 89, 342; PSB. T. 1. S. 393; НГАБ у Менску. Ф.1761, воп.1, ад.з. 14. Арк. 1232.
[25] Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1. – S. 321, 408.
[26] Ibidem. S. 496.
[27] Ibidem. T. 2. – S. 98.
[28] Ibidem. T. 1. – S. 497.
[29] Пра "рахункавода мануфактурнага кантару" на Гарадніцы Хрысціяна Готліба і Іагана Готліба (свечніка?) захаваліся згадкі ў гарадзенскіх гарадскіх кнігах 80-х гг. XVIII ст.: НГАБ у Менску, Ф. 1761, воп. 1, ад.з. 13. Арк. 412; ад.з. 14. Арк. 214; гл. таксама: *Spis mieszkańców Grodna z 1794 r. // Grodno w XVIII w. Miasto i ludność. – Białystok, 1997. – S.81.*
[30] НГАБ у Менску. Ф. 1761, воп. 1, ад.з. 14. Арк. 544.
[31] Тамсама. С. 352.
[32] Тамсама. С. 459; Łoza S. Architekci i budowniczowie w Polsce. – Warszawa, 1954. – S. 266.
[33] НГАБ у Менску. Ф. 1761, воп. 1, ад.з. 13. Арк. 564; ад.з. 14. Арк. 214; НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 19, ад.з. 1469. Арк.2.
[34] Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz ... – T. 1. – S. 247, 484.

блізка звязаныя з Антоніем Тызенгаўзам і мяшчане пераважна нямецкага паходжання.

Страта незалежнасці Рэчы Паспалітай прычынілася да закрыцця ложаў. Усе капіталы і масонскія архівы зніклі[35]. Таму ўявіць сабе формы дзейнасці масонаў у XVIII ст. даволі няпроста. Не выключана, што яны складаліся з традыцыйных дабрачынных ініцыятываў: падтрымкі ў адкрыцці шпіталяў, бязплатнага раздавання супоў і супрацьінфекцыйных прышчэпак. Гарадзенскія масоны не маглі абмінуць падобных чыннасцяў. Сябрамі ложы была тагачасная эліта з асяроддзя Антонія Тызенгаўза: дактары, архітэктары, прамыслоўцы, вайскоўцы і гарадзенскія мяшчане. Менавіта дзякуючы некаторым з іх у другой палове XVIII ст. узнікла і даволі дынамічна развівалася гарадзенскае прадмесце Гарадніца.

Л.Хас згадвае пра гарадзенскую "нерэгулярную ложу <...> св. Яна" (St. Jacques de la parfaite Egalite), якая існавала ў 80-ыя гг. XVIII ст.[36] Інфармацыя гэтая падаецца сумніўнай, бо існаванне ложы, якая не ўваходзіла ў склад Вялікага ўсходу, дакументальна не пацверджана.

## Масонская ложа ў Гародні ў 1817 – 1821 гг.

### Заснаванне

Адраджэнне масонскага руху на землях былога ВКЛ адбылося напачатку XIX ст., дзякуючы згодзе расейскага імператара Аляксандра I, які таксама быў масонам. Дадатковым фактарам, які спрыяў вышэйзгаданаму працэсу, стала існаванне розных патрыятычных арганізацыяў, такіх як "Саюз сяброў" у Варшаве, мэтай якога была рэстаўрацыя Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., шубраўцаў ці Таварыства філаматаў у Вільні[37].

У 1816 г. утварыліся ложы "Паўночная паходня" ў Менску і "Добры пастыр" у Вільні, а ў 1817 г. пачалі сваю дзейнасць яшчэ тры ложы: "Вузел еднасці" ў Навагрaдку, "Палямон" у Расенях і "Сябры чалавецтва" ў Гародні[38].

Першыя крокі гарадзенскай ложы былі наступныя. 5 красавіка 1817 г. Правінцыяльная ложа "Дасканалая еднасць" выдала "дыплом" пра стварэнне ложы ў Гародні[39]. 20 траўня Правінцыяльная ложа атрымала ад гарадзенскіх "вольных муляраў" просьбу пра зацвярджэнне ложы. Зварот пачынаюць словы: "Мы, майстар, чыноўнікі і работнікі той ложы сведчым гэтым лістом,

[35] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 53.

[36] Hass L. Wolnomularstwo... – S. 53; Рябинин И. Польское масонство // Масонство. – Москва, 1991. – С. 234.

[37] Добрянский С. Очерки из истории масонства... – С. 105.

[38] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 33, 50, 54; Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1742... – S. 188.

[39] АР ЦБАН Літвы. F 75-265. Арк. 87.



"Дом масонаў" у Гародні. XVIII. Фотаздымак. 2004 г.

Прывілей масонскай ложы "Сябры чалавецтва". 1817 г.



Na Chwałę Naywyższego Światów Budownika.
Pod zaręczeniem Nayprześwietnieyszego y Naypotężnieyszego Wielkiego Mistrza
Wielkiego Wschodu Polskiego y Litewskiego
Br: Stanisława Kostki Potockiego.
Loża Prowincyonalna Litewska Doskonałey Jedności na Wschodzie Wilna.
Wszystkim Lożom y Mularzom Regularnym.
Pozdrowienie. Moc. Jedność.

што WW ∴ вольныя муляры на Усходзе Гародні сабраныя ў дастатковай колькасці, звярнуліся да Нас з патрабаваннем, каб мы <...> выдалі Дыпламат законнай Канстытуцыі пра заснаванне новага храма на тым жа Усходзе пад назвай "Сябры чалавецтва"[40].

## Структура ложы

Галоўным ініцыятарам і стваральнікам ложы, а таксама яе першым майстрам, быў маршалак Берасцейскага павету Калікст Межаеўскі[41]. Пачынальнікамі ложы сталі былы палкоўнік войска ВКЛ Ігнацы Ляхніцкі[42], доктар Бернард Міхельсон, вядомы грамадскі дзеяч Ігнацы Эмануэль Ляхніцкі[43]. Да ліку заснавальнікаў арганізацыі належалі асэсар Гарадзенскага губернскага праўлення Рыгор Бялоцкі, сакратар Гарадзенскай шляхецкай палаты Міхал Вітаноўскі, дарадчык Віленскай Скарбавай палаты Ануфры Крыдэль, былы капітан войска Каралеўства Польскага Юзаф Бжазіна і гарадзенскі злотнік Філіп Майне.

Унутраная структура гарадзенскай сімвалічнай ложы складалася з трох узроўняў: вучня, чаляднікаі майстра. Акрамя таго існаваў падзел на дзейсных і ганаровых сяброў. Штогод 1 сакавіка адбываліся перавыбары на ўсе пасады. Крыніцы паведамляюць пра асабовы склад ложы "Сябры чалавецтва" 1819 і 1821 гг. і функцыі яе кіраўнікоў:

1) Майстар кафедры займаўся адміністрацыяй і фінансамі. Першым майстрам ложы "Сябры чалавецтва", як вядома, быў Калікст Межаеўскі[44], а ў

---

[40] Ibidem. PK 2-43 (F 5-43).

[41] Калікст Межаеўскі – уладальнік шэрагу маёнткаў у Пружанскім і Берасцейскім пав. Гарадзенскай губ. Памёр у красавіку 1854 г.; Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 53; НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 28, ад.з. 713. Арк. 1; Ф. 6, воп. 1, ад.з. 197. Арк. 87.

[42] Ігнацы Ляхніцкі – сябра Каралеўскага Варшаўскага сельскагаспадарчага таварыства. Гл.: Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 53; НГАБ у Гародні. Ф. 6, воп.1, ад.з. 162. Арк. 13, 37; Lachnicki J. E. Statystyka guberni Litewsko-Grodzieńskiej. – Wilno, 1817. – S. 1.

[43] Ляхніцкі І. Э. быў аўтарам *Statystyki guberni Litewsko-Grodzieńskiej* (1817), выдаўцам *Pamiętnika Magnetycznego* (Вільня, 1816-1818), ініцыятарам накіравання геалагічнай партыі ў мэтах даследавання пакладаў каменнай солі на Гарадзеншчыне, Віленшчыне і Беласточчыне (1824-1826). Дзякуючы яго намаганням у Друскеніках былі знойдзены водныя крыніцы (1824), белая крэйда ў Пышках пад Гародняй, маргель, крэйда і белая гліна ў Панямуні. У 1825 г. міністар фінансаў Расейскай імперыі звярнуўся да цэсарэвіча Канстанціна з просьбай узнагародзіць І.Ляхніцкага ордэнам св. Уладзіміра IV класа ці св. Ганны III класа. Гл.: *Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 53; Pamiętnik Magnetyczny Wileński. – 1816. – Nr 1. – S. 6-8; Chmielowski P. Liberalizm i obskurantyzm... – S. 85-94, 152; НГАБ у Гародні. Ф. 6, воп. 1, ад.з. 111. Арк. 19, 32-33.*

[44] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 53.

1819 г. – гарадзенскі грамадзянскі губернатар Міхал Бутаўт Анджэйковіч (1812-1824)[45].

2) Намеснікамі майстра былі рэгент Галоўнага гарадзенскага суда Вінцэнт Яноўскі (1819) і прэзідэнт 2-га дэпартаменту гэтага ж суда Антоні Елец.

3) Дазорцы дапамагалі майстру праводзіць "працы" ў ложы. Першым дазорцам у 1819 г. стаў Міхал Вітаноўскі, а наступным – дарадчык Гарадзенскай скарбавай палаты Вінцэнт Стычынскі (1821). Другім дазорцам у гэтыя гады быў выбраны прэзідэнт Гародні Казімір Крэйбіх[46].

4) Прамоўца вёў пратаколы паседжанняў і абвяшчаў рашэнні па асабліва складаных справах. Гэтую пасаду займалі адпаведна: асэсар Галоўнага гарадзенскага суда Дамінік Вітаноўскі (1819) і адвакат Бенедыкт Паўлоўскі, бацька пісьменніцы Элізы Ажэшкі (1821).

5) Скарбнік распараджаўся фінансамі. З захаваных крыніцаў вядома пра Рыгора Бялоцкага (1819) і скарбніка Гарадзенскага камітэту грамадскай апекі Юзафа Нелюбовіча (1821).

6) Суддзя рыхтаваў прысуды вінаватым братам. Яго функцыі выконвалі Антоні Елец (1819) і Вінцэнт Яноўскі (1821).

7) Ялмужнік займаўся фінансамі, прызначанымі для бедных, наведваў хворых сяброў ложы і размяркоўваў грашовую міластыню без абавязку фінансавай справаздачы. Ялмужнікам гарадзенскай ложы былі скарбнік Гарадзенскага павета Ян Заха (1819) і суддзя Рамуальд Данкевіч (1821).

8) Пасаду Сакратара, які рэдагаваў рабочыя пратаколы, займалі Бенедыкт Паўлоўскі і пісар магістрата Гародні Антоні Жышкевіч (1819-1821).

9) Майстрамі абрадаў, якія кантралявалі размяшчэнне братоў у ложы паводле іх ступеняў, былі падкаморы гарадзенскага павету Юзаф Эйсмант і Станіслаў Далінскі (1819-1821).

10) Сцюарт дапамагаў Ялмужніку ў правядзенні дабрачынных справаў і Майстру абрадаў падчас банкетаў. Першым сцюартам у 1819 г. быў Філіп Майне, потым у 1821 г. Мікалай Робі (у 1819 г. ён з'яўляўся Другім сцюартам). У 1821 г. Другім сцюартам быў гарадзенскі мешчанін Ян Міхаэліс[47].

11) Захавальнік пячаткі.

---

[45] Орловский Е. Гродненская старина. – Ч. 1. – Гродна, 1910. – С. 235; НГАБ у Гародні. Ф. 6, воп. 1, ад.з. 9. Арк. 5; Аддзел рукапісаў Бібліятэкі Вільнюскага універсітэту (далей АР БВУ). F 4, A 458. Арк. 24 адв.

[46] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 53; АР БВУ. F 4, A 458. Арк. 24 V.

[47] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 54; АР БВУ. F 4, A 458. Арк. 28 адв. Сярод згаданых прозвішчаў асаблівую ўвагу звяртае на сябе род Міхаэлісаў, які сустракаецца ў Гародні ўжо ў XVI ст. Юзаф Ядкоўскі знайшоў у актах Літоўскай Метрыкі звесткі пра будаўніка, які паходзіў з гэтага роду. У XIX ст. нашчадкам сямейных традыцый быў Юзаф Міхаэліс, вядомы архітэктар Гарадзенскай губ. У 1830 г. ён правёў папярэднія працы па направе будынку Дома дабрачыннасці ў Гародні. Гл.: *НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 1342. Арк. 249; Ф. 2, воп. 37, ад.з. 1037; Ф. 8, воп. 1, ад.з. 672; Jodkowski J. Grodno. – Wilno, 1923. – S. 82.*

12) Архівіст вёў архіў і ўсялякія рэестры. Гэтую пасаду займалі сакратар Гарадзенскага губернскага праўлення Казімір Сядлецкі (1819) і судовы рэгент Ян Нелюбовіч (1821).

13) Будаўнічы рахмістр правяраў усе спісы (1819 г. – Антоні Жышкевіч, 1821 г. – былы палкоўнік войска Каралеўства Польскага Ян Згурскі)[48].

Агульная колькасць сяброў ложы перавышала 150 чал.[49] Раз на год складалася справаздача, якая высылалася сімвалічнай ложы. Ложа мела ўласны суд. Парушэнне масонскага статута вяло да спагнання з сяброў грашовай кары, якая папаўняла дабрачынную касу.

Гарадзенскія масоны праводзілі паседжанні ў "гмаху масонскай ложы", размешчанай ва ўсходняй частцы Гародні. Пазней гэты будынак быў перададзены гарадскому Таварыству дабрачыннасці[50]. Сустрэчы адбываліся таксама ў палацы маёнтка Бобры мясцовага губернатара Анджэйковіча, збудаванага ў 1818 г. Паасобныя элементы маёнтка ("святы вяз" з унутранай капліцай, лямус, які не функцыянаваў як гаспадарчы аб'ект) з'яўляліся месцамі пэўных рытуалаў[51]. Нешматлікія актавыя матэрыялы дазваляюць сцвярджаць, што Будаўнічыя кнігі і іншыя дакументы складаліся па-польску і па-нямецку[52].

### Дзейнасць

У этычна-маральны кодэкс сяброў сімвалічных ложаў былі залічаныя наступныя якасці: давер, шчырасць, міласэрнасць, паслухмянасць, рахманасць, адвага і маўчанне. На кожным паседжанні шмат часу прысвячалася пытанню фінансавых выдаткаў на дабрачынныя мерапрыемствы. Таму з дзейнасцю масонаў можна звязваць некаторыя філантрапійныя акцыі пачатку XIX ст., звяртаючы асаблівую ўвагу на асобу гарадзенскага губернатара Міхала Бутаўта Анджэйковіча і іншых актыўных вольных муляраў.

Масоны напэўна прычыніліся да заснавання ў Гародні 12 снежня 1820 г. Таварыства дабрачыннасці. Гарадзенскі грамадзянскі губернатар М.Анджэйковіч, які, як вядома, быў майстрам ложы "Сябры чалавецтва", загадаў размясціць Таварыства ў будынку былога шпіталя св. Духа на Дамініканскай (былой Віленскай) вуліцы[53]. У 1824 г. у адпаведнасці з распараджэннем Анджэй-

---

[48] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 54; АР БВУ. F 4, A 458. Арк.24 адв.

[49] Załęski Z. O masonii w Polsce od roku 1738... – S. 204-210; Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 112-430; АР БВУ. F 4 A, 458. Арк.24 V-28 адв.

[50] Літоўскі Дзяржаўны гістарычны архіў (далей ЛДГА). Ф. 1135, воп. 12, ад.з. 283.

[51] Maroszek J. Bobra Wielka. Dzieje dworu i parku // Rocznik Białostocki. – 1991. – S. 285.

[52] АР ЦБАН Літвы. F 75-134. Nr 9-11.

[53] Dzieje Dobroczynności. – Wilno, 1820. – Nr 1. – S. 37; Шпіталь св. Духа быў заснаваны ў сярэдзіне XVI ст. каралевай Бонай. Нягледзячы на тое, што ў другой палове XVIII ст. будынак знаходзіўся ў пашкоджаным стане, асяродак працягваў сваю працу. Напачатку XIX ст. у ім пасяліліся марыявіткі, якія падтрымлівалі даўнія дабрачынныя традыцыі.

ковіча быў складзены праект перабудовы часткова знішчанага шпітальнага будынку, прызначанага пад Дом дабрачыннасці. Напярэдадні рамонтных працаў архітэктар Юзаф Міхаэліс павінен быў праверыць тэхнічны стан гмаху[54].

Гарадзенскія масоны ахвяравалі і збіралі дабрачынныя фундушы. У 1820 г. Анджэйковіч ахвяраваў на часопіс *Dzieje Dobroczynności* 100 руб. Фінансавую падтрымку гэтаму выданню аказалі таксама такія вядомыя гарадзенскія масоны як Ігнацы Ляхніцкі і Юзаф Бжазіна. У 1818 г. прэзідэнт Гародні Казімір Крэйбіх для тых жа мэтаў сабраў даволі значную суму 509,2 злотых і 130 руб. асігнацыямі. Здаралася, што масоны былі пасрэднікамі ў справе выдаткавання сродкаў на дабрачынныя мерапрыемствы. Такім чынам былі выдаткаваныя 200 руб. асігнацыямі, прысланыя жыхаркай Гародні Хацішэўскай на імя гарадзенскага пракурора Юзафа Гарыгляда[55].

Масоны прымалі ўдзел у працы кіраўнічага органа гарадзенскага Таварыства дабрачыннасці. У 1820 г. сярод 13 вылучаных кандыдатаў на кіруючыя пасады 6 належала да ложы “Сябры чалавецтва”. На пасаду прэзідэнта таварыства ўласную кандыдатуру прапанаваў губернатар Анджэйковіч, сяброў – чыноўнікі губернскіх установаў Юзаф Гарыгляд, Антоні Елец, Дамінік і Міхал Вітаноўскія і Казімір Крейбіх[56].

У дабрачынных акцыях прымалі ўдзел не толькі самі вольныя муляры, але таксама іх сваякі. Тагачасная прэса інфармавала пра дабрачынны канцэрт 11-гадовай дачкі губернатара Анджэйковіча Меланіі, які адбыўся ў доме яе бацькі. Меланія “...у час цяперашняга карнавала і шляхецкіх выбараў дала фартэпіянны канцэрт, з прымеркаваннем даходу на гарадзенскі Дом дабрачыннасці...”[57] Пасля канцэрту было сабрана 57 чырвоных злотых, 232 руб. і 10 кап. срэбрам, 195 руб. асігнацыямі.

## Гарадзенскія масоны і рэформа Якуба Шымкевіча

### Крызіс і закрыццё ложаў

У 1816 г. Вялікі ўсход працаваў над рэформай канстытуцыі 1784 г. Аднак разнастайныя падыходы і меркаванні прычыніліся да таго, што рэформа расцягнулася на чатыры гады. Асабліва гэта тычылася Літоўскай правінцыі. Рэфарматараў тут узначальваў Якуб Шымкевіч, які прадставіў салідную праграмуператварэння ложаў у навукова-дабрачынныя таварыствы[58]. Ста-

[54] НГАБ у Гародні. Ф.1, воп.1, ад.з. 1342. Арк. 249; Ф. 259, воп. 2, ад.з. 32. Арк. 6; Квитницкая Е. Особенности средневековых храмов Белоруссии // Архитектурное наследство. – 1975. – № 23. – С. 80.

[55] Dzieje Dobroczynności. – 1820. – Nr 1. – S. 37; НГАБ у Гародні. Ф. 6, воп. 1, ад.з. 198.

[56] Ibidem. – 1820. – Nr 1. – S. 39.

[57] Ibidem. – 1821. – Nr 15. – S. 307-308.

[58] Siewierski J. Dzieci... – S. 35.



Ігнацы Ляхніцкі, адзін з заснавальнікаў ложы "Сябры чалавецтва".

новішча масонскіх стуктураў значна ўскладнілася 16 сакавіка 1818 г. У гэты дзень на паседжанні віленскай ложы "Руплівы ліцьвін" Я.Шымкевіч паведаміў прысутным, што Літоўская правінцыя налічвае 10 ложаў (дакладна іх было 12), а колькасць сяброў дасягае лічбы 700. Я.Шымкевіч прапанаваў радыкальным чынам змяніць механізмы функцыянавання масонскай арганізацыі. Згодна яго меркаванню, канспірацыя ўскладняе далейшае існаванне і прыносіць празмерную шкоду масонству, якое не можа разлічваць на падтрымку як народу, так і ўраду. Якуб Шымкевіч прапанаваў ператварыць ложы ў незалежныя таварыствы без абавязковых сяброўскіх складак, выдаткаванне якіх у масонаў не кантралявалася. Ложы павінны былі функцыянаваць легальна, а кожная з іх мець асобны статус і самастойна праводзіць грамадскую дзейнасць, якая падлягала справаздачы. Дазвалялася братам з іншых ложаў прымаць удзел у паседжаннях кожнай ложы, але толькі ў якасці гасцей[59].

Майстар гарадзенскай лоджы "Сябры чалавецтва" М.Анджэйковіч ацаніў праект Я.Шымкевіча як малазначны і нерэальны. На яго думку, старая арганізацыйная структура павінна была быць захаваная. Дзеля ўзмацнення сваіх пазіцый праціўнікі Я.Шымкевіча 23 сакавіка 1818 г. стварылі Раду, на паседжанні якой былі выпрацаваныя накірункі далейшых дзеянняў і складзены ліст антырэфарматарскага зместу. Канстытуцыя, ухваленая 31 сакавіка 1820 г., у значнай ступені супярэчыла ідэям Я.Шымкевіча. Паводле яе, уводзілася цэнтралізацыя ў выглядзе сэмптэвірата на чале з Вялікім майстрам. Правы правінцыяльных і

[59] Добрянский С. Масонские ложи... – С. 237; ён жа. Очерки... – С. 117-120; "Traktat Jakuba Szymkiewicza o znaczeniu towarzystwa wolnomularzy i obowiązkach członków tego towarzystwa" сведчыў пра супярэчнасці паміж намерамі рэфарматарскага крыла і Вялікім усходам: "Dopraszamy się reformy dla tego ażeby było zniesione wyznanie tajemnictwa wolnomularskiego <...> Cele wolnomularstwa w oświeceniu dobroczynności poczytujemy za bardzo chwalebne i świetne, zatem chcemy zostać w dążeniu do tych że celów przez związek wolnomularski beztajemniczy. Gdy zaś takowa reforma wymaga odmiany ustaw przeto w tym celu życzymy aby wolno było każdemu podawać projekty i uwagi podług wewnętrznego najszczerszego przekonania <...> bo za najpierwszy sobie obowiązek cudze przekonanie szanować i nie gniewać się, że kto inszy czuje, pojmuje i myśli..." (АР ЦБАН Літвы. F 17/237/2. Арк.4, 41).

сімвалічных ложаў абмяжоўваліся. Аднак 21 сімвалічная ложа, у тым ліку і гарадзенская, не прынялі канстытуцыі[60].

Хваля пашыранага масонскага руху выклікала занепакоеннасць расейскага імператара Аляксандра I і ягоным указам ад 1 жніўня 1821 г. ложы былі зачыненыя[61]. 30 лістапада гэтага ж году віленскі генерал-губернатар Андрэй Рымскі-Корсакаў выдаў падобнае распараджэнне ў падначаленых яму губернях. 25 верасня 1822 г. Найвышэйшы сход масонаў у Варшаве атрымаў ад князя-намесніка ліст, у якім адзначалася: "...тайныя сходы могуць узбуджаць падазронасць нават тады, калі яны маюць на мэце найлепшыя намеры. Па гэтай прычыне прапаноўваем Найвышэйшаму сходу франкмасонаў у Польшчы і загадваем спыніць працу ва ўсіх іншых ложах на неакрэслены час..."[62] 28 верасня таго ж года Найвышэйшы сход пастанавіў схаваць у бяспечным месцы свае архівы і рэгаліі. Адказнымі за выкананне пастановы былі прызначаныя Станіслаў Класоўскі, Фрыдрык Пласт і Карл Гофман.

5 верасня 1822 г. гарадзенскі губернатар Анджэйковіч атрымаў распараджэнне пра закрыццё ложаў у губерні. Згодна лісту кіраўніка Міністэрства ўнутраных справаў графа Качубея загадвалася "закрыць усе ложы і іншыя тайныя таварыствы, а іх заснаванне адгэтуль не дазваляць <...> абвясціць пра гэта ўсім сябрам таварystваў і абавязаць іх да падпісання абяцання не прымаць удзелу ў іншых таварыствах вольных муляраў". Чыноўнікі былі змушаныя падпісваць абавязацельствы наступнага зместу: "Я, ніжэйпадпісаны, будучы сябрам таварыства былой масонскай ложы NN гэтым абвяшчаю, што ад гэтага часу ні ў якім выпадку не буду сябрам ні масонскіх, ні якіх-небудзь тайных таварыстваў, арганізаваных з якімі-небудзь высакароднымі намерамі"[63]. Падобныя абавязацельствы ў Гародні склалі каля 30 чыноўнікаў.

З ліста тайнага дарадцы Навасільцава да губернатара Анджэйковіча, датаванага 24 траўня 1823 г., вынікае, што нягледзячы на шматлікія забароны масонскія ложы працягвалі свае працы яшчэ ў 1823 г. У тым жа месяцы, на масонаў абрынуўся апошні ўдар. 25 траўня ў Вільні былі спаленыя масонскія дэкарацыі і абрадавыя прадметы (зоркі, чарапы, падсвечнікі). 29 траўня прэзідэнт Гародні Казімір Крэйбіх атрымаў аналагічнае распараджэнне і рэшткі атрыбутаў масонскіх арганізацый таксама былі спаленыя. Архіўныя дакументы вольных муляраў XIX ст. напаткаў той жа лёс, што і архівы XVIII ст.[64]

---

[60] АР ЦБАН Літвы. BF 9-3112. Арк.11 адв-12.
[61] Добрянский С. Масонские ложи... – С. 253.
[62] НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 2860, арк. 1, 4, 5.
[63] Ibidem. Арк. 7, 15, 17, 18, 20, 21, 25, 26, 34, 37, 38.
[64] Ibidem. Арк. 67-68, 71, 94; Добрянский С. Масонские ложи... – С. 26-27; Рябинин И. Польское... – С. 244. Паасобныя выпіскі актаў гарадзенскай ложы "Сябры чалавецтва" захоўваюцца ў фондах АР ЦБАН Літвы. F 75-134. Nr 9-11.

Закрыццю ложаў паспрыяла існуючая розніца поглядаў у асяроддзі масонскіх структураў. Аднак, як падаецца, існавалі больш важныя прычыны іх ліквідацыі. Прапановы Я.Шымкевіча па легалізацыі працы ложаў узбуджалі абгрунтаваную боязь часткі масонаў, што выяўленне некаторых іх поглядаў і дзеянняў (напр., абмеркаванне пытання ліквідацыі прыгонніцтва ці аднаўлення незалежнасці Рэчы Паспалітай) можа прывесці да рэпрэсій з боку расейскіх уладаў. Не выключана, што гарадзенскія масоны на чале з Анджэйковічам разумелі, што легальныя ўмовы дзейнасці ложаў нават пад прыкрыццём навукова-дабрачынных працаў маглі прывесці да іх поўнага кантролю з боку царскай адміністрацыі. Гэта пацягнула б за сабой раскрыццё патаемных палітычных намераў масонаў. Можна меркаваць, што прапановы Я.Шымкевіча былі адкінутыя менавіта па гэтай прычыне.

Метады ажыццяўлення масонскіх планаў у асяроддзі розных ложаў істотна адрозніваліся. Гарадзенскія масоны схіляліся да эвалюцыйнага вырашэння важных сацыяльных пастулатаў. Так, палкоўнік І.Ляхніцкі ў сваёй кнізе *Biografia włościanina nad brzegami Niemna powyżej Łosośnej mieszkającego* у пытанні ліквідацыі прыгону ўскладаў надзею на расейскага імператара. У сваіх разважаннях І.Ляхніцкі кіраваўся дэкрэтамі саксонскага караля і вялікага князя варшаўскага ад 21 снежня 1807 г. пра вызваленне польскіх сялянаў[65]. Аднак пецярбургскі двор не ўспрыняў ініцыятыву І.Ляхніцкага, намаганні якога, аднак, кампенсавалі ўзнагародай за ўзорнае кіраванне ўласнай гаспадаркай.

Калікст Межаеўскі, першы Майстар кафедры "Сябры чалавецтва", як, зрэшты, і некаторыя іншыя масоны, меў падобныя памяркоўныя, стрыманыя погляды. Ён не падтрымліваў радыкальных метадаў дасягнення палітычных мэтаў. Гэта пацвярджаюць ягоныя пасіўныя адносіны да паўстання 1830 – 1831 гг. З 1816 г. К.Межаеўскі жыў у Варшаве, дзе даведаўся пра пачатак паўстання, да якога, аднак, не далучыўся і выехаў у Кракаў[66].

Пагадзіўшыся з фактам падзелаў краіны, масоны спадзяваліся на іншыя формы дзяржаўнага ладу, напр., на аўтаномны статус былых земляў ВКЛ у складзе Расейскай імперыі. Гэтым можна патлумачыць удзел у напалеонаўскай кампаніі на расейскім баку шэрагу сябраў будучай ложы "Сябры чалавецтва" Рыгора Бялоцкага, Людгарда Бухавецкага і Казіміра Сядлецкага.

Масонскі рух аказаў значны ўплыў на студэнцкую моладзь. Вядома, напр., што філамат Тамаш Зан быў сябрам віленскай ложы "Школа Сакрата", на паседжаннях якой дэкламаваў вершы[67]. Блізкія кантакты з філаматамі падтрымліваў таксама І.Ляхніцкі[68].

[65] Lachnicki I. Biografia włościanina nad brzegami Niemna powyżej Łosośnej mieszkającego. – Warszawa, 1815. – S. 4, 135.

[66] НГАБ у Гародні. Ф. 4, воп. 1, ад.з. 87. Арк. 6, 7.

[67] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach... – S. 44, 187.

[68] Korespondencja filomatów (1817-1823). – Warszawa, 1989. – S. 359, 447.

Згодна меркаванню выдатнага знаўцы масонскай гісторыі Л.Хаса, нават пасля афіцыйнага закрыцця некаторыя ложы працягвалі сваю дзейнасць нелегальна. Да іх Л.Хас залічвае якраз ложу "Сябры чалавецтва"[69]. Ягоны пункт погляду знаходзіць пэўнае, хоць і даволі хісткае абгрунтаванне. Даводзіць гэта цікавы факт з гісторыі горада канца 30-х гг. XIX ст. У лістападзе 1838 г. актыўны калісьці сябра масонскага руху Пётр Сіманоўскі параіў вучню 7 класа гарадзенскай гімназіі Карлу Бернарду далучыцца да ложы. Праўда, гімназічныя ўлады не здолелі даказаць спробу (калі, канешне, яна мела месца) завербаваць К.Бернарда. Галоўным доказам віны падавалася кніга, якую К.Бернард атрымаў ад старога масона. Аказалася, аднак, што яна была зборнікам одаў і песняў на французскай мове, якія некалі хвалялі вольных муляраў[70].

**Спіс удзельнікаў гарадзенскай ложы "Сябры чалавецтва"**

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 1. | Адамовіч Якуб | Выв[адовы] дэп[утат] Гарадзенскага пав. | 2 |
| 2. | Адынец Геранім | Жыхар Слуцкага пав. | |
| 3. | Алізар Нарцыз | Вучыўся ў Крамянецкай гімназіі, у Віленскім універсітэце, афіцэр напалеонаўскай арміі, сакратар-кашталян Каралеўства Польскага, 1831 г. – старшыня Грамадзянска-вайсковай Рады Валынскай губ., дзеяч арыстакратычнага асяроддзя Вялікай эміграцыі, публіцыст, сябра Віленскага Тапаграфічнага таварыства, Таварыства падтрымкі "Дзённіка Віленскага", 1843 г. – узначальваў манархічнае "Таварыства 3 траўня". | † (нябожчык) |
| 4. | Аляшкевіч Юзаф | Мастак, вучыўся ў Ф.Смуглевіча ў Вільні, у Дрэздэне і Парыжы, 1811 г. – сябра Імператарскай Акадэміі мастацтва, аўтар партрэтаў А.Чартарыскага, А.Міцкевіча, Л.Сапегі і Г.Жавускага. | 33 |
| 5. | Анджэйковіч Фелікс | 1805 г. – маршалак Кобрынскага пав., 1817 г. – суддзя Апеляцыйна-межавага суда Кобрынскага пав., кобрынскі марша-лак, з 1821 г. – старшыня Апеляцыйна-межавага суда Гарадзенскай губ. | 31 |
| 6. | Анджэйковіч Ян | 1819 г. – флігель-ад'ютант імператара, палкоўнік расейскай гвардыі, генерал-маёр. | 5 |
| 7. | Анджэйковіч Міхал Бутаўт | 1794 г. – маёр кавалерыі, 1813 г. – гарадзенскі віцэ-губернатар, 1815, 1817, 1819 гг. – выконваючы абавязкі гарадзенскага губернатара, 1819 г. – гарадзенскі губернатар, 1824 г. – валынскі губернатар, з 30-х гадоў жыў у Пецярбурзе, Майстар кафедры. | 5 |

[69] Hass L. Wolnomularstwo... – S. 318.
[70] ЛДГА. Ф. 567, воп. 2, ад.з. 4462. Арк. 1, 2, 8.

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 8. | Багурскі Пётр | Афіцэр і ўдзельнік паўстання Т.Касцюшкі, паручнік польскіх войскаў, 1805-1808 гг. – прысяжны 2-га дэпартаменту Гарадзенскага галоўнага суда, апеляцыйны суддзя Кобрынскага павету, 1812 г. – удзел у кампаніі на баку Напалеона, дарадца Кобрынскай падпрэфектуры | 33 |
| 9. | Бжазіна Юзаф | Былы капітан войска Каралеўства Польскага, заснавальнік ложы. | 3 |
| 10. | Блажаеўскі Банавентура | Генеральны зборшчык Каралеўства Польскага, прадстаўнік гарадзенскай ложы ў Польскім нацыянальным W.·.W.·. | † |
| 11. | Бліоре Карл Артур | Служачы ложы | 3 |
| 12. | Блоцкі Станіслаў | 1814 г. – межавы суддзя Кобрынскага пав. | 1 |
| 13. | Брадоўскі Антоні | 1798 г. – чыноўнік Скарбавай палаты Лідскага пав., 1800 г. – бухгалтар Скарбавай палаты Гарадзенскага пав., 1807 г. – скарбнік Ваўкавыскага пав., 1817 г. – страпчы (судовы абаронца) Ваўкавыскага пав. | 2 |
| 14. | Бухавецкі Людгард | 1811 г. – юнкер 2-й запасной брыгады артылерыі, 1812 г. – харунжы расейскіх войскаў, 1813 г. – падпаручнік, удзел у кампаніі ў Сілезіі, у Саксоніі і Францыі, 1816 г. – паручнік, 1818 г. – кандыдыт на пасаду прысяжнага Гарадзенскага галоўнага суда, асэсар гэтага ж суда. | 5 |
| 15. | Бучынскі Ян | Сакратар Сенату | 5 |
| 16. | Быкоўскі Канстанцін | Харунжы Ковельскага пав. | 5 |
| 17. | Быстры Каспар | Музыкант | 2 |
| 18. | Бялоцкі Рыгор | 1795 г. – пісар Валынскага губернскага праўлення, 1802 г. – рэгістратар Гарадзенскай Скарбавай палаты і перакладчык Гарадзенскага галоўнага суда, 1816 г. – сакратар Гарадзенскага губернскага праўлення, 1823-1824 гг. – дарадца Віленскага губернскага праўлення. | 4 |
| 19. | Вайніловіч Фларыян | Былы генерал войскаў Каралеўства Польскага. | 5 |
| 20. | Вайніловіч Юзаф | 1805 г. – харунжы Наваградскага пав., 1814 г. – маршалак Наваградскага пав. | 4 |
| 21. | Валовіч Яахім | Дзяржаўны дарадца, 1816 г. – маршалак Беластоцкай вобл., кіраўнік Беластоцкай вобл. | 3 |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 22. | Valовіч Ян | Былы капітан войскаў Каралеўства Польскага. | 1 |
| 23. | Вальтэр Багуміл | 1811 г. – суддзя Ваўкавыскага межавага суда, 1817 г. – прэзідэнт Ваўкавыскага межавага суда, прэзідэнт Ваўкавыскага гродскага суда. | 1 |
| 24. | Вейсанхоф Францішак | Вількамірскі падкаморы, маршалак Вількамірскага пав. | 3 |
| 25. | Верашчака Юзаф | 1814 г. – дэпутат шляхты на губернскіх выбарах [гарадзенскіх], 1817 г. – харунжы Наваградскага пав. | 3 |
| 26. | Відацкі Якуб | 1809 г. – дазорца вясковых складаў (Гарадзенская губ.), 1813 г. – прысяжны Кобрынскага ніжняга земскага суда, 1818 г. – Кобрынскі земскі спраўнік, 1837 г. – прысяжны Кобрынскага павятовага суда, 1840 г. – кобрынскі павятовы суддзя. | 1 |
| 27. | Вірыён Ян | 1813 г. – сябра Камісіі секвестраваных маёнткаў, 1814 г. – старшыня Гарадзенскага гродскага суда, 1817 г. – старшыня Гарадзенскага Апеляцыйна-межавага суда, гарадзенскі падкаморы. | 3 |
| 28. | Вітаноўскі Дамінік | 1808 г. – канцылярыст Камісіі па пытанням школьных фундушаў Валынскай, Падольскай і Кіеўскай губ., 1811 г. – памочнік ст. настаўніка літаратуры Валынскай гімназіі, 1813 г. – настаўнік лацінскай і польскай мовы Луцкай павятовай школы, 1815 г. – сакратар маршалка Гарадзенскай вывадовай дэпутацыі, 1818 г. – архівіст па пытаннях шляхецкіх сходаў і вывадовых дэпутацый, прысяжны Гарадзенскага галоўнага суда, 1820 г. – стрaпчы па скарбавых пытаннях Гарадзенскай губ. | 4 |
| 29. | Вітаноўскі Міхал | сакратар шляхецкай палаты Гарадзенскай губ., 1812 г. – генеральны сакратар французскай адміністрацыі Гарадзенскага пав., намеснік майстра кафедры. | 4 |
| 30. | Галіцкі Рожыц Якуб | 1797 г. – “люстратар харчавання, дэпутат па пытаннях геаграфічнага апісання”, 1808 г. – межавы, земскі дэкрэтавы і актавы рэгент Лідскага пав., снежань 1812 г. – в.а. лідскага, 1815 г. – лідскі земскі пісар. | 2 |
| 31. | Гарабурда Адам | Старшыня Слуцкага земскага суда | 4 |
| 32. | Гарыгляд Юзаф | 1804 г. – чыноўнік канцылярыі Сената (перапісчык, канцылярыст, памочнік метрыканта), 1806 г. – вучоба ў Віленскай юрыдычнай школе, 1810 г. – перакладчык Статута ВКЛ на расейскую мову, 1817 г. – пракурор Гарадзен. губ. | 3 |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 33. | Гарэцкі Юзаф | Былы капітан гвардыі Каралеўства Польскага. | † |
| 34. | Герс Аляксандр | 1819 г. – паручнік расейскіх войскаў. | 3 |
| 35. | Геч (Hetsch) Францішак | | |
| 36. | Главацкі Юзаф | Мастак, літограф, дэкаратар Менскага, Варшаўскага і Віленскага тэатраў, аўтар выяваў св. Пятра і св. Паўла ў Віленскім кафедральным касцёле, дэкаратар палаца Пацаў у Варшаве. | 3 |
| 37. | Глашка Юліян | да 1821 г. – гарадзенскі земскі суддзя. | 3 |
| 38. | Глінскі Аўгустын | 1782 г. – чыноўнік канцылярыі маршалка, 1791 г. – сакратар Камісіі паліцыі абодвух народаў, 1793 г. – генеральны сакратар Кароннай Камісіі, 1794 г. – асэсар паліцыі Часовай рады, сакратар аддзелу бяспекі Найвышэйшай нацыянальнай рады, 1807 г. – кіраўнік міністэрства паліцыі Вялікага Княства Варшаўскага, 1812 г. – сябра ўрадавай Дырэкцыі нацыянальнага тэатра, 1818 г. – рэферэндарый, 1823 г. – дзяржаўны дарадца, перакладчык тэатральных твораў. | † |
| 39. | Гофман Карл | Генеральны кантралёр манетнага двара, грамадзянін Каралеўства Польскага. | † |
| 40. | Гродэк Эрнэст Годфрыд | 1804 г. – прафесар і бібліятэкар Вілен-скага універсітэту, выкладчык лацінскай і старажытнагрэчаскай мовы, сябра Каралеўскага таварыства ў Гетынгене, майстар кафедры ложы "Zum Guten Hirten". | † |
| 41. | Грыгаровіч Карл | Былы паручнік войскаў Каралеўства Польскага. | 1 |
| 42. | Губарэвіч Станіслаў | 1810 г. – чыноўнік канцылярыі Гарадзен. галоўнага суда, 1814 г. – гранічны суддзя Лідскага пав., 1823 г. – дэлегат у гранічны суд Гарадзен. губ., 1829 г. - асэсар 1-га дэпартаменту Галоўнага гранічнага суда. | 3 |
| 43. | Дабжанскі Вінцэнт | Сакратар Галоўнага віленскага суда. | 6 |
| 44. | Далінскі Станіслаў | чыноўнік Гарадзенскай скарбовай палаты, майстар абрадаў. | 3 |
| 45. | Дамброўскі Міхал | 1814 г. – гарадзенскі гродскі суддзя. | 2 |
| 46. | Дамброўскі Хрызастам | слуцкі межавы суддзя. | † |
| 47. | Данкевіч Рамуальд | 1815 г. – сакратар Апеляцыйна-гранічнага суда Гарадзен. губ., 1817 г. – пісар Гарадзен. гродскага суда, 1821 г. – гранічны суддзя Гарадзен. губ., ялмужнік. | 3 |

| №<br>п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 48. | Даўнаровіч Казімір | Маршалак Сакольскага пав. | 3 |
| 49. | Дзежыц Ян | Суддзя Ваўкавыскага гродскага суда. | 2 |
| 50. | Дзяконскі Юзаф | Прэзідэнт Ваўкавыскага гродскага суда. | 3 |
| 51. | Длускі Міхал | Віленскі прэлат і архідыякан, 1795 г. – дэпутат Духоўнага трыбуналу ў Гародні, 1797 г. – сябра Літоўскай Адукацыйнай камісіі, 1801 г. – доктар тэалогіі, майстар кафедры ложаў "Дасканалая еднасць" і "Школа Сакрата". | † (1819) |
| 52. | Дмахоўскі Міхал | Судовы пісар Адукацыйнай камісіі. | 3 (1819) |
| 53. | Елец Адам | Да 1821 г. – гранічны суддзя Гарадзен. губ. | 3 |
| 54. | Елец Антоні | 1794 г. – прысяжны Надворнага літоўскага суда, 1801 г. – рэгент Галоўнага літоўскага суда, 1805 г. – судовы чыноўнік у Гародні, 1812 г. – земскі спраўнік (камісар) Лідскага пав., 1818 г. – старшыня 2-а дэпартамента Галоўнага гранічнага суда, лістапад 1818 г. – в.а. гарадзенскага губернатара, намеснік майстра кафедры і суддзя ложы. | 4 |
| 55. | Ельскі Плацыд | дэпутат Ваўкавыскага пав. | 1 |
| 56. | Ельскі Юзаф | 1816 г. – Ваўкавыскі земскі спраўнік. | 2 |
| 57. | Жукоўскі Шымон | прафесар Віленскага універсітэту. | 3 |
| 58. | Жышкевіч Антоні | пісар гарадзенскага магістрату, сакратар і будаўнічы рахмістр ложы. | 3 |
| 59. | Жэвускі Адам | польскі пасол у Парыжы, 1804 г. – сябра Варшаўскага Таварыства сяброў навук, 1809-1812 гг. – маршалак Кіеўскай губ., сенатар, 1818-1819 гг. – майстар кафедры ложы "Белы арол" (Санкт-Пецярбург), 1819-1820 гг. – вялікі майстар ложы "Астрэя", камер-юнкер Імператарскага двара. | † |
| 60. | Жэвускі Генрых | 1841-1844 г. – житомірскі маршалак, 1858 г. – правадзейны дзяржаўны дарадца, публіцыст і пісьменнік. | 5 |
| 61. | Завадскі Юзаф | Друкар. | 3 |
| 62. | Загурскі Ян | Былы палкоўнік войскаў Каралеўства Польскага. | 3 |
| 63. | Задарноўскі Станіслаў | адвакат Гарадзенскага галоўнага суда. | 3 |
| 64. | Заха Ян | 1802 г. – перапісчык Гарадзенскай Скарбавай палаты і памочнік канцылярыста Лідскага скарбавага камітэту, 1803 г. – бухгалтар, 1804 г. – кіраўнік аддзела Гарадзен. скарбавай палаты, 1812 г. – скарбнік Гарадзен. пав., ялмужнік. | 4 |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 65. | Іваноўскі Юзаф | Надворны дарадца. | 3 |
| 66. | Івашкевіч Ян | Сакратар аддзела спр[аваў] Камісіі ўрада Каралеўства Польскага. | † |
| 67. | Казлоўскі Міхал | Чыноўнік Каралеўства Польскага. | 3 |
| 68. | Кайсараў (Kajsaroff) Пётр | Шамбелан расейскага імператарскага двара, дзяржаўны дарадца. | 5 |
| 69. | Камароўскі Балтазар | Старшыня Магілёўскага галоўнага суда. | 5 |
| 70. | Камінскі (Каменскі) Казімір | Былы лідскі земскі суддзя. | † |
| 71. | Камінскі (Каменскі) Людвік | 1819 г. – прэзідэнт Менскага галоўнага суда, менскі віцэ-губернатар. | † |
| 72. | Камінскі (Каменскі) Юзаф | да 1819 г. – асэсар Гарадзенскага галоўнага суда. | 3 |
| 73. | Камінскі (Каменскі) Ян | Міравы суддзя Каралеўства Польскага. | 3 |
| 74. | Канюшэўскі Ян | Адвакат Гарадзенскага галоўнага суда. | 3 |
| 75. | Капроўскі Юзаф | Кандыдыт філасофіі. | 1 |
| 76. | Кашуба Адольф | 1814 г. – рэгент Гарадзенскага гранічнага суда, 1817 г. – ваўкавыскі межавы суддзя. | |
| 77. | Котвіч Ян | Адвакат Віленскага галоўнага суда. | 3 |
| 78. | Крыдэль Аляксандр | 1819 г. – асэсар 2-а дэпартамента Гарадзенскага галоўнага суда, 20-я гг. XIX ст. – старшыня Лідскага гродскага суда, 1829 г. – лідскі межавы суддзя, 1834 г. – чыноўнік Гарадзенскай скарбавай палаты па межавых справах. | 3 |
| 79. | Крыдэль Ануфры | Дарадца Гарадзенскай і Віленскай скарбовых палатаў, 1834 г. – чыноўнік па спецдаручэннях пры генерал-інфанце расейскіх войскаў, заснавальнік ложы. | 3 |
| 80. | Крэйбіх Казімір | Прэзідэнт Гародні, другі дазорац ложы. | 4 |
| 81. | Кузімовіч Тамаш | Тытулярны дарадца. | 3 |
| 82. | Кунцэвіч Юзаф | 1809 г. – сяржант 17-га пяхотнага палка, 1811 г. – падафіцэрскі ад'юнкт, 1812 г. – падпаручнік, 1813 г. – паручнік, удзел у кампаніях 1809, 1812-1813 гг., атрымаў польскі залаты ордэн і ордэн французскага ганаровага легіёну за геройства ў бітве каля в. Панкратовіцы на р.Бярэзіне. | 2 |
| 83. | Кунцэвіч Юры | 1802 г. – адвакат у Лідзе, падкаморны, 1808 г. – лідскі гродскі пісар. | 3 |
| 84. | Ланскі Сяргей | Камер-юнкер расейскага двара, дзяржаўны дарадца. | † |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені ў ложы (1821) |
|---|---|---|---|
| 85. | Ласковіч Станіслаў | 1812 г. – люстратар Лідскага пав., паручнік кавалерыі войскаў Каралеўства Польскага, 1814 г. – лідскі межавы суддзя, 1815 г. – лідскі земскі суддзя, да 1829 г. – прэзідэнт Лідскага межавага суда. | |
| 86. | Лыкаў Тэадор | Калежскі асэсар. | 3 |
| 87. | Любецкі-Друцкі Францішак Ксаверы | Віленскі грамадзянскі губернатар, 1812 г. – сябра варшаўскага Часовага ўраду, міністр скарбу, уладальнік м. Шчучын, 1830 г. – міністр скарбу Каралеўства Польскага, адзін з заснавальнікаў Польскага банка, сябра Дзяржаўнай рады Расеі. | † |
| 88. | Ляхніцкі Ігнацы | Былы палкоўнік войскаў ВКЛ, 1790-1792 гг. – вількамірскі лоўчы, 1793 г. – камісар Літоўскай Скарбавай камісіі, 1794 г. – сябра Гарадзенскай парадкавай камісіі, віцэ-прэзідэнт Гародні, аўтар *Biografii włościanina...* (1815), ганаровы дазорац школаў Гарадзенскай губ., заснавальнік ложы | 5 |
| 89. | Ляхніцкі Ігнацы Эмануэль | Вучыўся ў Віленскім універсітэце, доктар філасофіі, рэдактар і выдавец “Pamiktnika Magnetycznego”, “Dziejyw Dobroczynności”, “Wiadomości Brukowych”, аўтар даследаванняў у галіне хіміі, медыцыны і статыстыкі, камер-юнкер Імператарскага двара, заснавальнік ложы. | 4 |
| 90. | Майне (Meine) Філіп | Заснавальнік ложы і сцюарт. | 3 |
| 91. | Малеўскі Антоні | Рэгент Урадавай камісіі. | 4 |
| 92. | Мараўскі Карл | Палкоўнік войскаў ВКЛ, генерал-маёр у паўстанні 1794 г., 1812 г. – генерал брыгады галоўнага штабу Напалеона, Майстар кафедры ложы “Шчаслівае вызваленне” (Нясвіж), каралеўскі шамбелан. | † |
| 93. | Марачэўскі Казімір | 1806 г. – пружанскі гродскі суддзя, 1809 г. – асэсар 2-а дэпартамента Гарадзенскага Галоўнага суда, 1811 г. – пружанскі межавы суддзя, 1814 г. – пружанскі маршалак. | 2 |
| 94. | Марачэўскі Тэафіл | Былы асэсар Гарадзенскага галоўнага суда, былы падкаморы Лідскага пав. | 3 |
| 95. | Маркіяновіч Міхал | Доктар права, рэдактар часопісу “Русский инвалид” | 3 |
| 96. | Маркіяновіч Юзаф | Кіраўнік архіва Літоўскай Метрыкі. | 5 |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 97. | Мацкевіч Міхал | 1819 г. – маршалак Наваградскага пав. | 6 |
| 98. | Межаеўскі Калікст | Былы маршалак Гарадзенскай губ., першы майстар кафедры і заснавальнік ложы. | 6 |
| 99. | Межаеўскі Фелікс | Былы асэсар Магілёўскага Галоўнага суда. | 3 |
| 100. | Міхаэліс Ян | Гарадзенскі злотнік, другі сцюарт ложы. | 3 |
| 101. | Міхельсон Бернард (Берэндт) | З купецкай сям'і, вучыўся ў Берлінскай і Віленскай Акадэміях, а таксама ў Каралеўцы, 1786 г. – доктар медыцыны, 1797 г. – доктар Берасцейскага пав., сябра Віленскай лекарскай управы, удзельнік ваеннай кампаніі генералаў Нунсэна і Кутузава напрыканцы XVIII-пачатку XIX ст. 1808 г. – заснавальнік вайсковых шпіталяў у Менску і іншых гарадах, 1821 г. – сябра Рады Віленскай Акадэміі, ст. інспектар Гарадзенскай лекарскай управы, заснавальнік ложы. | 5 |
| 102. | Мусін-Пушкін Брус Базыль | Тайны litрадца. | † |
| 103. | Мухлінскі Ігнацы | Жыхар Наваградскага пав. | 5 |
| 104. | Насажэўскі Юльян | Жыхар Берасцейскага пав. | 2 |
| 105. | Невядомскі Якуб | Кіраўнік аддзела Ваеннага міністэрства. | 4 |
| 106. | Незабітоўскі Стэфан | Былы паручнік войскаў Каралеўства Польскага, 1847 г. – маршалак Гарадзенскай губ. | 4 |
| 107. | Нелюбовіч Юзаф | Скарбнік Камітэту грамадскай апекі Гарадзенскай губ., скарбнік. | 3 |
| 108. | Нелюбовіч Ян | Рэгент Гарадзенскага галоўнага суда, архівіст і захавальнік пячаткі. | 3 |
| 109. | Непакайчыцкі Адам | Маршалак Слуцкага пав. | † |
| 110. | Нёфель (Noeffel) Фрыдрых | | |
| 111. | Нямцэвіч Ян | Былы берасцейскі маршалак. | 3 |
| 112. | Патоцкі-Костка Станіслаў | 1784-1790 г. – Вялікі Прамоўца Вялікага Нацыянальнага усходу, 1807 г. – сябра Урадавай камісіі Каралеўства Польскага, старшыня Адукацыйнай палаты, 1812 г. – старшыня Дзяржаўнай рады і Рады міністраў, кіраўнік асветніцтва, Вялікі Майстар Вялікага Нацыянальнага усходу, 1815 г. – старшыня Сенату Каралеўства Польскага. | † |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 113. | Паўлоўскі Бенедыкт | 1819 г. – канцылярыст і перакладчык Гарадзенскага Апеляцыйна-межавага суда, 1833 г. – адвакат Гарадзенскай палаты грамадзянскага суда, прамоўца ложы. | 3 |
| 114. | Пахнеўскі Антоні | 1805 г. – кобрынскі гродскі пісар, 1811 г. – кобрынскі земскі суддзя, 1817 г. – прэзідэнт Кобрынскага Апеляцыйна-межавага суда. | 2 |
| 115. | Плятэр Людвік | Удзельнік паўстання Т.Касцюшкі, дыр[эктар] урадавай камісіі прыходаў і скарбу, сенатар-кашталян Каралеўства Польскага, сябра Варшаўскага Таварыства сяброў навук, 1805 г. – візітатар школаў Віленскай губ., арганізатар лясніцтва ў Каралеўстве Польскім, 1807-1811 – інспектар Дзярж. ляснога фонду ў васьмі заходніх губернях Расейскай імперыі, аўтар працаў у галіне лясной гаспадаркі, 1815 г. – дзярж. дарадца ў Часовым урадзе Каралеўства Польскага, 1816 г. – генеральны дырэктар Дзярж. ляснога фонду, Майстар кафедры ложы "Казімір Вялікі", аднавіў пасаду Вялікага намесніка Літоўскай правінцыі. | † |
| 116. | Пуцілоўскі Бенэдыкт | Адвакат Віленскага галоўнага суда. | 3 |
| 117. | Пярфільеў Павел | Чыноўнік мытні. | 2 |
| 118. | Ражнецкі Аляксандр | Генерал польскай кавалерыі ў расейскай арміі, 1807 г. – генерал брыгады французскіх войскаў, Генеральны інспектар польскай кавалерыі, 1810 г. – Намеснік Вялікага майстра Людвіка Гутакоўскага, 1821 г. – старшыня Урадавай дырэкцыі варшаўскіх тэатраў, 1826 г. – кіраўнік тайнай паліцыі і жандармерыі Каралеўства Польскага. | † |
| 119. | Рдултоўскі Казімір | Былы маршалак Наваградскага пав. | 5 |
| 120. | Робі Мікалай | Сцюарт ложы. | 4 |
| 121. | Розэн Фрыдрых | Тытулярны дарадца, дырэктар паштампаў у Вільні. | 5 |
| 122. | Ромэр Міхал | 1803-1813 гг. – прэзідэнт 2-а дэпартамента Віленскага Галоўнага суда, 1812 г. – прэзідэнт Вільні, 1814 г. – віцэ-прэзідэнт Віленскай судовай камісіі, 1820-1821 гг. – адзін з заснавальнікаў Віленскага Друкарскага таварыства і Віленскага Таварыства дабрачыннасці, майстар кафедры Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць", 1816-1817 гг. – прыхільнік вызвалення сялянаў на землях былога ВКЛ, 1820 г. – правадзейны дзяржаўны дарадца. | † |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 123. | Ронгэ Карл | Нясвіжскі аптэкар. | 6 |
| 124. | Рымовіч Міхал | Падпалкоўнік расейскіх войскаў. | 2 |
| 125. | Рымскі-Корсакаў Андрэй | Віленскі генерал-губернатар. | † |
| 126. | Рэвель Юзаф | Служачы ложы. | 3 |
| 127. | Рэмбелінскі Віктар | 1819 г. – дэпутат сойму, прадстаўнік гарадзенскай ложы пры Вялікім усходзе Каралеўства Польскага і ВКЛ. | 5 (1819) |
| 128. | Рэмбелінскі Райманд | Старшыня Мазавецкай вайсковай камісіі. | † |
| 129. | Сержпутоўскі Ян | Былы асэсар Слуцкага пав., адвакат Гарадзенскага галоўнага суда. | 4 |
| 130. | Сіманоўскі Пётр | 1813 г. – чыноўнік канцылярыі Секвестравай камісіі, 1814 г. – чыноўнік Гарадзен. губерн. праўлення, архівіст гарадзенскага маршалка, 1815 г. – пісар гарадзенскага маршалка, 1824 г. – сакратар гарадзенскай шляхты, 1828 г. – пісар маршалка Гарадзенскай губ. | 4 |
| 131. | Сіпайла Юзаф | Камісар Грамадзянска-вайсковага суда Пінска-Берасцейскага пав., 1814 г. – пружанскі межавы суддзя. | 3 |
| 132. | Скіндэр Ігнацы | Вывучаў права ў судовых установах, 1809 г. – лідскі падкаморы, 1814 г. – лідскі маршалак. | 3 |
| 133. | Стычынскі Вінцэнт | Вучыўся ў Віленскім універсітэце, 1808 г. – доктар філасофіі, чыноўнік Шляхецкага лідскага сходу, каморнік Менскага пав., 1808 г. – настаўнік Віцебскай гімназіі, 1811 г. – настаўнік Беластоцкай гімназіі, 1812 г. – памочнік дырэктара школаў Беластоцкай вобл., 1815 г. – драгічынскі гродскі суддзя, 1819 г. – дарадца Гарадзен. Скарбавай палаты, кантралёр, 1827 г. – дарадца Гарадзен. губ. праўлення, 1827-1838 гг. - штогод на працягу 2 месяцаў в.а. Гарадзен. віцэ-губернатара, дазорац. | 3 |
| 134. | Суда[к]оўскі Пётр | | |
| 135. | Сядлецкі Казімір | 1803 г. – чыноўнік Слонімскага земскага суда, 1807 г. – кіраўнік аддзела Гарадзен. губернскага праўлення, 1812 г. - сакратар Ваўкавыскага земскага суда, 1812 г. - удзел у вайсковай кампаніі на расейскім баку, 1813 г. – сенатар Гарадзен. губ., 1814 г. – прысяжны Ваўкавыскага і Наваградскага земскіх судоў, 1815 г. – наваградскі спраўнік, 1816 г. – сакратар Гарадзен. губернскага праўлення, архівіст і захавальнік пячаткі. | 4 |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 136. | Сядлецкі Фелікс | Каморнік Пружанскага пав. | 1 |
| 137. | Фаленскі (Фалінскі) Антоні | Скарбнік Скарбавай палаты Гарадзенскай губ. | 2 |
| 138. | Філс'ян (Filsjaen) Ян | Настаўнік, уладальнік жаночага пансіянату ў Гародні (да 1831 г.). | 1 |
| 139. | Хабжынскі Юзаф | Былы маёр войска Каралеўства Польскага. | 5 |
| 140. | Хлявінскі Адам | Былы наваградскі харунжы | 4 |
| 141. | Хмялеўскі Ян | | |
| 142. | Ходзька Ян | 1808 г. – судовы чыноўнік, падкаморы Віленскага пав., прэзідэнт Трыбунала Менскага пав., заснавальнік ложы "Школа Сакрата", майстар кафедры ложы "Паўночная паходня" (Менск), сябра Таварыства шубраўцаў, 1820 г. – на старонках прэсы патрабаваў адкрыцця летніх школаў для вясковых дзяцей, аўтар граматыкі польскай мовы (Парыж), 1822 г. – візітатар і дырэктар школ Віленскай губ., 1823 г. – візітатар і дырэктар школаў Магілёўскай і Віцебскай губ., у 1829 г. – высланы ў глыб Расеі. | † |
| 143. | Чачкоўскі Міхал | Адвакат берасцейскіх судовых установаў. | 3 |
| 144. | Шукевіч Алойзы | 1806 г. – земскі лідскі суддзя, 1812 г. – капітан польскіх войскаў, 1817 г. – лідскі падкаморы. | 3 |
| 145. | Шуліпнікаў Раман (Schoulipnikow) | Калежскі асэсар. | 5 |
| 146. | Шыц Карл | Палкоўнік камендатуры Гародні. | 3 |
| 147. | Шышка Леапольд | 1793 г. – падпаручнік польскай кавалерыі, 1799 г. – прысяжны Лідскага ніжняга земскага суда, 1806 г. – лідскі гродскі суддзя, 1808 г. – межавы суддзя Лідскага пав., 1834 г. – межавы суддзя Гарадзен. губ., 1840 г. – прысяжны Гарадзен. грамадзянскага суда. | 22 |
| 148. | Шэдэ (Schede) Фрыдрых | Гарадзенскі аптэкар. | 3 |
| 149. | Эйсмант Карл | Адвакат Гарадзенскага галоўнага суда. | 2 |
| 150. | Эйсмант Юзаф | Падкаморы Гарадзенскага пав. | 3 |
| 151. | Ягмін Павел | 1815 г. – падкаморы Берасцейскага пав., 1817 г. – берасцейскі маршалак. | 2 |
| 152. | Ягмін Станіслаў | Суддзя Кобрын. Апеляцыйна-межавага суда, 1815 г. – суддзя Гарадзен. Апеляцыйна-межавага суда, 1817 г. – прысяжны Гарадзен. галоўнага суда, 1823 г. – кобрынскі маршалак, 1832 г. – камер-юнкер, 1835 г. – сябра Берасцейскага камітэту па справах апісання грамадзянскай нерухомасці. | 3 |

| № п/п | Імя і прозвішча | Сацыяльны статус і пасада ў ложы | Ступені (1821) |
|---|---|---|---|
| 153. | Яноўскі Вінцэнт | Вывучаў права пры канцылярыі Гарадзен. гродскага суда, 1810 г. – адвакат, 1815 г. – сакратар межавага суда Гарадзен. пав., 1819-1821 гг. – рэгент Гарадзен. Галоўнага суда, суддзя ложы. | 4 |
| 154. | Ятэйка Палікарп | Вучыўся ў Я.Рустэма, настаўнік малюнка ў Нясвіжскай і Менскай гімназіях. | 2 |

## Крыніцы

НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 1, ад.з. 95. Арк. 1; воп. 2, ад.з. 246. Арк. 104; ад.з. 271. Арк. 1; Ф. 2, воп. 3, ад.з. 152. Арк. 1, 2, 8, 10, 13, 22, 26, 27, 31, 34-37, 39, 40, 46, 49, 51-53, 58-60, 67, 68, 73, 74, 78, 79, 83, 84; ад.з. 1309. Арк. 1, 3; воп. 4, ад.з. 247. Арк. 47; воп. 37, ад.з. 30. Арк. 1,2, 4; ад.з. 176. Арк. 1, 2, 4; ад.з. 1820. Арк. 63, 77, 95, 100, 111, 125, 127, 159, 161, 166, 176, 180, 203-205; ад.з. 1822. Арк. 1, 2, 6; ад.з. 1256. Арк. 1, 6; ад.з. 1399. Арк. 1-4; ад.з. 1841. Арк. 1; ад.з. 1700. Арк. 6-8; ад.з. 1839. Арк. 5-7; ад.з. 1850. Арк. 1; ад.з. 1854. Арк. 67-68; ад.з. 1857. Арк. 20, 23, 38-39; ад.з. 1861, Арк. 1-4; ад.з. 1971. Арк. 218; Ф. 6, воп. 1, ад.з. 406; Ф. 9 воп. 7, ад.з. 86. Арк. 39, 81, 455-456; Ф. 92, воп. 1, ад.з. 258. Арк. 99; Ф. 1144, воп. 2, akt 2, k. 7, 16, 29, 31, 36, 76, воп. 3, akt 34, k. 15, 20, 21, 23, 37; Ф. 1168, воп. 1, akt 3, k. 136; НГАБ у Менску. Ф. 1761, воп. 1, ад.з. 14. Арк. 1004; ад.з. 15. Арк. 434, 436, 438; АР БВУ. F 4. A 458. Арк. 24-28; Encyklopedia powszechna. – Warszawa, 1862. – T. 10. – S. 741-743; 1864. – T. 16. – S. 600-601; 1865. – T. 19. – S. 878; Słownik artystów polskich. – Warszawa, 1975. – T. 2. – S. 377; PSB. Kraków, 1936. – T. 2. – S. 192-193; Kraków, 1939. – T. 5. S. 193-195; Wrocław, 1954. – T. 8. – S. 59-60; Wrocław, 1976. – T. 21. – S. 729-730; Wrocław, 1978. – T. 23. – S. 819-822; Wrocław, 1981. – T. 26. – S. 679-682; Wrocław, 1984-1985. – T. 28. – S. 159-170; Wrocław, 1988. – T. 31. – S. 652-653; Wrocław, 1989. – T. 32. – S. 457-464; Wrocław, 1992. – T. 34. – S. 95-96, 106-107; Chmielowski P. Liberalizm i obskurantyzm na Litwie i Rusi // Biblioteka dzieł wyborowych. – Warszawa, 1898. – Nr 21. – S. 85-94, 98, 107, 152; Beauvois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich. 1803-1832. – Lublin, 1991. – T. 1. – S. 77, 92, 101, 104, 121, 148, 157, 195, 256, 264, 308; Lublin, 1991. – T. 2. – S. 67, 418, 419; Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822. – Wyd. 2. – Kraków, 1908. – Cz. 1. – S. 204-210; Małachowski-Łempicki S. Wykaz polskich loż oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum Komisji Historycznej. – Kraków, 1930. – T. II. – S.112-430; Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisariusza Michała Wołłowicza z r. 1833. – Grodno, 1934. – S. 92; Дробов Л. Живопись Белоруссии XIX – начала XX вв. – Минск, 1974.

*Юры Гардзееў (Кракаў-Гародня)*

# Гарадзенскія масонскія прывілеі з мяжы XVIII – XIX ст.

Гісторыя масонскіх ложаў на беларускіх землях сваімі пачаткамі сягае другой паловы XVIII ст. Пра існуючыя ў той час у Вялікім Княстве Літоўскім ложы звестак захавалася не шмат[1]. Значная частка масонскіх дакументаў і ложавай атрыбутыкі была знішчана пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, а таксама мэтанакіравана знішчалася расейскімі ўладамі напачатку XIX ст. Менавіта па прычыне малалікасці масонскай спадчыны і недастатковай вывучанасці мінулага вольных муляраў кожны знойдзены ў архіўных і рукапісных сховішчах дакумент выклікае заслужаную ўвагу.

Гародня была адным з гарадоў Вялікага Княства Літоўскага, дзе ў часы Станіслава Аўгуста Панятоўскага была заснавана масонская ложа “L’hereuse Delivrance” (“Шчаслівае вызваленне”)[2]. Адбылося гэта ў 1781 г. Трэба зазна-




Прывілей гарадзенскай ложы “Шчаслівае вызваленне”. 1781 г.

чыць, што прывілей на заснаванне гарадзенскай ложы захаваўся. Згодна з тагачаснай традыцыяй ён быў напісаны на французскай мове. Дакумент багата аздоблены масонскай сімволікай: выявай сонца (сімвал асвечанай дзейнасці), калонамі (цноты і мудрасці), шнуркамі і глобусам (сімваламі масонскага адзінства). З даволі сціплага зместу дакумента вынікае, што гарадзенскія вольныя муляры перадавалі паўнамоцтвы прадстаўляць сваю ложу ў вышэйшых масонскіх установах Антонію Гадэну, Майстру кафедры віленскай ложы "Добры пастыр".

Пастаўленныя ў канцы прывілея подпісы, сведчаць пра тое, што сябры гарадзенскай франкамоўнай ложы "L'hereuse Delivrance" былі ў большасці нямецкага і французскага паходжання, служылі ў складзе гарадзенскага каралеўскага батальёну ці працавалі на гарадніцкіх мануфактурах і мясцовых школах. Цікава, што ўзначальваў гарадзенскіх вольных муляраў доктар і батанік Жан Эмануэль Жылібер. Пасля выезду ў Вільню яго замяніў іншы паплечнік Тызенгаўза Якуб Бэкю.

У канцы XVIII ст. масонскі рух у Рэчы Паспалітай спыніўся. Яго адраджэнне пачалося на пачатку XIX ст. у часы праўлення імператара Аляксандра I, вядомага сваімі ліберальнымі поглядамі. "Адліга" закранула шматлікія беларускія гарады. У красавіку 1817 г. у Гародні была заснавана ложа "Сябры чалавецтва"[3]. Праз месяц рашэнне гарадзенскіх масонаў было зацверджана віленскай Правінцыяльнай ложай. Факт заснавання ложы фіксуе іншы прывілей, напісаны на польскай мове[4].

## Умоўныя абазначэнні і скарачэнні

□ – графічная выява масонскай ложы.
∴ – графічная выява брата масонскай ложы.
(...), (?) – словы або выражэнні, запіс якіх выклікае сумненні.
[ ] – расшыфроўка скарочаных слоў.
АР ЦБАН Літвы – аддзел рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы.
НГАБ у Менску – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Менску.
НГАБ у Гародні – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні.
ЗСЗОИРГО – Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества.
PSB – Polski Słownik Biograficzny.

*LA*
*DELI*
*VRAN*
*CE*

*A la Gloire du Grand Architecte de l'univers|*
*D'un Lieu ou regne Silence la Force et l'Union Salut aux Eclaires !*

*Nous Maitre en Chaire premiere et second Surveil|lant Officiers Dignitaires et Members de la □ de la Delivrance de Grodno i reconnoisons par le pre|sent Pouvoir le J. V. Antoine Godin Maitre en Chair de la ∴ du Bon Pasteur de Wilna et | le nommons notre Député Representant aupres des ∴∴∴ reunies sous le nom de la Parfait Union | de Lithvanie et l'authorisons d'agir pour lout ce qui nous concerna en se conformant aux | articles que notre ∴ lui a delivre. Fait a la ∴ de la Delivrance al'Orient de Grodno | l'an maçonique 5781 (b) 24 Juin*

*J. E. Gilibert*[5] *+ c. k. s.*
*Maitre en Chaire*

*J. Becu*[6] *+ c. k. s.* *M[ai]tr[e] en Chaire sub[se]que[nt]* — *Louis Wiazowski*[7] — *J. Sacco*[8]

*(J) Virion garde des sceaux*[9] — *J. Gimel*[10] *pr[emier] surv[eillant]* — *Charles Gottlieb (Golt?) Jean Godefroi*[11] *Walter*

*J. H. Müntz*[12] *seco[n]d surv[eillant]* — *Zacharius Büttner*[13]

*Jean Louis Becu*[14] *Tresoner* — *Ephraim Gottlieb*[15] *(Kaus?)*

*François Narwoysz*[16] *l'orateur* — *Chresteon Ernst Fechner*[17]

*Gembowski M[ai]tr[e] ceremonie* — *Siegfrierd Schmidt*[18]

*Plain Puvoir | pour | le T. V. S. Antoine | Godin Député | representant | de la V Loge | la Delivrance | à l'Orient de | Grodno au(nr)es les ∴∴∴ reunice(e?)* — *Thad: Jurewicz*[19]

*Fr. Schreiber*[20]
*Secretaire*

[прывесістая на стужцы круглая пячатка]

Крыніца: Аддзел рукапісаў Цэнтральнай Бібліятэкі АН Літвы. F 1-378

[авальная пячатка-штэмпель з выявай Пагоні і надпісам:
*LA PARFAITE UNION DE LITHUANIE]*

*Na Chwałę Naywyższego Swiatow Budownika*
*Pod zaszczytem Naywspanialszego y Naypotężnieyszego Wielkiego Mistrza. Wielkiego Wschodu Polskiego i Litewskiego*
*B ∴ Stanisława Kostki Potockiego*[21].
*W ∴ Loża Prowincyonalna Litewska Doskonaley Jedności*[22] *na Wschodzie Wilna.*
*Wwszystkim Łożom y Mularzom Regularnym.*
*Pozdrowienie. Moc. Jednośc.*

*My, Mistrz, Urzędnicy y Robotnicy Wey ∴ Loży Prowincyonalney Doskonalej Jedności na Wschodzie Wilna. Wiadomo czyniemy tem Pismem Naszym, | że BB ∴ Wolni Mularze na Wschodzie Grodna w dostateczney liczbie zebrani, udali się do Nas z żądaniem, ażebyśmy Im wydali Dyplommat prawney Konstytucyi | na założenie nowey Swiątyni na tymże Wschodzie pod nazwaniem „Przyjaciele Ludzkości". Zważywszy, iż żądanie BB ∴ Wschodu Grodzieńskiego dąży do Dobra y Sławy Za|konu y że okoliczności mieyscowe bynaymniey się temu nie przeciwią, a zatem chętnie przychyłające się do takowego żądania, My, Mistrz, Urzędnicy y Robotnicy Wey ∴ Loży Prowincyonalney Litewskiey | na mocy władzy udzieloney Nam od W ∴ Wdu ∴ Polskiego i Litewskiego przez art. 52 statutu tegoż W ∴ Wdu ∴ uprawnialiśmy. Utwierdziliśmy, jako ninieyszym pismem. Uprawniamy i utworzamy Łożę S° Jana | na Wschodzie Grodna pod żądanem nazwaniem „Przyjaciele Ludzkości" zostawać mającąm Naywyższom zwierzchnością W ∴ Wdu ∴ Polskiego i Litewskiego, nadaiąc ety moc y władzę pracowania w stopniach symbolicznych, | przyjmowania Swiętowych, wyzwalania na Towarzyszo [...wienia] Maystrow, upodoniania y przyswajania dawnych mularzy, a to wedle form i sposobow przypisanych w Rytuałach, które Im będą dostarczone z Naszą | pieczęcią y z podpisem Naszego Sekretarza. Obowiązujemy się ucyzynić ∴ : jak przynależy: ∴ o tem wszystkiem Raport W ∴ Wdowi ∴ Narodowemu w czasie przez prawo [....żonym] zamierza, ażeby ninieyszą Konstytucyą została po|twierdzona Jm Xiegi zapisana, a to dla tego, ażeby S JD ∴ D ∴ S Jana pod nazwaniem „Przyjaciele Ludzkości" mogła bydź wyobrażaną na zgromadzeniach W ∴ Wdu ∴ Narodowego przez swojego Deputata, którey sobie wybierze. Działo się na | wschodzie Wilna pod punktem geometrycznym dnia 5go miesiąca II R ∴ S ∴ S ∴ 5817go.*

*Mistrz katedry B ∴ Michał Dłuski*[23] + ∴
∴ *B .‡ . Konstanty Nowomieyski*[24] *sekretarz* \++

*Zastępca sekretarza B ∴ Stanisław Muller*[25] *III* \
[пячатка]
*namiestnik B ∴ Antoni Chrapowicki*[26]
*1 dozorca B Józef Strumiłło*[27]
*2 dozorca B ∴ Wincenty Dobrczański*[28]
*podskarbi (.......?)*
*1 mistrz obrządów B ∴ Jakub Liebert*[29]
*2y stuard B ∴ Wincenty Malewski*[30]

[прывесістая на стужцы круглая пячатка]

Крыніца: АР ЦБАН Літвы. РК 2-43

Заўвагі:

[1] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo polskie za Stanisława Augusta (1784-1795) // Wiedza i Życie. – 1927. – Nr 21. – S. 1.

[2] Ibidem. – S. 9; АР ЦБАН Літвы. F 1-378. У гэтым месцы я хацеў бы выказаць шчырую падзяку Янне Гансяроўскай з Навуковай бібліятэкі ПАУ і ПАН у Кракаве за дапамогу ў падрыхтоўцы да друку тэксту гэтага прывілею.

[3] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego Wielkiego Księstwa Litewskiego 1776-1822 // Rozprawy Wydziału Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Wilnie. – T. IV. – Z. 1. – Wilno, 1930. – S. 33, 50, 54; Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1742 do 1822. – Kraków, 1889. – S. 188; АР ЦБАН Літвы. F 75-265. Арк. 87.

[4] АР ЦБАН Літвы. РК 2-43 (F 5-43). Згодна са жнівенскім указам 1821 г. ложы, якія функцыянавалі ў Літве і Беларусі, былі закрытыя. 5 верасня 1822 г. гарадзенскі губернатар Міхал Анджэйковіч атрымаў распараджэнне аб закрыцці ложаў ва ўсіх гарадах губерні. Трэба заўважыць, што нягледзячы на вiдавочную забарону гарадзенская масонская ложа працягвала існаваць яшчэ год (Добрянский С. Масонские ложы в Литве // ЗСЗОИРГО. – Кн. 2. – Вильно, 1911. – С. 253. Паасобныя выпіскі актаў гарадзенскай ложы "Сябры чалавецтва" захоўваюцца ў фондах АР ЦБАН Літвы. F 75-134. Nr 9-101).

[5] Жан Эмануэль Жылібер, батанік і прафесар медыцыны з Ліёна, заснавальнік Медыцынскай Акадэміі і батанічнага саду на Гарадніцы. Склаў фітагеаграфічную карту наваколля Гародні. Аўтар *Flora Lithuanica inchoata.* У 1781 пераехаў у Вільню (Sławiński W. Gilibert Jan Emanuel (1741-1814) // PSB. – T. 7. – Kraków, 1948. – S. 464-466; Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz podskarbi nadworny litewski. – T. 1. – Londyn, 1970. – S. 383, 393).

[6] Якуб Бэкю, дырэктар мануфактурнага кантару, загадваў працай гарадніцкіх мануфактур пасля адхілення А.Тызенгаўза ад кіравання каралеўскімі эканоміямі (1780-1787). Меркаванне Станіслава Малахоўскага-Лэмпіцкага аб тым, што Я.Бэкю выконваў функцыю майстра кафедры, мае пад сабою абгрунтаваныя падставы. Хутчэй за ўсё Я.Бэкю ўзначаліў мясцовых масонаў ужо ў 1781 г. пасля пераезду Жылібера ў Вільню (Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 2. – Londyn, 1971. – S. 382; Kościałkowski S. Bécu Jakób // PSB. – T. 1. – S. 392-393; Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 61).

[7] Людвік Вязоўскі, прафесар механікі, алгебры і геаметрыі гарадзенскага Корпусу кадэтаў, з 1780 г. аўдытар у рангу капітана гарадзенскага каралеўскага батальёна (Machynia M., Rakutis V., Srzednicki Cz. Oficerowie Wojska Wielkiego Księstwa Litewskiego 1777-1794. Spisy. – Kraków, 1999. – S. 496, 499; Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1. – S. 247, 484).

[8] Юзаф Сака (1735, Верона – 1798, Гародня), архітэктар Літоўскай Скарбавай камісіі, з 1774 г. працаваў у А.Тызенгаўза, маёр гарадзенскага каралеўскага батальёна. Аўтар шматлікіх аб'ектаў, узведзенных у Гарадзенскай каралеўскай эканоміі, прымаў удзел у рамонце Новага Каралеўскага замка і палаца А.Тызенгаўза на Гарадніцы, кіраваў гарадніцкай будаўнічай школай. Памёр у 1798 г. Пахаваны ў Гародні (НГАБ у Менску. Ф. 1761, воп. 1, ад.з. 9. Арк. 1289-1293; ад.з. 16. Арк. 233; Łoza S. Architekci i budowniczowie w Polsce. – Warszawa, 1954. – S. 266; Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1-2. – Londyn, 1970-1971; Postołowicz L. Józef de Sacco – architekt JKMci na Grodzieńszczyźnie // Białostocczyzna. 1995. – Nr 1. – S. 201-205; Polanowska J. Sacco Józef // PSB. – T. XXXIV. – Wrocław, 1992-1993. – S. 251-253; Machynia M., Rakutis V., Srzednicki Cz. Oficerowie... – S. 495, 499).

[9] Можна меркаваць, што Захавальнікам пячаткі ложы быў не Ян Вірыён, як раней лічылася, а Караль Юзаф Вірыён, які ў 1778 г. быў доктарам Гарадзенскай скарбавай харугвы. У канцы XVIII ст. жыў на вуліцы Маставой (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 299; Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1. – S. 390, 402).

[10] Першы дазорац Ян Жымель (паручнік Шавельскага гарнізона (1773, 1777), капітан, а потым маёр гарадзенскага каралеўскага батальёна (1780). Гл.: *Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1. – S. 464, 495; T. 2. – S. 98; Machynia M., Rakutis V., Srzednicki Cz. Oficerowie... – S. 440, 442, 449, 495, 498.*

[11] Ян Гадэфрой (Годфрыд) Вальтэр, паншчошнік, які прыбыў на Гарадніцу ў 1768 г., бухгалтар гандлёвага кантару (Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1. – S. 305, 352).

[12] Другі дазорац Й.Х.Мюнц (Muntz), верагодна, служыў у А.Тызенгаўза (Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1. – S. 497).

[13] Захары Бютнэр, касір гарадзенскай эканоміі. Упамінанні пра ўладальнікаў нерухомасці Бютнэраў выступаюць у матэрыялах гарадзенскага губернатара ў першай палове XIX ст. (НГАБ у Гародні. Ф. 1, воп. 19, ад.з. 1469. Арк. 2).

[14] Скарбнік Ян Людвік Бэкю, бухгалтар мануфактурнага кантару (1771), дыспанент гандлёвага кантару на Гарадніцы (1776), кантралёр Літоўскай Скарбавай камісіі (1778), дырэктар мытнай каморы ў Гародні (Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... T. 2. S. 89, 342; Kościałkowski S. Becu Jan Ludwik // PSB. – T. 1. – S. 393; НГАБ у Менску. Ф. 1761, воп. 1, ад.з. 14. Арк. 1232).

[15] У кнігах гарадзенскага магістрату з 80-х гг. XVIII ст. захаваліся згадкі аб “рахункаводзе мануфактурнага кантару” на Гарадніцы Хрысціяне Готлібе і Іагане Готлібе (НГАБ у Менску. Ф. 1761, воп. 1, ад.з. 13. Арк. 412; ад.з. 14. Арк. 214; Spis mieszkańców Grodna z 1794 r. // Grodno w XVIII w. Miasto i ludność. Grodno w XVIII wieku (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1939 roku) / A.Woltanowski i J.Urwanowicz. – Białystok, 1997. – S. 81).

[16] Прамоўца ложы Францішак Нарвойш (1742-1819), былы езуіт, матэматык, фізік, вучыўся ў Віленскай Акадэміі, выкладаў у Гародні (1763-1765), прафесар Віленскай Акадэміі, праводзіў астранамічныя доследы, у другой палове 70-х гг. XVIII ст. супрацоўнічаў з А.Тызенгаўзам, павінен быў стаць дырэктарам гарадзенскай астранамічнай абсерваторыі, прымаў удзел у ачышчэнні рэчышча Нёмана (1769-1772) (Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz... – T. 1. – S. 321, 408; Grzebień L. Narwojsz (Narwoysz) Franciszek Ksawery // PSB. – T. XXII. 1977. – S. 579-581).

[17] Купец з Эльблонга Хрысціян Эрнест Фэхнер у 1788 г. атрымаў гарадзенскае грамадзянства.

[18] Зігфрыд Шмідт, адзін з кіраўнікоў фабрыкі золата на Гарадніцы (Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz… – T. 1. – S. 247).

[19] Тадэвуш Юрэвіч (1741, ксёндз, вучыўся ў Віленскай Акадэміі, выкладаў у Крожах, з 1772 г. – у Гародні, прэфект гарадзенскай школы Адукацыйнай камісіі (1786-1790), потым яе рэктар (1793-1794). Гл.: *Poplatek J. Komisja Edukacji Narodowej: udział byłych jezuitów w pracach Komisji Edukacji Narodowej // uzupełnił L.Grzebień. – Kraków, 1973. – S. 290; Protokoły posiedzeń Komisji Edukacji Narodowej 1773-1785 // oprac. M.Mitera-Dobrowolska. – Wrocław, 1973. – S. 299; Protokoły posiedzeń Komisji Edukacji Narodowej 1786-1794 // oprac. T.Mizia. – Wrocław, 1969. – S. 45-46, 165, 212, 352-353.*

[20] Сакратар Фрыдэрык Шрайбэр, харунжы надворнай міліцыі А.Тызенгаўза, афіцэр гарадзенскага каралеўскага батальёна (Machynia M., Rakutis V., Srzednicki Cz. Oficerowie... – S. 497; Kościałkowski S.Antoni Tyzenhauz… – T. 1. – S. 496).

[21] Станіслаў Костка Патоцкі, грамадскі і палітычны дзеяч Каралеўства Польскага пачатку XIX ст. (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 174).

[22] Ложа "Дасканалая еднасць" была заснавана ў 1781 г. Сваю дзейнасць узнавіла ў 1816 г. (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 41).

[23] Міхал Длускі, Майстар кафедры віленскай ложы "Дасканалая еднасць" (Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822. – S. 165).

[24] Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 160.

[25] Станіслаў Мюллер, капітан артылерыі польскага войска (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 155).

[26] Антоні Храпавіцкі, палкоўнік, служыў у войску Рэчы Паспалітай, намеснік віленскай ложы "Добры пастыр" (Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738... – S. 170).

[27] Юзаф Струміла, расейскі дзяржаўны дарадца, намеснік майстра кафедры і заснавальнік ложы "Школа Сакрата" (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 200).

[28] Вінцэнт Дабжанскі, судовы сакратар Галоўнай Віленскай дэпутацыі, ганаровы сябра гарадзенскай ложы "Сябры чалавецтва" (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 83).

[29] Якуб Генрых Лібельт, сябра ложы "Дасканалая еднасць" (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 135; Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738... – S. 118).

[30] Вінцэнт Малецкі, былы асэсар Галоўнага суда Віленскай дэпутацыі (Małachowski-Łempicki S. Wykaz... – S. 143).

*Сяргей Рыбчонак (Менск)*

# Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 ст. (нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі)*

Гісторыя вольных муляраў пачынаецца не з цара Саламона, як яны самі цьвердзьлі, і, нават, не зь сярэднявечных цэхаў Італіі, як шмат хто мяркуе, але з самых звычайных лёнданскіх клюбаў пачатку XVIII ст. За кароткі час мулярскія варштаты апанавалі амаль усе разьвітыя краіны сьвету – Францыю, Прусію, Аўстра-Угоршчыну, Злучаныя Штаты Амерыкі, Рэч Паспалітую, Расею ды інш.

Масонства ў Рэч Паспалітую пранікае з Прусіі, і з 1784 г., пасьля стварэньня "Вялікага Усходу Польскага і Літоўскага**", набывае трывалую арганізацыю[1]. На жаль, гэты працэс вельмі слаба адлюстраваны як у пісьмовых, гэтак і ў друкаваных крыніцах. Відавочна, што на зямлі Беларусі вольнамулярства было шчыльна зьвязана з Варшаваю. Але вядомы прыклады пранікненьня масонства й з Усходу, гэтак, Бакунін сьцьвярджаў, што ў Магілёве, які з 1772 г. знаходзіўся ў складзе Расейскай імперыі, існаваў варштат "Геркулес у калысцы"[2].

З пачатку 19 ст. (1809-1814) пачынаецца другі этап масонскага руху на Беларусі. Асноўныя мэты й накірункі дзейнасьці вольных муляраў засталіся ранейшымі, у той час, як умовы іхнага йснаваньня зьмяніліся карэнным чынам – не было больш шляхецкай вольнасьці, завітаў на Беларусь казённы дух імперыі.

Разам з тым, лібералізм маладога імператара Аляксандра I, аднаўленьне аўтаномнага Царства Польскага паспрыялі зьяўленьню ў польска-беларускім грамадзтве пэўных надзеяў. На вышэйшым узроўні пачаліся спрэчкі пра далучэньне да гэтага Царства літоўскіх губерняў (Віленскай, Горадзенскай, Менскай) ці стварэньня аўтаномнага Вялікага Княства Літоўскага ў ме-

---

* Перадрук з дазволу аўтара. Упершыню артыкул быў надрукаваны ў выданні Згуртавання беларускае шляхты часопісе *Годнасць* (1994. № 1(2). С. 3-14.).

** Поўная назва "Вялікі усход Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага" (Заўвага рэд.).

[1] Добрянский С.Ф. Масонские ложи в Литве // ЗСЗОИРГО. – Вильно, 1911. – Кн. 2. – С. 231-232.

[2] Bakounine T. Les repertoires biographique des francs-masons russes. – Bruxelles, 1949. – S. 123-124.

жах Расейскай імперыі. Надзеі муляраў на Аляксандра І былі настолькі моцныя, што яны шчыра сьвяткавалі ягоныя йmяніны (заснаваньне менскай "Паўночнай паходні" было нават прымеркавана да гэтае падзеі), лічылі яго сваім патронам і заклікалі да рашучых зьменаў у грамадзтве. Пра гэта сьведчыць напісаная з нагоды ўрачыстага сходу рацэя, дзе між іншым выказвалася ўдзячнасьць імператару, што ён "не забараніў варштату працаваць", што ягоныя імкненьні супадаюць з мулярскімі й накіраваны да "адзінства й шчасьлівага быту ўсіх", набліжаюць гадзіну, "калі моцны ланцуг [масонаў] ахіне ўсю прастору зямлі", а народ, які "ўзвысіцца ў сваіх імкненьнях, будзе бласлаўляць імя Аляксандра й варштат"[3].

Несумненна, што філязофія масонаў на пач. XIX ст. мела гуманістычна-ліберальны накірунак французскага асьветніцтва, а асноўным прынцыпам іхнае працы была роўнасьць людзей, які прадэкляравала французская рэвалюцыя. Яскравы доказ таму прамова сябры "Паўночнай паходні" Людвіка Плятэра ў 1817 г., што захавалася ў выглядзе пераказа чыноўніка: "Толькі праз устанаўленьне роўнасьці, праз іскру добрачыннасьці, якую [мы] ў сакрэце на працягу вякоў захоўвалі, заясьнее некалі дзень адраджэньня ў які, дзеля аджыўнага сьвету, вернецца першая нявіннасьць, цнота й шчасьце". І далей, гаворачы пра вольнасьць і роўнасьць, адзначаў, "што перад тронам найпрэасьвяшчэннага аднолькава сагнуць калені, як сын і брат Каралеўскі, гэтак і рамесьнік, які жыве працаю сваіх рук; няма [у нас іншага], як закон [роўнасьці], таму кожны без выключэньня сляпа падпарадкоўваецца й паслушным [яму] быць павінен, і гэта ёсьць праўдзівая, шмат вякоў таму ўстаноўленая й захаваная, адзіная дзеля ўсіх ісьціна ў абліччы закону... Падпарадкуючыся гэтаму закону й знешнім абставінам, мы будзем супрацьстаяць [сваімі] намаганьнямі цемнасьці, цешыць долю пакутных, памнажаць лік абаронцаў, памяньшаць ганіцеляў, пашыраць уладу роўнасьці й тады ператворым цёмных жыхароў у людзей, усіх людзей у братоў, а ўвесь сьвет у нявенчаную цноту, і народу зьменім сьвятыні"[4].

Людзі, якія лічылі мэтаю жыцьця самаўдасканаленьне, устанавілі ў сваёй арганізацыі досыць жорсткія правілы – ня мог быць масонам чалавек, які вёў распуснае жыцьцё, піў, нават гуляў у карты, што выявіў, прыкладам, ананімны ліст, і яскрава пацьвердзіў таварыскі суд над сябрам П.Талачынскім[5]. Сярод муляраў былі выпадковыя й неўстойлівыя людзі, ды й сама хуткасьць зьяўленьня варштатаў гаворыць хутчэй пра пачуцьці, а не пра дзеі. У 1817 г. кіраўніцтва "Паўночнай паходні" зьвярнулася да Літоўскай Правінцыяльнай ложы з лістом, дзе пісалася, што падмайстар ксёндз Самуэль Кастравіцкі не

[3] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. А. 226 адв. – 227.
[4] Тамсама. А. 227-227 адв.
[5] Тамсама. А. 218.



Сядзіба Валенція Ваньковіча ў Менску, верагоднае месца сустрэчаў менскіх масонаў. Першая палова XIX ст.



Імператар Расеі Аляксандр I (1801-1825).

прымае ўдзелу ў працы варштату. Выкліканы на таварыскі суд, той заявіў, што адзіная перашкода гэтаму – папскія булы, якія забараняюць сьвятарам удзел у масонскім руху, пра што ён быццам ня ведаў пры ўступу. Каб гэты выпадак не застаўся без пакараньня ложа прасіла "няхай падзе на яго заслужаная пагарда ўсіх братоў на сьвеце". Кастравіцкі ж на разьвітаньне даслаў ліст былым прыяцелям, дзе па-хрысьціянску пісаў, што "ніколі не перастане лічыць іх братамі й сваімі блізкімі, якія заўжды маюць права на ягоную дапамогу"[6]. Але "браты" засталіся нязломнымі, толькі пашкадавалі ў сваёй пастанове, што на пач. XIX ст. на сьвеце яшчэ ёсьць людзі якім [рэлігійны] фанатызм закрывае сьвятло ісьціны"[7].

Нягледзячы на выключэньне некалькіх асобаў, варштат, усё ж нязначна палепшыў сваю дзейнасьць. Асноўным накірункам яго была дабрачыннасьць, грашовыя сродкі ў скарбніцу варштата паступалі двума шляхамі – гэта сяброўскія складкі за ўзьвядзеньне на ступень і дабраахвотныя ахвяраваньні. Ведама некалькі канкрэтных выпадкаў, куды нактроўваліся грошы: у 1817 г. ахвяраваныя Б.Бярновічам 700 руб. – мастаку Дамелю, у 1817 г. Трэмбінскім – на адзенне дзеля бедных, у 1818 г. Л.Дыбоўскі абавязаўся выплочваць па 100 зл. на год на карысьць бедных[8]. Зь вельмі цікавай ініцыятывай выступіў у 1820 г. магістар Ходзька. Ён прапанаваў стварыць у Менску школу дзеля выхаваньня і навучаньня бедных дзяцей па метаду Ланкастара[9]. На жаль, невядома, ці была гэтая ўстанова адчынена. Увогуле, прыкладаў дабрачыннасьці, аднак, няшмат.

У Менску існавалі два варштаты: 1) сімвалічны зь сяброўствам 1-3 ступені, г.зн. вучань, падмайстар і майстар (кіраўніцтва мела й вышэйшыя ступені) – "Паўночная паходня" і 2) вышэйшы капітул шкоцкі зь сяброўствам 6-7 ступені, г.зн. рыцар усходу й кавалер злата-ружовага крыжа – "Гара Табар". Па нашых падліках у першым было ня менш 215 сябраў (лічба 222, што падаецца чыноўнікам, памылковая), другім – 31 сябра[10]. Зразумела, гэтыя лічбы агульныя за ўвесь час існаваньня варштатаў і досыць умоўныя. Шмат хто з муляраў быў адначасова ўдзельнікам некалькіх ложаў, як прыкладам, памешчык Менскага пав. П.Прыстаноўскі, які лічыўся ад 1814 г. у "Шчасьлівым вызваленьні" (Нясьвіж), ад 1816 г. – у "Паўночнай паходні", а з 1819 г. – у "Сьвятыні спакою" (Нясьвіж), урэшце, з 1821 г. – у "Гары Табар"[11]. Вольныя муляры вельмі клапаціліся пра пашырэньне сеткі сваіх філіяў. Гэтак, па-

[6] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego WKL (1776-1822). – Wilno, 1930. – S. 34-35.
[7] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. А. 34-35.
[8] Тамсама. А. 203, 205, 208.
[9] Тамсама. А. 231.
[10] Тамсама. А. 163 адв.- 164.
[11] Тамсама. А. 171, 238, 241, 301 адв.

мешчыкам Дзісенскага пав. Ю.Акушку, Валасоўскаму й С.Рашкоўскаму патрабавалася ў 1817 г. 3-я ступень, каб заснаваць новую сімвалічную ложу ля свайго мейсца жыхарства[12].

Заснавальнікамі "Паўночнай паходні" ў 1816 г. былі сямёра чалавек, бо лічылася, што менавіта гэткая колькасць сябраў робіць ложу дасканалай. Былі гэта – Ян Барэйка-Ходзька, ініцыятар і першы магістар варштату, Ян Норвід, Пётр Прыстаноўскі, Ян Серакоўскі, Альберт Бургельскі, Вінцэнт Ляўковіч і Юзэф Рагоза[13].

Як сьведчыць Малахоўскі-Лямпіцкі, у 1820 г. пасады "Паўночнай паходні" былі размеркаваны наступным чынам:

магістар* – Дамінік Манюшка, былы маёр войскаў ВКЛ;
нам. магістра – Апалінары Ваньковіч;
нам. магістра па абрадах – Тэадор Любаўскі, загадчык Менскага вайсковага шпіталя;
1-ы дазорца – Мікалай Пашкоўскі, адвакат;
2-і дазорца – Вінцэнты Фрыбес, сакратар Менскага грамадзянскага губернатара;
прадстаўнік у Правінцыяльным Літоўскім камітэце – Юзэф Завадскі, друкар і выдавец;
аратар** – схаваны пад ініцыяламі Z.I.;
сакратар – Вінцэнт Грынеўскі, адвакат 2-га дэпартаменту Менскага галоўнага суда;
нам. сакратара – Гіляры Якубоўскі, рэгент 2-га дэпартаменту Менскага галоўнага суда;
нам. па агульных мовах – Пётр Шнэйдэр, выкладчык гімназіі;
1– сьцюарт – Юры Кабылінскі, тытулярны радца;
2– 2-і сьцюарт – Гіпаліт Гайдукевіч[14].

Ложы мелі ў сваёй структуры служкаў і ганаровых сябраў, што ў дачыненьні да "Паўночнай паходні" выглядае гэтак: з 215 чалавек было 143 сябра, 9 служкаў і 63 ганаровых сябра[15].

Менскія муляры, на нашу думку, групаваліся вакол двух цэнтраў – гэта Менскі галоўны суд, 8 службоўцаў якога былі сябрамі "Паўночнай паходні" і Менская мужчынская гімназія, адпаведна 7 чалавек. Большасьць жа сябраў паходзіла з сярэдняе й дробнае шляхты Менскага, Наваградзкага, Вілейскага,

[12] Тамсама. А. 208 адв.-209.
[13] Тамсама. А. 171.
* Г.зн. Майстар кафедры (заўвага рэд.).
** Г.зн. Прамоўца (заўвага рэд.).
[14] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego WKL... – S. 33-34.
[15] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. А. 163 адв.

Дзісенскага й Барысаўскага пав. Менскай губерні, было некалькі службоўцаў дзяржаўных установаў, адвакатаў, музыкаў, медыкаў, верагодна, што й яны былі шляхецкага паходжаньня.

Менскай ложай найвышэйшага капітулу была "Гара Табар". Малахоўскі-Лямпіцкі аднёс зьяўленьне гэтага варштату да 1818 г.[16], паводле нашых крыніцаў гэта адбылося толькі ў красавіку 1821 г.[17] Ягоным магістрам быў абраны менскі віцэ-губернатар Людвік Каменскі. Са сьпісу, што ён прадставіў уладам пасьля закрыцця ложы, вынікае, што "Гара Табар" налічвала ня менш 31 сябра (пераважна з "Паўночнае паходні" і нясьвіскіх варштатаў)[18]. Грашовых рахункаў і архіву па ёй чыноўнікі не адкрылі, што нібыта сьцвердзіла словы Каменскага, быццам, варштат не йснаваў увогуле, а ўсе ягоныя сябры плацілі складкі "Вялікаму ўсходу Польскаму і Літоўскаму" асабіста. Але зусім пра супроцьлеглае сьведчыць факт атрыманьня А.Ваньковічам, Л.Ашторпам, А.Ратынскім і М.Зяновічам 8 кастрычніка 1821 г. 6-й ступені – рыцар усходу[19].

Варштат усё ж быў па сваёй дзейнасьці хутчэй фікцыйны, яе ён проста не паспеў распачаць. Нават раней указа Аляксандра I ад 1 жніўня 1822 г. намесьнік Царства Польскага Заенчык, занепакоены ўсё большай радыкальнасьцю масонаў (пра якіх менскі губернатар у сакрэтным лісьце да цэсарэвіча пісаў, што яны былі небяспечныя з-за сваіх імкненьняў да "роўнасьці й незалежнасьці"[20]), выдаў загад, згодна якому "Вялікі Усход Польскі й Літоўскі" ліквідоўваўся да 1 кастрычніка 1821 г., а ўсе Правінцыяльныя ложы, яму падпарадкаваныя, да 15 кастрычніка. Менавіта пасьля гэтага загаду 29 верасьня 1821 г. Вялікі магістар А.Ражнецкі даслаў у "Паўночную паходню" ліст, дзе было сказана: "Зачыніць ложу і дзеля наступнага захаваньня ўсіх архіваў, рэчаў і грошай заснаваць камітэт з 3 чалавек… каб усё было схавана ў бяспечным мейсцы, каб пячаткі былі здадзены ў архіў, былі складзены інвентары ўсіх папераў, рухомай і нерухомай маёмасьці, і разам з пастановамі пра зачыненьні ложаў былі перададзены Вялікаму магістру"[21].

Прайшло амаль 7 гадоў покуль чыноўнікі Камітэта па разбору масонскіх архіваў скончылі сваю работу, і 24 студзеня 1829 г. цэсарэвіч накіраваў Менскаму грамадзянскаму губернатару загад, у якім між іншым ішла гаворка: "…5) усе масонскія паперы й архівы, а таксама пячаткі, кароны, ляскі й іншыя знакі, прысвоеныя розным ступеням і ўрадам, паклаўшы ў

[16] Małachowski-Łempicki S. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego WKL… – S. 59.
[17] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 1, ад.з. 286. А. 164.
[18] Тамсама. А. 238-238 адв.
[19] Тамсама. А. 164.
[20] Тамсама. А. 166 адв.
[21] Тамсама. А. 167-167 адв.



“Дом масонаў” у Менску. XVIII ст. Фотаздымак. 90-х гг. XX ст.

асобныя куфары, апячатаў, захоўваць у архіве грамадзянскага губернатара пры сакрэтных справах”[22].

Працяг гэтае справы адбыўся праз 10 гадоў, і лёс матар’яльнае спадчыны масонаў не зайздросны. 21 ліпеня 1839 г. мясцовыя ўлады атрымалі загад Віленскага ваеннага губернатара кн. Даўгарукава: “Усе масонскія знакі, кнігі, паперы, дыплёмы й іншыя рэчы – па вырыцці ямы ўнізу пад гарою пры вуліцы, вядучай каля Жыдоўскіх могілак да Ляхаўкі – спаліць”[23]. Выканаў гэты загад Менскі паліцмайстар маёр Тызенгаўзэн, павятовы страпчы Сямянкевіч і чыноўнік па сьпецыяльных даручэньнях Будзька[24].

[22] Тамсама. А. 336.
[23] НГАБ у Менску. Ф. 295, воп. 3, ад.з. 76. А. 13-14.
[24] Тамсама. А. 32-33.

## Дадатак 1.
## Сьпіс сябраў варштата "Паўночная паходня"

1. Гіляры Аборскі, падкаморы Менскі
2. Віктар Азямблоўскі, адвакат Ігуменскіх прысутных месцаў
3. Юзэф Акушка, Дзісенскі пав.
4. Ігнацы Алеша
5. Ян Аляшкевіч, квартальны Радашковіцкі
6. Гіляры Арцімовіч, доктар медыцыны
7. Феліцыян Арцімовіч, калежскі сакратар
8. Антоні Арцішэўскі, падпалкоўнік Літоўскага ўланскага палка
9. Казімер Аскерка, суддзя гранічны Вілейскі
10. Ян Аскерка, маршалак Вілейскі
11. Леан Апторп
12. Ануфры Багдановіч, паручык войскаў польскіх
13. Ігнацы Багдановіч
14. Казімер Багдановіч, Вілейскі пав.
15. Тэадор Багіжмольскі, капітан войскаў польскіх
16. Матэвуш Бардзкі, падсудак Вілейскага павятовага суда
17. Ян Барсук, суддзя Ігуменскага пав.
18. Францішак Белікович, з ложы Санкт-Пецярбурга
19. Ян Белікович, падкаморы Полацкі
20. Цыпрыян Беліновіч, кандыдат філязофіі, Менская гімназія
21. Караль Бідэрман, надворны радца, дывізійны лекар
22. Ігнацы Брадоўскі, прэфект Менскай гімназіі
23. Ян Брант, даглядчык вайсковых лазарэтаў
24. Аўгустын Брастоўскі (Бжастоўскі), Дзісенскі пав.
25. Альберт Бургельскі
26. Ігнацы Буцэвіч, падсудак Менскага павятовага суда
27. Сарвацы Бярновіч, старшыня Менскага губернскага гранічнага суда
28. Іван Бястужаў, ад'ютант генерала Фурка
29. Фэлікс Вайдзевіч
30. Вінцэнт Валадковіч, падкаморы Віленскі
31. Канстанцін Валасоўскі
32. Юзэф Валасоўскі, Дзісенскі пав.
33. Ліфтон Арыст Вандзевіч, юнкер
34. Апалінары Ваньковіч, Менскі пав.
35. Эдвард Ваньковіч, харужы Менскі
36. Ян Ваньковіч, гранічны суддзя Менскі
37. Аляксандар Вэйс, адютант Цэсарэвіча
38. Ян Верчун, ротмістар уланскага Конна-Польскага палка
39. Густаў Ветлер, палкоўнік войскаў расейскіх
40. Фэлікс Вішнеўскі, пісар земскі Мазырскі
41. Іван Вішнякоў, радца?
42. Гіпаліт Гайдукевіч
43. Алаізы Галаўня

44. Вінцэнт Гарловіч, юнкер Татарскага ўланскага палка
45. Мікалай Гатоўскі, на вайсковай службе
46. Тамаш Гендэрсон
47. Міхал Герман, каморнік
48. Вінцэнт Грынеўскі, адвакат Менскага галаўнога суда, 2-гі дэпартамент
49. Каэтан Датамінскі
50. Аляксандар Гэнрыцкі, штаб-лекар Менскага вайсковага шпіталя
51. Фэрдынанд Дваржэцкі, падсудак Вілейскага павятовага суда
52. Аўгустын Дрозд, настаўнік музыкі, гаспадар жаночага пансіёна
53. Барнаба Дэдэрка
54. Рох Дэдэрка, Вілейскі пав.
55. Леапольд Дзітоўскі
56. Ігнацы Есьман
57. Юстын Есьман, харужы Ігуменскі
58. Ян Жылінскі, ксёндз, капэлян Менскай гімназіі
59. Юльян Жэлігоўскі
60. Юзэф Заблоцкі, ротмістар уланскага палка
61. Тэадор Замойскі
62. Валенты Зубрыцкі (Замбжыцкі), Менскі пав.
63. Ігнацы Зяновіч, кандыдат філязофіі
64. Міхал Зяновіч, Менскі губернскі маршалак
65. Антоні Ёдка, Менскі галоўны суд, 2-і дэпартамент
66. Ігнацы Іваноўскі, лаўнік Менскага галоўнага суда, 2-і дэпартамент
67. Раман Іваноўскі, адвакат Менскага галоўнага суда, 2-і дэпартамент
68. Ежы Кабылінскі, тытулярны радца
69. Базыль Калкоўскі
70. Васіль Каратокцін, падпрапаршчык войскаў расейскіх
71. Міхал Карказеівч
72. Ян Карказевіч, падсудак Барысаўскага павятовага суда
73. Казімер Касоўскі, суддзя гранічны Ігуменскі
74. Самуэль Кастравіцкі, ксёндз, выключаны ў 1817 г.
75. Ян Квяткоўскі, павятовы лекар Вілейскі
76. Юзэф Лазінскі, артыст музыкі
77. Міхал Лапіцкі, пісар земскі Вілейскі
78. Юзэф Лапушынскі, магістар філязофіі
79. Фёдар Лыкаў, доктар медыцыны
80. Ян Любанскі, палкоўнік войскаў польскіх
81. Тэадор Любаўскі, даглядчык Менскага вайсковага шпіталя
82. Ян Ляндразын, паручык войскаў французскіх, гувернёр
83. Сымон-Францішак Лянтоўскі, геаметр
84. Вінцэнт Ляўковіч, паручык войскаў польскіх
85. Фэрдынанд Мадзалеўскі, служка варштату
86. Людвік Мантэграндзі, капітан войскаў расейскіх, настаўнік Менскай гімназіі
87. Дамінік Манюшка, адстаўны маёр войскаў польскіх, магістар варштата (1819)
88. Казімер Манюшка, доктар абодвух праваў
89. Чэслаў Манюшка, былы капітан войскаў польскіх

90. Юзэф Манюшка, харужы Барысаўскі
91. Антоні Марціноўскі, адвакат Вілейскі
92. Аўгустын Массыні, выхадзец з Францыі
93. Міхал Матусевіч, служка варштата
94. Стэфан Мацкевіч, Завілейскі пав.
95. Фэліцыян Машынскі, падсудак Ігуменскага павятовага суда
96. Раман Міладоўскі
97. Ян Мірскі, дэпутат Дзісенскага пав.
98. Ян Норвід
99. N.Пашкевіч, служка варштата
100. Мікалай Пашкоўскі, адвакат Менскага галоўнага суда, 2-і дэпартамент
101. Мікалай Підо(т), кандыдат філязофіі, Менская гімназія
102. Афанасі Про(у)шынскі, суддзя гранічны Менскі
103. Яўстафі Про(у)шынскі
104. Пётр Прыстаноўскі
105. Антоні Пятрыкоўскі, артыст музыкі
106. Юзэф Пятух
107. Юзэф Рагоза
108. Францішак Ражанскі
109. Людвік Ракіцкі, стацкі радца
110. Міхал Ракіцкі, Рэчыцкі пав.
111. Аляксандар Раманус, адстаўны капітан войскаў польскіх
112. Антоні Ратынскі
113. Эмануэль Рашэт, падпалкоўнік войскаў расейскіх
114. Серафін Рашкоўскі, Дзісенскі пав.
115. Антоні Салагуб
116. Ян Серакоўскі
117. Канстанцін Станскі, былы маёр войскаў польскіх
118. Матэвуш Стравінскі, артыст музыкі
119. Казімер Сулістроўскі, губернатар Менскі, магістар варштату (1819)
120. Рамуальд Сымановіч
121. Станіслаў Сьвентаржэцкі
122. Ян Сьнітка, павятовы казначэй Менскі
123. Павел Сьцяпанаў, падпалкоўнік войскаў расейскіх
124. Аляксандар Сямінскі
125. Вінцэнт Сянкевіч, Менская гімназія
126. Пётр Тарчынскі
127. Аляксандар Трабінскі, чыноўнік 13 клясы
128. Караль Трцынскі (Тжцынскі), артыст музыкі
129. Францішак Ужыхоўскі, слушка варштату
130. Ян Федаровіч, служка варштату
131. Вінцэнт Фрыбес, сакратар Менскага грамадзянскага губернатара
132. Францішак Фрыбес, адстаўны капітан войскаў польскіх, бухгалтар варштату
133. Міхал Фрэйт, артыст музыкі
134. Ян Хаецкі, земскі спраўнік Віленскі
135. Ігнацы Ходзька, сакратар пры Яну Ходцы

136. Ян Ходзька, першы магістар варштату (1816-1818)
137. Юзэф Цюндзявіцкі, суддзя гранічны
138. Людвік Чарніхоўскі, маршалак Вілейскі
139. Апалінары Чачот, суддзя гранічны Менскі
140. Ян Чачот, кандыдат філязофіі, Менская гімназія
141. Іван Чмыхаў, сакратар Менскага галоўнага суда, 1-ы дэпартамент
142. Вінцэнт Шалькевіч, артыст музыкі
143. Пётр Шнэйдэр, Менская гімназія
144. Станіслаў Штэйн, ксёндз, капэлян Конна-Польскага ўланскага палка
145. Паўліні Шулякоўскі, служка варштату
146. Міхал Шышка
147. Казімір Эйтвід, служка варштату
148. Сігізмунд Эстка, суддзя гранічны Ігуменскі
149. Якуб Эстка, суддзя гранічны Вілейскі
150. Гіляры Якубоўскі, рэгент Менскага галоўнага суда, 2-і дэпартамент
151. Павел Яленскі, Мазырскі пав.

## Дадатак 2.
## Ганаровыя сябры варштату "Паўночная паходня"

1. Людвік Агінскі, дырэктар польскага тэатру
2. Еранім Адынец, Слуцкі пав.
3. Юзэф Аксамітоўскі, паручык войскаў польскіх
4. Нарцыз Алізар, Валынская губ.
5. Вінцэнт Ахлі, Наваградзкая ложа
6. Ян Буцэвіч, адстаўны маёр войскаў расейскіх
7. Малхер Валадковіч, маршалак Віленскі
8. Флярыян Відза, суддзя апеляцыйны Царства Польскага
9. Валенты Вілкашэўскі, палкоўнік войскаў польскіх
10. Ежы Вільчэўскі, шамбелян двара польскага
11. Станіслаў Венгжэцкі, старшыня Камерцыйнага трыбуналу
12. Адам Гарабурда, суддзя Слуцкі
13. Лаўрэнты Гаркоўскі, Санкт-Пецярбургская ложа "Белы арол"
14. Юзэф Гарэцкі, Санкт-Пецярбургская ложа "Белы арол"
15. Людвік Гінет, кантралёр Царства Польскага
16. Адам Гінтэр, былы старшыня Менскага суда, 1-ы дэпартамент
17. Габрыэль Гольц, доктар медыцыны
18. Караль Гофман, палкоўнік войскаў расейскіх
19. Якуб-Фрыдрык Гофман, прафесар Варшаўскага універсітэту
20. Эрнэст Гродэк, прафесар Віленскага універсітэту
21. Вінцэнт Дабранскі
22. Тадэвуш Дамброўскі, жывапісец
23. Хрызастом Дамброўскі, суддзя гранічны Слуцкі
24. Ян Дамель, жывапісец
25. Ксаверы-Францішак Дарнфэльд, мецэнас пры найвышэйшым судзе
26. Міхал Длускі, прэлат Віленскі

27. Адам Жамойцель
28. Адам Жэвускі, Санкт-Пецярбургская ложа “Белы арол”, сенатар
29. Юзэф Завадскі, тыпограф Віленскага універсітэту
30. Казімер Каменскі
31. Людвік Каменскі, былы Менскі віцэ-губернатар
32. Станіслаў Класоўскі
33. Ян Ковіч
34. Станіслаў Курчынскі, прафесар артылерыйска-інжэнернай школы
35. Ян Лёншон, адстаўны капітан войскаў польскіх
36. Якуб Лібельт
37. Якуб-Герман Лібельт
38. Юзэф Маркіяновіч, Санкт-Пецярбургская ложа
39. Міхал Мацкевіч
40. Караль Мураўскі, генерал войскаў польскіх
41. Канстанцін Новаміцкі
42. Банавентура Навіцкі
43. Матэвуш Навіцкі, гэаметр
44. Адам Непакайчыцкі, маршалак Слуцкі
45. Ян-Антоні Нофак, банкір
46. Станіслаў Костка-Патоцкі, магістар “Усходу Польскага”, міністар асьветы й рэлігіі [Княства Варшаўскага]
47. Аляксандар Пацей, былы абозны Літоўскай кавалерыі
48. Аляксандар Пейкер, генерал войскаў расейскіх
49. Людвік Плятэр, стацкі радца
50. Ян Развадоўскі, генерал войскаў польскіх
51. Аляксандар Ражнецкі, генерал войскаў польскіх
52. Міхал Сабескі
53. Ян Сергушэўскі, ротмістар Конна-Польскага ўланскага палка
54. Станіслаў Сержыінскі, паручык войскаў польскіх
55. Юзэф Сіпайла, Санкт-Пецярбургская ложа “Белы арол”
56. Юзэф Струміла, радца
57. Антоні Турскі, Слуцкі пав.
58. Вінцэнт Тышкевіч, Барысаўскі пав.
59. Мікалай Філімонаў, палкоўнік войскаў расейскіх
60. Ануфры Хрушчэўскі
61. Юзэф Эльсьнер, дырэктар музыкі
62. Адам Эстка, Віленская ложа
63. Станіслаў Язерскі, Слуцкі пав.

## Дадатак 3.
## Сябры варштату “Гара Табар”

1. Леан Ашторп, маршалак Ігуменскі
2. Малхер Вайніловіч, былы маршалак Вілейскі
3. Флярыян Вайніловіч, генерал войскаў польскіх
4. Малхер Валадковіч, былы маршалак Вілейскі

5. Апалінары Ванькові̂ч, былы павятовы маршалак Менскі
6. Тамаш Гендэрсон, Слуцкі пав.
7. Габрыэль Гольц, доктар медыцыны
8. Хрызастом Дамброўскі, межавы суддзя Слуцкі
9. Адам Жамойцель, Слуцкі пав.
10. Міхал Зяновіч, былы губернскі маршалак Менскі
11. Густаў Ігельстром, брыгадны генерал
12. Казімер Каменскі, былы суддзя Лідскі
13. Людвік Каменскі, былы старшыня Менскага галоўнага суда, былы Менскі віцэ-губернатар
14. Дамінік Манюшка, маёр войскаў польскіх
15. Караль Ма(у)роўскі, генерал-маёр войскаў польскіх
16. Міхал Мацкевіч
17. Юзэф Мітарнаўскі, грамадзянскі суддзя Наваградскі
18. Ігнацы Мухлінскі, Наваградскі пав.
19. Банавентура Навіцкі, капітан войскаў польскіх
20. Адам Непакайчыцкі, маршалак Слуцкі
21. Пётр Прыстаноўскі, Менскі пав.
22. Людвік Развадоўскі, Слуцкі пав.
23. Ян Развадоўскі, генерал войскаў польскіх
24. Антоні Ратынскі, Ігуменскі пав.
25. Казімер Рдултоўскі, былы маршалак Наваградскі
26. Дамінік Рэйтан, адстаўны падпалкоўнік, Слуцкі пав.
27. Антоні Салагуб, Менскі пав.
28. Антоні Турскі, суддзя Лідскі
29. Францішак Фрыбес
30. Караль Чапскі, былы Менскі павятовы маршалак
31. Станіслаў Язерскі, Слуцкі пав.

*Станіслаў Малахоўскі-Лэмпіцкі (Варшава)*

# Міцкевіч і вольнае мулярства*

### І. Уплыў ісціннага вольнага мулярства

Цяжка ўстанавіць, ці захоўваліся вольнамулярскія традыцыі сярод бліжэйшых сваякоў аўтара "Оды да маладосці". З літоўскіх Міцкевічаў да віленскай жаночай ложы "Дасканалая вернасць" належала нейкая Міцкевічава (1781). Аднак невядома, ці паходзіла яна з той самай сям'і. У літоўскіх ложах былі два Маеўскіх, але і ў гэтым выпадку мы не ведаем, ці былі яны сваякамі Адама па матчынай лініі[1].

Як вучань навагрудскай школы малады Міцкевіч напэўна чуў пра мясцовую ложу "Вузел еднасці". У ёй працавалі найбольш вядомыя навагрудскія чыноўнікі, афіцэры і землеўласнікі. Згадаю пра трох Вайніловічаў – былога генерала польскіх войскаў Фларыяна, маршалка Навагрудскага павету Юзафа і навагрудскага суддзю Яна. Таксама трэба назваць падпалкоўніка польскіх войскаў Адама Солтана, капітана Караля Белапятровіча, камандзіра эскадрона Юзафа Незабытоўскага і харунжага Навагрудскага пав. Яна Слізня[2]. Вольныя муляры ў той час асабліва не хаваліся, а ў Навагрудку нават пры вялікім жаданні цяжка было б схавацца. Мясцовыя вучні перашэптваліся паміж сабой пра таямнічыя і загадкавыя сходы братоў ложы.

Універсітэцкія гады Міцкевіча супалі з росквітам вольнага мулярства ў Вільні. У гэтым горадзе ў той час працавалі пад кіраўніцтвам Правінцыяльнай ложы "Дасканалая еднасць" наступныя ложы – "Руплівы ліцьвін", "Доб-

* Станіслаў Малахоўскі-Лэмпіцкі (1884-1959) з'яўляецца адным з найбольш аўтарытэтных польскіх гісторыкаў вольнамулярскага руху. Ягоны артыкул, прысвечаны адносінам А.Міцкевіча да вольнага мулярства, быў надрукаваны ў часопісе *Ruch Literacki* (1930. № 7). Пазней не перадрукоўваўся. Пры публікацыі гэтага артыкула было вырашана пакінуць без перапрацоўкі ўсе аўтарскія спасылкі. Многія з іх зроблены на рэдкія і цяжкадаступныя ў Беларусі крыніцы і літаратуру. Таксама трэба адзначыць, што аўтарская гіпотэза наконт таго, што А.Міцкевіч мог быць вольным мулярам 2° ці 2-й ступені (г.зн. чаляднікам) трымаецца на памылковым тлумачэнні значэння масонскага тэрміна "Бооз". Аўтар артыкула, які з'яўляўся не толькі даследчыкам гісторыі вольных муляраў, але і сам належаў да Вялікай нацыянальнай ложы Польшчы ў міжваенны час, не мог не ведаць сапраўднага значэння гэтага тэрміна. Магчыма, ён свядома ўводзіў у зман чытачоў. На самой справе прыведзеныя факты дазваляюць сцвярджаць, што А.Міцкевіч мог быць вольным мулярам 1° або 1-й ступені (г.зн. вучнем) (заўвага перакл.).

[1] St.Małachowski-Łempicki. Wykaz polskich loż oraz ich członków… Kraków, Nakładem Polskiej Akademji Umiejętności, 1929, str. 271 (382) Nr 5156; str. 142 (253) Nr 2160, Nr 2165.

[2] Obraz B.B. Członków S. i D. Loży św. Jana pod osobnym nazwaniem *Węzeł Jedności* na wschodzie Nowogródka. Na rok p. Ś. 5820.

ры пастыр", "Школа Сакрата" і "Славянскі арол". Амаль уся прафесура і капітул належалі да ложаў. Рэформа вольнага мулярства прафесара Шымкевіча (1818), накіраваная на ажыўленне дзейнасці гэтага таварыства шляхам пераадолення руціны і таямнічасці, напэўна зацікавіла Міцкевіча.

Моцны ўплыў на маладога студэнта мелі прафесары-масоны – славуты Гродэк і Леан Бароўскі, духоўны вучань нямецкіх братоў Лесінга[3] і Гердэра. Але найбольш моцна ўплываў на паэта Тамаш Зан, сябра Правінцыяльнай літоўскай ложы "Дасканалая еднасць", які "жыў прынцыпамі вольнага мулярства – "братэрская роўнасць", лад, згода, еднасць, лагоднасць, праўда, мудрасць, сталасць, моц, смеласць і любоў, што пашыралася на "мільёны людаў". Мэту вольных муляраў Зан акрэсліў у двух радках:

*Niechaj w Mularzach znajdzie przez naszą życzliwość*
*Bóg prawą cześć, kraj wsparcie, a ludzie szczęśliwość*[4].

Зан стварыў Таварыства філаматаў, абапіраючыся на ўзор вольнага мулярства. Як у ложах, так і на сходах філаматаў панавала паэзія, літаратура і навука. Пад моцным уплывам масонства ўзніклі Таварыствы філарэтаў і Прамяністых. Мэта Прамяністых – падтрымка беднай моладзі – была ўзятая з вольнага мулярства. Адным з галоўных прынцыпаў ложаў была міласэрнасць у адносінах да бедных. Зан разам з руплівым вольным мулярам Янам Чачотам належаў да бліжэйшых сяброў аўтара "Дзядоў".

Паэт закончыў універсітэт і перабраўся ў Коўна, дзе не было ложы. Аднак духоўна ён па-ранейшым быў звязаны з Вільняй. У лістах згадваў пра вольнае мулярства: "Ежа, паляванне, любаванне прыгажосцю, – пісаў ён да Яжоўскага і Петрашкевіча, – слуханне, гульня, дзеянні, размовы нават пра ложы з цацерукамі" (масонамі). "Тамаш Зан паміж цацерукоў такуе, – піша ён зноў да Петрашкевіча (1821). – Шэрок (Тэадор Лазінскі) дабраўся да яшчэ больш вялікіх птушак (вугальшчыкаў[5]), якія нядаўна ў нас з'явіліся з паўднёвых краінаў (Італія); але гэтыя птушкі належаць да вялікіх асобнікаў, а мы да гэтага часу трымаемся *passive*... аднак не без надзеі моцнага ўдзелу"[6].

---

[3] St.Małachowski-Łempicki. Lessing wolnym mularzem. Epoka. Nr 20. 1929.

[4] „Wiersz przez br. Zana deklamowany na obrzędowych pracach loży prow. litewskiej w dzień obchodu uroczystości św. Jana". Ён быў апублікаваны Феліксам Пшыемскім на старонках *Pamiętnika Literackiego*: Nieznany wiersz Tomasza Zana. (Rocznik VI. Zeszyt I. 1907), а таксама ксяндзом Ст.Залэнскім у кнізе *O masonii w Polsce*. (Kraków, 1908). Пшыемскі згадвае, што песню А.Міцкевіча „*Hej, radością oczy błysną*" спявалі па нотах адной з масонскіх песен.

[5] Г.зн. "карбанарыяў" (заўвага А.С.).

[6] Гэтыя дзве цытаты ўжо апублікаваў прафесар І.Хжаноўскі: Chleb macierzysty *Ody do młodości* (Wydanie trzecie. 1924. Biblioteka uniwersitetów ludowych. 232. IV. „Oda do młodości" a poezja wolnomularska).

На падставе гэтых апошніх словаў мы можам сцвярджаць, што паэт меў намер далучыцца да карбанарыяў. Калі ў акадэмічных колах Міцкевіч ускосна трапляў пад уплывы вольнага мулярства, то прыведзеныя фрагменты сведчаць, што і сапраўднае "каралеўскае майстэрства" не было чужым для яго і прыцягвала ягоную ўвагу.

У творчасці Міцкевіча ўпершыню выразныя вольнамулярскія ўплывы адчуваюцца ў "Одзе да маладосці". На самой справе гэта тыпова мулярскі твор, які маглі дэкламаваць і спяваць у кожнай ложы "па ўсім свеце". Затрымаюся толькі на найбольш характэрных месцах:

*1. Dzieckiem w kołębce kto łeb urwał Hydrze...*

Геракл быў сімвалам вольнага мулярства. Ягоныя подзвігі – перамога над лернескай гідрай альбо Цэрберам (цемрай), ачыстка стайняў Аўгея ды інш. – муляры ўспрымалі як перамогу над сіламі зла, з якімі неабходна змагацца ("*...wieczna mgła zaciemnia obszar gnusności, zalany odmetem*"). Ложа ў Магілёве на Дняпры нават называлася "Геркулес у калысцы" (1776)[7], як напамін пра забойства грэчаскім героем змеяў у калысцы (лернескую гідру ён перамог, калі стаў дарослым)[8].

*2. Hej! Ramie do ramienia! spólnemi łancuchi*
*Opaszmy ziemskie kolisko!*

У канцы сталовай ложы (банкету) Майстар кафедры гаворыць: "Апошні раз страляем (уздымаем тост) з выкладам табліцы маляванай за здароўе ўсіх вялікіх і малых муляраў ад аднаго полюса зямлі да другога, таму перад выстралам (тостам) браты таямнічай лігі няхай зробяць агульны ланцуг, яднаючы полымя з полымем". Браты станавіліся ў праёме падковы стала, падаючы сабе рукі: Майстар кафедры са сваімі суседзямі, Дазорцы з братамі службоўцамі, афіцэры паміж сабой і іншыя браты такім спосабам, каб локаць правай рукі аднаго дакранаўся да локця левай рукі другога, далонь на плячы суседа і наадварот[9]. Масонскі ланцуг азначаў еднасць і братэрства ў ложы. Аналагічна разумеў яго Міцкевіч, які, безумоўна, ведаў гэты рытуал.

*3. Dalej, bryło, z posad świata!*
*Nowemi cię pchniemy tory...*

Галоўнай мэтай вольных муляраў з'яўляецца змаганне супраць цемры і забабонаў старога света і штурханне яго на новыя шляхі. Глыба (неапрацава-

---

[7] St.Małachowski-Łempicki. Wykaz... str. 40 (151) Nr 71.

[8] У маёй калекцыі знаходзіцца масонскі дукат з выявай Геракла, які правым плячом абапіраецца на калону, пакрытую львінаю скураю, а ў левай руцэ трымае рог багацця, з якога сыплюцца масонскія сімвалы – цыркуль, адвес, кельма, вугольнік і лінейка. Без даты.

[9] Cérémonies et coutumes réligieuses. Paris, 1809. Frank-Massonia mężczyzn i kobiet. Wilno, 1820.

ны камень) пры дапамозе цыркуля, вагі і вугольніка становіцца апрацаваным кубам. Вучань (яго сімвал – неапрацаваны камень) становіцца чаляднікам, сімвал якога – куб. Паводле мулярскага вучэння, неапрацаваны камень азначае хаос, пачатак усяго, нават нашае грамадства, а куб – росквіт грамадства[10]. Адсюль лозунг: *Ordo ab Chao*, з хаосу – лад, змешчаны на дыпломах французскіх лож.

*4. Jednem: Stań się! Z Bożej mocy*
*Świat rzeczy stanął na zrębie*[11] ...

Вялікі Будаўнік сусвету (Бог) стварыў зямлю. Масоны лічаць стварэнне сусвету будаўніцтвам, а зруб у будоўлі мае прынцыповае значэнне.

*5. W krajach ludzkości jeszcze noc głucha*
*Żywioły chęci jeszcze są w wojnie...*
.............................................
*Wyjdzie z zamętu świat ducha!*

Неачэсаны камень, калі стане кубічным – чытаем у кнізе для шостай ступені кавалера Усходу – з'яўляецца невызначанай матэрыяй, дзе паядналыя элементы і прынцыпы развіваюцца пры дапамозе ажыўляючага ўнутранага духа і паступова набліжаюцца да мэты, якую Стваральнік вызначыў для кожнага гатунку і кожнага плода[12].

*6. Pryskają nieczułe lody*
*I przesady światło ćmiące...*
*Witaj jutrzenko swobody,*
*Zbawienia za tobą słonce!*

Вольнае мулярства, як ужо адзначалася, змагаецца з забабонамі і цемрай, імкнецца да золку, свабоды і сонца. На гэта ўказваюць таксама назвы ложаў – "Пераможаны забабон" (Кракаў), "Разагнаная цемра" (Жытомір), "Узыходзячы золак" (Радом), "Візантыйскі золак" (Канстанцінопаль), "Шчаслівае вызваленне" (Нясвіж), "Узыходзячае сонца" (Ломжа).

Чыста мулярскія фрагменты сустракаем таксама ў "Песні філарэтаў":

*Cyrkla, wagi i miary*
*Do martwych użyj brył*[13].

Муляр пры дапамозе цыркуля, вагі і вугольніка ператварае мёртвыя глыбы, г.зн. неачэсаныя камяні ў кубы. "Рамеснікі альбо простыя рабочыя ка-

[10] Nauka wolnego mularstwa w trzech pierwszych stopniach ku wygodzie Najprzewielebniejszej loży Świątyni Izis zebrane. Рукапіс прадстаўлены ў фрагментах кс. С.Залескім (op.cit.).

[11] Цытаты 2 і 4 апублікаваў праф. І.Хжаноўскі (op.cit), даказваючы ўплыў вольнага мулярства на "Оду да маладосці".

[12] Nauka do stopnia VI pod imieniem wtajemniczenia. Nauka wolnego mularstwa. Рукапіс прадстаўлены кс. С.Залескім (op.cit.).

[13] Цытата па: Chrzanowski I. Op.cit.

рыстаюцца цыркулем дзеля вызначэння ўсёй сваёй працы, – чытаем у кнізе першай ступені[14], – але Мы, вольныя муляры выкарыстоўваем цыркуль праўды дзеля ўзнагароды і суаднясення нашых учынкаў з сям'ю галоўнымі абавязкамі[15]. Вагі азначаюць роўнасць, якая пануе паміж братамі ложы і заціраe саслоўную розніцу. Як ад раўнавагі асобных частак будовы залежыць агульная моц, так ад роўнасці залежыць моц таварыства. Як у пабудове ёсць аднароднасць, так у вольным мулярстве павінна быць аднадумства сярод братоў[16]. Нарэшце, вугольнік уяўляе сабой руплівасць і вернасць нашага шаноўнага Хірама ў адносінах да мулярскіх статутаў і чысціню, якую ніколі не страціў[17].

У "Песні філарэтаў" Міцкевіч яшчэ раз згадвае цыркуль:

*Bo gdzie się serca palą*
*Cyrklem uniesień duch...*

Тагачасныя паэты, што належалі да ложаў, такія як Козьмян, Асінскі і Брадзінскі, не прымалі, аднак, выразную схільнасць Міцкевіча да вольнага мулярства і рэзка крытыкавалі яго паэзію.

У вядомых мне спісах сяброў літоўскіх ложаў няма Адама Міцкевіча. Не маю таксама іншага доказу непасрэднай прыналежнасці паэта да масонства. Ён мог быць масонам у 1819 – 1822 гг., г.зн. пасля заканчэння універсітэту і да забароны масонства. Магчыма, знаходжанне Міцкевіча ў тыя гады ў Коўне, дзе не было ложы, было перашкодай на шляху ягонага далучэння да вольнага мулярства. Аднак трэба адзначыць, што ў апублікаваных спісах вольных муляраў змяшчалі прозвішчы толькі тых, хто даў на гэта згоду[18].

## II. Уплыў містычнага вольнага мулярства

У сталіцы на Няве Міцкевіч пазнаёміўся са славутымі вольнымі мулярамі: кашталянам Аляксандрам Хадкевічам і мастаком Юзафам Аляшкевічам. Апошні аказаў вялізарны ўплыў на нашага паэта.

Аляшкевіч быў Майстрам кафедры польскай пецярбургскай ложы "Белы арол" і карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод усіх сталічных муляраў. "Як толькі ў іншых ложах узнікалі непаразуменні ці з нагоды ўжывання статута ордэна, – пісаў Пшэцлаўскі, – ці па прычыне сумненняў, якія даты-

---

[14] Nauka wolnego mularstwa w trzech pierwszych stopniach ku wygodzie Najprzewielebniejszej loży Świątyni Izis zebrane. Рукапіс прадстаўлены ў фрагментах кс. С.Залескім (op.cit.).

[15] Сем абавязкаў – гэта давер, шчырасць, міласэрнасць да бедных, паслухмянасць, лагоднасць і цярплівасць, смеласць і маўчанне.

[16] Allgemeines Handbuch der Freimaurerei... von Lennings Encyklopädie der Freimaurerei. Leipzig. 1900.

[17] Precis du resp. Ordre de l'art royale et maçonnique. 1784. Rkps.

[18] Księga Budownicza loży „Szkoła Sokratesa". 5818/19. Rkps. Bibl. Un. W Wilnie v. 469.



Адам Міцкевіч на фоне турэмных кратаў. Паводле малюнка В.Ваньковіча (1828).



Юзаф Аляшкевіч (1777-1830). Мастак, Майстар кафедры ложы "Белы арол" (Санкт-Пецярбург).

чылі абрадаў, пасылалі дэпутацыю да Аляшкевіча, які і выносіў канчатковы прысуд"[19].

Па меры магчымасці ён імкнуўся жыць адпаведна сямі абавязкам вольнага муляра і асабліва адрозніваўся міласэрнасцю ў адносінах да бедных. Распавядалі, што аднойчы злодзей спрабаваў яго абакрасці на вуліцы, а, калі зразумеў, што яго заўважылі, кінуўся ўцякаць. Аляшкевіч дагнаў яго і аддаў напалоханаму злодзею, які на каленях маліў аб выбачэнні, свае грошы, заявіўшы, што напэўна яны яму вельмі патрэбныя, бо інакш не стаў бы красці. Дабрачыннасць Аляшкевіча Міцкевіч захаваў на вякі ў словах:

*Bo rozdawając między lud jałmużny,*
*Każdego z biednych po imieni witał,*
*Tamtych o żony, tych o dzieci pytał.*

Вольнамулярская ідэалогія пецярбургскага містыка і яго мары пра шчасце ўсяго чалавецтва, а не толькі польскай нацыі, Міцкевіч ахарактарызаваў наступным чынам:

*I widzi całe w męczarniach narody,*
*Czuje co cierpi, mają cierpieć wieki,*
*I przewiduje, jak jest kres daleki*
*Tylu pokoleń zbawienia – swobody*[20].

Сустрэўшы Міцкевіча на берагах Нявы, Аляшкевіч прывітаў яго словамі:

*Chrześcijaninem jestem i Polakiem*
*Witam cię Orła i Booza znakiem*[21].

Пад "арлом" Міцкевіч напэўна разумеў "Белага арла", г.зн. назву ложы, у якой Аляшкевіч быў Майстрам кафедры. Што датычыць "Бооза", то трэба адзначыць наступнае: у масонскай ложы першай і другой ступені, як памяць пра храм Саламона, знаходзяцца дзве калоны – паўночная і паўднёвая. Паўночная калона – вучнёўская, пры якой вучні атрымліваюць заробак, называецца "Якін" і азначае чысціню. Паўднёвая калона – чаляднікаўская, пры якой чаляднікі атрымліваюць заробак (размова ідзе пра заробак вучняў і чаляднікаў, якія працуюць на будаўніцтве храма Саламона), называецца "Бооз" і азначае мудрасць. Бооз – гэта містычнае паняцце: "Яно моцнае ў Богу[22]". Якін – гэта слова, па якому пазнаюць вучняў, а Бооз – чаляднікаў. Гэтыя словы, як вялікую святыню, захоўваюць у строгай таямніцы. "Каб зберагчы яго ад ціка-

---

[19] Prace Komisji do badań nad historią literatury i oświaty. Tom I. Warszawa, 1914. Józef Przecławski: Józef Oleszkiewicz.

[20] Cz. III. Petersburg.

[21] Dziadów. Cz. III. паводле аўтографа А.Міцкевіча апублікаваў Ю.Каленбах. (W Krakowie. Nakł. P. Akad. Umiej. 1925). Словы: „Orła i Booza znakiem" паэт, як вядома, замяніў на: „krzyża i pogoni znakiem".

[22] Allgemeines Handbuch der Freimaurerei…

васці або жартаў непасвечаных асабаў, – чытаем у рытуале першай ступені, – яно вымаўляецца з асцярогай, ужываючы *syllabe*, напрыклад, калі хто-небудзь з нашых братоў хоча пачуць гэтае слова, яно вымаўляецца ў адказ, г.зн. скажы мне першую літару, я табе скажу другую; калі той, хто цябе запытаў гаворыць Б, ты адказваеш О, той – О, ты – З; потым ты першую складаеш сілабу, а ён – другую; напрыканцы вымаўляецца самое слова і тройчы пацісkaюцца далоні[23].

Аляшкевіч прывітаў Міцкевіча як чаляднiка, брата другой ступені[24]. Гэта здарылася ў 1824 г. праз два гады пасля забароны вольнага мулярства. Раней прызнаная ўрадам ложа "Белы арол" ужо не існавала, але маглі адбывацца тайныя паседжанні, у якіх удзельнічаў таксама Міцкевіч.

Паэт наступным чынам характарызаваў Аляшкевіча:

*Biblią tylko i kabałę bada,*
*I mówia nawet, że z duchami gada*[25].

Дык вось, гэтыя размовы з духамі – не што іншае як навука Сен-Мартэна[26] і Сведэнборга. Славуты містык Сен-Мартэн быў уведзены сваім настаўнікам Марцінэсам Паскуалісам у вольнамулярскі саюз Кахенаў і пазней стварыў уласную сітэму *rit rectifié*, якую па-іншаму называюць "марцінізмам". Гэтая сістэма аб'ядналася пасля канвенту ў *Gaules* з галіною французскай сістэмы Строгага нагляду і ўзнікла *l'ordre des chevaliérs de la Cité sainte*. Сен-Мартэн лічыў вольнамулярства праявай божага і сцвярджаў, што яно ўзнікла аднačасна са стварэннем сусвету. Творы гэтага містыка, асабліва *Des Erreurs et de la Verité*, прызнаюцца вольнымі мулярамі падмуркам масонскіх ведаў[27].

Няма сумненняў, што з навукай Сен-Мартэна Міцкевіча пазнаёміў Аляшкевіч[28]. Хутчэй за ўсё гэта адбылося пад час доўгіх размоваў паміж імі. Гэтыя размовы вылечылі Міцкевіча, па-праўдзе, не ад адсутнасці веры, але ад індыферэнтызму, якім ён страдаў[29].

Міцкевіч не хаваў сваёй залежнасці ад пецярбургскага містыка ў *Księgach Narodu Polskiego i Pielgrzymstwa Polskiego*, калі пісаў, што выкарыстаў у *Кнігах* тое, што чуў, асабліва з вуснаў паляка па прозвішчу Аляшкевіч. Уплыў Сен-Мартэна на гэты твор характарызаваў ужо прафесар Пігонь[30].

---

[23] Nauka wolnego Mularstwa w trzech piewszych stopniach ku wygodzie Najprzewielebniejszej loży Świątyni Izis zebrana.

[24] На самой справе тэкст *Дзядоў* сведчыць пра тое, што А.Міцкевіч быў прывітаны як вучань, г.зн. брат першай ступені (заўвага А.С.).

[25] Dziady. Cz. III. Oleszkiewicz.

[26] Поўнае імя – Клод Луі дэ Сен-Мартэн (заўвага А.С.).

[27] Allgemeines Handbuch der Freimaurerei…

[28] Józef Przecławski: Józef Oleszkiewicz. Prace Komisji do badań nad historią literatury i oświaty. Tom I. Warszawa, 1914. – Stanisław Pigoń: Z epoki Mickiewicza. Lwów, 1922. – Stanisław Kolbuszewski: Ziemski mesjasz narodów. Poznań, 1930.

[29] Przecławski op. cit.

[30] Pigoń op. cit. Idee Saint-Martina w „Księgach Narodu Polskiego i Pielgrzymstwa Polskiego".

*Widzenie* у *Дзядах* таксама было створана пад уплывам Сен-Мартэна, як і загадкавыя "сорак чатыры"[31]. "Чытаю мала, – пісаў Міцкевіч у 1844 г. – Найчасцей гэта творы Сен-Мартэна, якія выкарыстоўваю для сваёй далейшай працы"[32]. Містыцызм Міцкевіча потым развіваўся ў *Kole Braci Zjednoczonych*.

Духоўная філасофія Сведэнборга, чые ідэі прыняло вольнае мулярства містычнага накірунку, асабліва ідэю о Новам Ерусаліме, таксама не была чужой для Міцкевіча. Уплыў Сведэнборга на частку III *Дзядоў* закранаў прафесар Пігонь[33]. Міцкевіч таксама падпаў пад уплыў разэнкрэйцэра Бёмэ, аднаго з адэптаў алхіміі і герменэўтыкі[34]. "Сярод сучасных містыкаў найвялікшы Бёмэ, – захапляўся наш паэт. – Гэта душа, якая палае вялікім чыстым полымем і малюе свае ўяўленні вогненнымі словамі. Гэта божы прарок і такі прадказальнік будучыні для сучасных хрысціянаў, якім быў Ісая для яўрэяў".

Сен-Мартэн стаў памостам для пераходу Міцкевіча да тавянізму, адзначыў прафесар Пігонь. Уплыў Сен-Мартэна на Тавянскага трэба прызнаць даказанным, прычым, што датычыць пасрэдніка гэтай знаёмасці, то можна лёгка пагадзіцца з тым, што ім стала тагачаснае масонства. Між іншым Тавянскі ўзяў з вучэння французскага містыка яго ідэю о рэінтэграцыі і метампсіхозе, прычым "ператварэнне мэтампсіхозы як арганічнага матыва ў касмагонію, у ядро гістарыясофіі і эсхаталогіі абодвух містыкаў, трактоўка яе ў якасці падмурку погляду на свет, прычым погляду адзінага ў розным, можа сведчыць пра генэтычную сувязь света ўяўленняў і веры Тавянскага з містыкай Сен-Мартэна". У іх абодвух "літаральна ўсё па прычыне духа і для духа існуе"[35]. А вось ад Сведэнборга Тавянскі ўзяў вучэнне пра калоны і касмалагічныя ўяўленні.

Відавочна, што да знаёмства з Тавянскім Міцкевіч, дзякуючы пецярбургскаму правадыру, дасканала ведаў вучэнне Сен-Мартэна, а таксама філасофію Сведэнборга і Бёмэ. Погляды гэтых трох славутых містыкаў, як ужо адзначалася, былі прынятыя містычным накірункам масонства.

Аднак паступова Міцкевіч выразна аддаліўся ад вольнага мулярства, сцвярджаючы, што яно трымаецца "толькі на адных формах"[36].

*Пераклад Алеся Смаленчука*

---

[31] Kolbuszewski op. cit.

[32] Ацэнкі і заўвагі з твораў Якуба Бема, Анёла Слёнзака і Сен-Мартэна. 1836.

[33] Pigoń op. cit. Przypuszczalny ślad Swedenborga w III części „Dziadów".

[34] Rozprawa Mickiewicza o Boehmem. Warszawa. 1898.

[35] Цытаты з працаў праф. Пігоня. Op.cit.

[36] Literatura Słowiańska wykładana w Kolegjum Francuzskiem przez Adama Mickiewicza. Tłumaczenie Feliksa Wrotnowskiego. Poznań. 1865. Lekcja XXVII. Wtorek, 31 maja 1842. <…>

*Алесь Смалянчук (Гародня)*

# Адраджэнне вольнага мулярства на беларускіх і літоўскіх землях напачатку XX ст.

Указ Аляксандра I ад 1 жніўня 1822 г., які забараняў арганізацыі вольных муляраў на ўсёй тэрыторыі імперыі, перапыніў іх дзейнасць на беларускіх і літоўскіх землях амаль на стагоддзе. Адраджэнне руху вольных муляраў на тэрыторыі Беларусі адбылося толькі пасля рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Ініцыятыва зыходзіла ад масонаў Масквы і Санкт-Пецябурга. Якраз напачатку XX ст. расейскае масонства дасягнула свайго найвялікшага росквіту. Невыпадкова вядомы польскі гісторык руху вольных муляраў Людвік Хас адну з сваіх публікацый, прысвечаных расейскім "братам" пачатку XX ст., назваў "Дні велічы"[1].

У палітычных цэнтрах Расейскай імперыі масонскія ложы "новага пакалення" пачалі ўзнікаць яшчэ ў перыяд рэвалюцыі. Прычыны гэтага працэсу большасць даследчыкаў звычайна звязвае з рэвалюцыйным крызісам, які спарадзіў сярод часткі грамадскіх дзеячоў моцнае імкненне да кансалідацыі. Вольнае мулярства з ягоным арэалам таямніцы, дэмакратызмам і лібералізмам у ідэалогіі стала прывабнай формай аб'яднання ліберальна-дэмакратычных элементаў расейскага палітычнага жыцця.

У 1905 г. у Маскву прыехаў вядомы гісторык і сацыёлаг, кіраўнік Вышэйшай школы сацыяльных навук у Парыжы прафесар Максім Кавалеўскі. У 1887 г. ён быў сярод заснавальнікаў парыжскай ложы "Космас", якая належала да "Вялікага ўсходу Францыі". М.Кавалеўскі атрымаў паўнамоцтвы на заснаванне ў Расеі масонскай ложы. Глеба для гэтага ўжо была падрыхтаваная. Напачатку 1905 г. сябрамі "Космасу" сталі некаторыя вядомыя расейскія палітыкі і грамадскія дзеячы ліберальна-дэмакратычнага накірунку (Васіль Маклакоў, Яўген Кедрын ды інш.)[2].

---

[1] Hass L. Dni wielkości. O masonerii Rosyjskiej początku XX w. // www.wlnp.pl/Arsregia.htm. Кніга Л.Хаса таксама друкавалася на старонках часопіса *Ars Regia* (1995/1996. – R. 4/ 5. – Nr 1-2).

[2] Hass L. Rosyjskie wolnomularstwo lat 1906-1918 (Fragment z dziejów liberalizma w Rosji.) // Studia z dziejów ZSSR i Środkowej Europy. – VII. – 1971. – S. 152. (Васіль Маклакоў (1869-1957) – сябра ЦК партыі кадэтаў, дэпутат II, III і IV Дзяржаўнай думы. Адвакат, абараняў Бэйліса. У 1917 г. прызначаны Часовым урадам паслом у Францыі. Старшыня Рускага камітэта пры Ліге нацый. Яўген Кедрын – адвакат, дэпутат I Дзяржаўнай думы).

Максім Кавалеўскі разгарнуў актыўную дзейнасць, і вынікі не прымусілі сябе доўга чакаць. 15 (28) лістапада 1906 г. у Маскве была створаная ложа "Адраджэнне" ("Возрождение"). Яе ўзначаліў прафесар Мікалай Бажэнаў[3]. Напачатку наступнага 1907 г. да Масквы далучыўся Санкт-Пецярбург, дзе ўзнікла ложа "Палярная зорка" (Вялебны – князь Арлоў-Давыдаў). Абедзьве ложы належалі да "Вялікага ўсходу Францыі". Рух вольных муляраў хутка пашыраўся. У сярэдзіне 1908 г. у ложах было ўжо каля 40 чал. У 1909 г. – прыблізна 300 – 350[4]. У гэты час існавалі тры ложы ў Санкт-Пецярбургу, дзве – у Маскве, па адной – у Ніжнем Ноўгарадзе, Адэсе і Кіеве.

Даследчыкі звярнулі ўвагу на істотнае адрозненне вольных муляраў пачатку XX ст. ад сваіх папярэднікаў. Калі да апошніх належалі пераважна прадстаўнікі расейскай арыстакратыі, то большасць вольных муляраў пачатку XX ст. прадстаўляла інтэлігенцыю. Гэта былі адвакаты, універсітэцкая прафесура, лекары, інжынеры ды інш. Па палітычнай арыентацыі пераважалі прыхільнікі ліберальна-дэмакратычнай ідэалогіі. Польскі даследчык Людвік Хас наступным чынам ахарактарызаваў іх погляды: "Гэта былі людзі светлыя і адукаваныя, лібералы па перакананнях, праціўнікі традыцыйнага ладу, якія не былі прыхільнікамі расейскай манархіі і крытычна ацэньвалі, па меньшай меры, двух апошніх цароў. Яны лічылі, што царызм праводзіць гібельную палітыку, якая прывядзе да рэвалюцыі"[5].

Празмерная палітызаванасць многіх расейскіх прадстаўнікоў "каралеўскага майстэрства" (у прыватнасці А.Калюбакіна, М.Някрасава[6] і іх аднадумцаў) справакавала ўнутраны канфлікт. Прыхільнікі традыцыйнага погляду на вольнае мулярства як на этычную сістэму (Д.Бебутаў, Я.Кедрын, М.Маргуэліс ды інш.) не жадалі ператварэння ложаў у інструмент барацьбы з самаўладдзем. У выніку "палітычная плынь" пад прыкрыццём размоваў пра правакатараў і агентаў "ахранкі", якія нібыта праніклі ў ложы, пайшла на істотную рэарганізацыю вольнага мулярства ў Расеі. У лютым 1910 г. адбыўся сход "братоў", на якім абмяркоўвалася пытанне пра самароспуск арганізацый. Большасцю галасоў было прынята рашэнне, што кожная ложа будзе сама-

[3] Hass L. Rosyjskie wolnomularstwo... – S. 156; Аврех А. Масоны и революция. – М., 1990. – С. 50. (Мікалай Бажэнаў (1857-1923) – псіхіатр, прафесар. Напачатку 1906 г. старшыня маскоўскага Літаратурна-мастацкага гуртка. Ініцыяваны ў 1884 г. у ложы "Les Amis Reunis" у Францыі).

[4] Аврех А. Масоны и революция. – С. 184.

[5] Hass L. Rosyjskie wolnomularstwo... – S. 152.

[6] Аляксандр Калюбакін (1868-1915) – сябра партыі кадэтаў, дэпутат III Дзяржаўнай думы. Сакратар Вярхоўнай рады Вялікага ўсходу народаў Расеі (1912-1915). Загінуў на фронце. Мікалай Някрасаў (1879-1940) – інжынер-чыгуначнік, дэпутат III і IV Дзяржаўных дум. У 1915-1916 гг. в.а. Сакратара Вярхоўнай рады Вялікага ўсходу народаў Расеі. Міністр шляхоў зносінаў у Часовым урадзе. Застаўся ў савецкай Расеі, у 1928-1930 гг. працаваў на Беламорска-Балтыйскім канале.

стойна вырашаць уласны лёс. У выніку амаль усе ложы афіцыйна "заснулі". Аднак на самой справе гэта быў толькі спектакль арганізаваны "рэфарматарамі" дзеля таго, каб пазбыцца ненадзейных "братоў" і тых, чыім ідэалам заставалася філасофска-этычнае масонства[7]. Па падліках гісторыка В.Старцава, у ложы новай масонскай арганізацыі, якая ў 1912 г. атрымала назву "Вялікі ўсход народаў Расеі", з расейскіх ложаў "Вялікага ўсходу Францыі" перайшло толькі 34 чал.[8] Затое ў новыя арганізацыі вольных муляраў Расеі хутка ўлілася "свежая кроў". Шэрагі "братоў" папаўняліся галоўным чынам левымі кадэтамі, меньшавікамі і эсэрамі.

Гісторыкі згодны, што новыя масоны перасьледавалі чыста палітычныя мэты. Галоўнай з іх была замена самаўладдзя парламенцкім ладам. Традыцыйныя маральна-этычныя нормы масонскай ідэалогіі былі падпарадкаваныя прынцыпам расейскага лібералізму. Праўда, у прынятым на II канвенце (Санкт-Пецярбург, 1913) статуце Вялікага ўсходу народаў Расеі гэта не знайшло свайго адлюстравання. Галоўнай мэтай вольных муляраў Расеі абвяшчаўся пошук ісціны і дасягненне маральнай дасканаласці чалавецтва шляхам аб'яднання людзей на пачатках братэрскай любові, узаемадапамогі, талеранцыі і поўнай свабоды сумлення[9].

Трэба заўважыць, што ўсе гэтыя перамены адбываліся без санкцыі Вялікага ўсходу Францыі. У выніку расейскае масонства не мела шансаў стаць часткай сусветнага вольнамулярства. Яно лічылася "нерэгулярнай" арганізацыяй. Шанс атрымаць прызнанне можна было шукаць на шляху паразумення з французскімі "братамі", але расейскія кіраўнікі не ішлі на гэтыя кантакты. Л.Хас лічыць, што яны былі ўпэўненыя ў пранікненні агентаў расейскай паліцыі ў структуры Вялікага ўсходу Францыі[10].

У гэты ж час на тэрыторыі Расейскай імперыі з'явіліся ложы, незалежныя ад Масквы і Санкт-Пецярбурга. У чэрвені 1910 г. у Варшаве была створана ложа "Вызваленне" (Вялебны або Майстар кафедры – Рафал Радзівіловіч), якая належала да "Вялікага ўсходу Францыі"[11]. Адроджаная польскае вольнае мулярства не адразу звярнула ўвагу на беларускія і літоўскія землі. Амаль да сярэдзіны 1913 г. ложы на гэтых землях былі звязаныя выключна з расейскімі масонамі.

Якраз прадстаўнікі расейскага палітычнага масонства ініцыявалі ўтварэнне ложаў на беларускіх і літоўскіх землях**. У 1910 г. па іх ініцыятыве

---

[7] Серков А. История русского масонства. 1845-1945. – Спб., 1997. – С. 105.

[8] Старцев В.И. Русское политическое масонство начала XX в. – Спб., 1990. – С. 23-24.

[9] Старцев В.И. Русское политическое масонство… – С. 124.

[10] Hass L. Dni Wielkości…

[11] Hass L. Masoneria Polska XX w. Losy, loży, ludzi. – Warszawa, 1993. – S. 44.

** Знойдзеныя крыніцы дазваляюць сцвярджаць памылковасць тэзіса Людвіка Хаса, які лічыць віленскую ложу "Літва" часткай сістэмы адроджанага польскага вольнамулярства (Hass L. Dni Wielkości...).

была створаная ложа ў Менску. На жаль, звесткі пра яе склад носяць фрагментарны і гіпатэтычны характар. Людвік Хас згадаў толькі двух менскіх масонаў – лекара Тэадора Кодзіса[12], які раней быў звязаны з партыяй "Пралетарыят", а таксама юрыста і палітычнага дзеяча Казіміра Петрусевіча[13]. Апошні ў 1898 г. удзельнічаў у працы I з'езда РСДРП у Менску як прадстаўнік сацыял-дэмакратычнай арганізацыі Екацерынаслава. Пазней пасяліўся ў Менску. На момант утварэння ложы быў прыхільнікам ліберальнай ідэалогіі. Паводле даследчыка Андрэя Сяркова, Казімір Петрусевіч у 1911 – 1912 гг. быў прысяжным паверыным, а пазней (1914-1917 г.) працаваў у земскім Саюзе дапамогі ахвярам вайны[14]. Людвік Хас назваў таксама імёны Э.Івашкевіча і лекара Яна Офенберга, як верагодных братоў менскай ложы[15].

Пра ўдзел Тэадора Кодзіса ў масонскай арганізацыі паведаміла ў сваіх успамінах Зофія Кодзіс-Фрэйерова. Паводле яе меркавання, да менскай ложы належалі пераважна юрысты і лекары, людзі з рознымі палітычнымі перакананнямі[16]. Міхал Ромэр ва ўласным дзённіку, распавядаючы пра паездку ў Менск у верасні 1911 г. віленскіх краёўцаў і масонаў Браніслава Крыжаноўскага і Вітальда Абрамовіча, згадаў імёны Эдмунда Івашкевіча, Канстанціна Дземідзецкага-Дземідовіча, Казіміра Петрусевіча і Загорскага[17]. Мэтаю паездкі быў пошук верагодных аўтараў для газеты краёўцаў "Пшэглёнда віленьскага". Цалкам магчыма, што сустрэча з вышэйназванымі менскімі юрыстамі была вынікам ранейшых масонскіх кантактаў. Таксама варта адзначыць, што Ежы Асмалоўскі, які ў 1912 – 1914 гг. быў сябрам варшаўскай ложы "Вызваленне" ("Wyzwolenie"), у 1915 г. у Менску часта наведваў дом адваката Эдмунда Івашкевіча. Яго звычайнымі суразмоўцамі пад час гэтых візітаў былі Казімір Петрусевіч, Канстанцін Дземідзецкі-Дземідовіч і Ігнацы Віткевіч[18]. Верагодна якраз гэтыя асобы і складалі "ядро" менскай ложы.

Крыніцы захавалі значна больш інфармацыі пра дзейнасць віленскіх вольных муляраў. Найбольшай увагі заслугоўвае дзённік Міхала Ромэра (1880-

---

[12] Hass L. Masoneria Polska XX w. Losy, loży, ludzi. – S. 222.

[13] Тамсама. – S. 271.

[14] Серков А.И. Русское масонство. 1731 – 2000. Энциклопедический словарь. – Москва: Росспэн, 2001. – С. 641.

[15] Hass L. Dni Wielkości… // www.wlnp.pl/Arsregia.htm (Паводле інфармацыі Дарыуша Тарасюка, Ян Офенберг з'яўляўся адным з кіраўнікоў польскай "Асветы" на Меншчыне і меў непасрэднае дачыненне да стварэння тайных польскіх школ. Эдмунд Івашкевіч у 1916 г. актыўна працаваў у Польскім таварыстве дапамогі ахвярам вайны (Tarasiuk D. Działalność kulturalno-oświatowa Polaków w Mińsku w latach 1905-1914 // На шляхах да ўзаемаразумення: навуковы зборнік. – Мінск, 2000).

[16] Dział rękopisów Biblioteki Narodowej (BN). Akc 11258. Z.Kodis-Freyerowa Z. Wspomnienia. – S. 20-21.

[17] Аддзел рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы (АР ЦБАНЛ). Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 2. – S. 35. Запіс ад 20.09. (3.10). 1911 г.

[18] Dział rękopisów BN. Rkps. 6792a. J.Osmołowski. Wspomnienia z lat 1914-1921. – S. 13.

1945). Гэты вядомы юрыст, навуковец, публіцыст і палітычны дзеяч Літвы (як "гістарычнай", так і "этнаграфічнай") пакінуў амаль 40 тамоў штодзённых запісаў. Першы з іх быў зроблены 1 студзеня 1911 г., а апошні – 18 лютага 1945 г., за некалькі дзён да смерці. Дзённік з'яўляецца надзвычай цікавай і каштоўнай крыніцай па гісторыі грамадскага, палітычнага і культурнага жыцця Беларуска-Літоўскага краю пачатку XX ст. Трыццаць чатыры тамы захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы (АР ЦБАНЛ), астатнія – у аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага універсітэту (АР БВУ). Дзённік стаў даступным для даследчыкаў адносна нядаўна. Міхал Ромэр дазволіў карыстацца запісамі толькі па прашэсцю 40 гадоў пасля яго смерці. Першымі заняліся вывучэннем дзённіка даследчыкі Літвы і Польшчы – Генрык Лаўмяньскі, Вінцас Марцінкенс, Рымантас Мікніс, Ян Савіцкі, Браніслаў Макоўскі, Збігнеў Соляк ды інш. Міхал Ромэр быў прыкметнай постаццю ў мясцовай масонскай іерархіі, і гэты бок яго жыцця і дзейнасці таксама знайшоў адлюстраванне ў запісах. Фрагмент дзённіка, у якім раскрываюцца абставіны ўзнікнення і мэты дзейнасці масонскіх ложаў у 1910 – 1915 гг., друкуецца цалкам у *Дадатку*.

Напрыканцы 1910 г. у Вільні ўзнікла ложа "Еднасць"* ("Jedność"). Ролю арганізатара адыграў удзельнік першых з'ездаў Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі Ежы Ром. Менавіта ён разам з братам Эльяшам, паводле сведчанняў Антона Луцкевіча, ужо ў 1908 або 1909 г. меў размову з Іванам Луцкевічам, з якой апошні даведаўся пра масонскія арганізацыі ў Расеі[19]. Дарэчы, паводле М.Ромэра, спачатку масоны звярнуліся да Т.Урублеўскага. Але вядомы адвакат і прыхільнік краёвай ідэалогіі адмовіўся ад супрацоўніцтва[20].

Ежы Ром быў добра вядомы ў колах грамадска-палітычных дзеячоў Віленшчыны. У перыяд рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. ён актыўна працаваў у яўрэйскіх арганізацыях Вільні, быў упаўнаважаным па арганізацыі камітэтаў партыі кадэтаў у Віленскай, Ковенскай, Гарадзенскай і Менскай губ., стварыў Віленскую арганізацыю гэтай партыі, рэгулярна ўдзельнічаў у пасяджэннях ЦК партыі з прадстаўнікамі губернскіх камітэтаў[21]. Сярод заснавальнікаў быў таксама ягоны брат Эльяш. Э.Ром – дзеяч дэмакратычнага "лагеру", прыхільнік

* У ранейшых публікацыях на беларускай мове гэтая ложа звычайна называлася "Лучнасць". Аднак польскамоўнай назве "Jedność", як падаецца, больш адпавядае беларускае слова "еднасць", якое ў *Тлумачальным слоўніку беларускай мовы* тлумачыцца, як "1. Адзінства, згуртаванасць… 2. Агульнасць, супольнасць…" (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 1996. – С. 196.

[19] Сташкевіч М. Гістарычны выбар напачатку XX ст. // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Пад рэд. А.П.Вайтовіча ды інш. – Мн., 2000. – С. 106-107.

[20] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 4. – S. 403. Запіс ад 3 (16). 03. 1915 г.

[21] Протоколы ЦК и заграничных групп Конституционно-демократической партии. 1905 – середина 1930-х г. – В 6 т. – Том 1. Протоколы ЦК конституционно-демократической партии. 1905-1911. – Москва, 1994. – С. 57, 82, 95, 102-103, 205-206 и др.



Старонка дзённіка М.Ромэра з інфармацыяй пра паседжанне ложы “Літва”.
Запіс ад 16 (29) лістапада 1911 г.




Старонка дзённіка М.Ромэра з інфармацыяй пра паседжанне ложы “Літва”.
Запіс ад 13 (26) снежня 1912 г.

“краёвай ідэалогіі”*, публіцыст. У 1906 г. актыўна супрацоўнічаў з “Газетай Віленьскай”, якую выдаваў і рэдагаваў Міхал Ромэр. Газета з’яўлялася цэнтрам групоўкі краёўцаў ліберальна-дэмакратычнага накірунку. Памёр у 1912 г. Старонкі дзённіка М.Ромэра захавалі партрэт гэтага чалавека. Аўтар дзённіка характарызаваў Э.Рома як “ідэаліста ў самым добрым значэнні гэтага слова”, як “аднаго з тых яўрэяў, якія не займаліся выключна яўрэйскімі праблемамі і выдатна разумелі сувязь паміж эмансіпацыяй яўрэяў і агульным станам дэмакратыі ў краіне. Ён быў шчырым яўрэйскім патрыётам і адначасна змагаўся супраць яўрэйскага нацыяналізму <…> Быў адным з тых нешматлікіх яўрэяў, якія разумелі асаблівасці нашага краю і ў хрысціянскай супольнасці бачылі не нейкую дзяржаўна-расейскую масу, а літоўцаў, беларусаў ды іншыя народы. Адным словам, гэта быў сапраўдны грамадзянін краю, сын не толькі яўрэйскага народу, але і Літвы-Айчыны, якую разумеў як адзіны сацыяльны арганізм, інтарэсы якога дамінуюць над усімі нацыянальнымі імкненнямі”[22].

У ліку заснавальнікаў “Еднасці” былі таксама браты Луцкевічы, літоўскі дзеяч Данатас Маліноўскас, прадстаўнік левіцы польскіх нацыянальных дэмакратаў доктар Людвік Чаркоўскі. У сакавіку 1911 г. у ложу быў прыняты Міхал Ромэр, які хутка стаў адным з лідэраў віленскага масонства. Трэба адзначыць, што афіцыйнае запрашэнне ён атрымаў ад Івана Луцкевіча, што адлюстравалася ў дзённікавым запісу[23].

У 1915 г. М.Ромэр даверыў свайму дзённіку не толькі таямніцу існавання арганізацый масонаў. Ён досыць падрабязна спыніўся на ідэалогіі, якой прытрымліваліся віленскія “браты”. “Нашая задача, – пісаў палітык і публіцыст, – не знішчаць, не ламаць, не разбураць, а ствараць і ўдасканальваць. <...> Нашым падмуркам з’яўляюцца ідэі братэрства, любові і свабоды чалавечага духу. Нашае брацтва – гэта Саюз гуманізму ў шляхетным і адначасова дзейсным значэнні гэтага слова. Мы імкнемся, каб нашыя лозунгі не сталі

* Г.зв. “краёвая ідэалогія” грунтавалася на прыярытэце інтарэсаў Беларуска-Літоўскага краю. Нацыянальныя імкненні яго народаў успрымаліся як другасныя. Краёўцы фактычна выступалі прыхільнікамі фарміравання нацыі грамадзянскага (палітычнага) тыпу. У адпаведнасці з гэтай ідэалогіяй кожны, хто адчуваў сябе грамадзянінам краю і ўспрымаў гістарычную Літву як сваю Радзіму належаў да “нацыі ліцьвінаў” незалежна ад этнічнай прыналежнасці і культурных сімпатый. Будучыню гістарычнай Літвы краёўцы першапачаткова звязвалі з дасягненнем аўтаноміі ў межах Расеі. Напрыканцы першай сусветнай вайны яны ператварыліся ў прыхільнікаў незалежнай дзяржавы ў межах былога ВКЛ. Галоўнымі ідэолагамі краёвасці былі Міхал Ромэр (ліберальна-дэмакратычны накірунак) і Раман Скірмунт (ліберальна-кансерватыўны). Таксама трэба назваць імёны Баляслава Ялавецкага, Канстанцыі Скірмунт, Аляксандра Лядніцкага, Тадэвуша Урублеўскага і Альбіна Гербачэўскага.

[22] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 2. – S. 317. Запіс ад 28.06. (11.07). 1912 г.

[23] Тамсама. – Т. 1. – S. 66. Запіс ад 7(20).03.1911 г.

звычайнай фармальнасцю <...> Мы імкнемся зрабіць іх рэальнасцю сумлення, дзеянняў і дачыненняў у чалавечым сужыцці; каб яны пранізалі адносіны як паміж асобнымі людзьмі, так і паміж усялякімі групамі, нацыямі і, нарэшце, сталі здабыткам усяго чалавецтва <...>". Закранаючы палітычны аспект масонскай дзейнасці, М.Ромэр падкрэсліў, што "брацтва" не з'яўляецца ні палітычным аб'яднаннем, ні партыяй. Аднак ва ўмовах расейскай дзяржавы арганізацыя, якая абвяшчае сваёй мэтай дасягненне свабоды чалавечага духа, непазбежна будзе займаць антыўрадавую палітычную пазіцыю. "Прычына ў тым, – сцвярджаў М.Ромэр, – што гэтая дзяржаўная арганізацыя <...> і сама расейская дзяржаўнасць як канкрэтны гістарычны феномен ёсць найвялікшая перашкода для рэалізацыі нашых прынцыпаў"[24].

Міхал Ромэр паслядоўна адстойваў асноўныя прынцыпы краёвасці. Менавіта краёвасць для яго з'яўлялася найбольш адэкватнай формай існавання і рэалізацыі масонскіх лозунгаў на тэрыторыі гістарычнай Літвы. У вялікай ступені якраз намаганнямі М.Ромэра віленскія ложы сталі моцнымі цэнтрамі прапаганды краёвай ідэалогіі, якая супрацьстаяла ідэалогіі нацыянальнага шавінізму. Пры гэтым краёвасць зусім не перашкаджала сваім адэптам актыўна працаваць у рэчышчы ўласных нацыянальных рухаў.

Трэба заўважыць, што Міхал Ромэр успрымаў грамадства Беларуска-Літоўскага краю як адзінае і непадзельнае, прасякнутае пачуццём краёвай грамадзянскасці і незалежнае ад падзелу на асобныя этнасы[25]. У грамадска-палітычнай дзейнасці ён імкнуўся да пабудовы "адзінага грамадскага будынку, а не шэрагу этнічных хатаў"[26]. Падмуркам гэтага адзінага краёвага будынку аўтар дзённіка лічыў дэмакратычны лад жыцця. На яго думку, толькі ў гэтым выпадку будуць створаныя адпаведныя ўмовы для ажыццяўлення патрабаванняў кожнага этнасу краю. Гэтае разуменне краёвасці істотна адрознівалася ад таго, якога прытрымліваліся яго калегі па групоўцы краёўцаў ліберальна-дэмакратычнай плыні. Напрыклад, Людвік Абрамовіч разумеў краёвае грамадства як свайго роду канфедэрацыю самастойных і роўных этнічных супольнасцяў, кожная з якіх мела поўнае права на ўласнае нацыянальна-культурнае развіццё. Пры такім разуменні галоўным у краёвасці станавілася магчымасць абароны інтарэсаў уласнай этнічнай супольнасці. Падобным чынам разумелі краёвую ідэю беларускія дзеячы (браты Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Іван Краскоўскі) – сябры масонскіх арганізацый. Адпаведна можна было весці гаворку пра польскіх і беларускіх краёўцаў. Аднак існаванне апошніх стала відавочным толькі пасля з'яўлення такіх органаў друку як "Вечерняя газета" (1911) і "Кур'ер краёвы" (1912).

---

[24] Тамсама. – Т. 4. – S. 403. Запіс ад 3 (16). 03.1915 г.
[25] Тамсама. – Т. 2. – S. 252. Запіс ад 24.04. (7.05). 1912 г.
[26] Тамсама. – Т. 2. – S. 89. Запіс ад 13 (26). 11. 1911 г.

Між тым у 1913 г. "Вялікі ўсход народаў Расіі" аб'ядноўваў ужо каля 40 ложаў[27]. Сярод іх былі дзве віленскія і адна менская. У 1911 г. з "Еднасці" вылучылася ложа "Літва", якую ўзначаліў Міхал Ромэр. На момант падзелу ў склад "Еднасці" ўваходзілі Ежы Ром як Вялебны (Venerable), Людвік Чаркоўскі, Іван ды Антон Луцкевічы, Эльяш Ром, дзеячы польскага руху Вітальд Абрамовіч, Браніслаў Крыжаноўскі і Зыгмунт Нагродскі, Іван Прозараў як прадстаўнік рускай грамадскасці, беларускі палітык Іван Краскоўскі*, Майсей Брамсон, Ян Багушэўскі, а таксама дзеячы літоўскага руху Міколас Сляжэвічус і Міколас Біржышка[28].

У ложу "Літва" апроч Вялебнага М.Ромэра ўвайшлі таксама Б.Крыжаноўскі, З.Нагродскі, М.Сляжэвічус, І.Прозараў, І.Краскоўскі, А.Луцкевіч, Э.Ром і М.Брамсон. Пазней у ложу былі прынятыя дзеячы літоўскага руху Вацловас Біржышка, Вацловас Бельскіс, Пеліксас Бугайлішкіс, Андрус Булёта, Юргіс Шаўлюс, Ёнас Вілейшыс, публіцыстка Феліцыя Барткевічэне-Повіцкайтэ**, прадстаўнікі віленскай польскай грамадскасці Казімір Астахевіч, Эдвард Сакалоўскі і Уладзіслаў Асмалоўскі, а таксама беларускі дзеяч Вацлаў Ластоўскі (1912). Апроч іх з ложы "Еднасць" перайшлі ў "Літву" А.Заштаўт і М.Біржышка[29].

Людвік Хас сцвердзіў прыналежнасць да ложы "Літва" яшчэ аднаго беларускага палітыка Дамініка Семашкі[30]. Аднак М.Ромэр не згадаў яго імя ў сваім дзённіку. Тое ж самае датычыць Тадэвуша Урублеўскага. Л.Хас назваў яго сярод "братоў" "Літвы"[31]. Прыналежнасць віленскага адваката да масонства пацвердзіў Браніслаў Тарашкевіч на старонках аўтабіяграфіі, напісанай у 1933 г.[32] Аднак сведчанні М.Ромэра абвяргаюць тэзіс пра ўдзел Т.Урублеўскага ў "братэрстве". Магчыма чуткі пра масонства Т.Урублеўскага, якія распаўсюдзіліся ў Вільні з часоў адраджэння ім Таварыства шубраўцаў, увялі ў зман беларускага дзеяча і польскага даследчыка. Нельга пагадзіцца і са сцвярджэннем Паўліны Мядзёлкі пра дачыненне да ложаў пачатку XX ст. Браніслава Тарашкевіча[33]. Матэрыялы дзённіка таксама не дазваляюць прыняць

---

[27] Hass L. Rosyjskie wolnomularstwo... – S. 166.

* Польскі даследчык Збігнеў Соляк лічыў І.Краскоўскага прадстаўніком рускай грамадскасці (Solak Z. Michał Römer i masoneria wileńska (1911-1915) // Lietuvių Atgimimo istorijos studijos. – 1996. – T. 13. – S. 36). Да рускіх адносіў І.Краскоўскага ў 1911 г. і М.Ромэр (Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 2. – S. 82. Запіс ад 6 (19). 11. 1911 г.). Цалкам верагодна, што І.Краскоўскі ў гэты час належаў да той катэгорыі дзеячоў нацыянальна-культурнага паўзмежжа, якія яшчэ ваганіся ў нацыянальным самавызначэнні.

[28] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 4. – S. 404. Запіс ад 4(17).03.1915 г.

** Гэта была адзіная жанчына ў ложах Беларусі і Літвы.

[29] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 4. – S. 404. Запіс ад 4(17).03.1915 г.

[30] Hass L. Masoneria Polska XX w. Losy, loży, ludzi. – S. 293.

[31] Тамсама. S. 303.

[32] Аўтабіяграфія Браніслава Адамавіча Тарашкевіча // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 116.

[33] Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця // Полымя. – 1993 – № 2. – С. 187.

меркаванне М.Сташкевіча, нібыта, кіруючая роля ў ложы "Літва" належала Вацлаву Ластоўскаму[34]. Масонская дзейнасць апошняга не была прыкметнай.

Актыўная грамадска-палітычная і культурная дзейнасць сяброў віленскіх ложаў спрыяла пашырэнню краёвай ідэі ў яе ліберальна-дэмакратычнай форме. Амаль усе яны былі аўтарытэтнымі дзеячамі розных нацыянальных рухаў і мелі магчымасць уплываць на іх ідэалогію, асабліва ў галіне міжнацыянальных адносінаў. Гэта адлюстравалася ў шматлікіх публікацыях вольных муляраў на старонках такіх віленскіх выданняў, як *Наша Ніва*, *Lietuvos žinios*, *Lietuvos ukininkas*, *Przegląd Wileński*, *Kurier Krajowy* і *Вечерняя газета*. Краёўцы-масоны ўваходзілі ў склад кіраўніцтва многіх культурных таварыстваў і гаспадарчых арганізацый, дзейнасць якіх выходзіла далёка за межы Віленшчыны. Варта назваць Таварыства сяброў навук у Вільне, Артыстычнае таварыства, Віленскае таварыства падтрымкі хатняга рамяства і народнага мастацтва, Таварыства падтрымкі кааперацыі ды інш.

М.Ромэр пазней адзначаў: "Як уласна масонская арганізацыя мы не дзейнічаем, але ў многіх справах менавіта сярод нас выпрацоўваюцца дырэктывы і нараджаюцца ініцыятывы. Нашыя ложы маюць вялікі ўплыў на ўмацаванне ў свядомасці братоў краёвай пазіцыі"[35]. На думку гісторыка Збігнева Соляка, менавіта на масонскіх паседжаннях было прынятае рашэнне пра высоўванне кандыдатуры Браніслава Крыжаноўскага на выбарах у IV Думу[36]. Ложы прычыніліся таксама да выдання *Пшэглёнда віленьскага* і *Кур'ера краёвага*, які стаў штодзённай польскамоўнай газетай краёвага і дэмакратычнага накірунку. Дарэчы, гісторыя арганізацыі абедзьвюх газетаў паказала адсутнасць адзінства ў асяроддзі краёўцаў. Рознае разуменне краёвасці і нацыянальных інтарэсаў стала падмуркам таго крызісу, які напаткаў віленскае масонства ў 1913 г.

Асобна трэба адзначыць актыўнасць беларускіх дзеячоў, а менавіта Антона ды Івана Луцкевічаў у прапагандзе краёвай ідэі. Верагодна, беларусы спадзяваліся, што яе пашырэнне ўзмоцніць сацыяльную базу беларускага руху і паспрыяе яго падтрымцы дэмакратычнымі элементамі іншых рухаў. Якраз таму яны і распачалі выданне польскамоўнага *Кур'ера краёвага* (1912). Пры гэтым удзел беларусаў у выданні заставаўся таямніцай для віленскай грамадскасці. На падобных пазіцыях знаходзілася рускамоўная *Вячэрняя газета*, выданнем якой таксама кіравалі беларусы.

Увесну 1913 г. у Вільні з'явіліся прадстаўнікі варшаўскіх масонаў Станіслаў Патэк і Вацлаў Макоўскі. Як ужо адзначалася, варшаўская ложа "Выз-

[34] Сташкевіч М. Гістарычны выбар... – С. 107.

[35] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т.4. – S. 404. Запіс ад 4 (17). 03. 1915 г.

[36] Solak Z. Michał Römer i masoneria wileńska (1911-1915) // Lietuvių Atgimimo istorijos studijos. – Vilnius, 1996. – S. 39.

валенне" была створаная яшчэ ў 1910 г. і належала да "Вялікага ўсхода Францыі". Яна не залежыла ад расейскіх цэнтраў і з'яўлялася "рэгулярнай" масонскай арганізацыяй. Прыезд варшаўскіх місіянераў справакаваў крызіс у асяроддзі віленскага масонства. Вітальд Абрамовіч, Бранiслаў Крыжаноўскі, Ян Пілсудскі, Зыгмунт Нагродскі і Станіслаў Будны выйшлі са склада "Еднасці" і "Літвы" і ўтварылі польскую масонскую ложу, арганізацыйна звязаную з Варшавай. Даследчык Людвік Хайн лічыць, што яна мела назву "Верны ліцьвін" ("Wierny litwin")[37].


Браты Антон і Іван Луцкевічы і Аляксандр Уласаў. Фотаздымак. Пачатак XX ст.

Раскол у асяроддзі віленскага масонства верагодна быў звязаны яшчэ і з тым, што вышэйназваныя "браты" адмовіліся ад аўтанамісцкай канцэпцыі гістарычнай Літвы і сталі прыхільнікамі яе незалежнасці, якая лічылася магчымай толькі ў саюзе з Польшчай. Варшаўскія вольныя муляры прытрымлівался незалежніцкай арыентацыі. Менавіта гэтую пазіцыю адстойвала штодзённая віленская газета *Наш край* (*Nasz Kraj*) (рэдактар Бенедыкт Хэрц), якая, паводле М.Ромэра, выдавалася сябрамі ложы "Верны ліцьвін"[38]. Пад час расейскага наступлення ў Галіцыі аўтары артыкулаў, у прыватнасці, выказвалі занепакоенасць лёсам мясцовай польскай дыяспары, якая, як вядома, пры аўстра-венгерскіх уладах мела выдатныя магчымасці для развіцця ўласнай культуры[39].

Пэўную ролю адыграла і тое, што паступова ўзніклі складанасці ў адносінах віленскіх ложаў з масонамі з Масквы і Пецярбурга. На думку З.Соляка, пагаршэнне адносінаў адчувалася ўжо на масонскім канвенце, які адбыўся ў студзені 1913 г. "Вялікі ўсход народаў Расеі" павінен быў прапагандаваць ідэю свабоднай федэрацыі ўсіх народаў імперыі. Аднак на самой справе было відавочным імкненне маскоўска-пецярбургскага кіраўніцтва навязаць ложам вялікадзяржаўную пазіцыю[40]. Магчыма на паводзіны "раскольнікаў" паўплывалі таксама вынікі выбараў у Дзяржаўную думу, якія абярнуліся сапраўдным

[37] Chajn L. Polskie wolnomularstwo 1920-1938. – Warszawa 1984. – S. 105.
[38] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 28. – S. 138. Запіс ад 17. 11. 1920 г.
[39] Sawicki J. "Przegląd Wileński" w latach 1911-1915 (część I) // Zapiski Historyczne. – T. LIX. – Rok 1994. – Zeszyt 4. – S. 52-53.
[40] Solak Z. Michał Römer ... – S. 40.

правалам для краёўцаў прыхільнікаў аўтаноміі. Дзённікавыя запісы Міхала Ромэра засведчылі таксама расчараванне часткі польскіх краёўцаў вынікамі супрацоўніцтва з дэмакратычнымі элементамі іншых народаў краю. Менавіта пра гэта ішла гаворка на сходзе 11 траўня 1913 г. на кватэры З.Нагродскага. Апроч названых "раскольнікаў" у размове ўдзельнічаў А.Заштаўт, які адзін быў супраць выхаду з віленскіх ложаў[41].

На дзейнасць віленскіх масонаў моцны ўплыў аказала першая сусветная вайна. Рост вялікадзяржаўных шавіністычных настрояў адбіўся на пазіцыі кіраўніцтва "Вялікага ўсхода народаў Расеі". Вольныя муляры з Вільні выразна адчулі гэта падчас кастрычніцкага (1914 г.) канвента ў Петраградзе. У працы канвента ўдзельнічала болей за 30 дэлегатаў з усёй Расеі. Па сваіх палітычных сімпатыях яны належалі да партый і арганізацый, якія прадстаўлялі расейскі палітычны "спектр" у дыяпазоне ад канстытуцыйных дэмакратаў да "трудавікоў". На канвенце прысутнічалі А.Луцкевіч і М.Ромэр. Разам з прадстаўнікамі Украіны яны ўтварылі пяціасабовую групу, якая пры абмеркаванні адносінаў да вайны выказалася за нейтральнае стаўленне да яе і за актывізацыю рэвалюцыйных дзеянняў, нават калі яны прывядуць да ваеннага паражэння і распаду дзяржавы. Большасць прысутных рэзка крытыкавала пазіцыю групы. Падаўляючай большасцю галасоў была прынятая рэзалюцыя за перамогу дзяржаваў Антанты. Дэлегаты з'езда таксама не прынялі прапанаванай А.Луцкевічам і М.Ромэрам рэзалюцыі аб прызнанні прынцыпа аўтаноміі Літвы і Беларусі і ўключэнні яго ў праграму расейскага вызваленчага руху[42]. Міхал Ромэр пазней адзначыў "выразныя імперыялістычныя настроі сярод рускіх братоў" і "дзяржаўныя амбіцыі ў расейскім масонстве"[43]. Гэты "імперыялістычны" настрой цалкам падзяляў трэці прадстаўнік віленскіх муляраў Цэмах Шабад[44].

Дыскусіі падчас канвента ды іншыя кантакты з расейскімі масонамі выразна паказалі ўсю падманлівасць ранейшых запэўненняў кіраўнікоў "Вялікага ўсхода народаў Расеі" ў магчымасць свабоднага (аўтаномнага) развіцця Беларуска-Літоўскага краю ў выпадку іх прыхода да ўлады. Віленскія масоны пачалі задумвацца пра неабходнасць утварэння ўласнай масонскай арганізацыі, якая б ахоплівала ўсе землі былога Вялікага Княства Літоўскага. Дзеля гэтага трэба было стварыць у Беларусі і Літве сем ложаў.

Актывізавалася арганізацыйная дзейнасць. Нарэшце быў пераадолены крызіс 1913 г. У склад ложаў былі прынятыя новыя сябры – Ёнас Вілейшыс, Уладзіслаў Асмалоўскі (у 1908 г. ён быў адным з заснавальнікаў беларускага

[41] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 3. – S. 136. Запіс ад 13 (26). 05. 1913 г.

[42] Тамсама. – Т. 4. – S. 300. Запіс ад 20. 11 (3.12). 1914 г.; тамсама. – S. 301. Запіс ад 21. 11 (4.12). 1914 г.

[43] Тамсама. – Т. 4. –S. 404. Запіс ад 4 (17). 03. 1915 г.

[44] Solak Z. Michał Römer ... – S. 243.

выдавецтва "Наша Хата"[45]), Феліцыя Барткевічэне-Повіцкайтэ, Андрус Булёта, Казімір Астахевіч[46]. Малюнкі і запісы (у т.л. шыфраваныя) у дзённіку М.Ромэра сведчаць, што ў кастрычніку 1914 г. у Вільні з'явілася яшчэ адна ложа – "Беларусь"[47]. Да яе належалі А.Луцкевіч, А.Булёта, П.Бугайлішкіс, М.Біржышка, А.Заштаўт і К.Астахевіч. Паседжанні "Беларусі" адбываліся разам з "Літвой".

Яшчэ адна ложа была заснаваная напачатку вайны ў Віцебску. Аднак наўрад ці віленскія масоны мелі непасрэднае дачыненне да гэтага. Паводле інфармацыі расейскага пісьменіка і філосафа Дзмітрыя Галкоўскага, змешчанай на яго сайце ў *Internet*, заснавальнікам ложы быў вядомы дзеяч Партыі Народнай свабоды дэпутат III Думы Аляксандр Калюбакін. Паводле той самай крыніцы, пры заснаванні ложы ў "братэрства" былі прынятыя Рыгор Брук, Аляксей Валковіч, Сяргей Пісарэўскі, Вітольд Бамас і Вячаслаў Федаровіч. Падчас прыезду ў Віцебск Аляксандра Керанскага[48] (1915 або 1916 г.) у ложу ўступіў Беніамін Гурэвіч. Восьмым сябром быў Аляксандр Цэйтлін. Віцебскія масоны таксама прадстаўлялі мясцовую інтэлігенцыю і прытрымлівалася ліберальна-дэмакратычных поглядаў. В.Брачаў сярод сяброў віцебскай ложы назваў Марка Шагала, які прыцягнуў у ложу таксама Р.Арансона[49]. Упершыню пра гэта пісала яшчэ Ніна Берберава[50].

Пэўныя біяграфічныя звесткі пра віцебскіх масонаў можна знайсці ў энцыклапедычным слоўніку А.Сяркова *Рускае масонства. 1731 – 2000*. Паводле слоўніка, В.Бамас (Бомас, Вомас) быў польскім прагрэсістам, які падтрымліваў кантакты з сацыялістамі. У 1911 – 1912 гг. ён працаваў прысяжным паверанным у Віцебску[51]. Падобныя палітычныя погляды меў іншы прадстаўнік мясцовай польскай грамадскасці В.Федаровіч[52]. Рыгор (Гірша) Брук – равін, доктар медыцыны, дэпутат I Дзяржаўнай думы (фракцыя кадэтаў), рэдактар газеты "Витебская жизнь"[53]. Б.Гурэвіч у 1905 г. належаў да БУНДа, пазней выйшаў

---

45 Беларускі Дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛіМ). Ф. 3, воп. 1, ад.з. 100. Арк. 32.

46 АР ЦБАНЛ. Дзённік М.Ромэра. – Т. 4. – S. 404. Запіс ад 4. (17). 03. 1915 г.

47 Тамсама. – Т. 4. – S. 257. Запіс ад 8. (21). 10. 1914 г.; тамсама. – S. 259. Запіс ад 10 (23). 10. 1914 г.

48 Аляксандр Керанскі (1881-1970) – адвакат, дэпутат Дзяржаўнай думы, міністр юстыцыі ў Часовым урадзе, ваенны міністр, старшыня Часовага ўраду, Вярхоўны Галоўнакамандуючы. Ініцыяваны ў 1912 г. у ложы "Малая Мядзведзіца". У 1916 г. быў абраны Генеральным сакратаром Вярхоўнай рады Вялікага ўсходу народаў Расеі.

49 Брачев В.С. Русское масонство XX в. – С. 71. (Рыгор Арансон (пам. 1968) – меншавік, аўтар мемуараў, гісторык, публіцыст).

50 Берберова Н. Люди и ложи. Русские масоны XX столетия. – М., 1997. – Биографический словарь.

51 Серков А. Русское масонство... – С. 84.

52 Тамсама. – С. 830.

53 Тамсама. – С. 142.

з партыі і ўзначальваў Віцебскую агульнагарадскую шпітальную касу[54]. С.Пісарэўскі ў 1916 г. выехаў у Петраград, дзе працаваў памочнікам прысяжнага паверанага. Пасля лютага 1917 г. быў сакратаром калегіі губкома ў Віцебску[55]. А.Валковіч да 1906 г. займаў пасаду віцебскага гарадскога галавы, таксама быў дэпутатам I Думы ад Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі[56]. А.Цэйтлін быў вядомым мастаком, які вучыўся ў Акадэміі мастацтваў у Вене і Парыжы. Пасля пераезду ў Віцебск (1911 г.) працаваў у Мастацкай народнай школе[57].

Напрыканцы 1914 г. на беларускіх і літоўскіх землях існавала шэсць ложаў. Аднак наўрад ці віцебскія "браты" імкнуліся адарвацца ад цэнтраў расейскага масонства. Гісторыя стварэння ложы ў Віцебску і сувязі мясцовых масонаў (у прыватнасці, візіт А.Керанскага) дазваляюць выказаць меркаванне пра адсутнасць імкнення да самастойнасці. Невядомай застаецца пазіцыя ложы ў Менску. Што датычыць ложы "Верны ліцьвін", то яна была непарыўна звязана з варшаўскім масонствам і практычна не мела ніякіх адносінаў з іншымі ложамі ў Вільні. Такім чынам, з фармальнага пункту погляду не існавала падставы для арганізацыйнага разрыва віленскіх ложаў з "Вялікім усходам народаў Расеі". Тым не менш розніца ў поглядах на будучыню Беларусі і Літвы непазбежна вяла да гэтага.

Апошнім актам супрацоўніцтва быў удзел дэлегатаў Вільні (Андруса Булёты і Аляксандра Заштаўта) у масонскім канвенце ў Петраградзе ў траўні 1915 г.[58] 17 траўня 1915 г. М.Ромэр запісаў у Дзённіку: "На 24 і 25 траўня па старому стылю прызначаны масонскі канвент у Пецярбургу. У парадку дня канвента і ў прапанаваных праектах рэзалюцый цэнтральныя ўлады Саюза выявілі ўльтракадэцкія тэндэнцыі, падпарадкоўваючы масонскі рух імперыялістычным імкненням расейскага лібералізму. Будзе вострая барацьба <...> Воду на кадэцкі млын ліць не можам і не хочам. Ад нашых двух віленскіх ложаў – ад "Літвы" і "Белай Русі" – накіроўваем Булёта і Заштаўта. Гэта два тараны радыкалізму для штурма кадэцкіх акопаў. Каго накіруе трэцяя віленская ложа не ведаем"[59].

Ваенныя падзеі і іх палітычныя наступствы ўнеслі свае карэктывы ў погляды віленскіх масонаў. У канцы 1914 – пачатку 1915 г. пачаліся першыя сур'ёзныя непаразуменні. Адно з іх набыло характар "літоўска-беларускага канфлікта". Аўтанамісцкая канцэпцыя дзеячоў літоўскага руху грунтавалася на пастанове Вялікага Сейма (Вільня, 1905 г.). Яны дамагаліся аўтаноміі для этнаграфічнай Літвы са сталіцай у Вільні і з далучэннем да яе г.зв. "прылег-

[54] Тамсама. – С. 283.
[55] Тамсама. – С. 644.
[56] Тамсама. – С. 193.
[57] Тамсама. – С. 861.
[58] Solak Z. Michal Römer ... – S. 42.
[59] АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 6. – S. 26. Запіс ад 17 (30). 05. 1915 г.

лых тэрыторый". Пад апошнімі звычайна разумеліся землі, населеныя пераважна беларусамі-каталікамі (частка Віленскай і Гарадзенскай губ.).

Зразумела, што дзеячы беларускага руху не маглі пагадзіцца з гэтай канцэпцыяй. Яны лічылі Вільню сталіцай усяго краю, усёй гістарычнай Літвы. Далучэнне "прылеглых тэрыторый" да аўтаномнай этнаграфічнай Літвы разглядалася імі як літоўская экспансія. Страта гэтых земляў магла прывесці да поўнага заняпаду беларускага руху, бо Усходняя Беларусь адна не мела шанцаў супрацьстаяць працэсу русіфікацыі. Зрэшты, прэтэнзіі на каталіцкія беларускія тэрыторыі прад'яўлялі і польскія палітыкі, якія, як заўважыў М.Ромэр, "карыстаючыся з адсутнасці ў беларусаў нацыянальнай свядомасці і атаясамлівання ў народзе паняцця каталіцызму і польскасці, альбо лічаць беларусаў-каталікоў палякамі, альбо вераць у іх хуткую паланізацыю і дзейнічаюць у гэтым накірунку"[60]. М.Ромэр надаваў вялізарнае значэнне беларускаму фактару: "Беларусы з'яўляюцца абавязковым элементам федэратыўнай Рэчы Паспалітай. Іх упадак разам з перамогай польскай і літоўскай этнаграфічных канцэпцый – гэта смерць ідэі Рэчы Паспалітай, якая павінна абапірацца на прынцыпы свабоды і федэрацыі"[61]. Аднак нават супольная праца ў масонскіх ложах не паспрыяла дасягненню міжнацыянальнага паразумення адносна будучыні краю.

У траўні 1915 г. М.Ромер пакінуў Вільню. Ён перайшоў лінію фронта, каб далучыцца да легіёнаў Юзафа Пілсудскага. Ягоны ад'езд, а таксама эвакуацыя з горада многіх "братоў", нанеслі моцны ўдар па дзейнасці віленскіх масонаў. Хоць цалкам яна не перапынілася. Спрабаваў выратаваць сітуацыю Юргіс Шаўлюс. Па яго ініцыятыве рэшткі трох віленскіх ложаў аб'ядналіся ў новую самастойную арганізацыю "Вялікі ўсход Літвы" ("Вялікі ўсход Літвы і Беларусі")[62]. Аналіз гістарычнай літаратуры і матэрыялаў дзённіка М.Ромэра дазваляе сцвярджаць, што сябрамі гэтай ложы хутчэй за ўсё з'яўляліся Ю.Шаўлюс (кіраўнік), Ё.Вілейшыс, К.Астахевіч, У.Асмалоўскі*, браты Луцкевічы, Е.Ром, М.Брамсон ды інш.

Менавіта гэтая ложа адыграла галоўную ролю ў стварэнні Часовай рады Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага і з'яўленні дакументаў, якія ў пэўным сэнсе можна лічыць "лебядзінай песняй" краёвасці. 19 снежня 1915 г. на беларускай, польскай, літоўскай і яўрэйскай мовах быў апублікаваны Універсал Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага. Дакумент паведамляў пра

[60] Тамсама. – Т. 4. – S. 299. Запіс ад 19. 11 (2.12). 1914 г.

[61] Тамсама. – Т. 4. – S. 300. Запіс ад 20.11 (3.12). 1914 г.

[62] Sawicki J. Z dziejów "Wielkiego Wschodu Litwy" // Przegląd Wschodni. – T. IV. – Z. 2 (14). – S. 444.

* У.Асмалоўскі быў захавальнікам масонскіх архіваў. Як засведчыў М.Ромэр, перад ад'ездам у Расею ён схаваў гэтыя архівы ў Вільні (АР ЦБАНЛ. Дзённік Міхала Ромэра. – Т. 27. – S. 135. Запіс ад 28. 07. 1920 г.). Лёс архіваў невядомы.

стварэнне літоўска-беларуска-польска-яўрэйскай Часовай рады Канфедэрацыі ВКЛ, якая будзе імкнуцца, каб "Літоўскія і Беларускія землі, якія здаўна прыналежалі да Вялікага Князьства Літоўскага, а цяпер апанаваны Нямецкімі войскамі, станавілі пры новых варунках гісторычных нераздзельнае цела на фундаменці незалежнасьці Літвы і Беларусі, як суцэльнай дзяржавы, засьцерагаючы усім нацыям у яе межах усе правы". Універсал канчаўся заклікам да "усіх нацый, да усіх станаў, да усіх істнуючых арганізацый і да усіх грамадзян Краю" далучыцца да Канфедэрацыі[63] (гл. *Дадатак*).

У лютым 1916 г. Універсал быў дапоўнены зваротам, у якім канкрэтызавалася мэта Канфедэрацыі. Новая міжнацыянальная арганізацыя заяўляла пра шкоднасць усіх надзеяў на Расею: "Больш чым стогадовае супольнае жыццё нашае з Расеяй найлепей паказала, што гэтае гасударства хоча з намі зрабіць. Праз увесь час супольнага з намі жыцця яно плянава і сістэматычна кіравалася да таго, каб сцерці ўсе адзнакі нашай самачыннасьці". Канфедэрацыя ВКЛ звязвала свой лёс з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй: "Мы верым, што пасля пабеды срэдне-еўрапэйскіх гасударств быўшыя заходнія правінцыі Расеі, а перш за ўсё землі польскія, літоўска-беларускія і надбальтыцкія павінны будуць адпасьць ад Расеі і стварыць гасударственыя адзінкі ў такой або сякой камбінацыі з срэдне-еўрапэйскімі гасударствамі, а пры гэтым былі бы <...> запэўнены варункі самачыннага развіцьця іх сацыяльна-культурнага і палітычнага жыцьця". Варта адзначыць, што праблема ўзаемаадносінаў Літвы і Польшчы ў дакументах Канфедэрацыі абміналася. Магчыма ініцыятары адраджэння ВКЛ у новай дзяржаўнай форме свядома абміналі гэтую праблему, бо яе абмеркаванне магло толькі абвастрыць польска-літоўска-беларускія адносіны.

Рада Канфедэрацыі сваімі галоўнымі задачамі абвяшчала ўтварэнне на літоўска-беларускіх землях незалежнай дзяржавы з сеймам у Вільні, абраным на падставе ўсеагульных, роўных, прамых і тайных выбараў, і з гарантыяй поўных правоў усім народам краю. Тэрыторыя незалежнай дзяржавы павінна была ўключаць, па меншай меры, Ковенскую і Віленскую губ., беларускую і літоўскую часткі Гарадзенскай і Сувалкскай, літоўскія часткі Курляндскай і частку Менскай губ, "каторая звязана з Віленскім цэнтрам". Форму дзяржаўнага ладу і Канстытуцыю "будучай вольнай літоўска-беларускай гасударственнай адзінкі" павінен быў вызначыць і зацвердзіць сейм у Вільні. У заключэнне зварот заклікаў да сумеснай працы дзеля будучыні Краю: "Кіньма сваркі і звадкі, ад каторых церпіць увесь Край. Падумайма разам ды шчыра аб долі гэтага Краю, бо ж усе мы, апрача жмені прыблуд, сыны нашай зямлі – нашай Літвы і Беларусі"[64].

---

[63] Літоўскі Дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). Ф. 1135, воп. 24, ад.з. 7. Арк. 153 (Пры цытаванні захаваныя моўныя асаблівасці арыгіналу).

[64] ЛДГА. Ф. 1135, воп. 23, ад.з. 7. Арк. 153.

Ізноў трэба адзначыць прыкметную ролю беларускіх палітыкаў у стварэнні Часовай рады і выданні азначаных дакументаў. Юльяна Вітан-Дубейкаўская лічыла Івана Луцкевіча галоўным ініцыятарам з'яўлення Універсала і Звароту[65]. Напрыканцы 20-х г. XX ст. Антон Луцкевіч прызнаваў, што менавіта беларускія дзеячы "стварылі "Канфедэрацыю Вялікага Князьства Літоўскага", аб'яднаўшы на грунце ідэі незалежнасці краю лепшых прадстаўнікоў дэмакратыі ўсіх чатырох нацыянальнасцяў: беларусаў, ліцьвінаў, жыдоў і палякаў"[66].

Аднак досыць хутка Часовая Рада распалася, а ложа "заснула". Галоўнай прычынай былі этнічныя супярэчнасці, якія яшчэ больш абвастрыліся ва ўмовах германскай акупацыі. Гісторык з Таронта Зяновіуш Панарскі звярнуў увагу на інфармацыю яўрэйскага палітыка Цэмаха Шабада пра адмову яўрэйскіх дзеячоў падпісаць лютаўскі (1916 г.) Зварот Рады па прычыне ягоных нібыта "сепаратысцкіх тэндэнцый"[67]. Г.Візнэр паведаміў пра праект Найвышэйшага Літоўскага камітэта, які быў прыняты 6 студзеня 1916 г. і прадугледжваў адраджэнне ВКЛ як літоўска-латышскай дзяржавы з магчымым далучэннем Беларусі[68]. Гэты праект, безумоўна, складаў канкурэнцыю Канфедэрацыі ВКЛ. Таксама трэба адзначыць утварэнне напрыканцы 1915 г. у Вільні Польскага камітэту, у якім былі прадстаўленыя амаль усе накірункі польскага руху ў гістарычнай Літве. Палітычная праграма гэтага Камітэту пачаткова грунтавалася на ідэі федэрацыі Літвы і Польшчы.

З.Панарскі лічыць, што шматэтнічная грамадскасць Віленшчыны была не падрыхтаваная да ідэі адраджэння ВКЛ у форме Канфедэрацыі. "Палякі, – сцвярджаў даследчык, – глядзелі ў накірунку Варшавы, з якой імкнуліся звязаць свой лёс у форме аўтаноміі або федэрацыі <...> Літоўцы толькі напачатку былі прыхільныя гэтай ідэі. Пазней, апасаючыся польскага дамінавання, зрабілі стаўку на Берлін, з якім спадзяваліся звязаць лёс этнаграфічнай Літвы са сталіцай у Вільні. Яўрэі не былі падрыхтаваныя да суіснавання з народамі гістарычнай Літвы. Яны паглядвалі на Маскву. Расейскі рынак маніў іх. Толькі беларусы спадзяваліся на ўтварэнне адзінай дзяржавы з літоўцамі, якія паступова аддаляліся ад іх"[69]. Беларусы сапраўды вельмі доўга захоўвалі прыхільнасць да канцэпцыі агульнай дзяржаўнасці земляў і народаў гістарычнай Літвы. Ю.Вітан-Дубейкаўская згадвала, што яшчэ летам 1916 г. І.Луцкевіч менавіта на гэтую тэму спрабаваў весці перамовы з дзеячамі розных рухаў[70].

---

[65] Вітан-Дубейкаўская Ю. Мае ўспаміны. – Вільня, 1994. – С. 45.

[66] Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў (1903-1928). Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, Беларуская Сацыялістычная Грамада. – Мн., 1991. – С. 46.

[67] Ponarski Z. Konfederacja Wielkiego Księstwa Litewskiego 1915-1916 // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1998. – Nr 10. – S. 65.

[68] Wisner H. Wojna nie wojna: Szkice z przeszłości polsko-litewskiej. – Warszawa, 1978. – S. 89.

[69] Ponarski Z. Konfederacja Wielkiego Księstwa Litewskiego... – S. 65.

[70] Вітан-Дубейкаўская Ю. Мае ўспаміны. – С. 66.

Варта таксама спецыяльна спыніцца на праблеме ўдзелу яўрэяў у руху вольных муляраў у Беларусі і Літве. Стэрэатыпы "жыдамасонскай змовы", створаныя калісьці расейскімі вялікадзяржаўнымі шавіністамі і чарнасоценцамі, дэманструюць сваю жывучасць і напачатку XXI ст. Між тым яўрэйскі ўдзел у ложах вольных муляраў на беларускіх і літоўскіх землях напачатку XX ст. трэба прызнаць неістотным. Безумоўна, асобныя прадстаўнікі яўрэйскай грамадскасці адыгралі значную ролю ў адраджэнні віленскага масонства. У першую чаргу, гэта датычыць ужо згаданых братоў Ромаў. Больш складана выказаць пэўнае меркаванне пра яўрэйскі ўдзел у працы віцебскай ложы. Сярод менскіх "братоў" яўрэяў, мажліва, не было наогул. Варта яшчэ раз звярнуць увагу на тую характарыстыку, якую М.Ромэр даў на старонках свайго дзённіка Эльяшу Рому. Падкрэсленая выключнасць асобы апошняга толькі адцяняла меркаванне М.Ромэра пра тое, што сярод "сыноў яўрэйскага народу" напачатку XX ст. у Беларусі і Літве было няшмат людзей, якія лічылі Беларуска-Літоўскі край сваёй Радзімай і кіраваліся ягонымі інтарэсамі ў сваёй грамадска-палітычнай дзейнасці.

З устаноўленых 45 вольных муляраў Беларуска-Літоўскага краю толькі дзевяцёра былі яўрэямі. Гэта складала 20% ад усіх вядомых вольных муляраў. Дзеля параўнання заўважым, што палякі складалі прыблізна каля 40%, літоўцы – 22%, рускія – 9% і беларусы – 9%. Пры ўсёй умоўнасці гэтай "арыфметыкі" можна канстатаваць адсутнасць зацікаўленасці яўрэяў Беларуска-Літоўскага краю масонскай дзейнасцю. У першую чаргу гэта датычыць Вільні і Менску. Верагодна, мясцовае вольнае мулярства з ягонай "краёвай арыентацыяй" не было прывабным для большасці яўрэйскай грамадскасці. Яна была настроена пераважна прарасейскі і шукала палітычнага партнёра галоўным чынам сярод расейскіх партый ліберальнай і дэмакратычнай арыентацыі*.

Звяртае на сябе ўвагу актыўны ўдзел у дзейнасці масонскіх ложаў беларускіх палітыкаў. Іх было няшмат, але роля беларусаў не вызначалася іх колькасцю. Браты Луцкевічы і Вацлаў Ластоўскі належалі да кіраўнікоў беларускага нацыянальна-культурнага Адраджэння. Іх масонская праца дазваляе ўзняць праблему ролі краёвай ідэалогіі ў выпрацоўцы беларускай нацыянальнай ідэі ў

* Расейскі даследчык Б.Башылаў у кнізе *Легенда, оказавшаяся правдой*, змешчанай у *Internet* бяздоказна сцвярджае актыўны ўдзел яўрэяў у дзейнасці вольных муляраў Беларусі і Літвы: "И сионизм, и другие еврейские политические течения не только не запрещали, а одобряли пребывание как в "гоевском", так и в чисто еврейском масонстве. И странно было бы, если русские и польские евреи, по примеру своих соплеменников в других странах, не использовали такое мощное тайное средство политической борьбы, как различные виды масонства. И они, конечно, его использовали со свойственным им пылом и активностью. И в ложах Северо-Западного края и в "украинских ложах" в Малороссии, и в Польше, всюду, где были ложи "гоевского масонства" – членами этих лож были и евреи" (www.masonry.ru).

міжрэвалюцыйны перыяд 1907 – 1917 гг. Відавочна, што гэтая ідэалогія актыўна выкарыстоўвалася беларусамі ў мэтах пашырэння сацыяльнай базы беларускага руху. Дзейнасць масонскіх ложаў спрыяла прапагандзе краёвасці.

У заключэнне трэба адзначыць, што масонскія ложы на беларускіх і літоўскіх землях у 1910 – 1916 гг. адыгрывалі прыкметную ролю ў нацыянальна-культурных і грамадска-палітычных працэсах. Найбольш эфектыўнай можна лічыць дзейнасць віленскіх ложаў "Еднасці", "Літвы" і "Беларусі", якія, фактычна, замянілі міжнацыянальную краёвую партыю ліберальна-дэмакратычнага накірунку і ажыццяўлялі каардынацыю ліберальна-дэмакратычных і краёвых элементаў асобных нацыянальных рухаў. У ідэалогіі віленскіх масонаў традыцыйны масонскі гуманізм, пра які пісаў у сваім дзённіку М.Ромэр, існаваў у форме краёвасці ліберальна-дэмакратычнага накірунку. Няма сумненняў, што апошні накірунак дамінаваў таксама ў ідэалогіі менскай ложы. Сябры масонскіх арганізацый пашыралі сярод грамадства ўсведамленне каштоўнасці ідэалаў дэмакратыі. Яны таксама прапагандавалі ідэі этнічнай талеранцыі і супрацьстаялі праявам шавінізму ў палітычным і культурным жыцці.

Знойдзеныя матэрыялы дазваляюць казаць пра пэўную адасобленасць ложаў. Асабліва гэта датычыць віцебскіх масонаў і віленскай польскай ложы "Верны ліцьвін". Тым не менш развіццё падзеяў непазбежна вяло да ўтварэння на беларускіх і літоўскіх землях адзінай масонскай арганізацыі. Аднак ваенныя дзеянні першай сусветнай вайны, якія суправаджаліся ростам міжнацыянальнай напружанасці на тэрыторыі гістарычнай Літвы перашкодзілі завяршэнню гэтага працэса. Між тым падобная арганізацыя з улікам сувязяў з заходнееўрапейскім масонствам магла адыграць не апошнюю ролю ў барацьбе за захаванне тэрытарыяльнага адзінства Беларуска-Літоўскага краю і яго ператварэння ў рэальны суб'ект міжнародных адносінаў напрыканцы і пасля завяршэння першай сусветнай вайны.

Дадатак

## Фрагменты дзённіка Міхала Ромэра*

Фрагмент 1.

21.10 (3.11).1914 г. (Т. 4. С. 270)

[Запіс датычыць масонскага канвенту, які адбываўся ў Санкт-Пецярбургу. Удзельнічала больш 30 чалавек з усёй Расіі. Палітычны спектр быў прадстаўлены досыць шырока – ад кадэтаў да "трудавікоў". Старшыня з'езду – Сцяпанаў, віцэ-старшыня – Васіленка. З рэфератам выступаў М.Някрасаў.

* Тамы дзённіка, фрагменты якіх змешчаны ў *Дадатку*, захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў ЦБАНЛ. Пераклад з польскай мовы Алеся Смаленчука.

Паводле меркавання М.Ромэра, сярод дэпутатаў выявіліся тры накірункі ў адносінах да вайны: I – Абвешчаны нейтралітэт у адносінах да ўраду, а фактычна, падтрымка ўраду, які быццам бы абараняе нацыянальныя інтарэсы. II – Аддзяленне ваеннай сферы ад палітычнай (А.Керанскі). Пры гэтым вайна ўспрымаецца як нацыянальная справа, якая павінна быць даведзена да перамогі, а вось ва ўнутранай палітыцы магчыма барацьба супраць урада. III – Нейтралітэт у адносінах да вайны і перамогі з націскам на рэвалюцыйныя дзеянні, нават калі яны прывядуць да ваеннага паражэння і распаду дзяржавы].

Што датычыць нашай іншаплемяннной групкі (два ўкраінца – Пракаповіч і Яфрэмаў, вільняне – Луцкевіч і я, а таксама адэскі латыш Мужэнак), то з гэтых трох накірункаў мы падтрымлівалі трэці, крытыкуючы два першых, якія вялі да падтрымкі нацыянальна-буржуазнай дзяржаўнасці і імперыялізму <…> Мужэнак ідэалізаваў паражэнне, але не дзеля перамогі ворага, а дзеля аслаблення дзяржаўнасці як неабходнай умовы для рэвалюцыі. Луцкевіч і два ўкраінцы абаранялі пазіцыю нейтральнасці ў адносінах да вайны. Але і яны дапускалі магчымасць паражэння. Хоць толькі дапускалі, а не заклікалі прыспешваць яго. Нашая пазіцыя, пазіцыя іншаплемянных крэсоўцаў, якія абаранялі інтарэсы рэвалюцыі, заставіла задумацца расейскіх удзельнікаў сходу. Яна ім не спадабалася, і большасць рэзка крытыкавала нашую групу <…> Прамовы гучалі як заклік да перамогі на руінах рэвалюцыі. Зрэшты ў кадэтаў рэвалюцыйныя ідэалы ўжо некалькі гадоў (па меньшай меры ад 1907 г.) тонуць у апартунізме. Трымалася яшчэ кадэцкая левіца, але і яна цяпер адмовілася ад рэвалюцыі.

[Сход закончыўся прыняццем рэзалюцыі за перамогу Патройнага Саюза. Супраць прагаласавалі толькі прадстаўнікі “іншаплемянной” групы].

Фрагмент 2.

3 (16) сакавіка 1915 г. (Т. 4. С. 403).

На днях я закончу гэты том майго дзённіка. Потым адвязу яго да Вянзоўца[1] і перадам у рукі Эльвіры на захаванне. Дзённік будзе схаваны здалёк ад усіх аж да майго распараджэння. На выпадак маёй смерці папрашу Эльвіру, не чытаючы, перадаць яго Заштаўту[2]. Заштаўта ж папрашу (лістом у асобным канверце) адвезці гэты том разам з іншымі ў музей Раперсвіля[3] і дэпаніраваць яго там на наступных умовах: 1) дзённік нельга чытаць; 2) праз 50 год пасля маей

[1] Маёнтак паблізу Радашковічаў, якім валодала Эльвіра Мячкоўская, сястра Міхала Ромэра.

[2] Аляксандр Заштаўт (1877-1944) – грамадскі і палітычны дзеяч. Краёвец. Адзін з кіраўнікоў Сацыял-дэмакратычнай партыі Літвы і Беларусі. Удзельнік пахода Люцыяна Жалігоўскага (1920). У 1924-1937 гг. – кіраўнік Незалежнай сацыялістычнай партыі працы.

[3] Раперсвіль – горад у Швейцарыі.

смерці дзённік павінен быць надрукаваны цалкам без скарачэнняў, пропускаў і змяненняў. Перад дэпаніраваннем дзённіка я дазваляю Заштаўту прачытаць яго асабіста або з кім-небудзь, але без права публікацыі.

Гэты сшытак я перадам Эльвіры, недапісаным. Працягваць запісы буду ўжо ў новым. Усё гэта я раблю таму, што ўжо зараз збіраюся распачаць хадайніцтва аб замежным пашпарце. Не хачу пры гэтым мець у Вільні, нават у кватэры Анінкі[4], нічога, што магло б мяне скампраметаваць у выпадку якіх-небудзь паліцыйных акцый або нават мажлівага вобыску. Новы том дзённіка я буду весці так, каб нічым не выдаць уласных незалежніцкіх сімпатый і намераў адносна легіёнаў. Не хачу, каб гэта стала вядомым да таго моманту, пакуль я не апынуся за кардонам. Таму адносна ўласных сімпатый і намераў я накладваю пячатку маўчання на свае вусны і пяро. Але гэта датычыць запісаў ужо наступнага тома. А ў гэтым перад яго заканчэннем я хачу зняць таямніцу з тэмы, пра якую увесь час маўчаў. Перадаючы гэты том у надзейныя рукі і вызначыўшы ягонае дэпазітнае захаванне на працягу 50 гадоў пасля маёй смерці, што, зразумела, зробіць немагчымым яго публікацыю ў гэты час, я магу выказацца і распавесці праўду пра адну таямніцу.

Справа ў тым, што я належу да Вольных муляраў. Паседжанні нашай ложы адбываліся ў тыя дні, у апісанні якіх адразу пад датай быў змешчаны які-небудзь знак. Адразу хачу заўважыць, што шырока распаўсюджана разуменне масонаў як езуітаў наадварот. Магчыма, так яно і ёсць у адносінах да Вольных муляраў дзе-нібудзь у свеце, але ў адносінах да нашага Саюза гэтае разуменне не адпавядае рэчаіснасці. Мы вельмі далекія ад перакanання, што мэта апраўдвае сродкі, што з дапамогай крывадушнасці, хлусні, гвалту ці якога іншага амаральнага сродка можна стварыць што-небудзь трывалае і цудоўнае. Гэта глыбока памылковы погляд быццам Вольныя муляры маюць пэўныя антыграмадскія або антыкультурныя мэты, імкнуцца да панавання і да знішчэння чалавечай культуры, адным з элементаў якой з'яўляецца рэлігія.

Наша задача – не знішчаць, не ламаць, не разбураць, а ствараць і ўдасканальваць. Канешне, я не магу адказваць за Масонства ўсяго свету ва ўсіх яго гістарычных формах. Не сумняваюся, што маглі быць і былі адхіленні і калецтвы творчай ідэі. Былі скажэнні ў накірунку сектанцтва, фармалізма, крывадушнага езуіцтва, нарэшце, бясплённага кар'ерызму клікі, як, было, у прыватнасці, у Францыі. Я распавядаю толькі пра наш Саюз. Нашым падмуркам з'яўляюцца ідэі братэрства, любові і свабоды чалавечага духа. Наша брацтва – гэта Саюз гуманізма ў самым шляхетным і адначасова дзейсным значэнні гэтага слова. Мы імкнемся, каб гэтыя лозунгі не сталі звычайнай фармальнасцю, не ўспрымаліся толькі як нейкі сцяг, не атаясамліваліся з тымі прыгожымі словамі, якія пішуцца на астрожнай браме і не маюць дачынення да рэчаіснасці.

[4] Ганна Вольберг (1891-1914) – сяброўка Міхала Ромэра.

Мы не жадаем і таго, каб гэтыя лозунгі ператварыліся ў сродак гвалту над жывым і творчым чалавечым духам. Мы імкнемся зрабіць іх рэальнасцю сумлення, дзеянняў і адносінаў у чалавечым сужыцці; каб яны пранізалі адносіны як паміж асобнымі людзьмі, так і паміж усялякімі групамі і нацыямі і, нарэшце, сталі здабыткам усяго чалавецтва; каб установы, законы, арганізацыі, уся культура былі напоўнена зместам і сэнсам гэтых лозунгаў. Гэта далёкая мэта, але жывая, да якой мы павінны імкнуцца ў кожнай дробязі жыцця. Унутры ж нашага асяродка, нашых ложаў мы павінны праз любоў і ўзаемадапамогу зрабіць братэрства фактам ужо сённяшняга дня. Вольныя муляры абавязаны мець актыўную жыццёвую пазіцыю, каб пастаянна рэалізоўваць масонскі прынцып гуманізма.

Наш Саюз – не палітычнае аб'яднанне. Нельга яго лічыць і партыяй. Толькі імкненне прытрымлівацца асноўных прынцыпаў чалавечнасці, прымушае нас (асабліва тут, у расейскай дзяржаве) займаць антыўрадавую палітычную пазіцыю. Прычына ў тым, што гэтая дзяржаўная арганізацыя, а па майму меркаванню і сама расейская дзяржаўнасць як канкрэтны гістарычны феномен з'яўляецца найвялікшай перашкодай для рэалізацыі нашых прынцыпаў. Мы не змагаемся супраць палітычных партый, мы нікога не адрываем ад іх. Партыі маюць свае ўласныя задачы, вырашэнне якіх неабходна для прагрэсіўнага развіцця чалавецтва. Калі накірунак і дзейнасць партый не пярэчаць выразна нашым прынцыпам, то нам няма ніякай справы да партыйнай прыналежнасці нашых братоў. Мы называем сябе "братамі", бо ва ўзаемаадносінах паміж сабой такімі і з'яўляемся ці, па меньшай меры, імкнемся быць. Уваходжанне ў нашыя ложы братоў рознай палітычнай арыентацыі нават пажадана, бо стварае магчымасць пэўнай каардынацыі дзейнасці розных партый. Нікога з братоў мы не падвяргаем прымусу, не дапускаем аніякага гвалту над пераканнямі і свабодай сумлення, таму што гэта пярэчыць нашым асноўным прынцыпам. Кожны брат і ў кожны момант можа пакінуць ложу і Саюз. Аднак ён павінен трымацца адной абавязковай ўмовы, а менавіта захоўваць у поўнай таямніцы сам факт існавання Вольных муляраў. Дзеля гэтага дазваляецца нават парушэнне судовай прысягі.

Фрагмент 3.

4 (17) сакавіка 1915 г. (Т. 4. С. 404)

Разлічваў, што маю яшчэ некалькі дзён для заканчэння дзённіка, але абставіны склаліся так, што вымушаны зрабіць апошні запіс ужо сёння. З Вільна да Вянзоўца я прыехаў уначы. Спадзяваўся правесці тут некалькі дзён, закончыць дзённік і пакінуць яго ў Эльвіры напярэдадні ад'езда. Апроч дамовы пра дэпаніраванне дзённіка я павінен быў яшчэ канчаткова дапрацаваць і падпісаць нашую з Эльвірай дамову пра супольнае валоданне Вянзоўцам.

Выехаць з Вянзоўца да Варшавы я планаваў у суботу дарогай на Менск і Берасце, каб у нядзелю прыняць удзел у польска-літоўскіх перагаворах. (Ініцыятарам гэтых перагавораў быў Незалежніцкі Саюз (*Blok Niepodległosciowy*)[5]. Літоўскі бок у перагаворах будзе прадстаўлены толькі партыямі: ад Дэмакратычнай партыі прыедзе Сляжэвіч[6], ад эсдэкаў – Янулайціс[7]. Я быў запрошаны асабіста як знаўца літоўскай сітуацыі. Рашэнне ехаць я прыняў толькі пераканаўшыся, што літоўцы не маюць нічога супраць майго ўдзелу.).

Дабраўшыся да Радашковіч, я даведаўся ад Яські Падольскага[8], які прыехаў за мной на станцыю, што Эльвіры яшчэ няма і невядома, калі яна прыедзе. У Вянзоўцу – адзін Стэфан[9]. Адсутнасць Эльвіры пазбаўляе сэнсу мой прыезд. Я ўсё роўна буду вымушаны прыехаць яшчэ раз. Адправіў тэлеграму Эльвіры ў Рабертаў з пытаннем, калі яна прыедзе. Калі адкажа, што прыедзе заўтра або ў пятніцу, то я паеду ў Вянзовец, калі адкажа, што прыедзе пазней ці не адкажа да 7 гадзіны вечара, то буду вяртацца ў Вільню і ўжо з Вільні паеду ў суботу ў Варшаву. А пакуль сяджу ў карчме Гінзбурга, што пры чыгуначнай станцыі ў Радашковічах, і пішу дзённік. Амаль упэўнены, што звесткі пра заўтрашні прыезд Эльвіры не атрымаю. Але назад у Вільню дзённік я ўжо не павязу. Тут, у карчме як-небудзь яго запакую і перадам Ясю, каб адвез да Вянзоўца, сцярог як зрэнку вока і перадаў Эльвіры пасля яе прыезду.

Хачу дадаць яшчэ некалькі слоў да ўчарашняй інфармацыі пра нашае Вольнае мулярства. Наш Саюз ахоплівае ўсю расейскую дзяржаву. Ён узнік, як здаецца, у 1909 г. як адгалінаванне Вялікага ўсходу Францыі. Ініцыятарамі стварэння гэтай "плантацыі" былі расейскія палітыкі, пераважна кадэты. Ад пачатку свайго існавання Саюз насіў выразны палітычны характар. Узорам для яго з'яўлялася турэцкая арганізацыя вольных муляраў "Еднасць і прагрэс" (усё падкрэслена М.Р. – *А.С.*), што стаяла на чале дзяржаўнага перавароту 1909 г., у якім галоўную ролю адыгралі рэвалюцыйныя афіцэры – змоўшчыкі. Праз 2 ці 3 гады расейскі Саюз вольных муляраў аддзяліўся ад Францыі і стварыў уласны Вялікі ўсход. Пазней на канвенце ў Маскве, калі не памыляюся, у студзені 1913 г. ён змяніў назву – "Вялікі ўсход народаў Расеі". Новая назва падкрэсліла ідэю вольнай федэрацыі народаў. (Не магу сцвярджаць, што рускія браты шчыра прынялі гэтую ідэю, але кірунак нашай дзей-

[5] Незалежніцкі Блок ці аб'яднанне незалежніцкіх арганізацый існаваў са жніўня па лістапад 1914 г. і аб'ядноўваў шэраг партый і арганізацый незалежніцкага накірунку на чале з ППС.

[6] Міколас Сляжэвічус (1882-1939) – палітык. Сябра Літоўскай Дэмакратычнай партыі. Кіраўнік ураду Літвы ў 1918-1919, 1926 гг.

[7] Аўгусцінас Янулайціс (1878-1950) – юрыст, гісторык. Сябра Літоўскай сацыялістычнай народна-дэмакратычнай партыі.

[8] Ян Падольскі – работнік маёнтка Вянзовец.

[9] Стэфан Мячкоўскі – муж Эльвіры.

насці менавіта такі. На апошнім кастрычніцкім канвенце ў Пецярбургу, на які ад нашай ложы быў дэлегаваны я, сярод рускіх братоў выразна адчуваліся імперыялістычныя настроі, а тое, што пераважная большасць рускіх братоў рэкрутуецца з кадэтаў, спрыяе прысутнасці дзяржаўных амбіцый у расейскім масонстве).

У Вільні першая ложа пад назваю "Еднасць" была заснавана ў канцы 1910 г. Я быў прыняты ў склад "Еднасці" ў сакавіку 1911 г. Звычайна, ложа павінна налічваць не менш 7 братоў і не больш 14. Калі набіраецца 14 братоў, ложа дзеліцца напалову і, такім чынам, узнікае яшчэ адна. "Еднасць" вылучыла з свайго складу новую ложу летам 1911 г. У той час у яе ўваходзілі: доктар Ежы Ром[10] (брат Вялебны (Venerable) – кіраўнік ложы, яўрэй), доктар Чаркоўскі[11] (брат Дазорца (Dozorca) і адначасова намеснік Венерабля, паляк, належаў да эндэцкай левіцы, блізкай па сваім сацыяльным поглядам да людоўцаў), Іван Луцкевіч (брат Прамоўца (Orator), захавальнік рытуала і статута, беларус), Эльяш Ром[12] (брат Скарбнік (Skarbnik) і Сакратар, яўрэй, родны брат Венерабля), Вітольд Абрамовіч[13], Браніслаў Крыжаноўскі[14], Зыгмунт Нагродскі[15], я (усе палякі), Прозараў[16] і Краскоўскі[17] (усе рускія), Антон Луцкевіч (беларус), Міхал Сляжэвіч, Міхал Біржышка[18] (літоўцы); ледзь не забыўся назваць імя яшчэ аднаго паляка – доктара Багушэўскага[19] і яўрэя Брамсона[20]. На самым пачатку ў ложу быў прыняты і літовец Данат Маліноўскі[21]. Ён быў у першай "сямёрцы", досыць няўдала падабранай Ромамі і Луцкевічамі. Мы пазбавіліся ад Маліноўскага, бо ўсе новыя браты абураліся яго ўдзелам. Яны ведалі Маліноўскага як чалавека палітычна несумленнага, які дзеля

---

[10] Ежы Ром – кіраўнік кадэцкай арганізацыі ў Вільні, дзеяч яўрэйскага руху.

[11] Людвік Чаркоўскі (1855-1928) – лекар, грамадскі дзеяч, кіраўнік бібліятэкі Таварыства сяброў навукі ў Вільні.

[12] Эльяш Ром – публіцыст, дзеяч яўрэйскага руху.

[13] Вітальд Абрамовіч (1874 - каля 1940) – адвакат. Адзін з арганізатараў ППС на Літве. Краёвец. У 1919 г. прэзідэнт Вільні. Удзельнік пахода Л.Жалігоўскага. Кіраўнік урада Сярэдняй Літвы. У 1939 г. вывезены ў СССР, дзе загінуў.

[14] Браніслаў Крыжаноўскі (1876-1943) – адвакат, палітык і грамадскі дзеяч. Краёвец. У маладосці належаў да ППС, потым – да Польскай народнай партыі "Вызваленне". Сябра ўраду Сярэдняй Літвы. Абараняў у судзе дзеячоў Беларускай сялянска-работніцкай Грамады.

[15] Зыгмунт Нагродскі (1865-1937) – гандляр, грамадскі дзеяч. Напачатку XX ст. быў адным з арганізатараў сістэмы польскіх тайных школаў у Беларусі і Літве. Краёвец. Выдаваў часопіс "Наш край".

[16] Іван Прозараў – архітэктар, грамадскі дзеяч.

[17] Іван Краскоўскі (1882-?) – школьны інспектар, дзеяч беларускага руху. У 20-ыя гг. дырэктар беларускай гімназіі ў Дзвінску. Пасля пераезду ў Менск выкладаў у БДУ. Арыштаваны ў 1930 г.

[18] Міколас Біржышка (1882-1962) – гісторык літаратуры, палітык. Сябра Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі. Адзін з арганізатараў Тарыбы.

[19] Ян Багушэўскі – лекар, грамадскі дзеяч. З 1916 г. – у легіёнах Юзафа Пілсудскага.

[20] Майсей Брамсон – гандляр, падтрымліваў сувязі з меншавікамі.

[21] Данатас Маліноўскас – літоўскі палітык і публіцыст.

ажыццяўлення літоўскіх нацыяналістычных імкненняў ішоў нават на кантакты з урадам. Ложа, што выйшла з "Еднасці" ў 1911 г., атрымала назву "Літва". У яе склад увайшлі: палякі – я (Венерабле), Крыжаноўскі і Нагродскі, літовец – Сляжэвіч (Скарбнік і Сакратар), рускія – Прозараў і Краскоўскі (пазнейшы Венерабле), беларус – Антон Луцкевіч (Прамоўца) і яўрэі – Эльяш Ром (1-ы Дазорац) і Брамсон. Эльяш Ром у 1912 г. памёр. У 1913 г. з абодвух віленскіх ложаў выйшаў цэлы шэраг братоў-палякаў: Крыжаноўскі і Нагродскі з "Літвы", В.Абрамовіч, і прынятыя ўжо пасля раздзелу, Будны[22] і Ян Пілсудскі[23] з "Еднасці". З 1911 г. у нашую "Літву" былі прынятыя : літоўцы – Вацлаў Біржышка[24] (у 1911 г.), Бельскі[25] (з Шауляў, у 1911 або 1912), Бугайлішкіс[26] (у 1911 або 1912 г. адначасова з Бельскім), Булат[27] (1913), Шаўлюс[28] (1912), Ян Вілейшыс[29] (1914), Феліцыя Барткевічава[30] (1915 г., першая жанчына ў віленскіх ложах); палякі – Казімір Астахевіч[31] (1913), Эдвард Сакалоўскі[32] (1912) і Уладзіслаў Асмалоўскі[33] (1913 або 1914), беларус Вацлаў Ластоўскі (1912). Акрамя іх да нас перайшлі з ложы "Еднасць" Аляксандр Заштаўт і Міхал Біржышка.

У кастрычніку 1914 г. з ложы "Літва" вылучылася новая ложа, ужо трэцяя ў Вільні. Яна атрымала назву "Беларусь". Пакуль яе самастойнасць больш фармальная. Фактычна яна ўсё яшчэ ўтварае адно цэлае з "Літвой", і канчаткова вылучыцца толькі ўвосень 1915 г. Да "Белай Русі" належаць А.Луцкевіч, Булат, Бугайлішкіс, М.Біржышка, Краскоўскі, Заштаўт і Астахевіч. На сённяшні дзень у нашым краі – 5 ложаў: тры – у Вільні і па адной у Менску і Віцебску. Мы заўсёды імкнуліся да стварэння аўтаномнай краёвай арганізацыі, для ўтварэння якой неабходна мець 7 ложаў.

---

[22] Станіслаў Будны – банкаўскі служачы. Краёвец. Сябра Віленскай гарадской рады.

[23] Ян Пілсудскі (1876-1950) – брат Юзафа, адвакат, грамадскі дзеяч. Краёвец. Міністр фінансаў Польшчы ў 1931-1932 гг. Арыштаваны бальшавікамі ў Вільні ў 1939 г. Пасля 1941 г. – у эміграцыі ў Англіі.

[24] Вацловас Біржышка (1884-1956) – брат Міколаса, бібліёграф і гісторык культуры.

[25] Вацловас Бельскіс (1870-1938) – публіцыст, грамадскі дзеяч і палітык. З 1915 г. сябра партыі эсэраў.

[26] Пеліксас Бугайлішкіс (1883-1965) – юрыст, публіцыст, гісторык.

[27] Андрюс Булёта (Булат) (1872-1941) – адвакат, грамадскі дзеяч і палітык. Дэпутат II і III Дзяржаўнай думы ад Сувалкскай губ. Сябра партыі эсэраў. Пазней адзін з кіраўнікоў Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі.

[28] Юргіс Шаўлюс (1879-1968) – літоўскі палітык, адзін з заснавальнікаў Тарыбы. З 1918 г. на дыпламатычнай рабоце. Пасол Літвы ў Германіі, Швейцарыі, Польшчы ды інш.

[29] Ёнас Вілейшыс (1872-1942) – адвакат. Сябра Літоўскай сацыялістычнай народна-дэмакратычнай партыі. Міністр унутраных справаў ва ўрадзе М.Сляжэвічуса.

[30] Феліцыя Барткевічэне Повіцкайтэ (1873-1945) – публіцыстка.

[31] Казімір Астахевіч ( 1883-1952) – банкаўскі служачы. У 20-ыя гг. – пастар у Вільні.

[32] Эдвард Сакалоўскі (1878-1932) – інжынер. Сябра Сацыял-дэмакратычнай партыі Літвы і Беларусі.

[33] Уладзіслаў Асмалоўскі – прамысловец, адзін з фундатараў "Кур'ера Краёвага", які выдаваўся пры актыўным удзеле Антона Луцкевіча. Захавальнік архіва віленскіх масонаў.

Фактычна мы не выконваем масонскага рытуала. Змест для нас важнейшы, чым рытуал, які выконваецца толькі пры прыёме новых сяброў. Хоць і ў гэтым выпадку ён зведзены да мінімума. Нельга не прызнаць, што дух братэрства сярод нас адчувальна ўзмацніўся, але дасканаласці няма, бо чалавечая натура слабая. Пастаянным і жывым крытэрыем ва ўсіх справах з'яўляюцца для нас прынцыпы гуманізму. Па меньшай меры, нашыя намаганні ў гэтым накірунку досыць адчувальныя. Іх уплыў відавочны. Нашыя ложы фактычна з'яўляюцца духоўнымі арганізацыямі. Як уласна масонская арганізацыя, мы не дзейнічаем, але па многіх справах менавіта сярод нас выпрацоўваюцца дырэктывы і нараджаюцца ініцыятывы. Нашыя ложы маюць вялікі ўплыў на ўмацаванне ў свядомасці братоў краёвай пазіцыі. Яшчэ раз хачу падкрэсліць, што нашае Вольнае мулярства, асабліва віленскія ложы, з'яўляецца гуманістычным Саюзам, які не мае нічога агульнага з крывадушным палітыканствам у стылі езуіцтва, з барацьбой супраць рэлігіі і з навязываннем чаго б ні было.

Я заканчваю гэты том дзённіка. У наступным буду маўчаць пра тое, што з'яўляецца найважнейшым элементам маёй волі і веры, г.зн. пра Незалежнасць і справу Легіонаў. Бывай дзённік, сведка той драмы, якой стала для мяне смерць маёй каханай Анікі, што абярнулася смерцю майго духа і ператварэннем мяне толькі ў выканаўца запавету, у здзяйсняльніка ідэі нашага Вялікага [Будаўніка сусвету].

Фрагмент 4.

17 (30). 05. 1915 г. (Т. 6. С. 26)

На 24 і 25 траўня старога стылю прызначаны масонскі канвент у Пецярбургу. У дзённым парадку працы канвента і ў прапанавых праектах рэзалюцый цэнтральныя ўлады Саюза ўяўнілі ультракадэцкія тэндэнцыі, падпарадкоўваючы масонскі рух імперыялістычным імкненням расейскага лібералізму. Будзе вострая барацьба. Мы выступаем з радыкальнай акцыяй. Не выключаны патэнцыяльны раскол. Воду на кадэцкі млын ліць не можам і не хочам. Ад нашых двух віленскіх ложаў – "Літвы" і "Белай Русі" – накіроўваем Булата і Заштаўта. Гэта два тараны радыкалізму для штурму кадэцкіх акопаў. Каго накіруе трэцяя віленская ложа не ведаем.

## Універсал Конфедэрацii Вялікаго Князьства Літоўскаго*

Лета 1915 мес. Грудня 10 дня члены Літоўскіх, Беларускіх, Польскіх і Жыдоускіх організаціі прыступілі да КОНФЕДЭРАЦІІ ВЯЛІКАГО КНЯЗЬСТВА ЛІТОУСКАГО, дабіваючыся супольнымі сіламі, абы Літоускіе і Беларускіе землі, каторые здауна прыналежылі да ВЯЛІКАГО КНЯЗЬСТВА ЛІТОУСКАГО, а цяпер апанаваны нямецкімі войскамі, станавілі пры новых варунках гісторычных нераздзельнае цела на фундамэнці НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ, ЯК СУЦЭЛЬНАЙ ДЗЯРЖАВЫ, ЗАСЬЦЕРАГАЮЧЫ УСІМ НАЦЫЯМ У ЯЕ МЕЖАХ УСІ ПРАВЫ.

Дзеля гэтаго конфедэраты звертаюцца да усіх націй, да усіх станау, да усіх істнуючых організацій і да усіх грамадзян Краю, клічучы, абы уважаючы на важнасць вялікаго гісторычнаго момэнту, забыушыся крыуд узаемных, свар і недавер'я, маючы на мэці адно карысць супольнае Бацькаушчыны, прылучыліся да КОНФЕДЭРАЦІІ ВЯЛІКАГО КНЯЗЬСТВА ЛІТОУСКАГО.

РАДА ТЫМЧАСОВА
Конфедэраціі Вялікаго Князьства Літоускаго.

## Спіс вольных муляраў у ложах Беларусі і Літвы. 1910-1915 гг.

1. Абрамовіч Вітальд (1874-каля 1940) – "Еднасць", "Літва", "Верны ліцьвін".
2. Арансон Рыгор – ложа ў Віцебску (?).
3. Асмалоўскі Уладзіслаў – "Літва", "Вялікі ўсход Літвы" ("Вялікі ўсход Літвы і Беларусі").
4. Астахевіч Казімір ( 1883-1952) – "Літва", "Беларусь", "Вялікі ўсход Літвы" ("Вялікі ўсход Літвы і Беларусі").
5. Афенберг Ян – ложа ў Менску (?).
6. Багушэўскі Ян – "Еднасць".
7. Бамас (Бомас, Вомас) Вітольд – ложа ў Віцебску.
8. Барткевічэне-Повіцкайтэ Феліцыя (1873-1945) – "Літва".
9. Бельскіс Вацловас (1870-1938) – "Літва".
10. Біржышка Міколас (1882-1962) – "Еднасць", "Літва", "Беларусь".
11. Біржышка Вацловас (1884-1956) – "Літва".
12. Брамсон Майсей – "Еднасць", "Літва", "Вялікі ўсход Літвы" ("Вялікі ўсход Літвы і Беларусі").
13. Брук Рыгор – ложа ў Віцебску.
14. Бугайлішкіс Пеліксас (1883-1965) – "Літва", "Беларусь".
15. Будны Станіслаў – "Еднасць", "Верны ліцьвін".
16. Булёта Андрюс (1872-1941) – "Літва", "Беларусь".
17. Гурэвіч Беніамін – ложа ў Віцебску.
18. Валковіч Аляксей – ложа ў Віцебску.

* Дакумент захоўваецца ў Літоўскім Дзяржаўным гістарычным архіве (Ф. 1135, воп. 23, ад.з. 7. Арк. 153). Пры публікацыі захаваныя ўсе моўныя асаблівасці арыгіналу.

19. Вілейшыс Ёнас (1872-1942) – “Літва”, “Вялікі ўсход Літвы” (“Вялікі ўсход Літвы і Беларусі”).
20. Заштаўт Аляксандр – “Еднасць”, “Літва”, “Беларусь”.
21. Івашкевіч Эдмунд – ложа ў Менску (?).
22. Калюбакін Аляксандр – ложа ў Віцебску.
23. Кодзіс Тэадор – ложа ў Менску.
24. Краскоўскі Іван (1882-?) – “Еднасць”, “Літва” (Вялебны), “Беларусь”.
25. Крыжаноўскі Браніслаў (1876-1943) – “Еднасць”, “Літва”, “Верны ліцьвін”.
26. Ластоўскі Вацлаў (1883-1938) – “Літва”.
27. Луцкевіч Антон (1884-?) – “Еднасць”, “Літва” (Прамоўца), “Беларусь”, “Вялікі ўсход Літвы” (“Вялікі ўсход Літвы і Беларусі”).
28. Луцкевіч Іван (1881-1919) – “Еднасць” (Прамоўца), “Вялікі ўсход Літвы” (“Вялікі ўсход Літвы і Беларусі”).
29. Маліноўскас Данатас – “Еднасць”.
30. Нагродскі Зыгмунт (1865-1937) – “Еднасць”, “Літва”, “Верны ліцьвін”.
31. Петрусевіч Казімір – ложа ў Менску.
32. Пілсудскі Ян (1876-1950) – “Еднасць”, “Верны ліцьвін”.
33. Пісарэўскі Сяргей – ложа ў Віцебску.
34. Прозараў Іван – “Еднасць”, “Літва”.
35. Ром Ежы – “Еднасць” (Вялебны), “Вялікі ўсход Літвы” (“Вялікі ўсход Літвы і Беларусі”).
36. Ром Эліяш – “Еднасць” (Скарбнік, Сакратар), “Літва” (Першы дазорац).
37. Ромэр Міхал – “Еднасць”, “Літва” (Вялебны).
38. Сакалоўскі Эдвард (1878-1932) – “Літва”.
39. Сляжэвічус Міколас (1882-1939) – “Еднасць”, “Літва” (Скарбнік, Сакратар).
40. Федаровіч Вячаслаў – ложа ў Віцебску.
41. Цэйтлін Аляксандр – ложа ў Віцебску.
42. Чаркоўскі Людвік (1855-1928) – “Еднасць” (Дазорац).
43. Шабад Цэмах – ложа ў Вільні.
44. Шагал Марк – ложа ў Віцебску (?)
45. Шаўлюс Юргіс (1879-1968) – “Літва”, “Вялікі ўсход Літвы” (“Вялікі ўсход Літвы і Беларусі”) (Вялебны).

# Дакументы і матэрыялы

## Канстытуцыі Андэрсана альбо Старажытныя запаветы вольнага муляра. 1723 г.

У 1718 г. на адным з паседжанняў Вялікай ложы Англіі Вялікі майстар Джордж Пэйн рэкамендаваў братам збіраць усе старажытныя масонскія дакументы. Праз тры гады Вялікі майстар герцаг Мантэгю даручыў аўтару вельмі папулярнай у той час кнігі *Каралеўская генеалогія або генеалагічныя табліцы імператараў, каралей і князёў* брату Джэймсу Андэрсану апрацаваць сабраныя дакументы і на іх падставе падрыхтаваць сучасны варыянт Статута вольных муляраў. У канцы снежня 1721 г. Д.Андэрсан выканаў даручэнне. Рукапіс падрыхтаванай Д.Андэрсанам *Кнігі Канстытуцый* прайшоў рэдагаванне ў Вялікай ложы Англіі, пасля чаго быў сдадзены ў друк. У лютым 1723 г. газета *Post Boy* паведаміла, што *Кніга Канстытуцый* паступіла ў продаж.

Кніга складалася з прысвячэння герцагу Мантэгю, напісанага вядомым у Англіі навукоўцам і святаром Тэафілам Дэзагюлье (1683-1744); нарыса гісторыі масонства, які ахопліваў перыяд "ад Адама" да 1688 гг. (аўтар Джэймс Андэрсан); Старажытных запаветаў вольных і пасвечаных масонаў *Old Charges of Free and Accepted Masons*; 39 агульных правілаў, складзеных Дж.Пэйнам і перапрацаваных Дж.Андэрсанам; правілаў стварэння ложы, а таксама песен Майстра, Чаляднiка, Вучня і Брамніка.

Уласна Канстытуцыямі з'яўляліся *Старажытныя запаветы*, якія па сённяшні дзень у вялікай ступені вызначаюць прынцыпы існавання арганізацый вольных муляраў. У перакладзе на беларускую мову друкуюцца ўпершыню.

Пераклад зроблены на падставе выдання *Anderson's Constitutions of the Free Masons. Edition of 1723.* (New York, 1905).

### Канстытуцыі Андэрсана альбо Старажытныя запаветы вольнага муляра і Старажытныя законы заморскіх ложаў, прызначаныя для чытання пры пасвячэнні новых братоў ці па загаду Майстра

#### 1. Пра Бога і рэлігію

Вольны муляр абавязаны падпарадкоўвацца маральнаму закону; і калі ён правільна разумее Каралеўскае майстэрства, то ніколі не будзе неразумным атэістам альбо няверуючым вольнадумцам. Аднак, калі ў старажытнасці вольныя муляры абавязаны былі ў кожнай краіне належаць да рэлігіі сваёй краіны і свайго народу, якой бы яна ні была, то сёння лічыцца больш разумным належаць толькі да той рэлігіі, у якой згодны паміж сабой усе людзі, дазволіўшы ім самім вызначаць свае рэлігійныя перакананні; гэта значыць [, што вольныя муляры павінны быць] людзьмі дабрадзейнымі, вернымі, іншымі словамі, людзьмі гонару, сумленнымі, незалежна ад асабістых перакананняў і канфесійнай прыналеж-

насці кожнага з іх. Адпаведна, Вольнае мулярства з'яўляецца цэнтрам паяднання і сродкам дасягнення сапраўднага сяброўства паміж людзьмі, якія, – калі б яго не было, – былі б падзеленыя непераадольнай безданню.

**2. Пра Уладу свецкую, Уладу вышэйшую і Уладу прызначаную**

Вольны муляр з'яўляецца лаяльным падданым свецкіх уладаў, дзе б ён ні жыў і ні працаваў. Ён не павінен удзельнічаць у змовах і тайных зламыснасцях супраць свету і дабрабыту народу. Таксама ён не павінен паводзіць сябе непатрэбным чынам у адносінах да прызначаных прадстаўнікоў улады; бо колькі б ні страдала мулярства ва ўсе часы ад войнаў, крывапраліццяў і замяшанняў, столькі ж былі схільныя старажытныя каралі і князі заўсёды аказваць майстрам дапамогу дзеля міралюбнасці і вернасці апошніх, заўсёды даваць годны адказ іх ворагам і садзейнічаць славе Братэрства, дзеля ягонага росквіту ва ўсе часы. Такім чынам, калі брат пойдзе супраць дзяржавы, яго не падтрымаюць у гэтым выступленні, але будуць шкадаваць аб ім, як аб кожным няшчасным. Калі яго асудзяць за гэта злачынства, Братэрства, лаяльнае па сваёй сутнасці, можа і павінна заявіць пра ўласны няўдзел у ягоным бунтарскім парыве, а таксама надалей не даваць падставы і не множыць варожасці да існуючых законных уладаў. Аднак арыштаваны брат не можа быць выключаны з ложы, і яго сувязі з ёй застануцца непарушнымі.

**3. Пра Ложы**

Ложа – гэта месца, дзе Вольныя муляры збіраюцца і працуюць. Ложай таксама называецца сход альбо належным чынам арганізаванае таварыства вольных муляраў, і кожны брат павінен належаць да якой-небудзь ложы і падпарадкоўвацца яе ўнутранаму рэгламенту, а таксама Генеральнаму рэгламенту. Ложа можа мець мясцовы альбо ўсеагульны характар, што лепей можна зразумець пасля яе наведвання, а таксама пасля знаёмства з Рэгламентам Генеральнай ці Вялікай ложы, які дадаецца да Канстытуцыі. У старажытнасці ніводны Майстар або брат не меў права не прыйсці ў ложу, асабліва ў тым выпадку, калі быў раней папярэджаны і не меў сур'ёзнай і паважнай прычыны, пасля разгляду якой Майстар і Дазорцы не прыйшлі б да высновы, што толькі суровая неабходнасць перашкодзіла яго прысутнасці. Людзі, якіх прымаюць у Ложу, павінны быць дабрадзейнымі і сумленнымі, вольнанароджанымі, сталага і разумнага ўзросту; яны не могуць быць даннікамі і леннікамі, жанчынамі, а таксама яны павінны быць людзьмі не амаральнымі і зняслаўленымі ў грамадстве, а толькі добрых звычаяў.

**4. Пра Майстроў, Дазорцаў і Вучняў**

Усе перавагі і адрозненні сярод вольных муляраў грунтуюцца толькі і выключна на сапраўднай годнасці і асабістых вартасцях; бо толькі так магчыма добра служыць Госпаду, не ганьбіць братоў і не зняславіць Каралеўскае

майстэрства. Таму аніводны Майстар або Дазорац не можа быць абраны толькі па прычыне свайго высокага становішча, але выключна дзякуючы сваім асабістым заслугам. Немагчыма ўсё перадаць на пісьме, таму кожны брат павінен наведваць сходы і займаць у іх належнае яму месца, каб засвоіць усё спосабамі, якія адрозніваюць нашае Братэрства. Але няхай будзе вядома кандыдатам, што ніякі Майстар не можа браць сабе Вучня, калі ён недастаткова знаёмы з ім; калі той не дасканалы малады чалавек, які не мае калецтваў і выродлівасцяў, што могуць перашкодзіць яго навучанню Каралеўскаму майстэрству, служэнню Госпаду яго Майстра і быць пасвечаным у браты, а потым – у Чаляднікі, нават пасля таго як ён адпрацаваў у першым званні той тэрмін, які вызначаны звычаямі яго краіны; калі ён паходзіць не ад высакародных бацькоў; і толькі, калі дакладна вядома, што ён адпавядае ўсім гэтым патрабаванням, ён можа быць прызнаны годным стаць Дазорцам, потым – Майстрам ложы, потым – Вялікім дазорцам і з часам – Вялікім майстрам усіх ложаў, у залежнасці ад яго заслугаў. Ніхто з братоў не можа быць Дазорцам, калі не адпрацаваў адпаведны тэрмін у ступені Чалядніка; ні Майстрам, калі не адпрацаваў Дазорцам; ні Вялікім дазорцам, калі не адпрацаваў Майстрам ложы, ні Вялікім Майстрам, калі не адпрацаваў да свайго абрання на пасадзе Вялікага дазорцы, адначасова з'яўляючыся нашчадкам высакародных бацькоў, які пры гэтым заслужыў сваімі вартасцямі добрую славу і высокую ацэнку ў сваёй ложы. Паводле старажытных запаветаў і рэгламентаў, правадыры і кіраўнікі старажытных ложаў, вярхоўныя і неаспрэчныя, павінны сустракаць поўнае паслухмянства ўсіх братоў у падначаленых ім аб'яднаннях з належнымі пакорай, любоўю, павагай і запалам.

**5. Пра кіраванне працай Братэрства**

Усе вольныя муляры павінны старанна працаваць у будныя дні дзеля таго, каб жыць у росквіце ў дні адпачынку; і час працы, вызначаны законамі іх краіны альбо пацверджаны звычаем, павінен няўхільна выконвацца. Самы вопытны з Чаляднікаў прызначаецца альбо абіраецца Майстрам ці Дазорцам над Гасподняй працай. Тыя, што працуюць пад яго кіраўніцтвам, павінны называць яго Майстрам. Вольныя муляры павінны пазбягаць лаянкі, не называць адзін аднаго крыўднымі словамі – называць жа адзін аднаго толькі "брат" ці "сябра". Яны павінны ветліва паводзіць сябе, як у ложы, так і па-за ёй. Майстар, якому вядома, што ён здольны на выкрутлівасць розуму, павінен тым не менш, наколькі магчыма з розумам ставіцца да Гасподняй працы і па справядлівасці дзяліць яе плады, быццам яны належаць толькі ўласна яму; ён не павінен надзяляць нікога з Вучняў альбо Чаляднікаў большай доляй, чым тыя заслужылі на самой справе. І Майстар, і муляры, якія па справядлівасці атрымліваюць заработную плату, застануцца вернымі Госпаду і сумленна закончаць пачатую справу, незалежна ад таго, ці будзе гэта праца ці падарожжа, а таксама не залічаць да працы тое, што звычайна лічыцца падарожжам. Ніхто не павінен зайздросціць поспехам брата, што можа пераш-

кодзіць яму працаваць альбо пазбавіць яго працы дзеля таго, каб закончыць яе самому, будучы здольным на гэта; бо ніхто не здольны дзеля славы Госпада закончыць з годнасцю чужую працу, калі не пазнаёміўся грунтоўна з чарцяжамі і накідамі таго, хто пачаў гэтую працу. Калі Чаляднік абіраецца Дазорцам працаў пад кіраўніцтвам самога Майстра, ён застаецца верным і Майстру, і сваім братам; пры адсутнасці Майстра ён дбайна сочыць за выкананнем працы дзеля славы Госпада; браты ж павінны ва ўсім яму падпарадкоўвацца. Усе вольныя муляры, што выконвалі працу, пакорліва атрымліваюць сваю заработную плату без наракання і абурэння, і не пакідаюць Майстра, пакуль праца не будзе закончана. Маладога брата трэба накіроўваць у працы, каб прадухіліць псаванне ім матэрыяла, якое пацягне за сабой судовае разбіральніцтва, і дзеля захавання традыцыі братэрскай любові. Усе выкарыстоўваемыя прылады працы аглядаюцца і атрымліваюць адабрэнне Вялікай ложы. Ніякі паднявольны работнік не можа займацца сапраўдным вольным мулярствам, і ніякі вольны муляр не можа працаваць разам з несвабодным мулярам, акрамя выпадкаў надзвычайнай неабходнасці; таксама забараняецца навучанне несвабодных работнікаў і непрынятых вольных муляраў тым навукам, якім трэба навучаць брата і сябра.

### 6. Пра паводзіны

*А. У ложы пасля ўтварэння і адкрыцця*

Нельга арганізоўваць прыватныя сходы і весці асобныя размовы, не запытаўшыся дазволу ў Майстра; нельга весці размовы пра што-небудзь непрыстойнае і нягоднае; нельга перапыняць Майстра альбо Дазорцу, альбо кожнага брата, які звяртаецца да Майстра. Нельга паводзіць сябе празмерна вольна і па-блюзнерску, калі ложа занята свяшчэннай альбо сур'ёзнай працай; ні пры якіх умовах і ні пад якім выглядам нельга карыстацца нягоднымі выразамі. Трэба аддаваць даніну належнай пашаны Майстру, Дазорцам і братам, выказваць ім павагу. Пры падачы скаргі справа абвінавачанага брата павінна разглядацца з вынясеннем рашэння братамі ложы, якія з'яўляюцца сумленнымі і кампетэнтнымі суддзямі у падобнага роду супярэчнасцях (апроч выпадкаў апеляцыі да ўлады Вялікай ложы), да якіх і павінен апеляваць віноўны, апроч тых здарэнняў, калі агульны сход братоў можа затрымаць выкананне працы дзеля славы Госпада, і ў такім выпадку магчыма вынясенне особнага рашэння. Аднак да моцы Закона нельга звяртацца пры разглядзе усіх масонскіх скаргаў, апроч тых выпадкаў, калі для ўсіх братоў ложы відавочна неабходнасць такога звароту.

*Б. Паводзіны ў ложы пасля заканчэння працаў, пакуль браты не разышліся*

Можна бавіць час цнатлівымі размовамі, весяліць адзін аднаго па меры здольнасцяў, аднак пазбягаць усялякай празмернасці і не прымушаць каго-

небудзь з братоў піці альбо есці болей, чым таму хацелася б, або перашкаджаць яму пайсці туды, куды яго вядуць ягоныя намеры ці справы, альбо выказваць знявагу і грубіянства, якія перашкаджаюць прыемнаму і свабоднаму ходу гутаркі, бо гэта разбурыць нашую гармонію і зганьбіць нашыя годныя захаплення мэты. Таму ніякія прыватныя сваркі і спрэчкі не могуць пераступіць ганак ложы, а асабліва сваркі і спрэчкі, што датычаць пытанняў рэлігіі, нацыі, дзяржаўнага ўладкавання, бо, належачы, як вольныя муляры да адзінай рэлігіі, пра якую ўжо была гаворка, мы таксама належым адначасова да ўсіх нацыяў, народаў, сем'яў, родаў і моваў, а таксама ўхіляемся ад усялякай палітыкі, якой, пакуль яна не пагражае росквіту ложы, маем намер ухіляцца і надалей.

*В. Паводзіны Братоў пры сустрэчы без пасвечаных па-за сценамі належным чынам утворанай ложы*

Трэба ветліва прывітаць адзін аднаго так, як вы будзеце навучаныя, называючы адзін аднаго братамі, свабодна даваць адзін аднаму рады той ступені падрабязнасці, якая будзе адпаведнай і дастатковай. Пры гэтым належыць імкнуцца быць нябачнымі і нячутнымі пабочнымі асобамі; не нападаць адзін на аднаго, захоўваючы тую традыцыю павагі і пашаны, якую належыць падтрымліваць у адносінах да кожнага брата, а таксама і не брата. Хоць усе вольныя муляры з'яўляюцца братамі аднаго ўзроўня, вольнае мулярства не пазбаўляе годнасці і высокага становішча ў грамадстве чалавека, прынятага ў Братэрства; хутчэй яно надае яму годнасць, асабліва, калі ён заслужыў пашану Братэрства, якое заўсёды ўшаноўвае годных. Трэба пазбягаць дрэнных манераў.

*Г. Паводзіны ў прысутнасці не муляраў*

Трэба захоўваць асцярожнасць у словах і манерах, каб нават самы пранiклівы і цікаўны з не муляраў не здолеў выкрыць нічога з таго, што яму нельга выкрываць; у некаторых выпадках належыць змяняць тэму размовы і ўводзіць яе ў бок дзеля дабра нашага высокашаноўнага Братэрства.

*Д. Паводзіны ў хаце і сярод знаёмых*

Трэба весці сябе так, як належыць сябе паводзіць маральнаму і мудраму чалавеку. Асабліва трэба заўважыць, што ні вашай сям'і, ні сябрам, ні суседзям нельга ведаць пра клопаты ложы і г.д.; у гэтых пытаннях вы павінны кіравацца загадамі ўласнага сумлення і гонару Старажытнага Братэрства па прычынах, пра якія тут не будзем казаць. Таксама належыць лічыцца з уласным здароўем, не затрымлівацца на сходзе празмерна доўга і здалёк ад хаты пасля завяршэння схода ложы, а таксама пазбягаць абжорлівасці і п'янства, каб вашыя сем'і не адчувалі сябе прыніжанымі і абдзялёнымі ўвагай і не страдала вашая праца.

*Е. Паводзіны з незнаёмым братам*

Вы павінны падвергнуць яго асцярожнаму допыту тымі сродкамі, якія падкажа вам разважлівасць і вопыт, каб вашай даверлівасцю не скарыстаўся цёмны самазванец, якога вам належыць з ганьбай і рашучасцю адштурхнуць,

пры гэтым стараючыся не даць яму намёку на сапраўдныя Веды. Аднак, калі вы ўпэўніліся, што перад вамі сапраўдны і верны брат, вы павінны аддаць яму належную пашану; і калі ён мае патрэбу ў чым-небудзь, аказаць яму ўсялякую магчымую дапамогу альбо ўказаць яму шлях да дапамогі, напрыклад, вы можаце даць яму працу на некалькі дзён альбо рэкамендаваць яго іншаму працадаўцу. Аднак вы не абавязаны рабіць нічога, што выходзіць за межы вашых здольнасцяў і магчымасцяў – толькі аддаць перавагу беднаму брату, які пры гэтым з'яўляецца дабрадзейным і верным чалавекам, перад іншымі беднымі людзьмі ў тых самых абставінах.

І нарэшце, усе гэтыя запаветы вы абавязаныя выконваць, таксама як і іншыя законы, даведзеныя вам тым самым парадкам; вы павінны песціць у сэрцах братэрскую любоў – аснову і вянец, які звязвае цэмент і славу гэтага Старажытнага Братэрства. Пазбягаючы ўсіх і ўсялякіх сварак і спрэчак, паклёпу і нагавору, не дазваляць іншым паклёпнічаць на годнага брата, але адстойваць яго гонар і аказываць яму добрыя паслугі настолькі, наколькі дазваляе ваша ўласнае сумленне і бяспека, але не больш таго. І калі нехта з братоў прычыніць вам шкоду, належыць у адпаведнасці з годным старажытным звычаям звярнуцца ў сваю альбо яго ложу, а адтуль вы можаце апеляваць да ўлады Вялікай ложы на штоквартальным яе сходзе, а адтуль – да ўлады штогадавой Асамблеі Вялікай ложы. Аднак да гэтага сродка трэба звяртацца толькі ў тым выпадку, калі справу немагчыма вырашыць іншым чынам, цярпліва і ўважліва выслухаўшы рады Майстра і братоў ложы, якія могуць дапамагчы вам пазбегнуць звароту да немулярскага закону альбо ж наадварот – будуць спрыяць хуткаму вырашэнню ўсіх вашых справаў у судзе з усёй магчымай справядлівасцю і на вашую карысць, але пры поўнай павазе да братоў. Майстар і браты самі павінны прапанаваць свае паслугі ў якасці пасрэднікаў, а браты, якія вядуць цяжбу павінны з удзячнасцю прыняць такую прапанову; а ў тых выпадках, калі такое пасрэдніцтва не прынясе вялікай карысці справе, ім належыць усё ж працягваць цяжбу ці судовы працэс, аднак без гневу і злапамятнасці (па меншай меры, не ў агульнапрынятым сэнсе гэтых словаў), не робячы і не гаворачы нічога, што можа пагражаць братэрскай любові. Добрыя адносіны паміж братамі трэба аднаўляць і падтрымліваць, каб для ўсіх быў відавочным спрыяльны ўплыў вольнага мулярства на грамадства і людзей. Так усе вольныя муляры паступалі ад пачатку свету, і так яны будуць паступаць да яго канца.

Амен, да будзе так.

*Пераклад і падрыхтоўка да друку*
*Марыяны Сакаловай і Алеся Смаленчука*

# Ландмаркі. 1889 г.

Ландмаркамі звычайна лічаць асноўныя законы жыцця "рэгулярных" вольных муляраў і галоўныя прынцыпы іх дзейнасці, якія не падлягаюць змяненням. Паводле Карла Х. Клаўдзі, аўтара *Кнігі Вялебнага майстра*, змешчанай на сайце Вялікай ложы Расеі[1], Ландмаркі суадносяцца з масонскім заканадаўствам, як *Magna Charta* – з сучасным канстытуцыйным правам. Падобна таму, як Хартыя вольнасці ўтрымлівае пералік асноўных прыроджаных правоў чалавека, якія павінны ўлічвацца ў кожным заканадаўстве, так і Ландмаркі з'яўляюцца падмуркам вольнага мулярства, без якога яно не магло б існаваць.

Ландмаркі доўгі час існавалі ў якасці непісанага закону. Пазней з'явіліся апублікаваныя варыянты Ландмарак, якія, аднак, розніліся паміж сабой. Сёння адсутнічае адзінае меркаванне пра колькасць і нават сутнасць Ландмарак. Найчасцей у якасці традыцыйных называюць 25 Ландмарак Альберта Макея[2]. Якраз яны выкарыстаныя для дадзенай публікацыі. На беларускай мове Ландмаркі публікуюцца ўпершыню. Некаторыя з іх суправаджаюцца каментарамі К.Клаўдзі з *Кнігі Вялебнага майстра*.

---

1. Існаванне сакрэтных знакаў для прызнання Братоў.
2. Падзел сімвалічнага масонства на тры ступені.
3. Легенда пра Хірама (легенда 3°).
4. Братэрствам кіруе афіцэр ложы, якога называюць Вялікім майстрам[3].
5. Вялікі майстар мае права кіраваць любым паседжаннем Братэрства, калі б і дзе б яно не адбывалася.
6. Вялікі майстар мае права прысвячаць у новыя ступені.
7. Вялікі майстар мае права даваць дазвол на адкрыццё ложы і правядзенне працаў.
8. Вялікі майстар мае права праводзіць пасвячэнне без выканання звычайнай працэдуры.
9. Масоны павінны збірацца ў ложах[4].

---

[1] http://freemasonry.ru

[2] Mackey A. Text Book of Mason Jurisprudence. – London. 1889. – P. 17-39.

[3] К.Клаўдзі: "Кіраванне Братэрствам ажыццяўляецца афіцэрам-старшынёю, якога называюць Вялікім майстрам і абіраюць з ліку братоў. Многія лічаць, што выбары Вялікага майстра вызначаюцца законам або пастановамі Вялікай ложы. Гэта не так. Сама пасада абавязаная сваім існаваннем Ландмарке. Вялікія майстры або афіцэры, якія выконвалі іх функцыі пад рознымі тытуламі, фігуруюць у памятных кнігах Братэрства задоўга да ўтварэння Вялікіх ложаў, і калі б сучасная сістэма кіравання праз Вялікія ложы была б зліквідаваная, Вялікі майстар усё роўна бы застаўся".

[4] К.Клаўдзі: "Неабходнасць для масонаў збірацца ў ложах – яшчэ адна Ландмарка. Не трэба думаць, што якая-небудзь старажытная Ландмарка робіць абавязковым інстытут падпарадкаваных ложаў, які з'яўляецца асаблівасцю сучаснай масонскай сістэмы. Ландмаркі заўсёды абавязвалі масонаў збірацца разам для правядзення аператыўных або спекулятыўных працаў, прычым такія сходы называліся "ложамі". Спачатку гэта былі імправізаваныя сустрэчы, якія склікаліся з адмысловай мэтай. Пасля чаго браты разыходзі-

10. Калі браты збіраюцца ў ложы, імі павінен кіраваць Майстар і два Дазорцы[5].
11. У час сходa ложа павінна належным чынам ахоўвацца[6].
12. Кожны масон мае права прадстаўляць ложу на ўсіх агульных сходах Братэрства і адпаведным чынам інструктаваць іншых прадстаўнікоў.
13. Кожны масон мае права падаваць апеляцыю на рашэнне братоў у Вялікую ложу або ва Усеагульную Асамблею франкмасонства.
14. Кожны масон мае права наведваць ложы і прысутнічаць на сходах любой рэгулярнай ложы.
15. Ніякі невядомы наведвальнік не мае права ўваходзіць у ложу, пакуль не адбудзецца допыт у адпаведнасці са старажытнымі традыцыямі.
16. Ніякая ложа не мае права ўмешвацца ва ўнутраныя справы іншай ложы ці прысвойваць ступені сябрам іншых ложаў.
17. Кожны вольны муляр абавязаны падпарадкоўвацца законам і прынцыпам масонскай юрысдыкцыі[7].
18. Існуюць патрабаванні да кандыдатаў.
19. Вера ў існаванне Бога як Вялікага Будаўніка сусвету[8].
20. Вера ў адраджэнне да новага жыцця.
21. "Кніга закона" (адпаведна рэлігіі той краіны, дзе існуе ложа) з'яўляецца незаменнай часткай інтэр'ера кожнай ложы[9].

---

лiся, каб сустрэцца ў іншы час у іншым месцы, зыходзячы з неабходнасці або абставінаў. Унутраны рэгламент ложы, пастановы, пастаянныя афіцэры і ўлік штогадавых недапрацовак – гэта сучасныя новаўвядзенні, якія ніякім чынам не выцякаюць з Ландмарак і вызначаюцца асобнымі ўказамі адносна пазнейшага часу".

[5] К.Клаўдзі: "Кіраванне братамі ў ложы ажыццяўляецца Майстрам і двумя Дазорцамі. Сход масонаў пад кіраўніцтвам кагосьці іншага <...> не лічыцца ложай. Наяўнасць Майстра і двух Дазорцаў у такой самай ступені неабходна для нармальнага функцыянавання ложы, як наяўнасць гаранта канстытуцыі ў нашыя дні. Безумоўна, назвы пасадаў розняцца на розных мовах, але іх лік, паўнамоцтвы і абавязкі паўсюль тыя ж самыя".

[6] К.Клаўдзі: "Кожная ложа пасля таго, як усе збяруцца, павінна быць зачынена – гэта важная Ландмарка Братэрства, якую нельга ігнараваць. Неабходнасць гэтай Ландмаркі выцякае з эзатэрычнага характара масонства. Абавязак ахоўваць дзверы, палохаючы шпіёнаў і выведнікаў, існуе здаўна <...>"

[7] К.Клаўдзі: "Ландмарка заключаецца ў тым, што кожны франкмасон адказны перад законамі і пастановамі масонскай юрысдыкцыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі яго пражывання, хоць ён можа і не ўваходзіць у ложу. Няўдзел у ложы, сам па сабе зняважлівы для іншых вольных муляраў, не пазбаўляе ад падпарадкавання масонскай юрысдыкцыі".

[8] К.Клаўдзі: "Вера ў існаванне Бога як Вялікага Будаўніка сусвету з'яўляецца адной з важнейшых Ландмарак ордэна. Заўсёды разумелася, што адмаўленне Вярхоўнай Улады катэгарычна пазбаўляе права на пасвячэнне. У гісторыі ордэна ніколі не было, і не можа быць прыкладу, каб атэіст быў пасвечаны ў масоны. Падобнае забараняецца. Яно немажлівае ўжо ў моц самой цырымоніі ініцыяцыі ў 1°".

[9] К.Клаўдзі: "<...> Кніга закона" з'яўляецца незаменнай часткай інтэр'ера кожнай ложы. Я знарок кажу "Кніга закона", бо агульнае выкарыстанне Старога і Новага запаветаў не

22. Роўнасць масонаў[10].

23. Таямніца арганізацыі[11].

24. Заснаванне Спекулятыўнай навукі на аператыўных (дзейсных) пачатках і сімвалічнае выкарыстанне і тлумачэнне тэрмінаў дадзенага рамяства для мэтаў рэлігійнага і маральнага выхавання.

25. Гэтыя Ландмаркі нязменныя.

*Пераклад і падрыхтоўка да друку*
*Марыяны Сакаловай і Алеся Смаленчука*

з'яўляецца абсалютным патрабаваннем. "Кніга закона" – гэта тое, што, як лічыцца ў адпаведнасці з рэлігіяй краіны, утрымлівае ў сабе волю Вялікага Будаўніка сусвету. Такім чынам, ва ўсіх ложах хрысціянскіх краінаў "Кніга закона" складаецца са Старога і Новага запаветаў; у краінах, дзе пануе іўдаізм – дастаткова толькі Старога запавета; у мусульманскіх краінах і сярод масонаў-мусульманаў выкарыстоўваецца Каран. Масонства не імкнецца ўплываць на рэлігійныя перакананні сваіх адэптаў. Яно абмяжоўваецца верай ў існаванне Бога і таго, што з гэтага непазбежна вынікае. "Кніга закона" для спекулятыўнага масона – гэта ягоны духоўны *trestle-board*. Без яе ён не можа працаваць".

10 К.Клаўдзі: "Роўнасць зусім не адвяргае таго сацыяльнага статуса, які ўзаконены звычаямі краіны. Манарх, дваранін або джэнтльмен маюць права аказваць уплыў і карыстацца павагай адпаведна свайму стану. Дактрына масонскай роўнасці азначае, што масоны, як дзеці аднаго Вялікага Бацькі, сустракаюцца ў ложы ў якасці падарожнікаў, што рухаюцца да адзінага перадвызначанага фінала, і што ў ложы агульныя заслугі годныя большай павагі, чым вялізарная ўласнасць, і павінны быць ушанаваныя і ўзнагароджаныя пэўным службовым ростам. Пасля заканчэння працаў у ложы браты пакідаюць мірную адасобленасць, каб ізноў далучыцца да свету. Кожны з іх ізноў займае сацыяльнае становішча і карыстаецца прывілеямі статуса, на якія ён мае права паводле звычаяў грамадства".

11 К.Клаўдзі: "Таямніца – наступная найважнейшая Ландмарка і неад'емны атрыбут ордэна, які суправаджае яго ад самога нараджэння <...> Страціўшы таямніцу, ордэн згубіць сваю ісціннасць, і вольнае мулярства перастане існаваць. Якраз таму, як бы не нападалі на ордэн за яго сакрэтнасць і як бы не цягнула нявопытных братоў у час выпрабавання дзеля ўласнай карысці адмовіцца ад таямніцы, гэтага ніколі не будзе <...>, бо такія змены азначалі б сацыяльнае самазабойства. Услед за легалізацыяй ордэна наступіць ягоная смерць. Вольнае мулярства як тайны саюз стагоддзямі заставалася нязменным, як адкрытая абшчына яно столькі не пратрымаецца".

# Статут вольных муляраў "Расейскай правінцыі". 1782 г.

Прыкметнай падзеяй у гісторыі вольных муляраў Расеі стала вылучэнне расейскіх ложаў, якія належалі да шведска-нямецкай сістэмы "Строгага нагляду" (Stricte Observanz), у асобную "Расейскую правінцыю". Гэта адбылося ў 1782 г. пад час Вільгельмсбадскага канвенту. Ініцыятарамі ўтварэння "Расейскай правінцыі" і аўтарамі звароту да кіраўніка "Строгага нагляду" герцага Фердынанда Браўншвейгскага сталі паэт Міхаіл Хераскаў, выдавец Мікалай Новікаў, прафесар Маскоўскага універсітэту Іаган Шварц ды інш. Якраз гэтыя асобы, а таксама князі Юрый і Мікалай Трубяцкія і Пётр Тацішчаў склалі кіраўніцтва Правінцыі. Пасада Вялікага майстра засталася вакантнай. Польскі даследчык Людвік Хас лічыць, што вольныя муляры спадзяваліся, што яе займе царэвіч Павел[1]. Ягоныя кантакты з масонамі пацвярджаюцца шматлікімі дакументамі. Некаторыя ўскосныя сведчанні дазваляюць выказаць думку, што недзе паміж 1777 і 1779 гг. царэвіч нават прайшоў пасвячэнне ў вольныя муляры[2].

Падчас гэтага ж канвента быў прыняты новы Статут вольных муляраў, які з'яўляўся свайго роду ідэйным маніфестам масонаў канца XVIII ст. Цалкам мажліва, што сябры ложаў 70 – 80-х гг. XVIII ст. у Магілёве, Полацку і Шклове ведалі гэты дакумент і кіраваліся ім у сваёй дзейнасці. Іншыя ложы гэтага перыяду, якія існавалі ў Вільні, Гародні, Нясвіжы і Слоніме, жылі адасобленым ад "Расейскай правінцыі" жыццём. Для іх дзейнасці больш важнай падзеяй стала прыняцце ў 1784 г. Статута Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Аднак і яны належылі да "Строгага нагляду", і Статут 1782 г. не мог не мець значэння для іх дзейнасці.

Упершыню Статут быў апублікаваны напачатку XX ст. гісторыкам масонства Цірай Сакалоўскай у часопісе *Море* (1907, № 25-26. С. 766-790), а потым – у выданні *Устав вольных каменщиков (XVIII-XIX вв.). Из материалов для истории русского масонства (Спб., 1907).* Яна ж суправадзіла публікацыю ўласным каментаром. Адносна нядаўна была зробленая трэцяя публікацыя дакумента – у выданні *Уставы вольных каменщиков России конца XVIII - XX веков // Масонство и масоны. Сб. ст. – Вып. I. (М., 1994. С. 90-117) (падрыхтоўка да друку І.Сучкова).*

Статут вольных муляраў "Расейскай правінцыі" 1782 г. друкуецца паводле тэксту Ц.Сакалоўскай і разам з яе каментаром у адпаведнасці з сучаснымі нормамі расейскай арфаграфіі.

---

Вильгельмсбадский конвент, собранный в 1782 г., открылся 16 июля в Вильгельмсбаде, под председательством герцога Фердинанда Брауншвейгского. Целью съезда было преобразование масонства и выработка наиболее целесообразной и наилучше организованной системы для масонской деятельности. На конвент съехались представители масонов Франции, верхней и нижней Германии, Австрии и Италии; Россия также имела представитель-

[1] Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX wieku. – Wrocław, 1982. – S. 180.

[2] Харитонович Д. Масонство. – М.: Весь мир, 2001. – С. 110.

ство. На конвенте Россия, "во внимание к ее обширному пространству и к большому числу лож, ревностно в ней работавших", была признана за восьмую провинцию ордена. Отсюда уже ясно значение Вильгельмсбадского конвента в истории русского масонства.

После конвента в Россию были присланы масонские акты, обряды, их объяснения, нравственные наставления. Многие из них сохранились доныне в архивах и снабжены соответствующими заголовками, например: "Объяснение обряда по Вильгельмсбадскому конвенту", "Рита"[3], утвержденная на общем Вильгельмсбадском конвенте и пр. Приводимые ниже законы также утверждены на Вильгельмсбадском конвенте. Мне пришлось видеть несколько вариантов этих законов во множестве списков, что доказывает чрезвычайную распространенность этих законов в России. Я же выбрала этот именно текст, как представляющий особый интерес: эти законы были предназначены для отправки к управляющему мастеру в одну из масонских лож в девятнадцатом веке, именно в ложу "Елизаветы к добродетели", в 1812 году. Особый интерес представляют те редакционные поправки, которые внесены в текст законов в 1812 г. Эти поправки я привела в подстрочных примечаниях, за исключением не имеющих значения поправок в слоге.

Масонские витии нередко черпали свои изречения из приводимых законов; нередко также какую-нибудь отдаленную статью из законов они развивали в пространную речь. Эти законы включают весь кодекс масонства, все те правила, которые усердно распространялись масонами и в ложах путем назиданий, путем устной пропаганды, и путем литературы, печатной и рукописной. Масоны иногда бывали фанатичными проповедниками своих воззрений и в своем увлечении выходили даже за пределы, указываемые самим орденом. Настойчиво, пламенно, с увлечением тщились масоны внушить правила нравственности, идеи равноправия людей, уважение к человеческому достоинству, терпимость религиозную и национальную, обязательность деятельного христианства и необходимость самого широкого благотворения. Нравственное усовершенствование признавалось средством достижения рая за гробом и златого века на земле. В приводимых законах некоторые статьи являются как бы членами символа масонской веры; тексты первых двух параграфов ярко подтверждают веру масонов в Бога и в бессмертие души и могут снять упрек с наших прадедов масонов в служению князю тьмы.

Мною сохранена дата (5787 г.), указываемая списком, которым я пользуюсь, хотя Вильгельмсбадский конвент состоялся в 1782 г. Ошибка здесь недопустима, так как масону, писавшему законы, прекрасно был известен год Вильгельмсбадского конвента, выделившего Россию в самостоятельную масонскую провинцию. В другой рукописи, в обряде принятия в товарищи, име-

[3] Г.зн. – рытуал.

ется такая приписка: "по чиноположению осьмой провинции утверждено лета 5787 на востоке Санкт-Петербурга". Поэтому, вероятно, в 1787 г. были в России узаконены постановления Вильгельмсбадского конвента. Законы, принятые на Вильгельмсбадском конвенте, действовали не только в XVIII веке. Выше сказано, что они подлежали отправке в ложу в 1812 г. Они продолжала действовать, добавлю здесь, вплоть до гражданской смерти русского масонства, т.е. до 1822 г.

*Тира Соколовская*

## Законы Ордена Свободных Каменщиков, как постановление, долженствующее быть отныне вперед наблюдаемо с прочими предписаниями На С.П. востоке 29 января 1812 года.

## Устав Вольных Каменщиков, утвержденный на всеобщем Совете Конвента, бывшем в Вильгельмсбаде в 1787 году

### ВСТУПЛЕНИЕ

О ты, учению мудрости новопосвященный! Чадо добродетели и дружбы, внемли прилежно гласу нашему. Да раскроется душа твоя для принятия мужеских велений истины. Мы тебе покажем путь, ведущий к счастливой жизни. Мы тебя научим угождать Творцу твоему и разрешить с бодростью и успехом все способы, Провидением тебе вверенные, дабы сделать тебя полезным сочеловеком и дабы вкушал ты сладость благотворения.

### ОТДЕЛЕНИЕ I

### О должностях к Богу и религии

**I-е**

Первая твоя клятва принадлежит Богу. Имей благотворение к существу исполненного величества, действием воли своей сотворившему вселенную и соблюдающему оную непрерывным деянием, наполняющим твое сердце, его же слабый предельный разум твой ни постигнуть, ни определить не может. Скорби о горестном заблуждении смыкающего глаза свои перед светом и блудящего в густом мраке случая. Сердце твое, умягченное и признательное отеческих благодеяний к тебе Бога твоего, да отвергнет с презрением оные суетные умствования, ясно доказывающие развращение человеческого ума, уклоняющегося от своего источника. Возвышайся часто душой над существами плотскими тебя окружающими и мечи взор исполненный желания на горние страны: они твое наследие и истинное отечество. Принеси Богу в жертву волю и желания твои. Сделай себя достойным Его животворных влияний. Соблюди законы, кои Он велел тебе исполнить, яко человеку на земном твоем ристали-

ще. Угождать Богу твоему, – се твое блаженство. Быть навеки с ним соединенну, – се твое ревнование и правило твоих деяний.

**2-е**

Но как смел бы ты стать перед Его лицом, существо слабое и виновное, преступающее всеминутно Его законы и оскорбляющее святость Его, ежели бы отеческая Его благодать не даровала тебе бесконечного обновителя? Оставленный разума своего блужданию, где бы ты обрел уверение будущего утешения? Преданный правому суду Бога твоего, куда бы ты сокрылся? Воздай убо благотворение Искупителю твоему, повергни себя перед Словом воплощенным, и благослови Провидение, произведшее тебя во свет между христианами. Исповедуй на всяком месте божественный закон Христа Спасителя и не стыдись никогда, что ты ему принадлежишь. Евангелие есть основание наших обязательств. Ежели ты ему не веришь, то ты не каменщик. Следуй сему чистому нравоучению, являй во всех твоих поступках умное и деятельное благочестие без лицемерия и лживости. Христианство не заключается в одних истинах умозрительных. Оживи оные исполнением нравственных должностей, в оном предписанных, и ты будешь счастлив, современники благословят тебя и ты явишься без трепета перед престол Бесконечного.

**3-е**

Пронзи себя стрелой любви и сострадания. Она есть основание святой религии сей. Жалей о грехе без ненависти, но не гони его. Оставь Богу единому суд; ты же довольствуйся Любовью и Терпением.

Каменщики! Чада единого Бога! Соединенные верой в божественного Спасителя нашего! Да свяжут вас[4] крепко оные узы любви и истребят всякий предрассудок, противоборствующий братскому нашему согласию.

**ОТДЕЛЕНИЕ II-е**

**Бессмертие души**

Человече! Царю Мира! Бывший некогда из творений совершенное потому, что сам Бог одушевил тебя Своим дуновением, восчувствуй твое высокое определение, все – что растет вокруг тебя имеет жизнь токмо животную, исчезает со временем и покорено власти твоей; единая твоя душа бессмертна. Истекающая из недра самого Бога, переживет тление и не исчезнет. Се твое истинное титло благородства. Чувствуй живо блаженство твое, но без гордости – она погубила корень твой и тебя свергнет в бездну. Существо обезображенное! При всем твоем первобытном и последственном величестве, что ты перед Бесконечным? Благотвори Его во прахе и отделяй прилежно оное небесное и неизменяемое начало от чуждых смешений. Обрабатывай твою бессмертную и совершаемую душу и твори ее способную к соедине-

[4] Вместо – “вас” надписано: “нас” (тут і далей заўвагі Ціры Сакалоўскай – А.С.).

нию с чистым Источником блага, когда она освобождаться будет от страдных паров тленности. Сим-то образом ты будешь свободен посреди оков, счастлив в недре злополучия, неколебим при свирепствующих бурях, и умрешь без трепета!

Каменщик! Ежели ты возможешь когда-либо усомниться о бессмертном естестве души твоей, то принятие будет для тебя бесполезно; ты престанешь быть усыновленным чадом мудрости и смешаешься в толпе существ материальных и непросвещенных, во тьме бродящих.

**ОТДЕЛЕНИЕ III-е**

**О должности к Государю и Отечеству**

**1-е**

Высочайшее Существо вверило положительнейшим образом власть свою на земле Государю, чти и лобызай законную власть уделом земли, где ты обитаешь; твоя первая клятва принадлежит Богу, вторая – отечеству и Государю[5]. Человек, скитающийся по лесам без просвещения и убегающий общества, был бы менее способен к исполнению намерений Провидения и к достижению всего блага, ему предоставленного. Существо его расширяется посреди ему подобных, разум его укрепляется стечением различных мнений. Но по единому соединению произвел бы беспрерывный бой о личной пользе и насыщении развратных страстей и вскоре бы невинность пала перед силой или коварством. И так нужны были для поступка его законы, а для сохранения оных – начальники.

**2-е**

Чувствительный человек! Ты чтишь родителей своих, чти равно с ними и отцов Государства. Они суть особы, представляющие Божество на земле сей. Если они ошибаются, сами они отвечать будут перед Судьей Царей; но твое собственное рассуждение, часто несправедливое, не может уволить тебя от повиновения. Молись о их охранении. Обнажи со рвением все способности твои для великого блага, блага Отечества. Ежели когда-нибудь не исполнишь ты сея священные должности, ежели сердце твое не будет более от радости трепетать при нежном имени Отечества и Государя твоего, то Каменщики извергнут тебя из недра своего, яко противника общего порядка, яко недостойного быть участником в преимущественных выгодах такого общества, которое заслуживает доверенность и уважение Государей, потому что любовь к Отечеству есть одна из главнейших его пружин и что, ревнуя сделать лучшими Граждан, требует оно, чтобы дети его с величайшей отличностью по чистейшим побуждениям исполняли Государственные должности. Храбрейшим воином, правосуднейшим судьей, кротчайшим господином, вер-

[5] Слово "Государь" зачеркнуто и заменено словом: "Государству".

нейшим слугой, нежнейшим отцом, постояннейшим мужем, преданнейшим сыном должен быть каменщик, потому что общие и обыкновенные обязанности Гражданина освящены и подтверждены свободными и произвольными каменщика обетами и что, презря оные, он к слабости присоединит лицемерие и клятвопреступство.

**ОТДЕЛЕНИЕ IV-е**

**О должности к человеку вообще**

**1-е**

Но ежели отечественный круг, открывающий тебе столь обильный и столь удовлетворяющий путь, не наполнит всей твоей деятельности, ежели нежное сердце твое пожелает упраздниться от дел Государственных и обнять с оным Электрическим огнем[6] всех людей и все народы, ежели, восходя к общему источнику, возревнуешь лобызать нежно всех имеющих такие же составы, такую же в любви нужду, такое же желание быть полезным и одну бессмертную душу как и ты, то иди в храмы наши воскурить жертву на жертвенник святого человечества! Вселенная есть отечество каменщика, и из принадлежащего человеку для него нет ничего чуждого.

**2-е**

Взирай с почтением на сие величественное здание, определенное для укрепления весьма ослабленных союзов человечества и нравственности. Лобызай всемирное сообщество добродетельных душ, способных возвеселиться, распростертое во всех концах земного круга, где разум и просвещение проникли, соединенное под святое знамя человечества и простых и единообразных законов; восчувствуй наконец высокую мету[7] святого ордена нашего, посвяти твою деятельность и всю твою жизнь благотворению и счастью сочеловеков, пекись непрестанно о нравственном твоем совершенстве, соединись теснее с Божеством. Сим-то образом облагородишь, просветишь и укрепишь пружины твоей великодушной решимости.

**ОТДЕЛЕНИЕ V-е**

**О Благотворении**

**1-е**

Сотворенный по образу Бога, благоволившего явить Себя человекам и излить на них Свою благость, себя к Нему, бесконечному образцу, постоянной волей, проливающей беспрестанно на соотечественников[8] весь тук[9] посильного твоего блага; все, что разум благого постигнуть может, есть наследие каменщика.

---

[6] Вписано: "человеколюбия".

[7] Мету – цель; метить – целить.

[8] Вместо – "соотечественников" стоит: "сочеловеков".

[9] Тук, т.е. запас.

**2-е**

Уважай немощную младенца слабость[10]: он подпоры твоей просит. Неопытность юноши пагубна, сей советов твоих требует; полагай счастье твое в предупреждении угрожающих ему заблуждений и обманов, зажги в нем искры священного огня даров врожденных и помоги им обнажиться для счастья человеков.

**3-е**

Всякое существо страждущее и воздыхающее имеет священное над тобою право. Берегись когда-либо не признать оного. Не ожидай, чтобы пронзающий вопль бедности восклицал к тебе, предупреждай и утешая несчастного в слабости. Не зарази тщеславием источников воды жизненной, в которых несчастный должен утолить свою жажду. Не ищи награды за твое благотворение в пустых плесках толпы народной. Каменщик обретает оную в нежном гласе своей совести и в упрекающей улыбке Божества, перед очами коего он благоговеет непрестанно.

**4-е**

Ежели Провидение поручит тебе или поручало какой-либо излишек, то берегись употребить оный на пустое и беззаконное дело. Оно благоволит, дабы ты не равное благих разделение учинил менее чувствительным, которое бы входило в его планы; наслаждайся сим прекрасным преимуществом.

**5-е**

Да не унизит никогда характера твоего скупость, из страстей гнуснейшая, и да возвысится сердце твое[11] выше хладных и сухих счетов, оной принуждаемых. Ежели оно когда стремится иссушить себя при томном оной дыхании, то беги от наших храмов сострадания и милосердия, они не будут иметь для тебя привлечение, и мы не возможем более познать в тебе древний образ Божества.

**6-е**

Благотворение твое да освятится религией, мудростью и благоразумием. Сердце твое да пожелает обнять нужды целого человечества, но разум твой долженствует избирать необходимое и важнейшее. Наставляй, советуй, покровительствуй, подавай, помогай попеременно. Не думай, что ты довольно сделал, и не покойся от трудов твоих, разве для того, чтобы получить новые силы и оказать новое соревнование.

**7-е**

Предавшемуся тебе сему величественному состраданию готовится тебе неиссякновенный сладостей источник. Ты на земле сей предвкусишь небесное блаженство. Душа твоя возвеселится и все часы жизни твоей исполнятся радости.

---

[10] Вместо – "слабости" поставлено: "робости".

[11] Прибавлено: "щедрое".

**8-е**

Когда же ты почувствуешь пределы конечного твоего естества, а душа твоя, будучи не в силах одна столько споспешествовать благу, сколько бы ты желал, опечалится, то иди во храмы наши, виждь священный благотворения узел нас связующий и, содействуя с живостью и по всей возможности твоей полезным намерениям и установлениям, тебе от общества каменщического предлагаемым и оным в действо производимым, возрадуйся, что ты гражданин наилучшего света, и вкуси сладких плодов от сил соединенных в единой мете. Тогда твои источники умножатся, ты поможешь сделать вместо одного тысячу счастливых, и обеты твои увенчаются.

## ОТДЕЛЕНИЕ VI

### О других должностях к ближнему

**1-е**

Люби ближнего твоего, яко самого себя, и не делай ему того, чего себе не желаешь. Храни высокий залог, твое слово, внешний знак твоего над естеством господства, для вспомоществования в нуждах ближнему и для возжигания во всех сердцах священного огня добродетели. Будь ласков и приветлив. Сооружай здание твое примером своим, дели счастье ближнего без ревности, не попускай никогда в недре твоем зависти зародиться на одну минуту, она возмутит чистые источники блаженства твоего и душа твоя будет добычей горестнейшей фурии.

**2-е**

Прощай врагу твоему, осмелься ему сделать добро. Сия великодушная жертва, предписанием которой мы одолжены закону[12], доставить тебе наиприятнейшие чувствования. Ты будешь паки живым образом Божества, прощающего с небесной благостью оскорбления человека и проливающего на него благодеяния, невзирая на неблагодарность. Воспоминай всегда сие великолепное торжество, какое разум получить над чувством может, и что каменщик забывает обиды, а благодеяния – никогда.

## ОТДЕЛЕНИЕ VII

### О нравственном совершенстве самого себя

**1-е**

Предавшись таким образом благу ближнего, не забывай твоего собственного совершенства и радей о удовлетворении нуждам бессмертной души твоей. Входи часто в сердце твое, испытуй сокровеннейшие в них силы. Познание самого себя есть основание каменщических правил. Душа твоя есть ди-

[12] Вписано: "эгиды".

кий камень, который очистить должно. Принеси Богу[13] в жертву исправленные и покоренные твои страсти.

**2-е**

Строгие и чистые нравы да будут неразлучными сопутниками твоими и да соделают тебя почтенным перед глазами непросвещенных. Да будет душа твоя чиста, пряма и покорна. Гордость есть опаснейший враг человека, источник всех зол его. Не рассуждай о той точке, к которой ты пришел, она умедлит течение твое. Стремись к той, к которой придти должен. Краткое время шествия твоего едва дает тебе надежду оной достигнуть. Отними от самолюбия твоего опасную пищу сравнения с теми, которые позади тебя. Восчувствуй паче огнь добродетельного ревнования, взирая на совершеннейшие образцы перед тобою находящиеся.

**3-е**

Уста твои да не переменяют сокровенных мыслей твоего сердца, да будут они навсегда органом истинным и верным. Каменщик, который сдерет с себя чистоту и непорочность в намерении принять личину[14] лицемерия и притворства, будет недостоин пребывания с нами, и сия недоверенность – призрак в мирных храмах наших, он сделается вскоре для нас ужасом.

**4-е**

Да укрепит и поддержит тебя высокая мысль Божьей вездесущности, обновляй на всяк день обет твой соделаться лучшим. Бодрствуй и молись. И когда при конце дня довольное сердце твое помянет тебе доброе дело, или какую-нибудь одержанную над собой победу, то успокойся на несколько часов, преклонив главу твою на изголовье твое, и потом паки облекись в новые силы.

**5-е**

Наконец, изучай смысл иероглифов и символов, тебе орденом предлагаемых. Сама природа не учит без покрова всем своим таинствам. Она требует, чтобы ее наблюдали, сравнивали и удивлялись ее действиям. Из всех наук, обширное поле которых предлагает счастливейшие извлечения попечению человеческому и пользе общества, та наука, которая покажет отношение между Богом, Вселенной и тобою, исполнит желания небесной души твоей.

## ОТДЕЛЕНИЕ VIII

### О должности к братьям

**1-е**

В бесчисленной толпе существ, населяющих сию Вселенную, ты признал каменщиков братьями своими, не забывай никогда, что всякий Каменщик, какого бы исповедания Христианского, какой бы страны, или состояния не был, прости-

[13] Вписано: "Божеству".

[14] Вместо – "личину" написано: "маску".

рая тебе десную свою[15], символ братской свободности, имеет священные права человеческого племени[16], он не жертвует никогда народным предрассудкам и священный узел сравнивает здесь все состояния. Уважай в обществе гражданском степени, учрежденные или терпимые Провидением. Часто гордость оные вымышляла, ей и предоставлено оные хулить и отвергать. Но берегись вводить в храмах наших льстивые[17] – отличности, нами непринимаемые, оставь твои достоинства и знаки любочестия за дверями и входи к нам с спутниками токмо твоими – добродетелями. Какое бы твое светское звание ни было, уступи в ложах наших добродетельнейшему, просвященнейшему.

**2-е**

Не стыдись никогда, при посторонних людях человека низкого состояния, но честного, которого ты несколько минут прежде лобызал, как брата. Орден постыдится тебя в свою череду и отринет тебя и с твоей гордостью, да торгуеши ею во светских непросвещенных позорищах. Ежели брат твой находится в опасности, лети к нему на помощь и не страшись за него жизнь свою пожертвовать. Ежели он в нужде, излей на него твои сокровища и возрадуйся, что ты сделал дело столь усладительное. Ты клялся оказывать благотворение всем людям вообще, тем паче обязан ты предпочтением воздыхающему брату твоему. Ежели он грешит и заблуждает, иди к нему с братскими оружиями: чувством, разумом и убеждением; возвращай добродетели существа колеблющиеся и воздымай падших.

**3-е**

Ежели сердце твое, уязвленное истинными и воображаемыми обидами, начинает питать некую тайную на брата твоего злобу, то разгони тот же час воздымающееся облако, избери себе на помощь кого-нибудь беспристрастного судью, требуй братского его посредничества, но не входи никогда во храмы, не укротя чувства злобы и мщения. Ты вотще будешь призывать имя Бесконечного, да благоволил бы Он обитать в храмах наших, ежели оные не очищены добродетелями братий и не освещены согласием.

## ОТДЕЛЕНИЕ IX

### О должности к Ордену

**I-е**

Когда ты уже допущен был к соучаствованию в выгодах Каменщического Общества, то в возмездие[18] за то жертвуй часть твоей свободы и так

[15] Вписано: "руку".

[16] Вместо слов "человеческого племени" вписано: "в твоей помощи и дружбе. Обет природы был равенство, но человек нарушил скоро оный. Каменщик восстанавливает первобытные права человеческого племени, он не жертвует никогда народным предрассудком".

[17] Лестные.

[18] Вместо следующих за тем шести слов надписано: "сему оставь со смирением долю от природной твоей щедрости".

исполни строго[19] нравственные наложенные на тебя обязательства. Сообразуй себя его[20] правилам и почитай тех, коих народная доверенность поставила хранителями законоположений и толкователями всеобщего света. Воля твоя в ордене[21] покорена воле законов и высших. Ты будешь дурной брат, ежели не признаешь сей нужной во всяком обществе подчиненности, и наше принуждено будет тебя исключить из своего недра. Паче всего есть один закон[22], коего наблюдение ты обещал перед лицом небес, то есть закон нерушимой тайны в рассуждении наших обрядов, законов[23] и образа принятия. Страшись думать, что сия клятва менее священна даваемых тобою в гражданском обществе. Ты был свободен, когда оную произносил, но уже не свободен нарушить клятву, тебя связующую. Бесконечный, коего призывал ты во свидетели, утвердил оную. Бойся наказаний, соединенных с клятвопреступством. Ты не избежишь никогда казни твоего сердца и лишишься почтения и доверенности многочисленного общества, имеющего уже тогда право объявить тебя вероломным и бесчестным.

**Заключение**

Братья мои! Ежели уроки, орденом тебе предлагаемые для облегчения пути истины и счастья, впечатлеют в кроткую твою душу, готовую к принятию впечатлений добродетели, ежели спасительные правила, которые назначат тебе, так сказать, каждый шаг в Каменщическом ристалище, сделаются твоими собственными правилами и всегдашним вождем[24] твоих деяний, – о, любезный брат, сколь велика будет наша радость! Ты исполнишь высокое твое определение, ты получишь вновь божественное подобие, которое было долей человека в невинном его состоянии, которое есть предмет христианства и цель принятия твоего. Ты соделаешься любимым творением неба. Его обильные благословения на тебя прольются и удостоятся славного титла всегда мудрого, свободного, счастливого и твердого[25], ты шествовать будешь на земле сей, яко царь, благодетель сочеловеков и образец братий.

Аминь!

*Падрыхтоўка да друку і каментар*
*Алеся Смаленчука*

---

[19] Вместо – "строго" надписано: "с точностью".

[20] Вписано: "мудрым".

[21] Слова: "в ордене" зачеркнуты.

[22] Вместо слов: "паче всего есть один" вписано: "особливо должен ты содержать в памяти твоей тот".

[23] Вместо слова: "законов" приписано: "церемоний, законов".

[24] Вместо – "вождем" надписано: "кормилом".

[25] Вписано: "всегда постоянного".

# Статут Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. 1784 г.

Напачатку 80-х гг. XVIII ст. вольнамулярскі рух на тэрыторыі Рэчы Паспалітай быў вельмі актыўным. На гэта паўплывала як актывізацыя пошукаў шляхоў пераадолення таго сацыяльна-палітычнага крызісу краіны, які абярнуўся падзеламі яе тэрыторыі паміж Расеяй, Прусіяй і Аўстрыяй у 1772 г., так і актыўнае пашырэнне ідэалогіі Асветніцтва. Апошняе прычынілася да паступовага ўзмацнення больш рацыянальнага накірунку ў вольным мулярстве, звязанага з англійскай сістэмай. Уплывы містычна-кансерватыўнага "Строгага нагляду", пашыранага ў Францыі, Аўстрыі, Італіі, Германіі, Рэчы Паспалітай і Расеі, пасля Вільгельмсбадскага канвента (1782), на якім большасць дэпутатаў выказала сумненне ў верагоднасці тэзіса пра паходжанне "Строгага нагляду" ад Ордэна тампліераў, значна аслабелі.

У лютым 1780 г. на чале ложаў "рацыяналістычнага" накірунку ў Рэчы Паспалітай стаў буйны магнат і вядомы палітык Ігнацы Патоцкі, прыхільнік рэфармавання дзяржаўнага і сацыяльна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай у духу Асветніцтва. Дзейнасць І.Патоцкага паспрыяла з'яўленню новыхварштатаў. У цэнтры пераменаў апынулася ложа "Кацярына пад паўночнай зоркай", якая пачала адыгрываць ролю Вялікай ложы. У снежні 1781 г. была створаная Вялікая Нацыянальная ложа Вялікага ўсходу Польскага[1], якая была Правінцыяльнай ложай Вялікай ложы Англіі.Аднак І.Патоцкі і яго прыхільнікі імкнуліся да поўнай самастойнасці вольных муляраў Рэчы Паспалітай. Гэтае імкненне набыло рэальнасць у лютым 1784 г., калі прадстаўнікі 13 ложаў прынялі Акт абвяшчэння і Статут Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Ад Беларусі і Літвы ў Вялікі ўсход увайшлі віленскія ложы "Дасканалая еднасць", "Руплівы ліцьвін", "Добры пастыр", "Храм мудрасці" і гарадзенская ложа "Шчаслівае вызваленне". Вышэйшая капітула зацвердзіла гэтае рашэнне 4 сакавіка 1784 г.

Вялікім майстрам быў абраны мазавецкі ваявода Андрэй Макраноўскі, а яго-нымі намеснікамі – станіславоўскі стараста Францішак Ксаверы Война, Вялікі гетман ВКЛ Міхал Казімір Агінскі і буйны магнат з Валыні князь Міхал Любамірскі. У кіраўніцтве Вялікага ўсходу дамінавала групоўка прыхільнікаў караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

У чэрвені 1785 г. апошнія прыхільнікі "Строгага нагляду" на польскіх, беларускіх, украінскіх і літоўскіх землях прызналі ўладу Вялікага ўсходу. Такім чынам, Вялікі ўсход Каралеўства Польскага і ВКЛ стаўся адзінай рэгулярнай масонскай арганізацыяй Рэчы Паспалітай[2].

Акт абвяшчэння і Статут Вялікага ўсходу друкуецца на падставе выдання *Akt ogłoszenia i ustawy Wielkiego Wschodu Królewstwa Polskiego i Wielkiego Księstwa Litewskiego. Cena a la rustica zł. z R.P.S. 5784.* – [Warszawa, 1784]. – 86 s.

Тэкст публікуецца з нязначнымі скарачэннямі.

[1] Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX wieku. – Wrocław, 1982. – S. 169-170.
[2] Ibidem. S. 174.

## Акт абвяшчэння і Статут Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага пад Усходам Варшаўскім дня 26 дванаццатага месяца года ісціннага святла 5783 а звычайнай эры 26 лютага 1784 г.

Дзеля славы Вялікага Будаўніка сусвету мы, ніжэйпадпісаўшыяся Упаўнаважаныя справядлівых і дасканалых ложаў – Кацярыны пад паўночнай зоркай пад Усходам Варшаўскім; Дасканалай еднасці пад Усходам Віленскім; Раўнавагі ўвенчанай пад Усходам Пазнаньскім; Дасканалай таямніцы пад Усходам Дубенскім; Святыні Ізіс, Тарчы Паўночнай, Багіні Элеўзіс пад Усходам Варшаўскім; Руплівага ліцьвіна, Добрага пастыра, Храма мудрасці пад Усходам Віленскім; Шчаслівага вызвалення пад Усходам Гарадзенскім; Белага арла і Школы мудрасці пад Усходам Пазнаньскім – свядома вырашылі:

маючы дастаковую колькасць для заснавання Вялікага Нацыянальнага ўсходу шляхам з'яднання нашых Упаўнаважаных і адпаведна вольнамулярскім Законам ва ўсёй іх паўнаце, з улікам таго, што край вельмі зацікаўлены, каб кожная асобная супольнасць падпарадкоўвалася Нацыянальнай уладзе, і, што інтарэсы Таварыства таксама, як і інтарэсы краю, патрабуюць непасрэднай улады над ложамі, мы, ніжэйпадпісаўшыся, маючы паўнамоцтвы ад нашых братоў, і надзеленыя адпаведнымі дакументамі, якія захоўваюцца ў архівах Таварыства, абвясцілі і абвяшчаем дадзены сход вольных муляраў Упаўнаважаных вышэйназваных ложаў і тых, што пазней будуць створаныя Вялікім Нацыянальным усходам, якому надаем паўнамоцтвы, правы і загадваем, каб ён існаваў як сталы прадстаўнік і найвышэйшая ўлада Таварыства ў Каралеўстве Польскім і Вялікім Княстве Літоўскім.

**Артыкул I. Заканадаўчае права**

Хочам і пастанаўляем: наш сход з гэтага часу і назаўсёды з'яўляецца сродкам адзінства муляраў у нашым краю, сумай імкненняў асобных ложаў, майстэрняў або мейсцам, дзе іх выяўленыя і выказаныя патрэбы будуць улічаныя і ператворацца ва ўсеагульнае імкненне, якое тым самым стане законам, абвешчаным і да ведама сапраўдных ложаў даведзеным.

Ніякі новы закон і ніякая перамена для згаданага сходу Вялікага ўсходу не будзе ўведзеная пакуль праект змяненняў не будзе абмеркаваны ў Варшаве нашымі Вялікімі афіцэрамі, а адтуль перададзены нашым упаўнаважаным Дэпутатам дзеля перадачы асобным ложам, якія павінны яго абмеркаваць і даць сваім Упаўнаважаным адпаведныя інструкцыі на бліжэйшы сход Вялікага ўсходу. А калі б здарылася, што некаторыя ложы альбо праз маруднасць, альбо па іншай прычыне спазніліся з разглядам праекту і з паведамленнем Упаўнаважаным пра сваё рашэнне; а з іншага боку, калі б узнікшая затрымка

несла шкоду Таварыству, стрымліваючы дзейнасць заканадаўчай улады, пастанаўляем: што дадзены праект, калі ён быў перасланы ложам або перададзены іх Упаўнаважаным за шэсць тыдняў да агульнага Сходу Вялікага ўсходу, а Упаўнаважаныя за гэты час не атрымалі адпаведных інструкцый ад ложаў, то маўчанне апошніх будзе азначаць, што ложа цалкам давярае свайму Упаўнаважанаму і даручае яму прыняцце рашэння адпаведна ягонаму сумленню і розуму.

**Артыкул 2. Выканаўчае права**

Хочам і пастанаўляем: сход Вялікага ўсходу мае не толькі права прымаць законы, абавязковыя для ўсіх рэгулярных ложаў Каралеўства і Вялікага Княства, але таксама мае права іх ажыццяўлення і выкарыстання дзеля гэтага ўсіх дазволеных сродкаў.

**Артыкул 3. Права заснавання і прыняцця ложаў**

Хочам і пастанаўляем: аніводная ложа, заснаваная па рашэнню нашых чатырох Шатландскіх ложаў, не будзе лічыцца рэгулярнай, калі яе Дыплом, пацверджаны Урачыстым актам, не будзе запісаны ў архіў Вялікага ўсходу на працягу трох месяцаў ад даты яго надання. Таму ж Вялікаму ўсходу надаем права прымаць у супольнасць ужо існуючыя ложы, якія захочуць далучыцца да Вялікага ўсходу, і права выключаць з сапраўднага вольнамулярства кожную ложу або кожнага яе сябра за ўчынак, здзейснены супраць Таварыства.

**Артыкул 4. Права суда**

Хочам і пастанаўляем: Вялікі ўсход з'яўляецца судом *ultima Jnstantiae* у справах пра парушэнне правоў і пастаноў паміж сябрамі ложаў, паміж сябрам і ложай, таксама паміж самымі ложамі. Толькі ён мае канчатковае права тлумачэння законаў, бо з'яўляецца іх стваральнікам.

**Артыкул 5. Права перамоваў**

Хочам і пастанаўляем: толькі Вялікі Нацыянальны ўсход можа весці перамовы з замежнымі Усходамі, заключыць з імі саюзы і падпісваць дагаворы як агульныя, там і спецыяльныя; не прызнаючы законнымі ніводны з аналагічных дагавораў, падпісаны адной з нашых ложаў з замежнай ложай без ведання і пасрэдніцтва Вялікага ўсходу. Аднак пакідаем нашым ложам права вядзення сяброўскай і братэрскай карэспандэнцыі з іншымі ложамі, як у крае, так і за яго межамі.

**Артыкул 6. Права ўтварэння Варштатаў**

Каб Вялікі ўсход мог эфектыўна карыстацца тымі правамі і той уладай, якой мы яго надзялілі, хочам і пастанаўляем: Вялікі ўсход мае права ўтвараць Дэпартаменты і Варштаты альбо Палаты з ліку сваіх сяброў дзеля ажыццяўлення ўласных інтарэсаў; утвараць часовыя альбо пастаянныя камісіі; нарэш-

це, мае найвышэйшую ўладу як заканадаўчую, так і выканаўчую і судовую, таксама права весці перамовы з замежнымі Усходамі ў той форме або тымі сродкамі, якія будзе лічыць аптымальнымі і прыстойнымі дзеля ажыццяўлення сваіх мэтаў.

**Артыкул 7. Межы яго ўлады**

Вялікі ўсход не мае права ўмешвацца ў справы Найвышэйшай капітулы, да якой *exlusive* належыць Містычнае і Духоўнае кіраванне Таварыствам.

<...>

**Артыкул 9. Упаўнаважаныя дэпутаты**

Упаўнаважаныя дэпутаты ложаў Каралеўства і Вялікага Княства з'яўляюцца паўнапраўнымі і актыўнымі сябрамі Вялікага ўсходу. Іх воля вызначае большасцю галасоў агульную волю і закон.

Упаўнаважаныя абіраюцца большасцю галасоў кожнай ложы напярэдадні 1 сакавіка тэрмінам на адзін год. Кожны муляр, сябра рэгулярнай ложы можа быць абраным Упаўнаважаным дэпутатам пры ўмове, што з'яўляецца Майстрам і абязуецца ўдзельнічаць у сходах Вялікага ўсходу.

<...> Кожны Упаўнаважаны ў Вялікім усходзе дае наступную прысягу:

"Я N. у прысутнасці Вялікага Будаўніка сусвету абяцаю, што буду працавіта і рупліва адстойваць інтарэсы справядлівай і дасканалай ложы, якія яна мне даверыла; што я буду ва ўсім звяртацца да інструкцый, якія атрымаў; што буду іх саблюдаць *ad literam* у кожным выпадку, дзе гэта будзе мажліва, і захаваю іх сэнс, калі непрадбачаныя абставіны зробяць іх недастатковымі. Няхай мне дапаможа ў гэтым Бог".

Абавязкі Упаўнаважаных дэпутатаў наступныя:

1. Знаёміць Вялікі ўсход з воляй і пажаданнямі сваёй ложы ў справах, па якіх будуць атрыманыя інструкцыі;

2. У непрадбачаных справах альбо, калі ложа надзяляе дэпутата поўным даверам, выказваць меркаванне, якое павінна адпавядаць намерам Таварыства, інтарэсам сваёй ложы і агульнаму духу інструкцый.

3. Уся карэспандэнцыя паміж Вялікім усходам і ложай будзе весціся праз яе прадстаўніка. Ён абавязаны паведамляць сваю ложу пра ўсе выпадкі, якія яе і ўсё Таварыства датычаць. Ён абавязаны адпраўляць у ложу агульны ліст пасля кожнага сходу Вялікага ўсходу, каб паведаміць пра яго працу; з іншага боку ён павінен ад імя сваёй ложы штогод перад 1 сакавіка перадаць у Вялікі ўсход апісанне сваёй ложы, адпаведна схемы, якая будзе распрацаваная.

4. Калі б у яго ложы ўзнікла нейкая складаная праблема, якую немагчыма было б вырашыць у ложы і прыйшлося знаёміць з ёй і чакаць рашэння Вялікага ўсходу, то Упаўнаважаны павінен прадаставіць інфармацыю і бараніць пазіцыю, якая перамагла ў ложы.

<...>

**Артыкул 10. Вялікія кіраўнікі**

Праца Вялікага ўсходу будзе ажыццяўляцца і кантраляваццa наступнымі Вялікімі кіраўнікамі

1. Найвыдатнейшы і Наймагутнейшы Вялікі майстар
2. Найслаўнейшы Намеснік Вялікага майстра ў Вялікапольскай правінцыі
3. Найслаўнейшы Намеснік Вялікага майстра ў Літоўскай правінцыі
4. Найслаўнейшы Намеснік Вялікага майстра ў Малапольскай правінцыі
5. Прывялебны Першы Вялікі дазорац
6. Прывялебны Другі Вялікі дазорац
7. Найпаважнейшы Вялікі прамоўца
8. Найпаважнейшы Прамоўца
9. Найпаважнейшы Вялікі сакратар
10. Найпаважнейшы Сакратар
11. Найпаважнейшы Вялікі скарбнік
12. Найпаважнейшы Вялікі Майстар абрадаў
13. Найпаважнейшы Майстар абрадаў
14. Найпаважнейшы Вялікі суддзя
15. Найпаважнейшы Вялікі ялмужнік
16. Найпаважнейшы Вялікі захавальнік пячаткі
17. Найпаважнейшы Вялікі архівіст
18. Найпаважнейшы Вялікі мечнік
19. Найпаважнейшы Вялікі будаўнічы рахмістр
20. Найпаважнейшы Вялікі сцюарт
21. Найпаважнейшы Гасцёўнік
22. Найпаважнейшы Сцюарт

**Артыкул 11. Пра Вялікага майстра**

Вялікі майстар – гэта галава Таварыства; ягоны тытул – Найвыдатнейшы і Наймагутнейшы. Штогод будзе абірацца ў Вялікім усходзе пад час свята святаго Яна большасцю тайных рысак ад лічбы дасканалых муляраў, адзначаных высокімі тытуламі, нараджэннем, годнасцю, а таксама вядомых сваімі цывільнымі і вайсковымі пасадамі.

Яго пацвярджэнне можа адбывацца столькі, колькі ён будзе падабацца Таварыству; аднак як і пацвярджэнне, так і элекцыя адбываецца пры дапамозе тайных рысак шляхам, апісаным у раздзеле пра элекцыі.

Вялікі майстар з'яўляецца Прэзідэнтам Вялікага ўсходу, а таксама Дэпартаментаў і Варштатаў, створаных дзеля дасягнення акрэсленых мэтаў.

Майстар кафедры кожнай рэгулярнай ложы будзе адкрываць яе пасяджэнні наступным спосабам: У імя Вялікага Будаўніка сусвету і пад кіраўніцтвам Найвыдатнейшага і Наймагутнейшага Вялікага майстра N. адкрываю і г.д., і г.д., і г.д.

Асоба Вялікага майстра з'яўляецца святой, а калі хто-небудзь прынізіць яго годнасць або адмовіць у паслухмянстве, будзе адразу аддадзены пад суд па ініцыятыве Вялікага прамоўцы.

Усе акты Вялікага ўсходу і Варштатаў Вялікіх кіраўнікоў будуць пачынацца наступным чынам: У імя Вялікага Будаўніка сусвету і пад кіраўніцтвам Найвыдатнейшага і Наймагутнейшага Вялікага майстра N. адкрываю і г.д., і г.д., і г.д.

Калі Вялікі майстар непасрэдна кіруе працай, то ягонага подпісу і подпісу Вялікага сакратара дастаткова для законнасці кожнага акта; пры адсутнасці Вялікага майстра падпісваць павінен той, хто трымаў малаток, і два Вялікія дазорцы.

Вялікі майстар прадастаўляе слова на ўсіх сходах, на якіх трымае малаток, але таксама мае права ўдарам малатка ўстанавіць маўчанне, калі хто-небудзь будзе злоўжываць правам выступу.

Вялікі майстар нікому не можа адмовіць у праве на выступ па адной тэме; толькі ад яго залежыць прадастаўленне паўторнай мажлівасці выступу.

Калі нейкая прапанова адпаведным спосабам будзе выдвінута, павінен адразу прыступіць да яе разгляду і паставіць на галасаванне. Адмова яе разгляду можа быць апраўдана толькі тым, што Вялікі майстар палічыў неабходным закрыццё ложы альбо адзін з сяброў Вялікага ўсходу дамовіцца пра спецыяльны разгляд справы (дэліберацыю), усе абставіны якой Вялікія кіраўнікі не маюць права рабіць таямніцай апроч тых пытанняў, якія належаць толькі да іх кампетэнцыі. Дэліберацыя пры разглядзе пэўнай праблемы мажлівая толькі аднойчы.

Прызначае на пасады Прамоўцы і Сакратара, Майстра абрадаў, Гасцёўніка і Сцюарта, а таксама Намеснікаў неабраных кіраўнікоў.

Будзе прызначаць склад усіх часовых камісій, дэпутацый і г.д., якія будуць зацверджаныя рашэннем Вялікага ўсходу.

Можа змякчыць пакаранне, накладзенае Вялікім усходам на ложу або на муляра.

Можа дадаваць гады дзеля атрымання новых мулярскіх ступеняў.

Будзе склікаць надзвычайны сход Вялікага ўсходу.

Будзе мець права прыпыняць *Activitaten* аднаго з кіраўнікоў Вялікага ўсходу аж да бліжэйшага сходу, на якім павінен распавесці пра прычыны яго пакарання. Аднак не можа ўжываць гэтага права ў дачыненні да Упаўнаважаных дэпутатаў, якія маюць прывілеі і могуць быць асуджаныя толькі на Надзвычайным сходзе Вялікага ўсходу.

Не будзе мець права прызначэння сябра на месца непрысутнага Упаўнаважанага прадстаўніка ложы, які сам <...> мае права прызначаць свайго Намесніка. Ніводны Упаўнаважаны прадстаўнік і ніводны кіраўнік падчас звычайных сходаў Вялікага ўсходу не маюць права аддаляцца, не папярэдзіў-

шы Вялікага майстра пра сваю адсутнасць. Упаўнаважаныя дэпутаты павінны гэта зрабіць пісьмова і ўказаць імя брата, які займе месца Упаўнаважанага дэпутата на бліжэйшым паседжанні.

Вялікі майстар альбо сам, альбо ў асобе намеснікаў, надзяліўшы іх гэтым правам, будзе наведваць усе ложы, якія належаць да Вялікага ўсходу, па меры мажлівасці як мага часцей.

Калі б здарылася так, што Вялікі майстар павінен быў бы адсутнічаць, то наступнаму пасля сябе ва урадзе, які будзе прысутнічаць на сходзе, ён павінен перадаць права подпісу інструкцый, канстытуцый ложаў і замежнай карэспандэнцыі. Кіраўнік, які атрымае на гэта паўнамоцтвы, падпісваць павінен наступным чынам: N. ад Найвыдатнейшага і Наймагутнейшага Вялікага майстра надзеленага правам.

**Артыкул 32. Пра працу**

Праца Вялікага ўсходу будзе распачынацца і завяршацца на нацыянальнай мове.

У выпадку адсутнасці Вялікага майстра праца распачынаецца праз 15 хвілінаў пасля прызначанай гадзіны.

Вялікія кіраўнікі павінны сядзець у наступным парадку:

З правага боку ад Вялікага майстра

1. Вялікі Намеснік Вялікапольскай правінцыі
2. Вялікі Намеснік Малапольскай правінцыі
3. Вялікі суддзя
4. Вялікі захавальнік пячаткі
5. Вялікі архівіст
6. Гасцёўнік
7. Вялікі скарбнік

З левага боку ад Вялікага майстра будуць размяшчацца

1. Вялікі Намеснік Літоўскай правінцыі
2. Вялікі ялмужнік
3. Вялікі мечнік
4. Вялікі будаўнічы рахмістр
5. Прамоўца
6. Сакратар
7. Вялікі сакратар

Вялікі прамоўца павінен сядзець перад алтаром.

Два Сцюарты будуць мець свае крэслы на ўсходзе светліцы.

Два Майстры абрадаў будуць сядзець на захадзе.

Упаўнаважаныя ложаў, хоць бы яны нават былі кіраўнікамі, заўсёды будуць сядзець аднолькавай колькасцю ў кожным шэрагу і паводле чаргі, у якой запісаныя, г.зн.:

У калоне Паўднёвай

1. Кацярына пад паўночнай зоркай
2. Раўнавага ўвенчаная
3. Святыня Ізіс
4. Багіня Элеўзіс
5. Добры пастыр
6. Шчаслівае вызваленне

У калоне Паўночнай

1. Дасканалая еднасць
2. Дасканалая таямніца
3. Тарча паўночная
4. Руплівы ліцьвін
5. Храм мудрасці
6. Белы арол
7. Школа мудрасці

Ніхто з прысутных, якія б ступені ён не меў, не можа сядзець у двух калонах.

Тыя, хто не мае высокіх ступеняў, будуць сядзець у другім шэрагу.

Два Вялікія дазорцы павінны займаць свае звычайныя месцы.

Ход працы Вялікага ўсходу будзе адбывацца паводле інструкцый, якімі павінна кіравацца кожная рэгулярная ложа.

<...>

**Артыкул 39. Пра галасы**

Найвыдатнейшы і Наймагутнейшы Вялікі майстар будзе мець 2 галасы, як у нарадах, так і падчас выбараў. Гэта датычыць таксама таго, хто замяшчае Вялікага майстра па прычыне ягонай адсутнасці.

Кожны Упаўнаважаны дэпутат ложы будзе мець толькі адзін голас ва ўсіх працах Вялікага ўсходу.

У заканадаўчых працах кіраўнікі Вялікага ўсходу будуць мець толькі *Vocem consultivam*, затое ў судзе і падчас выбараў – *decisivam*.

Кожны сябра Вялікага ўсходу мае права ўголас выказаць сваё меркаванне з указаннем матываў, а калі гэтага не жадае, то можа падняць руку, што азначае згоду, або трымаць яе апушчанай уніз, што азначае нязгоду. Калі адзін з сяброў Вялікага ўсходу дамовіцца, каб прапанова *per Vota Secreta* прымалася, то Вялікі майстар абавязаны падтрымаць яго, загадаць раздаць кожнаму правадзейнаму сябру па аднаму шару беламу і аднаму шару чорнаму. Белы шар заўсёды будзе азначаць *affirmative*, а чорны – *negative*.

<...>

**Артыкул 40. Варштат Вялікіх кіраўнікоў**

Мы, Упаўнаважаныя дэпутаты рэгулярных ложаў, палічыўшы, што не найлепшым варыянтам з'яўляецца сітуацыя, калі заканадаўчая арганізацыя павінна сачыць таксама за ажыццяўленнем законаў, і што для кожнага ўрада, кіраванне якога грунтуецца на разумных пачатках, з'яўляецца нормай, што вышэйшая ўлада саступае і перадае частку сваіх паўнамоцтваў магістратурам або ніжэйшым сходам, захоўваючы за сабой права іх кантролю і ўтрымання ў пэўных межах. З гэтай нагоды хочам і пастанаўляем наступнае:

**Артыкул 43. Судовае права**

Варштат Вялікіх кіраўнікоў у вышэйазначанай колькасці будзе мець права суда ад нашага імя *ultimanie* па ўсіх справах, якія знаходзяцца ў нашай кампетэнцыі і па якіх Вялікі ўсход павінен вынесці прысуд *ultima instantiae*, з наступным, аднак, папярэджаннем: гэты Варштат не мае права разглядаць справы *in primo instantia*, якія маюць дачыненне да Упаўнаважаных дэпутатаў. Прысуд, які будзе вынесены супраць іх, не будзе мець моцы, пакуль не будзе пацверджаны на Надзвычайным сходзе Вялікага ўсходу.

Кожны прысуд названага Варштату, які вядзе да адлучэння ложы або муляра ад Таварыства, не будзе выконвацца да прыняцця Дэкрэту *confirmationis* Вялікага ўсходу.

За выключэннем гэтых асобных выпадкаў усе прысуды Варштата нашых Вялікіх кіраўнікоў будуць безапеляцыйныя і павінны быць рэалізаваныя.

**Артыкул 44. Права заснавання і прыняцця ложаў**

Азначанаму Варштату перадаем права ад нашага імя выдаваць Канстытуцыі ложам, заснаваным нашымі шатландскімі ложамі, а таксама прымаць у нашую супольнасць і ўдасканальваць ужо існуючыя ложы.

**Артыкул 45. Права тлумачэння**

Азначанаму Варштату даем права і загадваем ад нашага імя тлумачыць законы і весці карэспандэнцыю з замежнымі Усходамі дзеля найвялікшага дабра Таварыства.

**Артыкул 46. Права кантралявання рэгулярных ложаў**

Азначанаму Варштату даручаем пільны кантроль над усімі рэгулярнымі ложамі і вядзення карэспандэнцыі ад нашага імя <...>

**Артыкул 50. Добрая арганізацыя і парадак працы**

Хочам, каб Варштат нашых Вялікіх кіраўнікоў меў права і магчымасці выкарыстання ўсяго таго, што будзе спрыяць добрай арганізацыі працы <...>

Азначаны Варштат будзе збірацца як мінімум 1 раз у тыдзень пад кіраўніцтвам першага ў чарзе прысутнага [Вялікага майстра]. Калі будзе прысутнічаць 7 кіраўнікоў, сход будзе поўным, а ягоныя рашэнні законнымі.

Сакратар Вялікага ўсходу будзе захоўваць будаўнічую кнігу яго працаў, а канцылярыя будзе размяшчацца ў пакоях, якія спалучаныя з ложай.

Усе прысуды, лісты і рашэнні гэтага Варштату будуць падпісвацца, завярацца пячаткай і афармляцца таксама як і рашэнні Вялікага ўсходу, ад імя і ўлады якога ён і будзе дзейнічаць.

Упаўнаважаныя дэпутаты ложаў могуць прысутнічаць на працах Варштату *cum voce consultiva*.

На кожным звычайным сходзе Вялікага ўсходу Вялікі прамоўца ад імя Варштату робіць справаздачу пра яго працу ў мінулым квартале, а кожны Упаўнаважаны мае права ўдзельнічаць у абмеркаванні і выказаць сваё незадавальненне.

Калі будзе такая патрэба і Упаўнаважаныя гэтага пажадаюць, будзе праведзена тайнае галасаванне па пытанню прыняць або не прыняць рашэнні Варштату.

Кожнае рашэнне Варштату можа быць адменена рашэннем Вялікага ўсходу, але пакуль Вялікі ўсход у законным парадку не адменіць гэтага рашэння, яно мае моц закона.

Хочам, нарэшце, каб пры кожных абставінах, якія не закранаюць заканадаўчую ўладу і не агавораныя вышэйазначанымі ўмовамі, Варштат нашых Вялікіх кіраўнікоў меў магчымасць дзейнічаць дзеля найвышэйшага дабра нашага Таварыства, як агульна, так і ў кожным канкрэтным выпадку такім жа спосабам і з тымі самымі правамі, як быццам бы мы самі дзейнічалі і прымалі рашэнне.

Нададзеныя паўнамоцтвы будуць дзейнічаць да таго моманту, пакуль мы не прымем рашэння іх пераглядзець.

**Артыкул 51. Уладкаванне Вялікага ўсходу**

Вялікі ўсход з'яўляецца сходам Упаўнаважаных ложаў і менавіта да іх належыць абавязак знайсці сродкі на яго ўтрыманне на ўзроўні годным такому прадстаўніцтву і найвышэйшай уладзе Таварыства. Аднак тыя ложы, якія бяруць на сябе гэты абавязак, атрымліваюць права самастойна прызначаць памеры складак, бо лепш за іншых ведаюць рэальны стан. Пры гэтым яны могуць загадаць сваім Упаўнаважаным, каб тыя атрымлівалі ад Варштату Вялікіх кіраўнікоў справаздачы пра звычайныя і непазбежныя выдаткі на патрэбы Вялікага Нацыянальнага ўсходу, якія забяспечваюцца ложамі. А калі ложы атрымаюць адпаведную рэзалюцыю, якая не пазней, чым праз 6 тыдняў пасля абвяшчэння дадзенай Канстытуцыі павінна быць прынятая, яны абавязаныя без адтэрміноўкі перадаць вызначаную для іх квоту праз Упаўнаважаных Вялікаму скарбніку Вялікага ўсходу, бо ў іншым выпадку ложы будуць пазбаўленыя *Activitatis* у Вялікім сходзе сваіх Упаўнаважаных дэпутатаў.

**Артыкул 52. Пра Правінцыяльныя ложы**

Хочам, каб права часовага кіравання і заснавання ложаў, як і раней, належала слаўнай Мацярынскай ложы шатландскай "Кацярыне пад паўночнай зоркай" і іншым ложам шатландскім яе дачкам, якія з гэтага моманту і назаўсёды будуць насіць тытул Правінцыяльных ложаў і мець правы і паўнамоцтвы, належныя гэтаму тытулу. Загадваем адным і другім карыстацца азначанымі правамі дзеля найвышэйшага дабра Таварыства ў мясцовасцях і землях, якія для іх вызначаныя.

Прывялебнай ложы Правінцыяльнай "Дасканалая еднасць на ўсходзе Віленскім" – ва ўсёй Літоўскай правінцыі.

Прывялебнай ложы Правінцыяльнай "Раўнавагі ўвенчанай на ўсходзе Пазнаньскім" – у землях і ваяводствах Пазнаньскім, Калішскім, Гнезненскім, Серадскім, Лэнчыцкім і Всхоўскім.

Прывялебнай ложы Правінцыяльнай "Дасканалая таямніца на ўсходзе Дубенскім" – у землях і ваяводствах Валынскім, Падольскім, Браслаўскім і Кіеўскім.

Слаўнай Мацярынскай ложы шатландскай "Кацярына пад зоркай паўночнай на ўсходзе Варшаўскім" – ва ўсіх землях і краях, якія знаходзяцца пад польскім панаваннем і дакладна не акрэсліваюцца, а таксама ў краях і правінцыях, якія ляжаць за межамі.

Вызначаным Прывялебным ложаў Правінцыяльных пад пагрозай страты сваіх прэрагатываў загадваем дакладна выконваць інструкцыі Найвышэйшай капітулы, якія ім былі або будуць высланыя са Слаўнай ложы "Кацярына пад зоркай паўночнай", і якія датычаць спосабу, формы і ўмоваў заснавання новых ложаў і арганізацыі іх працы.

Хочам і пастанаўляем: Слаўная Мацярынская ложа, а таксама Правінцыяльныя ложы маюць права кантроля і паляпшэння працы тых ложаў, якія яны засноўваюць, да таго моманту, пакуль мы не прымем іншага рашэння.

<...>

Зацверджана на агульным сходзе, скліканым адпаведна праву і з'яднаным вузлом братэрства пад геаметрычным пунктам, вядомым ад ісцінных муляраў у Вялікім усходзе Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага ў месцы, асвячоным, уладкаваным і моцным, дзе пануе роўнасць, мір і згода. Дня, месяца і года вышэйпазначанага.

(подпісы)

(L.S.)

Пацвярджэнне Найвышэйшай капітулы

На Усходзе Варшаўскім дня 19 дванаццатага месяца г.і.с. 5783 альбо агульнай эры 19 лютага 1784 г.

Дзеля славы і ад імя Вялікага Будаўніка сусвету.

Мы, сябры Найвышэйшай капітулы сабраліся адпаведна праву пад малатком магістральным.

Дадзеныя рашэнні Вялікага Нацыянальнага ўсходу пасля іх уважлівага разгляду ў частцы духоўнай, якая належыць да нашай улады, знаходзім дасканальна адпавядаючымі містычным правілам Таварыства і рэкамендуем дакладна выконваць.

Дадзена Слаўнай капітулай дня, месяца і года вышэйпазначанага.

(подпісы)

Мы, ніжэйпадпісаўшыяся абвяшчаем і пацвярджаем, што дадзены збор права быў урачыста прачытаны і апублікаваны ў рэгулярным сходзе Вялікага Нацыянальнага ўсходу пасярод радасці і апладысментаў дасканалых муляраў Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага.

У пацвярджэнне гэтага дадзенае абвяшчэнне падпісваем.

На Усходзе Варшаўскім дня 4 першага месяца г.і.с. 5784, а звычайнага 4 сакавіка 1784 г.

(подпісы)

Адпаведнасць арыгіналу пацвярджаю К.Брадзіньскі В. В. Сакратар

*Падрыхтоўка да друку, пераклад і каментар*
*Алеся Смаленчука*

# Канстытуцыйны статут вольнага мулярства Польскага. 1820 г.


USTAWA
KONSTYTUCYINA
WOL.'. MULARSTWA
POLSKIEGO.
Drukiem B.'. O.'. Łątkiewicza.

Ідэйныя і палітычныя перамены, якія адбываліся ў Еўропе ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст., істотна паўплывалі на развіццё руху вольных муляраў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Націск ліберальнай ідэалогіі і пачатак эпохі еўрапейскіх нацыяналізмаў справакавалі барацьбу сярод адэптаў Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага вакол пытанняў пра задачы і формы масонскай працы. Статут 1784 г. не адпавядаў сітуацыі, у якой апынуліся вольныя муляры былой Рэчы Паспалітай напачатку XIX ст. Але адзінае разуменне сутнасці рэфармавання адсутнічала.

Прадстаўнікі ліберальных колаў імкнуліся да далейшай лібералізацыі Братэрства і ўвядзення ў яго ідэалогію нацыянальнага кампанента. Апошні звычайна атаясамліваўся з незалежнай Польскай дзяржавай. Менавіта так разумелі яго браты люблінскай ложы "Вернутая вольнасць" (Валерыян Лукасіньскі, Казімір Махніцкі ды інш.), якія ў 1819 г. заснавалі канспіратыўнае Нацыянальнае вольнае мулярства, дзеля "захавання нацыянальнасці"[1].

Годам раней (1818) браты віленскай ложы "Руплівы ліцьвін" ад'юнкт Віленскага універсітэту і адзін з кіраўнікоў Таварыства шубраўцаў Казімір Контрым і доктар Якуб Шымкевіч прапанавалі ўласны варыянт рэформаў. Іх праграма прадугледжвала ператварэнне ложаў у навукова-дабрачынныя арганізацыі, якія павінны былі дзейнічаць легальна і аўтаномна. Толькі гэта, на думку рэфарматараў, магло паспрыяць ператварэнню вольнага мулярства ў шырокі сацыяльны рух. Аднак праграма не была падтрыманая, і планаваная "рэвалюцыя" абмежавалася ўтварэннем з ліку рэфарматараў ложы "Руплівы ліцьвін рэфармаваны". Яна праіснавала да канца 1818 г. і пасля смерці Я.Шымкевіча спыніла свае працы.

Памяркоўна ліберальнае кіраўніцтва Вялікім усходам у сваю чаргу выношвала планы цэнтралізацыі вольнамулярскага саюза і замены шматлікага і штогод абіраемага кіраўніцтва на вузкае кола правадыроў, якія б абіраліся на працяглы тэрмін. Гэтую ідэю падтрымлівала большасць сяброў Вышэйшай капітулы, якія ў лібералізацыі і палітызацыі вольнага мулярства бачылі рэальную пагрозу яго існаванню ў Расейскай імперыі. Вялікі майстар Вялікага ўсходу Станіслаў Костка Патоцкі, парушаючы прынятую працэдуру, арганізаваў зацвярджэнне праекта новага Статута.

[1] Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX wieku. – Wrocław, 1982. – S. 288.

Статут быў падпісаны Вялікім майстрам 3 траўня 1820 г., пасля таго як яго прызналі 12 ложаў і 6 капітул. У Беларусі і Літве праект статута Вышэйшай капітулы прынялі два капітулы – "Святыня спакою" (Нясвіж) і "Дасканалая еднасць" (Вільня), а таксама тры ложы – "Паўночная паходня" (Менск), "Вузел еднасці" (Наваградак), і "Славянскі арол" (Вільня). Праўда, паводле Л.Хаса, апошняя з іх хутка перакінулася ў лагер апазіцыі[2].

Наогул, большасць масонскіх арганізацый былой Рэчы Паспалітай выступіла супраць Статута 1820 г. У чэрвені 1820 г. С.Костка Патоцкі атрымаў "Пратэст", падпісаны прадстаўнікамі 24 арганізацый вольных муляраў. Сярод пратэстантаў была гарадзенская ложа "Сябры чалавецтва", а таксама віленскія ложы "Руплівы ліцьвін" і "Добры пастыр". Некаторыя варштаты ў знак пратэсту спынілі свае працы. Адбыўся раскол вольнамулярскага руху, які так і не быў пераадолены.

1 жніўня 1822 г. Указам імператара Аляксандра I дзейнасць вольных муляраў на тэрыторыі Расейскай імперыі забаранялася.

Тэкст Канстытуцыйнага статута друкуецца з нязначнымі скарачэннямі паводле выдання *Ustawa Konstytucyjna Wolnego Mularstwa Polskiego* [b.m., 1820?].

---

## Канстытуцыйны статут вольнага мулярства Польскага

Адбывалася пад Усходам Варшавы
Дня 29 месяца другога, года ісціннага 5820
альбо эры агульнай дня 29 красавіка года 1820.

Дзеля славы Вялікага Будаўніка сусвету

Мы ніжэйпадпісаўшыяся Паўнамоцныя
Капітулярных ложаў вышэйшых і ніжэйшых,
Правінцыяльных ложаў, а таксама ложаў Св. Яна,
якія складаюць Вялікі ўсход Польскі

Разглядзеўшы тыя Статуты, якія былі прынятыя дня 26 месяца XII года ісціннага 5783 нашымі папярэднікамі, і палічыўшы, што сучасны стан вольнага мулярства Польскага патрабуе іх дапрацоўкі; пасля вызначэння дзеля гэтай справы асобнай Камісіі, якая вынікі сваёй працы прадставіла Славутаму Варштату Вялікіх афіцэраў, а таксама пасля звароту праз Вялікага майстра нашага да вышэйшай дагматычнай Улады, захаваўшы пэўную разважлівасць і атрымаўшы ад нашых братоў асаблівыя паўнамоцтвы, мы пастанавілі і зацвердзілі наступны Канстытуцыйны Статут:

### Раздзел I. Вольнае мулярства Польскае

### Артыкул 1

Капітулярныя ложы альбо вышэйшыя і ніжэйшыя Капітулы, якія ў Вялікім усходзе не могуць быць прадстаўленыя, інакш як 1/5 часткай агуль-

[2] Ibidem. S. 291.

най колькасці Паўнамоцных прадстаўнікоў усіх ложаў, змешчаных на выяве Вялікага ўсходу. Правінцыяльныя ложы, якія знаходзяцца па-за межамі Каралеўства Польскага, але падпарадкоўваюцца Вялікаму ўсходу Польскаму, і ложы Св. Яна, як тыя, што ўжо існуюць, так і тыя, што будуць утвораныя паводле палажэнняў дадзенага Статуту, утвараюць Вольнае мулярства Польскае.

**Артыкул 2**

Ложы, асабліва тыя, што знаходзяцца па-за межамі Каралеўства Польскага, могуць непасрэдна належаць да Вялікага ўсходу Польскага, калі выкажуць выразнае ўласнае жаданне.

**Раздзел II. Вялікі ўсход Польшчы**

**Артыкул 3**

Вялікі ўсход Польшчы аб'ядноўвае ў сабе ўсе ўлады Ордэна, у тым ліку:

a, Заканадаўчую

b, Найвышэйшага нагляду

c, Дагматычную

d, Выканаўчую

e, Судовую

**Артыкул 4**

Заканадаўчая ўлада належыць да Паўнамоцных прадстаўнікоў Капітулярных, Правінцыяльных і Сімвалічных ложаў.

**Артыкул 5**

Улада Найвышэйшага нагляду належыць Вялікаму майстру і яго Радзе.

**Артыкул 6**

Дагматычная ўлада належыць Найвышэйшай капітуле.

**Артыкул 7**

Выканаўчая ўлада належыць Вялікаму варштату Вялікіх афіцэраў.

**Артыкул 8**

Судовая ўлада належыць усяму Вялікаму ўсходу паводле наступных палажэнняў:

a, Вялікі варштат Вялікіх афіцэраў выносіць прысуд як першая інстанцыя ў выпадку падачы скаргі на Вялікага афіцэра і афіцэра Вялікага ўсходу, суда над усёй ложай, суда над Майстрам кафедры, яго Намеснікам і Дазорцамі.

У гэтых выпадках канчатковы прысуд належыць да сходу Паўнамоцных прадстаўнікоў.

b, Вялікі варштат выносіць канчатковы прысуд па ўсіх справах, якія пачынаюцца са звароту ложаў, за выключэннем тых, што звязаныя з выключэннем муляра з Таварыства. У гэтым выпадку апошняй інстанцыяй з'яўляецца Вялікі ўсход. Дэпутаты разглядаюць справы, што датычаць Упаўнаважанага ложы, падчас сходаў Вялікага ўсходу ў першай і апошняй інстанцыі.

Найвышэйшая капітула разглядае справу свайго сябра ў Найвышэйшай капітуле.

**Артыкул 9**

Вялікі ўсход складаецца:

a, з Вялікага майстра і яго Рады.

b, з Найвышэйшай капітулы.

c, з Паўнамоцных прадстаўнікоў Капітулярных, Правінцыяльных і Сімвалічных ложаў.

d, з Вялікіх афіцэраў і афіцэраў Вялікага ўсходу.

**Артыкул 10**

Вялікая Рада Вялікага майстра складаецца з Вялікага майстра і шасці Вялікіх саноўнікаў.

**Артыкул 11**

Вялікімі афіцэрамі Вялікага ўсходу з'яўляюцца:

1. Вялікі Першы дазорац
2. Вялікі Другі дазорац
3. Вялікі прамоўца
4. Вялікі сакратар
5. Вялікі скарбнік
6. Вялікі Майстар абрадаў
7. Вялікі суддзя
8. Вялікі ялмужнік
9. Вялікі захавальнік пячаткі
10. Вялікі архівіст
11. Вялікі мечнік
12. Вялікі будаўнічы рахмістр
13. Вялікі сцюарт

**Артыкул 12**

Афіцэрамі Вялікага ўсходу з'яўляюцца:

a, Прамоўца ў нацыянальнай мове

b, Прамоўца ў мовах, у якіх працуе ложа ў рэгіёне Вялікага ўсходу

c, Гасцёўнік

d, Сакратар Вялікага варштату

e, Сакратары ў мовах, у якіх працуе ложа ў рэгіёне Вялікага ўсходу

f, Майстар абрадаў

g, Сцюарт

h, Дырэктар гармоніі.

Азначаныя афіцэры атрымліваюць правы і прывілеі Вялікіх афіцэраў, калі замяняюць іх падчас адсутнасці.

**Раздзел III. Працы Вялікага ўсходу**

**Артыкул 13**

Вялікі ўсход будзе збірацца на звычайныя працы і на ўрачыстыя. Звычайныя працы будуць адбывацца ў прысутнасці толькі сяброў Вялікага ўсходу; урачыстыя працы будуць адбывацца ў прысутнасці ўсіх Вольных муляраў.

**Артыкул 14**

Такія праблемы, як:

a, Абмеркаванне законаў,

b. Абранне Вялікіх саноўнікаў,

c, Квартальныя і гадавыя справаздачы з працы Вялікага варштату,

d, Рытуальныя паседжанні,

могуць вырашацца толькі пад час урачыстых працаў. Іншыя праблемы будуць разглядацца або пад час звычайных працаў, або пад час урачыстых паводле рашэння Вялікага майстра.

**Артыкул 15**

На урачыстых паседжаннях Вялікага ўсходу Вялікі майстар альбо той, хто будзе выконваць ягоныя абавязкі, мае права спыніць працы братоў, якія не ўваходзяць у склад Вялікага ўсходу.

**Артыкул 16**

Акрамя рытуальных сходаў Вялікі ўсход Польшчы будзе збірацца чатыры разы на год, а менавіта, у другой палове лютага, чэрвеня, верасня і снежня. Пад час гэтых сходаў і ў выпадку неабходнасці, прызнанай Вялікім майстрам, паседжанні могуць адкладацца з дня на дзень на працягу 7 дзён.

**Артыкул 17**

Выбары будуць адбывацца ў лютым. Змяненне заканадаўства – толькі на адным паседжанні, а менавіта, у снежні.

**Артыкул 18**

Вялікі ўсход можа быць сабраны Вялікім майстрам нечаргова, але не па пытаннях, што датычаць заканадаўства.

**Раздзел IV. Вялікі майстар і яго Вялікая рада.**

**Артыкул 19**

Вялікі майстар з'яўляецца кіраўніком Ордэна. Ён жа кіруе працамі Вялікага ўсходу, Вялікай Найвышэйшай рады, Найвышэйшай капітулы, сябрам якой становіцца шляхам выбараў, Вялікага варштату і ўсіх Камісій. Асоба Вялікага майстра – святая, і калі хто-небудзь адмовіць шанаваць тыя правы, якія належаць Вялікаму майстру, будзе аддадзены пад суд па ініцыятыве Вялікага прамоўцы. Усе дакументы Вялікага ўсходу і Варштату Вялікіх афіцэраў, а таксама ўсе дзеянні ложаў, будуць пачынацца згадкай пра кіраванне Вялікага майстра. Калі працамі кіруе сам Вялікі майстар, то ягонага подпісу і подпісу Сакратара дастаткова, каб лічыць кожны дакумент сапраўдным. У адсутнасць Вялікага майстра дакументы павінны падпісваць той, хто трымае ў руцэ малаток, і абодва Дазорцы. Вялікі майстар прадастаўляе мажлівасць выступлення на ўсіх паседжаннях, дзе ён трымае малаток, але таксама мае права ўдарам малатка спыніць выступ, калі хто-небудзь злоўжывае правам на выступ. Нікому нельга адмовіць у выступе па адной тэме. Ад яго залежыць прадастаўленне мажлівасці выступіць яшчэ раз. Калі нейкая прапанова будзе выказана адпаведным спосабам, Вялікі майстар павінен адразу ж пасля разгляду прапановы прыступіць да галасавання; яно не адбудзецца толькі, калі ён палічыць патрэбным закрыць ложу.

**Артыкул 20**

Вялікі майстар мае права прызначэння на пасады, пералічаныя ў Артыкуле 12. Прызначае кіраўнікоў усіх камісій, а таксама часовых намеснікаў Вялікіх афіцэраў, калі смерць або адстаўка прымусіць іх пакінуць пасады.

**Артыкул 21**

Вялікі майстар мае права зменшыць пакаранне ложы альбо муляра, за выключэннем выгнання брата з Таварыства альбо закрыцця ложы назаўсёды.

**Артыкул 22**

Вялікі майстар па просьбе ложы мае права дадаць годы, патрэбныя альбо да ўступлення ў Ордэн, альбо для атрымання першых трох ступеняў.

**Артыкул 23**

Вялікі майстар мае права прыпыніць выкананне пасадаў Вялікімі афіцэрамі і Афіцэрамі да першага сходу Вялікага ўсходу, на якім павінен паведаміць пра прычыны такога рашэння.

**Артыкул 24**

Прадметам дзейнняў Вялікіх саноўнікаў, якія складаюць Раду Вялікага

майстра, з'яўляецца дапамога Вялікаму майстру ў выкананні ўсіх абавязкаў, якія ён выконвае як кіраўнік Ордэна.

**Артыкул 25**

Першы з шэрагу Вялікіх саноўнікаў замяняе Вялікага майстра ў кіраўніцтве ўсімі працамі.

**Артыкул 26**

Каб першы з шэрагу саноўнікаў мог карыстацца прэрагатывамі Вялікага майстра, згаданымі ў артыкулах 19, 21, 22, 23 і 24, неабходны дазвол, выданы Вялікім майстрам.

**Артыкул 27**

У выпадку адсутнасці Вялікага майстра на Усходзе Варшавы болей, чым на 3 месяцы, альбо ў выпадку ягонага выезду з краіны, пра што Рада Вялікага майстра павінна паведаміць Вялікі варштат, усе атрыбуты Вялікага майстра (апроч згадкі ягонага імя ў дакументах вольных муляраў) пераходзяць да першага з шэрагу Вялікага саноўніка, які прысутнічае на Вялікім усходзе Варшавы. А ў выпадку смерці абавязкі Вялікага майстра пераходзяць да Рады саноўнікаў, і толькі ў дадзенай сітуацыі ўсе дакументы Рады выходзяць з дадаткам *sede vacante*.

**Артыкул 28**

Вялікія саноўнікі пад час выканання сваіх абавязкаў не маюць права займаць пасады ні ў Вялікім усходзе, ні ў асобных ложах.

**Артыкул 29**

Адносіны з краёвым урадам і іншымі Усходамі належаць да кампетэнцыі Вялікага майстра і ягонай Рады.

**Раздзел V. Найвышэйшая капітула**

**Артыкул 30**

Прадметам абмеркавання Найвышэйшай капітулы ў яе ўласным складзе з'яўляецца нагляд за дагматычнымі працамі ў ложах і ўсе дзеянні, якія датычаць навукі Ордэна.

**Артыкул 31**

Найвышэйшая капітула складаецца з 27 сяброў, у т.л. Вялікіх саноўнікаў.

**Артыкул 32**

Кожны сябра Найвышэйшай капітулы, калі не з'яўляецца афіцэрам на Вялікім усходзе альбо Паўнамоцным прадстаўніком якой-небудзь ложы, на паседжанні Вялікага ўсходу будзе мець права выступу па кожнай праблеме.

**Раздзел VI. Паўнамоцныя.**

**Артыкул 33**

Прадстаўнікі Правінцыяльных ложаў і ложаў св. Яна, будуць абірацца штогод з ліку братоў гэтых ложаў, якія па меншай меры маюць ступень Майстра і больш 30 гадоў узросту. Кожная ложа св. Яна, якая працуе на іншым Усходзе апрача Варшавы, будзе абіраць Прадстаўніка або з ліку сваіх сяброў, або з сяброў іншых ложаў, якія жывуць на Усходзе Варшавы.

**Артыкул 34**

Прадстаўнікі Капітулярных ложаў будуць абірацца ў Капітулярных ложах штогод з ліку братоў вышэйшых ступеняў, якія належаць да вольнага мулярства Польскага. Абраны Прадстаўнік павінен мець як мінімум найвышэйшую ступень, у якой працуе тая Капітулярная ложа.

**Артыкул 35**

Ніхто не можа быць Паўнамоцным прадстаўніком болей чым адной ложы і не можа займаць ніякай пасады ў Вялікім усходзе.

**Артыкул 36**

Кожная Капітулярная і Сімвалічная ложа праз свайго Прадстаўніка вядзе непасрэдную карэспандэнцыю з Найвышэйшай капітулай і Вялікім варштатам.

**Артыкул 37**

Кожны Прадстаўнік мае права прысутнічаць на паседжанні Вялікага варштату столькі разоў, колькі будзе трэба дзеля інтарэсаў яго ложы. Вялікі варштат абавязаны выклікаць Прадстаўніка на свае паседжанні кожны раз, калі там будуць разглядацца пытанні, якія будуць датычыць ягонай ложы.

**Артыкул 38**

Спіс кандыдатаў на пасады Вялікіх афіцэраў і афіцэраў Вялікага ўсходу складаюць Прадстаўнікі братоў рэгулярных масонаў, якія па меншай меры маюць трэцюю ступень, узрост больш за 30 гадоў і калісьці займалі пасады ў ложы, падпарадкаванай Вялікаму ўсходу.

Кожны Прадстаўнік мае права назваць двух кандыдатаў. У выпадку яго адсутнасці адзін з прысутных Прадстаўнікоў шляхам жрэбія вызначае ягонага намесніка з ліку двух кандыдатаў.

**Раздзел VII. Вялікі варштат**

**Артыкул 39**

Вялікі варштат Вялікіх афіцэраў складаецца з 13 Вялікіх афіцэраў з рашаючым голасам і афіцэраў з голасам дарадчым. Прадметам дзейнасці гэтага Варштату з'яўляецца:

a, Выкананне законаў.

b, Стварэнне сімвалічных ложаў.

c, Нагляд над працамі сімвалічных ложаў.

d, Абмеркаванне і падрыхтоўка праектаў законаў.

e, Падрыхтоўка адміністрацыйных рашэнняў <...>

f, Суд паводле Артыкула 8.

g, Выданне зваротаў, інструкцый і рэзалюцый, якія датычаць выканання працы.

**Раздзел VIII. Пра галасаванне**

**Артыкул 40**

Пры выбарах Вялікіх саноўнікаў і Вялікіх афіцэраў галасаюць толькі Паўнамоцныя.

**Артыкул 41**

Вялікія саноўнікі разам з Паўнамоцнымі прадстаўнікамі галасуюць па справах Вялікага ўсходу як апошняя інстанцыя, за выключэннем справаў супраць Прадстаўнікоў.

**Артыкул 42**

Наймагутны Вялікі майстар будзе мець два галасы, як пад час паседжанняў, так і пры выбарах. Тое ж будзе мець той, хто замяняе Вялікага майстра пад час ягонай адсутнасці.

**Артыкул 43**

Па ўсіх пытаннях, не ахопленых гэтымі артыкуламі, права голасу належыць усім сябрам Вялікага ўсходу.

**Артыкул 44**

Калі хто-небудзь з прадстаўнікоў-дэпутатаў выкажа жаданне, каб прапанова галасавалася тайна, Вялікі майстар павінен падтрымаць гэтую прапанову, за выключэннем пытанняў заканадаўства і суда.

**Раздзел IX. Тэрмін кіравання**

**Артыкул 45**

Вялікі майстар і Вялікія саноўнікі абіраюцца штогод.

**Артыкул 46**

Штогод адзін з шасці Вялікіх саноўнікаў павінен скласці паўнамоцтвы, а яго месца запоўняць Прадстаўнікі, якія зробяць новы выбар. У выпадку смерці або адстаўкі, абраны на вакантнае месца новы саноўнік выконвае абавязкі на тэрмін, які заставаўся ягонаму папярэдніку, і ў ніякім выпадку не займае месца перад старымі саноўнікамі.

**Артыкул 47**

Саноўнікі, якіх прызначае Вялікі майстар, займаюць пасады на працягу аднаго года.

## Раздзел X. Спосаб абрання

**Артыкул 48**

Вялікі майстар будзе абірацца большасцю галасоў поўнага складу Вялікага ўсходу паводле артыкула 9 дадзенага Статуту з ліку братоў, што належаць да вольнага мулярства Польскага, пачынаючы з 3-й ступені. Калі ніводны з братоў не атрымае большасці, паўторныя выбары адбываюцца з двух або болей братоў, якія атрымалі найбольшую падтрымку. Пры паўторным галасаванні зноў вырашае большасць, а вынікі залежаць ад адзінства меркаванняў.

**Артыкул 49**

Найвышэйшая капітула дзеля выбару сваіх сяброў складае спіс кандыдатаў, якія маюць вышэйшую ступень пасвячэння, і колькасць якіх у тры разы перавышае патрэбную лічбу. З гэтага спісу Прадстаўнікі абяруць аднаго, які будзе адпавядаць наступным патрабаванням:

a, Мае больш за 36 гадоў.

b, Мае найвышэйшую ступень.

c, Мае вопыт кіравання або як Майстар кафедры, або як яе Прадстаўнік, або на якой-небудзь іншай пасадзе Вялікага ўсходу.

**Артыкул 50**

Вялікія саноўнікі будуць абірацца Прадстаўнікамі Капітулярных і Сімвалічных ложаў з ліку сяброў Найвышэйшай капітулы.

**Артыкул 51**

У выпадку смерці або адстаўкі з пасады Вялікага майстра Вялікі ўсход на першым жа сваім паседжанні прызначае дату выбараў.

**Артыкул 52**

У выпадку смерці або адстаўкі аднаго з Вялікіх саноўнікаў або аднаго з Вялікіх афіцэраў Паўнамоцныя прадстаўнікі праводзяць абранне на самым першым квартальным паседжанні Вялікага ўсходу, паводле палажэнняў дадзенага Статуту, што, аднак, не змяншае значэння звычайных выбараў.

## Раздзел XI. Законнасць пастановаў Вялікага ўсходу

**Артыкул 53**

Усе рашэнні Вялікага ўсходу прымаюцца большасцю галасоў.

**Артыкул 54**

Той, хто трымае першы малаток, мае рашаючае слова ў выпадку роўнасці меркаванняў і вырашае спрэчныя моманты па ўсіх пытаннях і на ўсіх паседжаннях, апроч выпадкаў, звязаных з Судом, калі роўнасць галасоў вядзе альбо да апраўдання, альбо да змяншэння пакарання.

**Артыкул 55**

Для прызнання законнасці пастановаў патрэбная колькасць сяброў

1. У Вялікім усходзе:

2/3 Паўнамоцных прадстаўнікоў, два Саноўнікі і 7 Вялікіх афіцэраў.

2. У Вялікім варштаце:

Вялікіх саноўнікаў – 7, з якіх не больш трох могуць быць замененыя саноўнікамі.

**Раздзел XII. Парадак прыняцця законаў**

**Артыкул 56**

У сваіх прынцыпах Канстытуцыйны Статут з'яўляецца нязменным. Аднак праз кожныя 9 гадоў мажлівы перагляд і папраўка асобных артыкулаў па ініцыятыве асобных ложаў, калі практыка ўказвае на гэтую неабходнасць.

**Артыкул 57**

Законы, прынятыя на Вялікім усходзе, не могуць быць адмененыя раней, чым праз 3 гады пасля прыняцця.

**Артыкул 58**

Кожны законапраект або праект папраўкі дадзенай Канстытуцыі з улікам вышэйазначанага тэрміну, падаецца непасрэдна ложай або яе Прадстаўніком у Раду Вялікага майстра. Гэты праект Рада Вялікага майстра або перадае Вялікаму варштату або паведамляе прычыны яго непрыняцця. Аднак пасля аднадушнага рашэння Прадстаўнікоў Рада Вялікага майстра павінна будзе пададзены праект адаслаць на разгляд Вялікаму варштату.

**Артыкул 59**

Вялікі варштат займаецца разглядам і рэдагаваннем законапраектаў, прысланых з Рады Вялікага майстра. Такі падрыхтаваны праект за подпісам Вялікага майстра Вялікі варштат перасылае ложам, а потым прапануе сходу Вялікага ўсходу.

**Артыкул 60**

Пры абмеркаванні законапраектаў Вялікім усходам, ніводны Паўнамоцны прадстаўнік не можа быць заменены. Таксама не можа быць тайнага галасавання.

**Артыкул 61**

Пакуль не пройдзе 12 тыдняў з дня уручэння Паўнамоцным прадстаўнікам ложаў законапраекту, ён не можа быць унесены на разгляд Вялікага ўсходу.

**Артыкул 62**

Такім самым спосабам будзе ўведзены Скарбавы Статут.

**Артыкул 63**

Адносна адміністрацыйных палажэнняў, якія будуць прынятыя Вялікім варштатам саноўнікаў, Вялікі варштат павінен звярнуцца да Рады Вялікага майстра з запытаннем, ці не пярэчаць гэтыя Палажэнні дадзенаму Канстытуцыйнаму Статуту? Калі Рада Вялікага майстра прызнае іх адпаведнымі Статуту, тады адміністрацыйны Статут стане абавязковым для першага квартальнага паседжання Вялікага ўсходу, на якім ён будзе прадстаўлены для зацвярджэння Паўнамоцным прадстаўнікам.

**Артыкул 64**

У выпадку смерці Вялікага майстра або ягонаму зыходу з пасады перш, чым наступіць абранне новага Вялікага майстра, аніводны законапраект не можа быць прынятым.

## Раздзел XIII. Пра Адапцыйныя ложы

**Артыкул 65**

Стварэнне Адапцыйных ложаў з'яўляецца атрыбутам Вялікага ўсходу.

## Загаловак XIV. Фонды вольных муляраў

**Артыкул 66**

Усе фонды ложаў з'яўляюцца іх уласнасцю.

**Артыкул 67**

Патрэбы Вялікага ўсходу будуць вызначаныя Паўнамоцнымі прадстаўнікамі на Вялікім усходзе па прадстаўленню Вялікага варштату ў форме гадавой выплаты, таксама адносна надзвычайных патрэбаў, і будуць забяспечаныя з фондаў ложаў.

## Раздзел XV. Адказнасць

**Артыкул 68**

Вялікі майстар як кіраўнік Ордэну і Вялікія саноўнікі як яго Рада адказныя за дакладнае выкананне Канстытуцыйнага статуту; яны маюць права нагляду, каб усе ўлады, што належаць да структуры Вялікага ўсходу, а таксама Капітулярныя, Правінцыяльныя і Сімвалічныя ложы, падпарадкаваныя Вялікаму ўсходу Польскаму, цалкам прыстасоўваліся да Канстытуцыйнага статуту.

**Артыкул 69**

Вялікі ўсход Польскі ў межах Каралеўства не прызнае ніводнай ложы, якая б залежала ад чужой Улады вольнамулярскай альбо не прызнала абавязковасць выканання гэтага Статута.

**Часовыя распараджэнні**

I. Гэты Статут з'яўляецца абавязковым і замяняе Статут 5783 г. Аднак тыя артыкулы згаданага Статуту, якія датычаць правілаў падтрымання ладу, захаваюць сваю моц пакуль не будуць замененыя новым арганізацыйным правам.

II. У адпаведнасці з гэтым Канстытуцыйным статутам Вялікі майстар будзе абраны ўсім складам Вялікага ўсходу паводле артыкула 9. Шэсць Вялікіх саноўнікаў толькі ў гэты раз будуць абраныя Вялікім майстрам з шэрагу кандыдатаў, прадстаўленых у трохкратнай колькасці, з сяброў Найвышэйшай капітулы паводле артыкула 50 гэтага Статуту; таксама 13 Вялікіх афіцэраў Усходу будуць абраныя самімі Прадстаўнікамі. У выбарах могуць удзельнічаць толькі тыя сябры Вялікага ўсходу, якія падпісалі Канстытуцыйны статут.

III. Паколькі патрэба арганізацыйнага права і ўвядзення аднастайнасці працаў патрабуе хуткай выпрацоўкі ўсяго таго, што адносіцца да нармальнай арганізацыі кожнай улады, таму, не чакаючы тэрміна ўвядзення ў жыццё праваў, запісаных у Канстытуцыі, пастанаўляем:

каб такое арганізацыйнае права як мага хутчэй было выпрацавана і Вялікаму ўсходу прадстаўлена на яго надзвычайнае паседжанне для разгляду і зацвярджэння.

Мы, Старшыя кіраўнікі Ордэну, сябры Найвышэйшай капітулы, пад Малатком магістральным сабраныя, праект гэтага Канстытуцыйнага статуту вольнага мулярства Польскага прызнаём добрым і карысным для Ордэну, у доказ прыняцця яго ўласнымі рукамі падпісваем.

Адбывалася дня 6 месяца III года ісціннага 5820 або эры звычайнай 1820 г. 6 траўня ў Даліне Варшавы.

Подпісы:
Ражнецкі
Брат Вінцэнт Аксамітоўскі
Аўгустын Глінскі
Фрыдэрык Пфаф
Ян Караль Вільман
Станіслаў Класоўскі
Караль Гофман
Ян Залускі
Станіслаў Навакоўскі
Францішак Дорнфельд

Ян Вэнглінскі
Асінскі
Вэнгжэцкі
Віктар Шолдрскі
Эліаш Алой

Станіслаў Патоцкі Вялікі майстар, Прэзідэнт Найвышэйшай капітулы

(L.S.)

Мы, ніжэйпадпісаўшыеся Прадстаўнікі ложаў, усведамляючы, што далейшае спазненне паправак старой Канстытуцыі нашай, можа прынесці шкоду вольнамулярскаму Ордэну, таксама як відавочнай небяспекай для яго была бы замена ягоных старых прынцыпаў, усведамляючы таксама, што дадзены праект, прыняты ад Найвышэйшай капітулы, гэтага не дапускае, згаджаемся і дазваляем, каб ён быў абвешчаны ў якасці Канстытуцыі Ордэна вольнага мулярства Польскага.

Адбывалася пад Усходам Варшавы дня 16 месяца IIIісціннага года 5820 альбо эры звычайнай дня 16 траўня 1820.

Подпісы:

Як прадстаўнік Вышэйшай капітулы пад асобнай назвай "Братоў, аб'яднаных пад паўночнай зоркай". Падпісваю Ражнецкі.

Як прадстаўнік Надзвычайнай ложы Ніжэйшай капітулы пад асобнай назвай "Святыня спакою". Падпісваю Караль Гофман.

Як прадстаўнік Слаўнай і Дасканалай ложы Св. Яна пад асобнай назвай "Паўночная паходня". Падпісваю Якуб Фрыдэрык Гофман.

Як прадстаўнік Слаўнай і Дасканалай ложы "Братоў палякаў, аб'яднаных на Усходзе Варшавы". Падпісваю Аўгустын Глінскі, Майстар кафедры.

Як прадстаўнік Слаўнай і Дасканалай ложы Св. Яна пад асобнай назвай "Еднасць", якая працуе на Усходзе Замосця. Падпісваю брат Францішак Дорнфельд.

Як прадстаўнік Надзвычайнай ложы Ніжэйшай капітулы пад асобнай назвай "Гара Вавель у Даліне Кракава". Падпісваю брат Ян Караль Вільман.

Як прадстаўнік Надзвычайнай ложы Ніжэйшай капітулы пад асобнай назвай "Сапраўдная еднасць", якая працуе на Усходзе Любліна. Падпісваю брат Міхал Пётроўскі.

Як прадстаўнік Слаўнай і Дасканалай ложы Св. Яна пад асобнай назвай "Вузел еднасці", якая працуе на Усходзе Наваградка. Падпісваю брат Станіслаў Навакоўскі.

Як прадстаўнік Слаўнай і Дасканалай ложы Св. Яна пад асобнай назвай "Славянская еднасць на Усходзе Варшавы". Падпісваю Антоні Гужкоўскі.

Як прадстаўнік Вышэйшай капітулы Віленскай. Падпісваю Станіслаў Вэнгжэцкі.

Як прадстаўнік Ніжэйшай капітулы пад асобнай назвай "Святая Феміда". Падпісваю брат Станіслаў Малахоўскі.

Па выразнаму загаду маёй ложы падпісваю Багуміл Святаполк-Мірскі* , Прадстаўнік і Намеснік ложы "Мінерва на Усходзе Варшавы".

Як прадстаўнік ложы Св. Яна на Усходзе Дубна, якая працуе пад назвай "Усходняя зара". Падпісваю Якуб Панкрацы Сажаньскі.

Як прадстаўнік ложы Св. Яна Віленскі "Славянскі арол". Падпісваю Кэмпен.

Піўніцкі s. a. ложы К.П.

Такарскі s. a. ложы "Плоцкі трохвугольнік".

Тэадор Ноэль s. a. ложы "Вернутая вольнасць на Усходзе Любліна".

Эліаш Алой прадстаўнік ложы Св. Яна на Усходзе Вроцлаўка.

Зачытана на паседжанні Вялікага ўсходу дня 3 траўня ісціннага года 5820.

Станіслаў Патоцкі, Вялікі майстар
Павінна быць апублікавана
С.Патоцкі, В.М.
Па загаду Надзвычайнага і
Наймагутнага Вялікага
майстра Вялікага ўсходу
за Брата Вялікага сакратара
падпісваю брат Фелікс Павел Сжэдзінскі,
Сакратар Вялікага варштату.

*Падрыхтоўка да друку, пераклад і каментар
Алеся Смаленчука*

* У тэксце – Swatopełk Mirski.

# Статут Вялікага ўсходу народаў Расеі. 1912 г.

Адраджэнне вольнага мулярства на тэрыторыі Расейскай імперыі распачалося ў перыяд рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Ролю каталізатара адыграў "Вялікі ўсход Францыі", эмісары якога стаялі ў вытокаў арганізацыйнага афармлення расейскіх масонскіх ложаў. 15 (28) лістапада 1906 г. у Маскве была заснаваная ложа "Адраджэнне". А праз тры гады колькасць вольных муляраў дасягнула амаль 350 чал.[1]

Хуткае развіццё руху адэптаў "каралеўскага майстэрства", а таксама празмерная палітызаванасць многіх братоў прывялі да канфлікту паміж прыхільнікамі разумення вольнага мулярства як філасофска-этычнага руху і тымі братамі, якія бачылі ў масонстве выключна сродак палітычнай барацьбы супраць самаўладдзя. Урэшце рэшт перамаглі апошнія. Вынікам іх перамогі стала рэарганізацыя расейскага масонства і стварэнне ў 1912 г. нерэгулярнай арганізацыі, якая атрымала назву "Вялікі ўсход народаў Расеі". Традыцыйныя маральна-этычныя нормы масонскай ідэалогіі былі падпарадкаваныя прынцыпам расейскага лібералізму.

Паводле расейскага даследчыка І.Сучкова, праект Статуту быў распрацаваны ўзімку 1912 – 1913 гг.[2] Пасля абмеркавання ў ложах ён быў зацверджаны на II Канвенце, які адбыўся летам 1913 г. у Санкт-Пецярбургу. Канвент таксама даручыў Вярхоўнай радзе знайсці магчымасць ягонага канспіратыўнага выдання. У тым жа годзе Статут быў надрукаваны як гістарычны дакумент у якасці дадатку да кнігі Е.Сідарэнкі (верагодна псеўданім), прысвечанай італьянскім карбанарыям 20-30-х гг. XIX ст.[3] Гэтая публікацыя дазволіла братам легальна захоўваць Статут, не прыцягваючы ўвагі паліцыі.

Пазней Статут быў надрукаваны на старонках часопіса *История СССР* (1989. – № 6. – С. 129-134), потым перадрукоўваўся ў выданні *Масоны и масонство.* (Сборник статей. Выпуск 1 / Ред. С.И.Варнов, С.П.Карпачев. – Москва: Эра, 1994. – С. 111-117). Публікацыя была падрыхтаваная І.Сучковым. Менавіта яна стала падставай для падрыхтоўкі да друку дадзенага тэксту.

## Статут масонской арганизации "Великий Восток народов России". Вторая половина 1912 г.

### 1. Задачи и цели ордена

Создание связанного моральной общностью и взаимным доверием братского ордена; братья сохраняют свободу политического действия, но стремятся к утверждению и защите прав человека и гражданина.

Обязанности братьев изложены в формуле обещания, даваемого при посвящении.

---

[1] Аврех А. Масоны и революция. – М., 1990. – С. 184.

[2] Сучков И. Уставы вольных каменщиков России конца XVIII – начала XX веков // Масоны и масонство. Сборник статей Выпуск 1 / Ред. С.И.Варнов, С.П.Карпачев. – Москва: Эра, 1994. – С. 92.

[3] Сидоренко Е. Итальянские угольщики. – Спб., 1913.

**2. Состав ордена**

Орден состоит из братьев и сестёр, посвящённых одной из лож или делегацией Верховного совета.

**3. Орденские степени**

Орден имеет две степени: ученика и мастера.

Братья посвящаются первоначально в степень ученика. Братья, доказавшие на деле свою преданность ордену, усвоившие его традиции и проникшиеся его духом, могут быть впоследствии посвящены в степень мастера.

**4. Посвящение**

*А. Посвящение в степень ученика.*

а. Кандидат предлагается в ложе одним из братьев.

б. По обсуждении кандидатуры и с согласия всех братьев, открыто подающих свои голоса, может быть постановлено о поручении одному из братьев выяснить, желает ли кандидат вступить в орден. При исполнении этого поручения брат не должен открывать кандидату орденской тайны и ни называть ни ордена, ни членов ложи, не должен он и признавать существования братства.

в. О результатах опроса брат сообщает ложе, которая может по единогласному решению избрать двух анкетеров для более подробного опроса кандидата и подготовки его к посвящению. Анкетеры также обязаны не раскрывать орденской тайны. При выборе анкетеров один их должен быть возможно близок к кандидату.

г. По заслушании и обсуждении доклада анкетеров ложа может или постановить о прекращении анкеты, или о продлении ее, или единогласно признать желательным посвящение кандидата и назначить день его испытания.

д. Испытание производится во время заседания ложи. Оно не должно быть прерываемо. Испытуемый не должен общаться с непосвященными во все время обряда испытания.

Доставив испытуемого в назначенное место вне ложи, анкетеры предлагают ему письменно ответить на следующие вопросы:

Каковы Ваши требования к самому себе,

Женщине (мужчине) и

Отечеству, семье,

Человечеству.

Каков Ваш гражданский символ веры.

Затем анкетеры удаляются и возвращаются по зову испытуемого.

Если испытуемый изготовил письменные ответы на поставленные ему вопросы, анкетеры, взяв документ и оставив испытуемого, передают доку-

мент в ложу, немедленно по оглашении сжигают документ. Затем братья могут единогласно постановить о переходе к изустному испытанию в ложе.

По принятии этого постановления анкетеры возвращаются к испытуемому, завязывают ему глаза и приводят в темное помещение ложи. Братья задают испытуемому вопросы, какие найдут нужными. По окончании опроса анкетеры уводят испытуемого обратно в помещение вне ложи. Братья снова обсуждают вопрос о том, достоин ли испытуемый посвящения, и постановляют прекратить обряд, или продолжить испытание, или приступить к самому посвящению. Постановление о посвящении требует единогласного решения ложи.

е. По принятии этого последнего постановления анкетеры снова вводят испытуемого в темное помещение ложи с завязаными глазами. Венерабль объясняет испытуемому цели ордена и обязанности брата и затем спрашивает испытуемого, все ли желает он быть посвященным в братья ордена.

ж. В случае положительного ответа Венерабль предлагает испытуемому поднять правую руку и повторить слова орденского обета:

"Обещаю любить братьев моих масонов. Защищать их в опасности, хотя бы жизни моей грозила смерть. Обещаю хранить орденскую тайну. Не раскрывать существования братства, хотя бы я был спрошен об этом на суде, не открывать ничего, что я узнаю как брат. Обещаю исполнять постановления ложи и высших масонских властей".

з. После произнесения формулы обещания Венерабль берёт посвящаемого за руку и спрашивает анкетеров:

Чего хочет испытуемый?

Анкетеры: Света

Венерабль: Дайте испытуемому света.

Помещение ложи освещается, с испытуемого снимается повязка.

Венерабль: Именем "Великого Востока народов России" посвящаю Вас в братья ложи в степени ученика.

Затем братья дают новому брату поцелуй.

и. Посвящение может быть также совершаемо делегацией Верховного Совета в составе не менее трех мастеров.

*Б. Посвящение в степень мастера.*

Посвящение в степень мастера производится либо ложей в степени мастера по единогласному решению братьев ложи, либо делегацией из трех мастеров по постановлению Верховного совета.

Посвящение не сопровождается новым испытанием. Венерабль указывает посвящаемому на его обязанность с еще большей строгостью исполнять долг масона и затем произносит формулу посвящения: Именем "Великого Востока народов России" посвящаю Вас в степень мастера. Венерабли, ораторы, делегаты на Конвент, избиратели Верховного совета и его члены могут избираться лишь из числа мастеров.

**5. Ложи и их офицеры**

а. Основной орденской организацией является ложа.

б. Ложа состоит из 7-14 братьев.

в. Ложа, в которой присутствуют ученики, работает в степени ученика; ложа, в которой все братья мастера, работает в степени мастера.

г. Верховный Совет может создавать ложи особого назначения, объединяя в них братьев, принадлежащих к различным ложам.

д. Каждая ложа избирает сроком на один год следующих офицеров:

Венерабля

1-го Наблюдателя

из мастеров

2-го Наблюдателя

Оратора

Казначея

из мастеров или учеников

Секретаря

Должности Наблюдателей могут и не замещаться.

Обязанности Секретаря и Казначея могут быть совмещаемы.

Венерабль руководит работами ложи. Через него ложа сносится с Секретарём Верховного совета.

Наблюдатели замещают Венерабля.

Оратор разрешает возникающие при работах ложи вопросы Устава. Решения его принимаются в заседаниях ложи как окончательные, но правильность их может быть оспорена в ближайшем заседании, и решение отвергнуто на будущее время.

Секретарь – хранитель истории ложи. Никаких записей секретарь не ведет и по памяти восстанавливает отдельные события из жизни и деятельности ложи.

Казначей производит установленые ложей сборы и хранит средства ложи.

е. Ложа, состав которой превысит 13 братьев, может выделить из своего состава 7 братьев, образующих новую ложу.

ж. В местности, где лож нет, но где имеется не менее 7 братьев, по постановлению Верховного совета может быть инсталирована новая ложа делегацией в составе трех мастеров.

з. Каждая вновь образуемая ложа избирает себе особое наименование и избирает должностных лиц.

**6. Работы ложи**

а. Работы ложи открываются Венераблем или Наблюдателем по прибытии в назначенное время 7 братьев:

Венерабль: Все ли присутствующие масоны?

Наблюдатель (или Секретарь): Все присутствующие масоны.

Венерабль: Заперты ли двери?

Наблюдатель (или Секретарь): Двери заперты.

Братья, которым до конца работ предстоит удалиться, предупреждают об этом Венерабля.

Первым разрешается вопрос о времени и месте следующего собрания. Затем принимается порядок дня. Братья просят слова, единожды ударяя в ладоши.

Во время работы братья не курят.

По исчерпании повестки Венерабль обращается к Наблюдателю (если в ложе нет Наблюдателей, то к Секретарю):

В котором часу братья кончают свои работы?

- В полночь.

- Который час?

- Полночь!

Затем ложа кончает свои работы.

**7. Орденская тайна**

а. Братья обязаны хранить в тайне как само существование ордена, так и все, что касается его состава, планов и деятельности.

б. Братья обязаны хранить в тайне все сообщенное им в братском порядке или ставшее известным в заседании ложи.

в. Братья знают лишь членов своей ложи.

г. Венерабль знает Секретаря Верховного совета.

д. Все, относящееся к орденской тайне, не должно быть излагаемо на письме.

е. Письменные ответы испытуемого и баллотировачные записки немедленно сжигаются в самой ложе.

**8. Усыпление**

а. Орденское звание сохраняется братьями пожизненно.

б. Каждый брат вправе "уснуть", сообщив о своем решении своей ложе.

в. "Уснувший" брат, пожелавший вернуться к участию в работах братства, может быть принят по единогласному решению одной из лож. Принятию решения предшествует анкета, какую найдёт нужным провести ложа.

г. Ложа может "усыпить" нарушившего обязанности ордена брата.

д. Верховный совет может "усыпить" ложу, нарушившую орденские обязанности. Верховный совет может "усыпить" и отдельных братьев.

е. "Уснувшие" и "усыпленные" братья с момента "усыпления" освобождаются от исполнения орденских обязанностей. Но они остаются связанными обетом хранения орденской тайны.

**9. Конвент**

а. Не реже раза в год Верховный совет созывает Конвент ордена.

б. На Конвент каждая ложа посылает 2-3 представителей, избранных ложей из числа ее братьев-мастеров.

в. Конвент является высшим законодательным органом ордена. Он устанавливает основные положения работ ордена на предстоящий год.

г. Конвент избирает выборщиков в Верховный совет

д. В состав Конвента входят помимо представителей лож члены и Секретарь выбывающего состава Верховного совета.

**10. Верховный совет**

а. Верховным руководителем орденских работ, хранителем орденских традиций, высшим судьёй в ордене и исполнителем решений Конвента является Верховный совет, избираемый на срок до ближайшего годового Конвента и состоящий из 6-8 членов, включая Секретаря.

б. Порядок избрания Совета таков

Большинством 7/8 голосов Конвент избирает трех выборщиков. Секретарь Верховного совета последнего состава подсчитывает голоса и, не оглашая результатов голосования, сообщает выборщикам о состоявшемся избрании.

Выборщики избирают затем трех членов Верховного совета и по избрании таковых слагают с себя полномочия.

Избранные еще три члена Верховного совета немедленно избирают еще трех членов Верховного совета.

В последующем Верховный совет может доизбирать членов, но с тем, чтобы общее их число не превосходило 18.

По избрании первых 6 членов Верховный совет открывает свои работы и избирает секретаря.

Имена членов Верховного совета Конвенту не сообщаются.

в. Верховный совет работает в порядке ложи.

г. С ложами Верховный совет сносится через Секретаря и Венераблей.

д. Часть средств ложи, определяемая конвентом, поступает в распоряжение Верховного совета.

*Падрыхтоўка да друку і каментар*
*Алеся Смаленчука*

# Аўтабіяграфія Браніслава Адамавіча Тарашкевіча. 1933 г.

## (Фрагменты)



Б. Тарашкевіч (1892-1938). Фотаздымак. 1925 г.

Браніслаў Тарашкевіч (1892-1938) увайшоў у беларускую гісторыю як грамадскі і палітычны дзеяч, публіцыст, мовазнаўца і перакладчык. Ён стаяў у вытокаў адраджэння Беларускай сацыялістычнай Грамады ў 1917 г., у 1918 г. выдаў Беларускую граматыку для школ, якая ўпершыню вызначыла правапісныя і граматычныя нормы сучаснай беларускай мовы. Напачатку 20-х гг. кіраваў Беларускім пасольскім клубам, а ў 1925 г. быў сярод заснавальнікаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Сядзеў у польскіх і савецкіх турмах і быў растраляны як "вораг народа" ў лістападзе 1938 г.

Зрэшты, асноўныя вехі біяграфіі Б.А.Тарашкевіча добра вядомыя. А вось ягоны ўдзел у руху вольных муляраў, сяброўства ў масонскім братэрстве ў 20-ыя гг. доўгі час заставаліся таямніцай. Між тым Б.Тарашкевіч ужо ў 1933 г. прызнаў "масонскі эпізод" свайго жыцця на старонках аўтабіяграфіі, напісанай па прапанове супрацоўнікаў АДПУ СССР. Карыстацца гэтай крыніцай трэба з пэўнай асцярожнасцю. У момант яе напісання многія сябры і паплечнікі Б.Тарашкевіча былі асуджаныя на смерць па справе г.зв. "Беларускага нацыянальнага цэнтра" як "ворагі народу". Безумоўна, усё гэта паўплывала на беларускага дзеяча. Можна цалкам пагадзіцца з Анатолем Валахановічам і Уладзімірам Міхнюком, якія ў кароткім каментары да публікацыі аўтабіяграфіі на старонках *Спадчыны* адзначылі, што "выказванні і ацэнкі былога лідэра Грамады абумоўленыя той задушлівай маральна-псіхалагічнай і ідэйна-палітычнай атмасферай <…> у якой ён апынуўся[1]".

Апошняе цалкам датычыць "масонскага сюжэту". У прыватнасці, звяртае ўвагу тое, што Б.Тарашкевіч значна больш распавёў пра працы варшаўскай ложы "Праўда", у якую ўваходзіў напачатку свайго вольнамулярскага шляху, чым пра віленскую ложу, з якой быў звязаны больш часу. Ён нават не згадаў яе назву. Між тым, паводле інфармацыі польскага гісторыка Людвіка Хаса, Б.Тарашкевіч быў сябрам ложы "Тамаш Зан", якая належала да "Вялікай Нацыянальнай ложы Польшчы". Той жа аўтар сцвярджае, што беларускі палітык пакінуў масонства ў 1925 г.[2]

Тым не менш пры зразумелым крытычным стаўленні да тэксту аўтабіяграфіі як гістарычнага дакументу, яна ўсё ж часткова перадае ідэйную атмасферу, якая панавала на паседжаннях масонаў і палітычную арыентацыю многіх варшаўскіх і віленскіх братоў.

Фрагменты аўтабіяграфіі Б.Тарашкевіча друкуюцца паводле публікацыі часопіса *Спадчына* (1996. – № 4. – С. 96-132), падрыхтаванай А.Валахановічам і У.Міхнюком.

---

[1] Валахановіч А., Міхнюк У. Споведзь у надзеі застацца жывым // Спадчына. – 1996. – № 4. – С. 95.

[2] Hass L. Wolnomularze polscy w kraju i na świecie. 1821-1999. Słownik biograficzny. – Warszawa, 1999. – S. 498.

## Аўтабіяграфія Браніслава Адамавіча Тарашкевіча

## Чл. КПП (КПЗБ) з 1925 г.

<…> Да гэнага часу (восень 1920 г. – *А.С.*) адносіцца і прыняцьцё мяне ў масонскую лёжу "Праўда" ў Варшаве.

Рыхтаваў мяне да масонства мой стары знаёмец з Пецярбургу інжынер Зябіцкі. У мінуласьці ён меў дачыненьне да работніцкага рэвалюцыйнага руху і нават валодаў сацыял-дэмакратычным выдавецтвам, а польскімі справамі стаў цікавіцца толькі з часу вайны й рэвалюцыі. У 1917 г. спачуваў бальшэвіцкай рэвалюцыі, але ў значнай ступені з меркаваньняў нацыянальнага характару. У Польшчы некаторы час быў дырэктарам гаспадарчага дэпартаменту ў Міністэрстве замежных справаў, але ўжо ў 1920 годзе адтуль пайшоў і працаваў па сваёй спэцыяльнасці, займаючыся адгэнуль палітыкай толькі ў масонскім "брацтве". А гаварыў ён мне гэткія словы. Ён, маўляў, належыць да людзей, каторыя спачуваюць беларускаму руху, сам нават родам з Беларусі (Інфлянты). Рыскі трактат робіць палажэньне трагічным. Але не трэба маркоціцца, таму што магчыма, што якраз падзел Беларусі стане паваротным пунктам яе адраджэньня: наступіць спадужаньне паміж абодвума бакамі граніцы, урады будуць старацца беларускае пытаньне выкарыстаць адзін супраць другога. Ён і ягоныя палітычныя прыяцелі належыць да тых, якія хацелі б судзеяць стварэньню беларускага П'емонту на занятай Польшчаю тэрыторыі. Але для гэтага канечна ўзаемнае разуменьне і давер людзей сумленных, адданых справе і ўплывовых, без нацыянальных і рэлігійных забабонаў. Ён лічыць мяне чалавекам, дастойным поўнага даверу, і хацеў бы ўвесці мяне ў кола людзей, блізкае знаёмства з каторымі для мяне будзе ва ўсім карысным.

Тут даў для азнаямленьня статут "Вялікай лёжы". Гэткія статуты ведамыя з друкаванай літаратуры, якая адносіцца да масонства. Туманная містыка з "вялікім будаўніком сьвету" замест бога. Ані слова аб палітыцы, затое многа аб розных грамадзкіх, сямейных і спэцыяльна "брацкіх добрых дзеях".

Па малым часе пасьле гэтага я быў прыняты ў "брацтва" на ўрачыстым паседжаньні (калі не багаслужбе) у галоўнай "сьвятыні" ў Варшаве (вул. Злота). Сьпярша ў аддзельным пакойчыку вы запаўняеце біяграфічную анкету, затым вам завязваюць вочы і ўводзяць у храм. Над галавоюляскат зброі, урачыстым голасам падаюцца словы прысягі: сумленна жыць, захоўваць тайны, памагаць братом. За незахоўваньне тайны – праклён. Увогуле столькі ўрачыстасьці й жуды, што чалавеку з самым малым пачуцьцём гумару трудна ўтрымацца ад сьмеху. Але, калі мне зьнялі павязку, я з пэўным здзіўленьнем убачыў вельмі сур'ёзныя твары ўсіх у маім акружэньні. Наступіла прамова вялікага магістру ордэну, ведамага польскага пісьменніка Анджэя Струга. Гаварыў высакамоўнымі афарызмамі ў стылі сьпірытычных сэансаў. Ня буду

затрымвацца на масонскім рытуале, абрадах, каторыя ў цяперашнім часе вельмі спрошчаны.

Мяне ўвялі ў лёжу "Праўда", да якой належалі Зябіцкі, Кноль, Дароўскі, Гліўіц, Альтберг, М.Клет, М.Арцішэўскі (дыплёмат, не пэпэсавец), Лукасевіч, Скомпскі, Касьяровіч, Гусарскі, Тарноўскі, Гростэрн, Бяніслаўскі.

З сустрэтых мною ў лёжы і заслужаных прозьвішчаў магу назваць такія: Нарутовіч, былы прэзыдэнт, Ашкеназі, Сьпічынскі, Лядніцкі, Прыстар, браты Даўнаровічы, Ходзька, былы міністар аховы здароўя Вітальд Геежынскі.

Кабецкі ў канцы размовы, якую перадаю ніжэй, тройчы паціснуўшы руку, даў мне зразумець, што і ён масон. Але ў лёжы я яго не сустракаў.

[Віленская масонская лёжа]

З прычыны таго, што я вельмі рэдка бываў у Варшаве, мяне даручылі віленскай лёжы[3], назову якой не памятаю (імені Траўгута). У яе ўваходзілі:

1) Вітальд Абрамовіч
2) Бран. Кшыжаноўскі[4]
3) Ян Пілсудзкі
4) Вінцэнты Лучынскі, адвакат
5) Вімбар Казімер, стараста гор. Вільні
6) Нагродзкі, уладальнік складу сельскагаспадарчых машынаў, тутэйшы дзяяч
7) Турскі, дзяяч коопэрацыі
8) Ген. Такажэўскі
9) Кіртыкліс
10) Заштаўт
11) Багінскі, адвакат
12) Акуліч
13) Касьцялкоўскі
14) Кап. Дунін-Вансовіч
15) Мар'ян Сьвяхоўскі
16) Станевіч
17) Вышынскі

Існуючае польскае масонства называецца "Вялікаю лёжаю" шкоцкага абраду ў адрозненьні ад французскага абраду "Лёжы Вялікага ўсходу", з каторым знаходзіцца ў антагонізьме. Расейскае масонства было зьвязана з французскім. Між іншым, да французскага абраду належаў і ведамы ў Вільні адвакат Урублеўскі[5]. Выраз "шкоцкі абрад" мне выясьнілі так, што польскае ма-

[3] Паводле Людвіка Хаса, гэта была ложа "Тамаш Зан", якая належала да Вялікай нацыянальнай ложы Польшчы (Hass L. Wolnomularze polscy w kraju i na świecie. 1821-1999. Słownik biograficzny. – Warszawa, 1999. – S. 498, 594).

[4] У польскай мове прозвішча запісваецца як Krzyżanowski (заўвага А.С.).

[5] Б.Тарашкевіч памыляецца, пераказваючы досыць пашыраныя ў Вільні чуткі, якія на самой справе не мелі рэальнай падставы (заўвага А.С.).

сонства паявілася ў канцы імпэрыялістычнай вайны і атрымала "пасьвячэньне" ад італійскай лёжы-маткі, каторая ў сваю чаргу атрымала ад ангельскай. Польскае масонства, гаварылі мне, ставіць сабе, між іншым, задачу шыраньня масонства на ўсходзе, сярод украінцаў і беларусаў. Украінская лёжа ўжо існавала. На чале яе стаяў польска-украінскі дзяяч Стэмпоўскі. Хто ў яе ўваходзіў, ня ведаю. Пры маёй помачы меркавалася стварыць у быдучыні беларускую лёжу. Мелі на думцы прафэсара Іваноўскага і інжынера Дубейкаўскага. Але першаму быў зроблены адвод з прычыны ягонага заблытанага сямейнага жыцьця, а Дубейкаўскага ўважалі за чалавека задужа абмежаванага. Увогуле выбіралі людзей з вялікаю асьцярожнасцяй і захоўвалі консьпірацыю. Узаемапомач паміж "братамі" існавала ня толькі на словах. Прыкладам гэтага – міністэрская кар'ера Людкевіча. Наагул, пры кожным міністэрскім крызісе ў новы габінэт пападалі масоны.

У 1921 г. польскае масонства расло вельмі хутка, і ў лёжы "Праўда" выказваліся асьцярогі, што да масонства можа прымазацца дужа шмат непажаданых элементаў, каторыя ў пагоні за кар'ераю шукаюць апякунства ў лёжах. Сколькі лёжаў было ў Варшаве, ня ведаю, але дзесьці больш за дзесяць. А віленская лёжа так разраслася, што плянавалі стварыць другую.

<…> Чым займаецца масонства на сваіх паседжаньнях? У статуце я чытаў пра добрыя чыны, а на практыцы бачыў толькі палітыку. У Варшаве існавала тэндэнцыя да некаторай спэцыялізацыі лёжаў. Былі лёжы прафэсарскія, адвакацкія. Вось што мне памятаецца, ведама, у самым агульным выглядзе з гутарак у лёжы "Праўда".

У першай палавіне 1921 г. на сходах лёжы "Праўда" быў ня больш як 3-4 разы, таму што жыў тады ў Вільні (працаваў у дэпартаменце асьветы). Два разы меў даклад Гусарскі, якога лічылі добрым экономістам. Працаваў ён у Міністэрстве гандлю і прамысловасьці. Даклад быў на тэму адбываных зьменаў у пасьляваеннай экономічнай структуры, аб рацыяналізацыі вытворчасьці, у прыватнасьці, аб мэтадах амэрыканскага капіталізму. Ведама, і дакладчык, і слухачы вельмі оптымістычна ацэньвалі пэрспэктывы разьвіцьця капіталістычнай гаспадаркі наагул, а Польшчы ў прыватнасьці. Пра Совецкую Расею Дароўскі выказаўся так: "Каб падняць Расею ў экономічным пляне на даваенны ўзровень, трэба, прынамсі, 10 гадоў добрага капіталістычнага гаспадараньня, а большэвікі ўвогуле няздатны справіцца з разрухай". Ня ведаю, наколькі ён зьмяніў свой пагляд ў часе свайго перабываньня ў Маскве польскі пасланцом. Памятаю, што палажэньне Советаў у 1921 годзе вызначалася як зусім катастрофічнае: кранштадзкае паўстаньне, голад, прамысловая разруха. Чакаўся ў блізкай будучыні контррэволюцыйны крызыс. Большэвіцкую рэволюцыю лічылі тыпова расейскім гісторычным зьявішчам, гэткаю "смутнаю парою", якая выпадае Расеі на пачатку кожнага стагодзьдзя. Амаль агуль-

наю была думка, што дыктатура пролетарыяту будзе зрынена ваеннай дыктатурай, якая распачне сабою доўгі пэрыяд нацыяналістычнай рэакцыі, значна небяспечнейшай для незалежнасьці Польшчы, як Савецкая Расея. Пры гэткім паглядзе на рэчы робіцца вывад, што чым даўжэй працягнецца гэтая "анархія", тым лепш будзе для Польшчы, тым большы будзе прыгатавальны перыяд для яе актыўнага ўмяшаньня ў развязаньне "расейскага пытаньня". Прадбачылася, што Польшча змушана будзе ў "крытычны момант" умяшацца ў расейскія праблемы ўжо хаця б таму, каб не застацца ўбаку або адзаду за іншымі, асабліва за немцамі. У момант расейскага крызісу Польшча павінна вырашыць канчаткова гісторычнае пытаньне аб існаваньні сваім як вялікай дзяржавы. Асабліва распускаў цуглі фантазіі Кноль, ён лічыўся знаўцам расейскага, у прыватнасьці, украінскага пытаньня: для вялікадзяржаўнасьці Польшчы трэба адарваць Украіну і Беларусь, далучыць Усходнія Прусы, Літву і Латвію ўцягнуць у польскі фэдэратыўны саюз. Правядзеньне гэтага пляну лічыў магчымым да таго часу, пакуль Нямеччына раззброена, а на ўсходзе хаос. Разьвіцьця соцыялістычнага будаўніцтва ніхто не прыпушчаў. Тады не было асьцярогаў, што да рэволюцыйнага ўплыву Советаў на польскія масы. Дачынна Нямеччыны далёка ня ўсе пагаджаліся з думкамі Кнолевымі: многія ўважалі, што, наадварот, Польшча павінна і можа супольна з Нямеччынай вырашаць праблемы на ўсходзе: пытаньне аб так званым калідоры тады не стаяла так востра, як цяпер.

Лёжа "Праўда" ўвогуле была опозыцыйна настроена да афіцыяльнага франкофільскага курсу польскай палітыкі, лічучы яго эндэкаўскім. Уважалі, што Польшча, маючы перад сабою вырашэньне "вялікіх" усходніх задачаў (знакамітую Ягелёнскую місію), павінна перасесьці на ангельскага каня.

У "Праўдзе" былі разважаньні па пытаньні дзяржаўнай і соцыяльнай структуры Польшчы. Увогуле панаваў дух пагарды што да парляменцкай дэмакратыі. Затое папулярнымі былі тэорыі "грамадзкай эліты". Гэтыя настроі паглыбіліся асабліва, калі гэткі "інтэлігенцкі" выбарны сьпісак, на каторым стаяла многа масавых[6] прозьвішчаў, з трэскам, ганебна праваліўся на выбарах 1922 году. Гэтыя фашыстоўскія тэорыі пазьней знайшлі сваё публічнае выражэньне ў афіцыяльных выступленьнях Пілсудзкага, Славэка і інш.

Віленьская лёжа займалася больш тутэйшымі пытаньнямі, у прыватнасьці, лёсам Сярэдняй Літвы ў сувязі з аўтаномічнымі плянамі Пілсудзкага, якія мелі за абсалютную мэту захоп Літвы пад прыкрыцьцём "краёвай ідэолёгіі". Аднаго разу я паставіў на абмеркаваньне пытаньне аб беларускіх школах, каторыя пачалі душыць пасля таго, як старшыня часовай урадавай камісіі Сярэдняй Літвы Абрамовіч пад націскам эндэкаў мусіў ісьці ў адстаўку. Пры абмеркаваньні гэтага пытаньня многія з "братоў" прыадкрылі свае полёніза-

---

[6] падобна на памылку друку або апіску. Верагодна павінна стаяць слова "масонавых" (заўвага А.С.).

тарскія твары, што выклікала з майго боку рад вострых дакораў. З гэнага часу я стаў радчэй бываць на паседжаньнях, асабліва посьле таго, як уплывовыя людзі не захацелі пратэставаць проці высылкі Мяйштовічам па выбарах у віленскі сойм 33 беларусаў і літоўцаў у Коўну. Апрача таго, я заўважыў, што яны мелі нарады па гэтым пытаньні без майго ўдзелу. Віленская лёжа з свайго боку была незадаволена маім удзелам у арганізацыі бойкоту віленскага сойму. Посьле выбару мяне дэпутатам я бываў толькі ў лёжы "Праўда" ў Варшаве.

Віленская лёжа посьле майскага перавароту павінна граць значную ролю ў мясцовым палітычным жыцьці. Найбольш знакамітым яе дзеячом трэба лічыць былога міністра, цяпер рэктара Віленскага унівэрсітэту Станевіча <...>

*Падрыхтоўка да друку і каментар*
*Алеся Смаленчука*

# Храналогія. Слоўнік. Бібліяграфія.

## Храналогія гісторыі руху вольных муляраў. XVIII – першая трэць XX ст.

**1717 г., 24 чэрвеня** – стварэнне Вялікай ложы Англіі (Вялікі майстар Энтані Сэйер). Існавала толькі адна ступень пасвячэння.

**1719 г., 24 чэрвеня** – Вялікім майстрам абраны Тэафіл Дэзагюлье, які паклаў пачатак збору старажытных рукапісаў.

**1720 г.** – падчас побыту ў Лондане ў Вялікую ложу ўступіў Шарль Мантэск'е.

**1721 г.** – Вялікім майстрам абраны герцаг Мантэгю. Прынята рашэнне пра сістэматызацыю старажытных рукапісаў і распрацоўку Статута.

**1723 г.** – публікацыя *Кнігі Канстытуцый*, падрыхтаванай Джэймсам Андэрсанам. Уводзяцца дзве ступені – Вучань и Чаляднік (Падмайстар).

**1723 г., 11-13 красавіка** – у газеце *Flying Post* публікуецца першы катэхізіс масонаў.

**1724 г.** – выйшла з друку кніга *The Grand Mystery of the Freemasons Discovered*.

**1725 г.** – заснаванне першай ложы на тэрыторыі кантынентальнай Еўропы, у Парыжы (існавала да 1734 г.);
– узнікненне Вялікай ложы Ірландыі (Дублін).

**1728 г.** – заснаванне ложаў у Мадрыдзе і Анцігуа;
– у Вялікую ложу Англіі прыняты Эдвард Рамсэй (1696-1743), будучы заснавальнік Шатландскага рытуала.

**1729 г.** – заснаванне ў Варшаве першай на тэрыторыі Рэчы Паспалітай масонскай ложы "Да трох Братоў" ("Rux trois Frares").

**1730 г.** – увядзенне трэцяй ступені пасвячэння (Майстар);
– публікацыя антымасонскай кнігі Прычарда *Massonry Dessected*;
– Марцін Клэр надрукаваў *Абарону масонства;*
– Вялікі сакратар Вялікай ложы Ірландыі Джон Пенэл апублікаваў новую версію *Кнігі Канстытуцый.*

**1734 г.** – пабудова масонскага храма ў Філадэльфіі;
– створана ложа ў штаце Джорджыя (Саванна) Джэймсам Аглеторпам;
– Бенджамен Франклін (1706-1790) апублікаваў у Філадэльфіі першую *Масонскую кнігу*;
– заснавана ложа ў Гааге (Нідэрланды).

**1735 г.** – заснаванне першай ложы ў Італіі (Рым);

– масонская ложа ў Партугаліі атрымала хартыю ад Вялікай ложы Англіі.

**1736 г.** – заснаванне Вялікай ложы Шатландыі;
– Э.Рамсэй – Вялікі прамоўца Вялікай ложы Францыі – апублікаваў кнігу *Апалогія свабодных і пасвечаных масонаў.*

**1737 г., 28 сакавіка** – *New York Gazette* паведаміла пра існаванне ложы ў Нью-Ёрку.

**1738 г.** – доктар Джэймс Андэрсан апублікаваў другое выданне *Канстытуцый вольных муляраў;*
– антымасонская булла папы Клімента XII *In Eminenti*. Каталікам забаранялася ўступаць у ложы.

**1739 г.** – узнікненне Старажытнай Вялікай ложы, якая працавала па Шатландскаму рытуалу;
– пачатак праследу масонаў у Фларэнцыі (Італія).

**1740 г.** – сябры мадрыдскай ложы кінутыя ў турму (Іспанія);
– Эдыкт караля Філіпа V пра выгнанне франкмасонаў з Італіі.

**1741 г.** – заснаванне ложы ў Аўстрыі і ложы Шатландскага рытуалу ў Берліне.

**1743 г.** – арышты масонаў у Партугаліі. Барацьбу супраць вольных муляраў пачынае інквізіцыя;
– першая згадка пра чацвёртую ступень масонскага пасвячэння;
– выданне французскага пераклада *Кнігі канстытуцый* у Франкфурце-на-Майне.

**1749 г.** – заснаванне ложы ў Канадзе;
– Б.Франклін абраны Правінцыяльным Вялікім майстрам Пенсільваніі.

**1751 г.** – іспанскі святар Джозаф Тарубія прадставіў Вялікім інквізітарам спіс 97 ложаў;
– кароль Фердынанд VI забараніў масонскі ордэн у Іспаніі;
– Папа Бенедыкт XIV выдаў антымасонскую булу *Providas.*

**1751 г., 17 ліпеня** – ірландскія масоны заснавалі Старажытную Вялікую ложу Англіі (Ёркскі рытуал).

**1753 г., жнівень** – Джордж Вашынгтон атрымаў трэцюю масонскую ступень;
– ложа шатландскага рытуала заснавана ў Франкфурце.

**1756 г.** – узнікла Вялікая ложа Нідэрландаў.

**1758 г.** – заключаны саюз паміж Вялікай ложай Ірландыі і Старажытнай Вялікай ложай;
– масонская ложа заснаваная ў Бамбее (Індыя).

**1761 г.** – Вялікая ложа Ёркскага рытуала заснавана ў Пенсільваніі.

**1764 г.** – антымасонскі ўказ імператрыцы Марыі-Тэрэзіі (Аўстрыя).

**1766 г.** – І.Гердэр уступіў у масонскую ложу “Zum Schwerte”.

**1767 г.** – заснаванне ложы ў Кітае (з дазволу Вялікай ложы Англіі).

**1769 г.** – астраном Лаланд заснаваў у Парыжы ложу "Дзевяці сясцёр", сябрамі якой сталі Кандарсэ, Б.Франклін, Дантон, Дэмулен, Вальтэр (1788).
– у Канстанцінопале створаны філіял Вялікай ложы Швейцарыі.
– Вялікая ложа Англіі выдала хартыю незалежнасці нідэрландскім ложам і прызнала іх суверэнітэт.

**1770 г., 22 траўня** – заснаванне першай ложы "Двух Арлоў" на беларускіх землях (Магілёў). Існавала да 1790 г. (Паводле М.Рыбко ложа называлася "Да трох Арлоў").

**1771 г.** – заснаванне першай ложы ў Расейскай імперыі.

**1772 г.** – заснаванне першай ложы ў Паўднёвай Афрыцы;
– Уільям Прэстан выдаў *Illustration of Free Masonry* (да 1861 г. кніга перавыдавалася 17 разоў).

**1772 г.** – заснаванне Вялікага ўсходу Францыі.

**1773 г.** – заснаванне Вялікай Нацыянальнай ложы Францыі.

**1775 г.** – Эдуард Гібон уступіў у масонскую ложу ў Лондане;
– масонскі канвент у Браўншвейгу.

**1776 (1777?) г.** – заснаванне ў Магілёве ложы "Геркулес у калысцы".

**1777 г.** – у Полацк з Масквы перабіраецца ложа "Талія".

**1778-1779 гг.** – у Магілёве заснаваная яшчэ адна ложа (Майстар кафедры – У.Палянскі)

**1780 г.** – дзейнасць ложы "Добры пастыр"(?) у Слоніме;
– Іаган Вольфганг Гётэ стаў сябрам ложы "Амалія".

**1781 г.** – заснаванне ў Гародні ложы "Шчаслівае вызваленне" ("L'hereuse Delivrance"). Існавала да 1809 г. (?);
– утварэнне Вялікай Нацыянальнай ложы Вялікага ўсходу Польскага;
– заснаванне Вялікай ложы Нью-Ёрка;
– Робэрт Бэрнс уступіў у ложу "Святога Давіда" ў Тарболтоне (Шатландыя).

**1782 г.** – Вільгельмсбадскі канвент і ўтварэнне Расейскай правінцыі сістэмы "Строга нагляду" ("Stricte Observanz)". Прыняцце новага Статута вольных муляраў.

**1784 г., 26 лютага** – заснаванне Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Прыняцце Статута;
– заснаванне ложы "Пераможаныя забабоны" (Нясвіж);
– у ложу ў Вене ўступіў Амадэй Моцарт.

**1789 г.** – Вялікім майстрам у Англіі абраны прынц Уэльскі;
– у Рыме арыштаваны і асуджаны як масон граф Каліостра.

**1791 г.** – у Шклове працавала ложа "Мудрасць".

**1792 г., 1 жніўня** – Указ Кацярыны II пра забарону дзейнасці масонскіх ложаў.

**1795 г.** – антымасонскі эдыкт імператара Франца II. Ліквідацыя масонскіх ложаў у Аўстрыі.

**1797 г.** – Томас Сміт Уэб (1771-1819) апублікаваў *Freemason's Monitor*, які вытрымаў шмат выданняў;

– абат Баруэль выдаў *Мемуары да гісторыі якабінізма*, у якіх абвінаваціў масонаў у падрыхтоўцы рэвалюцыі;

– Джон Робінсан выдаў *Доказы змовы супраць усіх рэлігій і ўрадаў Еўропы, створанай на тайных сходах франкмасонаў, ілюмінатаў і таварыстваў чытання*.

**1799 г.** – аб'яднанне Вялікага ўсходу і Нацыянальнай ложы Францыі.

**1801 г.** – Вальтэр Скот уступіў у ложу "Святога Давіда" ў Эдынбургу.

**1807 г.** – утварэнне ў Варшаве ложы з ліку вайскоўцаў, што стала пачаткам адраджэння вольнага мулярства на польскіх землях.

**1809 г.** – заснаванне Вялікага ўсходу Італіі.

**1810 г.** – заснаванне ложы "Шчаслівае вызваленне " (Нясвіж). Існавала да 1821 г.;

– аднаўленне дзейнасці масонскіх ложаў у Партугаліі. Аднак хутка яны зноў былі зліквідаваныя.

**1810 г., 22 сакавіка** – аднаўленне працы Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага. Аднак ваенныя дзеянні прымусілі вольных муляраў ізноў спыніць свае працы.

**1813 г.** – аб'яднанне Старажытных і Сучасных (новых) ложаў у адзіную Аб'яднаную Вялікую ложу старажытных масонаў;

– заснаванне новага рытуала "Місраім" у Італіі.

**1814 г.** – Вялікія ложы Ірландыі, Англіі і Шатландыіі падпісалі *International Compact*, у якім узгаднялі асноўныя пастулаты масонства.

**1815 г.** – паўторнае аднаўленне працы Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага.

**1816 г.** – аднаўленне працы ложаў "Руплівы ліцьвін" і "Добры пастыр" (абедзве ў Вільні), заснаванне ложаў "Школа Сакрага" (Вільня), Палямон" (Расіены Ковенскай губ.), "Паўночная паходня" (Менск), "Багіня Цэрэра" (Наваградак).

**1817 г., 20 траўня** – заснаванне ложы "Сябры чалавецтва" (Гародня).

**1817 г.** – перайменаванне ложы "Багіня Цэрэра" ў "Вузел еднасці" (Наваградак).

**1818 г.** – спроба Якуба Шымкевіча і Казіміра Контрыма ("Руплівы ліцьвін") рэфармаваць масонскую канстытуцыю на беларускіх, літоўскіх і польскіх землях і пératварыць ложы ў масавыя легальныя арганізацыі;

– заснаванне ложы “Уладзіслаў Ягайла” (Слуцк).

**1818-1819 гг.** – у Вільні працавалі Правінцыяльная ложа “Дасканалая еднасць” і сімвалічныя ложы “Руплівы ліцьвін”, “Храм мудрасці”, “Добры пастыр”, “Школа Сакрата” і “Славянскі арол”.

**1819 г.** – заснаванне ложы “Святыня спакою” (Нясвіж). Праца ложаў “Святасць змовы”, “Святыня поўначы” (усе ў Менску), “Саюз справядлівасці і дасканаласці” (Шклоў) і капітулярнай ложы “Гара Табар” (Менск).

**1820 г., 3 траўня** – прыняцце Канстытуцыйнага Статуту вольнага мулярства Польскага.

**1822 г., 1 жніўня** – Указ Аляксандра I пра забарону масонскіх ложаў на ўсёй тэрыторыі Расейскай імперыі.

**1825 г.** – антымасонская була папы Льва XII *Qui garaviora*.

**1829 г.** – папа Пій VII выдаў антымасонскую булу *Traditti*.

**1832 г.** – папа Рыгор XVI выдаў антымасонскую булу *Mirari*.

**1838 г.** – заснаванне новага рытуала “Мемфіс”.

**1839 г.** – вольны муляр Джэймс Холівэл знайшоў у сховішчах Брытанскага музея манускрыпт *Regius*, які сталі лічыць найбольш старажытнай часткай масонскіх канстытуцый, напісанай каля 1390 г. Арыгінальная назва дакумента “Паэма аб маральных абавязках”.

**1841 г.** – у масонскую ложу Франкфурта ўступіў Ферэнц Ліст.

**1842 г.** – заснаванне першай ложы ў Новай Зеландыі.

**1845 г.** – Карнэліус Мур выдаў першы нумар *Masonic Review*. Выданне выходзіла на працягу 50 гадоў;
– Альберт Макей выдаў *Lexicon of Freemasonry*.

**1846 г.** – папа Пій IX выдаў антымасонскую булу *Qui Fluribus*.

**1849 г.** – папа Пій IX выдаў антымасонскую булу *Quibis quantisque Malis*.

**1850 г.** – Вялікая ложа Шатландыі заснавала ложу ў Аравіі.

**1852 г.** – Каралева Брытаніі Вікторыя стала патранэсай масонскай школы для хлопчыкаў.

**1855 г.** – Робэрт Морыс пачаў друкаванне 30 тамоў *Універсальнай масонскай бібліятэкі*.

**1856 г.** – Альберт Макей выдаў кнігу *Прынцыпы масонскага права*, якая вытрымала шмат выданняў. Кніга вядома таксама пад назвай *Масонская юрыспрудэнцыя*.

**1860 г.** – першая публікацыя рытуала “Усходняй зоркі”.

**1864 г.** – Джузэпе Гарыбальдзі аб’яднаў масонскія ложы Італіі;
– папа Пій IX выдаў антымасонскую булу *Quanta Cura*.

**1865 г.** – папа Пій IX выдаў антымасонскую булу *Multiplices Intern*.

**1866 г.** – Вялікая ложа Англіі заснавала ложу ў Японіі.

**1867 г.** – заснаванне Вялікага ўсходу Грэцыі.

**1869 г.** – папа Пій IX выдаў антымасонскую булу *Apostolicae Sedis*.

**1873 г.** – Папа Пій IX выдаў чарговую антымасонскую булу *Et si Multa*;
– заснаваны Вялікі ўсход Італіі.

**1877 г.** – Вялікі ўсход Францыі выкрэсліў з Канстытуцыі тэзіс пра веру ў Вялікага Будаўніка сусвету. Большасць ложаў адмовілася прызнаваць Вялікі ўсход Францыі;
– Сесіл Родс стаў сябрам Універсітэцкай ложы № 357 (Оксфард).

**1878 г.** – Вялікая ложа Англіі прыняла чатыры рэзалюцыі, у адпаведнасці з якімі вера ў Вялікага Будаўніка сусвету з'яўляецца найважнейшай ландмаркай.

**1880 г.** – апублікаваная *Гісторыя франкмасонства* Гулда, якая з'яўляецца адным з найбольш грунтоўных даследаванняў мінулага вольных муляраў.

**1884 г.** – антымасонская була папы Льва XIII *Humanum Genus.*

**1885 г.** – заснаванне Вялікага ўсхода Іспаніі;
– журналіст Г.А.Жоган-Пажэ (Лео Таксіль) (1854 –1907) абвясціў масонаў слугамі д'ябла. Праз 12 гадоў (19 красавіка 1897 г.) ён публічна прызнаў, што ягоныя антымасонскія працы з'яўляюцца містыфікацыяй.

**1886 г.** – Рэдзьярд Кіплінг стаў сябрам масонскай ложы "Надзея і стойкасць" у Лахоры (Індыя).

**1888 г.** – заснаванне Ордэна марціністаў.

**1889 г.** – масонскі канвент у Парыжы.

**1892 г.** – заснаванне Вялікай ложы Нарвегіі.

**1893 г.** – масонскі канвент у Чыкага. У Францыі ўзнікла ложа "Правы чалавека", сябрамі якой маглі быць жанчыны.

**1897 г.** – абат Жюль Трамантэн стварыў у Парыжы Антымасонскую лігу.

**1898 г.** – заснаванне ў Францыі намаганнямі вольных муляраў Лігі правоў чалавека.

**1900 г.** – масонскі канвент у Парыжы.

**1901 г.** – Тэадор Рузвельт прайшоў абрад ініцыяцыі ў адной з ложаў Нью-Ёрка.

**1902 г.** – Уінстан Чэрчыль прайшоў абрад ініцыяцыі ў адной з ложаў Лондана.

**1906 г.** – адраджэнне вольнага мулярства ў Расеі. Заснаванне ў Маскве ложы "Адраджэнне" ("Возрождение"). Вялебны – Мікалай Бажэнаў;
– выйшаў першы нумар галандскага масонскага журнала *De Wijmetselaar* (выдаваўся да 1940 г.).

**1909 г.** – да вольных муляраў далучыліся Уільм Тафт і Гары Трумэн.

**1910 г.** – адраджэнне вольнага мулярства на беларускіх і літоўскіх землях. Заснаванне ложы ў Менску (назва невядомая) і ложы "Еднасць" у Вільні

(Вялебны – Ежы Ром). Ініцыятарамі выступалі расейскія масоны. Сярод сяброў-заснавальнікаў ложы былі браты Луцкевічы;

– адраджэнне вольнага мулярства ў Польшчы. Заснаванне ў Варшаве ложы "Вызваленне" ("Wyzwolenie"). Вялебны – Рафал Радзівіловіч.

**1911 г.** – заснаванне ложы "Літва" (Вільня). Вялебны – Міхал Ромэр;

– абрад ініцыяцыі ў адной з ложаў ЗША прайшоў Франклін Рузвельт.

**1912 г.** – утварэнне Вялікага ўсходу Расеі, з 1913 г. – Вялікага ўсходу народаў Расеі. Арганізацыя лічылася нерэгулярнай, бо не была прызнаная масонскімі цэнтрамі.

**1913 г.** – заснаванне віленскай ложы "Верны ліцьвін", якая падпарадкоўвалася Варшаве.

**1914 г.** – заснаванне ложы ў Віцебску (назва невядомая) і ложы "Беларусь" (Вільня).

**1915 г.** – браты ложаў "Еднасць", "Літва" і "Беларусь", якія засталіся ў Вільні пасля адступлення расейскіх войскаў, заснавалі ложу "Вялікі ўсход Літвы" (або "Вялікі ўсход Літвы і Беларусі"). Вялебны – Юргіс Шаўлюс. Існавала да 1916 г.

**1919 г.** – заснаванне Вялікай Ложы сербаў, харватаў і славенцаў.

**1920 г.** – абрад ініцыяцыі ў варшаўскай ложы "Праўда" прайшоў Браніслаў Тарашкевіч. У далейшым (да 1925 г.) ён належаў таксама да віленскай ложы "Тамаш Зан";

– у Каўнасе аднавіла працы ложа "Літва", сябрам якой па некаторых дадзеных быў Дамінік Семашка.

**1921 г.** – заснаванне Вялікай Нацыянальнай ложы Польшчы;

– кангрэс Вярхоўнай Рады шатландскага рытуала ў Лазане (Швейцарыя);

– аднаўленне працы масонскай ложы ў Вільні. Паводле інфармацыі М.Рыбко, была адноўленая дзейнасць Вялікага ўсходу Літвы, якая працавала пад кіраўніцтвам Івана Краскоўскага;

– паводле ўзора масонскіх арганізацый у Каўнасе ўзнікла нелегальнае "Беларускае брацтва".

**1923 г.** – заснаванне Вялікай Нацыянальнай ложы Чэхаславакіі.

**1925 г.** – забарона вольных муляраў у Італіі;

– заснаванне Вялікай ложы Фінляндыі;

– заснаванне Вялікага ўсходу Румыніі.

**1927 г.** – канвент Сусветнай масонскай лігі ў Базеле (Швейцарыя).

**1930 г.** – заснаванне сімвалічнай Вялікай ложы Германіі;

– канвент Сусветнай масонскай лігі ў Жэневе (Швейцарыя).

**1931 г.** – канвент Сусветнай масонскай лігі ў Парыжы.

Крыніцы:

1. Гардзееў Ю. З гісторыі гарадзенскіх масонаў // Гістарычны альманах. – 2001. – Т. 5.
2. Добрянский С.Ф. Очерки из истории масонства в Литве // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. – Кн. 4. – Вильна, 1914.
3. Карпачев С.П. Путеводитель по масонским тайнам. – Москва, 2003.
4. Рыбко М. Масонства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 5. – Мн.: БелЭн, 1999.
5. Рыбчонак С. Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагоддзя (Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі) // Годнасць. – 1994. – № 1(2).
6. Серков А.И. Русское масонство. 1731-2000. Энциклопедический словарь. – Москва: Российская политическая энциклопедия, 2001.
7. Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-люты 1917 г. – 2-е выд. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004.
8. Соколовская Т. Материалы по истории русского масонства XVIII-XIX вв. – Москва, 2000.
9. Старцев В.И. Русское политическое масонство начала XX в. – СПб., 1996.
10. Швед В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772-1863). – Гродна, 2001.
11. Hass L. Ambicje, rachuby, rzeczywistość. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej. 1905 – 1928. – Warszawa, 1984.
12. Hass L. Loża i polityka: masoneria rosyjska 1822 – 1995. – W 2 t. – T. 1. Wolnomularstwo rosyjskie w podziemiu. 1822-1921; T. 2. Wolnomularstwo rosyjskie na obczyźnie i powrót w strone rodzinne. – Warszawa, 1996-1998.
13. Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX w. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1982.
14. Lennhoff E., Posner O. Internationales Freimaurerlexikon. – Zürich-Leipzig-Wien: Amathea Verlag, 1932.
15. Nasierowski T. Wolnomularstwo bez tajemnic. – Warszawa, 1996.

*Складальнікі Алесь Смалянчук (Гародня),*
*Марыяна Сакалова (Менск)*

## Слоўнік абраных тэрмінаў, паняццяў і сімвалаў вольных муляраў

**Абрады** да асноўных належаць адкрыццё і закрыццё працаў у ложы, пасвячэнне (ініцыяцыя), перавод у наступны градус. Адкрыццё і закрыццё працаў абмяжоўваецца вымаўленнем Вялебным, а таксама Першым і Другім дазорцамі рытуальных словаў і ударамі малатка. Найбольш складаны абрад пасвячэння (ініцыяцыі). Ён пачынаецца з чытання і спальвання запавета пасвячаемага. Потым яго ўводзяць у ложу з завязанымі вачыма, аголенай груддзю і каленам. Адбываюцца сімвалічныя вандроўкі, ачышчэнне вадой і полымем. Пасля вандровак здымаецца павязка з вачэй. Пасвячаемы прыносіць клятву на вернасць Братэрству, атрымлівае масонскае імя і займае сваё месца на лаве вучняў. Перавод з градуса ў градус звычайна абмяжоўваецца ўрачыстым словам Вялебнага і прынясеннем клятвы.

**Абуджэнне** аднаўленне дзейнасці братоў і ложаў пасля іх часовага "ўсыплення".

**Агапа** абрадавае ўжыванне ежы першымі хрысціянамі; у вольных муляраў – банкет, якім завяршаюцца паседжанні ложы. Падчас агапы браты абменьваюцца думкамі па розных пытаннях.

**Адстаўка** права кожнага вольнага муляра пакінуць Братэрства масонаў пры ўмове выплаты сяброўскіх складак. Заява пры гэтым падаецца на імя Вялебнага.

**Адэпт** вольны муляр, сябра ложы.

**Акацыя** дрэва, якое адыгрывае сімвалічную ролю ў легендзе пра Хірама (ягоная галінка была пасаджаная на месцы пахавання забітага будаўніка храма Саламона); абавязковы атрыбут інтэр'ера ложы.

**Алтар** трохвугольны столік каля месца, дзе знаходзіцца Вялебны, з трыма сімвалічнымі прадметамі – біблій, цыркулем, вугольнікам.

**Арол** элемент масонскай геральдыкі; эмблема Старажытнага і Шатландскага рытуалаў; сустракаецца ў назвах ложаў, напр., ложа "Двух арлоў" (Магілёў, 1776).

**Арэапаг** варштат, дзе збіраюцца браты з розных ложаў, якія маюць болей за 15°.

**Архівы** дакументы справаводства ложаў (за іх адказваў архівіст) і прыватныя паперы братоў. Рэшткі архіваў ложаў Беларусі і Літвы захаваліся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) у Гародні і Менску, Літоўскім Дзяржаўным гістарычным архіве (LVIA) (Вільня), Архіве старажытных актаў (AGAD) (Варшава).

**Аспірант** асоба (прафан), якая з'яўляецца кандыдатам у вольныя муляры.

**Афіцэры ложы** службоўцы, якія дапамагаюць Вялебнаму арганізаваць працу ложы. Звычайна гэта Першы і Другі дазорцы, Майстар абрадаў, Эксперт, Сакратар, Прамоўца, Скарбнік, Брамнік, Ялмужнік. У ложах вышэйшых градусаў абіраўся таксама Архівіст.

**Бооз і Якін** левая і правая калоны ў храме Саламона, якія сімвалізуюць моц і надзею на Бога. Лічацца свяшчэннымі словамі першых дзвюх ступеняў масонства.

**Балаціроўка** працэдура патаемнага галасавання "за" ці "супраць" асобы пад час цырымоніі пасвячэння.

**Біблія** першая з трох галоўных святынь масонства; сімвал духоўнага святла; увасабленне веры ў Вялікага Будаўніка сусвету. На Бібліі прыносяць клятву падчас пасвячэння. Ёй пачынаюць і заканчваюць паседжанні ложы.

**Блакітная ложа** тэрмін для пазначэння першых трох градусаў (ступеняў) пасвячэння, г.зв. "сімвалічнага масонства". Блакітны колер сімвалізуе дасканаласць, ісціну, добрую волю, сусветнае братэрства і вернасць.

**Брамнік** афіцэр ложы, які адказвае за бяспеку працаў.

**Брат** вольны муляр, масон;

на пісьме можа быць пазначаная наступным чынам – ∴.

**Братэрскі ланцуг** адзін з найбольш старажытных абрадаў. Пры закрыцці ложы браты бяруцца за рукі і ўтвараюць ланцуг, які сімвалізуе непарыўнасць сусветнага братэрства вольных муляраў.

**Бярцовыя косткі і чэрап** сімвал смерці ў абрадах і цырымоніях.

**Вандроўкі** сімвал працы розуму ў трох напрамках: пранікненне ва ўнутранае і знешняе асяроддзе, паглыбленне ў цемру падзямелля для даследавання чужых глыбінь і пераадолення жыццёвых перашкодаў. Вучань ажыццяўляе пяць вандровак, увасаб-

ляючых шляхі пазнання ўласных магчымасцяў, а таксама задачаў і мэтаў вольнага мулярства. Чаляднік падчас пасвячэння ў ступень майстра, вандруе ў пошуках магілы Хірама і тым самым нібыта набліжаецца да вялікай тайны быцця і спасцігае ісціну.

**Вокны** у памяшканнях масонскай ложы іх тры – на Поўдзень, Усход, Захад; звязаны з сімволікай "святла", "тайнаў", лічбы "тры".

**Вольны муляр** сінонім тэрміна "масон". Назва паходзіць ад сярэднявечных муляраў, якія аб'ядноўваліся ў прафесійныя карпарацыі – цэхі.

**Вопратка** строга не рэгламентавалася. Звычайна гэта цёмны касцюм, белая кашуля, гальштук або бабачка цёмнага колеру. Кіраўнікі масонскіх ложаў вышэйшых ступеняў Шатландскага рытуала (сістэмы) апранаюць мантыю, пакрытую сімволікай.

**Вучань** вольны муляр першага градуса (першай ступені) – 1°.

**Выбарнасць** замяшчэнне кіруючых пасадаў у ложах шляхам галасавання.

**Вышэйшыя майстэрні** арганізацыі братоў ад 4° да 33°.

**Вялебны** Майстар кафедры; тытул кіраўніка ложы.

**Вялікая ложа** назва масонскага цэнтра, якому падпарадкоўваюцца ложы рэгіёну. Ён цалкам самастойны і валодае абсалютнымі паўнамоцтвамі ў прыняцці важных рашэнняў на тэрыторыі сваёй юрысдыкцыі. Звычайна, у краіне існуе толькі адна Вялікая ложа. Згадваецца з указаннем на месца знаходжання, напр., Вялікая ложа Англіі. На чале стаіць Вялікі майстар і Вялікія афіцэры.

**Вялікая справа** агульная праца братоў па самаўдасканальванню ("будаўніцтву Храма ва ўласнай душы").

**Вялікі Будаўнік сусвету** 1. Вышэйшы Розум, які кіруе сусветам;
2. Бог. Паводле старажытных Ландмарак і Канстытуцый, вольныя муляры працуюць якраз у яго гонар.

**Вялікі майстар (магістр)** абраны або прызначаны на пэўны тэрмін старшыня Вялікага ўсхода або Вялікай ложы.

**Вялікі ўсход** назва масонскага цэнтра, у ложах якога па жаданню адэптаў практыкуецца некалькі рытуалаў. Характэрная рыса

Вялікага усхода – адмова ад хрысціянскай сімволікі. Прадстаўляе г.зв. нерэгулярнае масонства, якое не патрабуе ад сваіх адэптаў веры ў Вялікага Будаўніка сусвету (Бога). Адзін з кіраўнічых цэнтраў "нерэгулярных" ложаў – Вялікі ўсход Францыі.

**Вялікі ўсход народаў Расеі** нерэгулярная арганізацыя масонскага тыпу, якая ўзнікла ў 1912 г. Не падтрымлівала кантактаў з масонскімі цэнтрамі па-за Расеяй, прымала ў свае шэрагі жанчын, ігнаравала масонскую абраднасць, актыўна займалася палітычнай дзейнасцю, знаходзілася ў апазіцыі да царскага рэжыма. Яе прадстаўнікі складалі большасць сяброў Часовага ўраду Расейскай рэспублікі ў 1917 г.

**Вялікія светачы** Біблія, Цыркуль, Вугольнік, які адыгрываюць важную ролю ў сімволіцы і абраднасці вольных муляраў. Біблія трактуецца як воля Вялікага Будаўніка сусвету (Бога), цыркуль – як духоўнасць і маральнасць чалавека, вугольнік – як фізычнае жыццё чалавека.

**Вяроўка** выкарыстоўваецца ў масонскіх цырымоніях пры пасвячэнні. Нагадвае прафану пра яго непаўнавартасць.

**Гармонія** ідэя спакою і згоды, якія павінны панаваць паміж братамі. Нагляд за гэтым ажыццяўляе Брат гармоніі.

**Геаметрыя** лічыцца адной з галоўных навук, асновай дойлідства. У сімволіцы яе ўвасабляе літара G.

**Гербы** знакі ложы, у якіх шыфруецца яе назва, месцазнаходжанне, прыналежнасць да пэўнага рытуала.

**Градусы (ступені)** узроўні пасвячэння. Англійскае (блакітнае) масонства абмяжоўваецца першымі трымя градусамі (ступенямі). Вышэйшыя градусы (4°-33°) прысвойваюцца Капітулам, у які ўваходзяць браты вышэйшых градусаў пасвячэння. Найбольш развітая сістэма градусаў у Старажытным і прынятым шатландскім рытуале. Градусы 4-18 (чырвонае масонства) – капітулярные. Градусы 19-29 (чорнае масонства) – філасофскія. Градусы 29-33 (белае масонства) – адміністрацыйныя. Сістэма градусаў Старажытнага і прынятага шатландскага рытуала выглядае прыблізна так: 1° – Вучань; 2° – Чаляднік (Падмайстар); 3° – Майстар; 4° – Тайны майстар; 5° – Дасканалы майстар; 6° – Блізкі сакратар; 7° – Суддзя; 8° – Захавальнік ведаў; 9° – Майстар дзевяці абраных;

10° – Славуты абраннік пятнаццаці; 11° – Выдатны рыцар абраннік; 12° – Майстар-Дойлід; 13° – Рыцар царственнага свода альбо Венчаны муляр; 14° – Дасканалы вольны муляр альбо Вялікі абраннік; 15° – Рыцар усходу альбо Рыцар мяча; 16° – Князь ерусалімскі; 17° – Рыцар усходу і захаду; 18° – Рыцар ружы і крыжа (Разэнкрэйцэр); 19° – Вялікі панціфік нябеснага Ерусаліма; 20° – Высокашаноўны вялікі майстар (Вялікі магістр) альбо Пажыццёвы майстар; 21° – Вялікі ноеўскі патрыярх альбо Прускі рыцар; 22° – Рыцар каралеўскай сякеры альбо Князь Лівана; 23° – Захавальнік скініі; 24° – Князь скініі; 25° – Рыцар меднага змея; 26° – Князь міласэрнасці; 27° – Вялікі камандор храма; 28° – Рыцар сонца; 29° – Вялікі рыцар святога Андрэя; 30° – Вялікі абраннік, Рыцар кадош (святы – іўрыт); 31° – Вялікі камандор; 32° – Славуты рыцар каралеўскага сакрэта; 33° – Дзяржаўны вялікі вярхоўны інспектар.

**Гуманізм** асноўны прынцып масонскай дактрыны жыцця і дзейнасці.

**Дабрачыннасць** адна з галоўных мэтаў дзейнасці масонаў. Масоны ананімна дапамагаюць сіроцкім прытулкам, дамам састарэлых, медыцынскім установам.

**Даліна** месца, дзе працуе Капітул.

**Дзверы храма** уваход у ложу паміж 2 калонамі, які ахоўваецца Брамнікам; мяжа паміж прафанамі і масонамі; месца захода сонца.

**Дзеці ўдавы** сімвалічная назва масонскага братэрства.

**Догма** пастулат, заснаваны на веры. Масонства ў прынцыпе не прызнае догмаў. Вялікі ўсход Францыі і блізкія яму цэнтры, напр., адмаўляюцца прымаць якія б ні было догмы. Ложы Старажытнага і прынятага шатландскага рытуала прызнаюць існаванне Бога і бессмяротнасць душы, аднак не лічаць гэтыя пастулаты догмамі.

**Дождж (снег)** з'яўленне ў ложы чужога: мужчыны (дождж) або жанчыны (снег). Брат, убачыўшы чужога, падае сігнал: "Ідзе дождж (снег)".

**Дазорац** афіцэр ложы, які ў масонскай іерархіі займае месца ўслед за Вялебным. Першы дазорац апякуецца Чаляднікамі (Паўднёвая калона), Другі дазорац – Вучнямі (Паўночная калона).

**Дасканалая ложа** ложа, у складзе якой знаходзіцца поўная колькасць сяброў, прадугледжаная яе канстытуцыяй.

**Дыван** кладзецца на падлогу ложу. Ложы кожнага градуса адпавядае дыван з пэўнымі сімваламі. Пры пераходзе з аднаго градуса ў іншы дыван замяняецца.

**Дысцыпліна** рэгулюецца статутамі, якія рэгламентуюць паводзіны ў ложы, прадугледжваюць захаванне таямніцы, уплату складак ды інш. Для братоў характэрна пачуццё самадысцыпліны.

**Дэльта свяшчэнная**
1. Божае вока ў трохвугольніку;
2. Сімвал Бога, які ўсё бачыць. У масонаў часцяком замест вока фігуруе літара G (першая літара словаў *God* і *Geometry*);
3. Сімвал Вялікага Будаўніка сусвету;
4. Сімвал ведаў, якія разганяюць цемру нявуцтва.

**Еднасць** філасофская катэгорыя, якая ў вольных муляраў азначае пачатак і канец існага.

**Еўрапейская масонская асацыяцыя** канфедэрацыя рытуалаў пад эгідай Аб'яднанай Вялікай ложы Англіі.

**Закон маўчання** захаванне масонскай таямніцы перад прафанамі.

**Закрыццё працаў** у масонскую "поўнач" закрываецца Біблія, браты абяцаюць захоўваць у таямніцы ўсё, што адбывалася на паседжанні ложы, гасяць свяцільнікі.

**Запавет** пажаданні новапасвечанага брата чалавецтву, блізкім і роднай краіне. Пасля пасвячэння (ініцыяцыі) спальваецца.

**Запальванне полымя** адкрыццё новай ложы.

**Запон** фартук масона. Запон вучня і чаляднікa зроблены з белай скуры. Пачынаючы з 3° запоны становяцца ўзорчатымі і разнакаляровымі.

**Заснуць** часова пакінуць Брацтва.

**Зварот** са старажытнасці масоны звяртаюцца паміж сабой на "ты", тым самым падкрэсліваецца сяброўскі даверлівы характар адносінаў.

**Зодчыя працы** філасофскія працы братоў, якія зачытваюцца на паседжаннях ложы.

**Зорка** сімвал чалавека. Ранішняя зорка (пентаграма) – сімвал жыцця.

**Знакі ложаў** узнагароды братам за добрую дзейнасць ці выслугу гадоў, зробленыя з пазалочанай бронзы. Адлюстроўваюць сімволіку ложы, яе назву, месцазнаходжанне, дэвіз.

**Знакі масонскія** спосабы распазнавання братамі адзін аднаго па-за межамі ложы. Напрыклад, вучань падымае пад горла правую руку з выстаўленым у бок вялікім пальцам, астатнія сціснуты (утвараецца нібыта вугольнік). Чаляднік правай рукой дакранаецца да сэрца, а потым адводзіць управа і апускае ўдол. Майстар кладзе правую руку з выстаўленым у бок вялікім пальцам на левы бок.

**Інвалюцыя** передоленне вольным мулярам перашкодаў на шляху да духоўнай дасканаласці.

**Інвестура** ускладанне абавязкаў на новае кіраўніцтва пасля яго абрання.

**Ініцыяцыя** пасвячэнне ў шэрагі вольных муляраў.

**Інсталяцыя** прысяга Вялікіх афіцэраў Вялікай ложы, а таксама Вялебнага і афіцэраў сімвалічнай ложы.

**Інструменты** прафесійныя прылады працы муляра, якія сталі атрыбутамі выканання сваіх абавязкаў абранымі асобамі ложы. Малаток – сімвал улады і розума; вугольнік – справядлівасці; узровень – роўнасці; адвес – раўнавагі; цыркуль – пошукаў ісціны; лінейка – справядлівасці; рычаг – моцы; нажніцы – разважлівасці; кельма – дабразычлівасці.

**Іспыт** выпрабаванне адэпта перад цырымоніяй пасвячэння ў выглядзе адказаў на пытанні. Па яго выніках прымаецца рашэнне пра гатоўнасць брата да пасвячэння.

**Календар** вольныя муляры дадаюць да існуючага года 4000 (паводле Бібліі, 4000 г. да н.э. быў створаны сусвет). Напр., 2004+4000=6004 "год ісціннага святла", звязаны з г.зв. "масонскай эрай".

**Камень** сімвал душы чалавека; апрацоўваць камень значыць займацца самаўдасканаленнем. Краевугольны камень сімвалізуе братэрскую любоў.

**Канвент** Генеральная асамблея масонскай федэрацыі або штогадовы сход дэпутатаў ложаў масонскай федэрацыі для падвядзення вынікаў, абмеркавання важных пытанняў. Звычайна адбываецца ўвосень.

**Кандыдат** прафан, які звярнуўся да ложы з просьбай аб пасвячэнні. Ён павінен быць "вольным чалавекам добрага нораву", веруючым у Бога, старэйшым за 21 год ды інш.

**Капітул (капітулярная** адміністратыўны орган, у які ўваходзяць браты высокіх ступеняў. На землях Беларусі капітулы былі ў Нясвіжы

**ложа)** ("Святыня Спакою", 1821) і Менску ("Гара Табар", 1821).

**Каралеўскае майстэрства** сінонім тэрміна "масонства", які быў узяты ў "аператыўных" вольных муляраў, якія лічыліся "падмуркам" каралеўскага трону. Каралі часцяком з'яўляліся апекунамі і нават сімвалічнымі кіраўнікамі арганізацый вольных муляраў.

**Катэхізіс вольнамулярскі** асновы масонскай навукі ў выглядзе пытанняў і адказаў, распрацаваныя для розных ступеняў пасвячэння.

**Квадрат** геаметрычная фігура. Адлюстраванне суразмернага з чалавекам космаса. Сімвал камбінацыі чатырох элементаў – паветра, вады, полымя і зямлі. Адпавядае сімвалізму лічбы "4". Азначае стабільнасць і надзейнасць.

**Кельма** сімвал братэрскай любові ўсіх масонаў, цярпімасці і дабразычлівасці.

**Ключ** сімвал таямніцы

**Клятва** прыносіцца прафанам пры пасвячэнні ў вучні, а братамі пры павышэнні ў ступенях або пры абранні на пасаду. Звычайна гэта абяцанне верыць у Бога, быць адданым дзяржаве, любіць братоў, падпарадкоўвацца рэгламенту і распараджэнням кіраўніцтва, захоўваць таямніцу, выконваць свае абавязкі. У канцы прагаворваецца пакаранне за парушэнне клятвы.

**Кніга дойлідства** збор пратаколаў ложы, якія вядзе Сакратар. Падпісваецца Сакратаром і Вялебным пасля адабрэння ложы.

**Кніга руплівасці** рэестр з паметкамі наведвання братамі ложы. Апошняе ўваходзіць у кола асноўных абавязкаў масона.

**Кола** фігура без пачатку і канца, бязконцасць з указаннем на Вялікага Будаўніка сусвету. Яго малявалі крэйдай на падлозе перад пачаткам ложы.

**Кропкі** звычайна тры кропкі ( ∴ ), якія нагадваюць трохвугольнік, пазначаюць масонскае братэрства, адэптаў якога іншым разам называюць "людзьмі трох кропак". Кропка ў крузе азначае кантроль над уласнымі паводзінамі, узор правільнага жыцця.

**Крыж** важны культавы прадмет у хрысціянстве. У масонаў – сімвал Храма, Космаса. Выкарыстоўваецца ў ложах, дзе браты маюць высокія ступені. Крыж з'яўляецца знакам вярхоўных кіраўнікоў.

**Куб** 1. Сімвал завершанасці і бязконцасці, аднаўлення і спрадвечнасці, зямнога і нябеснага;
2. Знак чалядніка.

**Культ працы** 1. Важная складовая масонства;
2. Напамін пра паходжанне ад муляраў, а таксама – пра сур'ёзнасць працы ў ложах.

**Лад з хаоса Ordo in Chao** дэвіз Старажытнага і прынятага шатландскага рытуала, які заклікае братоў да нястомнай працы па прыкладу Вялікага Будаўніка сусвету над пабудовай сімвалічнага Храма шляхам удасканалення міжчалавечых адносінаў.

**Ландмаркі** непарушныя прынцыпы масонства. Да агульнапрынятых (апроч адэптаў Вялікага ўсходу) належаць вера ў Бога, у бессмяротнасць душы, выкарыстанне Бібліі пад час працы ў ложах. Паводле Макея – існуюць 25 ландмарак, а паводле Аб'яднанай Вялікай ложы Англіі – 8. (Да трох названых трэба дадаць забарону пасвячэння жанчын, абмеркавання палітычных і рэлігійных пытанняў, важнасць захавання ландмарак, суверэнітэт і незалежнасць Вялікіх ложаў ад іншых цэнтраў, самастойнасць Вялікіх ложаў у адносінах з Вярхоўнымі Радамі альбо іншымі федэрацыямі, якія кіруюць аб'яднаннямі вольных муляраў высокіх ступеняў пасвячэння.

**Ложа (майстэрня, варштат)** 1. Памяшканне, у якім праходзяць паседжанні братоў (ад англійскага *lodge*);
2. Арганізацыя вольных муляраў. Ствараецца пры наяўнасці 7 масонаў у ступені майстра, абавязкова з дазволу масонскіх уладаў, якія прысвойваюць ёй парадкавы нумар, зацвярджаюць назву і арганізуюць цырымонію адкрыцця (інсталяцыю). Звычайная ложа аб'ядноўвае масонаў усіх ступеняў ад 1° да вышэйшых. Аднак існуюць ложы, якія працуюць толькі ў першых градусах. Масоны ступенях вышэй 3° аб'ядноўваюцца ў вышэйшыя ложы. У сімвалічным значэнні ложы дзеляцца на "блакітныя" (браты першых трох градусаў) і "ложы ўдасканалення" (пачынаючы ад 4° і вышэй).

**Мазаічная падлога** 1. Сімвал чарадавання белага і чорнага, дабра і зла;
2. Важны элемент інтэр'ера масонскага храма.

**Майстар (магістр)** трэцяя (апошняя) ступень (3°) абстрактнага або сімвалічнага масонства; азначае спадчынніка Хірама; адкрывае шлях да атрымання вышэйшых ступеняў шатландскай сістэмы. Майстар носіць нашыйную ленту, квадратны белы фартух з

| | |
|---|---|
| | адпаведнай сімволікай і белыя пальчаткі. Слова "майстар" разам з тытуламі ўваходзіць у назву шэрагу высокіх ступеняў. |
| **Масоназнаўства** | навуковая дысцыпліна, якая вывучае дзейнасць Ордэна вольных муляраў практычна ва ўсіх яго праявах. У некаторых еўрапейскіх краінах выкладаецца ў універсітэтах. Замежная бібліятэка масоназнаўства налічвае дзесяткі тысяч тамоў. У Беларусі яно знаходзіцца на стадыі станаўлення. Большасць сучасных беларускіх даследчыкаў цікавяцца пераважна гісторыяй вольных муляраў і імкнуцца да яе навуковага асвятлення. У той жа час мае месца і антымасонская прапаганда, прыкладам якой з'яўляецца кніга У.Бегуна *Рассказы о "детях вдовы"* (Мінск, 1986). |
| **Масонскі пацалунак** | трохразовы пацалунак братоў; сімвал даверу і гатоўнасці дапамагчы. |
| **Масонства аператыўнае** | сярэднявечныя цэхі муляраў, якія імкнуліся захаваць таямніцу будаўніцтва і збіраліся на абмеркаванне прафесійных праблемаў у спецыяльных зачыненых памяшканнях – ложах. |
| **Масонства спекулятыўнае** | пачалося 24 чэрвеня 1717 г., заснаваннем Вялікай ложы Англіі. Сучасны Ордэн вольных муляраў з'яўляецца філасофска-этычным аб'яднаннем, якое грунтуецца на сукупнасці пэўных прынцыпаў і ўяўляе сабой канфэдэрацыю саюзаў без адзінага цэнтра. |
| **Мацярынская ложа** | для кожнага масона – гэта ложа, у якой адбыўся абрад пасвячэння. Для ўсіх Вялікіх ложаў свету Мацярынскімі з'яўляюцца Вялікія ложы Англіі і Шатландыі. |
| **Маштаб (мера, памер)** | час і тэрмін чалавечага жыцця, якое трэба выкарыстаць з карысцю. |
| **Малаток** | адзін з галоўных інструментаў Вялебнага, увасабляючы яго ўладу над братамі ложы. Рабіўся з цвёрдых пародаў дрэва. Малаток мелі таксама абодва Дазорцы ложы. |
| **Меч** | сімвал справядлівасці і непазбежнасці пакарання. |
| **Неба** | сімвал бясконцасці; памяшканне ложы мае зоркавы звод. |
| **Нерэгулярная (дзікая) масонская ложа** | 1. Арганізацыя, якая лічыць сябе масонскай, але створаная без дазволу Вялікай ложы;<br>2. Ложа, створаная ў адпаведнасці з масонскімі правіламі, якая працуе пасля прыпынення дзейнасці яе хартыі;<br>3. Ложа, якая працуе, нягледзячы на ўсведамленне яе сябрамі незаконнасці сваіх дзеянняў. |

**Ордэн** сукупнасць масонства ў сімвалічным і арганізованым сэнсе; аб'яднанне пасвечаных вольных муляраў.

**Павязка** апранаецца на вочы прафана перад абрадам пасвячэння і здымаецца пасля завяршэння цырымоніі. Гэтым падкрэсліваецца важнасць атрымання святла. У англійскай сістэме павязка выкарыстоўваецца таксама пры цырымоніях прыняцця ў 2 і 3 ступені.

**Падсвечнік** з трымя свечкамі увасабляе 3 дабрадзейнасці: Мудрасць, Моц і Прыгажосць.

**Пакой роздуму** памяшканне, у якім прафан перад пасвячэннем застаецца сам на сам і прымае канчатковае рашэнне наконт далучэння да масонства, піша філасоўскі запавет. У пакоі прысутнічае наступная сімволіка: чэрап і бярцовыя косці (непазбежнасць смерці чалавека), графін з вадою (крыніца жыцця), пясочны гадзіннік і каса (хуткабежнасць жыцця), хлеб (ежа людзей), соль (гасціннасць) ды інш.

**Пальчаткі** элемент вопраткі масонаў першых трох ступеняў. Белы колер сімвалізуе чысціню рук і думак. Пасля смерці брата іх кладуць у труну. Пальчаткі ў высокіх ступенях чырвонага і жоўтага колеру. Магчыма спалучэнне белага колеру з іншымі.

**Пелікан** 1. Сімвал разэнкрэйцэрства;

2. Птушка, якая карміла птушанят уласным цэлам, сімвалізуе Хрыста, што выратоўваў чалавечы род ахвяруючы ўласным жыццём.

**Піраміда** геаметрычная фігура, аснова якой можа быць трохвугольнай, чатырохвугольнай або сямівугольнай. У масонстве сімвалізуе духоўную магутнасць і дасканаласць, увасабляе пошукі чалавекам ісціны і святла.

**Полымя** адзін з асноўных элементаў ачышчэння адэпта перад "вандроўкаю" ў цырымоніі атрымання ступені чаляднікa.

**Поўдзень** час, які лічыцца найбольш спрыяльным для пачатку працы вольных муляраў, бо сонца дасылае максімум святла.

**Поўнач** час абсалютная цемры; час, калі завяршаюцца працы вольных муляраў у ложах.

**Прамоўца** афіцэр ложы, які павінен сачыць за выкананнем Канстытуцыі і агульных правілаў.

**Прастол** крэсла Вялебнага. Яно нагадвае пра прастол іўдзейскага цара Саламона.

**Прафаны** людзі, якія не належаць да Ордэна. Супольнасць такіх людзей называецца прафанскай або свецкай.

**Праца** дзейнасць масонаў, галоўны сродак выхавання братоў. Адбываецца на паседжаннях ложы, напр., вывучэнне рэгламенту, выхаванне дысцыплінаванасці ў жыццёвым і філасоўскім сэнсе, авалоданне метадамі дзеянняў дзеля дабра людзей і прагрэса. Масоны шмат увагі звяртаюць на дабрачыннасць, правядзенне мерапрыемстваў у свецкім грамадстве па пытаннях міра, дэмакратыі, аховы наваколля, правоў чалавека.

**Пячаткі** служаць для зацвярджэння дакументаў ложы. Звычайна круглыя па форме, утрымліваюць назву ложы і яе эмблему, сімволіку ордэна. Знаходзяцца ў распараджэнні кіраўніцтва. Ахоўваюцца спецыяльнай асобай – Захавальнікам пячаткі.

**Разэнкрэйцэры** сябры патаемнага містычнага "Ордэна Ружы і Крыжа" (Германія, пачатак XVII ст.). Верагодна, гэта было таварыства філосафаў і літаратараў, у якое ўваходзілі Р.Дэкарт и Ф.Бэкан. Найважнейшы дакумент – *Fama Fraternitatis* (*Слава Братэрства*, 1614). Разэнкрэйцэры спалучылі сярэднявечную алхімію і эзатэрычныя пошукі ісціны. На чале стаіць Вышэйшы магістр. Масоны высокіх градусаў (ступеняў) без перашкодаў могуць уступаць у ордэн разэнкрэйцэраў і займацца там акультнымі навукамі, у т.л. алхіміяй.

**Ружа** сімвал прыгажосці і тайны. Чырвоная ружа выкарыстоўваецца падчас цырымоній пасвячэння, адаптацыі і пахавання.

**Рытуалы** прынятая сістэма абрадаў; сістэма масонства. Найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца Старажытны і прыняты шатландскі рытуал і Амерыканскі або Ёркскі рытуал. Першы з іх налівае 33° градусы пасвячэння. Першыя тры градусы выкарыстоўваюцца ў Амерыканскім рытуале. Браты 4-14° аб'ядноўваюцца ў ложах удасканалення. Браты 15° і наступных уваходзяць у склад Філасофскіх радаў і працуюць пад кіраўніцтвам Капітулаў, Арэапагаў і Трыбуналаў. Працы вядуцца ў гонар Вялікага Будаўніка сусвету, адрозніваюцца шматзначным і эзатэрычным падтэкстам. Амерыканскі або Ёркскі рытуал таксама прымае інтэрпрэтацыю ландмарак

Аб'яднанай Вялікай ложай Англіі з характэрнай для гэтага рытуалу верай у Вялікага Будаўніка сусвету, бессмяротнасць душы і выкарыстанне Бібліі.

**Салідарнасць** узаемасувязь і ўзаемазалежнасць людзей у жыцці і працы. Адна з галоўных дабрадзейнасцяў вольных муляраў, якая на практыцы зводзіцца да абавязку дапамагаць не толькі братам, але і прафанам у рамках дабрачыннасці.

**Свабода, роўнасць, братэрства** лозунг Вялікай французскай рэвалюцыі, які стаўся дэвізам многіх масонскіх сістэмаў. На цырымоніях яго вымаўленне суправаджаецца ўдарамі малатка Вялебнага або хлапкамі ў далоні.

**Святло** сімвал далучэння да масонства. "Тры малых светача" – Сонца, Месяц і Вялебны – знаходзяцца адпаведна на паўднёвай, паўночнай і ўсходняй баках Храма. "Тры вялікіх светача" – Біблія, Цыркуль і Вугольнік. "Спрадвечнае святло" – масонскі Ордэн. "Светачы ложы" – пяць яе галоўных службовых асобаў. Братоў называюць "сынамі святла". Паняцце выкарыстоўваецца ў назвах ложаў, у абрадах і цырымоніях.

**Сімвалы** аснову масонскай сімволікі складаюць малаток, цыркуль, вугольнік, лінейка.

**Скарбонка ўдавы** скрыня, з якой Ялмужнік абыходзіць братоў для збора ахвяраванняў для дабрачыннасці.

**Складкі** фінансавая падтрымка братамі дзейнасці ложы. За гэтым сочыць Скарбнік.

**Сера** элемент інтэр'ера Пакоя роздуму. Сімвал духоўных памкненняў да пазнання.

**Старажытныя традыцыі і абавязкі** частка *Кнігі канстытуцый* Дж.Андэрсана (1723), дзе выкладзены старажытныя нормы паводзінаў у ложы і па-за яе межамі, прадпісанні пра адносіны да Бога, да дзяржаўных уладаў, пра абавязкі Дазорцаў, братоў і сістэму кіравання масонскімі арганізацыямі.

**Старажытныя хартыі** канстытуцыі, законы, правілы, устаноўленыя папярэднікамі вольнага мулярства.

**Таямніца** галоўны элемент сімволікі і абавязак не паведамляць прафанам справы ложы, характар і асаблівасці цырымоній, абмяркоўваемыя пытанні, прозвішчы іншых братоў, факт уласнай прыналежнасці да вольнага мулярства. Таямніца захоўваецца і пасля таго, як адэпт пакінуў ложу. Масонская

таямніца – заўсёды ўмоўная, бо раскрываецца ў шырокадаступных спецыяльных выданнях і даведніках.

**Трохвугольнік** геаметрычная фігура. Роўнабаковы трохвугольнік, накіраваны вяршынай уніз, у масонстве сімвалізуе вільгаць, жаночы пачатак; вяршынай уверх – полымя, мужчынскі пачатак. У ложы першы трохвугольнік (улада і моц) складаюць Вялебны, Першы і Другі дазорцы; другі трохвугольнік (веды, памяць і адносіны) – Вялебны, Сакратар і Прамоўца; трэці трохвугольнік (шляхі і сродкі) – Вялебны, Ялмужнік і Скарбнік. Трохвугольнікам называюць таксама рэгулярныя сходы трох братоў там, дзе адсутнічае ложа.

**Труна** сімвал смерці і ўваскрашэння пад час ініцыяцыі або пасвячэння ў ступень майстра.

**Трыбунал** орган масонскай юстыцыі, сход масонаў высокіх градусаў (ступеняў) пасвячэння дзеля разгляду абрадавых пытанняў.

**Тытул** масонскі дакумент, які пацвярджае прыналежнасць асобы да канкрэтнай ложы або федэрацыі з указаннем на градус (ступень) пасвячэння.

**Удава-маці Хірама (Авія)** Вольныя муляры лічаць яго сваім духоўным бацькам, а сябе дзецьмі яго маці, адсюль – назва "дзеці ўдавы".

**Узрост** для прыёма ў масонскую ложу прафан павінен мець болей за 18-21 год. Адпаведна ў ступені вучня знаходзяцца 3 гады, чаляднікa – 5, майстра – 7 гадоў.

**Універсалізм** істота масонскай ідэалогіі, якая ўказвае на аб'яднанне людзей на глебе прызнання і прыняцця пэўных агульных прынцыпаў, нягледзячы на розніцу палітычных і рэлігійных пераканнанняў, нацыянальнасцяў, расаў. У рытуалах і на практыцы выяўляецца як ідэал, да якога імкнуцца вольныя муляры.

**Усынаўленне (афіліяцыя)** прыняцце ў ложу брата іншай ложы альбо брата іншага рытуала.

**Усход** сімвалічны напрамак, свяшчэнная прастора, крыніца Святла, Мудрасці і Прыгажосці. На усходзе ложы знаходзіцца алтар і крэсла Вялебнага. Усход вечны – алегарычнае месцазнаходжанне душы памерлага масона. "Усход" пазначае таксама месцазнаходжанне ложы, напр. "Паўночная паходня на Усходзе Менска" (1816).

**Усыпленне** часовае спыненне дзейнасці ложы або братоў, дабраахвотнае або па загаду масонскіх уладаў.

**Філасоўская рада** варштат братоў ад 30° да 33°.

**Хартыя** афіцыйны дакумент вольнамулярскага рытуалу (сістэмы), якая дазваляе ложы працаваць па абранаму абраду.

**Хірам Абіф (Адонірам)** галоўны персанаж міфалогіі вольных муляраў. Згадваецца ў Бібліі як будаўнік Храма Саламона. Гісторыя пра забойства Хірама вучнямі, якія патрабавалі адкрыць ім вышэйшыя таямніцы, узнікла ў больш позні часы. Смерць Будаўніка эзатэрычна трактуецца як пачатак пераходу да ўваскрашэння, зыход і ўсход сонца. Хірам стаў сімвалам справядлівасці, генія, мастацтва.

**Храм Саламона** духоўны храм, пабудова якога з'яўляецца мэтай жыцця вольнага муляра.

**Цемра** стан няведання, у якім знаходзіцца прафан да свайго пасвячэння ў вольныя муляры.

**Цнатлівасць** адна з асноўных масонскіх дабрадзейнасцяў, пра якую нагадвае белы колер пальчатак.

**Цярпімасць** адна з асноўных масонскіх дабрадзейнасцяў, якая азначае прыняцце розных поглядаў людзей без навязвання ім нейкага афіцыйнага або дамінуючага ў грамадстве погляду. Аднак цярпімасць вольных муляраў мае свае межы. Напр., англасаксонскія сістэмы нецярпімы да федэрацый, якія не прымаюць іх інтэрпрэтацыі ландмарак з верай у Бога і бессмяротнасць душы, а масонства ў цэлым адвяргае атэізм, усе формы нацызму і расізму, забараняючы прыём у ложы сяброў падобных партый.

**Чаляднік (падмайстар)** вольны муляр 2°.

**Часткі свету** галоўныя для масонаў Усход, дзе ўзыходзіць сонца, і Захад. Поўнач супрацьстаіць Поўдню: першая – змрок, нявуцтва, другая – аднаўленне моцы, адпачынак.

**Шпага** сімвал унутранага полымя ў сэрцы кожнага вольнага муляра, сімвал ачышчэння.

**Эзатэрызм** сістэма ведаў, прызначаных толькі для пасвечаных.

**Ян Багаслоў** 1. Адзін з апосталаў;

2. Пасрэднік паміж Богам і чалавекам у якасці свяшчэннага Логаса, Святла і Полымя, Любові і Духа. Асабліва ўшаноўваецца масонамі. На Алтары ложы пад час абраду адкрыцця працаў Біблія звычайна адкрываецца на першай старонцы евангелія ад Яна. Дзень 27 снежня – дзень Яна Багаслова – лічыцца адным з галоўных масонскіх святаў на працягу календарнага года. Першыя тры ступені масонскага пасвячэння носяць назву янаўскіх.

**Ян Хрысціцель** паводле Бібліі займаўся хрышчэннем іўдзеяў. Ягонае свята – 24 чэрвеня – вольныя муляры адзначаюць урачыстымі цырымоніямі.

Крыніцы

Берберова Н. Люди и ложи. Русские масоны XX столетия. – Москва, 1997.
Карпачев С.П. Путеводитель по масонским тайнам. – Москва, 2003.
Соловьев О.Ф. Масонство. Словарь-справочник. – Москва: Аграф, 2001.
Cegielski T. Sekrety masonów. Pierwszy stopień wtajemniczenia. – Warszawa, 1992.
Chajn L. Polskie wolnomularstwo. – Warszawa, 1984.
Lennhoff E., Posner O. Internationales Freimaurerlexikon. – Zürich-Leipzig-Wien: Amathea Verlag, 1932.
Nasierowski T. Wolnomularstwo bez tajemnic. – Warszawa, 1996.
Wojtowicz J. Masoneria – wielka niewiadoma? – Toruń: Wyd. Adam Marszałek, 1992.
Афіцыйны сайт Вялікай ложы Расеі – http://www.freemasonry.ru
Афіцыйны сайт Вялікай Нацыянальнай ложы Польшчы – http://www.wlnp.pl

*Складальнікі Алесь Смалянчук*
*і Вячаслаў Швед*

# Бібліяграфія гісторыі вольных муляраў Беларусі. XVIII – першая трэць XX ст.

1. Берберова Н. Люди и ложи. Русские масоны XX столетия. – Москва, 1997. (Библиография).
2. Лебедев С. Масоны и вокруг них: масонство на страницах журнала "Море" за 1901 – 1917 гг.: аннотированный библиографический указатель. – СПб., Волгоград: Vendi, 1994.
3. Карпачев С.П. Путеводитель по масонским тайнам. – Москва, 2003. (Библиография).
4. Соловьев О.Ф. Масонство. Словарь-справочник. – Москва: Аграф, 2001.
5. Ars Regia. Czasopiśmo Fundacji "Sztuka Królewska w Polsce" poświęcone myśli i historii wolnomularstwa. – 1992 – 1999. (Bibliografia).
6. Cegielski T. Sekrety masonów. Pierwszy stopień wtajemniczenia. – Warszawa, 1992. (Bibliografia).
7. Estreicher K. Bibliografia Polska. Wyciąg Wolnomularstwo. Zestawiony przez Annę Figiel, Andrzeja Karpowicza, Beatę Nawrocką. Pod redakcją A.Karpowicza. – Poznań, 1987.
8. Estreicher K. Bibliografia Polska. XIX stulecia. – Kraków, 1916.
9. Estreicher K. Bibliografia Polska. XIX stulecia. Lata 1881 – 1900. – Kraków, 1916.
10. Hass L. Loża i polityka: masoneria rosyjska 1822 – 1995. – W 2 t. – T. 1. Wolnomularstwo rosyjskie w podziemiu. 1822-1921; T. 2. Wolnomularstwo rosyjskie na obczyźnie i powrót w strone rodzinne. – Warszawa, 1996-1998 (Bibliografia).
11. Karpowicz A. Katalog druków współczesnych w zbiorach masońskich Biblioteki uniwersiteckiej w Poznaniu. – Poznań, 2000.
12. Lennhoff E., Posner O. Internationales Freimaurerlexikon. – Zürich-Leipzig-Wien: Amathea Verlag, 1932.

Крыніцы

1. Воспоминания прелата Будкевича: Польское восстание 1831 г. // Русская старина. – 1878. – Т. 22. – Кн. 8; 1892. – Т. 75. – Кн. 9.
2. К истории масонства в России / Н.М.Затворницкий // Русская старина. – 1907. – Т. 129. – Кн. 3; Т. 130. – Кн. 4, Кн. 5.
3. Масонство в его прошлом и настоящем. – Москва, 1914. – Т. 1; 1915. – Т. 2.
4. Материалы для истории масонских лож / Пыпин А.Н. // Вестник Европы. 1872. – Т. 4. – Кн. 7.
5. Материалы по истории масонства в прежней русской армии / Собщ. Тира Соколовская // Русская старина. – 1907. – Т. 130. – Кн. VI; – Кн. VII; – Кн. VIII; – Кн. IX.
6. Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця // Полымя. – 1993 – № 2.
7. Николаевский Б.И. Русские масоны и революция. / ред.-сост. Ю.Фельштинский. – Москва: Терра, 1990.


Ludwik Hass
Wolnomularze polscy
w kraju i na świecie
1821-1999
Słownik biograficzny


Ludwik Hass
WOLNOMULARSTWO
W EUROPIE
ŚRODKOWO-WSCHODNIEJ
w XVIII i XIX wieku
Ossolineum


ДМИТРИЙ
ХАРИТОНОВИЧ
МАСОНСТВО
весь
мир
знаний


ISSN 1230-1442
ARS REGIA
AB UNO
ROK VII/VIII (1998/1999)
Nr 13/14
CZASOPISMO POŚWIĘCONE
MYŚLI I HISTORII WOLNOMULARSTWA
WARSZAWA 2000

8. Русское политическое масонство. (Документы из архива гуверовского института войны, революции и мира) // История СССР. – 1989. – № 6; 1990. – № 1.
9. Сидоренко Е. Итальянские угольщики. – СПб., 1913.
10. Сучков И. Уставы вольных камещиков России конца XVIII – начала XX в. // Масонство и масоны. Сборник статей. – Выпуск 1. – Москва: Эра, 1994.
11. Тарашкевіч Б. Аўтабіяграфія // Спадчына. – 1996. – № 4.
12. Acte déclaratoire et statuta du grand orient du Royaume de Pologne et du Gr. Duché de Lithuanie. B. w. m. 5784 (1784).
13. Akt ogłoszenia i ustawy Wielkiego Wschodu Król. Polskiego i W. X. Lit. r. p. 1784 – [Warszawa, 1785].
14. Chodźko Ignacy. Obrazy litewski. Serya VI. Nowe pamiętniki kwestarza przez brata Rafała Karęgę, wydane przez... – Wilno, druk J.Zawadzkiego, 1862.
15. Chwałę W. świata Budownika. Postanowienie W. Wschodu polskiego. Warszawa, [b.r.].
16. Dłuski Michał. List rabina Lizbońskiego do rabina Brzeskiego, z dyalektu rabińsko-tałmudzkiego wytłomaczony. – Wilno: druk Zawadzkiego, 1817.
17. Dwa teksty konstytucji Wielkiej Loży Narodowej Polski (1931, 1936) / Wyd. T.Cegielski // Ars Regia. – 1992. – R. 1. – Nr 1.
18. Głos ∴ Aleksandra Chodkiewicza, reprezentanta loży Palemona, miany na posiedzeniu Wielkiego Wschodu dnia 29 maja 1820 r. – [b.m., b.r.].
19. Fragment wspomnień M.Milguja-Malinowskiego // Hass L. Działalność wolnomularstwa polskiego w latach 1908-1915 // Kwartalnik Historyczny. – 1967. – Nr 4.
20. Jasiński J. Dla exulantów polskich. O stałości. – Grodno, 1793.
21. Kniażewicz J.G. Życie Józefa Balsamo znanego pod imieniem hrabia Cagliostro z processu rzymskiego w r. 1790 przeciw mu prowadzonego wyjętę, wytłumaczone i notami objśnione do wyrozumienia sekt masońskich przez J. G. K. Roku 1793 w Wilnie w drukarni XX. Bazylianów.
22. Kodzis-Freyerowa Z. Wspomnienia // Dział rękopisów BN w Warszawie. Akc. 11258.
23. Lachnicki I. Biografia włościanina nad brzegami Niemna powyżej Łosośnej mieszkającego. – Warszawa, 1815.
24. Matuszewicz T. Posiedzenie nadzwyczajne Wgo Wschodu narodowego. Pamiątka w d. 1 Grudnia 1811 r. zmarłego Lidwika Gutakowskiego. – Warszawa, [b.r.].
25. Moszech J.B. Odpowiedź Jzaaka Ben Moszech rabina brzeskiego Abrahamowi Ben Nahason rabinowi lizbońskiemu. – Wilno, 1817.
26. Nowakowski St. Mowa... Repr ∴ Pełn [∴] węzeł jedności na wsch ∴ Nowogrodka miana na W ∴ Wsch ∴ przy dyskussyi Projektu uzupełnionej ustawy konstytucyjnej, w dniu 20 Kwietnia 5820 r.
27. Obraz członków spr i dosk. Sgo Jana p. o. n. "Szęśliwe Oswobodzenie" pod W. Nieświża pracującej na r. p. ś. 5819 (1819).

28. Obraz S. i D. Jana pod solennym nazwiskiem "Szęśliwe oswobodzenie" na Wdzie Nieświeża pracującey n. r. p. s. 5820 (1820).
29. Obraz Spraw. i Dosk. S. Jana p. o. n. "Szkoła Sokratesa" na Wschodzie Wilna na rok P. S. 5820 (Wilno, 1820).
30. Obraz Spraw. i Dosk. S. Jana p. o. n. "Pochodnia północna" pod W. Mińska pracującey na r. p. ś. 5820.
31. Okulicz K. Relacja. Paryż. 3.11. 1974 (zbiory L.Hassa).
32. Osmołowski J. Wspomnienia z lat 1914-1921 // Dział rękopisów BN w Warszawie. Akc. 6797.
33. Osmołowski J. Wspomnienia z przeszłości, lata dziecięce i młodzieńcze // Dział rękopisów BN w Warszawie. Akc. 7042.
34. Romer M. Dziennik z lat 1911 – 1915. // Аддзел рукапісаў Цэнтральнай Бібліятэкі АН Літвы.
35. Rozprawa tycząca się poprawy ustaw Wielkiego Wschodu polskiego ogłoszona 26 lutego 1784 Ery powszechney.
36. Ustawa Konstytucyjna Woln ∴ Mularstwa Polskiego, druk. B. ∴ O. ∴ Łątkiewicza.
37. Wilkoszewski W. Rys historyczno-chronologiczny Towarzystwa Wolnego Mularstwa w Polsce. Wyd. z rękopisu T.Święcicki. – Londyn, 1968.
38. Wolski J. Relacja. Warszawa. 8.02.1965; 25.01.1967; 27.01.1968; 26.10.1968 (zbiory L.Hassa).
39. Wolson T. Farmazon Demaskowany albo Prawdziwy Sekret Farmazonów ze wszystkimi częściami i okolicznościami swemi wyiawiony. Przez Pana Tomasza Wolsona 1757 z francuzskiego na polski ięzyk przetłumaczony 1783.

### Літаратура

1. Анішчанка Я. Вольныя муляры // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 3.
2. Анішчанка Я. Мінскія масоны // Памяць. Мінск. – У 4 кнігах. – Кн. 1-я. – Мінск: БЕЛТА, 2001.
3. Аронсон Г. Россия накануне революции. Исторические этюды. Монархисты, либералы, масоны, социалисты. – Нью Йорк, 1962.
4. Бакунина Т.А. Русские вольные камещики. – Париж: Свеча, 1934.
5. Бакунина Т.А. Знаменитые русские масоны. – Париж, 1934 (Москва, 1991).
6. Башилов Б. История русского масонства. – Москва: Русло, 1993.
7. Бегун В.Я. Рассказы о "детях вдовы". – Минск, 1986.
8. Берберова Н. Люди и ложи. Русские масоны XX столетия. – Москва, 1997.
9. Брачев В.С. Русское масонство XX века. – Спб., 2000.
10. Вернадский В.Г. Русское масонство в царствование Екатерины II. – Петроград, 1917.
11. Гардзееў Ю. З гісторыі гарадзенскіх масонаў // Гістарычны альманах. – 2001. – Т. 5.
12. Гатальскі І. Масон з Роткаўшчыны // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 5.
13. Дабранскі С. Масонскія лёжы ў Літве // Спадчына. – 1997. – № 1.

14. Дабранскі С. Нарысы з гісторыі масонства ў Літве // Спадчына. – 1997. – № 3.
15. Добрянский С.Ф. Масонские ложи в Литве // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. – Кн.2. – Вильна, 1911.
16. Добрянский С.Ф. Очерки из истории масонства в Литве // Записки Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. – Кн. 4. – Вильна, 1914.
17. Карпачев С.П. Масонская интеллигенция России конца XIX – начала XX в. – Москва, 1998.
18. Карпачев С.П. Путеводитель по масонским тайнам. – Москва, 2003.
19. Ковалевский М.М. Воспоминания // История СССР. – 1969. – № 5.
20. Ланской С. О литовских бывших масонских ложах // Русская старина. – 1907. – Т. 129.
21. Малышев В.В. За ширмой масонов. – Минск: Вышэйшая школа, 1985.
22. Масонство в его прошлом и настоящем / Под ред. С.П.Мельгунова и Н.П.Сидорова. – Москва: Задруги, 1914.
23. Масонство в его прошлом и настоящем. // А.А.Боровой, А.М.Васютинский, Г.В.Вернадский и др. / Под ред. С.П.Мельгунова и Н.П.Сидорова. – Т. II. – Москва: Задруги, 1915.
24. Масонство или великое царственное искусство братства вольных каменщиков как культуроисповедание. – СПб., 1911.
25. Масоны и масонство. Сборник статей / Ред. С.П.Карпачев. – Выпуски 1-3. – Москва, 1994-1998.
26. Міхаленя А., Лабовіч А. "Дом масонаў" у музычным завулку // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 1.
27. Морамарко М. Масонство в прошлом и настоящем. – Москва: Прогресс, 1990.
28. Овчинникова-Архангельская В. Виленское масонство и обновленное Розенкрейцерство. – СПб., 1911.
29. Папюс. Генезис и развитие масонских символов: История ритуалов. Происхождение степеней посвящения. Легенда о Хираме. [пер с франц.]. – СПб.: Петрополис, 1992.
30. Платонов О.А. Терновый венец России. Тайная история масонства. 1731-1996. – Москва: Родник, 1996.
31. Пыпин А.Н. Русское масонство. XVIII и первая четверть XIX в. / Ред. и прим. Г.В.Вернадского. – Петроград: Огни, 1916.
32. Пыпин А.Н. Масонство в России. XVIII и первая четверть XIX в. / Ред., прим. Г.В.Вернадский, С.С.Москаленко. – Москва: Век, 1997.
33. Рыбко М. Масонства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т. 5. – Мн.: БелЭн, 1999.
34. Рыбчонак С. Менскія варштаты ў 1-й чвэрці 19 стагоддзя (Нарысы з гісторыі вольнамулярскага руху на Беларусі) // Годнасць. – 1994. – № 1(2).
35. Рябинин И.С. Польское масонство // Тайные ордена. – Харьков, Киев, Ростов-на-Дону, 1997.

36. Семевский В.И. Декабристы-масоны // Минувшие годы. – 1908. – февраль (№ 2); март (№ 3); июнь (№ 6).
37. Серков А.И. Из истории русского масонства: Ложа трёх добродетелей и декабристы // Вестн. Моск. ун-та. – Сер.8. История. – 1988. – № 5.
38. Серков А.И. История русского масонства. 1845 – 1945. – СПб., Изд-во им.Н.И.Новикова, 1999.
39. Серков А.И. Масонские ложи на территории Белоруссии и движение декабристов // Декабристские чтения: Тезисы респ. межвуз. науч. конф. / Под ред. Б.С.Клейна, Д.В.Карева, В.В.Шведа. – Гродно, 1990.
40. Серков А.И. Русское масонство. 1731-2000. Энциклопедический словарь. – Москва: Российская политическая энциклопедия, 2001.
41. Смалянчук А. Дзённік Міхала Ромэра як крыніца па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны агляд. – Т. 5. – Сшытак 1(8). – 1998.
42. Смалянчук А. З гісторыі віленьскага масонства пачатку XX ст. // Спадчына. – 1998. – № 5.
43. Смалянчук А. Масонскія ложы на беларускіх і літоўскіх землях. 1910-1916 гг. // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2002. – 17.
44. Смалянчук А. Ромэр Міхал Піус // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 6. – Мінск: БелЭн, 2001.
45. Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-1917. – Гродна: ГрДУ, 2001.
46. Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864-люты 1917 г. – 2-е выд. – Санкт-Пецярбург: Неўскі прасцяг, 2004.
47. Смоленчук А. Евреи в масонских ложах Беларуси и Литвы в начале XX в. // Материалы Десятой ежегодной международной междисциплинарной конференции по иудаике. – Часть 1. – Москва, 2003.
48. Соколовская Т. Капитул Феникса, высшее тайное масонское правление в России (1779-1822). – Петроград, 1916.
49. Соколовская Т. Материалы по истории русского масонства XVIII-XIX вв. – Москва, 2000.
50. Соколовская Т. Русское масонство 1730 – 1917. – Москва, 1993.
51. Соловьёв О.Ф. Масонство в России // Вопросы истории. – 1988. – № 10.
52. Соловьёв О.Ф. Русское масонство. 1730 – 1917. – Москва: Изд. МГОУ, 1993.
53. Старцев В.И. Русское политическое масонство начала XX в. – СПб., 1996.
54. Сташкевіч М. Гістарычны выбар напачатку XX ст. // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Пад рэд. А.П.Вайтовіча ды інш. – Мн., 2000.
55. Хасс Л. Русские масоны первых десятилетий XX в. // Историки отвечают на вопросы. – Москва, 1990.
56. Швед В.В. Гродзенскія масонскія ложы (канец XVIII-пач. XIX ст.) // Гарадзенскія запісы: Старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1997. – Вып. 3.
57. Швед В.В. Вягелін А.І. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 2. – Мн.: БелЭн, 1994.

58. Швед В.В. Ігельстром К.Г. // Беларуская энцыклапедыя: У 6 т. – Т. 7. – Мн.: БелЭн, 1999.
59. Швед В.В. Навагрудскіе масоны [1820-ыя гг.] // Швед В.В. Падзеі і постаці Гродзенскай даўніны. – Гродна, 1995.
60. Швед В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772-1863). – Гродна, 2001.
61. Швед В.В., Ігнатовіч Ф.І. Урачы і аптэкары – члены гродзенскіх масонскіх лож (канец XVIII – пачатак XIX ст.) // История: современные проблемы лекарственого обеспечения населения. – Гродно: [б.и.], 2000.
62. Шустер Г. Тайные общества, союзы и ордена / Под ред. А.Погодина. – СПб., 1905. – Т. 1; Т. 2.
63. Яковлев Н.Н. 1 августа 1914 г. – 3-е изд. – Москва, 1993.

64. Askenazy Sz. Lukasiński. – Warszawa, 1908. – TT. 1-2.
65. Cegielski T. "Ordo in Chao". Wolnomulastwo i swiątopoglądowe kryzysy XVII i XVIII w. – Warszawa, 1994.
66. Chajn L. Wolnomularstwo i parawolnomularstwo w Polsce międzywojennej. Zbiór nadbitek. – 1959-1974.
67. Chajn L. Wonomularswo w II Rzeczypospolitej. – Warszawa, 1975.
68. Chajn L. Polskie wolnomularstwo. – Warszawa, 1984.
69. Chmielowski P. Liberalizm i obskurantyzm na Litwie i Rusi // Biblioteka Dzieł Wyborowych. – Warszawa, 1898. – Nr 21.
70. Dunajówna M. Tomasz Zan. Lata uniwersiteckie. 1815 – 1824. – Wilno, 1933.
71. Dylągowa H. Walerian Łukasiński – Wolnomularstwo Narodowe (Towarzystwo Patriotyczne. 1819-1826). – Warszawa, 1996.
72. Encyklopedyczny słownik historii Polski / Pod red. J.Maciszewskiego. – Warszawa: POW, 1998.
73. Giertych J. O roli obozu masońskiego w przebiegu dziejów. – Poznań, 2000.
74. Fridrichs E. Freemasonry in Russia and Poland. – Berne, 1911.
75. Hass L. Ambicje, rachuby, rzeczywistość. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej. 1905 – 1928. – Warszawa, 1984.
76. Hass L. Główne nurty-odłamy ruchu wolnomularskiego (do końca lat dwudziestych XX wieku) // Mazowieckie Studia Humanistyczne. – 2000. – Nr 1-2.
77. Hass L. Dni wielkości: o masonerii rosyjskiej początku XX wieku // Ars Regia. – 1995/1996. – R. 4/5. – Nr 1-2.
78. Hass L. Działalność wolnomularstwa polskiego w latach 1908 – 1915 w relacji pamiętnikarskiej M.Malinowskiego // Kwartalnik Historyczny. – 1967. – R. 74.
79. Hass L. Loża i polityka: masoneria rosyjska 1822 – 1995. – W 2 t. – T. 1. Wolnomularstwo rosyjskie w podziemiu. 1822-1921; T. 2. Wolnomularstwo rosyjskie na obczyźnie i powrót w strone rodzinne. – Warszawa, 1996-1998.
80. Hass L. Masoneria polska XX wieku: losy, loże, ludzie. – Warszawa, 1993.
81. Hass L. Skład osobowy wolnomularstwa polskiego II Rzeczypospolitej (Wielka Loża Narodowa). – Warszawa, 1992.

82. Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej w XVIII i XIX w. – Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1982.
83. Hass L. Wolnomularze polscy w kraju i na świecie. 1821 – 1999. Słownik biograficzny. – Warszawa, 1999.
84. Hass L. Zasady w godzinie próby. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej. 1929 – 1941. – Warszawa, 1987.
85. Hass L. Wolnomularstwo w Europie Środkowo-Wschodniej po drugiej wolnie światowej (1945 – 1951). – W 2 cz. – Warszawa, 1990-1991.
86. Jankowski E. Eliza Orzeszkowa. – Warszawa: PIW, 1964.
87. Jodkowski J. Loża masońska w Grodnie i Białymstoku w latach 1781-1782 // Głos Ziemi Grodzieńskiej. 9. IX. 1931.
88. Jurkiewicz J. Rozwój polskiej myśli politycznej na Litwie i Białorusi w pierwszej połowie XX wieku. – Poznań, 1973. Mps. (машынапіс).
89. Keiler H.K. Abriss der freimaurer Geschichte in Russland // Quatuor Coronati Jahrbuch. (Bayreuth) – 1993. – Nr 2.
90. Kępiński Zd. Mickiewicz hermetyczny. – Warszawa, 1980.
91. Kipa E. Studia i szkice historyczne. – Wrocław, 1959.
92. Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz podskarbi nadworny litewski. – Londyn, 1970. – T. 1; 1971. – T. 2.
93. Kukiel M. Dzieje Polski porozbiorowej 1795-1921. – Wyd. 4. – Paris, 1984.
94. Lachnicki I.-E. Statystyka guberni Litewsko-Grodzieńskiej. – Wilno, 1817.
95. Małachowski-Łempicki St. Mickiewicz a wolnomularstwo // Ruch literacki. – 1930. – Nr 7.
96. Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego WKL (1776-1822). Dzieje i materiały. – Wilno, 1930.
97. Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo polskie za Stanisława Augusta (1784-1795) // Wiedza i Życie. – 1927. – Nr 21.
98. Małachowski-Łempicki St. Wykaz polskich loż wolnomularskich oraz ich członków w latach 1738-1821 // Archiwum komisji historycznej Polskiej akademii Umiejętności. – T. 14. – Kraków, 1930.
99. Małachowski-Łempicki St. Zarys historii wolnomularstwa polskiego. – [b.m., 1996].
100. Nasierowski T. Wolnomularstwo bez tajemnic. – Warszawa, 1996.
101. Niemcewicz J.U. O wolnem mularstwie w Polszcze. – Kraków, 1930.
102. Norton B.T. Russian Political Masonry and the February Revolution // Internacional Review of Social History (Amsterdam). – 1983. – Part. 2.
103. Ponarski Z. Konfederacja Wielkiego Księstwa Litewskiego 1915-1916 // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1998. – Nr 10.
104. Ponarski Z. O masonerii na Litwie słów kilka. // Ars Regia. – 1995/1996. – R.4/5. – Nr 1-2.
105. Sawicki J. Z dziejów "Wielkiego Wschodu Litwy" // Przegląd Wschodni. – 1997. – Tom IV. – Zeszyt 2 (14).
106. Sawicki J. Z dziejów wolnomularstwa w Wilnie // Literatura i kultura. – Olsztyn, 1994.

107. Smith N. Masonic Movement in Russia after 1905 and 15 other articles in the Modern Encyclopedia of Russian and Soviet History, among them: on I.V.Gessen, F.A.Golovin, N.N.Kutler. A.A.Manuilov, V.D.Nabokov, N.V.Nekrasov, V.A.Obolensky, I.I.Petrunkevich and more (Gulf Breeze, FL, 1976).
108. Smith N. Political Freemasonry in Russia. 1906-1918 // The Russian Review. (Hanover, New Hampshire) – 1985. – Vol. 44.
109. Solak Z. Między Polską a Litwą. Życie i działalność Michała Römera. 1880-1920. – Kraków, 2004.
110. Solak Z. Michał Römer i masoneria wileńska (1911-1915) // Lietuvių Atgimimo istorijos studijos. – 1996. – T. 13.
111. Solak Z. Odrodzenie masonerii wileńskiej w latach 1910-1915 w Dzienniku Michała Römera // Niepodległość. – 1996. – T. 28.
112. Smoleński Wł. Przewrót umysłowy w Polsce wieku XVIII. Studia Historyczne. – Warszawa, 1979.
113. Urbański J. Loże masońskie na ziemiach dawnej Rzeczypospolitej // Księga pamiętkowa ku uszczeniu 25-lecia działalności naukowej profesora M.Handelsmana. – Warszawa, 1929.
114. Waingartner P. Wolnomularstwo Drugiej Rzeczypospolitej w oczach współczesnych. – Łódź, 1999.
115. Wojtowicz J. Masoneria w XVIII w. Czynnik integracji czy dezintegracji społecznej? // Między barokiem i oświeceniem. Nowe spojrzenie na czasy saskie. – Olsztyn, 1996.
116. Wojtowicz J. Masoneria – wielka niewiadoma? – Toruń: Wyd. Adam Marszałek, 1992.
117. Wolnomularstwo w świetle encyklopedyj. Wypisy. – Warszawa, 1934.
118. Załęski K. Ustawy Wielkiego Mistrzowstwa Polskiego i Litewskiego z 1781 r. Pod młotkiem Ignacego hr. Potockiego przyjęte i zaprzysiężone // Kultura średniowieczna i staropolska. – Warszawa, 1991.
119. Zalęski S. Masonia r. 1889, jej statystyka i działalność. – Kraków, 1890.
120. Załęski S. O masonii w Polsce od roku 1738 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. – Kraków, 1908. – Cz.1. Dzieje masonii w Polsce; Cz. 2. Ryty i obrazy spisu masonii polskiej.
121. Zetowski St. Mickiewicz i Słowacki w kręgu sugestyj wolnomularskich // Ruch Literacki. – 1937. – Nr 2, 3-4.

*Падрыхтаваў Алесь Смалянчук.*
*01.05.2004 г.*

# Спіс ілюстрацый

1. Карчма “Гусь і верцел”, месца першага паседжання Вялікай ложы Лондана 24 чэрвеня 1717 г. Гравюра. 1894 г.
2. Фрагмент масонскага прывілея. XX ст.
3. Віленскі універсітэт. XIX ст. Гравюра.
4. Віжэ-Лебрэн Э. Партрэт Станіслава Аўгуста Панятоўскага. 1797 г.
5. Міхал Казімір Агінскі (1730-1800). Вялікі гетман ВКЛ (1768), Вялікі намеснік Літоўскай правінцыі Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і ВКЛ (1784).
6. Пячаткі і знакі масонскіх ложаў на беларускіх і літоўскіх землях напрыканцы XVIII – пачатку XIX ст.
7. Пячатка Вялікага ўсходу Каралеўства Польскага і ВКЛ. 1784 г.
8. “Дом масонаў” у Гародні. XVIII. Фотаздымак. 2004 г.
9. Прывілей масонскай ложы “Сябры чалавецтва”. 1817 г.
10. Прывілей масонскай ложы “Шчаслівае вызваленне”. 1781 г.
11. Ігнацы Ляхніцкі, адзін з заснавальнікаў ложы “Сябры чалавецтва”.
12. Сядзіба Валенція Ваньковіча ў Менску, верагоднае месца сустрэчаў менскіх масонаў. Першая палова XIX ст.
13. Расейскі імператар Аляксандр I (1801-1825).
14. “Дом масонаў” у Менску. XVIII ст. Фотаздымак. 90-х гг. XX ст.
15. Адам Міцкевіч на фоне турэмных кратаў. Паводле малюнка В.Ваньковіча. 1828 г.
16. Юзаф Аляшкевіч (1777-1830). Мастак, Майстар кафедры ложы “Белы арол” (Санкт-Пецярбург).
17. Старонка дзённіка М.Ромэра з інфармацыяй пра паседжанне ложы “Літва”. Запіс ад 16 (29) лістапада 1911 г.
18. Старонка дзённіка М.Ромэра з інфармацыяй пра паседжанне ложы “Літва”. Запіс ад 13 (26) снежня 1912 г.
19. Браты Антон і Іван Луцкевічы і Аляксандр Уласаў. Фотаздымак. Пачатак XX ст.
20. Браніслаў Тарашкевіч (1892-1938). Фотаздымак. 1925 г.

Навуковае выданне

# ВОЛЬНЫЯ МУЛЯРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ
**канец XVIII – пачатак XX ст.**

Укладальнік і навуковы рэдактар:
доктар гістарычных навук А.Ф.Смалянчук

Камп'ютэрны дызайн і вёрстка: У.Я.Ляўшук

Здадзена ў набор: 25.11.2004. Подпісана да друку 10.01.2005
Фармат 60х84/16. Папера афсетная. Гарнітуры Times, Arial.
Ум. друк. арк. 26,32   Ул.-выд. арк. 37,55
Наклад 500 асобнікаў. Замова 25

VSK

Надрукавана ў друкарне «Gudas»
A. Varta, 25, 2646, Vilnius, Lithuania

Гісторыя звычайна апісвае змяненні, што адбываюцца пры святле дня. Між тым у народаў, пазбаўленых свабоды, якраз пад покрывам начной цемры рыхтуюцца падзеі, якія рэалізуюцца пры дзённым святле <...> Калі-небудзь гісторыя ночы стане больш цікавай, чым гісторыя дня.

Юзаф Чыньскі, гісторык

Нашая задача – не знішчаць, не ламаць, не разбураць, а ствараць і ўдасканальваць <...> Нашым падмуркам з'яўляюцца ідэі братэрства, любові і свабоды чалавечага духу. Нашае брацтва – гэта Саюз гуманізму ў шляхетным і адначасова дзейсным значэнні гэтага слова. Мы імкнемся, каб нашыя лозунгі не сталі звычайнай фармальнасцю <...> Мы імкнемся зрабіць іх рэальнасцю сумлення, дзеянняў і дачыненняў у чалавечым сужыцці; каб яны пранізалі адносіны як паміж асобнымі людзьмі, так і паміж усялякімі групамі, нацыямі і, нарэшце, сталі здабыткам усяго чалавецтва <...>

Міхал Ромэр,
Вялебны ложы "Літва" (Вільня). 1915 г.

ВОЛЬНЫЯ МУЛЯРЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ